Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

**В.В.ШВЕД**

# ПАМІЖ ПОЛЬШЧАЙ І РАСІЯЙ: ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ (1772 – 1863 гг.)

Гродна 2001

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**
Ш 34

Рэцэнзенты: доктар гістарычных навук У.М.Міхнюк;
кандыдат гістарычных навук В.А.Цяплова.

Навуковы рэдактар: доктар гістарычных навук П.І.Брыгадзін.

Рэкамендавана саветам гістарычнага факультэта БДУ.

**Швед В.В.**

Ш 34 **Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772—1863 гг.).** — Гродна: ГрДУ, 2001. — 416 с.

ISBN 985-417-253-8.

У манаграфіі разглядаюцца польская, руская і ліцвінская плыні грамадска-палітычнага жыцця на землях Беларусі, нараджэнне беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. На падставе работ айчынных і замежных аўтараў, апублікаваных і неапублікаваных дакументальных і апавядальных крыніц асвятляюцца механізм далучэння зямель Беларусі да Расійскай імперыі, палітыка да іх расійскага ўрада, роля і значэнне зямель Беларусі ў польскім і рускім апазіцыйных рухах.

Для навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, усіх, хто цікавіцца гісторыяй нашай Бацькаўшчыны.

Бібліягр. 706. Табл. 21.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**

ISBN 985-417-253-8. ©В.В.Швед, 2001

# УВОДЗІНЫ

У вывучэнні гісторыі любой краіны значнае месца займае даследаванне грамадска-палітычнага жыцця: палітыкі ўрада і мясцовых улад, дзейнасці органаў кіравання і суда, ролі адукацыі ў палітычным выхаванні моладзі, падзей рэвалюцыйнага і апазіцыйнага рухаў, дзейнасці патаемных і паўпатаемных таварыстваў, фарміравання самасвядомасці тытульнага народа. Сумесна з вывучэннем эканамічнага і культурнага становішча гэта стварае поўную карціну гістарычнага развіцця дадзенай краіны і дазваляе зрабіць параўнанні з іншымі дзяржавамі.

Праблема даследавання грамадска-палітычнага жыцця на землях Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX стст. (1772—1863 гг.) набыла асаблівую актуальнасць таму, што ў дадзены храналагічны перыяд Беларусь паступова страчвала незалежнасць і ў выніку пазбавілася яе. Яна апынулася паміж намаганнямі расійскага самадзяржаўя і польскіх патрыётаў, а насельніцтва ўцягвалася ў барацьбу за чужыя інтарэсы, страчваючы свой фізічны і разумовы інтэлект, замест таго, каб накіроўваць яго на фарміраванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Сёння незалежная Рэспубліка Беларусь ізноў апынулася паміж Польшчай і Расіяй (Захадам і Усходам), і розныя палітычныя сілы цягнуць беларусаў на свой бок. Гісторыя павінна перасцерагчы іх ад непатрэбных страт і навучыць адстойваць свае асабістыя інтарэсы.

Гістарыяграфічны аналіз паказвае, што комплекснае даследаванне названай праблемы адсутнічае. Не былі аб'ектам вывучэння ў беларускай гістарыяграфіі такія тэмы, як: палітычная роля расійскай і польскай сістэм адукацыі, месца і роля Беларусі ў польскім пытанні, дэпартацыя і ссылка з зямель Беларусі, «польская» палітычная эміграцыя і яе эмісары на землях Беларусі, стварэнне асобнага Літоўскага корпуса як крок да перадачы былых зямель ВКЛ Каралеўству Польскаму, планы адраджэння ВКЛ у 1810—1815 гг. На гэтыя праблемы трэба паглядзець праз прызму беларускасці, бо рускія, савецкія, польскія даследчыкі разглядалі іх са свайго пункту гледжання, часам замоўчваючы сапраўдныя факты і падзеі і ствараючы міфы.

**Гіпотэза** — грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі адбывалася ў трох плынях: польскай, рускай і

ліцвінскай. Першая падтрымлівалася польскім нацыянальна-вызваленчым рухам, другая — рускай урадавай палітыкай і рускім рэвалюцыйным рухам, трэцяя сілкавалася ліцвінскім рухам. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух знаходзіўся ў зародкавым стане, быў «рухам у сабе» і нараджаўся ў барацьбе з польскім і рускім уплывамі.

Пры распрацоўцы дадзенай гіпотэзы вырашаліся наступныя задачы:

·выяўленне механізму падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння зямель Беларусі да Расійскай імперыі;

·вызначэнне перыядаў і характарыстыка эвалюцыі ўрадавай палітыкі ў адносінах да зямель Беларусі;

·даследаванне працэсу ўладкавання агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда;

·высвятленне палітычнай ролі польскай і рускай сістэм адукацыі;

·разгляд галоўнай арганізацыйнай формы грамадска-палітычнага жыцця (патаемныя і паўпатаемныя таварыствы і арганізацыі);

·аналіз дзейнасці «польскай» палітычнай эміграцыі і яе эмісараў на землях Беларусі;

·высвятленне месца і ролі зямель Беларусі ў рэвалюцыйных рухах Расіі і Польшчы;

·характарыстыка першага этапа беларускага нацыянальна-вызваленчага руху (1794—1863 гг.);

·паказ выпрацоўкі асноватворных ідэй і паняццяў грамадзянскай супольнасці ў працэсе грамадска-палітычнага жыцця зямель Беларусі.

Такім чынам, пад тэрмінам «грамадска-палітычнае жыццё» мы разумеем падзеі грамадскага жыцця (палітычныя і непалітычныя), палітыку ўрада, дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і кіравання, дзейнасць патаемных, паўпатаемных арганізацый і грамадзянскіх груповак, палітычную барацьбу, нацыянальна-вызваленчы рух [295, с.8,9,11,12; 323,Т.8,стб.1840; Т.10,стб.997-998,1774;248,с.12-13; 290, с.255]. Такое азначэнне не пярэчыць поглядам, прынятым іншымі сучаснымі даследчыкамі ўзнятых намі праблем: расійскімі [140, с.87—104,208-230], беларускімі [168,с.106,115; 72,с.259; 244, с.280, 288; 159, с.443], польскімі [590,с.28-30, 100-113].

Думаю, што неабходна звярнуць увагу на найбольш важныя палітонімы і этнонімы:

**Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае** (скарочана **ВКЛ, Літва) —** біэтнічная балта-ўсходнеславянская дзяржава з дамінаваннем усходнеславянскага элемента, якая існавала ў XIII — XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Летувы, Беларусі і Украіны (да сакавіка — чэрвеня 1569 г.). Беларуска-Літоўская дзяржава заўсёды мела (нават пасля Люблінскай уніі) суверэнітэт, урад і дзяржаўныя інстытуты ўлады і кіравання (сейм, войска, скарб, Літоўскі трыбунал, адміністрацыйны апарат), сваё заканадаўства (у тым ліку Статут ВКЛ 1588 г.), права эмісіі аднолькавай манеты, сваю дзяржаўную мову (беларускую) [84,187,198]. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай менавіта ВКЛ было далучана да Расійскай імперыі, а не Польшча, як памылкова лічылі дзеячы польскага нацыянальнага руху канца XVIII — першай паловы XIX ст., а пазней пісала большасць польскіх даследчыкаў. Савецкія гісторыкі стварылі міф пра ВКЛ як выключна літоўскую (летувіскую) дзяржаву, каб апраўдаць тры падзелы Рэчы Паспалітай і падаць анексію беларускіх земляў як вызваленне сваіх адзінакроўных славянскіх братоў з-пад літоўскага прыгнёту. Працы М.Ермаловіча, В.Насевіча, А.Краўцэвіча, М.Спірыдонава паспяхова яго абверглі [115,187,246,342].

**Літва —** 1) гісторыка-геаграфічная і этнаграфічная вобласць паўночна-заходняй сучаснай Рэспублікі Беларусь і паўднёва-ўсходняй сучаснай Рэспублікі Летува. У канцы XYIII — першай палове XIX ст. гэтым тэрмінам называлі пераважна Віленскую, Ковенскую, Гродзенскую, а часам і Мінскую губерні; 2) у вузкім сэнсе гэты тэрмін, як і Чорная Русь, ужываўся для назвы гістарычнай вобласці ў басейне верхняга і сярэдняга Нёмана.

**Беларусь (Белая Русь, Беларусія, Беларосія) —** 1) так называлі з канца XVIII ст. да 1880-х гадоў Віцебскую, Магілёўскую, Смаленскую, часам Мінскую губерні. Напрыклад, у знойдзеных намі дакументах, выдадзеных Магілёўскаму каталіцкаму арцыбіскупу Ст.Сестранцэвічу, прыводзяцца два апошнія палітонімы; 2) з апошняга дзесяцігоддзя XIX ст., калі пачаўся беларускі нацыянальны рух, назва гэта стала ўжывацца для вызначэння ўсёй сучаснай тэрыторыі беларускай дзяржавы (поўная афіцыйная яе назва — Рэспубліка Беларусь) [413; 249, ф.2567, воп.1, сп.67, а.20,34,36].

**Паўночна-Заходні край** — заходні рэгіён Расійскай імперыі, які складаўся з часткі былой тэрыторыі ВКЛ, а менавіта з шасці

этнічна беларускіх і літоўскіх губерняў: Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, Віленскай, Ковенскай. У афіцыйным расійскім канцылярскім справаводстве, урадавых дакументах, навуковых даследаваннях таго часу гэта тэрыторыя да сярэдзіны XIX ст. называлася таксама як: «губерні, вернутыя ад Польшчы», «заходнія губерні», «Заходні край», «Літва», «Заходняя Расія», «Заходняя Русь», «Заходнерускі край», «Літоўска-Руская дзяржава». Памылкова лічыцца, што тэрмін «Паўночна-заходні край» стаў ужывацца пасля сенацкага ўказа ад 18 (30) ліпеня 1840 г., калі было забаронена ўжываць назвы «Беларусь» і «Літва». На самай справе, калі звярнуцца непасрэдна да дакумента, дык аказваецца, што ягоны сэнс зусім іншы: забараняліся не тэрміны «Беларусь» і «Літва», а іх прыметнікі: «беларускі» — у дачыненні да Віцебскай і Магілёўскай губерняў і «літоўскі» — адпаведна да Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай.

**Рэч Паспалітая —** федэрацыя дзвюх дзяржаў: Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага (скарочана Літвы) і Каралеўства Польскага (Кароны), утвораная паводле Люблінскай уніі 1569 г. Мэта апошняй — іх зліццё ў адзінае «непадзельнае цела» ніколі не была здзейснена. Нават канстытуцыя 3 мая 1791 г., абвясціўшая ўнітарную краіну, праіснавала толькі да Таргавіцкай канфэдэрацыі 1792 г., якая і адмяніла яе. Гісторык І.Лапа ў сваім даследаванні піша, што Захад успрымаў федэрацыю як Польшчу (Polonia, Pologne, Polen), а ўсходнія суседзі добра ведалі Літву і цвёрда памяталі, што яна — не Польшча: «Пасольскі прыказ, гэта значыць міністэрства замежных спраў старой Масквы, і маскоўскія дыпламаты, так трывала і аддана стаяўшыя на варце інтарэсаў і праў Маскоўскай дзяржавы ў яе знешніх зносінах, заўсёды ведалі і памяталі, што менавіта «Літва» і «літоўскі» вялікі князь былі суседзямі Маскоўскага царства, а зусім не Польшча, і дакладна падзялялі абедзве злучаныя па Люблінскай уніі дзяржавы, вядучы да кожнай з іх і розную палітыку» [198,с.200]. Тры падзелы Рэчы Паспалітай прывялі да канчатковага скасавання федэрацыі, і адраджэнне яе стала мараю, ідэяй польскага нацыянальнага руху канца XVIII — першай паловы XIX ст.

**Літвіны (ліцвіны) —** 1) з XVI да канца XVIII ст. незалежна ад этнасу ці канфесійнай прыналежнасці назва жыхароў Вялікага княства Літоўскага; 2) саманазва насельніцтва Гродзенскага, Ваўкавыскага, Слонімскага, часткова Слуцкага

паветаў; у Віленскай губерні, Мінскім, Дзісенскім, Барысаўскім паветах літвінамі называлі католікаў, а праваслаўных — беларусамі. Жыхароў Белай Русі называлі ліцвінамі — беларусцамі [410]. У 1772 — 1863 гг. адукаваныя, знакамітыя людзі Беларусі карысталіся этнонімам для вызначэння свайго этнасу. Літвінамі лічылі сябе А.Міцкевіч, А.-Т.Касцюшка, бацька Адама Чартарыйскага, прафесар ксёндз Ст.Юндзіл, біскуп Смаленскі і Луцкі, паэт і гісторык А.Нарушэвіч, гісторык І.Лелявель і іншыя. З далучэннем ВКЛ да Расійскай імперыі, скасаваннем Літоўскай, а затым Літоўска-Гродзенскай губерняў, забаронай карыстання назваю «літоўскія губерні» дадзены этнонім траціць сваё колішняе значэнне, але ўзгадваецца нават у канцы XIX — пачатку XX ст. [212].

**Беларусы —** у канцы XVIII ст. гэты этнонім выкарыстоўваўся для назвы насельніцтва ўсходняй часткі ВКЛ, а таксама для вызначэння вернікаў праваслаўнай царквы (таму Магілёўская праваслаўная епархія часта называлася Беларускай). У першай палове XIX ст. так называлі жыхароў Магілёўскай, Віцебскай, Смаленскай і ўсходняй часткі Мінскай губерняў Расійскай імперыі.

Падрыхтоўка маёй працы стала магчымай дзякуючы матэрыяльнай падтрымцы Фонда дапамогі незалежнай літаратуры і навуцы (Парыж) і Фонда Каса імя Юзафа Мяноўскага (Варшава).

# ГЛАВА 1. **КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ І ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД**

## 1.1. **Крыніцы**

Пад **гістарычнай крыніцай** мы разумеем «аб'ект, які ўтрымлівае інфармацыю пра мінулае жыццё людзей і ўключаны ў працэс навуковага вывучэння» [404, с.5]. У аснову сістэматызацыі крыніц нашага даследавання мы паклалі класіфікацыю па праблемах з улікам падзелу крыніц, прапанаваным спецыялістам беларускага крыніцазнаўства С. Ходзіным [404, с.9].

I. Дакументальныя крыніцы:

1) дакументы заканадаўства (помнікі права);
2) актавыя крыніцы (дамоўнага характару);
3) матэрыялы справаводства;
4) статыстычныя матэрыялы.

II. Апавядальныя крыніцы:

1) мемуарная літаратура і эпісталярныя крыніцы;
2) літаратурныя і публіцыстычныя творы.

Спачатку зробім агляд дакументальных і апавядальных крыніц, якія маюць матэрыялы па розных праблемах даследуемых намі тэм. Дакументы заканадаўства сабраны ў Поўным зборы законаў Расійскай імперыі (ПЗЗРІ). Упершыню ён быў надрукаваны ў 1830 г. і меў 45 тамоў [117,с.149]. Намі былі выкарыстаны тыя, у якіх знаходзіліся заканадаўчыя дакументы аб далучэнні Беларусі да Расійскай імперыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні зямель Беларусі, увядзенні губернскай адміністрацыі, функцыянаванні розных органаў кіравання і суда, замене польскай сістэмы адукацыі расійскай [292]. Пра спецыфічнасць і ўнікальнасць дакументаў ПЗЗРІ для вывучэння гісторыі Беларусі XVIII ст. пісаў у сваім артыкуле А.П.Грыцкевіч [83].

Аўтар-складальнік зборніка «Столетний период русского законодательства» [350] у храналагічнай паслядоўнасці, са сваім аналізам і дапаўненнем прыводзіць царскія ўказы па розных галінах жыцця беларускага грамадства: далучэнне заходніх губерняў да Расійскай імперыі; вайна 1812 г.; паўстанне 1830 — 1831 г. і палітычныя падзеі 1830 —1840-х гадоў; канфіскацыя маёмасці і рэлігійныя адносіны (ліквідацыя уніі, праваслаўнае і каталіцкае духавенства).

Дакументальныя крыніцы па шырокаму спектру даследуемых намі праблем апублікаваны ў 3 і 4 тамах «Белоруссии в эпоху феодализма» [39]. Тут змешчаны дакументы з Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў, Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны, НГАБ у Мінску і Гродне. Яны раскрываюць ход падзелаў і далучэння Беларусі да Расійскай імперыі, усталяванне агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, сацыяльна-класавую палітыку царызма на Беларусі, поступ русіфікацыі, палітыку ў галіне адукацыі. Па дакументах можна ўявіць становішча Беларусі ў час вайны 1812 г., грамадскі і рэвалюцыйны рухі на землях Беларусі. Дакументы палітычнага характару падабраны тэндэнцыёзна з мэтаю паказаць добраахвотны ход «воссоединения» Беларусі, станоўчы ўплыў яго на ўсе галіны развіцця беларускага края (эканоміку, культуру, адукацыю).

Польскі прафесар Г.Масціцкі сабраў дакументальныя крыніцы аб палітычных падзеях на літоўскіх і беларускіх землях пасля трох падзелаў і выдаў зборнік «Землі літоўска-рускія пад расійскай акупацыяй». Мы знойдзем у ім матэрыялы аб 1812 г. на тэрыторыі ВКЛ, аб Віленскім універсітэце і створаных студэнцкіх і гімназічных патаемных таварыствах шубраўцаў, філаматаў і сяброў карысных забаў, падзеях 1831 г. у Ашмянах, дзейнасці Ш.Канарскага [698].

Своеасаблівай крыніцай з'яўляецца «жизнеописание» Ф.Я.Міркавіча, складзенае па асабістых яго запісках, успамінах блізкіх асоб і «сапраўдных дакументах» [393]. З 1840 г. ён быў літоўскім генерал-губернатарам, паездзіў па сваіх губернях, і таму сведчанням яго можна давяраць, улічваючы, канешна, суб'ектывізм. Па ўсепадданейшых справаздачах, запісках, рапартах, лістах можна ўявіць сабе атмасферу грамадска-палітычнага жыцця на землях Беларусі 1840-х гадоў. Асабліва звяртаецца ўвага на дзейнасць тут польскіх эмісараў (вынікі справы Ш.Канарскага, Я.Рэр), апісваецца ўплыў еўрапейскіх падзей і «галіцыйскіх сцэн» на «тамошних безрассудных мечтателей» [393,с.309]. Міркавіч прапанаваў Мікалаю I стварыць Брэсцкі кадэцкі корпус з мэтаю русіфікацыі моладзі Беларусі, падтрымаў правядзенне інвентарнай рэформы і вяртанне уніятаў у лона праваслаўнай царквы.

Шэраг актавых крыніц па падзелах Рэчы Паспалітай змешчаны ў «Сборнику грамот и договоров о присоединении царств…»: канвенцыі і трактаты, якія былі заключаны паміж Расіяй, Аўстрыяй, Прусіяй; маніфесты Кацярыны II, акт адрачэння Станіслава Аўгуста Панятоўскага [311]. У зборніку «Начало конца Польши» знаходзяцца «материалы, извлечённые: 1) из Московского Отделения общего архива Главного Штаба, 2) из Военно-Учёного Архива этого же Штаба и 3) из Московского Главного архива МИД и напечатанные штабс-капитаном А.К. Ильенко». Тут ёсць дакументы аб падзеях 1768–1772 гг.: расійскай дапамозе польскім канфедэратам напярэдадні першага падзела РП. Дакументы яскрава сведчаць аб тым, што расійскія вайсковыя часці захапілі землі Беларусі і этнічнай Польшчы [251].

Змястоўныя матэрыялы аб падзелах РП утрымлівае 2 том «Дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі». Тут апублікаваны канвенцыя паміж Аўстрыяй і Расіяй, трактат паміж Расіяй і Каралеўствам Польскім у сувязі з першым падзелам РП, даклад ваеннай калегіі аб неабходнасці пабудовы ваенных крэпасцей на захопленных пасля 1772 г. землях, вытрымка з лістоў Кацярыны II Пацёмкіну ад 25.11.1789 г. аб жаданні «беларуссов прибрать», указ Кацярыны II Сенату ад 13.04.1793 г. аб далучэнні да Расійскай імперыі беларускіх і ўкраінскіх зямель, дэкларацыя 23.XII.1794 г. (3.01.1795 г.) аб падрыхтоўцы Расіяй трэцяга падзела РП, дамова паміж Расіяй, Прусіяй, Аўстрыяй аб трэцім падзеле РП ад 24.10.1795 г. [93]. Частка дакументаў «Хрестоматии по истории Белоруссии» прысвечана другому падзелу РП. З маніфеста Крачэтнікава, напрыклад, відаць яго прычыны – не дапусціць рэвалюцыі і выратаваць хрысціянства ад «бязбоцкіх тэорый» Французскай рэвалюцыі, захаваць свае інтарэсы [406].

Падзелам РП прысвечаны тры польскія выданні мемуараў. Ва «Успамінах з 18 стагоддзя...» апублікаваны дзённік Я.І.Булгакава, паўнамоцнага міністра ў Варшаве (1791 –1792 гг.), і карэспандэнцыя Станіслава Аўгуста Панятоўскага да Кацярыны II, з якіх мы даведваемся пра падзеі 1792 г. на тэрыторыі ВКЛ і жаданні Кацярыны II, каб польскі кароль пераехаў з Варшавы ў Гродна [642]. Аб дзейнасці Барскай канфедэрацыі і ролі караля ўспамінае А.Машчэнскі [638]. Станіслаў Панятоўскі апісвае сустрэчы 1787 г. з аўстрыйскім імператарам Юзэфам II у Херсоне, які ў размове выказаў жаданне вярнуць Польшчы Галіцыю пры ўмове, што Прусія і Расія зробяць тое ж самае [618].

Неапублікаваныя дакументальныя крыніцы знаходзяцца перш усяго ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (далей НГАБ). Так, у фондзе Магілёўскага намесніцкага праўлення [249, ф.2567] захоўваюцца цікавыя справы аб стварэнні Беларускай губерні, аб далучэнні ВКЛ да Расійскай імперыі ВКЛ. У фондах Полацкага намесніцкага праўлення [249, ф.2567] ёсць матэрыялы аб прывядзенні да прысягі на вернасць Кацярыне ІІ памешчыкаў і дваран гэтага намесніцтва. У фондзе Беларускага губернскага праўлення — справы аб адкрыцці Беларускай губерні, уладкаванні межаў паміж Беларуссю, Курляндыяй, Пскоўскай і іншымі губернямі.

У фондзе Тызенгаўзаў Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве (далей ГАСА) захаваўся адказ літоўскіх саноўнікаў на першы падзел Рэчы Паспалітай.

Сярод праблем тэмы «Расійская ўрадавая палітыка на землях Беларусі» найбольш нераспрацаванымі з'яўляюцца ссылка і дэпартацыя. Новыя статыстычныя матэрыялы дапамагаюць паглыбіць нашы веды. М.Ромер апублікаваў спіс сасланых у Сібір у перыяд з 1825 па 1831 г., у якім знаходзім 25 прозвішчаў выхадцаў з зямель Беларусі [656]. У «Именном списке ...» зафіксаваны прозвішчы 192 чалавек, збегшых за мяжу падчас франка-рускай вайны 1812 г. [135]. Спіс сасланых філаматаў і філарэтаў апублікаваў Ф.Вержбоўскі [149]. Аб дэпартацыі уніятак апавядае маці К.Мечыслаўская (расказ занатаваны Кс.Бранікоўскім). Цяжка чытаць, як пакутавалі ад Семашкі і ягоных падручных манашкі-базыльянкі (некаторыя з іх сталага ўзросту) з Мінска, Віцебска і Полацка [693].

Саслоўны характар расійскай палітыкі зафіксавалі дакументальныя крыніцы, якія захаваліся ў НГАБ. У фондзе Віцебскага грамадзянскага губернатара [249, ф.1430] зберагліся справы аб колькасці дваран і складанні спісаў шляхты ў час яе «разбору». У багатым фондзе беларускага генерал-губернатара [249, ф.1297] ёсць звесткі аб колькасці шляхты і памешчыкаў за 1830—1839 гг. па Віцебскай і Магілёўскай губернях, што дазваляе прасачыць вынікі «разбора шляхты». У фондзе Віцебскага губернскага праўлення [249, ф.1416] захаваліся ўказы Сената аб сацыяльным становішчы шляхты, сялян, мяшчан, спісы названых слаёў насельніцтва, перапісы аднадворцаў заходніх губерняў. У фондзе Віцебскага павятовага прадвадзіцеля дваранства [249, ф.2784] ёсць справы аб правілах устанаўлення дваранства.

Ход уладкавання агульнарасійскай сістэмы кіравання і суда бачны з матэрыялаў справаводства, якія надрукаваны ў «Сборнику циркуляров и распоряжений МВД» [315]. У ім апублікаваны распараджэнні, якія датычацца губернатараў і губернскіх праўленняў. У фондзе Віцебскага губернатара НГАБ у Мінску [249, ф.1430] ёсць справы аб зацвярджэнні штатаў канцылярыі губернатара, аб выбарах на розныя пасады. У фондах канцылярыі генерал-губернатара Віцебскага, Магілёўскага, Смаленскага [249, ф.1297] і Магілёўскага крымінальнага і грамадзянскага судоў [249, ф.3213] адкладаліся справы аб адмене Літоўскага Статута і ўвядзенні агульнарасійскага судаводства [249, ф.1297, спр. 5299, 5898, 6024, 6125, 7884], указы Сената аб распаўсюджанні на заходнія губерні агульнарасійскага заканадаўства [249, ф.1297, спр. 11755] і парадка судаводства [249, ф.3213, спр. 126], аб увядзенні ў беларускіх губернях пасады віцэ-губернатара [249, ф.1297, спр. 9828], аб пераўтварэннях губернскіх праўленняў [249, ф.1297, спр. 13511], палажэнне аб парадку дваранскіх сходаў і выбараў [спр. 5508]. Аб скасаванні магістратаў у Віцебскай і Мінскай губернях гавораць справы фондаў адпаведных гарадскіх дум [ф. 2620, с.368; ф.24, с.2009]. У фондзе Ашмянскага павятовага суда знаходзіцца справа за 1840 г. «О распространении влияния российского гражданского законодательства на западные, возвращённые от Польши губернии, и об упразднении межевых судов» [249, ф.585, воп. 1, спр. 159].

Значная колькасць апублікаваных дакументальных крыніц прысвечана развіццю асветы на землях Беларусі. Адным з важных выданняў з'яўляюцца «Материалы для истории просвещения в России», дзе ёсць храналагічны спіс навучальных устаноў з 1824 па 1826 г., дадзеныя па колькасці вучняў [160]. Тры тамы «Сборника материалов для истории просвещения в России» маюць матэрыялы аб вучэбных установах Беларусі ў час да ўтварэння Віленскай навучальнай акругі, а таксама за 1802 —1807 гады. Узяты яны з архіва Міністэрства народнай адукацыі і таму маюць важнае значэнне непасрэднага дакумента эпохі. Матэрыялы паказваюць становішча розных тыпаў навучальных устаноў, колькасць іх і вучняў на адпаведны год, мерапрыемствы ўрада і мясцовых уладаў па развіццю сеткі школаў [313]. «Сборники постановлений по Министерству народного просвещения» прысвечаны перыяду панавання імператараў Аляксандра I, Мікалая I, Аляксандра II і змяшчаюць дакументы заканадаўства са спраў дэпартаментаў народнай

асветы: пастановы паседжанняў камітэта міністраў, загады імператараў, пастановы Сената і іншых органаў улады аб усталяванні народных вучылішчаў, іх штатах, мове навучання, праграмах, статутах навучальных устаноў. Цікава адзначыць, што большая частка матэрыялаў прысвечана часу Аляксандра I і першаму дзесяцігоддзю праўлення Мікалая I. Затым колькасць дакументаў, прысвечаных беларускаму рэгіёну, зменшылася. Гэта, на наш погляд, падкрэслівае ўстанаўленне агульнарасійскай сістэмы адукацыі, дасягненне большай нівеліроўкі вучэбных устаноў Беларусі з велікарасійскімі ўстановамі — выдаваемыя законы распаўсюджваліся на ўсіх, і не было неабходнасці асобнага выдзялення [314].

Польскія публікацыі дакументаў па развіццю адукацыі дапаўняюць расійскія тым, што больш характарызуюць польскую сістэму адукацыі на землях Беларусі. «Рапарты генеральных візітараў» прыводзяць матэрыялы аб становішчы школ ВКЛ у 1782 і 1791-92 гг. [655]. «Пратаколы паседжанняў Адукацыйнай камісіі» расказваюць пра выданне падручнікаў, патрыятычнае выхаванне ў розных тыпах школ на тэрыторыі ВКЛ у 1786 — 1794 гг. [651]. Зборнік «Матэрыялы да падзей літаратуры і асветы», які склаў Т.Туркоўскі, паходзіць з друкарні Віленскага універсітэта Ю.Завадскага: лісты да яго і ад яго, статыстычныя дадзеныя аб дзейнасці друкарні па выхаду ў свет падручнікаў, іх змесце, ёсць тут звесткі аб рознага тыпу школах Віленскай навучальнай акругі, аб неабходнасці выдання нарысаў па польскай гісторыі, праграмах школ [622].

Неапублікаваныя матэрыялы ўносяць новыя звесткі аб паланізацыі і русіфікацыі беларускай моладзі. У фондзе Віцебскага губернатара [249, ф.1430] ёсць справы аб адкрыцці кадэцкага корпуса і настаўніцкай семінарыі ў Полацку. У фондзе Магілёўскага губернатара [249, ф.2001] захавалася перапіска Міністэрства народнай адукацыі з папячыцелем Віленскай навучальнай акругі аб адкрыцці рознага тыпу навучальных устаноў. У фондзе беларускага генерал-губернатара [249, ф.1297] ёсць матэрыялы аб далучэнні Віцебскай і Магілёўскай губерняў да Пецярбургскай навучальнай акругі, што сведчыць аб спробах адарваць беларускую моладзь ад польскага ўплыву і аб узмацненні яе русіфікацыі. У фондзе Мінскага губернскага праўлення захаваліся цікавыя справы аб адкрыцці ў Вільні і Гродне шляхетных пансіёнаў (1831 г.), аб пераўтварэнні прыходскіх вучылішчаў у народныя (1849 г.). У

фондзе Віцебскага павятовага прадвадзіцеля дваранства [249, ф.2784] адкладіся справы аб закрыцці пансіёнаў, якія ўтрымліваліся рымска-каталіцкімі кляштарамі.

Багатыя дакументальныя крыніцы зберагаюцца ў фондзе папячыцеля (апекуна) Беларускай навучальнай акругі [249, ф. 3157, воп. 1—3]: рэестры навучальных дапаможнікаў і падручнікаў, матэрыялы аб набыцці кніг і перыядычных выданняў для школьных бібліятэк, справы аб пераглядзе навучальных праграм, змене польскай сістэмы адукацыі на рускую, аб адкрыцці рознага тыпу навучальных устаноў, а таксама афіцыйныя матэрыялы жыццядзейнасці Беларускай навучальнай акругі (справаводства, перапіска, указы, распараджэнні, агляды навучальных устаноў, іх статуты і палажэнні). Адзначым некалькі цікавых спраў: прашэнне В.Р.Бялінскага і яго рэферат аб навучанні дзяцей акругі рускай мове [воп. 1, спр. 43, а. 213 — 220], аб забароне выкладання польскай мовы ў 1835 г. [воп. 1, спр. 224], аб прызначэнні настаўнікамі ў вучэбныя ўстановы акругі выпускнікоў расійскіх універсітэтаў [воп. 2, спр. 8, 43].

У фондах дырэкцый народных вучылішчаў Мінскай [249, ф. 458], Віцебскай [ф. 2507[ і Магілёўскай губерняў [ф. 2254] знойдзены ведамасці, справаздачы аб становішчы ўстаноў адукацыі за розныя гады, сведчанні аб паспяховасці, паводзінах і здольнасці вучняў, гістарычныя запіскі вучылішчаў, праграмы па прадметах, фармулярныя спісы настаўнікаў і спісы вучняў, фінансавыя паперы, прашэнні настаўнікаў, вучняў і бацькоў, справы аб выдачы пасведчанняў аб заканчэнні навучальных устаноў і інш. Цікавымі, напрыклад, былі матэрыялы аб забароне выкладання польскай мовы, аб літаратурных і чытацкіх размовах, аб выкладанні рускай мовы і славеснасці, аб набыцці для дырэкцыі народных вучылішчаў партрэтаў імператара Аляксандра II.

Даследаваць планы адраджэння ВКЛ і іх рэалізацыю дапамаглі тры апублікаваныя помнікі права — дзве запіскі і праект указа М.К.Агінскага, напісаныя ім у 1811 г. з нагоды стварэння ВКЛ і надрукаваныя А.П.Грыцкевічам на беларускай мове [128]. Пры гэтым унесены недакладнасці ў датах, якія трэба выправіць: запіска пададзена Агінскім 15.(27).05.1811 г., праект указа датуецца 22.10.(3.11).1811 г., а Памятная запіска — 1.12.1811 г.[582,с.27,39]. Польская публікацыя дакументальных крыніц «Дзеі пасля падзелаў Польшчы», складзеная Г.Масціцкім,

ахоплівае 1772 – 1807 гг. і мае матэрыялы аб «пулаўскім плане» А.Чартарыйскага, аб надзеях Напалеона выкарыстаць «польскае пытанне» ў сваіх інтарэсах [636].

Падзеям франка-рускай вайны 1812 г. прысвечаны два вельмі змястоўныя выданні дакументальных крыніц. У 128 томе «Сборника Русского исторического общества» надрукаваны акты, дакументы і матэрыялы, якія датычацца Гродзенскай і Мінскай губерняў: акты Варшаўскай і Літоўскай канфедэрацый; 6 дакументаў аб усталяванні Камісіі Часовага ўрада – 38 яе распараджэнняў па грамадзянскай і 15 – па ваеннай частцы; артыкулы з «Tymczasowa Gazeta Minska» («Часовая Мінская газета») аб падзеях у Мінску з 18.07 па 25.10.1812 г.; дакументы і матэрыялы аб падзеях у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях; гістарычныя запіскі Гродзенскага і Мінскага губернатараў аб становішчы губерняў у 1812 г. Падобнага роду матэрыялы па Магілёўскай губерні знаходзяцца ў 139 томе «Сборника РИО» [4].

Трыццаць сёмы том «Актов, издаваемых Виленской комиссией для разбора древних актов» [6] змяшчае цікавыя дакументы і матэрыялы аб органах кіравання ў занятых французамі губернях, аб беларуска-літоўскім войску, рапарты і прадпісанні мясцовых уладаў Барысаўскага кантону, загады КЧУ ВКЛ і французскіх начальнікаў, розныя ведамасці аб колькасці насельніцтва, жывёлы, хлеба, падводаў, коней. Пятая кніга «Виленского временника» ўтрымлівае дакументальныя крыніцы за перыяд 15.03.1811 – 2.07.1812, снежань 1812 г. – 1813 г.: перапіска, ведамасці, рапарты губернатараў, прапановы літоўскага ваеннага губернатара, прадпісанні галоўнакамандуючых 1-й і 2-й Заходніх армій, з якіх можна даведацца аб эвакуацыі маёмасці, архіваў, казённых грошай з адыходзячымі расійскімі войскамі, аб высылцы неблаганадзейных асоб, аб існаванні ВКЛ 1812 г., аб падрыхтоўцы ў Літве хваляванняў супраць рускага ўрада, аб канфіскацыі маёнткаў і вяртанні дадому эмігрантаў Віленскай і Гродзенскай губерняў, аб стратах гэтых губерняў, а таксама Мінскай губерні і Беластоцкай вобласці [5].

У шматтомным выданні «Внешняя политика России XIX и начала XX века» апублікаваны дакументы, які маюць матэрыялы аб адносінах расійскага ўрада да планаў Напалеона пашырыць Герцагства Варшаўскае і выкарыстаць яго як ваенна-стратэгічны плацдарм для вайны супраць Расіі і Аўстрыі, аб пазіцыях Напалеона, польскіх дзеячоў і Расіі адносна аднаўлення

самастойнай польскай дзяржавы, аб праекце адраджэння ВКЛ М.-К.Агінскага. Асобны шосты том прысвечаны франка-рускай вайне 1812 г. Тут змешчаны матэрыялы, якія адлюстроўваюць ваенна-дыпламатычныя падзеі [55].

Перыяду вайны 1812 г. прысвечана большасць старонак успамінаў князя Е.Сагушкі, які быў ад'ютантам Напалеона пры галоўнай кватэры [658]. Публікатар мемуараў на рускай мове В.І.Харкевіч даў ім наступную характарыстыку: «Прызначаныя аўтарам для яго дзяцей, яны адрозніваюцца безштучнасцю, носяць месцамі характар навучэння і дыхаюць праўдаю» [402,с.672]. Сангушка як ліцвін перш за ўсё звяртае ўвагу на ваенныя падзеі на тэрыторыі ВКЛ, яго становішча, гаворыць аб літоўскім патрыятызме, дае ацэнку адносін Напалеона да польскай справы. Аб польскіх войсках у Навагрудку, фарміраванні войск ВКЛ успамінае Э.Паўловіч [272,644]. Аб паходзе Напалеона на Расію — А. дэ Каленкур [169]. Тут, між іншым, вызначаны беларускія населеныя пункты, у якіх быў Напалеон.

Значныя дакументальныя крыніцы захаваліся ў НГАБ у Мінску [249]. У фондах Віцебскага [ф.1430], Мінскага [ф.295] і Магілёўскага [ф.2001] губернатараў ёсць справы аб забеспячэнні армій абмундзіраваннем, харчаваннем, транспартам. Спісы ўдзельнікаў вайны 1812 г. зберагліся ў фондзе Віцебскага губернскага прадвадзіцеля дваранства [ф.2626]. У Гродзенскім філіяле НГАБ у фондзе канцылярыі гродзенскага грамадзянскага губернатара [250, ф.1] нас зацікавілі справы аб прызыве рэкрутаў у расійскую армію, рапарты паліцэйскіх аб паляках, якія служылі ў французскай арміі, аб колькасці матэрыяльных і чалавечых страт па губерні, пералік месцаў баявых дзеянняў па губерні, пастаўкі харчавання расійскім войскам.

Усяго дзевяць спраў ёсць у фондзе Часовай гродзенскай выканаўчай камісіі Часовага літоўскага ўрада [250, ф. 1168], але яны вельмі каштоўныя сваімі звесткамі аб выбарах органаў самакіравання ў г. Гродне, іх адкрыцці ў павятовых гарадах Гродзенскага дэпартамента [спр. 1,2] і арганізацыі цыркулёвых судоў [спр. 4]. Цікавымі для нас аказаліся Зборнік дакументаў па арганізацыі, гаспадарчых і фінансавых пытаннях камісіі, Кніга рэгістрацыі пастаноў адміністрацыйнай камісіі па збору падаткаў і аб выдатках за час з 1 кастрычніка па 18 снежня 1812 г. [спр. 9].

Недаследаванаю праблемай з'яўляецца стварэнне асобнага Літоўскага корпуса на тэрыторыі Беларусі. У фондзе Мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства [249, ф.320] захаваліся матэрыялы аб забеспячэнні правіянтам войск Літоўскага асобнага корпуса, у сувязі з чым можна даведацца аб яго размеркаванні на тэрыторыі Мінскай губерні. Цікавым для нас быў фонд гродзенскай канцылярыі грамадзянскіх спраў цэсарэвіча-галоўнакамандуючага Літоўскім асобным корпусам [250, ф. 6]. 98% спраў — гэта прашэнні і скаргі сялян, памешчыкаў і гараджан, што пацвярджае, на наш погляд, прызнанне Канстанціна Паўлавіча гаспадаром тэрыторыі, на якой размяркоўваўся Літоўскі асобны корпус, а таксама пэўную накіраванасць палітыкі Аляксандра I, які абяцаў далучыць землі Беларусі да Каралеўства Польскага.

Яшчэ адна маладаследаваная тэма — эміграцыя з зямель Беларусі і дзейнасць тут яе эмісараў. Таму так важна звяртацца да невядомых пакуль мемуарных крыніц. У дзённіку Ш.Канарскага расказваецца аб дзейнасці польскай эміграцыі ў Францыі і яе сувязях з польскімі патрыётамі на тэрыторыі былога ВКЛ [599]. Другі раздзел сваёй «Рукописи в тюрьме» К.Машкоўскі, паплечнік Ф.Савіча, назваў «Нарыс духа Віленскай акадэміі ад яе ўсталявання да 1839 года». Ён прысвечаны стварэнню і дзейнасці Дэмакратычнага таварыства, мае звесткі пра яго сувязі з Ш.Канарскім, ёсць успамін пра адносіны студэнтаў да «Кнігаў пілігрымства польскага народу» А.Міцкевіча [240]. «Заметки Владислава Коссовского», напісаныя па заказу В.Ф. Ратча ў 1865 г., змяшчаюць матэрыял аб польскай эміграцыі напярэдадні 1863 г. [240].

У 2 томе «Избранных произведений прогрессивных польских мыслителей» змешчаны дакументы Дэмакратычнага таварыства (акт заснавання, зварот «Да грамадзян салдатаў!», Маніфест), публіцыстычныя творы («Краткі палітычны катэхізіс» Я.Яноўскага і «Гаранты для простага народа» В.Гельтмана) [134]. Праграма барацьбы польскага народа за сваё вызваленне, напісаная, па адной версіі, «бліжэйшым паплечнікам Касцюшкі (у асноўным яго сакратаром Паўлюкоўскім)» выйшла ўпершыню ў 1800 г. пад назвaю «Могут ли поляки добиться независимости?» [235]. Аўтары звяртаюцца не толькі да карэнных палякаў, але і да палякаў былога ВКЛ, у тым ліку і беларусаў-ліцвінаў.

Несумненную карысць прыносіць зварот да архіваў. У фондзе Віцебскага губернатара НГАБ у Мінску [249, ф.1430] ёсць справы, якія маюць звесткі аб сувязях польскіх эмісараў з Віленскім універсітэтам, аб асобах, якія жадаюць прыняць удзел у еўрапейскіх рэвалюцыях, аб асобах, якія эміфравалі ва Усходнюю Прусію пасля Лістападаўскага паўстання, аб пошуках і затрыманні эмісараў. У Гродзенскім філіяле НГАБ у фондзе Гродзенскага грамадзянскага губернатара [250, ф.1] знойдзены матэрыялы аб падзеях 1848 г. на землях Беларусі: спісы забароненай літаратуры, ведамасці асоб, якія знаходзяцца пад паліцэйскім наглядам, рапарты земскіх спраўнікаў аб палітычным становішчы ў губерні, ведамасці аб справах па выпадках у паветах, справы аб дзейнасці польскага эмісара Рэра, аб рэвалюцыйным сачыненні «Партызанка», аб памешчыках, якія хацелі прыняць удзел у венгерскім паўстанні і г.д.

Часткай праблемы паланізацыі беларускай моладзі з'яўляюцца пытанні аб вучнёўскіх і студэнцкіх гуртках і таварыствах. Вырашаць іх дапамагаюць мемуары іх удзельнікаў. Успаміны М.Чарнецкага з допісамі Т.Зана маюць звесткі аб пачатках дзейнасці патаемных таварыстваў у Віленскім універсітэце. Аўтар — стрыечны брат вядомага этнографа З.Даленгі-Хадакоўскага — прыводзіць пратакол «Таварыства шасці», або «Думаючай моладзі», правіла моладзі, якая належала да арганізацыі «Сяброў прыдатнай забавы», напісанай Чарнецкім і зацверджанай на маёўцы 17 мая 1820 г. у Вільні [564]. Аб разумовай і палітычнай дзейнасці філаматаў і філарэтаў напісаў у сваіх успамінах І.Дамейка [569].

Эпісталярная спадчына філаматаў знаёміць з іх поглядамі, кантактамі, напрамкамі і зместам дзейнасці [598]. Літаратурныя і публіцыстычныя працы А.Міцкевіча, Я.Чачота, Т.Зана і яшчэ сямі філаматаў і філарэтаў, лісты трох названых, якія сабраў у зборнік беларускі даследчык К.Цвірка, таксама паглыбляюць веды аб дзейнасці віленскіх патаемных таварыстваў. Унікальныя дакументы, якія захаваліся ў фондзе Навасільцава Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве, таксама сведчаць аб іх сувязях з патаемнымі арганізацыямі Каралеўства.

Лёс Беларусі ў паўстанні 1794 г. нельга вывучаць без апублікаваных дакументальных крыніц. Публікацыя «Пратаколы дэпутацыі ...» дае нам звесткі аб сувязях Літвы з Каронай Польскай падчас паўстання 1794 г. Са справаводства і карэспандэнцыі Тайнай дэпутацыі бачны спробы праяўлення

ліцвінскага патрыятызму, ваенныя планы паўстанцаў і рускага камандавання, рабаванні рускіх войск на землях Беларусі [668].

У НГАБ у Мінску, у фондах Гродзенскай і Мінскай грамадска-ваеннай парадковай камісій [249, ф.1887, 1889], якія асаблівую актыўнасць праявілі падчас паўстання 1794 г., знаходзяцца справы аб наборы рэкрутаў, арганізацыі паспалітага рушэння, забеспячэнні яго харчаваннем і амуніцыяй.

Новыя крыніцы па масонству, якія ўводзяцца намі ў навуковы зварот, апублікаваныя і неапублікаваныя. З архіва А.Аракчэева нейкі З.Н. апублікаваў запіску С.Ланскога імператару Аляксандру І пад назваю «Аб літоўскіх былых масонскіх ложах». З яе мы даведваемся аб кантактах беларуска-літоўскіх ложаў з братамі Варшавы і Пецярбурга, аб непрыняцці віленскай ложай новай масонскай канстытуцыі, рэфарматарах Я.Шымкевічы і Ю.Мяноўскім, аб працах пасля закрыцця ложаў у 1821 г. [197]. У фондах Мінскага губернатара [249, ф.295] і мінскага прадвадзіцеля дваранства [249, ф.320] захаваліся спісы братоў Слуцкай, Мінскіх, Нясвіжскай масонскіх ложаў. Са спраў відаць іх кантакты з расійскімі і польскімі ложамі. Аб масонах Гродзенскай губерні гавораць справы фонда Гродзенскага губернатара ў НГАБ у Гродне [250, ф.1, воп.1, спр. 912, 2860].

Глыбокай крыніцай, апавядаючай пра рух дзекабрыстаў, з'яўляецца публікацыя архіўных матэрыялаў і дакументаў: «Восстание декабристов. Документы и материалы». У адпаведных тамах знаходзяцца звесткі пра «бабруйскую змову» 1823 г., беларускі след «маскоўскай змовы» 1817 г., аб межах РП і будучай Расійскай імперыі, аб філадэльфійскай арганізацыі ў Літве (паказанні С.Валконскага), аб перамовах паміж дзекабрыстамі і сябрамі Патрыятычнага таварыства, аб месцы Беларусі ў планах дзекабрыстаў [63].

Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў знаходзяцца ў шматлікай мемуарнай спадчыне дзекабрыстаў і сучаснікаў падзей [423, с.125—127; 439]. Гэтыя апавядальныя крыніцы нясуць суб'ектыўную інфармацыю аб знаходжанні сяброў расійскіх дзекабрысцкіх таварыстваў на тэрыторыі Беларусі, дзейнасці тут дзекабрысцкіх арганізацый, аб дзекабрыстах-ураджэнцах і жыхарах зямель Беларусі, ролі і месцы апошніх у тактыцы дзекабрыстаў і ў іх лёсе. Асобна адзначым «Записки» І.Якушкіна, які перадае гарачую атмасферу паседжанняў сяброў Саюза Выратавання падчас абмеркавання «маскоўскай змовы» 1817 г. Ясна відаць, што яна ўзнікае з прычыны намераў

Аляксандра I далучыць былую тэрыторыю ВКЛ да Каралеўства Польскага [536]. У публіцыстычнай працы М.Луніна «Разбор донесения тайной следственной комиссии» ўзгадваюцца перамовы дзекабрыстаў з Патрыятычным таварыствам. Аўтар у той час быў у Варшаве, дзе пазнаёміўся з некаторымі польскімі патрыётамі, таму яго сцвярджэнню, што на перамовах не была дасягнута згода на перадачу беларускіх зямель Польшчы, можна верыць [209]. Гэта пацвярджае і публікацыя «Донесение Варшавского следственного комитета» [102].

Значны масіў архіўных крыніц дэталізуе асобныя праблемы тэмы «Землі Беларусі ў планах дзекабрыстаў і польскіх патаемных таварыстваў». У фондзе Віцебскага губернатара НГАБ у Мінску [249, ф.1430] ёсць справы аб пошуках дзекабрыста В.К.Кюхельбекера і аб лісце М.К.Юшнеўскай да Крулікоўскага. У фондзе беларускага генерал-губернатара [249, ф.1297] захаваліся справы аб будаўніцтве Бабруйскай крэпасці напярэдадні Бабруйскай змовы дзекабрыстаў, аб пошуках Крулікоўскага, аб прашэнні І.Гарбачэўскага — бацькі дзекабрыста. У першым вопісе фонда Мінскага губернскага дваранскага дэпутацкага сходу [249, ф. 319] ёсць генеалагічная кніга на літару В (W), дзе знаходзяцца сведчанні аб родзе Вайніловіча і Вайдзевіча, звязаных з дзекабрыстамі [спр. 23]. У другім вопісе змяшчаюцца матэрыялы аб дваранскім паходжанні Вайніловічаў [спр. 561], Вайдзевічаў [спр. 557], Лапаў [спр. 1724], Пушчыных [спр. 2659], Я. Чачота [спр. 3627].

У Гродзенскім філіяле НГАБ у фондзе гродзенскага губернатара [250, ф.1] таксама ёсць справа аб В.К.Кюхельбекеры, што дае магчымасць скласці больш поўную карціну яго пошуку. Захаваліся справы аб дзейнасці на землях Беларусі патаемных таварыстваў «Заран», «Ваенных сяброў», польскага Патрыятычнага таварыства, затрыманні ў Брэсце «декабриста без декабря» П.Я.Чаадаева.

Беларускія старонкі гісторыі дзекабрысцкага руху адшуканы намі ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве (РДВГА) і Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве (РДГА). У РДВГА [302] матэрыялы выцягнуты з фондаў №№1 [воп. 1; воп. 1, т. 44], 36, 156 [воп. 1], 312 [воп. 1], 395 [воп. 88, 272-277, 312], 735 [воп. 10], 801, 2350 [воп. 1], 3545, 14414 [воп. 1], 16229-16231 [воп.1]. У знойдзеных справах ёсць звесткі аб дзейнасці Таварыства ваенных сяброў, аб яго лідэрах К.Г.Ігельстроме і А.І.Вягеліне, аб паўстанні Літоўскага

піянерскага батальёна, аб «Бабруйскай змове» 1823 г. у Бабруйскай крэпасці і спробе С.П.Трусава падняць тут на паўстанне Паўлоўскі пяхотны полк у лютым 1826 г., аб пошуках В.К. Кюхельбекера.

У РДГА [303] пошукі вяліся ў фондах 303, 735, 878 (С.С.Тацішчава), 925 (Галянішчава-Кутузава-Талстога), 970 (І.П.Карнілава), 1014 (М.П.Паўлава-Сільванскага), 1018 (І.Ф.Паскевіча-Эрыванскага), 1021 (Пероўскіх), 1093 (П.Е.Шчогалева), 1280 (упраўленне каменданта Петрапаўлаўскай крэпасці), 1286 (дэпартамента выканаўчай паліцыі), 1343, 1405, 1409 (Асабістай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі), 1584, 1652 (С.А.Панчулідзева). Тут знайшліся ўспаміны А.Х.Бенкедорфа аб паўстанні і дзекабрыстах, аўтабіяграфічныя запіскі І.П.Карнілава, дзённік К.Ф.Толя, дакументы Вярхоўнага крымінальнага суда [303, ф. 878, воп. 1, с. 85], спісы сасланых у Сібір [303, ф. 1045, воп. 1, с. 36] і на Каўказ [303, ф. 1018, воп. 3, с. 152], афіцыйныя матэрыялы аб арыштах, следстве [303, ф. 1409, воп. 1, с. 1277], знаходжанні зняволеных у Бабруйскай крэпасці, прашэнні сваякоў дзекабрыстаў, рукапісы гісторыкаў П.Е.Шчогалева (аб Бестужавых, І.І.Гарбачэўскім, А.В.Карніловічу) і М.П.Паўлава-Сільванскага, артыкулы С.А.Панчулідзева аб Аляксандры І і дзекабрыстах, справы аб дваранскім паходжанні родаў Ігельстромаў [303, ф. 1343, воп. 22, с. 3438], Войдзевічаў [303, ф. 1343, воп. 18, с. 3248], М. Рукевіча [303, ф. 1343, воп. 28, с. 3315].

Пры даследаванні лёсу Беларусі ў Лістападаўскім паўстанні нельга пакінуць без увагі апублікаваныя ў Польшчы дакументы: акты паўстання [538], дзённікі рэвалюцыйнага сейма [568] і Сената [567], пратаколы паседжанняў Польскага Цэнтральнага Часовага Урада ў Літве [652], збор пастаноў сейма 1831 г. [697]. Змешчаныя тут дакументальныя крыніцы (заклікі, пастановы рэвалюцыйных улад, прамовы паслоў і сенатараў, вайсковыя праекты і планы) нясуць інфармацыю аб вялікай зацікаўленасці польскіх паўстанцкіх урадавых колаў у разгортванні паўстання на землях Беларусі, аб спробах стварэння Літоўскага легіёна, аб удзеле прадстаўнікоў з Беларусі ў паседжанні сейма.

Дакументальныя крыніцы дапаўняюцца мемуарнымі. Ва ўспамінах Э.Паўловіча ёсць матэрыялы аб падзеях 1831 г. на Навагрудчыне. Аб паходзе ў 1831 г. на землі былога ВКЛ узгадваюць Г.Дэмбінскі [566], Д.Хлапоўскі [561], М.Мелжынскі [623]. Дзённік Ш. Канарскага дзень за днём з 5.02.1831 па

18.10.1834 г. перадае падзеі і баі 1831 г. на тэрыторыі Беларусі [599]. Розныя старонкі гісторыі Лістападаўскага паўстання на землях Беларусі і Літвы апісваюць у сваіх успамінах яго ўдзельнікі Ю.Шчапінскі [670], Ф.Вратноўскі [690], Ю.Зенковіч [692], Ю.Клюкоўскі [504], Р.Хомскі [563], Вільчынскі [686] і іншыя [650]. Перапіска Мікалая I з галоўнакамандуючым дзейнічаючай арміі графам Дзібічам-Забалканскім дазваляе паглядзець на паўстанне расійскімі вачыма, пры гэтым параўнаць вынікі баёў ваюючых бакоў, іх планы дзеянняў [57].

Шмат матэрыялаў аб падзеях паўстання 1830-1831 гг. захоўваецца ў Гродзенскім філіяле НГАБ [250]. Яны расказваюць аб забароне зносін паміж насельніцтвам памежных беларуска-польскіх тэрыторый, аб зборы мясцовай уладай зброі ад насельніцтва, аб баявых дзеяннях паўстанцаў і пагроме паўстання, аб рэпрэсіях супраць яго ўдзельнікаў (устанаўленні паліцэйскага нагляду; высылцы ў Сібір; канфіскацыі маёнткаў і г.д.). Самыя розныя матэрыялы пра паўстанне 1830-1831 гг. захаваліся ў фондзе гродзенскай губернскай камісіі для вызначэння ступені віны мяцежнікаў [ф. 4]: аб дзейнасці паўстанцкіх атрадаў і расійскіх вайсковых частак, аб арыштах паўстанцаў і людзей, звязаных з імі, або па падазрэнні ў сувязях з паўстанцамі, рапарты паліцэйскіх і жандармскіх устаноў па пытаннях паўстання, спісы паўстанцаў [воп. 1, спр.57,110,191,192], пратаколы паседжанняў і рашэнні камісіі аб прыцягненні да адказнасці ўдзельнікаў паўстання, справы аб канфіскацыі маёнткаў памешчыкаў-паўстанцаў графа Тышкевіча, Л.Паца, К.Парчэўскага і сотняў іншых. Справаздача аб дзейнасці камісіі таксама знаходзіцца ў фондзе [воп. 1, спр.177].

Дапаўненнем гэтых крыніц могуць быць справы фонду Гродзенскай губернскай ліквідацыйнай камісіі аб справах, якія тычацца канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830-1831 гг. [250, ф. 5]. У архіве захаваліся справы аб канфіскацыі маёнткаў Яўстафія Сапегі, Адама Солтана, Антона Булгарына, Ігнацін Дамейкі, Франца Міцкевіча, Напалеона Орды, Фадзея Тышкевіча, Юзафа Кашыцы, Цітуса Пуслоўскага і іншых удзельнікаў паўстання па Гродзенскай губерні.

Апавядальныя крыніцы, якія маюць матэрыялы па першаму этапу беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, апублікаваны ў «Хрэстаматыі па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі». Убачылі свет успаміны пра двух удзельнікаў тэатральнай трупы В.Дуніна-Марцінкевіча (А.Васільева і

Леўданскім), аб першай пастаноўцы 9.02.1852 г. «Сялянкі», пра забарону выканання яе на беларускай мове [407]. І. Запрудскі апублікаваў два ўрыўкі з кнігі «Рассказы на белорусском наречии», якая выдадзена ў 1863 г. і з'яўляецца цяпер бібліяграфічным рарытэтам. З дзвюх гэтых крыніц бачна, як ішоў працэс фарміравання беларускай самасвядомасці [241].

Беларускі даследчык Г.В.Кісялёў склаў выдатны зборнік дакументаў, якія дапамаглі нам разабрацца ў жыцці і дзейнасці пачынальнікаў новай беларускай літаратуры ў першай палове XIX ст., асабліва ў ацэнцы ролі Я.Баршчэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, А.Вярыгі-Дарэўскага —лідэраў груповак (цэнтраў) станаўлення новай беларускай літаратуры, у высвятленні кантактаў паміж імі [280].

Такім чынам, апублікаваныя і неапублікаваныя крыніцы дазваляюць прааналізаваць грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі пасля іх далучэння да Расійскай імперыі і зрабіць адпаведныя высновы па такіх праблемах, як: эвалюцыя царскай палітыкі ў дачыненні да Беларусі, уладкаванне агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, распаўсюджванне расійскай і польскай адукацыі і іх роля ў русіфікацыі і паланізацыі беларускай моладзі, месца і роля Беларусі ў планах адраджэння РП, дзейнасць «польскай» палітычнай эміграцыі на землях Беларусі, Беларусь у польскім і расійскім апазіцыйным руху (паўстаннях, патаемных таварыствах, масонскіх ложах), першы этап беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

## 1.2. **Гістарыяграфічны агляд**

Агляд літаратуры пачнем з прац канцэптуальнага характару, у якіх вызначаны адносіны аўтара да зямель Беларусі, далучаных да Расійскай імперыі пасля падзелаў РП. Рускія гісторыкі Ф.Е.Еленеў, М.В.Каяловіч, А.Вінаградаў, Г.А.Паўскі, І.І.Лапа спрабавалі даказаць, што Заходняя (ці Паўночна-Заходняя) Русь ніякая не «искони польская па духу и национальности», а спрадвеку руская, бо край гэты насяляюць «миллионы русских граждан» [113,с.79]. Тэрмін «Заходняя Русь» выкарыстоўваўся імі для тэрыторый Літвы і Беларусі. Еленеў пісаў: Кацярына «аднавіла Расію ў тых межах, якія ўказаны ёй боскай воляй, указаны ўсёю нашай гісторыяй, пачынаючы ад святога Уладзіміра і Яраслава І» [113,с.59]. Народ Заходняга края, на яго погляд, не мае нацыянальнага вышэйшага

класа, адарваны ад разумовага і грамадскага руху «сваёй Айчыны». Прычыну гэтага ён бачыць у тым, што «рускае грамадства не зрабіла для гэтага часу (кніга выдадзена ў 1863 г. – *В.Ш.*) нічога для нашага Заходняга краю; гэта краіна была дагэтуль не дачкою, а толькі падчаркай Расіі» [113,с.81].

Найбольш паслядоўным «западно-русистом» быў М.Каяловіч. У адрозненні ад іншых ён вельмі любіў гэты край і з замілаваннем сэрца пісаў аб беларусах: «Гэта старадаўняе племя, якога і паходжанне, і дзяржаўнасць пакрыты цемрай старажытнасці… Але пачніце глядзець на яе хаця б з таго часу, калі шмат чаго відаць ясна, напрыклад, з часу татарскага іга. Вы тады ўбачыце, што і дзяржаўнасць, і грамадскасць тут больш развіты, чым у Маларосіі. Заходнерускае заканадаўства, літаратура, брацтва разгортваюцца тут перш усяго і паказваюць сваю моц» [184,с.23]. Каяловіч спадзяваўся і верыў, «што гэты край годны самага глыбокага вывучэння і рускай навукі, і рускіх людзей, а можа быць, тады яшчэ выявіцца, што ён годны разам з тым і самага глыбокага, брацкага спачування і рускай навукі і рускіх людзей [182, с.154]. Вось гэтага гонару за Беларусь, кахання і абароны ад прыніжэння ў «агульна рускай сям'і» [184, с.17], на жаль, не ўбачыў гродзенскі гісторык В.М.Чарапіца, прысвяціўшы сваю манаграфію Каяловічу і выцягваючы з ягоных прац толькі тыя матэрыялы, якія падмацоўвалі асабістую канцэпцыю сучаснага аб'яднання Беларусі з Расіяй [417].

Вызначаючы этнічныя межы рассялення беларусаў, М.В.Каяловіч задоўга да Я.Карскага ўключыў у іх не толькі землі сучаснай Беларусі, але і частку Віленскай губ., паўночныя раёны Аўгустоўскага і паўднёвыя раёны Сейненскага паветаў Аўгустоўскай губ., заходнюю частку Смаленскай губ. і паўднёвую – Пскоўскай [183,с.95, 98; 182,с.150]. Каяловіч лічыў, што «не ўсялякая народнасць павінна складаць асобную дзяржаву» [183,с.105] і што беларусы, маларосы, вялікаросы – рускія людзі генетычна, матэрыяльна і духоўна. Беларусь, Украіна, Расія – часткі адзінай цывілізацыі, таму пасля падзелаў РП адбылося «аб'яднанне спрадвечных пачаткаў Заходняй і Усходняй Русі» [185,с.301]. «Величайшим благом» Каяловіч лічыў «обрусение» Беларусі: папаўненне радоў адукаваных чыноўнікаў і духоўных асоб за кошт мясцовых рускіх праваслаўных людзей, будаўніцтва праваслаўных храмаў і царкоўна-прыходскіх школ, аднаўленне праваслаўных царкоўных брацтваў, развіццё нацыянальнай свецкай адукацыі [185,с.289-290].

А.Вінаградаў лічыў, што распаўсюджаны погляд рускіх на заходні край як на Польшчу «ўжо не раз саслужыў у іх гісторыі смутную службу і ў той жа час ворагам рускай народнасці і праваслаўя даў зачэпку абвінавачваць нас не толькі ў захопе краю, але як бы і ў прыгнечванні яго «прыродных нацыянальных» памкненняў» [52,с.3]. Адзначым, што наконт нацыянальнага прыгнёту аўтар не памыляецца — ён існаваў на самай справе і захапіў не паноў-палякаў, а ліцвінаў і беларусаў.

І.І.Лапа ў сваёй кнізе «Западная Россия и её соединение с Польшей в их историческом прошлом» адносіў да Заходняй Расіі заходнія губерні Расійскай імперыі, без Каралеўства Польскага і Прыбалтыйскага краю: Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую губерні, а часам і Смаленскую. Ён быў упэўнены, што «будучае Заходняй Русі знаходзілася цалкам у руках рускага ўрада, без таго ці іншага ўплыву грамадства на яго палітыку». Лапа слушна лічыў, што РП — гэта федэратыўны саюз дзвюх дзяржаў: ВКЛ і Польшчы, што ВКЛ ніколі не ўваходзіла ў Польшчу, а польскія патрыёты хочуць уключыць яе ў адраджаемую новую Польшчу «ад мора да мора». Ён звярнуў увагу на паланізацыю пры Паўле І Аляксандры І, з якой пакончыў Мікалай І пасля падаўлення паўстання1830-1831 гг. [198,с.16, 20-21].

У рознай ступені тыя ці іншыя пытанні нашага даследавання ўзнімаліся ў беларускай гістарыяграфіі: у кнігах В.Ю.Ластоўскага [199], У.М.Ігнатоўскага [132,133], У.І.Пічэты [282,283], М.В. Доўнар-Запольскага [103], М.Ільяшэвіча [137]. У асноўным гісторыя Беларусі разглядалася імі з нацыянальных пазіцый і з падкрэсліваннем глыбокіх каранёў беларускай дзяржаўнасці. Супрацьлеглы погляд мелі аўтары падручнікаў «История Белорусской ССР» і «История БССР» [144,145], але на багатай факталогіі часам і яны рабілі даволі слушныя высновы па асобных праблемах палітычнага развіцця зямель Беларусі пасля іх уваходжання ў склад Расійскай імперыі.

Сучасны погляд на гісторыю зямель Беларусі пасля падзелу РП выказалі беларускія гісторыкі А.Кіштымаў і Я.Анішчанка. А.Кіштымаў доказна напісаў у сваім артыкуле «Аб характары становішча Беларусі», што «зводзіць гісторыю Беларусі канца XVIII — пачатку XIX ст. да схемы «Беларусь — калонія» нельга», бо «неўсялякае заваяванне і захоп — каланіяльная экспансія», якая «не існуе ў адрыве ад капіталізму і капіталістычнай сусветнай сістэмы». Аўтар даказвае, што Беларусь не стала

аб'ектам каланіяльнай экспансіі, бо 1) палітыка насаджэння на Беларусі рускага землеўладання поспеху не мела; 2) размяшчэнне асноўнага эканамічнага патэнцыялу ў сельскай мясцовасці з'яўляецца трывалай рысай беларускай эканомікі; 3) «разбор шляхты» супярэчыць метадам класічных каланізатараў, якія імкнуцца захаваць у калоніях мясцовую «туземную» ўладу, каб з яе дапамогай эксплуатаваць пакоранае насельніцтва; 4) праводзілася палітыка ўніфікацыі, збліжэння, зліцця ў адзінае цэлае, а не дзяленне на метраполію і калонію (ураўнанне беларускай шляхты ў правах з рускім дваранствам, скасаванне уніі, русіфікацыя адміністрацыйнага кіравання і адукацыі); 5) рэпрэсіі насілі часовы характар [166].

Я.Анішчанка ў кнізе «Беларусь часоў Кацярыны II» асвяціў старонкі гісторыі беларускіх зямель першага падзелу РП (1772 – 1796 гг.): палітыку царызму ў галіне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання і арганізацыі кіравання і суда, рэгуляванне адносін на вёсцы, аправаслаўленне уніятаў і ўвядзенне мяжы аселасці для яўрэяў. Анішчанка слушна лічыць, што праведзеная царскім урадам вернападданая прысяга «стварыла ідэалагічную падставу для існавання трывалай канцэпцыі аб добраахвотным уз'яднанні Беларусі з Расіяй» [14,с.35].

Некаторыя праблемы, якія ўзнімаюцца ў нашым даследаванні, былі разгледжаны польскімі гісторыкамі Т.Мараўскім [632], У.Касякевічам [601], Г.Масціцкім [633,635], М.Кукелем [605], якія прысвяцілі свае працы польскай гісторыі часоў пасля падзелаў РП. Імі разглядаліся такія пытанні, як: падзелы РП, паўстанні 1794 і 1830 –1831 г., вайна 1812 г. і адносіны Напалеона да Польшчы, развіццё адукацыі, яе ўплыў на фарміраванне патрыятычнай моладзі, дзейнасць польскай эміграцыі, «польскае» пытанне, палітыка расійскіх урадаў у адносінах да Польшчы і Літвы, рэлігійныя справы, арганізацыя і дзейнасць органаў кіравання і суда. Усе польскія гісторыкі падаюць ход гісторыі Польшчы, тэрытарыяльна ахопліваючы землі былога ВКЛ і праз прызму барацьбы за адраджэнне РП у межах 1772 г. Калі яны пішуць пра землі ВКЛ, дык цікавяцца перш за ўсё іх польскасцю. Ад гэтай нацыянальнай пазіцыі не адышлі і сучасныя польскія гісторыкі – Ст.Кіневіч [590], Ю.Кальбушэўскі [595], Р.Ясяніца [586] і іншыя.

Тэма падзелаў РП і ўваходжання зямель Беларусі ў склад Расійскай імперыі стала аб'ектам увагі польскіх, расійскіх і беларускіх гісторыкаў. На рускай мове двума выданнямі

выходзіла кніга польскага гісторыка У.Грабеньскага (У.Смаленскага) «История польского народа». У сёмай главе «Спробы рэформ і падзенне Рэчы Паспалітай» аўтар апісвае палітычныя падзеі часоў падзелаў праз змену форм кіравання РП, яе грамадска-палітычнага ладу. Грабеньскі прытрымліваецца пазіцыі, што падзелы былі захопам з боку трох дзяржаў — Расіі, Аўстрыі, Прусіі (адпаведна з гэтым назвы раздзелаў яго працы — «Русское приобретение» («захват») [77, с.413].

Матэрыялы па рашэнню дысідэнцкага пытання ў РП напярэдадні першага падзелу знаходзім у кнізе польскага даследчыка Ф.Алкара «Князь Рапнін і Польшча...» [538]. Вакол асобы рускага пасла аўтар падае ўсе калізіі расійскай палітыкі ў дачыненні да Польшчы, звяртае ўвагу на ўвод рускіх войск на тэрыторыю РП і на дзейнасць Радомскай канфедэрацыі. Ш.Аскеназы ў другім томе манаграфіі «Два стагоддзі. XVIII і XIX» зрабіў цікавыя параўнанні палітыкі трох захопнікаў на далучаных тэрыторыях [544]. Становішча Літвы і Беларусі падчас падзелаў апісвае ў трэцім томе «Гісторыі ладу Польшчы ў нарысах» Ст.Кутшэба. Землі, якія далучыла Расія (ваяводствы Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае, Мінскае, Брацлаўскае, Навагрудскае, Брэст-Літоўскае), ён называе польскімі [608].

Найбольш грунтоўнай працай аб падзеле з'яўляецца кніга Т.Цэгельскага і Л.Кандзелы «Падзелы Польшчы. 1772 —1793 — 1795». Аб першым падзеле пісаў Т.Цэгельскі, які большую ўвагу надаваў знешнепалітычнаму боку гэтай падзеі: кантакты паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. Ён прыйшоў да высновы, што не Расія з'яўляецца найбольш вінаватай у падзеле РП, а Аўстрыя (ініцыятар) і Прусія (стваральнік планаў падзелу і галоўны архітэктар палітыкі падзелаў). Цэгельскі піша, што ўсе тры краіны высоўвалі адну прычыну сваёй захопніцкай акцыі: умацаванне сваіх межаў падчас грамадзянскай вайны ў РП з мэтаю не даць перарасці ёй у еўрапейскую [560, с.111,115,308]. Кандзела — аўтар раздзела аб другім і трэцім падзеле РП — таксама падрабязна апісвае дыпламатычныя кантакты паміж Расіяй і Прусіяй, стварэнне і дзейнасць Таргавіцкай канфедэрацыі. Ён звяртае ўвагу на тое, што спачатку адбыўся захоп тэрыторый Беларусі, а значна пазней — яго легалізацыя, што ўваходжанне зямель Беларусі ў склад Расійскай імперыі мела для іх вельмі сур'ёзныя вынікі і змяніла ход іх развіцця.

З расійскай гістарыяграфіі падзелаў перш за ўсё трэба назваць працы М.В.Каяловіча, А.Брыкнера, М.Карэева,

М.І.Кастамарава, Ф.М.Уманца. Каяловіч прысвяціў падзелу РП спецыяльную главу (чытанні XV) сваёй папулярнай кнігі «Чтение по истории Западной России». Ён падзяляў гісторыю «русско-польского государства» на дзве часткі: гісторыю руска-польскую і гісторыю народную, заходнерускую. «Шляхецкая Польшча шла на Захад, заходне-рускі народ — да Расіі», — пісаў Каяловіч [185, с. 265]. Сваёй задачай у выкладанні лекцый ён лічыў «паказаць, як адзіны рускі народ падзяліўся на дзьве паловы, усходнюю і заходнюю, і потым злучыўся зноў» [184,с.19]. Прафесар Дэрпскага універсітэта А.Брыкнер у кнізе «История Екатерины II» выказвае думку, што «па сутнасці заваёўніцкая палітыка Расіі прывяла да падзелу Польшчы». Брыкнер не з'яўляецца прыхільнікам ідэі «собирания Руси», падкрэслівае, што пасля першага падзелу Расія «приобрела» менавіта беларускія землі на Дзвіне і Дняпры — гэта мела важнае значэнне для Кацярыны II [47, с.III, 360].

М.Карэеў адной з важных прычын «отторжения русских земель польско-литовского государства к России» лічыў «собирание русских земель» [154,с.178]. Ён падкрэсліў дзве тэндэнцыі ў адносінах Расіі да РП: да XVIII ст. на першым плане было вяртанне «сваёй вотчыны», з часоў Пятра II — уладанне ўсёю Польшчаю [154,с.178]. Унутранымі прычынамі падзення Польшчы сталі, на погляд Карэева, «безнарядье», бяссілле заканадаўчай і разлад выканаўчай улады, прыгнёт сялян і іх абыякавасць да «айчыны», эканамічны заняпад краіны, праследаванне дысідэнтаў, падаўленне разумовага жыцця, каталіцкая рэакцыя і агульнае невуцтва кіруючага класа. Вонкавыя прычыны «ляжалі ў польска-прускіх адносінах, з аднаго боку, і ў польска-рускіх, з другога» [154,с. 380, 382].

Разглядаючы прычыны падзення РП, Кастамараў, у адрозненне ад іншых расійскіх гісторыкаў, пісаў, што «рэспубліканскі лад грамадства не можа быць крыніцаю разбурэння», а прыводзяць да яго іншыя з'явы, якія «супраціўны духу рэспубліканскага праўлення» [177,с. 660 —661]. Ён меў на ўвазе liberum veto, канфедэрацыі, «всё развращающее» рабства сялян. Кастамараў сцвярджаў, што для «простого сельского народа» і значнай часткі гараджан «было ўсё роўна, ці застанецца Польшча, ці Расія заваюе Польшчу, бо існаванне Польшчы не прадстаўляла для іх нічога добрага, і таму хто бы ёю не завалодаў, яму горш быць не магло» [177,с.103]. Але ўсё ж Кастамараў лічыў, што рускі народ у межах РП чакаў свайго збаўлення «з

ляцкай няволі» ад адзінавернай Расіі, і «як страшэнна быў падмануты, паруганы ў сваіх чаканнях гэты бедны народ, даўні пакутнік! Расія пакінула яго пад ярмом тых жа самых паноў-ляхаў, якіх ён ненавідзеў і ад якіх шукаў выратавання» [177, с. 668].

Цікавы погляд на падзелы меў Ф.М.Уманец. У сваёй кнізе «Вырождение Польши» ён пісаў: «Самую вялікую з нашых памылак складае падзел Польшчы. Гэта не значыць, што зліквідаванне Польшчы было само па сабе памылкаю. Памылка заключаецца менавіта ў тым, што гэта ліквідацыя адбылася шляхам падзелу паміж трыма дзяржавамі, а не далучэннем адной краіны да другой. Злучэнне ўсёй Польшчы з Расіяй было даўно «прадвызначана ў розумах рускіх і палякаў XVI і XVII ст.ст.». Гэта прывяло да таго, што народ Польшчы пакутуе ад падзелу. «Можа быць, — пісаў Уманец, — гэтая ўзмацняючая пакута не больш, як аптычны абман, ні што іншае, як плач дзіцяці над зламанай цацкай, але яно — у прыродзе чалавека» [387, с. XLVIII, XLIX].

У беларускай гістарыяграфіі спецыяльнага манаграфічнага даследавання падзелаў няма. У асноўным погляды на гэтую праблему выказваліся ў кнігах агульнага характару, падручніках або артыкулах. Дадзім некаторым з іх ацэнку. У.Ігнатоўскі ў «Гісторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.» пісаў пра інкарпрацыю Беларусі ў Расійскую імперыю. «Вышла так, - сцвярджаў ён, — што з адной ужо раскіданай дзяржавы яна ўвайшла ў другую, якая таксама не магла пахваліцца сваім здароўем… Вялікае тэрытарыяльна і багатае прыроднымі багаццямі гаспадарства задыхаецца эканамічна, а разам з тым і палітычна. Вось у гэтую затхлую атмасферу гнілога вялікага арганізма пападае і Беларусь» [133,с.7]. І далей: «Вызваліўшыся з пут клерыкальна-шляхецкай рэспублікі, Беларусь апынулася ў ланцугах панска-дваранскага, царскага абсалютызму» [133, с.12]. В.Ластоўскі ў «Кароткай гісторыі Беларусі» сцвярджаў, што Расія не кіравалася пачуццём «племянной еднасці з беларусамі», «тут а ні племянное, а ні нацыянальнае, а ні, нават, рэлігійнае пачуццё не мела ніякай вагі, «прылучэнне («воссоединение») беларускіх зямель мела толькі палітычны характар» [199, с. 90, 93].

С.Таляронак у двух артыкулах гаворыць, што Беларусь не ўз'ядналася з Расіяй, а была да яе далучана» [366, с.11]. Ён пералічыў колькасць і катэгорыі далучанага да «імперыі Раманавых» насельніцтва, указаў на дапамогу Расіі Станіславу

Аўгусту Панятоўскаму пры выбарах на польскі прастол (памылкова выкарыстоўвае тытул «кароль РП», які ў сапраўднасці не існаваў), апісвае цяжкі шлях вырашэння дысідэнцкага пытання і дзейнасць розных канфедэрацый [366, 367].

Падзелам прысвечаны два артыкулы А.Філатавай [398, 399]. У іх адзначаны ўсе найбольш важныя моманты трох падзелаў РП, пачынаючы ад выбару Кацярынай II на польскі трон у 1763 г. Станіслава Аўгуста Панятоўскага да адрачэння яго ў 1795 г.: стварэнне канфедэрацый, інтэрвенцыя рускіх войск, месца баёў на тэрыторыі ВКЛ, праекты падзелаў, іх юрыдычнае замацаванне. Аўтар звяртае ўвагу на тое, што планы падзелаў існавалі ў Расіі, Прусіі і Аўстрыі яшчэ да арганізацыі канфедэрацыі, што захопы зямель пачыналіся да іх юрыдычнага афармлення, а ў час іх адбывалася акупацыя «сваіх» тэрыторый. Нельга не пагадзіцца з высновай Філатавай: «Расія, Аўстрыя, Прусія скарысталі правы моцнага суседа супраць слабейшага. Але і Рэч Паспалітая не цуралася такіх метадаў, калі была моцнай дзяржавай і неаднаразова ў пачатку XVII ст. спрабавала захапіць маскоўскі трон, пасадзіўшы на яго спачатку Лжэдзімітрыя I, а потым Лжэдзімітрыя II. І ніхто не цікавіўся народамі, якія жылі на гэтай зямлі: у выніку ваенных дзеянняў пераходзілі ад адной дзяржавы да другой» [399,с.116].

З нагоды юбілеяў (2000-годдзя трэцяга і 225-годдзя першага падзелу РП) выйшлі два газетныя артыкулы У.Арлова [22, 23]. Іх танальнасць зададзена сучасным палітычным становішчам Беларусі: аўтар звяртае ўвагу на адмоўныя вынікі далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. На жаль, Арлоў паўтарае памылковыя штампы аб забароне ў 1840 г. назвы «Беларусь» і ўвядзенні «Северо-Западный край», аб «нямым» Гродзенскім сейме 1793 г. (бо было толькі адно нямое паседжанне). Думаю, нельга пагадзіцца і з яго сцвярджэннем, што «Беларусь на два стагоддзі зрабілася калоніяй» [23, с.3].

Падрабязнасцям першага падзелу прысвяціў адзін з раздзелаў сваёй працы «Беларусь часоў Кацярыны II» Я.Анішчанка [14]. Як і ў артыкуле «Канец прахаднога двара», дзе апавядаецца аб другім і трэцім падзеле [10], ён сцвярджае, што Расія захапіла тэрыторыю Беларусі, і ніякага добраахвотнага далучэння да Расіі не было. М.Сільчанка і І.Басюк у кнізе «Беларуская дзяржаўнасць» адзначылі выкарыстанне «справы аб дысідэнтах» у замежнай палітыцы Расійскай імперыі, слушна ўказалі на адмоўную ролю шляхецкіх канфедэрацый і рокашаў

у вырашэнні лёсу польскай дзяржаўнасці, бо «гэтае выключае права шляхты і было ўзята на ўзбраенне суседнімі дзяржавамі» [322,с.161]. Аднак яны памыляюцца, калі пішуць, што Станіслаў Аўгуст Панятоўскі пасля ўзяцця А.Суворавым Варшавы адрокся ад прастола і пераехаў у Гродна [322, с. 171]. Менавіта тут 25.11.1795 г. адбылося адрачэнне караля [423, с. 107].

Такім чынам, у літаратуры па праблемах падзелаў РП не быў выяўлены механізм далучэння зямель Беларусі да Расійскай імперыі, не акрэслены наступствы іх інкарпарацыі, не выяўлены характар сувязі Беларусі з Расійскай імперыяй.

Эвалюцыя палітыкі царызму ў адносінах да зямель Беларусі была прадметам даследавання рускіх гісторыкаў. А.М.Пыпін расказаў аб дзейнасці Расійскага біблейскага таварыства, у лёсе якога «выказалася столькі розных бакоў рускага грамадскага жыцця» [298,№12,с.758]. А.А.Плансон напісаў сваю брашуру «Последнее слово о польском вопросе в России» з мэтаю «падрабязна разгледзець усе крыніцы, з якіх паланізм чэрпае свае сілы» [285, с.5]. Ён убачыў іх у дзейнасці каталіцкай царквы («хранилище полонизма»), сувязях праваслаўнага духавенства з паланістамі, удзеле палякаў («этих рыцарей «свентой справы»), у складзе розных адукацыйных саветаў, апецы палякамі вышэйшых рускіх саноўнікаў («которые корчат из себя либералов»), у слабым насаджэнні рускага элемента (праваслаўных святароў і чыноўнікаў з карэнных рускіх) [285,с.11, 28,32].

М.В.Каяловіч у кнізе «История русского самосознания» абвінаваціў урад Кацярыны ІІ у тым, што ён «далучыў да сябе частку Беларусі, дазволіўшы Прусіі і Аўстрыі ўзяць дарма багатыя правінцыі з захада і паўднёва-захада», што дазволіў езуітам застацца і пакінуў у іх руках выхаванне людзей, што забараніў западнарусам «кінуць сілай навязаную ўнію і вярнуцца ў праваслаўе» [181, с.384—386]. А.А.Вінаградаў у «Кратком историческом очерке о деяниях в северо-западном крае императрицы Екатерины ІІ» піша, што палітыка Кацярыны ІІ на «исконно русской области», вернутай пасля падзелаў РП, была накіравана на «матэрыяльнае паляпшэнне народнага быта і забяспячэнне ягонай вольнасці» [53, с.149]. У.Студніцкі сярод метадаў «обрусения» называе адкрыццё расійскіх вучэбных устаноў і земляробчую каланізацыю зямель Беларусі [351].

У кнізе «Русская политика…» А.Карнілава апісаны меры, якія праводзіліся ўрадам Расіі, Прусіі, Аўстрыі для інкарпарацыі захопленых тэрыторый. На іх падставе мы можам зрабіць

высновы, што для палякаў Беларусі царская палітыка была негоршай, чым палітыка Прусіі і Аўстрыі для палякаў, якія апынуліся ў іх складзе. Фрагментарна апісваецца роля А.Чартарыйскага ў паланізацыі Беларусі, указваюцца намеры Аляксандра I вярнуць заходнія губерні Польшчы і рэакцыя на гэта розных колаў рускага грамадства, расказваецца аб дзейнасці Заходняга камітэта, стварэнні асобнага Літоўскага корпуса [173]. У кнізе М.Любаўскага «Основные моменты истории Белоруссии» падкрэсліваецца, што Павел I і Аляксандр I прытрымліваліся «полонофильской» палітыкі, што апошні не быў супраць далучэння зямель Беларусі да Польшчы, а Мікалай I пасля паўстання 1830—1831 гг. імкнуўся зрабіць далучаны край рускім, але «рабіў ён усё гэта груба і ў вышэйшай ступені няўмела»: скасаваў унію, зачыніў Віленскі універсітэт, саслаў у Сібір паўстанцаў з польскіх землеўладальнікаў [216, с.21].

З прац польскіх даследчыкаў трэба назваць кнігу Ш.Аскеназы «Два стагоддзі. XVIII і XIX», дзе ён выказаў думку пра наяўнасць двух падыходаў Аляксандра I да розных зямель Беларусі: адзін да пяці заходніх губерняў разам з Беластоцкай вобласцю, другі — да трох паўднёвых губерняў (Кіеўскай, Віцебскай, Магілёўскай). Адсюль вынікаў і розны іх лёс: першых цар планаваў далучыць да Каралеўства Польскага (таму тут дапускалася «польскасць»), другіх — цалкам зніталаваць з Расійскай імперыяй (адсюль палітыка русіфікацыі). У гэтай сувязі Аскеназы піша аб стварэнні асобнага Літоўскага корпуса на тэрыторыі пяці заходніх губерняў, перамовах дзекабрыстаў з сябрамі Патрыятычнага таварыства ў 1824 г. [544]. Магчымасць параўнаць палітыку ўрадаў-захопнікаў на сваіх «тэрытарыяльных набытках» у галінах адміністрацыі, адукацыі і культуры дае ўзгаданая раней кніга У.Грабенскага «История польского народа» [77]. У шэрагу артыкулаў «Як царызм знішчаў польскасць» Я.Саруш паказаў як царскі ўрад скасаваў польскасць на Беларусі метадамі секвестра маёнткаў, дэпартацыі насельніцтва, русіфікацыі адукацыі і культуры, праследвання ўніятаў, перадачы улады на месцах рускаму чынавенству і распаўсюджвання рускай мовы. Звяртаецца ўвага на спробы царызма раз’яднаць шляхту з сялянствам [659].

Даволі багата беларуская гістарыяграфія палітыкі царызму ў Беларусі. В.Ластоўскі ў «Кароткай гісторыі Беларусі» пісаў, што «царыца Кацярына II лічыла ўсю шляхту польскай, а беларускі народ чыста расійскім, такім самым, якім ёсць

расейскі народ у Маскоўскай або Тульскай губерні...». Пералічваючы меры царскага ўрада па «обрусению» беларусаў, ён сцвярджае, што гэта супярэчыць ягоным жа заявам аб тым, што на землях Беларусі жыве «чыста рускі» народ. В.Ластоўскі звярнуў увагу на Літоўскі статут, на тое, што польская шляхта засталася такой жа, як была ў часы РП, а беларускі народ, нават праваслаўны, трапіў пад узмацнёную паншчыну [199,с.90—94,97]. Апошні тэзіс падтрымліваў і У.М. Ігнатоўскі ў «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі» [133] і «Гісторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX стагоддзя» [132]. Ён сцвярджаў, што шляхта не страціла прыгоннага права на сялян, якія зрабіліся рабочым «скотом», а сама між тым пазбавілася ад «моцных рэфармістых, якія з'явіліся ў канцы XVIII ст. у Польшчы». Мяшчане, па яго словах, «былі прыроўнены да сялян» і пазбаўлены магдэбургскага права. У нацыянальнай палітыцы Ігнатоўскі заўважыў русіфікацыю, наступ якой быў пасля 1830 —1831 гг. [133,с.166, 167].

У працах У.І.Пічэты («История беларусского народа», «Основные моменты») адзначаецца «асцярожная і эластычная» палітыка Кацярыны II і Паўла I у адносінах да польскай шляхты. З аднаго боку, прысяга расійскаму цару і канфіскацыя маёнткаў, з другога — «Даравальная грамата дваранству». У зямельнай палітыцы Пічэта звярнуў увагу на раздачу беларускіх зямель расійскім дваранам, у заканадаўчай — на захаванне пры Кацярыне II мясцовых судоў. Прыводзіцца цікавы факт хадайніцтва беларускай шляхты ў Паўла I аб змяненні напрамка рускай палітыкі ў адносінах да далучаных зямель (спрэчным з'яўляецца сцвярджэнне Пічэты аб тым, што толькі з часоў Мікалая I рускі ўрад стаў на шлях русіфікацыі краю ў мэтах вызвалення яго ад польскага і яўрэйскага ўплываў» [282, с. 52, 54].

Значную ўвагу надаваў палітыцы царызму ў дзвюх сваіх кнігах М.В.Доўнар-Запольскі. Ён слушна пісаў: «Расійскі ўрад бадай да 60-х гадоў мінулага стагоддзя, — значыць да губэрнатарства М.-Н.Мураўёва, кепска разумеў, што ён мае дзела з Беларускім краем». Адсюль дапушчэнне ў пачатку расійскага панавання на Беларусі паланізацыі насельніцтва. Барацьбу з пануючым становішчам апалячанай шляхты царызм, на думку Доўнар-Запольскага, вёў «няўдала, груба, без ніякай сістэмы», праводзімыя меры былі «выпадковымі і непланамернымі» [103, с.13]. Кацярына II вельмі лагодна ставілася да шляхецкіх правоў. «...Руская палітыка на Беларусі, — заўважаў Доўнар-Запольскі, — прыняла той накірунак, якога яна трымалася больш

за 100 гадоў, менавіта: абарона вышэйшага саслоўнага элемента, маёмнага класа ўвогуле на шкоду сялянскаму беларускаму элементу» [104, с.248]. Адносна заканадаўчай галіны аўтар заўважыў: «Ужо за Кацярынай II пачалі заводзіць у Беларусі расейскі дзяржаўны лад і расейскія законы», а з 1840 г. пачынаецца «аканчацельная перастройка суда і ўпраўленьня на расейскі капыл» [103, с.13].

Адміністрацыйная палітыка заключалася ва ўвядзенні губернскага кіравання згодна з рэформай 1775 г., ліквідацыі былога гарадскога самакіравання. Гісторык вызначае асаблівасці заканадаўчай палітыкі пры розных імператарах і ўказвае на «прамежкавы стан паміж перыядам увядзення рускіх установ і канчатковай ліквідацыяй мясцовых». У адукацыйнай палітыцы ён бачыць перыяд паланізацыі пры А.Чартарыйскім, калі «рускі ўрад не разбіраўся ў становішчы спраў. Не разумеў ён і таго, што гэта вядзе да ўскладненняў, і, вядома, не ўсведамляў, што яго няўвага прыгнятае слабейшыя нацыянальнасці». Змена курсу адбылася пасля выкрыцця патаемных таварыстваў у Віленскім універсітэце, а затым пасля паўстання 1830 – 1831 гг. Пры Мікалаі I таксама не лічыліся з карэнным беларускім і літоўскім насельніцтвам. У барацьбе з навучальнымі ўстановамі, дзе панаваў «польскі дух», ствараліся сярэднія школы «ў рускім духу» згодна з увараўскай ідэяй зліцця «варожага пачатка з адпаведнай перавагай рускага». Паступова скарачалася ўжыванне ў навучальным працэсе польскай мовы, але ў часы Аляксандра II ізноў пачаліся «палёгкі на карысць польскага элемента на Беларусі», што прывяло, на думку Доўнар-Запольскага, да паўстання 1863 г. [103, с.13; 104, с.247, 261, 264,268-273].

У 1929 г. была апублікавана кніга А.Цьвікевіча аб «западноруссизме». Аўтар не мог абысціся без аналізу палітыкі царызму, бо расказваў пра «тую плынь у гісторыі грамадзкай думкі на Беларусі, якая лічыла, што Беларусь не зьяўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і нямае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіцьцё, але што яна зьяўляецца культурна і дзяржаўна часткай Расіі...». Найбольшую ўвагу надаў Цьвікевіч палітыцы русіфікацыі, якая пачалася з Кацярыны II. Яна праводзілася праз адукацыю, рэлігійную, зямельную, саслоўную палітыку ўрада. Створанаму «Западному комитету» была пастаўлена мэта зраўняць заходнія губерні з велікарускімі [414,с.7–15].

У 1933 г. у Вільні апублікавана (адзіная і на сённяшні дзень) брашура, прысвечаная менавіта расійскай палітыцы на далучаных беларускіх землях. Аўтар яе, М.Ільяшэвіч, асноўную ўвагу затрымаў на адміністрацыйнай і рэлігійнай палітыцы царызму, а таксама на адносінах яго да сялянства ў час панавання Кацярыны II і Паўла I. Па адукацыйнай, заканадаўчай палітыцы і адносінах расійскага ўрада да шляхты Ільяшэвіч вызначыў толькі напрамкі дзейнасці, бо, як ён сам адзначыў «з прычыны недахопу мейсца тут змешчаны толькі адрыўкі з больш абшырнае і ўсебаковае працы на гэту тэму». Ільяшэвіч лічыў, што «адміністрацыйныя перабудовы на забраных беларуска-літоўскіх землях адбываліся з большымі ці меншымі перарывамі стала. Тэрыторыя першага падзелу была для Кацярыны II мейсцам эксперамэнту ў галіне адміністрацыйнага законадаўства». Мелася на ўвазе ўвядзенне губернскага кіравання згодна з «Учреждением» 1775 г. [137, с. 3, 9–12, 16].

У 1954 г. убачыла свет акадэмічнае выданне «История Белорусской ССР», у якім пытанням царскай палітыкі прысвечаны часткова першы параграф IX главы і асобны 6 параграф X главы. Асноўны змест і напрамкі палітыкі паказаны дакладна: падкрэслены класавы характар — абарона інтарэсаў феадалаў, нягледзячы на этнічнае паходжанне, але рашучае падаўленне выступленняў шляхты супраць рускага ўрада; спробы аблягчэння становішча сялян (люстрацыя, інвентарная рэформа); дазвол адпраўлення каталіцкіх абрадаў, але падпарадкаванне каталіцкай царквы дзяржаве; пазбаўленне мяшчанства былога самакіравання; паступовае ўвядзенне расійскага адміністрацыйнага кіравання і судаводства; уладкаванне расійскай сістэмы адукацыі; кантроль за друкам і распаўсюджваннем кніг. На наш погляд, аўтары дадзенага матэрыяла В.В.Чапко і М.П.Баранава памыляюцца, гаворачы пра «воссоединение» Беларусі з Расіяй, якое з радасцю вітала беларускае насельніцтва, бо факты, нават якія яны прыводзяць, не пацвярждаюць гэта. Не была Беларусь і «окраиной царской России», не забараняў Мікалай I выкарыстоўваць тэрмін «Беларусь» [144, с.145–147,249–257,266–267]. Амаль тое ж самае прыводзіцца ў навучальным дапаможніку «История БССР», выдадзеным у БДУ ў 1981 г. Аўтарам яго была В.В.Чапко. Новым палажэннем стала сцвярджэнне аб рэзультатыўнасці палітыкі ўрада, накіраванай на падзел польскага дваранства [145,с.158–169,191–193].

Новым этапам у беларускай гістарыяграфіі стаў выхад «Нарысаў гісторыі Беларусі». Раздзел аб палітычным і сацыяльна-эканамічным становішчы Беларусі напісаў Я.Анішчанка, а аб культуры — С.А.Кузняева. На добрым фактaлагічным матэрыяле Анішчанка даказаў прадвaранскую сутнасць палітыкі царызму, звярнуў увагу на насаджэнне рускага землеўладання, на выкарыстоўванне царызмам саслоўных супярэчнасцей ва ўласных мэтах, упершыню расказаў аб органах кіравання губернатара і генерал-губернатара, напісаў пра асобны Літоўскі корпус, змену палітыкі царызму пасля 1812 г., арганізацыю ваенных пасяленняў. Кузняева выявіла моцны рускі ўплыў на культурнае жыццё Беларусі, паказала, што барацьба супраць польскага ўплыву не ставіла мэты «стварэння спрыяльных умоў для развіцця беларускай культуры», адзначыла, што «царызм насаджаў тут моцны адміністрацыйны і паліцэйскі нагляд за культурнымі ўстановамі..» [244, с. 267—280, 296-297].

У 1990-я гады выдадзены шэраг прац па асобных галінах і праблемах палітыкі царызма на Беларусі. Паланізатарскім планам кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі прысвечаны артыкул С.В.Таляронка. Ён слушна заўважае, што «як і польскія нацыяналісты, царскі ўрад не прызнаваў нацыянальны воблік беларускага народу, самабытнасць яго культурнага жыцця». Каб аслабіць палітычную ролю польскай шляхты ў Беларусі, праводзілася рэформа адукацыі 1804 г. [354, с.576-580]. Аб паланізацыі і русіфікацыі напісала артыкул А.Філатава. Яна заўважыла, што паланізацыя беларускага насельніцтва адбывалася ў XVII — XVIII стст., а не пачалася пры Аляксандры I. Што тычыцца русіфікацыі, дык у канцы XVIII ст. Расія не мела «дастатковай сілы для правядзення жорсткай, сістэматычнай палітыкі русіфікацыі», а пачалася яна мэтанакіравана толькі пасля задушэння паўстання 1863 г. [360,с.131-132]. Русіфікацыя стала аб'ектам даследавання Л.Лыча ў шэрагу артыкулаў, змешчаных у газеце «Народная воля». У іх ён паказаў, што русіфікацыя беларускага насельніцтва адбывалася праз распаўсюджванне рускай сістэмы адукацыі, праз ліквідацыю уніяцтва і ўмацаванне праваслаўнай царквы, праз усталяванне рускага справаводства і рускай мовы ў ім. Мы не можам пагадзіцца з тэрмінам «Паўночна — Заходні край» для часоў Мікалая I, бо знойдзеныя намі архіўныя крыніцы не пацвярждаюць гэта. Не зусім дакладна гаворыць Лыч пра

адносіны дзекабрыстаў да Беларусі: пазіцыя П.Песцеля даецца толькі па «Рускай Праўдзе», а замоўчваецца згода Паўднёвага таварыства на народны плебісцыт на беларускіх землях; па праекту М.Мураўёва таксама не названа Заходняя дзяржава, у якую ўвайшла бы Гродзенская губерня [214, 3, 4, 7.09.1999].

Карані русіфікацыі і некаторыя яе напрамкі вызначыў у артыкуле «Пачаткі татальнай русіфікацыі» Я.Анішчанка. У саслоўнай палітыцы ён паказаў адносіны царскага ўрада да сялян, у заканадаўчай — змяненні ў дзейнасці Статута, у судовай — перамены ў дзейнасці судовых устаноў, у адміністрацыйнай — спробы замены чыноўнікаў польскага паходжання рускімі, у зямельнай — укараненне рускага землеўладання [15]. У артыкуле пра М.М.Мураўёва гродзенскія гісторыкі С.В.Токць і Д.У.Караў прыводзяць прынцыпы палітыкі царызму на беларускіх землях: уніфікацыя, бюракратызацыя, русіфікацыя і сцвярждаюць, што за дасягненне гэтай мэты «царызм павінен быў лічыцца з рэальнай палітычнай сітуацыяй і размеркаваннем сіл на міжнароднай арэне» [375, с.587]. Зборнік навуковых прац, прысвечаных нацыянальнай палітыцы расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзяў, выдаў (пад агульнай рэдакцыяй А.М.Лютага) у 1995 г. Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт. Цікавыя, на мой погляд, артыкулы пра адносіны царызма да рускіх (С.Д.Жмуроўскага), да польскага насельніцтва (М.У.Смяховіч), да дробнай шляхты (Г.М.Туміловіч). Жмуроўскі адзначыў сувязь нацыянальнай палітыкі з сацыяльна-эканамічнай, «адсутнасць у царызма ў пазямельнай палітыцы якога-небудзь прынцыпу нацыянальнага характару», папярэджвае пра неабходнасць улічваць «фактычную рэалізацыю праяўлення палітыкі царызму». Але мы не згодныя з сцвярджэннем Жмуроўскага, што «тэрміналагічна мэтазгодна гаварыць, адносна храналагічнага адрэзка, аб Паўночна-Заходнім краі, беларускіх губернях...» [118, с.57].

Палітыку расійскага самадзяржаўя ў адносінах да дваранства Беларусі разгледзелі Г.Туміловіч і С.Лугаўцова. Першая слушна пісала: «…Ёсць адна асаблівасць, якая характарызуе адносіны ўсіх прадстаўнікоў вярхоўнай улады да данай тэрыторыі (Беларусі. —*В.Ш.*) — гэта адчуванне свайго законнага панавання над ёю» [380, с.12]. Мы не можам пагадзіцца са сцвярджэннем Туміловіч, што для Кацярыны II характэрна «імкненне уніфікаваць ва ўсім становішча беларускіх зямель з агульнарасійскімі», бо для яе больш

падыходзіць тое, што аўтар прыпісвае Аляксандру I — спробы «спалучаць дзейнасць мясцовых парадкаў з агульнарасійскімі пастановамі» [380, с.11]. С.Лугаўцова разглядае палітыку царызма ў адносінах да дваранства Беларусі ў рэчышчы агульнарасійскай палітыкі. Яна справядліва выдзяляе два этапы: да і пасля паўстання 1830-1831 гг. і засяроджвае ўвагу на заканадаўстве аб дваранскіх выбарах, на палітыцы царскага ўрада ў адносінах да ўдзельнікаў паўстання і сяброў патаемных таварыстваў, на разбор шляхты. Такім чынам, Лугаўцова чамусьці звярнула большую ўвагу на надзвычайныя, а не на нармальныя з'явы жыцця шляхты (не даследавана зямельная, адукацыйная, рэлігійная, вайсковая палітыка самадзяржаўя ў адносінах да шляхты). Блытае яна тэрміны «шляхта» і «дваранства», бо апошні падыходзіць толькі да той шляхты, якая даказала сваё шляхецтва [207].

Значную цікавасць гісторыкі праявілі да палітыкі царызму ў адносінах да уніяцтва. Выклікаюць інтарэс артыкулы Я.Анішчанкі, У.Сосны, А.Філатавай і В.Грыгор'евай, С.Таляронка, Ю.Драгуна [11,80,105,339,358]. Усе яны характарызуюць ліквідацыю уніі як прымусовы акт, як крок у напрамку русіфікацыі беларускага насельніцтва. Асобна трэба вылучыць працу С.Таляронка «Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай і уніяцкай царквы на Беларусі (1772 — 1839 гг.)». Аўтар слушна вылучае два перыяды гэтага напрамка палітыкі самадзяржаўя: першы — 1772 — пачатак 20-х гадоў XIX ст., калі адміністрацыйныя меры былі накіраваны на падпарадкаванне і ўзмацненне кантролю каталіцкай і уніяцкай царквоў у Расіі і Беларусі; другі — пачатак 20-х гадоў — 1839 г., які характарызуецца жорсткім курсам урадавай палітыкі да касцёла, выгнаннем ордэна езуітаў і гвалтоўным скасаваннем уніяцтва [358].

Этапнай можна назваць манаграфію Я.К.Анішчанкі «Беларусь у часы Кацярыны II», у якой ён на багатым архіўным матэрыяле вызначыў сферы, тэмпы і шляхі падпарадкавання беларускай тэрыторыі. Разгледзеўшы ўрадавыя мерапрыемствы па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму ўладкаванню беларускіх зямель, па арганізацыі кіравання і суда, па рэгуляванню адносін на вёсцы, па аправаслаўленню уніятаў і ўвядзенню мяжы аселасці для яўрэяў, Анішчанка прыйшоў да правільнай высновы, што «ў цэлым царскі ўрад дзейнічаў на далучаных землях Беларусі больш як кансерватар, чым рэфарматар і пераўтваральнік». Нестандартныя, не сустракаемыя ў

вышэйзгаданай літаратуры, высновы робіць Анішчанка ў кожным раздзеле сваёй працы. Так, напрыклад, звяртае нашу ўвагу на тое, што вернападданая прысяга «стварыла ідэалагічную падставу для існавання трывалай канцэпцыі аб дабраахвотным уз'яднанні Беларусі з Расіяй»; што «поўнае ігнараванне папярэдняга адміністрацыйнага падзелу ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай прадэманстравала дэмаркацыя новай мяжы імперыі», якая праводзілася «з шантажом і пры змоўніцкім патуранні сеймавых дэлегатаў» [14, с. 35, 63, 87, 162, 188].

Царскую палітыку на землях Беларусі закранулі М.Сільчанка і І.Басюк у кнізе «Беларуская дзяржаўнасць». Яны слушна паказалі, што распаўсюджвалася «Даравальная грамата дваранству», але Кацярына II пакінула і некаторыя былыя льготы; што саслоўная палітыка была прадваранская, але супраць апазіцыйнай дробнай шляхты прымаліся рэпрэсіўныя меры, насаджалася расійскае землеўладанне. Гарады былі пазбаўлены магдэбургскага права, і на іх распаўсюджвалася «Даравальная грамата гарадам» [322]. С.Куль-Сяльверстава ў манаграфіі «Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур» разгледзела палітыку царызма ў галіне культуры і адукацыі. У асноўным яны правільна вызначыла этапы і аб'екты русіфікацыі насельніцтва зямель Беларусі, ролю адукацыі ў асіміляцыі беларускага насельніцтва [103, с.28,58]. Дакладна акрэсліў асноўныя напрамкі і сутнасць расійскай палітыкі ў адносінах да Беларусі часоў Кацярыны II — Мікалая I В.Д.Друшчыц [107].

Аб рэпрэсіўнай палітыцы самадзяржаўя на землях Беларусі можна прачытаць у шэрагу артыкулаў рускіх, беларускіх і польскіх даследчыкаў. Так, С.У.Кодан і Б.С.Шастаковіч прысвяцілі свой артыкул палітыка-юрыдычным аспектам польскай ссылкі ў Сібір у 30—50-я гады XIX ст., калі туды ссылаліся «заліўшчыкі», «канаршчыкі», дзеячы «Садружнасці польскага народа», эмісары эмігранцкага «Дэмакратычнага таварыства», удзельнікі патаемных арганізацый 1840-х гадоў. Маюцца звесткі аб канкрэтных месцах ссылкі асоб з тэрыторыі былога ВКЛ, іх занятках, умовах жыцця і правах (а дакладней, аб адсутнасці іх) [526]. А.П.Грыцкевіч у артыкуле «Беларуская шляхта» звяртае ўвагу на незаконныя, на яго погляд, намаганні ўрада выкрэсліць з ліку дваранства шматлікую шляхту Беларусі, асабліва пасля паўстанняў 1830—1864 гг. [81].

Шэраг невялікіх артыкулаў зборніка «Дэпартацыя як сацыяльная праблема» прысвечаны дэпартацыям, якія адбыліся

ў 1-й палове XIX ст. С.Марозава расказала аб практыцы высылкі ўніяцкіх святароў, якія не хацелі прымаць праваслаўе; Я.Піскун — аб дэпартацыі беларускіх пісьменнікаў-фалькларыстаў Т.Зана і Я.Чачота; У.Сосна — аб перасяленні шляхты з беларускіх губерняў у 2-й трэці XIX ст. Дэпартацыі як аб'екту метадалагічнага аналізу прысвяціў свой артыкул прафесар С.Яцкевіч. Ён адзначыў ключавыя аспекты гэтай з'явы: каўзальны, функцыянальны, аб'ектны, суб'ектны, тэмпаральны, сацыяльны, аксіялагічны [112].

Такім чынам, нягледзячы на шматлікую літаратуру, комплекснага і ўсебаковага аналіза царскай палітыкі на землях Беларусі не маецца. Асабліва маладаследаваны такія пытанні, як: ссылка, дэпартацыя, канфіскацыя, секвестр у палітыцы расійскага ўрада ў дачыненні да жыхароў Беларусі; не вывучаны пытанні фарміравання і дзейнасці палітычнай паліцыі на землях Беларусі; не абгрунтаваны перыяды ў эвалюцыі расійскай палітыкі да Беларусі; ніхто не параўнаў апошнюю з палітыкай іншых захопнікаў зямель РП.

Праблемам усталявання новай сістэмы органаў кіравання і суда прысвечаны працы рускіх даследчыкаў — П.Шчэбальскага, У. Дзіцяціна, А.Д.Градоўскага, У.М.Гэсена. «Уладкаванне, дадзенае Беларусі» пасля першага падзелу, стала аб'ектам даследавання П.Шчэбальскага [531]. Дзіцяцін свой твор прысвяціў пытанням уладкавання гарадскіх органаў кіравання [98]. Градоўскі падрабязна напісаў аб кацярынінскім «Учреждении о губерниях», функцыях і задачах генерал-губернатараў [79]. Гэсен апісаў мясцовае кіраванне, куды залічыў губернатара як орган нагляду [71]. Аб сістэме кіравання пры Кацярыне II пісаў М.Каяловіч [185].

З матэрыялаў савецкіх гісторыкаў дзяржавы і права трэба вылучыць працы П.А.Заянчкоўскага і М.П.Ерошкіна. Заянчкоўскі зрабіў аналіз расійскага чыноўніцтва (вышэйшай бюракратыі і губернскай адміністрацыі) на сярэдзіну XIX ст., прывёў спіс пасад губернскай і павятовай адміністрацыі, выбіраемай дваранствам [126]. Ерошкін у падручніку «История государственных учреждений» паказаў функцыяванне дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі (пры гэтым, гаворачы пра асаблівасці кіравання расійскімі ўскраінамі, нічога не напісаў пра Беларусь), а ў кнізе «Крепостническое самодержавие и его политические институты (первая половина XIX века)», ахарактарызаваў чыноўніцтва Расіі, звярнуўшы ўвагу, што

першыя пяць класаў (да іх адносяцца між іншым генерал-губернатары, губернатары, папячыцелі навучальных акруг) разам з імператарам вызначалі курс палітыкі краіны [116,117].

У беларускай гістарыяграфіі важкімі з'яўляюцца два артыкулы і кандыдацкая дысертацыя С.Токця аб дзяржаўным апараце царызму ў Беларусі ў 1830 –1860 гг. і шляхецкім самакіраванні [374, 376, 377]. Токць паказаў механізм функцыявання апарату, характар узаемаадносін органаў шляхецкага самакіравання з мясцовымі дзяржаўна-бюракратычнымі ўстановамі (гэта зроблена толькі на ўзроўні губернатараў). Ён прааналізаваў склад чыноўніцтва Беларусі і прыйшоў да слушнай высновы, што ў 1830 – 1850-я гады «абсалютная большасць служачых належала да мясцовых ураджэнцаў» [376, с. 14,15], а расіяне займалі пасады губернатараў, віцэ-губернатараў, былі паліцэйскімі чынамі. Токць доказна ўпэўнівае ў тым, што структура, функцыі і чыноўніцкі корпус дзяржаўнага апарату царызма ў Беларусі пасля паўстання 1830-1831 гг. перажылі змены, вызначае этапы ўніфікацыі сістэмы мясцовага кіравання.

Значны ўклад у даследаванне дзейнасці органаў кіравання зрабіў Я.Анішчанка. Спачатку ў артыкуле «Усынаўленне» [7], а потым у кнізе «Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796)» [14] ён распрацаваў гісторыю функцыявання апарату кіравання і суда ва Усходняй Беларусі пасля першага падзелу РП. Анішчанка звярнуў увагу на скасаванне сеймікаў як органаў рэгіянальнага самакіравання шляхты; на свядомае распальванне рускімі камісарамі саслоўнай варожасці ў вёсцы. У арганізацыі ўлады царызма на далучаных тэрыторыях ён выдзеліў два этапы – да і пасля рэалізацыі губернскай рэформы 1775 г. Нельга не пагадзіцца з Анішчанкам, што «царызм з першых дзён далучэння замацаваў верхавенства рускіх законаў», а «дэкларыраванае захоўванне мясцовых правоў, судаводства апынулася фікцыяй» [14, с. 87].

Аўтары кнігі «Беларуская дзяржаўнасць» М.Сільчанка і У.Басюк вызначылі функцыі генерал-губернатара, губернатара і яго канцылярыі, казённай палаты, павятовых улад, успомнілі скасаванне магдэбургскага права і распаўсюджванне «Жалованной грамоты городам» (1785). Яны заўважылі змену былой судовай сістэмы на расійскую на працягу 50 гадоў, пачынаючы з Мікалая I, пасля паражэння паўстання 1830-1831 гг. [322, с.194].

Кіраванню дзяржаўнай вёскай надаваў увагу У.Сосна. Ён напісаў аб дзейнасці такіх устаноў, як праўленне дырэктара камерных спраў, казённая палата [336]. А.Цітоў у брашуры «Вольныя беларускія месцы» звярнуў увагу на змяненне становішча мяшчан і самакіравання гарадоў і мястэчак Беларусі, паказаў, што ліквідацыя магдэбургскага права пагоршыла стан гарадскіх саслоўяў, бо ўзамен атрымала па «Жалованной грамоте городам» меншыя правы, чым карысталася звыш некалькіх стагоддзяў [411]. У кандыдацкай дысертацыі М.М.Артушкевіча разгледжаны заканадаўчыя акты аб гарадах другой паловы XVIII — першай паловы XIX стст. і асаблівасці іх рэалізацыі ў Беларусі. Ён адзначыў, што магістраты беларускіх гарадоў займаліся не толькі судовымі справамі, але і з’яўляліся «асноўнымі органамі гарадскога самакіравання» [25, с.9]. Працы В.Шаўкапляс прысвечаны судовым органам Беларусі. Не звяртаючыся да матэрыялаў архіваў, яна пераказвае змест ПСЗРІ, але тое, што там напісана, не зусім адпавядае жыццю і дзейнасці судовых органаў на Беларусі — яны мелі свае асаблівасці ў адрозненне ад цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. Шаўкапляс блытаецца ў тэрмінах «павятовы» і «уездный» (што адно і тое ж на розных мовах ), у сваіх адносінах да Статута 1588 г.: то піша, што павятовыя суды кіраваліся ў сваёй дзейнасці Статутам, то сцвярджае, што ўзнаўленне ранейшых судоў «на аснове мясцовага права не адбылося» [420, 529].

Трэба абавязкова ўзгадаць працы польскіх гісторыкаў: Л.Жытковіча «Урады Рапніна на Літве ў 1794 — 1797 гадах» і Л.Шчукі «Маршалкі шляхты Гродзенскай губерні». Першы на матэрыялах архіваў і бібліятэк Вільні і Варшавы, якія цяпер нам недаступныя, апісаў даволі падрабязна дзейнасць М.Рапніна на тэрыторыі трэцяга падзелу [706]. Другі ў кароткім уступным слове да спісаў губернскіх і павятовых маршалкаў Гродзенскай губ. з 1801 па 1915 г. звярнуў увагу на два моманты: афіцыйнае ўжыванне тэрміна «маршалак» да 1831 г., калі адбылася змена на «прадвадзіцель дваранства»; выбарнасць гэтай пасады да 1862 г., пасля чаго на яе сталі прызначаць [671].

Такім чынам, у вышэйназванай літаратуры ўладкаванне агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда не разглядаецца як сродак русіфікацыі і уніфікацыі зямель Беларусі з цэнтральнымі рэгіёнамі Расіі, не выдзелены перыяды гэтага працэса, не падкрэслена розніца ў адносінах царскага ўрада да заходніх і ўсходніх зямель Беларусі, не даследаваны выбары ў мясцовае

самакіраванне як сродак палітыкі і склад чыноўніцтва, як кадравая палітыка царызма.

Даволі шмат літаратуры ёсць па праблемах развіцця адукацыі, у якой таксама закранаюцца пытанні адукацыйнай палітыкі самадзяржаўя на землях Беларусі. Спробу гістарыяграфічнага аналізу дадзенай праблемы зрабіў А.Гурэцкі, але ў сваім артыкуле ён большую ўвагу засяродзіў на агульнай характарыстыцы прац, не выдзяляючы ўклад кожнага з аўтараў у раскрыццё палітыкі расійскага ўрада ў галіне адукацыі моладзі Беларусі [88]. Цікавыя артыкулы С.Бархатцава (С.Шалковіча), у якіх ён паказаў палітычны характар адукацыі і выхавання ў Віленскай навучальнай акрузе, ахарактарызаваў дзейнасць А.Чартарыйскага і яго паплечнікаў (Т.Чацкага, І.Страйноўскага, Г.Калантая) ва ўзмацненні духу паланізацыі, прааналізаваў дакументы аб стварэнні і дзейнасці Віленскага універсітэта і зрабіў правільную выснову аб яго значнай ролі ў патрыятычным выхаванні моладзі Беларусі: «адзін з самых моцных і магутных цэнтраў апалячвання Заходняй і Паўднёва-Заходняй Русі» [524, с.240]. На яго погляд, Віленская навучальная акруга была правобразам тэрытарыяльнага аб'яднання гэтых зямель з Каралеўствам Польскім. Бархатцаў памыляецца, калі сцвярджае, што толькі пасля паўстання 1830-1831 гг. пачалі накіроўваць настаўнікаў рускага паходжання. Гэта было і раней, але не ў такіх памерах, ды былі гэта часцей выхадцы з зямель Беларусі, якія скончылі расійскія навучальныя ўстановы [27].

Нямала зрабілі ў галіне даследавання адукацыйнай палітыкі царызма П.М.Жуковіч, А.У.Бялецкі і Ю.Ф.Крачкоўскі. Першы ў дзвюх сваіх публікацыях разгледзеў распаўсюджванне польскай і расійскай адукацыі і зрабіў выснову, што пры Паўле I у Заходняй Расіі не прымалі якіх-небудзь асаблівых мераў для паслаблення «панавання ў ёй польскай школьнай адукацыі» [119, с. 224]. Расійская сістэма ў колькасных паказчыках (школ, вучняў) саступала польскай, але заклала падмурак для свайго далейшага развіцця. Жуковіч прааналізаваў праграмы школ, паказаў асаблівасці школьнай справы на тэрыторыі былога ВКЛ [121].

З нагоды 100-годдзя ўказа аб стварэнні навучальных акруг была створана камісія па напісанню твора, прысвечанага гістарычнаму агляду дзейнасці Віленскай навучальнай акругі за 1803 —1903 гг. Камісію ўзначальваў А.Бялецкі, памочнік папячыцеля ВНА. Ён жа стаў аўтарам трэцяй часткі працы

пад назваю «Учебные заведения Витебской и Могилёвской губерний в 1803 —1830 гг». Акрамя матэрыялаў, якія ёсць у Жуковіча, знаходзім тут аналіз падручнікаў, школьных праграм, методык настаўнікаў, школьных статутаў — усё гэта робіцца з кропкі погляду «русско-патриотического» духа. Бялецкі разглядае ўсе тыпы школ, якія іcнавалі на землях Беларусі да і пасля ўключэння іх у склад Расійскай імперыі. На жаль, падчас працы над кнігай ён памёр, і матэрыял яе заканчваецца 1803 г. [38]. Крачкоўскі быў аўтарам першай часткі працы пад назваю «Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа». Ён зразумеў палітычны характар польскай сістэмы адукацыі на землях Беларусі, яе ролю ў захаванні польскай мовы і развіцці навук пры адсутнасці дзяржаўнай незалежнасці Польшчы. Крачкоўскі прызнаў ролю А.Чартарыйскага ў наданні адукацыі нацыянальна-патрыятычнага характару, але слушна пісаў пра тое, «як мала кн. Чартарыйскі вінаваты ў паланізацыі заходне-рускіх ускраін» [188, с.85]. Каратка праанлізаваўшы напрамкі прац Адукацыйнай камісіі, ён зразумеў, што яна «ўзбудзіла і праявіла грамадскі польскі нацыянальны настрой» [188,с.25]. Аб палітычнай ненадзейнасці польскіх падручнікаў у школах на далучаных тэрыторыях пісаў У.Студніцкі [351]. Протаіерэй І.Карчынскі ўзгадаў аб дзейнасці Сямашкі — пачынальніка арганізацыі школ пры царкоўных прыходах [176].

У польскіх даследчыкаў таксама знаходзім грунтоўныя публікацыі аб развіцці адукацыі на тэрыторыі былога ВКЛ. М.Балінскі прысвяціў сваю працу дзейнасці Галоўнай літоўскай школы (Віленскай акадэміі — будучаму універсітэту), дзе паказаў змяненні сістэмы адукацыі ў час кіравання генерал-губернатара М.Рапніна [549]. Чатырохтомная праца Ю.Лукашэвіча падрабязна знаёміць з развіццём польскай адукацыі: дзейнасцю Адукацыйнай камісіі на тэрыторыі Беларусі (пасылала моладзь вучыцца за мяжу, вучыла дзяўчат — «будучых мацераў, гаспадынь, грамадзян», рыхтавала падручнікі), колькасцю школ розных тыпаў [617, т.2, 4]. «Статыстычны нарыс школаў Віленскага аддзела» М.Амброса дае інфармацыю аб колькасці школ, вучняў і настаўнікаў за 1803 —1815 гг., аб праграмах і асноўных дакументах дзейнасці ВНА [539].

Артыкул М.Жмігродскага «Педагагічныя прынцыпы князя Адама Чартарыйскага» напісаны па матэрыялах парыжскага архіва Чартарыйскага, знаёміць з педагагічнымі прынцыпамі апекуна ВНА і сродкамі патрыятычнага выхавання моладзі

[701]. «Гістарычны нарыс арганізацыі пачатковай адукацыі ў Польшчы ад Камісіі народнай адукацыі да сённяшняга часу» падрыхтаваў Е.Сухан. Ён прааналізаваў статут Віленскага універсітэта і падпарадкаваных яму школ, дзейнасць рэктара Я.Снядэцкага і дазорцаў павятовых школ [669]. Праца Адукацыйнай камісіі знайшла адлюстраванне ў кнігах Г.Масціцкага «Літва і Карона ў эпоху пасля падзелаў» [635] і І.Шыбяк «Школьніцтва нацыянальнай Адукацыйнай камісіі ў ВКЛ». Апошняя звярнула большую ўвагу на выхаваўчы працэс у школах розных тыпаў на тэрыторыі ВКЛ у 1773 — 1793 г., мову выкладання і падручнікі [676].

У беларускай гістарыяграфіі найбольш значнымі з'яўляюцца працы У.Пасэ [24,245,278,279]. Ён паказаў поспехі і праблемы развіцця рускіх народных школ на землях Беларусі: праграмы, настаўнікі, бібліятэкі. Прычым Пасэ перабольшыў ролю невялікай колькасці галоўных і малых народных вучылішчаў у адукацыі беларускай моладзі. Ён звярнуў увагу на рэформы Адукацыйнай камісіі і расійскага ўрада, на рэакцыйную накіраванасць каталіцкіх школ, на школьныя статуты і развіццё ланкастарскіх школ. Апошнія Пасэ памылкова называе «незаконнымі», бо ўказам ад 22.05.1819 г. пры Галоўным упраўленні быў створаны камітэт вучылішч узаемнага навучання. Справядліва адзначана, што самадзяржаўная ўлада ігнаравала нацыянальныя інтарэсы Беларусі, праводзіла русіфікацыю школ, што новая сістэма адукацыі «служыла як мэтам умацавання класавых і палітычных пазіцый царызма пры адначасовым аслабленні палітычнай ролі польскіх магнатаў і каталіцкай царквы, так і сродкам прыцягнення апошніх на бок царызма» [245, с.133]. Адзначана роля Віленскага універсітэта як цэнтра перадавой грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі і Літве і прааналізаваны ўдзел моладзі Беларусі ў грамадска-палітычным руху [245, с.149,160 — 169]. Але палітычны бок адукацыі не быў дастаткова даследаваны У.Пасэ — не паказана дзейнасць А.Чартарыйскага па апалячванню і акаталічванню вучняў ВНА, няма палітычнага аналіза праграм розных тыпаў школ. Не ведаў ён, відаць, і аб існаванні з 1797 г. Літоўскай Адукацыйнай камісіі [278, с. 63].

Глава аб адукацыі ёсць у «Гісторыі культуры Беларусі» Л.Лыча і У.Навіцкага. Лыч закранае такія важныя для нас моманты, як: мова выкладання ў створаных царызмам

навучальных установах; роля Віленскага універсітэта ў абуджэнні ў студэнтаў з Беларусі і Літвы павагі да сваёй культурнай спадчыны, імкненне аддаць свой талент яе прагрэсу; значэнне адукацыі ў асімілятарскай палітыцы расійскага ўрада. На наш погляд, Лыч памылкова лічыць 1840 г. «у пэўным сэнсе слова пераломным у гвалтоўнай русіфікацыі нашага краю» [213, с.117], бо зыходзіць з памылковай пасылкі — указа 1840 г., які быццам бы забараніў ужыванне тэрміна «Беларусь».

С.Куль-Сяльверстава ў кнізе «Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. — 1820-я гады)» разглядае спачатку агульныя тэндэнцыі ў развіцці асветы на тэрыторыі ўсходняй і заходняй Беларусі пасля першага падзелу РП (с. 17—34), а потым паказвае развіццё дзвюх сістэм асветы на землях Беларусі пасля другога і трэцяга падзелаў РП [193, с.55—72]. Яна прыходзіць да правільнай высновы: народныя школы расійскай сістэмы асветы на ўсходзе Беларусі аказаліся слабейшым, чым школы польскай сістэмы на захадзе і ў цэнтры Беларусі, падмуркам для новай школы часоў рэфармавання адукацыі ў першай палове XIX ст. [193,с.33-34]. У 1-й чвэрці XIX ст., на думку Куль-Сяльверставай, у пераўладкаванні сістэмы асветы працягваліся магістральныя працэсы — уніфікацыя, секулярызацыя, скасаванне саслоўных перагародак [193,с.72]. У главе «Спажыўцы і стваральнікі культуры» аўтар звяртае ўвагу на выкладчыцкі склад школ ВНА (яго паходжанне, карпаратыўнасць, уключэнне ў саслоўны ліфт «Табеля о рангах») і яго ролю ў выхаванні будучых дзеячоў нацыянальна-вызваленчага руху.

У брашуры П.І.Леўты «Из истории народного образования на Гродненщине (конец XVIII — начало XX вв.)» першы раздзел прысвечаны кароткаму агляду развіцця адукацыі на Гродзеншчыне ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. Тут адзначаны саслоўны характар навучання, немагчымасць выкладання на беларускай мове, робіцца правільная выснова аб тым, што «школа зноў заставалася зброяй нацыянальнага прыгнёту і апалячвання беларускага народу» [202, с.1]. «Политика царизма в области образования» — так называецца праца А.Гурэцкага, але ён разглядае розныя пытанні адукацыі, а не канкрэтна палітыку па стварэнню расійскай сістэмы адукацыі з мэтаю русіфікацыі насельніцтва Беларусі і выхавання яго ў вернападданых пачуццях да царскай улады.

Гурэцкі звярнуў увагу на кадры навучальных установ, кантроль за зместам адукацыі з боку дзяржавы, ігнараванне інтарэсаў беларускай моладзі, выключэнне беларускай мовы з навучальнага працэсу [87]. Толькі ў кандыдацкай дысертацыі А.Ф.Самусіка адзначана, што навучальныя ўстановы ўспрымаліся насельніцтвам як цэнтры грамадска-палітычнага жыцця, асабліва радыкальнага польскага патрыятычнага духу [310, с.3,15]. У кандыдацкай дысертацыі А.Лукашэвіча разглядаецца развіццё закрытага тыпу навучальных установ, кадэцкіх корпусаў і роль некаторых іх выхаванцаў у грамадска-палітычным жыцці [208].

Такім чынам, у літаратуры няма даследаванняў аб ролі расійскай сістэмы адукацыі ў русіфікацыі беларускай моладзі, а польскай — у паланізацыі, не паказаны ўстановы адукацыі як арэна палітычнай барацьбы паміж польскай і рускай сістэмамі адукацыі, не выдзелены сродкі гэтай барацьбы і не звернута ўвага на палітычную ролю выхавання.

Польскае пытанне як праблема па сутнасці з'яўляецца асноўным зместам амаль усіх публікацый польскіх гісторыкаў аб падзеях палітычнага жыцця краіны пасля трох падзелаў РП. Таму ў сваім аналізе мы штучна выдзяляем некаторыя творы, дзе гэтае пытанне выглядае больш канцэнтравана і сустракаецца беларускі матэрыял.

У 1898 г. выйшла праца А.Вратноўскага «Палітычныя памкненні польскага народу», у якой галоўная ўвага была звернута на патрыятызм палякаў пасля падзелаў РП да 1863 г. [689]. Аўтар падкрэсліў, што мэтай яго было адраджэнне незалежнай Польшчы ў межах 1772 г. Ён адзначае ролю А.Чартарыйскага ў вырашэнні польскага пытання праз Аляксандра I у 1803 — 1823 гг. і праз дапамогу еўрапейскіх краін з 1830 г. Галоўным зместам першага тома кнігі У.Фелдмана «Гісторыя польскай палітычнай думкі ў перыяд пасля падзелаў» з'яўляецца паказ эвалюцыі палітычнай арыентацыі польскіх нацыянальных сілаў на тэрыторыі падзелаў РП і ў эміграцыі. Аўтар выдзяляе французскую арыентацыю да 1813 г., расійскую — з 1813 г. да 1830 г., незалежна-паўстанцкую ў эміграцыі 1831—1848 гг., барацьбу паміж французскай і расійскай арыентацыямі ў 1848—1863 гг. [576]. С.Кіневіч у кнізе «Прывід незалежнай Польшчы» апісаў праграмы адраджэння Польшчы, якія ўзнікалі на працягу першай паловы XIX ст.: брашура «Ці палякі могуць дасягнуць

незалежнасці?», мемарыял А.Чартарыйскага «Аб палітычнай сістэме, якой павінна прытрымлівацца Расія», праекты польскага асветніцтва Сташыца і Калантая [580].

У 1907 г. на рускай мове выйшла кніга польскага даследчыка У.Студніцкага «Польша в политическом отношении от разделов до наших дней» [351]. Ён коратка асвяціў польскае пытанне ў час падзелаў РП і напалеонаўскіх войнаў. Далейшы перыяд вырашэння польскага пытання да 1825 г. стаў аб'ектам вывучэння рускага гісторыка М.Любаўскага. У артыкуле «Аляксандр I і Польшча» ён паказаў лёс зямель Беларусі ў Пулаўскім плане 1805 г., падчас Венскага кангрэса 1815 г., польскіх сеймаў 1818—1825 гг. [215]. Савецкі гісторык Е.І.Фядосава на падставе апублікаваных дакументаў, польскай гістарычнай літаратуры і мемуараў паказала месца польскага пытання ў знешняй палітыцы напалеонаўскай імперыі: планы адраджэння РП Напалеона, Аляксандра I, А.Чартарыйскага, М.-К.Агінскага [391]. Тэрмін «Беларусь» Фядосава ні разу не ўзгадвае, землі Беларусі лічыць расійскімі, а таму беларускі аспект у вышэйназваных планах не вылучаецца.

Такім чынам, у літаратуры не вызначана роля зямель Беларусі ў польскім пытанні, не паказаны іх месца і значэнне ў пытанні аб адраджэнні РП.

«Польскай карце» ў палітычнай барацьбе Напалеона і Аляксандра I і планам адраджэння ВКЛ асноўную ўвагу надавалі польскія даследчыкі. У кнізе Ш.Аскеназы «Князь Юзаф Панятоўскі» даецца апісанне місіі А.Чартарыйскага да князя з прапановай Аляксандра I аб саюзе супраць Напалеона, расказваецца аб тайнай падрыхтоўцы дамовы Герцагства Варшаўскага з Расіяй у лістападзе-снежні 1812 г. [545]. Комплексную і змястоўную манаграфію «Літва ў 1812 г.» напісаў Ю.Івашкевіч [582]. У ёй раскрываюцца такія пытанні, як: эканамічнае і сацыяльна-палітычнае становішча зямель ВКЛ перад франка-рускай вайной 1812 г., арганізацыя і дзейнасць урада ВКЛ, фарміраванне літоўскай арміі. На жаль, Івашкевіч не пазбег некаторых паўтораў матэрыяла ў розных частках кнігі і свядома ўжывае тэрміны «палякі», «польскі» да жыхароў ВКЛ, яго войска і ўстаноў. У.Фелдман у «Дзеях польскай мыслі...» закрануў польскія планы Напалеона і Аляксандра I, план М.-К.Агінскага аб утварэнні ВКЛ у 1811 г., месца зямель ВКЛ у вайне 1812 г. [576].

М.Хандельсман у кнізе «Францыя-Польшча. 1795—1845» звярнуў увагу на супрацоўніцтва дзвюх краін напярэдадні 1812 г.,

адзначыў наяўнасць двух напрамкаў польскай палітычнай думкі: традыцыйнага патрыятызму былой РП і таргавіцкіх традыцый [579 а]. М.Кукель у «Гісторыі польскага войска ў напалеонаўскі перыяд» назваў план А.Чартарыйскага супрацістаўленнем ВКЛ Польшчы. Ён прытрымліваўся думкі, што Напалеон не хацеў ваяваць з Расіяй і вайна 1812 г. была «другой польскай вайной». Ролю ВКЛ у вайне 1812 г. Кукель прыніжае [606]. У сваёй кнізе «Літва і Беларусь і напалеонаўскія войскі 1812 г.» ён выказвае тыя самыя погляды і называе прычыны невялікай актыўнасці ВКЛ, дае яе адрозніванне ад Белай Русі [607]. Кніга Ю.Скаўронка знаёміць нас з антынапалеонаўскімі поглядамі А.Чартарыйскага ў перыяд яго найбольшага ўплыву на напрамак расійскай знешняй палітыкі. Асобны раздзел прысвечаны «пулаўскаму плану» Чартарыйскага ў час наладжвання трэцяй антыфранцузскай кааліцыі [661].

З рускіх публікацый успомнім цікавую працу В.Г.Краснянскага, у якой ён расказаў пра дзейнасць Мінскага дэпартамента ВКЛ [186]. Кнігі В.К.Дабравольскага і Е.Ф.Арлоўскага, якія выйшлі ў 1912 г., маюць матэрыял аб падзеях вайны 1812 г. на тэрыторыі Віцебскай і Гродзенскай губерняў: ваенныя дзеянні і дзейнасць адміністрацыйных камісій [99, 267]. Шэраг артыкулаў, які ўтрымліваюць матэрыял аб землях ВКЛ, знаходзяцца ў шматтомным выданні «Отечественная война и русское общество». У.І.Пічэта напісаў аб польскай канфэдэрацыі ў 1812 г. [284, с.154—161], А.Л.Пагодзін — аб тым, што Напалеона і Аляксандра І цікавіла больш Літва, чым Польшча [288, с.162—170] і пра заняцце французамі тэрыторыі Польшчы [287,с.148—153], М.К.Любаўскі распавёў пра адносіны Аляксандра І да Польшчы [215, с.88—104]. Ва ўводзінах да пятай кнігі «Виленского временника» Ю.Тацішчаў напісаў артыкул «Вильна и Литовские губернии в 1812-1813 гг.», дзе адлюстраваў іх эканамічнае і палітычнае становішча да і пасля вайны, ваенныя падзеі, дзейнасць мясцовых уладаў [373].

З кніг савецкіх гісторыкаў трэба ўзгадаць «Отечественную войну 1812 г.» Л.Г.Бяскроўнага і «1812. Великий год России» М.А.Троіцкага, дзе ў асноўным паказаны баявыя дзеянні на землях Беларусі [40, 378]. Заслугоўваюць увагі дзве гістарыяграфічныя кнігі Б.С.Абаліхіна і В.А.Дунаеўскага, у якіх яны пішуць пра тое, што тэму «Літва (Паўночна-заходняя Расія і Прыбалтыка) і 1812 г.» «ні ў якім разе нельга лічыць

завершанай» [2, с.200], нават публікацыя кнігі Б.А.Дундуліса «Літва ў перыяд напалеонаўскай агрэсіі (1807–1812)» «поўнасцю не вырашыла гэтай праблемы» [1, с.32]. Цікавы рукапіс «Вооружённые силы Литовского княжества 1812 г.» падрыхтаваў І.Ю.Кудрашоў. На 16 старонках ён расказаў пра фарміраванне літоўска-беларускіх войскаў, іх дзеяннях, даў апісанне ўніформы і 13 малюнкаў [190].

У беларускай гістарыяграфіі на сённяшні дзень ёсць толькі адна кніга Е.І.Карнейчыка «Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г.» [172]. Праз «рускую прызму» аўтар распавядае пра становішча Беларусі напярэдадні вайны, пра ваенныя дзеянні і акупацыйны рэжым на землях Беларусі, яе вызваленне і вынікі вайны. Адсутнасць архіўных матэрыялаў і слабасць дакументальнай базы, марксісцка-ленінская метадалогія не дазволілі аўтару пазбегнуць памылак і аднабаковасці ў асвятленні адносін беларускага насельніцтва да франка-рускай вайны 1812 г. ВКЛ 1812 года разглядаецца як саюз Напалеона з польскімі памешчыкамі Беларусі. Беларусь у планах Напалеона і Аляксандра І, удзел жыхароў Беларусі ў вайне на баку французаў як праблемы ў кнізе не ўзнімаюцца.

Некалькі артыкулаў: А.Ружанца [306], В.Галубовіча [68], К.Тарасава [369], С.Таляронка і А.Блінца [359] прысвечаны фарміраванню і лёсу войск ВКЛ. Розныя праблемы разглядае С.Таляронак: звяртае ўвагу на план М.Агінскага 1811 г. [361], заяўляе, што для беларусаў вайна не была Айчыннай, і Беларусь рабавалі як французы, так і рускія [362], апісвае пазіцыі беларускага дваранства і сялянства [360]. Шмат цікавых фактаў прывяла ў сваім газетным артыкуле А.Філатава: план Агінскага, фарміраванне войск ВКЛ, далучэнне зямель Беларусі да Генеральнай канфедэрацыі [396]. Палітыку Напалеона на Беларусі закрануў у сваім артыкуле Я.Ліс [204]. Даволі дакладна, з храналагічнай паслядоўнасцю, перадае ход ваенных падзей на землях Беларусі А.Данілаў. Ён з болем піша, што «за год наш край быў спустошаны, разрабаваны і спалены двойчы» [91, №3, с.45]. Да пяці частак артыкула прыкладзены дакладныя карты.

Такім чынам, асноўная ўвага ў літаратуры звярталася на ваенныя падзеі, удзел беларусаў на баку рускіх войск, руска-французская вайна называлася Айчыннай. Толькі ў апошнія гады намеціўся паварот да даследуемых намі праблем (планы адраджэння ВКЛ напярэдадні вайны, ВКЛ 1812 г.; удзел

літоўска-беларускага войска на баку Напалеона), але комплексна і з прыцягненнем польскіх крыніц і архіўных матэрыялаў яны не вывучаліся.

Літаратуры, прысвечанай ролі асобнага Літоўскага корпуса ў польскім пытанні, няма. Толькі даследчыкі руху дзекабрыстаў і дзейнасці Патрыятычнага таварыства звярнулі ўвагу на яго ролю ў перамовах 1824 і 1825 гг. (аб чым глядзі агляд літаратуры ніжэй).

Асноўная літаратура па праблемах польскай эміграцыі і дзейнасці яе эмісараў на землях Беларусі мае польскае паходжанне. А.Вратноўскі, у адрозненне ад большасці польскіх даследчыкаў, лічыў, што дзейнасць польскай эміграцыі ў 1831—1861 гг. была «вельмі шкоднай для нацыянальнай справы» [689, с.193]. Г.Масціцкі ў кнізе «Літва і Карона ў перыяд пасля падзелаў» апісаў, як ліцвінская моладзь прабіралася да легіёнаў Я.Дамброўскага, як пакідала яна свой край пасля вайны 1812 г. і паражэння паўстанняў 1830-1831 і 1863 гадоў [635]. У 4 томе «Гісторыі польскай культуры» А.Брукнер даў характарыстыку эміграцыі пасля Лістападаўскага паўстання, перадаў змест спрэчак розных яе груповак, суадносіны двух эміграцыйных цэнтраў: Дэмакратычнага таварыства і Гатэля Ламберт [557]. С.Калэмбка ў сваёй кнізе «Польскае выходніцтва пасля паўстанняў і іншыя палітычныя эміграцыі ў Еўропе XIX ст.» звярнуў увагу толькі на перыяд Вялікай эміграцыі (1832 — 1862 гг.), якую ён назваў «Польшчай у выгнанні» [589,с.195]. Калэмбка апісаў дзейнасць эміграцыі і яе палітычных арганізацый на розных этапах існавання, прывёў колькасны і сацыяльны склад польскай эміграцыі і Дэмакратычнага таварыства.

У зборнай працы «Эміграцыя з польскіх зямель у новым і навейшым часе (XVIII — XX стст.)» ёсць глава, прысвечаная нашаму перыяду. Аўтар яе, Е.Казлоўскі, вызначыў важныя вехі эміграцыі з зямель былога ВКЛ: барская эміграцыя, 1792—1794 гг., да 1830 г., Вялікая эміграцыя 1831—1862 гг. Апошнюю ён таксама назваў «Польшчай у выгнанні» і лічыў, што ў пэўнай ступені яна выконвала функцыі неіснуючай польскай дзяржавы [574, с.60,66]. Погляды на землі Беларусі эміграцыі ў 1850-я гады прааналізавала ў кнізе «Нараджэнне патаемнай польскай дзяржавы» Ф.Раматоўская [654]. Яна вызначыла напрамкі і метады дзейнасці ў краі Дэмакратычнага таварыства і прыхільнікаў А.Чартарыйскага, указала на дзве арыентацыі (памяркоўную і радыкальную) тэрыторый, якія захапіла Расія.

У дзесятым раздзеле «Гісторыі Польшчы (1795—1918)» С.Кіневіча расказваецца пра дзейнасць Вялікай эміграцыі: стварэнне розных камітэтаў, арганізацый, таварыстваў. Звяртаецца ўвага на тое, што «можа яшчэ важнейшым ад гэтых палітычных прац былі разумовы і духоўны ўплыў на край» [590, с.148].

Па гарачых слядах у 1866 г. выйшла праца расійскага даследчыка В.Ратча «Польская эмиграция до и во время последнего мятежа 1830—1863 гг.» [48]. Шэраг дакументаў, якія цытуе аўтар, і яго разважанні даказваюць, што польская эміграцыя гэтых гадоў пастаянна мела мэтаю адраджэнне РП у межах 1772 г. Для здзяйснення яе на землі Беларусі («рускую Польшчу») высылаліся эмісары, якія рыхтавалі глебу для паўстанняў, стваралі гурткі, таварыствы. Ратч піша, што эміграцыя турбавалася мець непарыўныя кантакты з землякамі, каб ведаць навіны з краю, збіраць грошы на «польскую справу», распаўсюджваць агітацыйную літаратуру.

У савецкай літаратуры ёсць вельмі цікавая кніга С.М.Фальковіча «Идейно-политическая борьба», у якой паказаны ідэйна-палітычныя плыні польскай эміграцыі [390]. Добра, што звяртаецца ўвага на адносіны розных партый і таварыстваў да зямель былога ВКЛ, з якіх можна зрабіць выснову аб тым, што іх праграмы ад «памяркоўнай дэмакратыі» да арыстакратычнай партыі Чартарыйскіх мелі мэтай адраджэнне РП у межах 1772 г. Аўтар разглядае дзейнасць Дэмакратычнага таварыства, Саюза польскай моладзі і М.Мераслаўскага на тэрыторыі былой РП у пачатку 1860-х гадоў. Цікавыя звесткі аб існаванні польскіх вайсковых школаў у Парыжы і Генуі, дзе вучыліся будучыя беларускія паўстанцы 1863 г. У беларускай гістарыяграфіі толькі ў апошні час з'явіліся працы, у якіх разглядаюцца пытанні эміграцыі з зямель Беларусі. В.Кіпель у кнізе «Беларусы ў ЗША» некалькі старонак прысвяціў перыяду, які даследуецца намі [161, с.43—48]. Ён адзначыў некаторыя хвалі эміграцыі з Беларусі ў ЗША: пасля трох падзелаў РП, забароны ў Расіі ордэна езуітаў, пагрому Лістападаўскага паўстання. А.Калубовіч у кнізе «Крокі гісторыі» таксама выдзеліў хвалі эміграцыі, тры з якіх прыпадаюць на 1794—1864 гг. (пасля паўстанняў 1794 г. і 1830-1831 гг., пасля франка-рускай вайны 1812 г.). Ён прывёў прыклады і назваў месцы эміграцыі беларусаў [151]. У агульным аглядзе гісторыі беларускай эміграцыі з часоў ВКЛ

да сучаснасці Г.Сяргеева выдзеліла невялікі раздзел «асаблівасцяў міграцыі ў першае стагоддзе пасля анэксіі беларускіх зямель Расіяй» [353]. Яна слушна адзначыла, што перасяленні набылі ў гэты час характар хваляў і былі звязаны з царскімі рэпрэсіямі пасля пагромаў паўстанняў і пераследамі ўдзельнікаў вайны 1812 г. на баку Напалеона. Прыведзены шэраг прозвішчаў выдатных дзеячоў эміграцыі беларускага паходжання і зроблена выснова аб важным укладзе беларусаў-эмігрантаў у развіццё іншых народаў.

Аб эмісарах польскай эміграцыі і іх дзейнасці на землях Беларусі літаратуры няшмат. Значная колькасць яе прысвечана Ш.Канарскаму. Мы карысталіся кнігай польскага даследчыка У.Загорскага «Ш.Канарскі: жыццё і дзейнасць», у якой, на наш погляд, змешчана найбольш карысная для нас інфармацыя [692]. Ад выправы Канарскага з Парыжу да арышта ў Вільні аўтар расказвае аб дзейнасці эмісара, асабліва аб стварэнні разгалінаванай сеткі патаемных таварыстваў на Украіне, у Беларусі і Літве. Прыводзяцца прозвішчы найбольш актыўных дзеячоў, у тым ліку таварыства Ф.Савіча. Фрагментарна аб экспедыцыі Канарскага напісаў у сваім падручніку С.Кеневіч, але чамусьці не ўспомніў аб партызанскай дзейнасці М.Валовіча [590]. Невялікая, але даволі змястоўная кніжка К.Сідаровіч-Чарняўскай «Справа эмісара Міхала Валовіча ў 1833 г.», выдадзеная ў 1934 г., не страціла свайго навуковага значэння і сёння [660]. Напісаная на падставе матэрыялаў следства і суда па «справе Валовіча», яна дае магчымасць пазнаёміцца з падзеямі 1833 г. па ўжо не існуючым дакументальным крыніцам. Аўтарка дала спачатку кароткі агляд жыцця эміграцыі напярэдадні партызанскай дзейнасці Заліўскага і ўдзелу Валовіча ў Лістападаўскім паўстанні, а затым — яго дзейнасці як эмісара на Слонімшчыне. Пры апісанні следства і ваеннага суда Сідаровіч-Чарняўская звярнула ўвагу на паводзіны кожнага партызана, на асаблівасці складу атрада Валовіча.

У беларускай гістарыяграфіі найбольш важкай працай аб эмісарах на землях Беларусі з'яўляюцца публікацыі А.Талерчыка. Нягледзячы на газетнае выданне, яго артыкул «Лістападаўскае паўстанне 1830 г. і ўдзел у ім М.Валовіча» напісаны на грунтоўным архіўным матэрыяле і апублікаваных крыніцах [355]. Даволі падрабязна аўтар перадае ўсе падзеі экспедыцыі Заліўскага і дзейнасць Валовіча на тэрыторыі Беларусі, прыводзіць біяграфічныя звесткі аб удзельніках яго

партызанскага атрада, звяртае ўвагу на застрашальны характар пакарання валовічаўскіх партызан.

Аб падзеях 1848 г. на землях Беларусі фрагментарныя матэрыялы прыведзены ў працах рускіх, беларускіх і польскіх гісторыкаў. Так, А.С.Ніфантаў у кнізе «Россия в 1848 г.», выкарыстоўваючы архіўныя крыніцы III аддзялення, паказвае ўплыў еўрапейскіх падзей на становішча ў Беларусі, раскрывае пазіцыю памешчыкаў па польскаму пытанню [259]. Больш падрабязна аб падзеях гэтага часу на землях Беларусі гаворыць у сваім часопісным артыкуле «1848 г. у Беларусі» В.Чапко [415]. Дзейнасць Ф.Савіча, Ш.Канарскага, патаемнай афіцэрскай арганізацыі А.Кузьміна-Караваева, «Саюза літоўскай моладзі» апісвае ў працы «Из истории освободительного движения в Белоруссии и Литве в 1840-1860-е годы» А.Ф.Смірноў [325]. З прыведзеных аўтарам матэрыялаў можна зрабіць выснову аб тым, што ў канцы 1840-х гадоў адбылася змена складу, характара і метадаў дзейнасці рэвалюцыянераў Беларусі — яны пераходзілі да агітацыі сярод рамеснікаў і асоб «простага стану», а польскі патрыятызм адышоў на задні план. С.Кіневіч у згаданым намі падручніку, апісваючы падзеі 1848 г., засяродзіў увагу на дзейнасці «Саюза літоўскай моладзі», яго кантактах са студэнцкім гуртком З.Серакоўскага, які ў сваю чаргу меў сувязі з петрашэўцамі. Відаць, таму распаўсюджваліся на землях Беларусі сачыненні апошніх [590, с.192—194].

Такім чынам, літаратуры па эміграцыі з зямель Беларусі няма. Фрагментарныя факты, падзеі сустракаюцца ў польскіх працах, але ў іх яны разглядаюцца як польская гісторыя. Не выўлены сувязі польскай эміграцыі з землямі Беларусі, хвалі і месцы беларускай эміграцыі, дзейнасць яе цэнтраў.

Пэўныя дасягненні ёсць у даследаванні дзейнасці на землях Беларусі патаемных таварыстваў. Два артыкулы з аднолькавай назвай «О тайных обществах в учебных заведениях Северо-западного края при князе А.А.Чарторийском» напісаў С.Шалковіч [522, 523]. Яму ж належыць артыкул «Польская пропаганда в учебных заведениях Северо-западного края» [524]. Шалковіч распавёў аб дзейнасці такіх таварыстваў, як: шубраўцы, філаматы, філарэты, прамяністыя, «Навуковае», «Маральнае». Ён падкрэсліў іх польскую накіраванасць — імкненне да адраджэння РП. У артыкулах знайшлі фрагментарнае адлюстраванне і падзеі 1846-1847 гг. у навучальных установах Беларусі. М.І.Каробка звярнуў увагу

на дзейнасць на землях Беларусі Патрыятычнага таварыства, на сувязь з ім студэнцкіх арганізацый праз Т.Зана. Матэрыялы аб таварыствах філаматаў, філарэтаў, прамяністых, характарыстыкі Ф.Чацкага, І.Лялевеля, А.Чартарыйскага ёсць у «Исторических заметках» П.Кукальніка [192].

У 1950-я гады дзейнасць патаемных таварыстваў на землях Беларусі закранулі ў сваіх публікацыях С.С.Ланда, У.А.Варанкоў, П.М.Альшанскі. Ланда дзве працы прысвяціў ролі А.Міцкевіча ў стварэнні і дзейнасці таварыстваў філаматаў і філарэтаў, паказаў яго сувязі з навагрудскімі масонамі і іншымі патаемнымі таварыствамі. Упершыню ў рускай літаратуры напісана аб патаемных «Таварыстве сяброў», «Таварыстве вольных палякаў» [196, 610]. Варанкоў расказаў аб дзейнасці польскіх гурткоў моладзі ў Літве і Беларусі. Ягоныя матэрыялы мала чым адрозніваюцца ад прац С.Шалковіча [58, 59]. Значная частка артыкула Альшанскага «К вопросу о связях декабристов с польским освободительным движением…» прысвечана Таварыству ваенных сяброў. Аўтар паказаў ролю М.Рукевіча ў яго стварэнні, дзейнасць Ф. Ляховіча па арганізацыі патаемных таварыстваў у Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях, кантакты Таварыства ваенных сяброў з рускімі рэвалюцыянерамі. Нельга пагадзіцца з Альшанскім, калі ён сцвярджае, што «Ваенныя сябры» па нацыянальнаму складу былі палякамі (40 чал. з 46), бо ў аснову падліку было ўзята веравызнанне, а, як вядома, не ўсе католікі — палякі [264].

У беларускай гістарыяграфіі, акрамя нашых прац, трэба адзначыць аповед Б.С.Клейна «Тайна согласных братьев» і шэраг артыкулаў С.Таляронка. Клейн успомніў пра В.Гельтмана, паказаў ролю М.Рукевіча ў арганізацыі таварыства «Згодных братоў» у Свіслацкай гімназіі, паведаміў аб выступленні гімназістаў 3 мая 1824 г. (а не ў канцы года, як ён памылкова ўказаў) і адзначыў уваход некаторых «згодных братоў» (на гэты час «заран») у Таварыства ваенных сяброў [167]. Артыкулы Таляронка паступова раскрываюць гісторыю дзейнасці такіх патаемных таварыстваў і гурткоў, як: Віленская асацыяцыя (1796-1797 гг), свіслацкія «Навуковы» і «Маральны» гурткі, «Заране». Аўтар дае структуру арганізацый, іх актыўных сяброў, апісвае асноўныя этапы дзейнасці і вызначае іх ролю ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе [363, 364, 365]. Аб філаматах-беларусах напісалі І.Бас [30] і К.Цвірка [409].

Асобна трэба адзначыць кнігу Н.І.Махнач «Общественно-политическая и этническая мысль Белоруссии начала XIX в.». Другая глава прысвечана таварыству філаматаў. Коратка падаецца гісторыя таварыства, некаторых яго легальных і паўлегальных арганізацый (філарэты, прамяністыя, «Саюз сяброў», «Навуковае таварыства»), аналізуюцца тры статуты філаматаў і рэарганізацыя адпаведна з ім структуры таварыства. Аўтар нічога не піша аб асобах філаматаў ці філарэтаў, памыляецца ў колькасці «Саюза сяброў» (іх было 20, а не 200) і прамяністых (не 3-4 чал., а каля 50). Трэцяя глава даводзіць да чытача асноўныя грамадска-палітычныя погляды кіраўніцтва філаматычнага таварыства (А.Міцкевіча, Я.Чачота, Ф.Ежоўскага, Т.Зана, М.Рукевіча, Е.Малеўскага): на навуку і літаратуру, ролю моладзі ў жыцці грамадства і асвеце народа і г.д. Але Махнач не падкрэслівае ліцвінскі характар дзейнасці філаматаў і створаных імі таварыстваў [237].

Зразумела, што ў польскай гістарыяграфіі не маглі не звярнуць увагу на дзейнасць патаемных таварыстваў на тэрыторыі былога ВКЛ. Яшчэ ў 1886 г. Ст.Мумідлоўскі надрукаваў артыкул аб духоўнай натуры і этнічных поглядах заснавальнікаў і кіраўнікоў таварыства філаматаў і філарэтаў, «Навуковага таварыства», прамяністых [639]. Ш.Аксеназы напісаў двухтомную працу аб Лукасінскім, дзе, спасылаючыся на выдатную базу (дакументальныя крыніцы, якія адкладаліся ў патаемнага таварыства і ўрадавых установаў), расказаў аб віленскай правінцыі Патрыятычнага таварыства, распаўсюджванні Нацыянальнага масонства на землях Беларусі, следстве над філарэтамі і сябрамі свіслацкіх «Заран», месцы Беларусі ў адносінах Аляксандра І да Напалеона [542]. А. Краўшар у сваім артыкуле ўказвае на існаванне ў Віленскім універсітэце ў 1827 г. арганізацыі пад назваю «Ілемя сарматаў, або каханкаў Айчыны» [604]. К.Менжыцкі свой артыкул прысвяціў патрыятызму філаматаў і іх адносінам да Расіі. Раскрываецца гэтае праз карэспандэнцыю, прамовы на паседжанні, паэтычныя творы філаматаў [623].

Даволі рэдкія матэрыялы знаходзяцца ў працах М.Вержкоўскага і З.Судольскага. Першы дае звесткі аб віленскім гуртку Я.Вазнякоўскага [685]. Другі ў выдатнай кніжцы «Міцкевіч» прывёў дадзеныя аб Таварыстве Літоўскіх і Рускіх зямель у эміграцыі [678].

Такім чынам, наяўнасць літаратуры дазваляе ўзняць пытанне аб стварэнні агульнай комплекснай карціны грамадска-палітычнага жыцця ў адзіна магчымай тады форме патаемных таварыстваў і аналізу іх дзейнасці, сувязяў паміж сабой. Неабходна падкрэсліць зацікаўленасць сяброў гурткоў і таварыстваў беларускасцю, выправіць памылкі ў датах іх існавання, колькасці сяброў, фактах дзейнасці.

Шматлікія матэрыялы аб лёсе зямель Беларусі ў паўстанні 1794 г. знаходзяцца ў польскай літаратуры. Яшчэ ў 1917 г. Г.Масціцкі на якаснай дакументальнай базе напісаў кнігу «Генерал Ясінскі і касцюшкаўскае паўстанне» [634]. Мы звярнулі ўвагу на тое, што і А.-Т.Касцюшка, і літоўскі ўрад, і Найвышэйшая Нацыянальная рада глядзелі на землі былога ВКЛ як на частку РП. Гэта відаць праз іх звароты да ліцвінаў і войска. У дадатку кнігі ёсць крыніцы і даволі значная частка дакументаў, якія на сённяшні дзень амаль не даступныя для даследчыкаў. Значнае месца займае паўстанне 1794 г. і ў такім творы Масціцкага, як «Пасляпаўстанцкая гісторыя Літвы і Русі» [633]. Даволі падрабязна разглядаюцца розныя праблемы: баявыя дзеянні, радыкалізм Ясінскага, сепаратызм ВКЛ, дзеянні рэвалюцыйных улад, партызанскія рэйды на Белую Русь, значэнне паўстання на Беларусі і Літве. Тры працы Л.Жытковіча таксама паглыбляюць веды пра паўстанне 1794 г. на землях Беларусі. У адной з іх ён раскрывае структуру і дзейнасць скарбавай камісіі ВКЛ з красавіка па кастрычнік 1794 г. [703]. У другой адным з першых адзначыў сепаратызм ВКЛ, які, на погляд Жытковіча, тычыўся не ідэалогіі, а арганізацыі паўстання, яго асобнай улады (Найвышэйшай Літоўскай рады) і яе радыкальнай дзейнасці [704]. У трэцяй Жытковіч паказаў Я.Ясінскага як супрацоўніка Ваеннай камісіі ВКЛ і чалавека, кантакты якога з Таргавіцкай канфедэрацыяй былі «ў дасканалай гармоніі» [705, с.182].

Кніга А.Прухніка «Касцюшкаўская дэмакратыя» змяшчае матэрыялы аб дзейнасці паўстанцкага ўрада ў Варшаве і поглядах Касцюшкі на будучую РП (якая ўключала землі Беларусі), да якой можна прыйсці праз ваенна-народную рэвалюцыю [653]. Б.Ліманоўскі ў «Гісторыі польскай дэмакратыі» асноўную ўвагу звярнуў на адносіны да паўстання сялян, мяшчанства, фальварачнай шляхты, прызнаў змену характара паўстання пасля адхілення Ясінскага ад кіраўніцтва літоўскім войскам, лічыў, што паўстанне ў ВКЛ не мела якабінскага характара, хаця і

выкарыстоўваліся карныя меры супраць здраднікаў [615]. Аб якабінскіх поглядах паўстанцаў 1794 г. піша ў сваёй кнізе «Польскія якабінцы. Старонка з гісторыі інсурэкцыі 1794 г.» Б.Леснадорскі [612]. Ён даказвае на фактах значны радыкалізм паўстання на землях ВКЛ і іншае разуменне лозунга «вольнасць, роўнасць, незалежнасць». Пра радыкалізм паўстанцаў-ліцвінаў піша і Р.Ясеніца ў кнізе «Рэчпаспалітая Абодвух народаў». Пры гэтым заўважае, што Ясінскі — вялікапалянін, а Касцюшка — ліцвін з Беларусі. Ён сцвярджае, што па сутнасці было тры паўстанні: кракаўскае, варшаўскае і ліцвінскае. «Кінуліся ў бой, — чытаем мы, — сіямскія сёстры, Карона і Літва. Павінны і жадалі ісці разам, але кожная пад уласным імем і з уласным тварам» [586, с. 532, 533, 560].

Асобна адзначым працы Е.Урвановіча і А.Вальтаноўскага аб паўстанні ў Гродне. У сумесным артыкуле яны, абапіраючыся на дакументы Гродзенскай парадкавай камісіі, сцвярджаюць, што мабілізацыя жыхароў павета ішла вельмі марудна, таму хутка была створана толькі муніцыпальная міліцыя. За рэкрута ішла барацьба паміж парадкавай камісіяй, магістратам, генерал-маёрам паспалітага рушэння К.Ельскім і муніцыпальнай дэпутацыяй [683]. Вальтаноўскі ў артыкуле «Гродна ў касцюшкаўскім паўстанні» расказаў аб Гродзенскай парадкавай камісіі, дзейнасць якой упэўніла нас у тым, што не тэрор быў галоўным, а мабілізацыя войска і яго забеспячэнне. У Гродне нейкі час знаходзілася Цэнтральная дэпутацыя, вакол горада канцэнтраваліся літоўскія сілы, якія адышлі на Варшаву ў пачатку кастрычніка 1794 г. Вальтаноўскі слушна піша аб запаволенасці рэагавання літоўскіх улад на рашэнні Варшаўскай ННР [688].

У беларускай літаратуры найбольш значныя творы аб паўстанні 1794 г. выйшлі з-пад пяра Я.Юхо, У.Емяльянчыка, Я.Анішчанкі. Першыя два даследчыкі ў 1994 г. выдалі кніжку «Нарадзіўся я ліцвінам...»: Тадэвуш Касцюшка», у якой расказалі не толькі аб лёсе нацыянальнага героя некалькіх краін, але і пра паўстанне на землях ВКЛ [535]. Больш падрабязна і глыбей раскрывае праблемы паўстання Емяльянчык у манаграфіі «Паланез для касіянераў»: баявыя дзеянні, дзейнасць паўстанцкіх уладаў, характарыстыка дзеючых асоб, праца следчай камісіі і «асобага камітэта» [114]. Нас найбольш зацікавілі старонкі, прысвечаныя сепаратызму Літвы, радыкалізму Ясінскага, ролі ВКЛ у паўстанні, дзейнасці Літоўскай рады.

Розныя бакі паўстання 1794 г. на землях Беларусі разглядае ў сваіх артыкулах, нестандартных і заснаваных заўсёды на добрых дакументальных крыніцах, Я.Анішчанка. У публікацыі «Паўстанне 1794 г.: Змаганне за народ» ён добра заўважыў, што паслы Гродзенскага сейма 1793 г. здалі Расіі не свае землі і маёнткі, а землі ВКЛ, што паўстанне насіла шляхецкі характар. Выклікае цікавасць маёмасная характарыстыка тытулаваных сяброў Літоўскай рады, з якой відаць, якія былі там «прыхільнікі грамадскай роўнасці». Нельга пагадзіцца з сцвярджэннем, што большасць выканаўчых органаў стваралася ў якасці рэпрэсіўна-карных устаноў» [9,с.234]. Адзін з артыкулаў Анішчанкі прысвечаны выключна «шляхецкай Вандэе» падчас паўстання на землях Беларусі. Ён сцвярджае, што «ў паўстанні выдатна спалучыліся тэрарыстычная рашучасць якабінца Ясінскага з прыстасаваннем знаці» — 12 з 29 сяброў Літоўскай рады ўдзельнічалі ў працах соймавых камісій у Гродне 1793 г. [8]. У адным з артыкулаў Анішчанка аналізуе адозвы літоўскага паўстання, каб адмоўна адказаць на пытанне: «Ці можна лічыць паўстанне 1794 г. зыходнай кропкай у станаўленні беларускай самасвядомасці?» [12]. Цікавая яго думка аб тым, што літоўскі ўрад нельга лічыць больш радыкальным, чым Касцюшку, бо той хаця б на час паўстання, але вызваліў сялян ад прыгонніцкіх прац. У артыкуле «Канец прахаднога двара» Анішчанка назваў паўстанне Я.Ясінскага «звычайнай палацавай рэвалюцыяй — адна гродзенская хеўра скінула ва ўладзе другую, найбольш агідную [10, с.5]. Мы не можам з гэтым пагадзіцца, бо маштаб разгортвання паўстання, яго лозунгі і метады дасягнення ніяк не нагадваюць простую змену дэкарацый пры пераходзе ўлады ад адной кіруючай групоўкі да другой. У артыкуле «Статут жыцця Ясінскага» Анішчанка паказвае стварэнне Ясінскім патаемнай арганізацыі, падобнай брамінскай, пра якую ён напісаў твор. Звяртаецца ўвага на тое, што змоўшчыкі ставілі мэтай вяртанне ў РП усіх зямель, захопленых у выніку трох падзелаў, а значыць, і ВКЛ. Даецца адмоўная характарыстыка паўстанцаў-арыстакратаў і часткова прыводзяцца прычыны іх вымушанага ўдзелу ў паўстанні [16].

Такім чынам, наяўнасць літаратуры дазваляе вырашаць пытанні комплекснага паказу сепаратызма, радыкалізма і якабізма паўстання 1794 г. на тэрыторыі былога ВКЛ, дзейнасці ліцвінскіх органаў паўстання, ролі і значэнні зямель Беларусі ў «рэчапаспаліцкім» паўстанні.

Па праблемах масонства найбольш значныя працы напісаны польскімі даследчыкамі. Ужо ў 1899 г. С.Заленскі выдаў кнігу «Аб масонстве ў Польшчы...», у якой мы знайшлі матэрыял аб дзейнасці масонскіх ложаў на землях Беларусі, спісы іх братоў, аб палітычных поглядах масонаў, аб іх уплыве на стварэнне палітычных арганізацый і патаемных таварыстваў [695]. Глыбокімі па зместу з'яўляюцца працы С.Малахоўскага-Лемпіцкага. У кнізе «Вольнамулярства на землях былога ВКЛ (1776 — 1822)» ён зрабіў кароткі агляд гісторыі масонства Польшчы і ВКЛ, звярнуўшы большую ўвагу на сімволіку, унутранае жыццё братоў і іх абавязкі, рэформу Я.Шымкевіча [620]. У «Пераліку польскіх ложаў...» Малахоўскі-Лемпіцкі прывёў спісы ложаў, іх братоў з пазначэннем (па магчымасці) свецкіх і масонскіх пасадаў [621]. Не менш цікавыя кнігі Л.Гаса (да 1957 г. — грамадзянін СССР), адна з якіх мае беларускія матэрыялы: «Масонства ў сярэдне-ўсходняй Еўропе ў XVIII і XIX ст.» [581]. Савецкі гісторык М.Ф.Зубкоў даў ёй слушную характарыстыку: «па-першае, напісана яна галоўным чынам на аснове архіўных дакументаў, упершыню ўводзімых у навуковы зварот, і вельмі рэдкай гістарыяграфіі вывучаемых эпох; па-другое, даследванне пабудавана на строга навуковых прынцыпах, аўтар імкнецца паслядоўна прасачыць дыялектычную сувязь масонства са складаным грамадска-палітычным развіццём дзяржаў, краін і народаў гэтага вялізнага рэгіёну» [131, с.128]. Менавіта апошняе цікавіла нас асабліва, бо масонства было прадвеснікам і спадарожнікам палітычных партый. Я.Рушкоўскі ў кнізе пра А.Міцкевіча паказаў сувязі Я.Шымкевіча з шубраўцамі і К.Кантрымам, звярнуў увагу на сутнасць рэформы Шымкевіча: змена характара масонства ад антыўрадавай арганізацыі да легальнай дзейнасці [657].

З расійскай літаратуры ўзгадаем працы С.Ф.Дабранскага «Очерки из истории масонства в Литве» і «Масонские ложи в Литве», выдадзеныя ў Вільні. Аўтар напісаў аб палітычных поглядах беларуска-літоўскіх масонаў (іх адносіны да адраджэння Рэчы Паспалітай, спробы вызвалення сялян ад прыгонніцтва), рэформе Шымкевіча, «справе Міцканеўскага», пячатках масонскіх ложаў [100,101]. У кнізе А.Пыпіна «Русское масонство...» ў храналагічным паказчыку рускіх ложаў знаходзім масонскія ложы на землях Беларусі [299].

Ёсць некалькі прац савецкіх даследчыкаў, у якіх знаходзіцца беларускі матэрыял. С.С.Ланда ўспомніў пра

навагрудскіх масонаў у публікацыі «У истоков «Оды к юности» [196, с. 48—50]. А.Ф.Салаўёў назваў некаторыя беларускія ложы ў кнізе «Масонство в России» [333]. А.І.Серкоў апублікаваў артыкул «Масонские ложи на территории Белоруссии и движение декабристов», у якім пералічыў ложы на землях Беларусі, назваў некаторых братоў і паказаў іх удзел у дзекабрысцкім руху [320]. А.Платонаў у кнізе «Терновый венок России» з расійскіх велікадзяржаўных пазіцый настойліва называе землі Беларусі «заходнімі губерніямі Расіі», а таварыства філаматаў — масонскай арганізацыяй, абвінавачвае польскі нацыянальны рух у закліках да ваеннай барацьбы з Расіяй, а дзекабрыста М.Мураўёва — у «расчленении» Расіі, бо ствараў дзяржавы, у тым ліку Заходнюю [286, с.92]. Прозвішчаў масонаў з былога ВКЛ у «Масонской галерее России», складзенай аўтарам, змешчана няшмат [286, с.108 — 161].

У беларускай гістарыяграфіі прац аб масонстве толькі некалькі. У невялікім артыкуле «Менскія варштаты ў 1-й чвэрці XIX стагодзьдзя» С.Рыбчонак на падставе дзвюх архіўных спраў расказаў аб ложах «Паўночная паходня» і «Гара Табар». У дадатках ён прывёў спісы братоў гэтых ложаў [309]. М.Рыбко ў артыкуле «Масонства» коратка, як патрабуе энцыклапедыя, даў пералік ложаў на землях ВКЛ, назваў майстроў і выдатных братоў, колькасць масонаў у ложах, іх погляды і ўплыў на дзейнасць патаемных таварыстваў [308, с.91-92]. На сувязь масонства з культурай, на ўдзел у ложах яе некаторых дзеячоў і масонскую сімволіку звярнула ўвагу ў сваёй кнізе «Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур...» С.Я.Куль-Сяльверстава [193].

Такім чынам, упершыню ёсць магчымасць з выкарыстаннем набыткаў літаратуры і новых крыніц напісаць комплексную гісторыю літоўска-беларускіх ложаў польскага і рускага масонства, вызначыць ролю братоў у грамадска-палітычным жыцці, іх сувязі з ложамі Расіі і Польшчы. Неабходна паказаць барацьбу апошніх за братоў з масонскіх ложаў зямель Беларусі.

Гістарыяграфічнаму аналізу тэмы «Дзекабрысты і Беларусь» былі прысвечаны нашы публікацыі «Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў» і «Декабристы и Белоруссия» [423, 439], таму адзначым не напісаныя намі сюжэты і сканцэнтруем увагу на праблеме «Барацьба за землі Беларусі паміж дзекабрыстамі і сябрамі польскага Патрыятычнага таварыства». Не пісалі мы аб тым, хто даследаваў пытанне аб месцы Беларусі ў канстытуцыях дзекабрыстаў. З савецкіх

гісторыкаў закрануў гэтую праблему М.М.Дружынін у кнізе пра дзекабрыста М.Мураўёва і ягоны канстытуцыйны праект. Гісторык прааналізаваў тры варыянты і паказаў, што спачатку беларускія землі стваралі асобную «дзяржаву» з самастойнымі заканадаўчай і выканаўчай уладамі, але па трэцяму варыянту ўсе «дзяржавы» ператварыліся ў звычайныя вобласці, прыраўненыя да генерал-губернатарстваў [106]. Нацыянальнае пытанне ў праграме дзекабрыстаў разглядаюць у сваіх артыкулах А.П.Грыцкевіч і В.М.Чарапіца. Першы прыйшоў да высновы, што П.Песцель у адрозненне ад М.Мураўёва быў ворагам федэратыўнага ладу і прыхільнікам адзінай і непадзельнай Расіі, жадаў аб'яднаць усе плямёны ў «адзіны Народ» і ішоў на ўступкі польскім рэвалюцыянерам за кошт беларускіх зямель [82]. В.Чарапіца больш звярнуў увагу на тое, што Мураўёў падзяліў землі Беларусі на дзве «дзяржавы», вызначыў адмоўную рэакцыю К.Рылеева на прапанову Песцеля аддаць «заходнія землі Расіі» Польшчы [418].

Яшчэ адзін маладаследаваны аспект — роля зямель Беларусі ў «маскоўскай змове» дзекабрыстаў. Упершыню пра гэта напісаў дзекабрыст М.Тургенеў у кнізе «Россия и русские»: абяцанне Аляксандра I далучыць землі Беларусі да Каралеўства Польскага выклікала да жыцця «маскоўскую змову» 1817 г. сяброў Саюза выратавання [381]. І.Беккер у артыкуле «Декабристы и польский вопрос» звярнуў увагу на ліст С.П.Трубяцкога, які прывёў да бурлівых паседжанняў у Маскве і змовы 1817 г. [33]. Вядомая дзекабрыстазнаўца М.В.Нечкіна ў манаграфіі «Движение декабристов» лічыла натуральным, што дзекабрысты разглядалі далучаныя да Расійскай імперыі тэрыторыі «исконно русскими землями», таму намеры Аляксандра I аднавіць Польшчу ў межах 1772 г. выклікалі іх адэкватную рэакцыю: забіць імператара, які «ненавидит Россию» [257, т.1, с.176]. В.П.Паўлава ва ўступным артыкуле да публікацыі мемуараў С.П.Трубяцкога паказала ролю дзекабрыста ў абмеркаванні планаў «маскоўскай змовы» [271].

Землі Беларусі адыгрывалі важную ролю ў кантактах дзекабрыстаў і сяброў польскага Патрыятычнага таварыства. Узгаданы І.Беккер пастаўленую ў загаловак артыкула праблему раскрываў праз наступныя сюжэты: «маскоўская змова» 1817 г., будучае ўладкаванне Польшчы, праца М.С.Луніна «Взгляд на польские дела», перамовы паміж дзекабрыстамі і сябрамі Патрыятычнага таварыства ў 1824 і 1825 гг. [33]. Сувязям дзекабрыстаў з Патрыятычным таварыствам і іншымі

польскімі таварыствамі прысвяціў шэраг прац П.Альшанскі [262—265]. У іх ён паказаў, што рускія і польскія рэвалюцыянеры вялі барацьбу за адны і тыя ж ідэалы — гэта стварала ўмовы для іх кантактаў: Паўночнага таварыства з філаматамі і Таварыствам ваенных сяброў, Паўднёвага таварыства з філаматамі і Патрыятычным таварыствам, Таварыства злучаных славян з філаматамі. Альшанскі піша аб ролі Літоўскага корпуса ў перамовах дзекабрыстаў-паўднёвікаў з польскімі патрыётамі, аб дзейнасці М.Луніна, які там служыў у Гродзенскім гусарскім палку, аб стварэнні ў корпусе Таварыства ваенных сяброў. Артыкул В.М.Чарапіцы «Предоставим народам право решить...» прысвечаны перамовам дзекабрыстаў з прадстаўнікамі Патрыятычнага таварыства. Аўтар даказвае, што П.Песцель не праяўляў «вялікадзяржаўнага рускага шавінізму», а прапаноўваў правесці рэферэндум на спрэчных беларускіх тэрыторыях [418, с.82]. На нашу думку, да гэтага Песцеля прымусілі польскія патрыёты, якія не жадалі падтрымліваць адносіны без уступкі зямель Беларусі. Аб будучай руска-польскай мяжы, нерашучай і часам варожай пазіцыі Патрыятычнага таварыства да руху дзекабрыстаў, паўстанні Таварыства ваенных сяброў піша ў кнізе «Дзекабрысты і Польшча» польскі даследчык Л.Баумгартэн [550].

Такім чынам, комплекснага даследавання беларускіх старонак руху дзекабрыстаў да выхаду нашай кнігі не было. У дадзеным даследаванні, акрамя вырашаных раней пытанняў, звернута ўвага на месца зямель Беларусі ў нацыянальных праграмах дзекабрыстаў і польскага Патрыятычнага таварыства, «беларускі» ўплыў на «маскоўскую змову» дзекабрыстаў у 1817 г., месца зямель Беларусі на перамовах дзекабрыстаў і сяброў Патрыятычнага таварыства.

Гістарыяграфічны аналіз па праблеме «Паўстанне 1830-1831 гг. і Беларусь» зрабіла ў сваёй кандыдацкай дысертацыі В.В.Гарбачова [73], таму мы звернем увагу на некаторыя працы, якія больш важныя для нас, і на тыя, якія выйшлі пасля 1995 г. У польскага даследчыка А.Вратноўскага мы знайшлі цікавую думку наконт плана вядзення Лістападаўскага паўстання: ён лічыў, што трэба было яго весці не паміж Нёманам і Віслай, а на Дзвіне [689]. Ш.Аскеназы напісаў артыкул аб агітацыйных матэрыялах і дакументах рэвалюцыйнага сената, з якога мы ўбачылі яго зацікаўленасць у распаўсюджванні паўстання на тэрыторыю зямель Беларусі [574].

Два рускія даследчыкі, Ф.Сміт і А.Пузырэўскі, даволі падрабязна апісалі баявыя дзеянні рускіх і польскіх войск, падзеі на землях Беларусі [328, 296]. Аб сацыяльным складзе ўдзельнікаў паўстання па матэрыялах заходніх губерняў Расійскай імперыі напісалі артыкул В.А.Дзякаў, У.М.Зайцаў і Л.А.Абушэнкава [109].

У беларускай гістарыяграфіі адзначым публікацыю І.Г.Шпілеўскага і Л.А.Бабровіча «Сінхраністычная табліца падзей паўстання на Беларусі, Літве і Польшчы ў 1830 – 1831 гг.» [527], дадзеныя якой былі выкарыстаны намі пры складанні сваёй храналогіі паўстання на землях Беларусі. Для гэтага былі карысныя і такія працы, як: «З хронікі баявых сутычак паўстанцаў» А.Філатавай [397], «За землю і за волю» Э.Зайкоўскага [125]. Кандыдацкую дысертацыю «Восстание 1830-1831 гг. на Беларуси» абараніла ў 1995 г. В.В.Гарбачова. Яна апісала падзеі паўстання (але даволі коратка) і сацыяльны склад яго ўдзельнікаў, высветліла вынікі паўстання для Беларусі [73]. Каштоўнасць дадзенай працы зніжаецца нявыкарыстанасцю багатых матэрыялаў гістарычнага архіва ў Гродне і польскіх дакументальных крыніц і літаратуры. Аб арганізацыі і асобах паўстання напісаў артыкул М.У.Смяховіч [330]. Брашуру «Гародня ў паўстанні 1830-31 гг.» выдаў С.Данскіх, але самастойнага значэння яна не мае, бо складзена з вядомых папулярных прац (у тым ліку ў значнай меры з нашых). Ён раскрыў становішча Гродна напярэдадні паўстання, падзеі ў горадзе, дзеянні эмісараў польскай эміграцыі М.Валовіча і М.Шыманскага [92].

Такім чынам, патрэбна зрабіць аналіз дакументаў рэвалюцыйнай улады і вызначыць ролю і значэнне зямель Беларусі ў Лістападаўскім паўстанні, паказаць партызанскі рух, ахарактарызаваць дзейнасць Віленскага цэнтральнага паўстанцкага камітэта і Цэнтральнага польскага Часовага ўрада ў Літве, дзейнасць рэгулярных польскіх войск на землях Беларусі.

Апошняя праблема, якая цікавіла нас пры даследаванні грамадска-палітычнага жыцця на землях Беларусі – першы этап беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Ф.Ф.Турук у сваёй брашуры аб беларускім руху лічыў, што ён пачаўся пасля паўстання 1830-1831 гг., і формай яго праяўлення было аднаўленне беларускай пісьменнасці ў дзейнасці пісьменнікаў і вучоных мясцовага паходжання. Ён звяртае ўвагу на новы тып беларускага патрыёта – беларус па паходжанню, паляк па

нацыянальнасці (gente russus albus, natione Polonus). У публікацыях А.Станкевіча «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення», «Расказы з гісторыі», «Беларускі хрысціянскі рух» называюцца пачынальнікі беларускага культурнага адраджэння (ксёндз Магнушэўскі, П.Багрым, А.Рыпінскі, В.Равінскі і іншыя), падкрэсліваецца роля Віленскага універсітэта, дзе працавалі дзеці уніяцкіх святароў І.Даніловіч, І.Анацэвіч, А.Марціноўскі, П.Сасноўскі і з якога выйшлі беларускія літаратары-рамантыкі і вучоныя [343, 344, 666].

Пасля звыш трыццацігадовага маўчання па гэтай праблеме з'явілася праца З.Я.Тальвірскай «Некоторые вопросы общественного движения в Литве и Белоруссии в конце 50-х — начале 60-х годов и подпольная литература», у якой звяртаецца ўвага на ліцвінскі патрыятызм апалячанай шляхты і сепаратызм, які назіраўся як сярод «белых», так і сярод «чырвоных» напярэдадні паўстання 1863 г. Аўтар адзначае тры цэнтры складвання беларускай інтэлігенцыі (Вільна, Мінск, Віцебск) і ролю ў іх А.Кіркора, В.Дуніна-Марцінкевіча, А.Вярыгі-Дарэўскага [357]. Я.Карнейчык у гістарычным нарысе «Беларуская нацыя» выдзеліў для беларускага нацыянальнага руху спецыяльную главу, але пачаў свой агляд з 1863 г., бо лічыў яго адпраўным пунктам [155].

У шэрагу прац скрупулёзны даследчык беларушчыны XVIII — XIX стст. А.Мальдзіс данёс да нас матэрыялы замежных бібліятэк і архіваў, якія знаёмяць са станаўленнем новай беларускай літаратуры і пачынальнікамі беларускага адраджэння [217—219]. Аб гэтых праблемах пісалі А.А.Лойка ў «Гісторыі беларускай літаратуры» [206], Г.В.Кісялёў у кнігах «Героі і музы» і «Ад Чачота да Багушэвіча» [163, 164], У.Мархель у кнізе «Крыніцы памяці» [223]. Яны звярнулі ўвагу на сувязь літаратуры з нацыянальным рухам, уплыў пачынальнікаў на сучаснікаў і на сваіх паслядоўнікаў канца XIX — пачатку XX стст. У «Очерках истории науки и культуры» шэраг артыкулаў (Д.У.Карава, В.К.Бандарчыка, А.С.Фядосіка, М.Ф.Гуліцкага) прысвечаны праяўленням нацыянальнага беларускага руху першай паловы XIX ст. [45, 86, 153, 392].

Беларускі гісторык з Беластоку А.Латышонак у артыкуле «Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі» даказаў, што нельга гаварыць пра «адраджэнне» беларускай нацыянальнай думкі толькі ў XIX ст., бо працэс станаўлення беларускай нацыі («найперш супольнасці ідэйнай») непарыўны і ахопліваў «дзьве

суседнія паловы XVIII і XIX стст». Ён лічыць, што беларускую нацыянальную ідэю стварылі «не шляхецкія паэты і рэвалюцыянеры, а гістарычна адукаваныя спакойныя паповічы» (І.Даніловіч, М.Бабpoўcкі, І.Анацэвіч, П.Сасноўскі, Я.Ярашэвіч); што «пруская Беласточчына для Беларусі адыграла выключную ролю ў станаўленні нацыянальнай свядомасці» [200, с.14]. У сваёй другой працы «Беларускае асветніцтва» Латышонак сцвярджае, што «нацыянальнае беларускае асветніцтва» існавала ў святле (ці цені) польскага асветніцтва, што беларуская нацыянальная свядомасць у перыяд першай трэці XIX ст. яшчэ не сфарміравалася, нягледзячы на намаганні уніяцкага духавенства — прадвеснікаў беларускага адраджэння [616, с.35].

Спробу вызначэння тэрміна «нацыянальная свядомасць» здзейснілі ў сваіх публікацыях З.Шыбека і У.Філякоў [530, 400]. Храналагічныя рамкі дваранскага (шляхецкага) перыяду вызваленчага руху на Беларусі (1794—1863 гг.) былі вызначаны А.П.Грыцкевічам у артыкуле «Беларуская шляхта» [81]. Пытанням гістарычнай самасвядомасці і яе ролі ў росце нацыянальнай самасвядомасці беларусаў прысвечаны працы Д.Карава [152], І.Запрудскага [130], В.Грыцкевіча [84]. Аб сэнсе беларускай ідэі, этапах яе развіцця і яе носьбітах ад Ф.Скарыны да Ф.Багушэвіча напісаў акадэмік Р.Г.Гарэцкі [70]. На ролю мовы ў фарміраванні беларускай самасвядомасці звярнулі ўвагу ў сваіх кнігах Т.М.Мікуліч і Л.Лыч. Першая аўтар-мовазнавец лічыць, што ў даследуемы намі час этнічная самасвядомасць аформілася і адбыўся працэс стварэння беларускай літаратурнай мовы на новай народнай падставе [229, с.83]. Гісторык Лыч, акрамя таго, звярнуў увагу на нацыянальна-культурны ўціск беларускага народа і асвятліў іншыя прычыны стрымлівання фарміравання яго нацыянальнай свядомасці [211].

М.Я.Сямёнчык у артыкуле «Да пытання аб становішчы беларускага народа ў мікалаеўскую эпоху (1825 — 1855 гг.)» прапанаваў разглядаць працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці ў асяроддзі розных сацыяльных пластоў і прадпрыняў спробу такога падыходу. Ён прыйшоў да высновы, што жыхары Беларусі ў даследаваны час мелі «пэўныя ўяўленні» аб сабе як адзінай сацыяльнай супольнасці, небеларуская шляхта стала зачынальніцай беларускага Адраджэння, а ўздым навуковай цікавасці да мінуўшчыны ВКЛ адбываўся ў рэчышчы польскай ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай. Апошняе сцвярджэнне аўтара, на наш погляд, аднабаковае. Сямёнчык

памыляецца, калі піша, што група віленскіх прафесароў, якая стала прадвеснікам беларускага Адраджэння, «усведамляла сябе палякамі» [352, с.27]. Як мы пісалі вышэй, яны лічылі сябе ліцвінамі. Гэта ж пісаў і польскі даследчык Б.Белаказовіч. У адрозненне ад Сямёнчыка, які называе Віленскі універсітэт «цэнтрам польскага вальнадумства» [553, с.25], ён паказвае яго ролю ў фарміраванні беларускай нацыянальнай свядомасці і робіць правільную выснову аб тым, што карыстанне польскаю моваю не ўмаляе ўклад пачынальнікаў- прафесароў універсітэта ў беларускае культурнае адраджэнне.

Такім чынам, патрэбна распрацоўка канцэпцыі першага этапа беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, выдзяленне цэнтраў беларускага інтэлектуальнага жыцця, даследаванне ліцвінскасці адраджэнцаў новай беларускай літаратуры і мовы і «ліцвінскага рэгіяналізма» польскамоўных літаратараў-выхадцаў з зямель Беларусі, вызначэнне ролі уніяцкіх нараджэнцаў, ацэнка прычын стрымлівання нацыянальнага развіцця беларусаў у перыяд 1794—1863 гг.

У агульным падсумаванні трэба адзначыць, што праведзены гістарыяграфічны аналіз паказвае, што на сённяшні дзень адсутнічае комплекснае даследаванне праблемы «Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772—1863 гг.)». Фрагментарна, часам без дастатковага ведання дакументальнай базы, геаграфічна і тэматычна лакальна, аднамерна (аднабакова) разгледжаны такія пытанні, як: падзелы Рэчы Паспалітай, уладкаванне агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, лёс Беларусі ў 1812 г. і паўстаннях 1794 г. і 1830-1831 гг., першы этап беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Нявырашанымі засталіся праблемы расійскай урадавай палітыкі на землях Беларусі, Беларусь у планах дзекабрыстаў, рускае і польскае масонства на яе тэрыторыі. Не былі аб'ектам даследавання ў беларускай гістарыяграфіі такія праблемы, як: палітычная роля расійскай і польскай сістэм адукацыі, месца і роля Беларусі ў польскім пытанні, дэпартацыя і ссылка з зямель Беларусі, «польская» палітычная эміграцыя і яе эмісары на землях Беларусі, стварэнне асобнага Літоўскага корпуса як крок да перадачы былых зямель ВКЛ Каралеўству Польскаму, планы адраджэння ВКЛ у 1810—1815 гг. На даследуемыя намі праблемы трэба было паглядзець праз прызму беларускасці, бо рускія, савецкія, польскія даследчыкі пісалі са свайго пункту гледжання, часам замоўчваючы сапраўдныя факты і падзеі і ствараючы міфы.

# ГЛАВА 2. ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ НА ДАЛУЧАНЫХ ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ

## 2.1. Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі

Палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і рэлігійныя прычыны падзелаў Рэчы Паспалітай больш-менш разгледжаны гісторыкамі тых краін, якія іх ажыццявілі, а ў апошні час і беларускімі вучонымі. Нашай мэтай з'яўляецца выяўленне механізму далучэння Беларусі да Расійскай імперыі і этапаў уваходжання беларускіх зямель у яе межы, вызначэнне віноўнікаў страты Беларуссю дзяржаўнасці і характару сувязі Беларусі з Расіяй, акрэсленне наступстваў далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.

У трактатах, падпісаных паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй, інтэрвенцыя ў Рэч Паспалітую заўсёды матывавалася неабходнасцю стрымлівання на яе тэрыторыі рэвалюцыйнай хвалі і ліквідавання беспарадкаў (па сутнасці грамадзянскай вайны), якія пагражаюць суседнім дзяржавам, а таксама стварэннем для гэтага ў Польшчы адпаведнага іх інтарэсам палітычнага быту [351, с.3]. Тое ж гаварылася ў адпаведных маніфестах, якія абвяшчаліся падчас падзелаў. Напрыклад, у маніфесце генерал-аншэфа М.Н.Крачэтнікава 1793 г. напісана: «... от введения нового пагубного учения, стремящегося к расторжению всех связей гражданских и политических, совесть, безопасность и собственность каждого обеспечивающих, что помянутые враги (маюцца на ўвазе польскія канфэдэраты. — *В.Ш.*) и ненавистники общего покоя, подражая безбожному, неистовому и развращённому скопищу бунтовщиков французских, стараются рассеять и распространить оное по всей Польше и тем самым навеки истребить как собственное её, так и соседей спокойствие» [406, с.174].

Анексіі тлумачыліся «вечными и законными правами» на «рускія» (чытай «беларускія») і польскія землі і неабходнасцю ўзнагародзіць сябе за барацьбу супраць французскай рэвалюцыі. У знойдзеным Я.Анішчанкам дакуменце, датаваным канцом красавіка — маем 1772 г. і, верагодна, напісаным З.Чарнышовым, далучэнне беларускіх зямель да Расіі падкрэслівалася «правам на оные или в удовлетворение тех

претензий, какие Россия от Польши из давних лет имеет...» [14, с.19]. У вышэйзгаданым маніфесце Крачэтнікава гаварылася падобнае: «... в удовлетворение в замену многих своих убытков, так и в предохранение польз и безопасности империи Российской, а равно и самих областей польских...» [406, с. 175].

Расійскія ўлады дзейнічалі выключна ў сваіх інтарэсах, а насельніцтва беларускіх зямель ВКЛ не вяло ніякай барацьбы за далучэнне да Расійскай імперыі (прарасійскія групоўкі магнатаў і шляхты выступалі не за страту дзяржаўнасці, а толькі за ўнію з Расіяй, як раней з Польшчаю), таму слушна піша В.Грыцкевіч, развейваючы міф аб добраахвотнасці далучэння беларусаў да сваіх «рускіх братоў»: «...беларусы ўвесь час імкнуліся з-пад рукі свайго легітымнага спадара — вялікага князя беларуска-літоўскага трапіць у залежнасць да маскоўскага вялікага князя ( потым рускага цара ці пазней імператара)? Што яны ўсе былі ў душы здраднікамі дзяржавы, у якой жылі?» [85, с.179]. Другі міф, які стварыла расійская, а працягвала падтрымліваць савецкая гістарыяграфія, той, што царызм не хацеў прымаць удзел у падзелах Рэчы Паспалітай, а быў да гэтага прымушаны. Кім? М.Каяловіч адказвае: «...думка аб падзеле польскай часткі Польшчы належыць немцам, і на Расію можа толькі падаць славянскі дакор за садзейнічанне такому падзелу Польшчы» [181, с.387]. Але факты гавораць аб актыўным удзеле ўсіх трох захопнікаў зямель былой Рэчы Паспалітай. Трактат 1772 г., падпісаны манархамі Аўстрыі, Прусіі, Расіі, пачынаўся словамі: «У імя Святой Троіцы». Аб ёй піша А.Міцкевіч у сваіх «Кнігах народа польскага і пілігрымства польскага»: «Нарэшце ў ідалапаклончай Еўропе з'явіліся тры каралі: імя першага Фрыдрых Другі Прускі, імя другога Кацярына Другая Расійская, імя трэцяга Марыя Тэрэса Аўстрыйская.

І была гэтая тройца д'ябальская, супраць Божай Тройцы, і была як пасмешышча і пад'южваннем ўсяго, што ёсць святога». І далей: «Гэтая тройца, бачачы, што яшчэ не зусім народы дурныя і змарнаваныя, зрабілі новага ідала, найбрыдшага з усіх, і назвалі гэтага ідала Інтарэс, і такога ідала не ведалі старажытныя паганцы» [625, с.34, 36; 673, с.37].

Менавіта асабістыя інтарэсы абараняла кожная краіна, дзяліўшая Рэч Паспалітую, і вяла ў імя іх складаную дыпламатычную барацьбу. Расію ніхто не прымушаў, ды хто мог прымусіць самадзержыцу Кацярыну II? В.Грыцкевіч піша аб

знаходцы ў архіве знешняй палітыкі Расіі цікавага дакумента, які ляжаў у канверце з надпісам рукой Кацярыны II: «Секретный план, преподнесённый от гр. Чернышёва на С.К.К.П., окроме меня никому не разпечатывать». Чатыры вялікія літары расшыфроўваюцца такім чынам — «на случай кончины короля польского». На гэты выпадак і быў прадстаўлены план падзелу Рэчы Паспалітай, складзены віцэ-прэзідэнтам Ваеннай калегіі З.Р.Чарнышовым. Шостага кастрычніка 1763 г. ён быў прачытаны «на конференции держаной у двора»[85, с.174; 66, с.61].

Аб перапетыях дыпламатычнай барацьбы добра напісалі ў сваёй кніжцы сучасныя польскія даследчыкі Т.Цагельскі і Л.Кандзела. Шматлікія факты, прыведзеныя імі, гавораць аб эвалюцыі палітыкі краін-захопнікаў, прыстасаванні сваіх інтарэсаў да агульных [560]. Таму нельга гаварыць адназначна, што Расія не хацела дзяліць Польшчу ці яе прымушалі рабіць гэта. На розных этапах дыпламатычных перамоў пазіцыі ўсіх трох манархаў не былі статычнымі, улічвалі зменлівасць унутраных і міжнародных умоў.

Вытокі першага падзелу Рэчы Паспалітай трэба шукаць у 1764 г., калі польскім каралём стаў літоўскі стольнік граф Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Яго кандыдатура на прастол разглядалася на надзвычайнай канферэнцыі пры расійскім двары 6 кастрычніка 1763 г. Было вырашана падтрымаць «прыроднага паляка» з Пястаў, якому дапамагала найбольш моцная на той час партыя Чартарыйскіх (Фамілія), і да таго ж былога фаварыта Кацярыны II [66, с.60,70 -71; 648, с.354; 618, с.16]. Кацярына II наконт гэтага гаварыла наступнае: «Станіслаў Панятоўскі быў выбраны Расіяй на польскі прастол, таму што з усіх шукальнікаў ён меў найменей шанцаў і таму найболей павінен быў адчуваць падзяку да Расіі» [251, с. XXXVI].

7 верасня 1764 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі стаў каралём польскім. Не абышлося без дапамогі расійскага войска. Яшчэ на вышэйзгаданай канферэнцыі пры расійскім двары гаварылася: «Утрымліваць тутэйшыя войскі да дзеяння ў Польшчы вызначаныя ў такой гатоўнасці на межах, каб па першаму загаду зараз жа ўступіць туды маглі». Рух расійскіх войск на тэрыторыю Рэчы Паспалітай пачаўся ў сакавіку, а 23 красавіка віцэ-прэзідэнту ваеннай калегіі Чарнышову загадана хутка накіраваць у Літву да Вільні для падтрымкі мясцовай «Генеральнай канфедэрацыі» корпус генерал-маёра І.Рэнекампфа (7431 чал., 2 гарматы). 22 мая ён быў у Полацку,

23 чэрвеня — у Мінску, 27 чэрвеня заняў Нясвіж, а 2 ліпеня — Слуцк. 20 ліпеня Рэнекампф і Бржастоўскі прыбылі ў Гродна. Перад элекцыйным соймам пад Варшавай было сабрана да 12 тыс. расійскага войска, а на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай — 37-44 тыс. чал. [251, с. XXXVII — LVI].

Далей быў сейм 1766 г., на якім галоўным пытаннем па патрабаванню Расіі было дысідэнцкае — прадастаўленне некатолікам (праваслаўным і пратэстантам) некаторых палітычных праў (дапушчэнне іншаверцаў у сейм і іншыя інстытуты дзяржаўнага кіравання пры захаванні пануючай ролі каталіцызма). Польскі даследчык Т.Цагельскі справядліва піша, што «дысідэнтам прызначана роля расійскага інструмента на полі польскай палітыкі». З дысідэнцкім пытаннем шэф расійскай дыпламатыі Мікіта Панін звязваў гарантыі ладу Рэчы Паспалітай. Станіслаў Аўгуст гатовы быў падтрымаць расійскія намаганні, бо пагаджаўся з неабходнасцю прадаставіць абедзвюм галінам хрысціянства вольнасці рэлігійнага культа і роўнасць у правах публічных, але супраць гэтага былі Чартарыйскія. Яны паўплывалі на рашэнне сейма 11 лістапада — дысідэнтам дазваляліся вольнасці культавыя, але не палітычныя.

Кацярына II прадбачыла супраціўленне соймавых паслоў і прадпісала свайму рэзідэнту ў Рэчы Паспалітай М.В.Рапніну сабраць праваслаўных і іншых дысідэнтаў і скласці з іх канфедэрацыю, якая папросіць дапамогі ў Расіі. Тады, быццам саступаючы іх просьбам, можна будзе паслаць рускую армію і вырашыць справу сілаю [178, с.67]. Такім чынам распрацоўваўся механізм, які будзе выкарыстаны на працягу ўсіх трох падзелаў Рэчы Паспалітай. У сакавіку 1767 г. пры падтрымцы Рапніна былі створаны канфедэрацыі: пратэстанцкая ў Торуні для Кароны і кальвінісцка-праваслаўная ў Слуцку для ВКЛ. Абедзве былі прыняты пад «найвысачэйшую пратэкцыю» Кацярыны II, якая паслала ім на дапамогу 40-тысячную расійскую армію. Рапнін стараўся — разаслаў па ўсёй Рэчы Паспалітай дэкларацыю, у якой пісаў, што імператрыца жадае палякам дабра і спакою і таму вымушана паслаць у яе ўладанні войска «для абароны слабых ад магутных». Па дадзеных М.І.Кастамарава, у Польшчы і Літве на працягу 8-10 майскіх дзён 1767 г. адбылося 178 сходаў і запісаліся ў канфедэрацыі 80 тысяч незадаволеных каралём і Чартарыйскімі.

Ад усіх створаных канфедэрацый да Рапніна ў Варшаву ішлі аднолькавага зместу заявы, складзеныя па створанаму

загадзя плану: зліквідаваць вынікі рэформ Чартарыйскіх, захаваць liberum veto, не дазваляць павышаць падаткі і колькасць польскага войска, прасіць імператрыцу прыняць на сябе гарантыі непарушнасці польскага кіравання [178, с.71]. У Радаме было вызначана месца злучэння ўсіх канфедэрацый пад наглядам расійскіх войск на чале з І.А.Ігельстромам. 23 чэрвеня была створана генеральная Радомская канфедэрацыя. Ад яе прадстаўнікоў патрабавалі склікання надзвычайнага сейма для рашэння дысідэнцкага пытання. Спачатку з 88 чалавек толькі 6 безумоўна падтрымалі расійскія жаданні, але арышт і высылка апазіцыйных радамчан (біскупаў К.Солтыка і Ю.Залускага, гетмана В.Ржэвускага і яго сына Северына) і ціск з боку расійскага войска паволі прымусілі і астатніх. Сеймікі таксама праходзілі пад наглядам расійскіх войскаў, якія Рапнін размеркаваў у пунктах магчымага супраціўлення. Сеймікі былі вымушаны прымаць інструкцыі паслам на сейм, праект якіх ім быў прапанаваны (задаволіць жаданні некатолікаў, гарантыі Расіі ўсталявання законаў), і выбіраць у паслы тых, каго прапанавалі Рапнін і Станіслаў Панятоўскі [178, с. 72 -73; 560, с.100 — 101].

У кастрычніку 1767 г. пачаў працу наступны сканфедэраваны сейм, на якім Рапнін хацеў нарэшце пакончыць з дысідэнцкім пытаннем. Цікава звярнуць увагу на механізм яго вырашэння, бо ён будзе выкарыстаны на ўсіх сеймах трох падзелаў Рэчы Паспалітай. Была выбрана дэлегацыя (камісія) з 60 чалавек, якая ў сваю чаргу абрала са свайго складу 14 паслоў. Менавіта яны большасцю галасоў (8 чалавек!) 19 лістапада і вырашылі дапусціць дысідэнтаў да ўсіх пасадаў, акрамя каралеўскай годнасці. Трэба ўлічваць, што дэлегацыя працавала пад дыктоўку Рапніна, пад прымусам расійскага войска (40 тыс. чал.), шырока выкарыстоўваўся подкуп паслоў. У ноч з 13 на 14 кастрычніка былі арыштаваны і высланы ў Калугу апазіцыйныя радамчане (біскупы К.Солтык і Ю.Залускі, гетман В.Ржэвускі і яго сын Северын) [178, с.77 -78].

Таксама вырашаліся іншыя пытанні, якія тычыліся дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай: створаны каталог «кардыянальных праў» («вечных і нязменных прынцыпаў» — вольная элекцыя каралёў, liberum veto і інш.); спіс «дзяржаўных матэрыяў», пры рашэнні якіх права вета не дзейнічае; спіс «эканамічных матэрыяў» [560, с.100-101; 77, с. 278]. Усе пастановы сейма 1767 — 1768 гг. былі ахоплены гарантыямі Кацярыны ІІ. «Тым самым, — слушна піша Т.Цагельскі, —

Расія атрымала поўны кантроль над дзяржаўным ладам Рэчы Паспалітай; кожная змена фармальна патрабавала згоды гаранта. Польшча стала не толькі фактычнай, але і фармальнай васалкай Расіі» [560, с.101]. Нават расійскі гісторык М.І.Кастамараў прызнаў: «Зразумела, што з такой апякункай Польшчы было кепска: у палякаў не было ні самастойнасці, ні сілы, ні дзяржаўнай разважлівасці настолькі, каб Кацярына магла іх паважаць, бо яны нездатныя былі аддацца ёй шчыра і безумоўна, каб яна магла іх палюбіць: яна пагарджалася імі, і гэта пагарда адбілася на ўсіх яе дзеяннях да самага канца» [178, с. 64].

Рашэнні сейма выклікалі да жыцця Барскую канфедэрацыю супраць караля і Расіі, за цэласнасць і незалежнасць дзяржавы. Яна была створана 29 лютага 1768 г. групай былых радомскіх канфедэратаў на чале з Ю.Пуласкім і М.Красінскім. Летам рух канфедэратаў перайшоў з Украіны на тэрыторыю заходняй Малапольшчы, а познім летам і восенню — на Літву і Вялікую Польшчу. Дзейнасць канфедэратаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы каардынавалі члены Галаўнога савета («Генеральнасці») — маршалак М.Пац і камандуючы войскамі Ю.Сапега. Актыўным дзеячом быў князь К.-Ст.Радзівіл (Пане Каханку). Атрады канфедэратаў дзейнічалі ў Берасцейскім і Мсціслаўскім ваяводствах, Ашмянскім, Аршанскім, Браслаўскім і Ваўкавыскім паветах. У Брэсце К.Пулаўскі разбіў рускі атрад, але пазней сам пацярпеў паражэнне.

У кастрычніку 1768 г. канфедэраты пацярпелі паражэнне пад Дзярэчынам (Слонімскі павет), рускія войскі занялі Слуцкую крэпасць і Нясвіж (К.Радзівіл збег і летам 1769 г. выехаў за мяжу, каб знайсці падтрымку з боку Францыі, а пазней Турцыі). У 1769 г. рускія былі разгромлены пад Берастаўіцай, Слонімам, Мышшу. У чэрвені 1770 г. з Літвы на Беларусь перайшоў атрад Ш.Касакоўскага, разгарнуўшы дзеянні ў раёне Мядзеля, Радашковіч, Мінска. Пад іх уплывам зноў абудзілася шляхта Ашмянскага і Браслаўскага паветаў, Мсціслаўскага і Полацкага ваяводстваў. Пад Навагрудкам атрад Касакоўскага быў неўзабаве разбіты. У верасні 1771 г. на бок канфедэратаў перайшоў гетман вялікі літоўскі М.К.Агінскі, але пад Сталавічамі 22 верасня яго трохтысячны атрад быў знянацку разбіты А.В.Суворавым [84, с.400; 178, с. 84,87; 150, с.311-312; 619, с.159-161]. Разгром Барскай канфедэрацыі даў магчымасць прыступіць да першага падзелу Рэчы Паспалітай. Ініцыятарам стала Аўстрыя. Яна стварыла прэцэдэнт падзелу — у лютым 1769 г. адцяла ваенным

кардонам частку польскіх зямель (староства Спіске), агаворваючы свае дзеянні аховаю сваіх межаў ад ваеннай завірухі. У 1770 г. прускі кароль адгарадзіў «санітарным кардонам» Каралеўскую Прусію і частку Вялікай Польшчы.

Менавіта Прусія і стала архітэктарам першага падзелу. 2 лютага 1769 г. у Пецярбург быў пасланы першы праект траістага падзелу Рэчы Паспалітай, восенню 1770 г. — другі. Расійскі кабінет з 1769 па восень 1772 г. ад іх адбіваўся, бо ў перспектыве мроілася поўнае падпарадкаванне РП і нават аб'яднанне з Расіяй у адно палітычнае цела. План захопу Беларусі быў распрацаваны З.Р.Чарнышовым яшчэ на паседжанні 6 кастрычніка 1763 г. Згодна з ім да Расіі адыходзілі Полацк, Віцебск, Орша, Магілёў, Мсціслаўль, а руска-польская мяжа «для лучшей окружности и безопасности» павінна была прайсці па рэках Заходняя Дзвіна і Днепр [66, с.61; 251, с.XXXVII]. Калі міжнародныя абставіны змяніліся, Расія не толькі падтрымала ідэю падзелу Рэчы Паспалітай, але і дзейнічала актыўна і рашуча. 6(17) лютага 1772 г. у Пецярбурзе заключана канвенцыя з Прусіяй, якая вызначала тэрыторыі захопаў кожнага саюзніка і абяцала Аўстрыі адпаведны раўны кавалак здабычы. Польскі гісторык Цагельскі піша: «Прыняты прынцып роўнасці надзелаў прыводзіў да таго, што жадаючы няшмат, Расія прымушала партнёраў да змяншэння сваіх набыткаў» [560, с.125].

19 лютага ( 2 сакавіка) аўстрыйскі імператар і яго маці Марыя-Тэрэзія падпісалі канвенцыі з Расіяй і Прусіяй. Пасля гэтага тры дзяржавы занялі з дапамогай сваіх войск памежныя тэрыторыі і ў Пецярбурзе пачалі перамовы аб дакладным вызначэнні зямель, якія павінна была страціць РП. 25 ліпеня (5 жніўня ) 1772 г. з'явіліся трактаты, падпісаныя паміж Расіяй і Прусіяй, Расіяй і Аўстрыяй. Змест іх быў аднолькавы, а часткова амаль літаральны: вызначаліся тэрыторыі захопаў, і кожная краіна пагаджалася з тэрытарыяльнымі набыткамі іншай [311, стб.350-356; 93, Т.ІІ, с.1]. Расія атрымала ваяводствы: Інфлянцкае, Полацкае (за выключэннем невялікай часткі на левым беразе Дзвіны), Віцебскае (без Аршанскага павета), Мсціслаўскае, частку Мінскага. Уся тэрыторыя склала 92 тыс. кв. км, а колькасць насельніцтва — 1 млн. 300 тыс. чал., з іх, па падліках У.Ігнатоўскага, 199575 скарбавых сялян, 316322 прыватнаўласніцкіх сялян, 5521 шляхціцаў, 126841 мяшчан [77, с.291; 560, с.126; 132]. Заходнерусіст М.В.Каяловіч неаднойчы ў сваіх працах шкадаваў, што «Рускі ўрад, валодаўшы тады фактычна ўсёй усходняй часткай польскай

дзяржавы — Беларусіяй і заходняй Маларосіяй, абмежаваўся далучэннем да Расіі толькі Беларуссю», ды яшчэ крыўдзіўся на тое, што «Падзел гэты зроблены так, што Расіі дасталася самая неўрадлівая частка рускай Польшчы, усходняя Беларусь...» [180, с.113; 185, с.287].

Пасля атрымання зямель Рэчы Паспалітай тры захопнікі сталі клапаціцца аб легалізацыі сваіх дзеянняў — прызнання з яе боку факта, які адбыўся. Гэта было неабходна для заспакаення грамадскасці і ўрадаў краін Заходняй Еўропы. Патрэбна было як мага хутчэй склікаць сейм РП, які б зацвердзіў бы падзел. Пра гэта з восені 1772 г. турбаваўся расійскі пасол у Варшаве Отта фон Штакельберг — уздзейнічаў на Станіслава Аўгуста Панятоўскага, пагражаў звяржэннем. Польскі кароль у рэшце атрымаў ультыматум: склікаць сейм 1 сакавіка 1773 г. і да канца красавіка заключыць пагаджальныя трактаты з трыма захопнікамі. У лютым 1773 г. паслы Расіі, Аўстрыі, Прусіі прадставілі ноты, у якіх дамагаліся склікання сейма на 19 красавіка. Рада сената выказала згоду, бо на той час у РП не было палітычных сілаў, якія б маглі супрацідзейнічаць падзелу ці абмежаваць яго памеры. Пасольскія сеймікі праходзілі вельмі цяжка. Спачатку трыццаць з іх былі сарваны. Кароль склікаў новыя сеймікі, якія Штакельберг забараніў зрываць пад прымусам канфіскацыі маёмасці. Адбылося не больш 111 сеймікаў — меней паловы камплекта. Сярод выбраных дэпутатаў толькі дваццаць кіраваліся грамадскімі інтарэсамі і сваім абавязкам.

16 красавіка была створана генеральная канфедэрацыя з 60 паслоў і 9 сенатараў. 19 красавіка ў Варшаве (дзе размясціліся гарнізоны дзяржаў-захопнікаў) яны сабраліся, каб аб'явіць сеймавую канфедэрацыю і выбраць маршалка сейма. Навагрудскія паслы Т.Рэйтан і С.Корсак выступілі супраць абрання А.Панінскага маршалкам і стварэння канфедэрацыі (а не супраць, як сведчыць легенда, акту падзелу), бо гэта было нязгодна з каралеўскім універсалам і інструкцыямі сеймавых канфедэрацый. Пратэст Рэйтана і яго сяброў не быў аднаразовым актам, ён з'яўляўся шматдзённай палітычнай акцыяй. Сваім смелым учынкам яны хацелі не дапусціць згоды большасці сейма (вета не дзейнічала ) на тэрытарыяльныя захопы і тым самым выратоўвалі гонар РП.

24 красавіка сейм пачаў працу. З паслоў, якія, як мы бачым, не прадстаўлялі ўсёй РП, была створана дэлегацыя для

заключэння трактатаў — зноў лёс вырашала толькі частка, і то не найлепшых дэпутатаў. 29 верасня яны падпісалі, а 19 лістапада кароль ратыфікаваў трактаты аб першым падзеле РП [560, с.145 — 150; 77, с.95—298]. У трактаце, заключаным паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай «Аб аднаўленні міра паміж абедзвумя краінамі і аб далучэнні да Расіі некаторых ад Польшчы зямель», называлася тэрыторыя Беларусі, якая адыходзіла да Расійскай імперыі з мэтаю «...цалкага спынення памежных спрэчак паміж абедзвумя краінамі і дзеля скасавання з аднаго і другога боку ўсіх дамаганняў, якога б кшталту яны не былі» [311, стб.378 — 380; 93, с.2 — 3]. 15 ліпеня 1775 г. Расія заключыла з РП Акт падрабязнага размежавання далучаных беларускіх зямель.

М.І.Кастамараў прыводзіць сведчанне сучасніка аб выніках першага падзелу РП: «Пецярбург зрабіўся нашаю сталіцаю, а Варшава стала галоўным горадам губерні, належачай Расіі, дзе ветлівым чынам, але ўсім распараджалася Масква: губернатар гэтай губерні называўся пасланнік; маскоўскі ўрад — гарантыяй, губернская рада — Пастаянным саветам, а старшыня гэтага савета — каралём; і ў гэтым савеце з 36 членаў большасцю галасоў праводзілася ў выкананне тое, што загадваў пасланнік. Імператрыца была неабмежаванай уладаркай: прымала на сябе ўсе зносіны Польшчы з замежнымі дзяржавамі» [178, с.95]. Усё сказанае тычылася і беларускіх зямель, якія засталіся ў складзе ВКЛ.

Пасля першага падзелу Казімір Нестар Сапега, Станіслаў Малахоўскі, Станіслаў Сташыц, Гуга Калантай стаялі на чале патрыятычнай партыі, якая выступіла за правядзенне ў РП сапраўдных рэформ. Сачыненне Калантая «Да Станіслава Малахоўскага, рэферендара кароннага, аб былым сейме некалькі слоў ананіма» стала праграмай дзейнасці Чатырохгадовага сейма (6.10.1788 — 28.05.1792 гг.). Ён паспеў зрабіць многае: прыняў рашэнне аб павелічэнні арміі да 100 тыс. чал.; увёў падаткаабкладанне шляхты, духавенства, уладальнікаў старостваў, што ў 2 разы павялічыла дзяржаўныя прыбыткі; зацвердзіў праект рэформ дзяржаўнага ладу; прыняў статут аб сейміках, адпаведна з якім беззямельная шляхта (часта марыянетка ў руках буйных магнатаў) была пазбаўлена выбарчага права; заключыў дамову аб абарончым саюзе з Прусіяй (1790 г.); распрацаваў Палажэнне аб гарадах (1790 г.), што падняло статус трэцяга саслоўя, і іншае [533]. Усё названае

тычылася і беларускіх зямель. Напрыклад, паводле апошняга дакумента, Наваградак, Брэст-Літоўск, Пінск атрымалі права на прадстаўніцтва ў сейме, Гродна і Мінск высылалі паслоў; Гродна вызначана месцам паседжанняў апеляцыйнага суда [621 а, с.27,46,213,223].

Самым значным дасягненнем Чатырохгадовага сейма стала прыняцце канстытуцыі 3 мая 1791 г. Яна была першай у Еўропе і другой у свеце пасля ЗША. З 34 павятовых сеймікаў ВКЛ непрыхільнасць да яе выказалі толькі тры (Расіенскі, Троцкі, Эйшышскі), а астатнія прысягнулі [635, с.35]. Паводле майскай канстытуцыі выдзялялася тры галіны ўлады: заканадаўчая, выканаўчая і судовая. Першая даручалася сейму, які падзяляўся на дзве палаты і перавыбіраўся кожныя два гады (шляхта беларускіх зямель таксама накіроўвала сваіх паслоў). Выканаўчая ўлада належала каралю з радаю. Польскі прастол стаў «выбарным па прозвішчу», гэта значыць спадчынным. Ліберум вета, канфедэрацыі і канфедэрацыйныя сеймы адмяняліся. Акрамя ардынарных сеймаў, дазвалялася маршалку склікаць сейм па неабходнасці. За шляхтаю захоўваюцца «ільготы, прывілеі і першанства ў прыватным грамадскім жыцці», мяшчанства 21 горада (у тым ліку беларускіх) атрымала магчымасць пасылаць на сейм сваіх упаўнаважаных, сялянства было ўзята пад «апеку законаў» [597,с. 93—110,126,135].

Можна цалкам пагадзіцца з польскім даследчыкам Л.Кандзелам, які піша: «Прыняцце канстытуцыі 3 мая пахавала шанцы на добраахвотнае вяртанне РП пад расійскі пратэктарат і праштамплявала рашэнне аб інтэрвенцыі» [560, с.235]. Расійскія палітыкі палічылі канстытуцыю канчатковым адыходам ад таго ладу, які быў зацверджаны на сеймах 1768 і 1773—1775 гадоў і гарантаваны апекай Кацярыны II. 2(13) ліпеня яна напіша польскаму каралю: «Справа ў тым, каб вярнуць рэспубліцы даўнюю свабоду яе і спосаб праўлення, гарантаваныя маімі пагадненнямі з ёю і гвалтоўна скінутыя рэвалюцыяй 3 мая, насуперак свяшчэннейшым законам» [Цыт. па: 399, с.107]. Ужо перад ліпенем 1791 г. было прынята рашэнне аб інтэрвенцыі, а спосаб ажыццяўлення яе быў ужо выпрабаваны. Як пісала імператрыца свайму фаварыту фельдмаршалу Р.А.Пацёмкіну: «Калі Бог падарыць нам спакой, утворым рэканфедэрацыю», бо «партыя знойдзецца заўсёды, калі будзе патрэбна» [Цыт. па: 560, с.236].

Яна не памылялася. Партыя алігархіі (старашляхецкая), у якую ўваходзілі вялікі гетман каронны Ян Браніцкі, польны гетман С.Ржэвускі і генерал кароннай артылерыі Ст.Шчэнсны-Патоцкі, дзейнічала супраць караля, жадала адабраць ад яго ўладу і пераўтварыць РП у алігархічную дзяржаву. Яны не думалі пра аднаўленне і рэформы, а, наадварот, баранілі «залатыя шляхецкія вольнасці». Здраду рыхтавалі загадзя. Так, ваенная камісія сейма на чале з Браніцкім наўмысна сабатажнічала ў справе стварэння стотысячнай арміі і адводзіла войскі ад межаў краіны, каб адкрыць фронт для іншаземных армій [146, с.396]. Падтрымку плана рокаша знайшлі ў рымскай курыі, якая дзейнічала праз свайго нунцыя ў Варшаве, а таксама ў «кангрэгацыі прапаганды веры», прадстаўнік якой удзельнічаў у перамовах у Пецярбургу [146, с.402]. Апірышча ў Расіі шукалі праз Пацёмкіна, з якім вялі перапіску.

З лістапада 1791 г. да лютага 1792 г. у Яссах, куды з'ехаліся творцы таргавіцкай канфедэрацыі, адбываліся канферэнцыі з расійскім канцлерам А.А.Безбародкам. Менавіта ён прапанаваў стварыць канфедэрацыю пасля падпісання руска-турэцкай дамовы і перахода рускімі войскамі польскай мяжы. 27 красавіка 1792 г. у Пецярбургу быў падпісаны акт канфедэрацыі, загадзя датаваны чатырнаццатым мая, днём, калі яго павінны былі абвясціць у м.Таргавіца, якое належала маршалку канфедэрацыі Ст.Патоцкаму. Сярод падпісаўшых 2 гетманы, 7 асоб — кліентура Патоцкага, 1 — Ржэвускага, таму яны не прадстаўлялі «прыгнечанага шляхецтва», аб чым абвяшчалі творцы таргавіцкай канфедэрацыі. У акце гаварылася аб дэспатызме, «фатальных прыкладах з Парыжа» і падрыхтоўцы «дэмакратычнай заразы» [560, с.239], абвяшчаліся вольнасць і роўнасць усёй шляхты, ахова каталіцкай рэлігіі, цэласнасць межаў РП, адмена канстытуцыі 3 мая і захаванне рэспубліканскага праўлення, заклікалася давяраць дапамозе Расіі [399, с.106].

11 мая 1792 г. Кацярына II увяла на тэрыторыю РП дзве арміі: 64 тыс. чал. на чале з М.В.Кахоўскім на Украіну, напалову менш на чале з М.Н.Крачэтнікавым у ВКЛ (начальнікі калон — Крачэтнікаў, Ю.У.Далгарукі, Мелліна, Ферзен). Расія па-майстэрску выкарыстала міжнародную сітуацыю і інтэрвенцыю падала як частку агульнай барацьбы манархаў супраць «рэвалюцыйнага наступу» (Аўстрыя і Прусія ажыццяўлялі інтэрвенцыю ў Францыі). З гэтага вынікала патрэба кампенсацыі ў адной частцы

Еўропы (РП) за намаганні ў яе другой частцы (Францыі). Мы згодны з Л.Кандзелам, які сцвярджае, што інтэрвенцыя не азначала памкненні Кацярыны II да другога падзелу РП, што яна не выступала з прапановай яго, але і не супрацідзейнічала іншым дзяржавам ісці ў гэтым напрамку [560, с.214].

Армія ВКЛ у жніўні 1792 г. (гэта значыць пасля вайны, у якой яна панесла нязначныя страты) складалася з дзвюх дывізій, корпусаў артылерыйскага і інжынернага, фузілернай часткі, 3 харугв і батальёна фейерверкераў — усяго 15691 чал., 5943 коней. Яна размяркоўвалася ў паўночнай частцы Мазоўша, ад межаў Падляшша праз Плоцк да Торуні і прускай мяжы [705, с.171]. Армію ўзначальваў вірцембергскі прынц Людовік, пляменнік прускага караля і стрыечны брат нашчадка расійскага прастола. Роднасныя сувязі галоўнакамандуючага паўплывалі на яго дзейнасць — перамога рускім была забяспечана. Даведаўшыся з перахопленага ліста пра здрадніцтва мужа, Марыя, народжаная Чартарыйская, падала заяву аб разводзе, а кароль даў яму адстаўку і дазволіў выехаць за мяжу. Але і наступныя камандуючыя (Ю.Юдыцкі і М.Забелла) не аказвалі належнага адпору: цярпелі паражэнні і адыходзілі ўглыб тэрыторыі [77, с.372]. Без бою на працягу мая-ліпеня былі заняты Браслаў, Ушачы, Бабруйск, Глуск, Нясвіж, Навагрудак, Слонім, Гродна (6.07). Значныя сутычкі адбыліся пад Мірам (11.06), Зэльваю (3.07), Мсцібавам (10.07), Брэстам (23.07) [424, с.85; 84, с.400; 399, с.106-107].

Услед за расійскімі войскамі ішлі канфедэраты і стваралі ваяводскія канфедэрацыі, куды шляхта ішла не вельмі ахвотна. Больш багатыя, заможныя магнаты збягалі ў Прусію, а бедныя, запалоханыя рабункамі «саюзнай арміі», падпарадкоўваліся. Пасля захопу Вільні (11.06) Шыман Касакоўскі арганізаваў Літоўскую канфедэрацыю на чале з канцлерам княства А.Сапегам (з 8.08 — Ю.Забелла). Падпісанне акта адбылося 25 чэрвеня 1792 г. у віленскім кафедральным саборы пад кіраўніцтвам Ю.Касакоўскага. Восьмага жніўня канфедэрацыя ВКЛ злучылася ў Брэсце з кароннай на чале з Шчэнсным-Патоцкім [13, с.287; 77, с.37].

Рашэнне Расіі аб другім падзеле было канчаткова вырашана толькі падчас вайны 1792 г., але размовы аб ім ішлі даўно. Яшчэ ў снежні 1789 г. Кацярына II піша Пацёмкіну: «Прусаў мы песцім, што тычыцца Польшчы, гэтае трэба ўладкоўваць з іншымі справамі і сучасным становішчам, каб кашы не згатаваць

больш цяперашняга... Пасля міру і беларусаў прыбраць можна» [93, с.18]. Прусія ж хацела выкарыстаць антырускую палітыку польскай патрыятычнай партыі для ціску на Расію і Аўстрыю, каб атрымаць ад іх тэрытарыяльныя ўступкі. У сакавіку 1790 г. быў падпісаны польска-прускі абарончы саюз. 1 і 2 мая аўстрыйскі канцлер падаў Пецярбургскаму двару дыпламатычную ноту аб гатоўнасці свайго ўрада вярнуць Польшчы Галіцыю з умовай, што таксама паступяць абодва іншыя ўдзельнікі першага падзелу РП. 24 мая Дзяржаўная рада Расіі разгледзела дадзеную ноту і адказала, што не супраць, калі Аўстрыя і Прусія вернуць свае набыткі, але сама не збіраецца аддаваць далучаную Беларусь. Польскі гісторык Е.Лоек слушна піша, што на такое рашэнне ўплывалі не столькі палітычныя мэты, колькі зямельныя набыткі «сяброў уплывовых прыдворных клік у Пецярбурзе. Цяжка было бы ад іх чакаць дабраахвотнага вяртання гэтых набыткаў. Прыватныя інтарэсы такім чынам пераважалі інтарэсы цэлай краіны» [648, с.290].

У 1792 г. Расія заключыла з Аўстрыяй (14.07) і Прусіяй (7.08) аднолькавага зместу дамовы аб падтрымцы польскіх канстытуцый 1773 — 1775 гг., кардынальных праў і межаў першага падзелу РП. Калі ў канцы жніўня стала вядома аб згодзе нямецкіх дзяржаў на роўны ўдзел Расіі ў новым падзеле, кацярынінскія дыпламаты пачалі ставіцца да яго больш лагодна. У верасні яны выказалі жаданне сустрэцца з двума іншымі дварамі, каб сумесна, як у 1772 г., падпісаць дамовы. У сярэдзіне кастрычніка Прусія настойвае на падпісанні руска-прускай дамовы аб падзеле, але маўчала Аўстрыя. Ва ўмовах прайграных прусамі бітваў у Францыі Кацярына ІІ лічыла неабходным: «Затрымаць пакуль можна падзел Польшчы. Ніякіх анэксій пасля такой няшчаснай кампаніі, Не падымаць гэтай справы без ведама аўстрыйскага двара. Няма ніякіх повадаў, каб павялічыць тэрыторыю прускага караля. Не рабіць нічога супраць гонару і абяцанняў» [Цыт. па: 560, с.265]. У пачатку снежня 1792 г. яна змяніла тактыку, бо зразумела, што таргавіцкая канфедэрацыя не мае сілы, каб нармалізаваць становішча ў РП, а Прусія можа выйсці з вайны супраць Францыі. Немалую ролю адыграў апетыт на беларускія і ўкраінскія землі, жаданне ажыццявіць, па словах А.Маркава, «найвыдатнейшую анэксію» [Цыт. па: 560, с.265-266].

8(19) снежня выйшаў імянны ўказ генерал-аншэфу М.Н.Крачэтнікаву пра распараджэнні ў «польскіх абласцях,

занятых рускімі войскамі». Яму даручалася скласці дакладную карту з камеральным апісаннем і прыступіць да стварэння 3 новых губерняў (Мінскай, Валынскай, Ізяслаўскай). 22 снежня 1792 г. (2 студзеня 1793 г.) у рэскрыпце новаму расійскаму паслу ў РП Я.Сіверсу Кацярына ІІ пасля пераліку спраў палякаў таго часу пісала: «Сии и многие другие уважения решили нас на дело, которого началом и концом предполагаем избавить земли и грады, некогда России принадлежавшие, единоплеменниками ея населенные и созданные, и единую веру с нами исповедующие от соблазна и угнетения, им угрожающих» [180, с.353].

12(23) студзеня 1793 г. у Пецярбурзе пад расійскім дыктатам і па ўзору 1772 г. была заключана сакрэтная канвенцыя паміж Расіяй і Прусіяй адносна другога падзелу РП. Мэтай дзвюх краін была засцярога ад уплыву французскай рэвалюцыі, дух якой «паўстанні і новаўводзіны... гатовы праявіць сябе ў Каралеўстве Польскім непасрэдна прылягаючым да іх абаюдных валоданняў». У трэцім артыкуле гаварылася аб акупацыі тых зямель, якія Расія хацела далучыць да сваіх валоданняў, у тэрміне паміж 25.03 (5.04) — 10 (21).04 [311,стб.438-439]. 27 сакавіка Расія і Прусія абвясцілі акты аб акупацыі сваіх доляў падзелу. З зямель Беларусі Расія атрымала частку Віленскага ваяводства, Мінскае, Брацлаўскае, усходнюю частку Навагрудскага, Брэст-Літоўскага ваяводстваў — усяго каля 250 тыс. кв. км з насельніцтвам каля 3 млн. чал. [77, с.377; 560, с.285,286]. 13 (24) красавіка Кацярына ІІ дала ўказ Сенату аб далучэнні беларускіх і ўкраінскіх зямель да Расіі [93, с.20].

9 красавіка 1793 г. у Гродне, куды былі перанесены паседжанні Тарговіцкай канфедэрацыі, аб’яўлена пра падзел РП і неабходнасць склікання сейму для «гарантыі РП трывалай і непарушнай сутнасці» [560, с.271]. Інакш кажучы, патрэбна была легалізацыя падзелу, выражэнне самой РП згоды на анексію. 27 мая пад наглядам тарговічан і расійскіх войск адбыліся сеймікі: пасламі ў асноўным былі выбраны тэрытарыяльныя маршалкі канфедэрацыі. У сейме не ўдзельнічалі паслы з зямель, занятых Расіяй і Прусіяй.

Гродзенскі надзвычайны сейм праходзіў з 17 чэрвеня па 23 лістапада. Па рашэнню сейма 1768 г. ён павінен быў працаваць два тыдні, таму прыйшлося некалькі разоў працягваць сесіі. Умоўна паседжанні Гродзенскага сейма можна падзяліць

на тры перыяды адпаведна з галоўнымі пытаннямі, якія на ім вырашаліся. Першы працягваўся з 17 чэрвеня па 22 ліпеня, калі стаяла пытанне аб заключэнні трактату з Расіяй. Па вопыту першага падзелу Сіверс дамагаўся выбару сеймавай дэлегацыі, якая падпіша трактат, а сейм толькі ратыфіцыруе. 11 ліпеня яна была «выбрана»: кароль падкрэсліў у прапанаваным спісе прозвішчы тых асобаў, якія задавальнялі Сіверса — трох біскупаў (Ю.Касакоўскага, І.-Ю.Масальскага, В.Скаржэўскага), двух кашталянаў (П.Ажароўскага і Аборскага), ваяводу віленскага М.-Г.Радзівіла, паслоў (Ш.Касакоўскага, Ю.Анквіча, К.Янкоўскага, А.Валеўскага і інш.), літоўскіх міністраў (Л.Тышкевіча, Л.П.Плятара, М.-К.Агінскага, Дзяконскага), кароннага міністра А.Сулкоўскага, гетмана польнага Ю.Забеллу [424, с.89,90; 674, с.30]. 13 ліпеня сеймавая дэлегацыя атрымала трактат аб падзеле з Расіяй, у якім РП адмаўлялася ад зямель, якія адышлі да яе, гарантавалася цэласнасць рэшткаў РП і новай формы кіравання, Расія абяцала падпісаць пакт перамір'я і гандлёвае пагадненне [424, с.90; 560, с.277]. З мэтаю ціску на паслоў і сеймавую дэлегацыю Сіверс значна павялічыў колькасць рускага войска ў Гродне і вакол яго, наклаў секвестр на маёнткі караля, Б.-А.Мнішка, Л.Тышкевіча, склаў спіс паслоў, якіх збіраўся арыштаваць, пагражаў канфіскаваць маёмасць РП. 22 ліпеня, у дзень нараджэння ўнучкі Кацярыны II, трактат з Расіяй быў падпісаны. У ім вызначаны межы зямель Беларусі, якія генеральныя станы Польскага Каралеўства і ВКЛ «уступают сим трактатам безотменно на вечные времена и без всякого поворота и изъятия Ея Величеству Императрице Всероссийской, Наследникам и преемникам Ея...» [311, с.428-432].

Другі перыяд працы Гродзенскага сейма ўмоўна можна акрэсліць 22 ліпеня — 25 верасня, калі галоўным пытаннем быў трактат РП з Прусіяй. Яе лічылі ініцыятарам падзелаў і прычынаю ўсіх бедаў краіны, таму абмеркаванне ішло вельмі марудна. Сеймавая дэлегацыя, якая падпісала трактат з Расіяй, была ўпаўнаважана зрабіць тое ж самае з Прусіяй. 13 жніўня быў ратыфікаваны трактат з Расіяй. 23-24 верасня адбылося знакамітае «нямое» паседжанне, на якім тэрарызаваны сейм моўчкі згадзіўся на падпісанне дэлегацыяй трактата з Прусіяй (змест яго падобны на трактат з Расіяй). С.Салаўёў падмеціў: «На працягу стагоддзяў народ маўчаў, а гаманіў толькі адзін шляхецкі сейм, на ім толькі чуліся прыгожыя рэчы. Але такая з'ява не магла быць другой, і сейм вымушаны быў анямець,

таму, што ўсё было навокал нямым. Можа быць некаторыя будуць здзіўлены гэтым нямым паседжаннем сейма, можа быць у некаторых абудзіцца моцнае спачуванне да анямелых дэпутатаў, але хіба іх не мацней здзіўляе яшчэ больш жудаснае аняменне цэлага народу? Хіба яны не бачаць у аняменні дэпутатаў апошняга сейма толькі неабходны вынік анямення цэлага народу?» [332, с.311-312].

У другі перыяд працы сейма разглядаліся такія пытанні, як: фінансавае забеспячэнне польскага і літоўскага войск, заняпад банкірскіх дамоў, пазбаўленне зарплаты тых службовых асоб, якія не выконваюць свае абавязкі, праект М.Агінскага аб рэформе кіравання. У гэты час адбылася большая частка баляў, якія суправаджалі працу сейма. Днём гаварылі пра любоў да Айчыны, а вечарам за грошы з расійскай і пруской казны ладзілі застолле, абеды і вячэры, карты, асамблеі і раўты, адзначалі імяніны Сіверса і караля. Як слушна пісаў М.Кастамараў, «пасланнікі, якія прыехалі забіваць Польшчу, частавалі палякаў, а палякі, па сваім звычаі, пілі і танцавалі над выкапанай магілай сваёй Айчыны» [178, с.561].

Пасля 25 верасня 1793 г. пачаўся апошні перыяд працы Гродзенскага сейма, калі адбылося заключэнне трактата «саюзу, сяброўства і сувязі паміж Расіяй і Польшчай» (14.10) і прыняцце новай (Гродзенскай) канстытуцыі (23.11). Першы дакумент быў патрэбны для стрымлівання прускіх жаданняў пажывіцца за кошт польскіх зямель, а другі — для ўсталявання парадку, гарантаванага Расіяй і заснаванага на выбарнасці караля, дзейнасці двухпалатнага сейма, захоўванні шляхецкіх прывілеяў і кардынальных праў [560, с.95-96]. На апошнім паседжанні была скасавана Гродзенская канфедэрацыя, якая існавала з 15 верасня, і складзена Пастаянная Рада. На гэтым сейм, які польская гістарыяграфія называе «вялікай камедыяй», удзельнікі якой загадзя мелі зададзеныя ролі» [560, с.276], скончыўся. Але працягвалася трагедыя: 3 снежня была зацверджана форма прысягі для жыхароў ВКЛ, а 28 снежня яны павінны былі яе прыняць [350, с.13; 674, с.34].

Паўстанне 1794 г., якое выбухнула ў адказ на другі падзел РП, скончылася паражэннем (гл. раздзел 4.1) і прывяло да трэцяга падзелу РП. Аб ім ужо задумаліся ў час пагрому паўстаўшых у абарону сваёй Айчыны палякаў і жыхароў ВКЛ. М.В.Рапнін тлумачыў ваеннаму міністру П.Салтыкову, што «падзел некаторай часткі зямлі і цалкам знішчэнне цэлай

краіны ёсць дзве зусім розныя рэчы», што трэба «не заняць, а так сказаць, задавіць войскамі частку жадаемага нам набыцця і зрабіць гэта як мага хутчэй, не чакаючы невядомага вырашэння спраў пад Варшавай» [Цыт. па: 10, с.5]. Далучэнне ВКЛ, такім чынам, не трэба было звязваць з падзеямі ў Кароннай Польшчы. Напрыканцы мая канцлер А.Безбародка склаў план ліквідацыі польскай рэспублікі і набыцця астаткаў ВКЛ: «Атрымаем пэўную колькасць народа грэчаскай веры, звернутых у вунію і якіх даволі лёгка вярнуць да лучнасці з нашай царквой пры аднолькавай мове» [10, с.5]. Разам з І.Остэрманам і П.Зубавым ён пераконваў Кацярыну ІІ у добрых выніках ажыццяўлення названага праекта.

21 лістапада 1794 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі напісаў ліст расійскай імператрыцы, у якім аддаваў сваё жыццё і лёс усёй РП у рукі «великодушной победительницы». У адказ атрымаў загад пераехаць у Гродна, а 4 снежня быў выдадзены ўказ «аб прыняцці і пасяленні караля польскага на жыхарства ў Гродне» [231,с.1249]. Ён будзе жыць тут з 1 студзеня 1795 г. па 15 лютага 1797 г. [падрабязней гл.: 424, с.105-107]. 3 студзеня 1795 г. быў падпісаны трактат аб падзеле РП паміж Расіяй і Аўстрыяй. У ім былі акрэслены межы новых зямельных набыткаў дзвюх дзяржаў. З беларускіх зямель ВКЛ да Расіі адыходзілі: рэшткі Слонімскага, Навагрудскага, Слуцкага, Ашмянскага, Браслаўскага і Брэсцкага паветаў; Ваўкавыскі, Віленскі, Лідскі паветы; частка Гродзенскага павета — усяго каля 120 кв. км і 1 млн. 230 тыс. чал. [424, с.107; 39, Т.3, с.73]. Рэскрыптам ад 18 сакавіка Кацярына ІІ загадала генерал-фельдмаршалу графу П.А.Румянцаву-Задунайскаму заняць усе прызначаныя Расіі землі, каб «уся прастора гэтая сапраўды была ў нашых руках і каб грамадзянскае ў гэтых землях пастаўленае ад нас кіраўніцтва ўсе магчымыя сродкі мела не толькі прывесці да прысягі ўсіх абывацеляў, але і кіраваць імі імем і ўладаю нашай» [39, Т.3, с.74].

24 кастрычніка 1795 г. у Пецярбургу былі заключаны трактаты паміж Расіяй і Прусіяй, а таксама Аўстрыі з Прусіяй. Яны тычыліся тэрытарыяльных размежаванняў за кошт РП: Прусіі саступалі частку Мазоўша і Падляссе [706, с.26; 311, стб.472-473]. Юрыдычным замацаваннем трэцяга падзелу можна лічыць адрачэнне Станіслава Аўгуста Панятоўскага ад прастолу 25.11.1795 г. На гэты раз нават не парупіліся склікаць сейм, які звычайна легалізоўваў захопы трох краін. Праз месяц,

25 снежня, быў абвешчаны ўказ Сенату «аб далучэнні да Расійскай імперыі ўсёй часткі ВКЛ, якое па спыненню мецяжоў у Літве і Польшчы было занята войскамі» [311, стб.476-477]. Да ўказа быў далучаны маніфест на імя Рапніна, які трэба было абвясціць «новым подданным нашым», якія павінны ведаць «новые пределы Российской империи» і прынесці прысягу «на вернасць подданства их Нам» [249,ф.136,воп.1,а.1]. Апошнім актам падзелу стала руска-пруская канвенцыя аб даўгах РП і караля ад 26.01.1797 г., да якой далучылася і Аўстрыя. Вельмі важным быў 11 артыкул, у якім гаварылася аб «змешаных падданых» — ім даводзіўся тэрмін у 5 гадоў, каб прадаць маёмасць у адной з краін і задэклараваць сваё падданства ў той, дзе яна застаецца [706, с.33].

Такім чынам, у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай Расійская імперыя змяніла геапалітычнае і дэмаграфічнае становішча, павялічыўшы сваю тэрыторыю на 466 тыс. кв. км і колькасць насельніцтва — на 5,6 млн. чал. (нашы лічбы трохі розняцца ад падлікаў Кукеля, у якога 462 тыс. кв. км і 6,2 млн. чал.) [605, с.45-46]. Выбіты медаль з надпісам «отторженая возвратих» сведчыў аб дасягненні даўняй, ад цара Аляксея Міхайлавіча, мары аб далучэнні зямель Беларусі. «Гэтае імкненне, — добра заўважыў Я.Запруднік, — увасаблялася ў двух найвышэйшых тытулах расійскіх уладароў — святарскім (патрыярх «Всея Руси») і свецкім (цар «всея Великия, Малыя и Белыя России») [129, с.59]. Мы бы дадалі яшчэ адзін факт, які тычыцца гістарычнай Літвы: пасля трэцяга падзелу ў поўным тытуле Кацярыны II з'явілася назва «вялікая княгіня літоўская». Для Польшчы вынікі падзелаў вобразна падсумаваў Т.Чацкі: «Ужо Польшча выкрэслена з асяроддзя народаў; у палацах каралей і ў месцах былой урадавай улады павук пляце свае сеці, а філін, які гняздзіцца на вежах велічных будынкаў, спявае сваю прарочую песню» [Цыт. па: 188, с.II прил. к гл.I]. Але вобраз Рэчы Паспалітай, якая знікла з геаграфічнай карты, будзе хваляваць не адно шляхецкае пакаленне моладзі (у тым ліку і на тэрыторыі былога ВКЛ), для якой РП працягвала існаваць і за якую яна будзе праліваць кроў.

ВКЛ перастала існаваць. Страта незалежнасці адбылася прыкладна па аднаму і таму ж сцэнарыю: 1) дыпламатычныя перамовы з будучымі захопнікамі тэрыторыі РП; 2) стварэнне там прарасійскай канфедэрацыі; 3) увод расійскіх войск на тэрыторыю РП; 4) анексія зямель Беларусі; 5) легалізацыя

апошняга на сейме РП; 6) прысяга насельніцтва захопленых зямель расійскаму імператару. Насельніцтва зямель Белай Русі і Літвы апынулася ў краіне, якую Ф.Энгельс назваў «апошнім аплотам агульнаеўрапейскай рэакцыі», а У.Ленін — «турмой народаў» [532, с.13,51; 201, с.107]. Беларусь апынулася паміж Польшчай, якая ўвасабляла заходнюю цывілізацыю і яе вольнасці, і Расіяй, якая ўяўляла сабою ўсходні, азіяцкі дэспатызм.

## 2.2. **Эвалюцыя расійскай урадавай палітыкі**

Далучаную да расійскай тэрыторыі Беларусь царызм зусім не ведаў і не разумеў. М.В.Доўнар-Запольскі слушна пісаў, што «расійскі ўрад бадай да 60-х гадоў мінулага сталецця, — значыць, да губернатарства М.Н.Мураўёва, — кепска разумеў, што ён мае справу з Беларускім краем» [103, с.13]. З цягам часу веды не паглыбляліся, а нават наадварот, расійская ўлада забылася тое, што ведалі М.В. Рэпнін і іншыя кіраўнікі і дзеячы польскай палітыкі Кацярыны II: «З Польшчаю Літва, як асобная краіна, ніколі … «не змешвалася», што яны ніколі не змешваліся і ні ў сваёй дзяржаўнай тэрыторыі, ні ў сваім самастойным значэнні ў іх федэратыўным саюзе» [198, с.30]. Расійскае грамадства таксама мела смутныя ўяўленні аб Беларусі. Акадэмік В.М.Севергін, наведаўшы Беларусь у 1802 г., самым сур'ёзным чынам лічыў праваслаўных беларусаў схізматыкамі і здзіўляўся, што служба падобная на грэка-расійскую [316, с.106].

Хістанні ў адносінах да Беларусі добра бачны ў змяненні афіцыйнай тэрміналогіі. Разуменне Кацярыны II праглядваецца ў надпісу на выбітым медалі ў памяць далучаных да Рускай дзяржавы частак Заходняй Расіі пасля двух падзелаў: «Отторженная возвратих». У афіцыйных актах і справаводстве гэтыя землі называліся «присоединённые от Польши губернии». У рускім грамадстве гаварылі: «наши западныя губернии, принадлежавшие раньше Польше» [Гл.:198, с.15]. Павел I і Аляксандр II ставіліся да беларускіх зямель як да сваіх «польских провинций». Дзекабрыст К.Ф.Рылееў на следстве заявіў: «Правительство наше делает великую погрешность, называя упомянутые провинции в актах своих польскими или вновь присоединенными от Польши и в продолжение тридцати лет ничего не сделав, дабы нравственно присоединить оные к России» [62, Т.IУ, с.180]. Мікалай I спачатку называў землі ВКЛ «былые польские провинции», а жыхароў іх —

«соотечественники»; пазней прыйшло разуменне, што гэты край зусім не польскі, а рускі, звязаны з ім племянным адзінствам паходжання, мовай рускай, сваім гістарычным мінулым, а насяляюць яго «издревле русские по происхождению, нравам и навыкам жители областей» [198, с.30]. На гэтым падмурку пачаў складвацца «западнорусизм».

З навуковых публікацый дайшло да школьнага падручніка па гісторыі для 8 класа няправільнае разуменне сенацкага ўказа 18(30).07.1840 г., які, як лічаць, адмяніў найменні «Літва», «Беларусь» і ўвёў назву «Северо-Западный край» [42, с.41]. Вымушаны прывесці дакладную цытату: «Управляющий Министерством юстиции предлагает Правительственному сенату по случаю внесения по высочайшему предписанию проекта указа, в котором упоминались губернии Белорусские и Литовские под сими наименованиями, государь император, зачеркнув название «Белорусских» и «Литовских», изволил приказать переписать указ с поименованием губерний каждой отдельно Витебскою, Могилёвскою, Виленскою и Гродненскою; причем последовало собственноручное высочайшее повеление: «Правила сего держаться и впредь, никогда иначе не прописывая, как поименовано, губерний» [39, Т.IV, с.131]. Разгледжаныя намі архіўныя матэрыялы і апублікаваныя дакументы 1830—1850-х гадоў даказваюць, што назва «Северо-Западный край» не сустракаецца, а ўжываюцца «западныя губернии», «западный край» (радзей, чым першы тэрмін). Прычым карыстаецца імі сам Мікалай I [314, Т.2, 0тд.1, стб.368, 1139, 1141, 1143, 1299 і інш.; 39,Т. IV, с.139, 293, 306 і інш.]. Больш таго, забароненае слова «беларускі» ўжывалася ва ўрадавых дакументах. Напрыклад, указ Сенату ад 2.05.1850 г. аб «преобразовании Белорусского учебного округа» [314, Т.2, Отд.2, стб. 988].

Галоўнымі задачамі расійскай урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі былі: інтэграванне і русіфікацыя беларускіх зямель, выкараненне польскага нацыянальна-вызваленчага руху — усё, што можна назваць «руская справа» ў заходнім рэгіёне Расійскай імперыі. Слушна піша гісторык Ю.Драгун, што згодна з тэорыяй «Масква — трэці Рым» Масква ўзяла на сябе функцыю аб'яднання ўсіх праваслаўных народаў пад эгідаю рускага цара, вызвалення іх ад каталіцкага прыгнёту. Адсюль канцэпцыя «вызвалення заходняй Русі (пазней — «Заходняй Расіі») ад прыгнёту палякаў, літоўцаў і каталіцкай царквы» [105, с.14].

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай мерапрыемствы ўсіх расійскіх імператараў перыяда 1772—1863 гг. былі накіраваны на тое, каб «вярнуць гэтаму краю былы рускі выгляд, заслонены чужымі наваўводзінамі і парадкамі» [383, с.173]. У палітыцы гэта знайшло сваё адлюстраванне ў русіфікацыі, «овеликорушении народа», як пісаў М.Багдановіч [27, с.121]. Праграму русіфікацыі прапанаваў расійскаму ўраду магілёўскі губернатар М.М.Мураўёў. У 1831 г. ён падаў дзве запіскі, у якіх дакладаў «об способах сближения Белорусского края с Россией». Прапановы былі разгледжаны ў Камітэце па справах заходніх губерняў 28.12.1831 г. і было прынята заключэнне. Яно падзелена на 3 раздзелы, кожны з якіх меў прапановы па духоўнай і грамадзянскай частцы. Прывядзем гэтыя дакументы ў нашай, некалькі абагульненай і скарочанай форме.

I. Прапановы, якія можна ўвесці ў дзеянне неадкладна

а) па духоўнай частцы:

1. Замяніць магілёўскага архіепіскапа і трох епіскапаў у губернях, «вернутых ад Польшчы».

2. Палепшыць склад беларускага духавенства святарамі з Расіі, якія «образованные в России, преданные православной вере и твёрдого характера». Прыняць меры да падтрымання іх становішча і стану праваслаўных цэркваў.

3. Падняць прэстыж духавенства праваслаўнага сана і адмяніць здачу вінаватых святароў у рэкруты.

4. Забараніць каталіцкаму духавенству займацца выхаваннем юнакоў у дамах і замяніць духоўныя вучылішчы на свецкія з выкладаннем у іх на рускай мове.

5. Увесці судовую адказнасць свецкіх і духоўных асоб за «совращение православных в римско-католическую веру» па расійскаму заканадаўству.

б) па грамадзянскай частцы:

Дазволіць уступаць у грамадзянскую службу па пасведчаннях дэпутацкіх сходаў, зацверджаных губернатарам. Надаць ім правы канцылярскіх служачых 3-га разраду.

II. Прапановы, якія трэба выканаць паступова і з цягам часу.

а) па духоўнай частцы:

1. Зменшыць колькасць рымска-каталіцкіх і грэка-уніяцкіх кляштароў, забраць іх нерухомыя маёнткі ўзамен за штогадовы грошавы аклад.

2. Усіх дзяцей праваслаўных і каталіцкіх бацькоў хрысціць у праваслаўную веру.

3. Забараніць каталіцкім святарам служыць ва уніяцкіх кляштарах, а уніяцкім — у каталіцкіх.

4. Прыняць строгія меры, каб спыніць пераход слуг памешчыкаў у каталіцкую веру з уніятаў і праваслаўных.

б) па грамадзянскай частцы:

1. Прызначыць на галоўныя месцы ў губерні рускіх благанадзейных чыноўнікаў (земскіх спраўнікаў, гараднічых, віцэ-губернатараў, губернатараў, пракурораў, сяброў губернскіх прысутных месцаў, пошт-экспедытараў) з прадстаўленнем некаторых выгад па службе.

2. Раздаваць рускім казённыя маёнткі для ўмацавання там рускіх сямействаў.

3. Аблягчэнне жыхароў Беларусі ў розных «неуравнительных тягостях».

4. Узнагародзіць знакамі беларускіх памешчыкаў, аддадзеных Расіі.

III. Прапановы, якія ўжо выконваюцца.

а) па духоўнай частцы:

З Магілёўскія епархіі аддалены прэлат Шчыт.

б) па грамадзянскай частцы:

1. Уведзена руская мова ў судовае і грамадскае справаводства. Польскія назвы пасад заменены рускімі.

2. Адменены Літоўскі Статут і аднаўлена дзеянне расійскага заканадаўства [39, T.IV, с.107].

Як канкрэтна выконвалася гэтая праграма, мы раскажам ніжэй у адпаведных раздзелах дадзенай працы. Прывядзем вынікі «рускай справы» ў Беларусі па словах А.Ліпрандзі, які пабываў тут у 1895 г. — юбілейным з апошняга падзелу РП: «заходні край наш, не гледзячы на стогадовае абрусенне, далёка яшчэ не рускі край, што ён не вернуты яшчэ самому сабе, што руская справа знаходзіцца там далёка не так, як бы хацелася б і неабходна... у інтарэсах яе мясцовых, так і агульнадзяржаўных...Да гэтага часу гэты край польскі... Праваслаўе і руская нацыянальнасць да гэтага часу яшчэ занімаюць тут вельмі сціплае месца, што перавага іншаплемянных і іншаверных, спрадвек варожых нам, элементаў да гэтага часу яшчэ моцна дае сябе адчуваць на кожным кроку» [203, с.28].

Палітыка расійскага ўрада ў адносінах да Беларусі была лагічнай для заваёўніка і нагадвала такую ж палітыку двух іншых удзельнікаў падзелаў Рэчы Паспалітай — Аўстрыі і Прусіі. Тыя праводзілі ў заходніх правінцыях былой канфедэрацыі такую ж палітыку знішчэння «пальшчызны»,

называемую «германізацыяй», ці «анямечваннем». Апошняе знайшло сваё адлюстраванне ў зямельнай, карацельнай, саслоўнай, адміністрацыйнай, адукацыйнай і канфесійнай палітыцы нямецкіх уладаў [77, с.411,413,402–408; 173, с.10–12]. Нават сродкі ажыццяўлення русіфікацыі і анямечвання былі падобныя:

-канфіскацыя, секвестр, каланізацыя захопленых зямель;

-дэпартацыя, ссылка (у Расійскай імперыі жандарскія акругі і ваенныя пасяленні) найбольш актыўных элементаў заваёванага народа;

-саштурхоўванне сялянства са шляхтай;

-уладкаванне агульнай сістэмы кіравання і суда з прыцягненнем агульнага заканадаўства, адзінага справаводства і дзяржаўнай мовы;

-распаўсюджванне рускай (або нямецкай) сістэмы адукацыі з выкладаннем на мове захопніка, а таксама культуры;

-умацаванне дзяржаўнага веравызнання і царквы на далучаных землях, выцясненне або ліквідацыя іншых веравызнанняў.

Аб першых трох сродках, якія ўяўляюць асобны блок, звязаны з зямельнай маёмасцю і яе ўладальнікамі і карыстальнікамі, раскажам у дадзеным параграфе. Два наступныя патрабуюць асаблівай увагі, займаюць важкае месца ў расійскай палітыцы ў адносінах да Беларусі, таму будуць выкладзены кожны ў асобных раздзелах працы, больш аб'ёмных па матэрыялу. Канфесійная палітыка закранаецца намі ў розных главах працы і патрабуе спецыяльнага даследавання.

Валоданне зямлёй у той час было галоўнай, а можа быць, адзінай асновай незалежнасці. «…Зямля ёсць глеба, фундамент, моц нацыі, маці яе давольства, карміліца яе дзяцей…», — слушна пісаў невядомы аўтар артыкула «Газетные толки». Ён лічыў: «Пакуль землі рускія будуць у руках палякаў, пакуль спавядальнікі «Польскага катэхізіса» будуць падвяргацца перыядычнай небяспецы паўстання з аднаго і ўтаймавання яе з другога боку, — мы не будзем мець магчымасці развіваць у Заходняй Расіі канчаткова нашыя прагрэсіўныя і палітыка-эканамічныя ўстановы… Мы ўпэўнены ўсім былым і сучасным, што пакуль землі нашы будуць у чужых руках, нашы правы на валоданне Заходнім краем Расіі будуць толькі моцныя de jure, а не de facto, яны не будуць мець над сабою глебы і на баку прышэльцаў або рэнегатаў будзе сіла натуральная — матэрыяльная» [67, с.73]. Таму расійскі ўрад хацеў пазбавіць

шляхту гэтай асновы, а да таго ж перадаць рускім гаспадарам, каб тыя самыя стварылі сабе базу русіфікацыі беларускага насельніцтва. Вось што пісаў цару ў 1841 г. Ф.Міркавіч, праслужыўшы адзін год віленскім генерал-губернатарам і прапанаваўшы прадаць рускім дваранам 840 маёнткаў: «Толькі тады стане ўтварацца ў цэлым краі сетка наглядальнікаў, якія зрабілі бы дарэмнымі ўсялякую канспірацыю ў зародку, толькі тады ўзмоцніцца наша праваслаўная вера і родная мова, а таксама адшукаем пэўнасць, за дваццаць пяць год польская народнасць загіне безпаваротна» [603, с.213; 393, с.255].

Існавалі два шляхі пазбаўлення шляхты зямельнай апоры «польскай прапаганды»: канфіскацыя і секвестр. Канфіскацыя — гэта перадача маёнтка ў казну па рашэнню Адміністрацыйнай рады ці суда. Былы гаспадар маёнтка падвяргаўся цывільнай смерці — забароне набываць зямельную ўласнасць, арэндаваць, не мог выступаць як бок ці сведка ў працэсе, яго сям'я магла лічыць яго памёршым і не пакінуўшым тэстамента. Секвестр — здача маёнтка прыгаворанага гаспадара на часовае кіраванне казне, якое магло завяршыцца або канфіскацыяй, або вяртаннем уладальніку [588, с. 45]. Механізм канфіскацыі і секвестра пачаў працаваць пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, калі Кацярына II указам ад 16.08.1772 г. папярэдзіла землеўладальнікаў, што маёнткі застануцца пры іх толькі пры ўмове прысягі на падданства Расійскай імперыі. Не прынеслі яе князі Радзівілы, Агінскія, Чартарыйскія, Сапегі, Салагубы, Пацеі — іх маёмасць канфіскавалі і раздалі праваслаўным падданым. Усяго канфіскавалі 51 уладанне з 110357 сялянамі. Гэта былі буйныя маёнткі, якія пры раздачы дзяліліся на часткі.

Незвычайнай была раздача маёнткаў на тэрыторыі другога падзелу Рэчы Паспалітай, бо 2(13).09.1793 г., значыць, да падпісання трактатаў, урачыста быў абвешчаны спіс тых, хто атрымае землі і дзе. Настолькі ўпэўнены былі расійскія ўладары, што Гродзенскі сейм зацвердзіць трактаты. Гэты факт яшчэ раз пацвярджае рабаўніцкія мэты захопу Беларусі. Па ўказу 17.03.1793 г. прысягу павінны былі даць жыхары новазахопленых беларускіх тэрыторый на тых жа ўмовах, што папярэдні раз. 19.04.1794 г. Кацярына II дала распараджэнне генеральнаму губернатару Ц.І.Туталміну ўзяць у секвестр маёнткі касцюшкаўскіх паўстанцаў. Указам 3(14).05.1795 г.

загадана Туталміну забраць у казну маёнткі ўсіх удзельнікаў паўстання, а таксама тых гаспадароў, якія адсутнічалі на момант зацвярджэння іх праў на валоданне маёнткамі, і вярнуць тым, хто да 1.01.1795 г. вярнуўся ў межы дзяржавы, а тыя, хто не вярнуўся, абавязаць, каб прадалі свае маёнткі на працягу 1 года і 6 тыдняў [633, с.302]. Згодна з ведамасцю літоўскага генерал-губернатара ад сакавіка 1797 г. Кацярынай ІІ у Літоўскай губерні было пажалавана 80511 душ 42 асобам. Некаторыя з іх (13 чалавек) на той час не ўступілі ў валоданне беларускімі землямі па прычыне, як запісана ў ведамасці, «за неприсылкою приемщика» [39, Т.III, с.85—95]. Па Мінскай губерні ёсць «Роспись канцелярии генерал-прокурора о пожалованных крестьянах» у 1793—95 г. на вечнае і патомнае валоданне розным асобам. 37 чалавек атрымалі 38218 душ сялян [39, Т.III, с.75—78]. Такім чынам, увогуле атрымліваецца 118729 сялянскіх душ.

Чарговая хваля пазбаўлення шляхты зямлі адбылася пасля франка-рускай вайны 1812 г. 12(24).12.1812 г. Аляксандр І выдаў маніфест, у якім дараваў ліцвінам удзел у вайне на баку французаў, але папярэджваў тых, хто не вернецца на працягу двух месяцаў дадому і застанецца «в службе наших неприятелей» і «продолжая и после прощения пребывать в том же преступлении, таковых, яко совершенных отступников, Россия не примет уже в свои недра, и все имущества их будут конфискованы» [Цыт. па: 373, с.70]. Па Мінскай губерні шляхта пазбавілася 84 тыс. сялянскіх душ [337,с.94], па Гродзенскай — 205 маёнткаў з 42530 сялянскімі душамі [138].

Вельмі асцярожна праводзілі канфіскацыю пасля паўстання 1830-1831 гг. на падставе ўказа Мікалая І Сенату ад 22.03 (3.04).1831 г. Міністр фінансаў генерал ад інфантэрыі гр. Канкрын і ўпраўляючы сенатар Дубенскі папярэджвалі ў ліпені 1832 г. Мінскага губернатара аб асцярожнасці ў гэтай справе: «…я покорнейше прошу, Ваше превосходительство, о всех таковых конфискациях, каждый раз уведомлять Министерство финансов, дабы в противном случае не произошло каких-либо запутанностей, присовокупляя к тому подробные сведения о самих имениях» [249, ф.295, воп.1, с.325, а.1 адв.]. Ведамасць камітэта па справах заходніх губерняў аб канфіскацыі маёнткаў ва ўдзельнікаў паўстання 1831 г. дае нам мажлівасць даведацца аб памерах канфіскацыі на 1835 г. (табл. 2.1).

Табліца 2.1

*Канфіскацыя маёнткаў удзельнікаў Лістападаўскага паўстання**

| Губерні | Колькасць канфіскаваных маёнткаў | Колькасць прыгонных душ |
|---|---|---|
| Віленская | 118 | 25099 |
| Мінская | 22 | 15503 |
| Гродзенская | 70 | 28612 |
| Магілёўская | 1 | 1457 |
| Віцебская | 6 | 1471 |
| Беластоцкая вобл. | 7 | 347 |
| Усяго | 224 | 72489 |

Даследчыца С.Л.Лугаўцова прыводзіць цікавы жыццёвы факт: незаслужана былі канфіскаваны землі ў асоб, якія мелі аднолькавыя прозвішчы з паўстанцамі-шляхціцамі. Напрыклад, толькі ў Мінскай губерні ў 1836 г. налічвалася 81 дваранскае сямейства, пазбаўленае з гэтай прычыны зямлі [207,с.75]. Канфіскоўваліся землі ўдзельнікаў экспедыцыі Ю.Заліўскага. На тэрыторыі Беларусі ў 1837 г. лічыліся канфіскаванымі 115 маёнткаў з 38544 сялян. душамі [337, с.94]. Пазней канфіскацыі і секвестры, як слушна лічыць У.Сосна, не мелі істотных вынікаў, бо «шляхецкі рух набываў дэмакратычны аграрны характар, і ўладальнікі сялян ад яго адыходзілі» [337, с.94].

Акрамя шляхецкіх зямель, канфіскацыі падлягалі землі каралеўскіх эканомій і старасцінскія. Гэта было лагічна: былыя польскія дзяржаўныя землі пераходзілі ва ўладанне рускай дзяржаве. Па стану на 1.(12)06.1773 г. у казённае кіраванне на тэрыторыі Усходняй Беларусі паступілі 95097 душ м.п. [39, Т.3, с.41—44]. Па высачайшаму прысуду ад 20.06(1.07).1795 г. канфіскацыі падвергліся каралеўскія і дзяржаўныя землі, якія знаходзіліся ў Заходняй Беларусі. У 70—90-я гг. XVIII ст. урад адабраў у духавенства на Беларусі 40 тыс. сялян м.п. [222, с. 236].

* Складзена па: [39, т.IV, с.126].

Усе забраныя прыватныя, былыя дзяржаўныя і царкоўныя землі раздаваліся рускім генералам, царскім фаварытам і любімцам, саноўнікам, губернатарам, розным дзяржаўным служачым і нават некаторым палякам-здраднікам. За 1773–1779 гг. раздалі 107 маёнткаў з 94160 сялянскімі душамі. Пасля рэскрыпта Кацярыны II ад 2(13).07.1780 г. аднымі з першых, хто не прапусціў шанца, былі: фельдмаршал граф П.Румянцаў-Задунайскі (уладальнік маёнтка Гомель, 13326 душ), брыгадзір Сіманаў (Целешава), генерал-маёр І.В.Завадоўскі (Полаўцы, 4737 душ), сенатар Казлоў, кн. А.М.Галіцын (Краснаполь, Палужье, 1260 душ), тайны дарадца Казьмін (м. Хіславічы і вакольныя вёскі, 2090 душ), г-м Міхельсон (Капцёва), гр. Чарнышоў (Чачэрск і вакольныя вёскі, 5071 душа), былы магілёўскі віцэ-губернатар Варонін (староства Жукоўскае), камергер Г.М.Карсакаў-Рымскі (Захарава), князь Пацёмкін (Крычаў, 14227 душ), генерал М.Панін (3090 душ), граф Остэрман (2740 душ) і іншыя [180, с.211, прим.2; 282, с.52].

Раздачу зямель працягваў Павел I, бо лічыў перадачу казённых сялян у прыватныя рукі карыснай мерай для дзяржавы. У Літоўскай губерні ён раздаў з каралеўскіх эканомій 10062 душы 17 асобам (ген-пракурор Самойлаў, генерал-лейтэнанты Дунін і О'Брыен дэ Ласі, генерал-дырэктар пошт дэ Паліньяк і іншыя), са старасцінскіх сялян – 4176 душ 4 асобам (Лашкарову, тайнаму дарадцу Пастухову, генерал-паручыку Тацішчаву, графу Безбародка) [119, август, с.216–218]. У Мінскай губерні 13 чалавекам была пажалавана 4761 душа, у Беларускай губерні 17 чалавекам – 6823 душы. У гэты час «хапання» казённых зямель паўстала не адна магнацкая гаспадарка [304, с.170; 318, с.157].

Часам землі вярталі назад былым землеўладальнікам. Напрыклад, у 1773 г. Л.Пацэю вярнулі 12474 душы, кн. Чартарыйскаму – 1610 душ, М.Агінскаму – 2862 душы [39, т.III, с.41–43]. У 1795 – пач 1796 г. больш за 2/3 секвестраваных маёнткаў былі вернуты былым уладальнікам [380, с.12]. Рэскрыптам Кацярыны II Літоўскаму генерал-губернатару ад 3(14).12.1795 г. вярнулі маёнткі сваякам польскага караля: кн. Станіславу Панятоўскаму (24614 душ), гр. М.Мнішаку, гр. В.Тышкевічу, былому гетману М.Агінскаму, кн.Ізабэле Любамірскай (ур. Чартарыйскай) [39, Т.III, с.79; 633, с.304-305]. Вяртаў канфіскаваныя маёнткі і Павел I. Нават тым, хто праявіў сваю варожасць да Расіі: Ігн.Патоцкаму (да 1000 душ яшчэ даў

у велікарускіх губернях братам Ф. і М.Чацкім, якім частку ўжо вярнула Кацярына II, вярнуў астатняе, у большых памерах, чым былы маёнтак). Свае землі атрымалі: падпалкоўнікі Зенковіч і Ф.Гарадзенскі, каронны гетман Ажароўскі, гр. Забела, гр.Умінскі, гр. Храптовіч, былы Віленскі ваявода кн. Радзівіл, былы літоўскі вялікі маршалак Л.Тышкевіч, гр. Ю.Вельгорскі. Указ Аляксандра І дазволіў вярнуцца ў свае маёнткі на Беларусі былому літоўскаму падскарбію М.Агінскаму, польскаму генералу М.Забэлле, Т.Візагіерду, Ст.Мірскаму, К.Прозару, А.Тызенгаузу, Кацёлу, Юл.Нямцэвічу [39, T.III, с.114-115]. Высачайшы рэскрыпт імператара на імя Літоўскага ваеннага губернатара А.М.Рымскага-Карсакава ад 31.10(12.11) 1813 г.: «секвестрованное имение тайного советника князя Адама Чарторийского в губернии Гродненской и Виленской как не принадлежащие отцу его, возвратить ему во владение» [5, кн.5, ч.2, с.251].

Незалежна ад таго, ці акцыя раздачы зямлі была накіравана русіфікацыйнай тэндэнцыяй, ці не, яна ўнесла расійскі элемент у зямельную ўласнасць. Большае значэнне ён меў у беларускіх губернях, дзе было раздана каля 1/3 падданых сялян і новыя рускія памешчыкі складалі 9%, а колькасць сялянскіх душ — 32% ад усіх памесных. У літоўскіх жа губернях раздача зямлі не скараціла прыватнай польскай уласнасці, бо раздаваліся каралеўскія землі, насельніцтва якіх складала ўсяго 9,5% ад усіх прыгонных сялян у нашчадных маёнтках Віленскай і Слонімскай губерняў [Гл.: 706, с.205; 119, с.221]. Але, як пісаў у сваім успаміне-артыкуле сучаснік падзей Эдвард Паўловіч: «канфіскацыя вялікай колькасці маёнткаў за ўдзел у паўстанні спустошылі Літву духоўна і матэрыяльна» [272, с.121]. Тым больш, што спецыяльных абмежаванняў на валоданне маёнткамі рускіх памешчыкаў не было: з часам яны пераходзілі ў якой-небудзь форме да палякаў. Даследчык Жытковіч прыводзіць прыклады: у бліжэйшыя гады прадалі свае беларускія землі Сувораў і Румянцаў [706, с.204]. У журнале Камітэта па справах Заходніх губерняў ад 5(17).03.1832 г. чытаем рашэнне: для павелічэння колькасці «природных российских помещиков» у заходніх губернях маёнткі жалаваць расійскім дваранам у стогадовае арэнднае або нашчаднае леннае кіраванне. Прадаць, завяшчаць у чужыя рукі і закласці ў банкі было нельга [39, T.IV, с.112-113]. Да замацавання рускага землеўладання ў Беларусі быў накіраваны ўказ 1842 г. аб майяратах: рускія людзі, якія атрымалі ў маёмасць маёнткі, не мелі права ні прадаць

іх, ні аддаць у арэнду, а абавязаны былі асабіста кіраваць маёнткамі і па магчымасці жыць у іх пастаянна [383, с.182]. Удзельная вага расійскіх памешчыкаў была нязначная – у 1859 г. яны ўладарылі толькі 21% памешчыцкіх земляў [15, с.27].

Царскі ўрад спрабаваў ажыццявіць земляробчую каланізацыю Беларусі, каб укараніць рускі элемент, насадзіць у вёсцы свае парадкі, умацаваць па магчымасці праваслаўную веру. Сучаснік А.А.Плансан пісаў: «Поселите чисто русских крестьян не особыми деревнями, а между местными жителями, и они, уже и теперь, освобожденные от польского, помещичьего и экономического ига, и в языке, и в верованиях, и в правах быстро возвратятся в первобытное, чисто русское состояние, старшины и писаря будут русские, помещик найдет себе русских приказчиков и т.д.» [285, с.53–54]. У 1833 г. Асобы камітэт па справах заходніх губерняў прыняў рашэнне перасяляць у Беларусь рускіх казённых сялян з наданнем ім некаторых льготаў:

-на ревізскую душу выдзялялася 8 дзесяцін зямлі (5 пахатных + 3 сенакосных);

-вызваляліся на 5 гадоў ад падаткаў і грошавых павіннасцяў;

-вызваляліся ад земскіх павіннасцяў і рэкруцкага набора, на 10 гадоў ад вайсковага пастою;

-ліквідавалі ўсе недаімкі ў дзяржаўных падатках;

-бясплатна адпускаўся лес на першапачатковыя пабудовы;

-давалі па 100 руб. на двор;

-для пасева давалі хлеб з запасных магазінаў з адтэрміноўкай узноса на 5 гадоў.

У лютым 1836 г. урад зацвердзіў палажэнне аб перасяленні рускіх сялян у Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць. У Гродзенскай губ. было выдзелена пад пасяленні 11,5 тыс. дзесяцін для 1441 чалавека, у Віленскай губ. – да 37 тыс. дзесяцін для 4624 чалавек, Мінскай губерні – 21 тыс. дзесяцін для 2632 чалавек. Але да 1837 г. замест чакаемых 8697 чалавек перасяліліся ў Віленскую губ. 70 чалавек, у Мінскую – 44 чал. з Арлоўскай, Курскай, Пскоўскай і Калужскай губерняў [416, с.161]. Ва ўсепадданнейшым данясенні 16 мая 1845 г. Ф.Міркавіч пісаў аб перасяленцах з унутраных губерняў у заходнія па ўказу 24.12.1841 г., які для распаўсюджвання гандлю і прамысловасці на землях Беларусі дараваў ільготы купцам, мяшчанам і людзям вольнага стану хрысціянскага веравызнання. Па стану на 1 студзеня 1845 г. прыпісаліся па

Віленскай губерні 3 купцы і 1 мяшчанін, па Мінскай — адпаведна 23 і 9, па Гродзенскай -ніводнага [393, с.295].

Звычайна секвестравалі або канфіскоўвалі землі асоб, якія ссылаліся за ўдзел у антыўрадавых падзеях. Асобным відам ссылкі з'яўлялася дэпартацыя — гвалтоўнае высяленне з родных мясцін, якое нярэдка бывае масавым. Хвалі ссылак і дэпартацый пракаціліся ў Беларусі пасля Барскай канфедэрацыі, першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.), руска-польскай вайны 1792 г. і другога падзелу (1793 г.), паўстання А.-Т.Касцюшкі ў 1794 г. і трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.), франка-рускай вайны 1812 г., у сувязі са стварэннем ваенных пасяленняў, пасля следства над тайнымі таварыствамі гімназістаў і студэнтаў у 1824—1826 г., Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг. і дзеянняў эмісараў Ю.Заліўскага (1830—1833 гг.), следства па справе Ш.Канарскага (1837—1839 гг.), ліквідацыі уніяцтва (1839 г.), следства па справах польскіх эмісараў 1840-х гадоў.

Барская канфедэрацыя (1768—1772 гг.) адкрыла гісторыю польскай і беларускай палітычнай ссылкі. Канфедэраты ссылаліся ў Казань, Арэнбург, Табольск, Хлынаў, Сімбірск. У верасні 1773 г. Кацярына II абвясціла ім амністыю [260,с.11]. Пасля паўстання Касцюшкі першы раз у краі даведаліся аб Сібіры. З таго часу слова «Сібір», пісаў А.Міцкевіч, «стала паўсядзённым, як пастаянны напамін «палякам» пагрозы. Кожны з іх, вырашыўшыхся на які-небудзь небяспечны намер, павінен быў памятаць аб Сібіры» [626, с. 240]. Дваццатага чэрвеня 1795 г. выйшаў імянны ўказ з прысудам удзельнікам паўстання 1794 г. Іх падзялілі на 11 катэгорый: 6 першых складаліся з жыхароў тэрыторый другога падзелу, якія далі прысягу і парушылі яе — усіх ссылалі ў Сібір (Табольская і Іркуцкая губ., Архангельскае намесніцтва); да 5 іншых належалі тыя, хто не прынёс прысягу, але лічыўся «ворагам айчыны, як удзельнік бунту» — іх ссылалі ў Арлоўскую, Разанскую, Тамбоўскую губерні [659, с.40]. Сярод беларускіх паўстанцаў у першую чаргу трэба ўспомніць А.-Т.Касцюшку, Я.Ясінскага,Т.Гарадзенскага, Ю.Баркоўскага, Ю.-У.Нямцэвіча, Ст. і П.Грабоўскіх, Я.Зенковіча, Ст.Солтана, Ю.Харжэўскага, М.-К.Агінскага, А.Важынскага, Т.Ваўжэцкага, Р.Гедройца, Кс. і Ю.Несялоўскіх, Ст.Патоцкага, К.Рушчыца, К. і Ф.Сапегаў і іншых [425, с.99—109].

Маркаў, які падпісаў трэці падзел, раіў выселіць усю шляхту ў расійскія стэпы, а іх маёнткі раздаць расіянам [632, с.3]. Губернатары трох новых губерняў (Курляндыя, Віленская і

Гродзенская) высяляюць па падставе «ўдзел у паўстанні» ў Сібір кожнага, хто «выявіў сярод апошніх падзеяў жывую прывязанасць да краю». Указам ад 14(26).08.1824 г. ссылаліся тыя, хто «думаў пашырыць неразумную польскую нацыю праз навуку»: 20 чал. са 108 філаматаў і філарэтаў прадпісана «употребить по части училищной в отдалённых от Польши губерниях» [611, с.58; 250, ф.1, воп.2, спр.246, а.222 аб.]. Назавем некаторых найбольш значных асоб: Т.Зан, Ю.Ежоўскі, Ю.Кавалеўскі, Т.Лазінскі, Фр.Малеўскі, А.Міцкевіч, А.Петрашкевіч, Я.Сабалеўскі, А.Сузін, Я. Чачот. Разам са студэнтамі пацярпелі і 4 прафесары, з якіх І.Даніловіч і І.Лялевель былі сасланы за межы Беларусі [672, с.31—33].

Пасля Лістападаўскага паўстання былі сасланы 509 чалавек з Гродзенскай, Мінскай губерняў, беларускіх паветаў Віленскай губ. [673, с.38]. Сярод іх — інсургенты з Мастоўшчыны: С.Дзяшко і І.Палубінскі, сасланыя ў службу адпаведна ў Сібірскія лінейныя батальёны і ў Каўказскі асобны корпус [425, с.138-139]. Некалькі дзесяткаў чалавек былі сасланы за ўдзел у партызанскіх дзеяннях Ю.Заліўскага. Напрыклад, ваенны суд у Гродне асудзіў партызанаў, якія дзейнічалі на Гродзеншчыне: Л. і Я.Панасюкі, Т.Сейчук, Я.Марцінкевіч, Т.Васіліцкі, М.Фератка пасля збіцця кнутом ссылаліся на цяжкія працы ў Сібір; А.Лапка і С.Сідаркевіч пасля прагнання праз шарэнгу з розгамі — у сібірскія лінейныя батальёны; М.Песакоўскі пасля біцця палкамі — на пасяленне ў Сібіры [660, с.55]. Па справе М.Валовіча таксама былі сасланы І.Нагумовіч (у Каўказскі асобны корпус) і Ю.Яцкевіч (на цяжкія працы ў Сібір). Па справе М.Шыманскага выслалі пяць ксяндзоў-дамініканаў: Я.Сенкевіча і І.Нецюнскага (на пасяленне ў Сібіры), Ф.Ляскоўскага, А.Садкоўскага, Ш.Гілеўскага (углыб Расіі); ксёндза свецкага Зялінскага (углыб Расіі); ксёндза Шымборскага і яшчэ 12 чалавек (у далёкі кляштар). Па справе Ю.Гардынскага саслалі ў Сібір кс. Ш.Шышко, а астатніх 4 ксяндзоў — у далёкія кляштары пад нагляд паліцыі, Ю.Сасіновіча — у крэпасць Усх. Сібіры. Па справе жыхароў г.Гродна — удзельнікаў партызанскіх дзеянняў 1833 г. сасланы ў Каўказскі асобны корпус 17 чалавек, углыб Расіі — 8 чалавек [660, с.89—92].

Па справе Ш.Канарскага (1838-1839 гг.) у Сібір і ўглыб Расіі сасланы 32 чалавекі, радавымі ў Каўказскі корпус — 3 чалавекі [207, с.90]. У 1847 г. гучнай была справа эмісара Я.Рэра. Разам са сваімі паплечнікамі (Рэнірам, Багуслаўскім

і Гафмайстрам) ён быў сасланы на катаржныя працы ў Сібіры [587, с.202, 206; 74, с.151]. Палітычныя ссыльныя з Польшчы і Беларусі ў асноўным адбывалі катаржныя працы на Іркуцкім саляварным, Аляксандраўскім і Ілгінскім вінакураных заводах ва Усходняй Сібіры і на Кацярынскім вінакураным заводзе ў Заходняй Сібіры. Шэраг ссыльных адбывалі катаржныя працы ў крэпасных арыштанцкіх ротах. На заводах (а яны належалі казне) ссыльныя нарыхтоўвалі дровы, сена, служылі пісарамі, санітарамі і г.д. [526, с.193].

Высланыя ў расійскія ўнутраныя губерні аказвалі значны ўплыў на рускае насельніцтва. А.А.Плансан, аўтар брашуры «Последнее слово…», пісаў: «Не нападайте на Герценов, Шедо-Ферроти и Ко, не они создают ренегатов, а разсеянные по всей поверхности России поляки, воспитанники революции, самые красные из последователей Мадзини, деморализуют русских, воспитывают изменников и ренегатов» [285, с.34]. І яшчэ: «Из тысячи этих влиятельных уроженцев Западного края, которых мы встречали во всех концах России и с которыми всегда легко сходились, мы не встретили ни одного, а lalette, ни одного, кто бы не желал отделения от России 9 западных губерний, и присоединения их к Польше для образования отдельного государства…» [285, с.25]. І галоўнае — не ўтойваюць гэта, маюць уплыў на рускіх, якія робяцца «тенью своего друга-поляка и бессознательно следуют на пути нравственной жизни по стези, указанной ему этим другом» [285, с.27].

Пад адну з першых масавых дэпартацый трапілі вайскоўцы былога ВКЛ, а таксама паўстанцы 1794 г. Па ўказу 7(18).09.1794 г. усіх палякаў, якія засталіся ў рускай службе, пераводзілі ў палкі і гарнізоны ў аддаленыя губерні. 14.11.95 г. быў выдадзены загад высылаць былых польскіх салдат на пасяленне ў Кацярынаслаўскае намесніцтва [659, с.39]. Каля 1500 чалавек, галоўным чынам з корпуса Ст. Грабоўскага, у палове верасня 1794 г. выслалі ў Смаленск і насуперак умовам капітуляцыі прымусілі іх да гарнізоннай службы ў глыбіні Расіі [706, с.46].

У 1796 г. Кацярынаслаўскі генерал-губернатар П.Зубаў прапанаваў перасяліць на землі, далучаныя ад крымскіх татар (Наваросія), дробную шляхту з Беларусі. Спачатку разлічвалі на 4 тыс. сямей, а ў перспектыве — на 100 тыс. «душ» — болей за палову шляхты, якая знаходзілася на чыншы. Кацярына ІІ зацвердзіла план і ўказам 5(16)06.1796 г. загадала яго ажыццявіць. Пачалося выкананне, але ў лістападзе памерла

Кацярына II, а Павел I указамі 7(18).03 і 3(14).04.1797 г. стрымаў перасяленне. Колькасць усёй перaселенай шляхты невядома, але аб памерах можна судзіць па петыцыі прадстаўнікоў Браслаўскай губ., пададзенай падчас каранацыі Паўла I у красавіку 1797 г. У ёй ёсць такія словы: «Асобы абодвух палоў, як падатныя, так і шляхецкага паходжання ў значнай тысячнай колькасці праз розныя вайсковыя каманды, а нават і партыкулярных асоб, часта абманнымі спосабамі, але найчасцей адкрытай перавагай і сілай з гэтага краю забраны і або ўглыб Расіі, або ў большасці ў сцепі Бессарабіі праз партыкулярных асоб засталіся паселянныя» [659, с.42]. У 1810 г., каб вызваліць месца пад першыя ваенныя пасяленні, з Магілёўскай губ. высялілі ў Наваросію 667 сем'яў Бабылецкага староства Клімавіцкага пав. (планавалася з Віцебскай і Магілёўскай губерній да 4 тыс. дзяржаўных сялян). Палова сялян памерлі падчас пешага пераходу, дзесятую частку ўнесла ў магілу «тоска по родине, холод и голод», ніхто нічога не атрымаў на новым месцы [340, с.126; 422, с.125].

Масавае выгнанне з родных месцаў адбывалася пасля пагрому Лістападаўскага паўстання з мэтаю паслаблення «польскага элемента» на Беларусі і ў Літве. Масава перасялялі ўглыб Расіі дробную і засцянковую шляхту, якая ва ўсіх паўстаннях складала найбольш актыўную патрыятычную частку; адначасова яны страчвалі шляхецкія прывілеі. За 1832–1850 гг. перасялілі ўглыб Расіі з «зямель забраных» каля 50 тыс. чал. (некаторыя пішуць 50 тыс. сямей) [584, с.64; 590, с.119]. 25.03.1832 г. былі зацверджаны «Правілы для перасялення грамадзян і аднадворцаў з заходніх губерняў у Каўказскую вобласць па вызначэнню ўрада». Мясцовае начальства рэкамендавала ў першую чаргу «неблагонадежных» асоб. Перасяленцам давалі льготы: яны вызваляліся на 5 гадоў ад падатнай падаці і земскіх павіннасцяў, рэкруцкіх набораў; на 3 гады – ад натуральных павіннасцяў; на 6 гадоў – ад вайсковых пастояў; ім ліквідавалі недаімкі па былому месцу жыхарства; выдалі пры адпраўленні па 50 руб. на сям'ю. Пры прыбыцці на месца далі па 100 руб., а таксама бясплатны хлеб для пасева і 3 пуды солі [292, вып.2, Т.VII, с.153–158]. У той жа дзень заснаваны правілы і для добраахвотнага перасялення аднадворцаў заходніх губерняў на Каўказ, у Саратаўскую і Арэнбургскую губерні. Льготы былі тыя ж, але без дапамогі хлебам і соллю [292, Т.VII, вып.2, с.158–162].

8.03.1846 г. з'явілася распараджэнне Міністэрства ўнутраных спраў Віленскаму ваеннаму губернатару аб перасяленні аднадворцаў заходніх губерняў у іншыя губерні Расіі. Па Міністэрству дзяржаўных маёмасцяў прапанавана перасяліць аднадворцаў з Ковенскай, Гродзенскай, Віленскай, Мінскай губерняў да 1000 душ у Херсонскую і да 80 сямействаў у Таўрычаскую губ. на выдзеленыя там землі [39, Т.IV, с.133]. Усяго да канца 1850 г. на казённыя землі былі перасяелены 12948 заходніх аднадворцаў мужскога полу [340, с.126]. 26.02(10.03). 1832 г. выйшаў царскі ўказ аб інкарпарацыі польскай арміі ў склад рускай і высылцы на Каўказ або ў Сібір [574, с.63].

Дэпартацыі падверглася уніяцкае духавенства. У 1839 г. шесць кляштараў (5 мужскіх і 1 жаночы) варожа сустрэлі злучэнне з праваслаўем, за што мітрапаліт Іосіф Сямашка вырашыў перасяліць 20 манахаў і святароў у Курскі манастыр [268,№17,с.135]. 34 манашкі Мінскага базыліянскага кляштара, 14 манахін Віцебскага і 103 Полацкага кляштара перажылі цяжкія пакуты ў 1830-я гады, калі па загаду Сямашкі іх кляштары зачынілі не толькі па рэлігійных прычынах, але і каб прыбраць іх маёмасць і багацці. 120 базыліянак выслалі ў Смаленск, а адтуль — у Сібір, куды дайшлі нямногія. Туды высялілі і 346 базыліянак [693, с.5—15]. Больш за 200 асоб былі дэпартаваны па справе Ш.Канарскага [574, с.71].

Нераспрацаваным з'яўляецца ў беларускай гістарыяграфіі пытанне станаўлення і развіцця ў 1-й палове XIX ст. палітычнай паліцыі. 5 верасня 1805 г. «для захавання ўсеагульнага спакою і цішыні грамадзян і аблягчэння народнага харчавання» быў створаны Камітэт вышэйшай паліцыі, «Настаўленне» для якога напісаў М.М.Навасільцаў. Аднак ён так і не пачаў дзейнічаць і быў заменены 13 студзеня 1807 г. Камітэтам аховы агульнай бяспекі. Апошні павінен быў займацца палітычным сыскам, збіраць звесткі аб «розных слухах адносна адраджэння Польшчы; узбуджэння народа чуткамі аб вольнасці сялян; аб падазрэннях і паклёпах, змовах супраць гасудара імператара.., аб дзяржаўнай здрадзе;… складанні і распаўсюджванні абуральных заклікаў, шкодных сачыненняў і д.п…; аб патаемных таварыствах, забароненых сходах» [Гл.: 266, с.12]. Камітэт перастаў існаваць 17 студзеня 1827 г., а незадоўга да гэтага 3 ліпеня 1826 г. быў аб'яўлены ўказ аб арганізацыі III аддзялення асабістай Яго Імператарскай Вялікасці Канцылярыі. Яму вызначалася роля «Цэнтральнага штаба па нагляду за поглядам

агульным і духам народным» [266,с.23]. Гэтае было даверана першай экспедыцыі III аддзялення, якае збірала звесткі аб людзях, якія знаходзяцца пад наглядам паліцыі; займалася высылкаю асоб падазроных і шкодных; выяўленнем патаемных таварыстваў і змоў; тайным наглядам за «дзяржаўнымі злачынцамі» і падазронымі асобамі; агульным кантролем і назіраннем за дзейнасцю дзяржаўнага апарата; выяўленнем злоўжываванняў мясцовых чыноўнікаў, беспарадкаў пры дваранскіх выбарах, рэкруцкіх наборах і д.п. Другая экспедыцыя сачыла за дзеяннем рэлігійных сектаў (за раскольнікамі, якія жылі ў Беларусі), з'яўленнем фальшывых грошай, наглядам за дзейнасцю розных таварыстваў. Трэцяя экспедыцыя (контрразведка) займалася пропускам праз межы замежнікаў, сачыла за іх паводзінамі на тэрыторыі Расійскай імперыі і пры неабходнасці высылала дадому. Чацвёртая экспедыцыя займалася незвычайнымі здарэннямі: пажарамі, забойствамі, эпідэміямі, сялянскімі хваляваннямі і злоўжываннямі памешчыцкай уладаю [266, с.27-28].

Выканаўчым органам III аддзялення на месцах сталі жандармы. Упершыню ў Расійскай імперыі яны з'явіліся ў 1815 г., калі ў кожным кавалерыйскім палку была створана асобная жандармская каманда. 28 красавіка 1827 г. выйшаў указ аб стварэнні новай жандармскай арганізацыі — уся Еўрапейская Расія была падзелена на 5 жандармскіх акруг. Беларусь склала трэцюю, Заходнюю, з цэнтрам у Вільні. У 1830 г. яна выглядала наступным чынам: г.Вільна — начальнік акругі генерал-маёр Лясоўскі; у кожнай губерні быў штаб-афіцэр корпуса жандармаў: у Віцебскай губ. — палкоўнік Мердер; у Магілёўскай — маёр Лязнёў; у Мінскай — падпалкоўнік Рэбіндер; у Віленскай — падпалкоўнік Руткоўскі; уГродзенскай — палкоўнік Дейер, ад'ютант паручнік Кузьмін; у Беластоцкай вобласці — маёр Кох [249, ф.1430, воп 1, спр.2478, а.1,1 адв.].

З 1832 г. Каралеўства Польскае складала III акругу, а Заходняя стала IV, з 1837 г. III акругу перайменавалі ў Варшаўскую, а IV — у Віленскую [266, с.42,45]. Царскім указам ад 7(19).11.1834 г. у кожную губерню былі прызначаны па 4 жандармскія обер-афіцэры з даручэннем наглядаць за гарадской і земскай паліцыямі, гараднічымі, паліцмайстрамі, земскімі спраўнікамі, лаўнікамі земскіх судоў, не дапускаць «противозаконных скопищ сношений или заговоров».

Асноўныя напрамкі дзейнасці III аддзялення ў 2 чвэрці XIX ст. у Беларусі — гэта справа дзекабрыстаў (іх сувязь з Польскім Патрыятычным таварыствам; дзейнасць таварыства «Ваенных сяброў»), паўстанне 1830-31 гг.; следства па справах польскіх эмісараў Ю.Заліўскага, М.Валовіча, Ш.Канарскага, Я.Рэра; справы перыяда «вясны народаў» 1848-1849 гг., барацьба з сялянскім рухам, разгляд скаргаў і прашэнняў; нагляд і збор інфармацыі аб мясцовым кіраванні. Жандармскія штаб-афіцэры пасылалі рапарты аб палітычным і эканамічным становішчы сваіх губерняў, у якіх адзначалі «маральны дух» усіх станаў, недахопы і адміністратыўныя злоўжыванні апарата губернскага ўпраўлення, розныя здарэнні, эпідэміі.

З 1810 г. на тэрыторыі Беларусі сталі ўладкоўвацца ваенныя пасяленні, што з'явілася адной з праяў аракчэеўшчыны [гл.: 467, с.140]. Як мы ўжо пісалі вышэй, у гэтым годзе з былога Бабылецкага староства Клімавіцкага павета мясцовыя дзяржаўныя сяляне былі выселены, а на іх месцы размясцілі асабовы склад Ялецкага пяхотнага палка. У 1817 г. па суседству было размешчана пасяленне Полацкага пяхотнага палка, якое аб'ядналі ў 1827 г. з першым у 1-ю акругу пасялення 2-й сапёрнай брыгады. У Дынабургскім пав. Віцебскай губ. было ўтворана пасяленне 1-й сапёрнай брыгады, цесна звязанае з папярэднімі. Даследчык ваенных пасяленняў на Беларусі Ю.А.Блашкоў прыйшоў да правільнай высновы: «Стварэнне ваенных пасяленняў на тэрыторыі Беларусі было ва ўсіх адносінах няўдалым. Толькі каля 20% сямей пасялян-«гаспадароў» нават ва ўраджайныя гады маглі забяспечыць сябе харчаваннем. «Пастаяльцы» ўвесь час знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні. Відаць, таму ў 1836 г. пяхотныя ваенныя пасяленні пераведзены на становішча ворных салдат» [43, с.184; 349, с.262-263].

Руская ўлада на былой тэрыторыі ВКЛ паволі, але паслядоўна і стала, змяняла саслоўную (грамадскую) структуру. Палітыка ўсіх расійскіх цароў ад Кацярыны II да Аляксандра II была прадвaранскай падобна палітыцы імператараў Аўстрыі ці каралёў Прусіі [гл.: 77, с.400,410]. Ясеніца піша правільна: «Дзяржаўныя апараты трох захопнікаў зусім не зачыняліся перад добра народжанымі новымі падданымі. Феадальным паняццям, якім пакланялася не толькі Расія, але таксама Аўстрыя і Прусія, быў характэрны свойскі касмапалітызм, заснаваны на тым, што рыцарскі стан, як і манархі ўсіх краін, адчуваюць сябе пэўным сатаварыствам» [586, с. 570].

Яшчэ Кацярына II ва ўказе 1776 г. заявіла, што «белорусских подданных от Великароссии ни в чем различать не изволит» [144, с.252]. Памешчыкам далі ўсе правы і прывілеі расійскага дваранства па «Даравальнай грамаце дваранству» 1775 г., але абмежавалі самастойнасць буйных феадалаў: іх права трымаць войска, мець свае крэпасці, мястэчкі і гарады, адмянілі юрысдыкцыю свецкіх і царкоўных магнатаў. Арыстакраты і багатая шляхта ў значнай большасці згадзіліся з расійскім урадам, які адабраў у іх палітычную ўладу, але пакінуў іх былыя эканамічныя і сацыяльныя пазіцыі. Расійская ўлада праводзіла карысную для шляхты палітыку ўзмацнення залежнасці сялян ад паноў і больш эфектыўна, чым бязмоцная ўлада Рэчы Паспалітай, падаўляла праявы супраціўлення сялян. Кансэрватыўная «крэсовая» арыстакратыя ахвотна знаходзіла ў Пецярбурзе і ўваходзіла ў кааліцыю з расійскай арыстакратыяй.

Самадзяржаўны апарат кіравання адрозніваў паняцці «польскае дваранства» і «шляхта». Расійскія імператары захоўвалі правы і прывілеі перш за ўсё дваранства, магнатэрыі і заможнай шляхты. На ахове іх інтарэсаў стаялі законы Расійскай імперыі [291, Т.225, с.638,306—308,331]. Большасць шляхты Беларусі была дробнай — брукавыя, чыншавыя, шарачковыя, заградовыя шляхціцы. Яны былі галоўным матэрыялам для хваляванняў і паўстанняў, таму расійскі ўрад адразу ж звярнуў на іх пільную ўвагу і пачаў рэвізію дробнай шляхты з мэтаю ачышчэння вышэйшага расійскага дваранства і высялення актыўных элементаў з асяроддзя шляхты за межы Беларусі. «Даравальная грамата дваранству» распаўсюджвалася толькі на тую шляхту, якая магла пацвердзіць сваё дваранскае паходжанне [291,Т.10,с.40]. Такое ж распараджэнне было апублікавана 12(23).09.1772 г. у адносінах да дваранства Усх. і Зах. Беларусі: «Дворянству подать от себя в губернские города списки о их дворянстве, чтоб впредь без Высочайшей воли никто себя тем достоинством не почитал, и потому бы принадлежащим только дворянству правом, кроме действительных дворян, не мог никто пользоваться» [291, Т.19, с.571].

Паняцце «разбор шляхты» сустракаецца ў афіцыйных дакументах з канца XVIII ст. Ужо пасля I падзелу шляхце прадпісвалася падаць у губернскія канцылярыі дакументы, якія пацвярджаюць дваранскае паходжанне. У маі 1795 г. выйшаў указ Кацярыны II, адпаведна якому шляхта заходніх губерняў атрымала двухгадовы тэрмін для «отыскания доказательств на

дворянство», пачынаючы з 1(13).01.1801 г. Павел I таксама праводзіў рэвізію дробнай шляхты, патрабуючы ад яе прадстаўлення дакументаў свайго паходжання. Працягвалася яна і пры Аляксандры I. Не аднойчы выходзілі ўказы і распараджэнні аб умовах доказу свайго дваранскага паходжання. Маніфестам ад 12(24).03.1801 г. Аляксандр I аднавіў у кожнай губерні складанне дваранскіх радаслоўных кніг (у Гродне захаваліся некаторыя з іх на літары «В» і «Г» — 250, ф.332, воп 2, с.1, 2; воп 3, с.1), аднадворцам дазволілі даказваць сваё дваранскае паходжанне, такое ж права атрымалі ўсе, хто хацеў падаць доказы гэтага. Указ 20.01(2.02).1816 г. змяніў умовы «разбора шляхты»: да доказу свайго дваранскага паходжання шляхта заходніх губерняў пераводзілася ў аклад і ёй забаранілі перасяляцца, пераходзіць з месца на месца да канчатковай праверкі дакументаў, што на практыцы не вытрымлівалася [291,Т.33,с.465—467]. Як ажыццяўляліся гэтыя ўказы, бачна, напрыклад, з табліцы «Разбор шляхты на Беларусі. 1816 г.», прыведзенай С.Лугаўцовай у дысертацыі [207, с.95], або з дакументу 1817—1824 гг., які захаваўся ў гістарычным архіве [250,ф.295,воп.1,с.126]: частка асоб зацверджана ў дваранстве, частка разглядаецца ў розных інстанцыях, частка да пацвярджэння не прадставіла ўсіх доказаў, некаторыя не зацверджаны ў дваранстве і пераведзены ў падатнае саслоўе.

Пры Мікалаі I пачаўся больш рашучы наступ на дробную шляхту: 8(20).06.1826 г. з'явіўся ўказ, які ўстанавіў тэрміны і парадак залічэння былой шляхты ў аклад [292, Т.1, с.542—543]; 11 (23).03.1828 г. — указ аб парадку абкладання акалічнай і чыншавай шляхты з дамоў, а не з душ [292, Т.3, с.228—236]. Згодна з указамі ад 14(26).11.1824 г. [291, Т.34, № 30115], ад 11(23).07.1828 г. і 14 (26).05.1830 г. [292, Т.5, отд.1, с.399-400] шляхціцы, якія не мелі сялян, маглі запісвацца ў купцы або атрымаць пасведчанні гандлюючых мяшчан. Царскі ўказ ад 19(31).10.1831 г. «О разборе шляхты в западных губерниях и об устройстве сего рода людей» [291, Т.6, с.134—138] падзяліў шляхту на дзве асноўныя групы: 1) шляхціцы, якія даказалі дваранства і 2) асобы, якія называюцца шляхтай без доказаў: аднадворцы («сельские обыватели») і грамадзяне («городские обыватели»). Першыя захавалі ўсе правы дваранскага саслоўя і сталі называцца ўжо не шляхтаю, а дваранамі. Другія з 1(13).01.1833 г. павінны былі выконваць дзяржаўныя павіннасці

(земскія; падымны збор на ўтрыманне войска; рэкруцкую). Былі вызначаны «Правілы ўстанаўлення дваранства»:

1. Падаць прашэнне з доказамі адпаведна 92 артыкула «Даравальнай граматы дваранству», дзе напісана, што «доказательствами неопровергаемыми Благородства да будет»: дыпломы продкаў, дадзеныя ім каранаванымі асобамі; пажалаваныя ім гербы; патэнты на чыны; патэнты на ордэны; указы на дачу зямель, тое ж за вайсковую службу (памесце); указы на дачу вёсак; доказы дваранскай службы продкаў; купчыя, закладныя, духоўныя аб дваранскім маёнтку; доказы таго, што дзед, бацька валодалі вёскамі і г.д.

2. Пры прашэнні дадаць копіі гэтых дакументаў засведчаныя судзебным парадкам (у перакладзе на рускую мову).

3. Прыкласці радаслоўныя з малюнкамі герба, спіс жывых асобаў па адпаведнай форме.

4. Прыкласці пасведчанне дванаццаці «благородных дворян и помещиков» або павятовага прадвадзіцеля дваранства аб тым, што ўсе прадстаўленыя дакументы сапраўдныя і належаць прасіцелю.

5. Тыя, хто даказваў дваранства з падатнага саслоўя, павінны мець з дакументамі рашэнне мясцовага павятовага суда аб непадляганні запісі ў рэвізскія скаргі.

6. Народжаныя асобы запісваюцца ў дваранскую годнасць бацькоў пасля прадстаўлення метрычнай выпіскі, заверанай кансысторыяй [249, ф.2784, воп. 1, спр.1, а.380].

Шэраг дакументаў ад 21.12.1831 (2.01.1832), 11(23).11.1832, 25.07(5.08.).1833, 5(17).07.1838 г., 3(15).07.1845 г. быў прысвечаны «разбору шляхты»: складанне спісаў грамадзян і аднадворцаў заходніх губерняў [249,ф.1430, воп.1, с.3363, а.1,аб.]; падзел былой шляхты на «три разряда людей»; вызначэнне тэрміну прадстаўлення доказаў на дваранства; пералік патрабуемых дакументаў [292,Т.7, с.836-837; Т.20,с.506,507; Т.23,с.5—7; 254,с.151-152]. У 1842 г. аднавілася дзейнасць створаных яшчэ ў 1833 г. спецыяльных камісій для праверкі актавых кніг: адна для Віленскай, Гродзенскай губерняў і Беластоцкай вобласці, другая — для Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. З 1834 г. на кожны ліст ставілася пячатка, бо знайшлі «многие беспорядки в нумерации листов, в описях, перемене печатей и внесение в книгу подложных документов» [291, Т.17, с.76-77]. Турчыновіч пісаў: «Падробка дакументаў у Гродзенскай губерні дасягнула такіх памераў, што вызвала асобае

следства, якім было выяўлена, што ў прыватных руках меліся ў значнай колькасці бланкі з сапраўднымі подпісамі былых польскіх каралёў» [383, с.183]. Улашчык заўважыў, што і ў Мінску падробка дакументаў набыла найбольшы размах, бо цяжка было знайсці чыноўніка, які б не займаўся б гэтым, а ў Вільні былі найлепшыя спецыялісты [386, с.91-92]. Падробкі рабілі таксама ў Магілёўскай і Віцебскай губернях [207, с.101].

Праца спецыяльных камісій па разгляду метрычных і актавых кніг цягнулася да 1843 г. Указ 5(17).11.1841 г. павялічыў тэрмін пошуку дваранскіх праў да 1844 г. Гэтым урад даваў «новое доказательство заботливости о пользе и выгодах жителей края», — лічыў Турчыновіч [383,с.183]. У ліпені 1845 г. было аб'яўлена, што тэрмін скончыўся, і ў сувязі з гэтым:

1) асобы, якія не маюць зямлі і не зацверджаныя ў дваранстве, павінны запісацца ў аднадворцы або ў грамадзяне;

2) асобы, якія валодалі нерухомай маёмасцю, павінны былі ўносіцца ў спецыяльныя спісы, а затым разглядацца дваранскімі дэпутацкімі сходамі;

3) права прадставіць дадатковыя дакументы давалася толькі тым, хто аб'явіў аб незацвярджэнні ў дваранстве пасля 1(13).01.1844 г.

Ці дасягнуў расійскі ўрад сваёй мэты — скарачэння «выбуховага матэрыялу», дробнай шляхты? Мяркуйце самі: па дадзеных Г.Туміловіч, удзельная вага дваранства па губернях скарацілася з 10-12% да 4-6% (4% па Віленскай губерні, 6% — па Мінскай і Віцебскай губернях); захоўвалася перавага дваран заходніх губерняў у адносінах да расійскага дваранства (больш 6%); тут пражывалі больш за 2/3 усіх патомных дваран імперыі [380,с.5; 379, с.58]. Усяго ў Гродзенскай, Віленскай (Ашмянскі, Свенцянскі паветы), Мінскай (Дзісенскі, Вілейскі паветы) губернях у склад аднадворцаў было пераведзена па дадзеных IX рэвізіі (1851 г.) 10636 чалавек [386, с.97]. Як мы гаварылі вышэй, значная частка шляхты была ў час разбору дэпартавана. Разбор закрануў і тытулаванае дваранства. У адпаведнасці з сенацкім указам ад снежня 1830 г. тытулы «граф», «князь» маглі ўжывацца толькі тады, калі асоба мела доказы на права іх нашэння [207, с.99].

Скарачэнне дробнай шляхты — адзін бок саслоўнай палітыкі царызма. Другі бок — адносіны да сялянства. Асабліва пасля Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг., калі на сялян Беларусі сталі глядзець як на матэрыял для русіфікацыі. Урад

Расіі, як і ўрады Аўстрыі, Прусіі, шукаў сярод сялянства апірышча для свайго панавання і спрабаваў узяць яго пад сваю апеку [Гл.: 351, с.46; 48, с.104,106; 173,с.11, 35]. Сярод сялян насаджалі веру ў добрага цара-апекуна, цара-выратавальніка ад прыгнёту іншаверцаў. Упэўненасць у гэтым павінны былі даць наступныя мерапрыемства самадзержцаў:

-у 1773 г. генерал-губернатар Чарнышоў склаў форму арэнднага кантракту, дзе абавязаў арандатараў ад сялян «не патрабаваць ніякіх больш падаткаў, не накладаць на іх ніякіх для сябе збораў і не прымушаць да ніякіх панскіх работ, акрамя тых, якія яны да гэтага часу аддаваць і выконваць павінны былі і выконвалі» [Цыт. па: 338, с.15];

-забарона ў беларускіх губернях продажу сялян без зямлі для «вывода в Россию» (1775 г.);

-рэкамендацыі ўпраўляючым і арэндатарам казённых маёнткаў пазбягаць фізічных пакаранняў (1776 г).;

-дазвол сялянам выбіраць лаўнікаў у ніжнія (міравыя) суды (1795 г.);

-дазвол сялянам, якія шукаюць вольнасць легальным шляхам, падаваць апеляцыйныя скаргі ва ўсе судовыя інстанцыі: аж да Сената (1796 г.); потым хадайніцтва і перанос спраў быў ускладзены на губернскіх пракурораў;

-пацвярджэнне маніфестам Паўла I у дзень каранавання ва ўсёй імперыі неабходнасці выканання патрабавання «десядословия» аб прысвячэнні на служэнне Богу сёмага дня кожнага тыдня: «дабы никто и ни под яким выглядам не смел в воскресные дни принуждать крестьян к работам» (1797 г.);

-вызваленне Паўлам I усіх баяр (246 чалавек) ад прыналежнасці прыватным асобам, калі раздаваў землі з сялянамі (1798 г.);

-залічэнне вольнымі перасяленцаў у Літоўскую губ. у былыя часы з Цесарыі, Прусіі і іншых зямель і названых пры апошняй рэвізіі вольнымі (1799 г.) [291,т.25,с.573];

-падчас голаду ў 1800 г. Павел I паслаў сенатара Дзяржавіна з наказам перадаваць маёнткі тых памешчыкаў, якія пакідаюць сваіх сялян без пракармлення, у апеку. Яна павінна была даць сялянам памешчыцкі хлеб, а калі яго не хопіць, дык за іх лік узяць з запасных магазінаў (складоў);

-Паўлаўскім указам ад 4(15).12.1796 г. была пакінута літоўска-польская сістэма падатковага абкладання і толькі ўказам 18 (29).12.1797 г. загадана збіраць падушны падатак з 1(13).01.1798 г.;

-указ Аляксандра I аб «вольных хлебапашцах» (1803 г.);

-перавод выплаты падаткаў з серабра на асігнацыі [291, Т.24, с.16-20, 243, 587, 813-815, 845-846; Т.25, с.21-24,573].

Спрэчнымі па ўплыву на беларускіх сялян былі люстрацыі — падрабязнае апісанне кожнага маёнтка і інвентарная рэформа. У 1798 г. была праведзена люстрацыя, у выніку якой складаліся інвентары ў дзяржаўных маёнтках заходніх губерняў. Рапнін у інструкцыі пісаў, што люстрацыйныя камісіі павінны «наогул паказаць усе выгаднасці тых маёнткаў, раўнамерна засведчыць колькасць дзён паншчызны і ўсялякіх работ, выконваемых жыхарамі» [Цыт. па: 338,с.15]. Але люстратары не мелі права змяншаць устаноўлены «адпаведна ранейшым польскім інвентарам» арэндны даход, таму мае рацыю У.Сосна, што «люстрацыя не ўнесла істотных змен у павіннаснае ярмо сялянства» [338, с.15]. У снежні 1839 г. Мікалай I падпісаў «Палажэнне аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў заходніх губернях і Беластоцкай вобласці». Асноўныя два мерапрыемствы заключаліся ў правядзенні люстрацыі і стварэнні апарата кіравання дзяржаўнымі маёмасцямі. Люстрацыі суправаджаліся зямельнымі перадзеламі з мэтаю ліквідацыі малазямелля сялян і ўсталявання нормы надзялення іх зямлёй. У выніку яна садзейнічала паступоваму пераходу на аброчную сістэму (канчаткова ў 1857 г.), уплывала на ліквідацыю арэнды казённых маёнткаў, зямельны фонд сялян павялічыўся на 10,7%, а падатны ўціск знізіўся на 20% [124, с.418; 144, с.313-314].

З 1844 г. пачалі працу губернскія інвентарныя камітэты, у задачу якіх уваходзіла перагледзець старыя інвентары і там, дзе іх няма, скласці нанова. У гэтым дакуменце замацаваліся павіннасці сялян і нормы надзялення іх зямлёй. З 1845 г. інвентары пачалі ўводзіцца ў жыццё. Памешчыкі тармазілі гэтую справу, праз інвентарны камітэт дамагаліся захавання былых прыгонных павіннасцяў (а часам і яшчэ большых). У 1848 г. Літоўскі генерал-губернатар Ф.Міркавіч даносіў, што да гэтага часу камітэтамі было разгледжана па яго 4 губернях 9600 інвентароў, а калі ўладальнік перабольшваў «противу прежнего повинности», дык аб'яўленне інвентара спынялася, і ад памешчыка патрабуецца новы з правільным паказаннем павіннасцяў [393,с.310]. Да 1857 г. толькі ў 0,1 часткі памешчыцкіх маёнткаў былі ўведзены ў дзеянне перагледжаныя або нанова складзеныя інвентары [144,с.315]. Магілёўскі інвентарны камітэт у 1855-1856 гг. патрабаваў ад памешчыкаў

губерні інвентарных правіл [249,ф.2001,воп.1,спр.50-51, 674—687]. «Складзеныя самімі ж памешчыкамі, яны не прывялі роўна ні да чаго і зусім не аблегчылі становішча сялян», — слушна пісаў даследчык Еленеў [113,с.64].

Пералічанымі мерамі ўрад не столькі хацеў дапамагчы сялянам, колькі аслабіць сялянскі рух, прыцягнуць сялян на свой бок у барацьбе супраць «польскіх» рэвалюцыянераў і шляхецкай апазіцыі. Сялян спрабавалі адарваць ад шляхты, імкнуліся ўнесці паміж імі недавер, не даць злучыцца ў адзіную антырасійскую сілу. У маі 1776 г. да генерал-губернатара З.Г.Чарнышова звярнуліся са скаргаю аршанскі стараста І.А.Язафовіч і камергер польскага двара І.В.Гальнскі. Праз іх, між іншым, шляхта скардзілася на рускіх камісараў, якія свядома распальваюць саслоўную варожасць у вёсцы: «внушают тем крестьянам, што они отнюдь не подвластны своим господам» [Цыт. па: 7, с.76].

А сялянства, нягледзячы на вышэйназваныя царскія мерапрыемствы, жыло не так ужо і добра. Як красамоўна выказаўся гісторык У.Ігнатоўскі, яно карысталася ў Рэчы Паспалітай «выгадамі быдла», а ў новым гаспадарстве атрымала «выгады рабочага «скота». Факты пацвярджаюць гэтае. Карэнным чынам змяніліся ўмовы падданства: павіннасці, заснаваныя да гэтага часу на нязменным элеменце (зямле, дыме), сталі залежаць ад жывога элемента (мужской душы). Гадавы падушны чынш дасягаў ад 5 да 70 і вышэй рублёў серабром і знаходзіўся пад наглядам абшчыны. З’явіўся невядомы стан дваравых («людзей без зямлі»). Сялян маглі прадаць. Прыйшла 25-гадовая служба сялян у войску, дзе паміралі не толькі ад ваенных падзей, але і ад бізуноў, голаду. Да таго ж яны аказваліся пад ціскам русіфікацыі. Да сярэдзіны 40-х гг. XIX ст. паншчынная сістэма ў Беларусі ахоплівала 97% памешчыцкіх і абсалютную большасць дзяржаўных сялян [336, с.67]. Царскі ўрад прымаў шэраг пастаноў аб розыску і вяртанні беглых сялян, пераўтварэнні ўсіх «бродяг» і «бобылей» у цяглых сялян, было дазволена прадаваць беларускіх сялян без зямлі, аддаваць іх у рэкруты замест рускіх сялян. Ён жорстка караў іх выступленні, заклікаў быць паслухмянымі памешчыкам, выконваць павіннасці пад пагрозаю пакарання «по всей строгости закона» [291, Т.24, с.305-306]. За скаргу на свайго пана селяніна білі кнутом і ссылалі ў Сібір. Памер зямельнага надзела памяншаўся, а павіннасцяў стала больш («менш зямлі, больш працы»).

Пагоршылася становішча мяшчанства, статус якога калісьці паднялі Чатырохгадовы сейм і Канстытуцыя 3 мая 1791 г. На гарады Беларусі была распаўсюджана «Даравальная грамата гарадам» 1785 г. Як вядома, да гэтага яны мелі магдэбургскае права (некаторыя з XIV—XV стст.). На этнічных землях Беларусі было звыш 120 вольных магдэбургскіх месцаў, а ў сучасных межах — больш за 90 [гл.: 411, с.11]. У «Плакаце» ад 10(21).08.1772 г. на далучэнне Усходняй Беларусі Кацярына II «священным именем и словом» абяцала, што «жительствующие в присоединенных к империи Российской городах и землях, будут оставлены и сохранены при всех тех свободах, коими они ныне … пользуются». Але, калі мяшчане сталі патрабаваць, даказваючы свае правы прывілеямі, суды і Сенат прызнаваў іх «недействительными». А.Цітоў прыводзіць прыклады такіх адмоўных хадайніцтваў жыхароў Бялыніч і Угор’я і адзначае факты страты ўладамі дакументаў вольных месцаў пры спробах адшукання былых магдэбургскіх правоў [411,с.10-11].

Паколькі значную колькасць насельніцтва гарадоў і мястэчак складалі яўрэі, дык нельга не сказаць хаця б некалькіх слоў аб адносінах да іх царызма. Тым больш, што, па словах Я.Анішчанкі, «абшчынная аўтаномія яўрэяў з атрыманым у спадчыну грамадскім поглядам і асобным заканадаўствам рабіла іх самастойнай сацыяльнай групай, накшталт саслоўя» [17,с.132]. З далучэннем да Расійскай імперыі яўрэі захавалі свой былы дваісты стан адасобленай сацыяльнай групы. На іх у рэчаіснасці не распаўсюдзілася абяцаная роўнасць у грамадскіх правах з іншымі расійскімі падданымі. Напрыклад, высачайшы дазвол у 1779 г. запісвацца ў гарадское купецтва і мяшчанства, выклікаў незадавальненне і супрацідзеянне хрысціянскіх купцоў і мяшчан, магістратаў, памешчыкаў (занятых вінакурэннем). Магчымасць яўрэяў заняць пасады ў гарадскім самакіраванні, а разам з тым набываць маёнткі выклікала пагрозу манаполіі дваранства. Права перасоўвання купцы-яўрэі мелі толькі ў межах Беларусі, а запісацца ў купецтва ва ўнутраных губернях Расіі было немагчыма. Указ Кацярыны II ад 23.12.1791 г. пра тое, што права «грамадзянства і мяшчанства» даецца яўрэям толькі ў Беларусі, па сутнасці ўводзіў смутнавядомую «черту еврейской оседлости», якая фактычна існавала ўжо з 1772 г. 23 чэрвеня 1794 г. мяжа, дзе дазвалялася «евреям водворяться», пашырылася да 15 губерняў, у тым ліку на ўсю сённяшнюю Беларусь (тады 5 губерняў).

Адасабленню яўрэяў садзейнічала і захоўванне кагала, які вырашаў духоўныя і грамадскія справы яўрэяў, збіраў некаторыя подаці і падаткі. Павятовы кагал быў падпарадкаваны губернскаму, а той — сенатару [119,с.256]. Жадаючым даведацца больш падрабязна аб станаўленні расійскай палітыкі да яўрэяў раім прачытаць манаграфію Я.Анішчанкі «Черта оседлости» [17].

У завяршэнні агляда трох галін палітыкі царызму (зямельнай, карацельнай, саслоўнай) неабходна адзначыць этапы яе эвалюцыі з вызначэннем асаблівасцяў кожнага, бо на працягу даследуемага перыяда палітыка царызму не была аднастайнай і прамалінейнай. У беларускай гістарыяграфіі сустракаецца выдзяленне Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг. як этапнай мяжы ў палітыцы царызма адносна Беларусі [380, с.11; 118, с.62]. Заўважылі таксама змену палітыкі пасля франка-рускай вайны 1812 г. [244, с.273]. Але да гэтага часу няма пэўнай перыядызацыі расійскай палітыкі адносна Беларусі. Мы прапаноўваем сваю:

I. Кацярынінскі перыяд.

1.1772-1795 гг. — ад першага падзелу Рэчы Паспалітай да паўстання 1794 г.

2.1795-1796 гг. — ад паражэння паўстання 1794 г. да канца панавання Кацярыны II.

II. Паўлаўска-Аляксандраўскі перыяд.

1.1796-1801 гг. — цараванне Паўла I.

2.1801-1812 гг. — ад пачатку панавання Аляксандра I да франка-рускай вайны 1812 г.

3.1812-1825 гг. — ад вайны 1812 г. да канца панавання Аляксандра I.

III. Мікалаеўскі перыяд.

1. 1825-1830 гг. — ад пачатку панавання да Лістападаўскага паўстання.

2. 1830-1855 гг. — ад паўстання да канца панавання Мікалая I.

IV. Перыяд панавання Аляксандра II (1856-1863 гг.)

Кацярына II у сваёй палітыцы адносна беларускіх зямель падкрэслівала, што не ўзяла «ни пяди чужой земли», а толькі вярнула «исконно русские земли». У верасні 1795 г. Кацярына II пісала М.Грыму: «При разделах Польши я не получила ни единого вершка Польской земли, но взяла то, что сами поляки называли и называют Червонною Русью, т.е. воеводство Киевское,

Подолию, Волынь, с ея столичными городами Владимиром, основанным Владимиром I в 992 г. Что касается Литвы и Самогии, то оне никогда не были Польшею, и так, я не имею ни одного вершка Польской земли и потому не могу быть Польскою королевою» [313, Т.1, с.XLVIII]. Нават на памятным медалі быў надпіс «Отторженная возвратих», інакш кажучы, вярнула тое, што раней адарвалі ад Расіі. Але, відаць, меў рацыю І.Лапа, калі пісаў: «Нават у кацярынінскім афарызме «отторженная возвратих» болей чуецца ўрачыстасць старой ідэі, знайшоўшай сваё адлюстраванне ў словах Маскоўскага вялікага князя на мяжы XV і XVI: «уся руская зямля ад прабацькаў нашых наша вотчына», чым разуменне таго, што народ рускі цяпер у агульнай сваёй масе стварае адзіную рускую краіну...» [198, с.15].

У наказах і ўказах, дадзеных З.Р.Чарнышову, М.Н.Крачэтнікаву, М.В.Рапніну, Кацярына II падкрэслівала: «Мы жадаем, каб гэтыя вобласці, не толькі моцаю зброі былі нам падуладны, але каб вы сэрцы людзей, якія там жывуць, добрым, прыстойным, правасудным, паблажлівым, кроткім і чалавекалюбівым кіраваннем Расійскай Імперыі прысвоілі, дабы яны самі прычыну мелі лічыць адтаржэнне сваё ад анархіі рэспублікі польскай за першы крок да іх благадзенства» [329, с.16]. Усе жыхары далучаных тэрыторый павінны былі прынесці прысягу, і тады толькі ім гарантавалі захаванне іх правоў адпаведна становішча. У «Плакаце», прыкладзеным да ўказа, які павінен быў аб'явіць З.Чарнышоў, гаварылася, што Кацярына, «усыновляя» сваіх новых «падданых» і «саграмадзян», «пацвярждае пры поўнай і неабмежаванай свабодзе ў публічным адпраўленні іх веры, таксама і пры законным кожнага валоданні і маёмасці, але і дасканала іх пад Дзяржаваю сваёю ўсынаўляючы, усіх і кожнага ўзнагароджвае яшчэ цяпер у поўнай меры і без усялякага выключэння ўсімі тымі правамі, вольнасцямі і прывілеямі, якімі старажытныя яе падданыя карыстаюцца, такім чынам кожны стан з жыхароў далучаных зямель уступае з самога гэтага дня ва ўсе яму належачыя выгоды па ўсёй прасторы Расіі» [311, стб.362].

У кіраванні ўмацаваўся, як ахарактарызаваў Я.Анішчанка, «сімбіёз спадчыны і навіны» [15, с.18]. Падрабязна пра гэта будзе расказана ў раздзеле 2.3 дадзенай працы, а тут хочацца прывесці погляд на гэты конт І.Лапы: захаванне былых праў і парадкаў было «праяўленнем мудрасці рускай улады ў момант далучэння Заходняй Расіі да Расійскай Імперыі, бо для ўдалых

пераўтварэнняў патрэбны былі і глыбокія веды Края, з яго асаблівасцямі і патрэбамі, і іншыя абставіны, а не тыя, якія былі ў першыя гады пасля далучэння». Але гэта, з другога боку, «захавала і яго асобы характар у агульным складзе Імперыі, што павінна было падтрымліваць уяўленні аб ім як аб дадатку да астатняй Расіі, а не яе арганічнай часткі, тэрыторыі, занятай таксама рускім народам, далучаючымся з гэтага часу з іншымі часткамі гэтага народа, ствaрыўшымі Расію» [198,с.12]. Кацярына II адразу імкнулася да зліцця далучаных зямель з іншымі часткамі імперыі, але рабіла гэта асцярожна і паступова: уводзіла «русские начала» — адміністрацыю, законы, суд, рускае землеўладанне, рускую мову. Расійскі гісторык А.Вінаградаў пісаў: «Плыня дзяржаўнага жыцця гэтага края з таго часу атрымала ўжо вызначаны характар паступовага аб'яднання і зліцця з роднаю яму Маскоўскай Руссю» [53,с.160]. Пасля разгрома паўстання 1794 г., трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай гэтая палітыка Кацярыны II праводзілася больш упарта і настойліва, з прымяненнем тых карных мераў, пра якія мы гаварылі вышэй.

Паўлаўска-Аляксандраўскаму перыяду былі характэрны паланафільскія тэндэнцыі ў розных галінах палітыкі расійскіх урадаў адносна Беларусі. «… под Русским владычеством полонизм развился в Русской земле гораздо сильнее, нежели во времена продолжительного господства над нею Речи Посполитой», — пісаў С.Шалковіч [524,с.242]. Пад «паланізацыяй» мы разумеем сістэму мерапрыемстваў дзяржаўных органаў, устаноў культуры і адукацыі, каталіцкага духавенства па асіміляцыі беларускага народа. Павел I і Аляксандр I лічылі захоплены беларускі край «польскими провинциями» і адпаведна гэтаму будавалі сваю палітыку. Павел I неаднойчы гаварыў (І.Патоцкаму, Ст.Панятоўскаму, Ю.Нямцэвічу, А.Чартарыйскаму): «Заўсёды быў супраць падзела Польшчы, быў гэта крок як непрыстойны, так і непалітычны, але ён ужо адбыўся. Ці дазволяць Аўстрыя і Прусія на адраджэнне Польшчы? Магу лі я сам аддаць маю частку, іх узмацніць, а сябе аслабіць? Ах, больш чым трэба дзяржава мая вяла ўжо войнаў, час нам адпачыць. Трэба таму паддацца абставінам і жыць спакойна» [Цыт. па: 586,с.557]. Таму ліквідаваць вынікі падзелаў і аднаўляць РП урад Паўла I не збіраўся. Тым не менш, шляхта ў адрасе, пададзеным Паўлу I , заяўляла, што «жывучы не ў Польшчы, яна адчувае сябе як бы ў Польшчы і нават лепш, чым у сапраўднай Польшчы» [Цыт. па: 216, с.21].

Палітыку спачування «польскай справе» працягваў Аляксандр I, асабліва да франка-рускай вайны 1812 г., пасля якой змянілася матывацыя адносін да беларускіх земляў і кансерватыўная плынь расійскай палітыкі перамагла ліберальную. Польскія адраджэнцы краіны спадзяваліся на Аляксандра I. Каэтан Козьмян, палітычны дзеяч таго часу, у сваіх успамінах пісаў: «Засветил он как звезда, а скорее как солнце, освещающая не только мрачный горизонт Польши, но всего человечества» [602, Т.1, с.243]. А паэт польскіх легіёнаў Цыпрыян Годэбскі сведчыў: «На тэрыторыі расійскага захопу кожны цешыць сябе прыгожымі надзеямі будучага» [Цыт.па: 605, с.87]. Але палітыка Аляксандра I была дваістай і хісталася «ад думкі аднавіць княства Літоўскае для яго наступнага далучэння з Польшчай да замыслаў цалкам абрусіць яго» [288,с.163]. На гэта мелі ўплыў, з аднаго боку, «польскі нацыяналіст» А.Чартарыйскі са сваімі прыхільнікамі, з другога — расійскія нацыяналісты на чале з М.М.Карамзіным.

Дзякуючы дзейнасці першага, ішло збліжэнне зямель Беларусі з Каралеўствам Польскім [542, Т.I, с.218]. «Пад апекаю Чартарыйскага Заходняя Расія так апалячвалася і лацінілася, як не апалячвалася і не лацінілася ніколі, — пісаў М.Каяловіч, — і цяпер яшчэ ёсць старыя, як у Заходняй, так і Усходняй Расіі, якія гавораць, што да Чартарыйскага многія з дробнага дваранства заходнерускага, хаця і лічылі сябе палякамі, але не ведалі польскай мовы, а гаварылі і пісалі па-руску (гэта значыць па-беларуску. — *В.Ш.*). Пасля Чартарыйскага такіх людзей ужо не сустракалася: рускімі заставаліся толькі тыя, хто не атрымаў адукацыі, гэта значыць сяляне (беларусы), большасць бедных мяшчан» [179, с. CLXVIII].

Другія ў «імя рускіх інтарэсаў» не дапусцілі аднаўлення «старой Польшчы» і вяртання ёй «далучаных губерняў». Вось што пісаў М.М.Карамзін Аляксандру I: «Вы думаеце аднавіць старажытнае Каралеўства Польскае, але гэтае аднаўленне ці згодна з законам дзяржаўнага блага Расіі? Ці згодна з Вашымі свяшчэннымі абавязкамі, з Вашаю любоўю да Расіі і да самой справядлівасці? Ці можаце са спакойным сумленнем адняць у нас Беларусію, Літву, Валынь, Падолію, умацаваную маёмасць Расіі яшчэ да Вашага аравання? Ці не прысягаюць дзяржаўцы забяспечваць цэласнасць сваіх дзяржаў? … Дагэтуль нашым дзяржаўным правілам было: ні пядзі ні ворагу, ні сябру!…» [Цыт. па: 198, с.27]. У абодвух выпадках з жыхарамі Беларусі ніхто не лічыўся.

Палітыка Мікалая I была накіравана на вяртанне больш узмоцненай русіфікацыі і ўніфікацыі Беларусі. Спачатку асцярожная, бо «в областях прежней Польши к России присоединенной не отменены ни прежнее законодательство, ни судопроизводство ни употребление польского языка. Поляк оставлен поляком и будучи верноподданым нынешних своих государей, может любить свой язык, и переданные от отцов обычаи и Уставы. Если патриотизм его не выходит из сего круга, то он не есть преступным и имеет основание свое в Всемилостивейших Государях российских при присоединении польского края обьявлениях. Но дело приемлет другой вид коль скоро с таковым патриотизмом соединяются мечтания о будущей независимости Польши, и когда сочинения польских писателей клонятся к питанию душей своих соплеменников подобных мыслей, ибо в таком случае они противны верноподданнической преданности, отторгая сердца их от действительного Отечества и привязывая к какому-то ещё не существующему и будущему» [540, zesp.Nowosilcowa, syg.772, a.12—21]. Пасля 1830-1831 гг. царскі ўрад выступіў актыўна супраць усяго, што, на яго погляд, перашкаджала поўнай інтэграцыі гэтых зямель з астатняю тэрыторыяй дзяржавы і магло падтрымліваць польскія мары. Генерал Замойскі ўспамінаў, што Мікалай I «галосна, хаця толькі ў размовах, выказваў, што палякі не могуць чакаць ад яго нічога большага, акрамя таго, што ўжо ёсць і што дадзена ў Канстытуцыі, што перш за ўсё павінны пакінуць надзею ўключэння да Каралеўства правінцый за Бугам і Нёманам. Чулі яго часам гаворачага, што папярэднікі яго, Аляксандр, даўшы гэтую надзею палякам, перайшоў за межы таго, што вольна цару, з погляду на інтарэсы маскоўскай дзяржавы» [Цыт. па: 576, с.38]. 16.09.1831 г. быў, як мы ўжо пісалі, створаны спецыяльны «Заходні камітэт», задачаю якога было «зраўняць Заходні край ва ўсіх адносінах з унутранымі вялікарускімі губернямі».

Пры Аляксандры II былі зроблены паслабленні ў польскім пытанні, што адразу заўважылі сучаснікі. Вось што пісаў К.Шыманскі, тады вучань рэальнай гімназіі ў Варшаве: «Усе аджылі, спадзяваючыся на лагоднейшае і справядлівейшае кіраванне. Мікалаеўскія сатрапы буйнага і дробнага калібру панізілі тон і менш былі строгімі. Гаварылі аб вяртанні з Сібіры.. Чакалі расвета новай эры ад маладога ліберальнага манарха... Разпачаўся рух, ажыўленне: пачалі шмат чытаць; пры

лагоднейшай цэнзуры множыліся новыя выдавецтвы. Камяні звярынага дэспатызму, прыгнетаючых жывы арганізм, адсунуліся, наша грамадства трохі ўздыхнула пасля 25 гадоў суровага і зняважаючага прыгнету» [цыт. па: 654, с.18].

Былі змяненні і ў адносінах да Беларусі. «Заходнія нашы губерні перасталі лічыцца як бы пасынкамі Расіі, шчодраю рукою пасылаліся на іх Манаршыя дабрадзействы і занялася светлая заранка новага іх дзяржаўнага жыцця, але на жаль, заранка гэтая хутка і нечакана згасла», — адзначыў даследчык І.А.Нікоцін [350, с.30]. Але і Аляксандр II працягваў палітыку ўніфікацыі і інтэграцыі заходніх губерняў з іншымі тэрыторыямі Расійскай імперыі, бо лічыў, што Беларусь — «край гэты ніколі не быў незалежным і ніколі не лічыўся здабыткам, а толькі адабраным ад Польшчы, як былая маёмасць Расіі» [цыт. па: 576, с.334-335].

Такім чынам, палітыка расійскага самадзяржаўя на землях Беларусі не была адназначнай і прамалінейнай, а залежала ад палітычных абставін і поглядаў пануючага манарха. Эвалюцыя царскай палітыкі ўплывала на змены ў грамадска-палітычным жыцці зямель Беларусі.

## 2.3. **Уладкаванне агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда**

Адміністрацыйнае ўпарадкаванне ВКЛ і Расійскай імперыі перад інкарпарацыяй адрознівалася адно ад другога, і таму расійскі ўрад павінен быў праводзіць сваё адміністратыўнае ўладкаванне далучаных беларуска-літоўскіх земляў. У ВКЛ павятовая рэформа 1566 г. ліквідавала блытаніну розных тэрытарыяльных адзінак і стварыла выразную структуру з ваяводстваў і паветаў. Было 10 ваяводстваў, менавіта: Віленскае, Троцкае, Полацкае, Навагрудскае, Віцебскае, Брэсцкае, Мсціслаўскае, Мінскае, Інфлянцкае і княства Жмудскае. Апошняе дзялілася на 28 цівунстваў (паветаў), астатнія — на паветы (акрамя Інфлянцкага, Мсціслаўскага, Полацкага ваяводстваў) [137, с.4; 448, с.295-296]. У Расійскай жа імперыі праект адміністрацыйнага падзелу быў падрыхтаваны спецыяльнай камісіяй у 1767 г. Уся тэрыторыя дзялілася на 20 губерняў (кожная з іх велізарных памераў), тыя — на правінцыі, апошнія — на паветы. Беларусь, далучыўшыся да Расіі, стала палігонам для выпрабавання спачатку гэтага праекта,

а потым «Учреждения для управления губерний» ад 7 (18).11.1775 г. На наш погляд, Пічэта слушна звязвае губернскае ўладкаванне зямель Беларусі з мэтамі царскага ўрада «больш цеснага іх зліцця з Расіяй» і называе гэта русіфікацыяй, бо насельніцтва звыклася з былым адміністрацыйным парадкам [282, с.53].

Увядзенне расійскага адміністрацыйнага падзелу і адміністрацыі было патаемна задумана яшчэ да далучэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Аб гэтым сведчыць Наказ Кацярыны II ад 28.05(8.06).1772 г. генерал-губернатару, графу З.Г.Чарнышову. У праводзімай расійскім урадам адміністрацыйнай палітыцы адносна «далучаных тэрыторый» вылучаюцца наступныя тры перыяды. Першы — кацярынінскі (1772—1796 гг.) — гэта спроба поўнай уніфікацыі і нівеліроўкі асаблівасцяў беларускіх земляў. Рабілася ўсё, каб пастунова зліць іх з астатнімі часткамі імперыі, бо насельніцтва не страціла сваёй «роднай мовы і нацыянальнага рускага выгляду» [334, с.33-34]. Прычым землі першага і другога падзелаў РП Кацярына II лічыла «исконно русскими» і «губернямі, вернутымі ад Польшчы».

Другі перыяд — паўлаўска-аляксандраўскі (1796—1825 гг.) — гэта адраджэнне часткі старога адміністрацыйнага ўладкавання і кіравання. Трэці перыяд — мікалаеўскі (1825—1856 гг.) — час больш жорсткай уніфікацыі, нівеліроўкі, русіфікацыі. Чацвёрты — паслабленне названых працэсаў пры панаванні Аляксандра II.

У кацярынінскі перыяд можна выдзеліць наступныя этапы ў адміністрацыйным уладкаванні беларускіх зямель, далучаных да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. Першы — загад ад 16(27).08.1772 г. графу Чарнышову, адпаведна якому з новых зямель утварылі дзве губерні: Пскоўскую і Магілёўскую (схема Д.1.1.). Абедзве губерні ўваходзілі ў адно генерал-губернатарства на чале з З.Чарнышовым [350, с.4]. Другі этап адміністрацыйнай палітыкі пачаўся пасля з'яўлення «Учреждения о губерниях» 1775 г., даравальнай граматы дваранству і гарадавога палажэння. 24.08(4.09).1776 г. Сенат зацвердзіў праект Чарнышова аб стварэнні дзвюх губерняў: Магілёўскай (з былым падзелам на паветы) і Полацкай (замест Пскоўскай), ад якой аднялі Пскоўскі і Велікалуцкі паветы. Вясною 1777 г. адбыўся новы падзел гэтых губерняў на паветы. Магілёўская падзялялася на 12 паветаў. Пры гэтым мястэчкі Дрыса, Люцын, Сураж, Чавусы і Копысь, а таксама пасёлкі Бабінавічы, Клімавічы і Беліца падняты на ўзровень павятовых цэнтраў.

13(24).04.1793 г. быў рэалізаваны праект Кацярыны II аб адміністрацыйным уладкаванні беларускіх зямель, далучаных пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай: «Словом Мы повелели по указу 8.12.1792 г. образовать те губернии по правилам учреждений Наших и прочим законам, по коим Всероссийская империя и Белорусские губернии, от Польши же присоединённые, управляются» [291, Т.33, с.388,417]. Частка Полацкага ваяводства ўвайшла ў Полацкую губ., усе землі ад новай граніцы гэтай губерні да р.Бярэзіна — у Магілёўскую губ., Мазырская акруга — да Чарнігаўскай губ., рэштка земляў падзелена на тры губерні: Мінскую, Ізяслаўскую, Браслаўскую. Мінская падзялялася на 13 паветаў [633, с.79; 608, Т.3, с.181]. Увесь абшар другога падзелу складаўся з 5 паветаў, і таму ўзнікла цяжкасць з вызначэннем павятовых цэнтраў. Кацярына II выдала нават спецыяльны загад аб стварэнні новых месцаў. 2(13).10.1795 г. было створана Мінскае намесніцтва, падзеленае на 13 акруг [137, с.8].

Па ўказу Кацярыны II ад 30.10.(10.11.)1794 г. вызначалася часовая арганізацыя ВКЛ ( назва гэтая захоўвалася да 1795 г.). Адміністрацыйна яна падзялялася на тры часткі: Гродзенскую на чале з генералам князем П.Цыцыянавым (а з мая 1795 г. М.П.Паніным ), Віленскую ( генерал-маёр Б.Кнорынг), Ковенскую. Стварaўся Найвышэйшы Літоўскі Урад — Вярхоўнае Літоўскае Праўленне (далей: ВЛП) на чале з генерал-губернатарам М.В.Рапніным. Афіцыйна яно адкрыта 28.06.1795 г., а перастала існаваць 12.11.1796 г. (эканамічны дэпартамент скончыў сваю працу 20.11). Ствараемыя органы кіравання і суда былі падобнымі да ўнутрырасійскіх. ВЛП адпавядала губернскаму праўленню, крымінальны і грамадзянскі дэпартаменты — судовым палатам, эканамічны (або дамаводства ) — губернскаму дырэктару эканоміі, скарбовы — казённай палаце [706, с.94].

Крымінальны і грамадзянскі дэпартаменты павінны былі быць пасрэднікамі паміж Літоўскім трыбуналам і сенатам у Пецярбургу, таму прымалі апеляцыі ад судоў гродскіх, земскіх. Эканамічны і скарбовы ахапілі адміністрацыю, усе прыбыткі, якія ў часы РП ішлі ў дзяржаўную і каралеўскую казну, даходы з маёнткаў і ўсёй наогул маёмасці, узятай у казённае кіраванне.

Згодна з першым параграфам кацярынінскага ўказа ад 30.10.(10.11.) 1794 г. уладу адміністрацыйную выконвалі камандуючыя раскватараваных там корпусаў, у паветах— камандзіры брыгад, палкоў, батальёнаў. Рапнін павінен быў

падрыхтаваць для іх дакладныя інструкцыі, мог прызначыць у гарадах гараднічых, у паветах — капітан-спраўнікаў і іншых канцылярскіх чыноўнікаў, мог даваць ім чыны да тытулярнага саветніка. На пасады дапускаліся мясцовыя жыхары, вернападданыя Расіі [291, Т.33, с.572-584]. Кожны дэпартамент меў сваю канцылярыю, існавала таксама агульная — усяго каля 200 служачых [706, с.97]. Ва ўказе ад 30.10 (10.11).1794 г. падкрэслівалася, што судаводства застаецца ў руках грамадства, з гэтаю мэтаю былі аднолены гродскія, земскія, гарадскія суды. Толькі прыгаворы павінны выносіцца ад імя імператрыцы ўсерасійскай, у судах усё павінна было быць па Статуту ВКЛ і так, як перад канстытуцыяй 3 мая 1791 г. Функцыі суддзяў павінны былі выконваць тыя асобы, якія былі выбраны перад паўстаннем 1794 г. або нанова выбраныя грамадствам.

Спачатку аднавілі гарадскія судовыя ўстановы ( войтаўска-лаўнічы і бурмістраўскі суды) з умовай прынясення суддзямі прысягі на вернасць Кацярыне II. Апеляцыі ад судоў гродскіх, земскіх, гарадскіх павінны былі ісці да Трыбунала, але гэта не былы judicium generale supremum, а ўстанова, падобная на існуючы ў кожнай расійскай губерні вышэйшы земскі суд (суд II інстанцыі). Далей апеляцыю можна было падаваць у адпаведны дэпартамент ВЛП, а адтуль — у трэці дэпартамент Сената. Апрача таго, справы аб службовых злачынствах разглядаў ВЛП па расійскіх законах [706, с.105].

Такім чынам, на Беларусі дзейнічалі два судовыя заканадаўствы, але трэба прызнаць, што больш паўтарагадовае існаванне ВЛП безумоўна зменшыла магчымае замяшанне перад трэцім падзелам РП. У ім было шмат людзей, якія ведалі лакальныя абставіны, маглі даць неабходныя рэкамендацыі для адміністрацыі. Трэба пагадзіцца з Жытковічам, які пісаў: «Было гэтак ВЛП пераходным інстытутам у намечанай уніфікацыі краю з імперыяй, штучным стварэннем, палавінчатым» [706, с.114].

Пасля трэцяга падзелу РП былі створаны два намесніцтвы (схема Д.1.1.): Віленскае (7.01.1796) і Слонімскае (25.11.1796) [249, ф.2002, воп.1, спр.8, а.226-229]. Пры Паўле I шляхам аб'яднання Магілёўскай і Полацкай губерняў была створана Беларуская губ. з цэнтрам у Віцебску (23.12.1796). Яна падзялялася на 16 паветаў. Рэшткі былых губерняў адышлі да суседніх паветаў. 12(23).07.1797 г. Віленская і Слонімская губерні аб'ядналіся ў Літоўскую губерню з цэнтрам у Вільні,

якая падзялялася на 19 паветаў [3, с.16,51-52]. Як бачна, Павел І прытрымліваўся этнаграфічных падстаў. А.Чартарыйскі гаварыў, што «падуў новы дух у адміністрацыйным кіраванні».

Паводле ўказа Аляксандра І ад 9(21).09.1801 г. Літоўская губерня была падзелена на Віленскую і Гродзенскую губерні [426,с.12-15]. Склад іх быў такім самым, як і па ўказу ад 14(25).12.1795 г. 27.02(11.03).1802 г. Беларуская губ. была падзелена на Магілёўскую і Віцебскую (замест Полацкай) губерні. Абедзве складаліся з ранейшых паветаў. Паводле ўказа ад 18 (30).12.1842 г. «Аб утварэнні паўночна-заходніх губерняў» у склад Гродзенскай губ. быў перададзены Навагрудскі павет, а ў Віленскую губ. — Лідскі [3, с.25, 34-35, 54, 68-69].

У выніку трох падзелаў РП насельніцтва Беларусі і гістарычнай Літвы, асабліва шляхецкая грамадскасць, сутыкнуліся з дзяржаўным апаратам, які па характару быў цалкам адметным ад таго, з якім звыкліся ў ВКЛ. Людзям, якія былі выхаваны ў спецыфічных традыцыях, навязвалі прынцыпы, прынятыя ў бюракратычных абсалютных манархіях. Органы кіравання і суда, якія прыйшлі на змену, можна ўбачыць, напрыклад, па штату Слонімскага намесніцтва [249, ф.2002, воп.1, с.8, а.226—229]. Цэнтральныя органы кіравання і суда мелі на месцах свае ўстановы (схема Д.2.1.) :

-Міністэрства ўнутраных спраў — губернатар і яго канцылярыя, губернскае праўленне з канцылярыяй, яго камітэты і камісіі, паліцэйскія ўстановы (павятовы спраўнік, верхні і ніжні земскія суды, станавы прыстаў, паліцыя ў гарадах), органы жандармерыі, органы дваранскай карпарацыі ( губернскі і павятовы дваранскія сходы).

-Міністэрства юстыцыі — палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў, павятовы суд, пракуратура.

-Міністэрства фінансаў — казённая палата, павятовыя казначэйствы, мытныя ўстановы.

-Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў ( з 1838 г. ) — палата дзяржаўных маёмасцяў і акруговыя ўпраўленні.

-Галоўнае ўпраўленне шляхоў зносін ( з 1809 г.) — начальнік акругі.

-Міністэрства народнай адукацыі (з 1803 — 1804 гг.) — папячыцелі Віленскай і Беларускай навучальных акруг, Віленскі універсітэт як орган кіравання вучэбнымі ўстановамі; інспектары гімназій (з 1828 г.), рада пры дырэктары гімназіі, выбарны ганаровы папячыцель гімназіі; інспектар прыватных вучэбных установ (з 1833 г.), інспектар казённых вучылішчаў.

-Установы Сінода — архірэй і кансісторыя ў епархіі, у духоўных паветах благачыньня на чале з благачынным, царкоўныя прыходы.

-Установы ваеннага ведамства — адміністрацыйна-гаспадарчыя органы артылерыйскіх, інжынерных, правіянскіх, камісарыяцкіх акруг; корпус унутранай варты (з 1816 г.) на чале з інспектарам, падпарадкаваным ваеннаму міністру.

Дзейнасць кожнага з названых органаў кіравання і суда патрабуе спецыяльнага даследавання як па ўсёй Беларусі, так і па яе рэгіёнах. Некаторыя праблемы даследаваны (гл. раздзел 1.2), а мы звернем увагу толькі на тыя ўстановы, якія мелі найбольш значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё.

Спецыфічным органам кіравання быў інстытут генерал-губернатараў, які, па словах П.Заянчкоўскага, «утвараў штучную перагародку паміж губернскай адміністрацыяй і вярхоўнай уладаю» [126, с.145]. Другі расійскі даследчык кіруючага апарата самадзяржаўнай Расіі А.Градоўскі пісаў: «Сам генерал-губернатар, якімі б ні былі яго погляды, як бы ён ні быў вольным ад забабонаў, аддан Расіі і гасудару, едзе ў выбраны яму край з прадузятай ідэяй, ад якой ні ў якім выпадку не можа вызваліцца. Гэтая ідэя заключаецца ў тым, што край гэты ёсць нешта асаблівае ад астатняй дзяржавы... Часам гавораць, генерал-губернатар ёсць прадстаўнік рускіх інтарэсаў і агульнага закона ў давераным яму краі. Колькі іроніі ў гэтым выказванні: быць прадстаўніком рускіх інтарэсаў у Расіі! Чаму ж ад курскага і варонежскага губернатара не патрабаваць таго ж самага!» [79, с.336]. Думаю, што рускі ўрад добра разумеў, што на далучаных землях (не толькі Беларусі) такі спецыфічны орган кіравання, як генерал-губернатар, вельмі патрэбны для русіфікацыі («обрусения»).

Вышэйшай службовай асобай (начальнікам) губерні, надзеленай адміністратыўнай, судовай, ваеннай і палітычнай уладай, з'яўляўся губернатар [484]. Ён назначаўся царом па прадстаўленню міністра ўнутраных спраў з ліку асоб, якія належалі да вышэйшых колаў дваранства (шляхты). Абавязкі губернатара абумоўліваліся настаўленнямі 1728 і 1764 гг. (галава і гаспадар губерні), наказам губернатарам 1837 г. (прадстаўнік вярхоўнай улады на месцы), указам 1856 г. (права выдаваць пастановы і інструкцыі, якія раскрываюць агульныя артыкулы законаў) [18, с.51,52; 44, с.173].

Губернатар як прадстаўнік вышэйшай урадавай улады павінен быў сачыць «за непарушнасцю вярхоўных праў

самадзяржаўя, карысцямі дзяржавы і дакладным выконваннем законаў, статутаў, найвышэйшых загадаў, указаў Сената і загадаў начальства» [44, с.167]. Губернатар з'яўляўся старшынёю губернскага праўлення, статыстычнага камітэта, губернскіх прысутніцтваў (па сялянскіх справах, па земскіх і гарадскіх справах, па піцейных і па фабрычных справах, па вайсковай павіннасці і інш.). Быў таксама старшынёю або членам яшчэ прыкладна 20 камісій і камітэтаў, якія дзейнічалі ў губерні [18, с.55; 44, с.161]. Губернатар ажыццяўляў ведамасны і надведамасны нагляд за дзейнасцю падпарадкаваных яму ўстаноў і асоб: губернскага праўлення, камітэтаў і камісій, казённай палаты і яе ўстаноў, судовых палат і іх органаў, обер-паліцмайстра, гараднічага, землямераў, прыказ грамадскай апекі, сумленны суд [78, с.227].

Фінансавая дзейнасць губернатара тычылася збору розных падацей, нядоімак, састаўлення штогодных каштарысаў земскіх збораў, клопату аб належным становішчы ўсіх казённых будынкаў. Ваенныя функцыі вымушалі губернатара праводзіць рэкруцкія наборы, садзейнічаць ваеннаму начальству, турбавацца аб кватэрным і харчовым забеспячэнні воінскіх і рэкруцкіх каманд, якія знаходзяцца на тэрыторыі губерні. Выконваючы паліцэйскія абавязкі (а ў паліцэйскай дзяржаве яны носяць усемагутны і ўсёабдымны характар), губернатар падтрымліваў грамадскі парадак і спакой, забяспечваў дзяржаўную і асабістую бяспеку, сачыў, каб не было тайных таварыстваў, займаўся пошукам дзяржаўных злачынцаў і збеглых, назіраў за дзейнасцю пажарных служб, санітарнай і медыцынскай паліцыі, за асобамі, якія знаходзіліся пад наглядам паліцыі і інш. [291, т.20, с.258]. Судовая дзейнасць патрабавала ад губернатара займацца справамі грамадзянскага і крымінальнага судаводства: зацвярджэнне выбарных суддзей, рашэнняў палаты грамадзянскага суда, сумленных судоў, нагляд за следствам (мог нават адмяніць прыгавор) і прызначэннямі ваеннага суда [291, т.27, с.221–222; 44, с.225].

Нагляд за дзейнасцю губернатара ажыццяўлялі: імператар, міністэрства ўнутраных спраў, фінансаў і дзяржаўных маёмасцяў, Сенат. Губернатар дасылаў генеральныя ведамасці аб выкананні земскіх павіннасцяў, ведамасці аб здачы рэкрутаў, аб зборы падаткаў, гадавыя справаздачы імператару (копіі ў МУС), перыядычныя справаздачы і статыстычныя звесткі ў МУС, розныя данясенні імператару, МУС і III аддзяленню. Бліноў слушна піша: «Такая шматлікая і складаная справаздачнасць

страшэнна абцяжарвала губернатараў і па сутнасці будучы сродкам толькі фармальнага кантролю, яна мела невялікае значэнне для справы нагляду; значна больш карысці было бы, калі б справаздач было меньш, а існавала бы магчымасць фактычнай праверкі таго, што ў іх напісана» [44, с.241].

Паводле «Учреждения для управления губерний» агульнае кіраванне губерняй «імем Яе Вялікасці і складаючае таму як бы орган Правячага Сената» ажыццяўляла губернскае праўленне. У яго склад уваходзілі віцэ-губернатар, губернатар, некалькі дарадцаў [249, ф.2002, воп.1, с.8, а.226]. Даследчыкі дзейнасці губернскіх праўленняў сходзяцца на тым, што яны былі з 1775 г. канцылярыяй губернатара, які па сутнасці і вырашаў усе справы за выключэннем некаторых судовых, нягледзячы на калегіяльны характар гэтай установы [18,с.45,46; 44,с.173; 420,с.48]. У функцыі губернскага праўлення ўваходзіла абнародваць законы, распараджэнні ўрада і губернатара, сачыць за іх выкананнем, назіраць за «благочинием». Справаводства вялося канцылярыяй праўлення [315, с.43], якая мела чатыры аддзяленні [116, с.175]. Пры друкарні праўлення выдавалася газета «Губернскія ведамасці».

Даволі значная колькасць спраў вырашалася ў камітэтах і камісіях (схема Д.2.1.), а таксама ў апекунскім аб турмах таварыстве, апекі дзіцячых прытулкаў, прысутнасці для «освидетельствования умалишённых». Пры праўленні быў губернскі пракурор, які паводле «Учреждения о губерниях» з'яўляўся «прадстаўніком элемента законнасці і блюсціцелем закона». Ён ажыццяўляў агульны і мясцовы нагляд за выкананнем законаў і хуткім здзяйсненнем правасуддзя. Бліноў правільна піша, што, «маючы толькі двух страпчых і пракуратуру, губернскі пракурор, прымацаваны да губернскага горада, не мог выконваць свае абавязкі здавальняюча. Губернатар трымаўся ў адносінах да яго як начальнік» [44, с.237; 126, с.167-168].

Ва ўказе Кацярыны II генерал-губернатару графу З.Чарнышову ад 16(27).08.1772 г. «Аб арганізацыі кіравання ў далучаных землях ёсць шосты пункт, які тычыцца судовай справы: «Суд і расправу ажыццяўляць у існуючых установах па мясцовым правам і звычаям, але Нашым ужо імем і ўладаю» [39,Т.3,с.31]. Такім чынам, захаваліся суды гродскія (да 1831 г.), земскія, падкаморскія (да 1832), магістрат (да 1795), Галоўны (Літоўскі) трыбунал. Апошні быў вышэйшай апеляцыйнай інстанцыяй для названых судоў і выконваў натарыяльныя

абавязкі [54, с.36; 347, с.500,536,568]. 8(19).05.1773 г. з'явіўся ўказ Сената аб арганізацыі ў беларускіх губернях губернскіх і правінцыяльных земскіх судоў, суддзі якіх выбіраліся шляхтаю, а зацвярджаліся губернатарам. Яны выраашалі крымінальныя і маёмасныя справы, губернскі земскі суд прымаў апеляцыі з правінцыяльнага [39, т.3, с.38,40].

Паводле «Учреждения о губерниях» арганізоўваліся верхнія і ніжнія земскія суды (схема Д.2.1.). Першыя існавалі да 1796 г., другія — да 1862 г. Верхні земскі суд разглядаў у апеляцыйным парадку крымінальныя і грамадзянскія справы дваран. Ніжні земскі суд на чале з земскім спраўнікам (старшынёй суда) выконваў распараджэнні вышэйстаячых улад, прыгаворы судоў, праводзіў папярэдняе следства па крымінальных злачынствах і павінен быў ахоўваць «благочиние, добронравие и порядок», глядзець, каб «ніхто беглых людзей не прымаў, не трымаў», ажыццяўляць нагляд за тым, каб «цяглае насельніцтва спраўна выплочвала падаткі і зборы, выконвала натуральныя павіннасці, наглядаць за падаткамі ў час гандлю, за харчовымі справамі і станам дарог, за захаваннем супрацьпажарных і супрацьэпідэмічных мераў і г.д.» [116, с.121].

Першай інстанцыяй па дробных крымінальных і грамадзянскіх справах для ўсіх саслоўяў павета (акрамя гараджан) былі павятовыя суды, суддзя і засядацелі, якіх выбіралі на павятовых сейміках. Яны вырашалі і некаторыя несудовыя справы: захоўвалі межавыя кнігі і планы, праводзілі рэвізію павятовага казначэйства, разам з паліцыяй «вводили в имение» яго законнага ўладальніка [116, с.179]. На ўсходніх землях Беларусі павятовыя суды былі створаны пасля першага падзелу РП, а на заходніх — у 1840 г. [249, ф.2002, воп.1, спр.8, а.172,197; 350, спр.30]. Пры іх арганізоўваліся дваранскія апекі ў складзе павятовага маршалка, суддзі і засядацеляў [249, тамсама, спр.8, а.152].

Земскім судам падпарадкоўваліся станавыя прыставы, пасада якіх уводзілася пасля арганізацыі ў паветах адміністрацыйна-паліцэйскіх раёнаў (станаў) паводле Палажэння ад 3(15).06.1837 г. Губернатар прызначаў станавых прыставаў, а яны ў выкананні сваіх функцый абапіраліся на выбарную паліцыю ўдзельных і дзяржаўных сялян (соцкіх і дзесяцкіх ), на вотчынную паліцыю [116, с.176]. Гэтыя паліцэйскія сілы наглядалі за палітычна неблаганадзейнымі асобамі, займаліся пошукам злачынцаў і забароненай літаратуры, пастаўкамі фурманкаў і коней для войск, вышукам тых, хто ўхіляўся ад вайсковай службы.

Згодна з 75 артыкулам «Учреждения о губерниях» ствараліся ніжнія расправы (па аднаму суду на 10-30 тыс. душ) для гарадоў і акруг, дзе ёсць аднадворцы або ў «былой службе служылыя людзі», чорнасошныя дзяржаўныя сяляне, фурманы, дзяржаўныя сяляне, прыпісаныя да прадпрыемстваў. Вырашаліся крымінальныя і грамадзянскія справы, апеляцыі на якія можна было падаваць у верхнюю расправу. Сюды пастулалі і апеляцыі на ніжні земскі суд, калі ён быў падпарадкаваны ёй [249,ф.2002, воп.1,спр.8,а.197 зв. — 198]. У 1810 г. адчыніліся межавыя суды, якія займаліся размежаваннем дзяржаўных земляў ад памешчыцкіх і духоўных уладанняў на падставе Статута ВКЛ і пад наглядам прадстаўнікоў губернскага праўлення і казённай палаты. Скасаваны межавыя суды былі ў 1823 г. [350, с.22; 15, с.22, 26].

У гарадах паліцэйскія функцыі выконвалі гараднічыя, якія паводле «Учреждения о губерниях» прызначаліся з адстаўных ваенных Сенатам па прадстаўленню губернскага праўлення. Яны павінны былі сачыць за выкананнем прадпісаных законаў і прымаць меры ў выпадках іх парушэнняў, захоўваць у горадзе «благочиние, добронравие и порядок», прыводзіць у дзеянне загады губернскага праўлення і рашэнні судовых палат [291,Т.20,с.259]. Судовыя функцыі выконвалі таксама гарадскія суды, магістраты, палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў. У Мінскай і Магілёўскай губернях апошнія былі створаны ў 1796 г. [249, ф.2002, воп.1,спр.8, а.163,173]. У кожнай губерні з 1833 г. працавалі змяшаныя саслоўныя ўстановы — сумленныя суды, галоўнай задачай якіх было прымірэнне бакоў, якія спрачаюцца [98, с.392-393, 396, 458; 322, с.194; 116, с.86, 122, 129].

Пэўную ролю ў грамадска-палітычным жыцці выконвалі губернскія і павятовыя дваранскія сходы — карпаратыўныя органы дваранскага грамадства. У павятовым сходзе ўдзельнічалі ўсе паўналетнія радавыя дваране, не асуджаныя і не выключаныя з дваранскага грамадства. Паседжанні адбываліся за тры месяцы да губернскага дваранскага сходу. Вырашаліся саслоўныя справы павятовага маштабу: складанне спіса дваран з вызначэннем праў кожнага з іх на ўдзел у паседжаннях сходу, выбары дэпутата для рэвізіі справаздачы аб выкарыстанні і становішчы дваранскай казны, кандыдатаў на пасады ў павятовыя ўстановы. На губернскім дваранскім сходзе прысутнічаць маглі ўсе паўналетнія дваране, запісаныя ў радаводную кнігу губерні, не зняслаўленыя па суду і не

выключаныя з дваранскага грамадства. Правам голаса ва ўсіх пастановах, акрамя выбараў, мелі дваране, якія валодалі ў губерні нерухомай маёмасцю або на правах уласнасці, а таксама мелі чын або ордэн ці атэстат аб заканчэнні курса ў вышэйшай або сярэдняй вучэбнай установе, або праслужылі не менш трох гадоў на дзяржаўных пасадах. Удзельнічаць у выбарах маглі асабіста або праз прадстаўніка дваране, якія мелі маёнтак з не менш, як 100 душ, або нерухомасць не менш 15 тыс. руб.; валодалі нерухомасцю або мелі чын сапраўднага стацкага саветніка (палкоўніка); праслужыўшыя тры гады на пасадзе маршалка шляхты; упаўнаважаныя ад дробнапамеснай шляхты і прадстаўнікі ад дваранак, якія маюць поўны ўчастак.

Сходы былі звычайныя і надзвычайныя. Першыя збіраліся адзін раз у тры гады ў зімовы час ( снежань — студзень ) на 15 дзён. Другія — праходзілі па загаду або дазволу губернатара. Ён адчыняў сход, потым прысутныя прыводзіліся да прысягі, і старшынёю станавіўся губернскі маршалак. Дваранскаму сходу дазвалялася мець у губернскім горадзе будынак для паседжанняў, архіў і пячатку. У кампетэнцыю губернскага дваранскага сходу ўваходзілі: выбары на пасаду ў саслоўныя дваранскія органы (маршалкі, сакратар дваранскага сходу, засядацелі ў дваранскую апеку, верхні і ніжні земскі суды, сумленны і павятовы суды і інш.); рашэнне пытанняў, прапанаваных урадам; права хадайніцтва праз спецыяльна выбраную дэпутацыю перад генерал-губернатарам, Сенатам і царом (па пытаннях ліквідацыі мясцовых злоўжыванняў і нязручнасцей у мясцовым кіраванні); вядзенне дваранскіх кніг і выключэнне з дваранства (нават тых, хто не быў асуджаны судом, але яго ганебны ўчынак вядомы ўсім); складанне капіталаў для саслоўных патрэб (абавязак усіх дваран губерні); распараджэнне маёмасцю дваранскага грамадства. Забаранялася абмяркоўваць пытанні аб асновах дзяржаўнага ладу. Ліквідаваны дваранскія сходы на землях Беларусі пасля паўстання 1863 — 1864 гг. [485, с.215; 305, т.5, с.32-44].

На шляхецкае самакіраванне значна ўплываў губернатар. Як справядліва піша І.Бліноў: «амаль ні кроку нельга было зрабіць без губернатара» [44, с.196]. Ён даваў дазвол на скліканне дваранскіх сходаў, вызначаў павестку дня, турбаваўся аб прывядзенні дваран да прысягі, дастаўляў маршалкам спісы дваран, якія знаходзяцца пад следствам і судом, сачыў за дзейнасцю дэпутацкага схода.

На дваранскіх сходах выбіралі маршалка шляхты. Тэрмін «прадвадзіцель дваранства» пачне ўжывацца пасля загаду ад 23.02 (7.03).1831 г. [671, с.123]. Павятовы маршалак адпаведна заканадаўству асноўным абавязкам меў загадванне ўнутранымі справамі шляхецкай карпарацыі: кіраўніцтва правядзеннем сходаў, апека над сіратамі і хворымі, выдача пасведчанняў аб дваранскім паходжанні і інш. На практыцы былі актыўнымі дзеячамі мясцовай адміністрацыйнай улады: старшынствавалі на паседжаннях павятовых дарожна-будаўнічых, воспенных, харчовых і інш. камітэтаў і камісій, збіралі для начальнікаў губерній статыстычны матэрыял аб ураджайнасці, цэнах на харчаванне і будаўнічыя матэрыялы, аплаце падаткаў і г.д., выконвалі даручэнні губернатараў [377, с.15]. Губернскі маршалак павінен быў дакладваць у МУС «откровенно и доверительно обо всём, что может способствовать исполнению благотворительных видов Его Императорского Величества» [291, т.24, с.319]. Зразумела, што на пасады маршалкаў ( як навогул на ўсе выбарныя месцы) павінны былі трапіць толькі асобы благанадзейныя, здольныя і строгай маральнасці. Так, напрыклад, у 1836 г. на пасаду слонімскага павятовага маршалка выбралі брата паўстанца Міхала Валовіча Яўстаха, які адказна служыў на выбарных пасадах з 1821 г. і меў чын тытулярнага саветніка. Нягледзячы на гэта, гродзенскі губернатар не зацвердзіў яго асобу [250, ф.1, воп.10, спр.214, а.222]. У 1843 г. Ф.Міркавіч быў супраць зацвярджэння губернскім прадвадзіцелем дваранства М.Агінскага [393, с.277].

Шляхта не вельмі ахвотна прымала ўдзел у выбарах на мясцовыя пасады. У 1827 г. М.М.Мураўёў пісаў: «На выбары большай часткаю з'яўляюцца тыя дваране, якія шукаюць не агульнага дабра, а сваёй асабістай выгады.., тыя, хто гатовы прыняць усе непрыемнасці і агіды, дагаджаць моцнаму і багатаму; хто гатовы на ўсялякую несправядлівасць, толькі б разбагацець за кошт рамеснікаў, сялян, купцоў, валацэнгаў і тых, хто крадзе!» [422, с.70]. Шыман, прыведшы гэтае выказванне, слушна лічыць, што прычынамі таго, што лепшыя прадстаўнікі шляхты не імкнуліся заняць пасады ў мясцовым кіраванні і судзе, былі: абставіны, якія прымушалі іх трапляць у залежнасць ад буйных і дробных чыноўнікаў; нежаданне «адмовіцца ад самага прывабнага са сваіх правоў — права не працаваць. Яны прывыклі збіраць жатву, не сеяўшы, і не выяўлялі ні якой схільнасці прымаць на сябе стамляючыя

абавязкі, якія да таго ж ускладалі на іх і адказнасць, да якой яны не прывыклі і якую несці не жадалі» [422, с.69].

Губернскім органам міністэрства фінансаў па дэпартаменту дзяржаўнага казначэйства з'яўлялася казённая палата. У яе ўваходзілі: упраўляючы (якім да 1845 г. быў віцэ-губернатар, а потым спецыяльна прызначаемы старшыня) і паўкалегіяльная агульная канцылярыя («присутствие») з назначаных некалькіх дарадцаў, асэсараў, губернскага скарбніка. Існавалі таксама падатныя інспектары і падатныя канцылярыі. Казённыя палаты мелі наступныя аддзяленні: гаспадарчае — займалася дзяржаўнымі сялянамі і дзяржаўнымі маёмасцямі (да 1838 г.); лясное — казённымі лясамі, іх эксплуатацыяй і мясцовай лясной вартай (да 1838 г.); піцейных збораў — ажыццяўляла нагляд за піцейнымі адкупамі, за выдачай пасведчанняў на вінакурэнне і за дзейнасцю казённых піцейных устаноў; казначэйскае — загадвала павятовымі казначэйствамі; рэвізскае — ажыццяўляла ўнутраны фінансавы нагляд (рэвізію кніг і гадавых справаздач казначэйстваў).

У функцыі казённых палат уваходзілі правядзенне таргоў на падрады, размеркаванне па губерні дзяржаўных падаткаў, назіранне за гандлем і прамысловасцю, правядзенне перапісу (рэвізій) падатнага насельніцтва, пакаранне парушальнікаў устаноў казначэйства. Патрабаванні палаты прыводзіліся ў выкананне паліцыяй. У 1863 г. адбылася рэформа, пасля якой функцыі казённай палаты былі зведзены да вузка фінансавых пытанняў [464, с.9].

У адукацыйнай палітыцы царызму значную ролю адыгрывалі прыказы грамадскай апекі, прадугледжаныя «Учреждением для управления губерниями» і праіснаваўшыя да 1867 г. Ім даручалася «попечение и надзирание о установлении и прочном основании» народных школ, сіроцкіх дамоў, багадзельняў, дамоў для псіхічна хворых, працоўных дамоў. Па статуту народных вучылішч 1786 г. прыказы грамадскай апекі павінны былі спрыяць развіццю сеткі вучылішч, накіроўваць іх вучэбную і гаспадарчую працу [76, с.463]. Такім чынам, у Беларусі яны насаджалі рускую сістэму адукацыі.

Усе вышэйпералічаныя органы губернскага кіравання і суда ў сваёй дзейнасці абапіраліся на адпаведнае заканадаўства. Пры Кацярыне II на Белай Русі было ўведзена Саборнае ўлажэнне 1649 г., якое састарэла для самой Расіі, а для Беларусі было чужым і нязвыклым. На некаторы час захаваўся Статут

1588 г., пастановы сеймаў РП ( акрамя Чатырохгадовага). Павел I вярнуў Статут, адменены ў апошнія часы панавання Кацярыны I. Пры Аляксандры I назіраўся заканадаўчы хаос, бо намінальна захоўваліся былыя законы, Статут, але ў 1803 — 1804 гг. працавала камісія «па складванню расійскіх праў», распаўсюджваемых на далучаныя землі Беларусі [540, zesp. azchiw. Tyzenhauzow,sig.G-871]. Такім чынам, паралельна існавалі старыя традыцыйныя нормы права і навязаныя агульныя нормы расійскага права, мноства спецыяльных указаў Кацярыны II, Паўла I, Аляксандра I, часта спрэчных лакальных пастаноў. Усё гэта стварыла заканадаўчы лабірынт, у якім блукала насельніцтва і вельмі добра адчувала сябе мясцовая расійская бюракратыя, знайшоўшая сабе невычарпальную крыніцу новых даходаў.

Асобна трэба сказаць пра карыстанне Статутам ВКЛ, бо, як лічыць сучасны польскі даследчык Мараўскі, «атрыманне яго і сеймікаў зрабіла тое, што народнасць не была яшчэ да шчэнту затаптана ў гэтай частці польскай дзяржавы» [632, с.5]. У 1811 г. Аляксандр I дазволіў надрукаваць яго ў Вільні. Паколькі ён быў выдадзены ў 1786 г., дык у 1821 г. было загадана зрабіць праўку згодна з арыгіналам 1588 г. і кадыфікаваць яго ў межах расійскага заканадаўства. У маі 1822 г. стварылі спецыяльную камісію (І.Даніловіч, У.Лелявель, Я.Зноска, Я.Лабойка, К.Кантрым), якая за два гады апрацавала толькі 96 старонак [15, с.22].

У лістападзе 1828 г. Мікалай I зацвердзіў палажэнне Камітэта Міністраў аб перакладзе Статута на рускую мову і выданні яго на беларускай, польскай, рускай мовах [157,с.8]. У 1831 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях царскім указам дзеянне Статута было спынена і ўведзены «как по правительственной, так и по судебной части тот же самый порядок, который наблюдался во внутренних частях государства» [350, с.24]. Указам ад 25.06 (16.07).1833 г. было пацверджана, што пры вырашэнні крымінальных і следчых спраў трэба абапірацца на «русские узаконения» і толькі калі яны будуць «действительно недостаточными к разрешению представившегося обстоятельства», можна звярнуцца да Літоўскага Статута і пастаноў сеймаў РП. У 1832 г. выйшла прадпісанне Міністэрства юстыцыі аб выданні звода польскіх законаў «толькі на рускай мове для Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці і аб пераводзе тут усяго судаводства праз год на рускую мову. Дзяржаўны Савет

кіраваўся ў вырашэнні пытання аб увядзенні расійскай мовы ў судаводства наступным: «…В Государстве Самодержавном чем части его составляющие однороднее и чем законы единообразнее, тем и управление удобнее» [314, т.2, отд.1,стб.388]. Губернскія ўлады надрукавалі патрэбную колькасць названага прадпісання міністра і разаслалі ў мясцовыя ўстановы кіравання і суда [249, ф.295, воп.1, спр.324, а.1 – 4].

У час падрыхтоўкі поўнага збору законаў Расійскай імперыі было вырашана зрабіць Звод мясцовых законаў. Даніловіч хацеў уключыць артыкулы Статута ў якасці дзеючых нормаў мясцовага права ў склад агульнаімперскага збору законаў, але павінен быў працаваць паводле палітычнага заказу – у дзеючае права заносіць царскія акты, якія толькі ў неабходных выпадках тлумачыў спасылкамі на «польскае» заканадаўства. Да 10.04.1835 г. падрыхтаваны ў 1834 г. Звод праходзіў цэнзуру мясцовых экспертаў і ў 1837 г. 50 экзэмпляраў было надрукавана [15, с.23, 24]. Указам ад 25.06.(7.07)1840 г. Віленская, Мінская, Гродзенская губерні атрымалі аднолькавае ўнутранае ўладкаванне з губернямі карэннай Расіі. Дзейнасць Статута і сеймавых пастаноў была скасавана, яны былі заменены рускім заканадаўствам, руская мова прызнана дзяржаўнай і на ёй загадана весці ўсе справы па ўрадавай і судовай частцы, не выключаючы справы дваранскіх дэпутацкіх сходаў; усе акты патрэбна было пісаць па расійскіх узорах і правілах [350, с.29; 383, с.180]. Важнасць гэтай справы добра разумеў літоўскі генерал-губернатар Ф.Міркавіч. У размове 28 жніўня 1840 г. ён гаварыў пра гэта Мікалаю І у Брэст-Літоўску [393, с.232].

Заканадаўства ўводзіла ў жыццё чыноўніцтва, якое актыўна ўдзельнічала ў грамадска – палітычных падзеях: уваходзіла ў патаемныя таварыствы і масонскія ложы, у час паўстанняў складала рэвалюцыйную адміністрацыю краю («народныя ўрады»), садзейнічала планам эміграцыі і дапамагала яе эмісарам. Пра гэта будзе ў адпаведных раздзелах працы, а тут нам хацелася б звярнуць увагу на склад чыноўніцтва. Перад гэтым вызначымся з тэрміналогіяй, бо нават у афіцыйнай перапісцы таго часу сустракаецца блытаніна ў назвах пасад, хаця Табель аб рангах (1722 г.) адразу быў распаўсюджаны на «новаздабытыя тэрыторыі». Так, у справе па прадпісанню міністра ўнутраных спраў «О образе сношений между начальниками губерний, предводителями и маршалками дворянства» (1808 г.) сустракаюцца два тэрміны: «прадвадзіцелі

дваранства» і «маршалы дваранства» [249, ф.295, воп.1,спр.71, а.2 — 3]. Як мы пісалі вышэй, апошні тэрмін захаваецца да загада 23.02(7.03).1831 г. Па ўказу ад 11(23).01.1831 г. былі ліквідаваны пасады падкаморыя, каморніка, возных, харунжых. Указам ад 30.10(11.11).1831 г. усім прысутным месцам і пасадам ва ўсіх западных губернях загадана «присвоить именования, какие по Учреждению о губерниях соответственным местам и должностям в великороссийских губерниях присвоены, с отменою навсегда нынешних названий» [249, ф.2784, воп.1, спр.1, а.3].

Пасля першага падзелу РП у наказе Пскоўскаму і Магілёўскаму генерал-губернатарам ад 28.05(8.06).1772 г. Кацярына II пісала: «определить порядочное управление от нас предписуемое, не исключая из числа сих и тех природных тамошних уроженцев, в коих более привязанности к империи нашей вами усмотрено будет…» [39, т.3, с.28]. Па ўказу ад 8(19).12.1792 г. на імя Крачэтнікава ў Мінскай губ. месцы павінны былі быць замешчаны «из русских людей, известной способности и безкорыстия, не исключая из числа к местам определяемых и тех природных тамошних жителей, в коих более привязанности и усердия к Империи нашей усмотрено будет» [291, т.23, с.388-391]. Канцылярскіх служачых трэба было браць з Маларасійскай, Тульскай, Калужскай і іншых губерній. Але прыехалі чыноўнікі з Архангельска (8 чал.), Аланецка і аднайменнай губерні (8 чал.), Цверы — 1 чал. [329,с.56]. Павел I працягваў палітыку мацяры і падтрымаў праект мінскай шляхецкай дэлегацыі, якая прыехала ў Маскву на ўрачыстасць каранацыі: «Каб у кіраванні частка кіраўнікоў складалася з прадстаўнікоў польскай нацыі; каб судовыя ўстановы ў краі заставаліся, як і раней, на правах нашых польскіх, на ўласнай мове і на старых парадках; каб памешчыкі, што добра ведаюць законы, у судовыя ўстановы пасаджаны былі» [132, с.15]. Аляксандр I пайшоў яшчэ далей — у заходніх губернях адміністрацыя складалася выключна з асоб, якія, па словах рускага гісторыка Турчыновіча, «складалі адну шчыльную масу з астатнім польскім грамадствам губерні (Гродзенскай. — *В.Ш.*), былі непрыхільны і варожы да рускага ўрада і рускага народа» [383, с.176]. Мікалай I павярнуўся да чыноўнікаў рускага, праваслаўнага паходжання. У архівах захаваліся справы аб пераездах чыноўнікаў і выпускнікоў універсітэтаў на працу на землях Беларусі. Напрыклад, у 1859 г. Магілёўскі губернатар

запрашаў студэнтаў юрыдычнага факультэта Маскоўскага універсітэта на вакантныя пасады ў губернскіх і павятовых установах. Дакладныя запіскі з просьбамі прыняцця на працу паступілі ад выпускнікоў Маскоўскага і Пецярбургскага універсітэтаў, ад юрыста і чыноўніка канцылярыі з Кіева [249, ф.2001, воп.1, спр.785, а.2 — 14].

Перамены ў кадравай палітыцы бачны ў суадносінах чыноўніцтва мясцовага і рускага паходжання. Аналіз адміністрацыі Полацкага намесніцтва за 1791 г. паказвае, што асноўная большасць канцылярскіх служачых была з мясцовых жыхароў рознага сацыяльнага паходжання: «беларускіх дваран», сялян, «польскай шляхты», «беларускай шляхты», дзяцей салдацкіх і обер — афіцэрскіх, купцоў. Асоб рускага паходжання былі адзінкі: «расійскія дваране», сяляне, паповічы [249, ф.2567, воп.1, спр.195, а.5 — 194 зв.]. Напярэдадні вайны 1812 г. (16.06.) гродзенскі губернатар С.Ланскі ў сакрэтным рапарце пісаў, што мясцовая адміністрацыя ў органах дзяржаўнага кіравання і суда (асабліва ў маршалкаў і прысутствіях аб вайсковых павіннасцях, казённай палаце) складзена з «нацыянальных чыноўнікаў», «людзей тутэйшай нацыі». Пасля вайны гэтыя людзі яшчэ некаторы час знаходзіліся пры ўладзе па прадпісанню Літоўскага ваеннага губернатара ад 6(18).01.1813 г. [5, кн.5, ч.2, с.39]. Па дадзеных С.Токця, які прааналізаваў фармулярныя спісы штатных чыноўнікаў Гродзенскай і Мінскай губерняў напярэдадні паўстання 1830 — 31 гг., абсалютная большасць іх — мясцовыя ўраджэнцы. У канцы 1850-х гадоў было тое ж самае. Чыноўнікі — католікі ў Мінскай губерні складалі 65,6%, у Гродзенскай — 79,7%, а выхадцы з велікарускіх губерняў займалі пераважна вышэйшыя губернскія пасады [376, с.14,15]. Па Віленскай і Гродзенскай губернях зрабіў падобныя высновы Е.Арлоўскі, прааналізаваўшы запіску І.Сямашкі ад 10.01.1855 г. У складзе старэйшых чыноўнікаў тут былі 723 іншаверцы і толькі 140 праваслаўных (1/6) [268, №28, с.223]. Такім чынам, лёсы насельніцтва дзвюх губерняў знаходзіліся ў руках «праваслаўных» (што атаясамлівалася з паняццем «нярускіх»): яны выхоўвалі, вучылі, судзілі, лячылі, наказвалі, апякалі, кіравалі. Паколькі асноўная частка гэтых чыноўнікаў была католікамі, дык яны падтрымлівалі «польскі» дух у грамадска — палітычным жыцці зямель Беларусі.

Трэба мець на ўвазе, што ўрад не аднолькава ставіўся да ўсходніх і заходніх зямель Беларусі. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях ён абапіраўся на польскі элемент, і таму

адміністрацыя складалася з мясцовых ураджэнцаў. У Віцебскай і Магілёўскай губернях апорай былі праваслаўныя і прыезджыя з велікарускіх губерняў. Русіфікацыя чыноўніцтва ішла не так хутка, як хацелася царскаму ўраду. Не хапала для гэтага кадраў і фінансаў. Нават у Магілёўскай губерні, якая паступова русіфікавалася з 1772 г., у сярэдзіне 1840-х гадоў большая частка чыноўнікаў была католікамі [352, с.27]. Ва ўсёй Беларусі ў 1840-я гады лік выкліканыхураднікаў складаў 25 — 30% ад усяго чыноўніцтва [132, с.75].

Гэтых рускіх чыноўнікаў расійскі даследчык Плансан умоўна падзяліў на дзве катэгорыі: прыехаўшыя з велікарускіх губерняў і мясцовыя ўраджэнцы — праваслаўныя. Абедзвюм ён даў характарыстыку: яны бачаць толькі або выключна «справы і паперы» асоб, але не бачаць іх саміх і не ўплываюць на іх чыноўнікі. Прыехаўшыя чыноўнікі звычайна пакінулі сваіх родных у Расіі і таму на новым месцы «склалі нешта падобнае казачыны і маюць цалкам такі ж уплыў на больш развітых, чым яны, жыхароў края, як руская армія, заняўшая Парыж, на яго жыхароў» [285, с.38]. Мясцовыя чыноўнікі — праваслаўныя паходзілі з сялян — уніятаў, дзяцей уніяцкіх святароў, дзяцей і ўнукаў рускіх салдат, палякаў, прыняўшых праваслаўе для атрымання пасады, з ваенных і грамадзянскіх чыноў, ажаніўшыся на «польках». Усе яны, лічыць Плансан, «душэўна аддадзены польскай справе» і «значна болей даражаць поглядам мясцовых нязменных жыхароў, з якімі яны раслі, і сваіх патронаў, чым поглядам зменяемых прадстаўнікоў урада; ахоўваючы інтарэсы першых і дагаджаючы ім усімі сіламі, яны імкнуцца толькі выказацца перад урадам, а адшукаўшы давер, выкарыстоўваюць яго на шкоду і прыносяць больш шкоды рускай справе, чым былыя палякі [285, с.39]. Даволі трапную характарыстыку аднаму з чыноўнікаў Дзісенскага павета даў сучаснік М.Шамшура: «Буйны чыноўнік у рускім мундзіры, але з польска — нямецкай душою…» [419, с.322].

Такім чынам, пасля інкарпарацыі зямель Беларусі рускі ўрад паступова займаўся ўладкаваннем тут агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, заснаванай на расійскім заканадаўстве. Але пры гэтым часова захоўваліся мясцовыя правы і органы кіравання і суда. Гэта прыводзіла да прававой блытаніны і стварала магчымасці бюракратычнай валакіты і злоўжыванняў. Кадры адміністрацыі складаліся з прыезджых рускіх чыноўнікаў і ў большасці з мясцовых, русіфікацыя якіх ішла не так хутка, як хацелася царскаму ўраду.

## 2.4. **Распаўсюджванне расійскай сістэмы адукацыі**

Звернем увагу на школу як на арэну палітычнай барацьбы паміж расійскай і польскай сістэмамі адукацыі за беларускую моладзь. У дадзеным раздзеле працы мы пакажам ролю расійскай сістэмы адукацыі ў асімілятарскай палітыцы расійскага ўрада на землях Беларусі, а ў раздзеле 3.3. вызначым ролю польскай сістэмы адукацыі ў паланізацыі беларускай моладзі.

Ролю адукацыі ў палітычнай барацьбе заўважылі яшчэ расійскія манархі. Кацярына II зразумела, што менавіта рэформы ў галіне публічнай адукацыі прывялі да «разумовага перавароту» ў РП у апошніх некалькіх дзесятках гадоў і разам з іншымі прычынамі давялі да Чатырохгадовага сейма, канстытуцыі 3 Мая і паўстання 1794 г. Таму і сама яна «глядзела на школы як на моцную зброю ў руках вярхоўнай улады для накіроўвання рэлігійнага і грамадзянскага выхоўвання народа і для развіцця яго дабрабыту» [313, с.XXVI]. Кацярына II гаварыла: «Бог церпіць на зямлі веры і мовы ... насілля не патрэбна, дастаткова школаў. Вы жадаеце папярэдзіць злачынства, зрабіце, каб асвета распаўсюдзілася паміж людзьмі, каб немаёмасныя маглі вучыцца без платы, а маёмасныя — за памяркоўную плату. Значна лепш папярэдзіць злачынства, чым наказваць» [Цыт. па: 53, с.158]. Яна лічыла, што ўсё маладое пакаленне далучаных зямель Беларусі і Літвы, якое паходзіць ад змешаных шлюбаў, «павінна быць пастаўлена пад уплыў царквы, праз абавязковую для ўсіх адукацыю ў царкоўных школах, дык толькі тады б мы дасягнулі бы прамой мэты абрусення края...» [401, с.18].

Мікалай І пісаў Бенкендорфу аб памылках палітыкі мясцовага начальства на Каўказе: «Мы самі стварылі горцаў, якія яны ёсць, і даволі часта разбойнічалі ні горш за іх ... для інтарэсаў Расіі трэба прыгалубіць горцаў і прывязаць іх да рускай дзяржавы ... Я сам напісаў адразу ж Вельямінаву новую інструкцыю і загадаў уладкаваць у розных месцах школы для дзяцей горцаў як найвярнейшы сродак да абрусенія і змягчэння іх нораваў» [356, с.96]. Пасля Лістападаўскага паўстання Мікалай І праявіў турботу аб дзецях выгнаных і сасланых, вязняў і сірот забітых паўстанцаў — загадаў знайсці гэтых дзяцей і адаслаць у Мінск, у батальёны кантаністаў. Каля 700 дзяцей сабралі падобна янычараў [605, с.260].

Пытанне аб развіцці расійскай сістэмы адукацыі ўзнікла адразу ж пасля першага падзелу РП. Рускіх школ на тэрыторыі

Белай Русі не было, таму адкрыццё іх патрэбна было для «рускага насельніцтва» (маючца на ўвазе праваслаўныя), дзяцей прыехаўшых чыноўнікаў і вайскоўцаў. «Але не аднаму толькі рускаму насельніцтву Беларусі патрэбны былі рускія школы, — пісаў Бялецкі. — Палітыка імператрыцы Кацярыны II у адносінах да Беларусі выразна накіравана да аб'яднання новадалучанай вобласці, якую яна лічыла спрадвечнай уласнасцю Расіі, з унутранымі губернямі Расіі, давала пастаянна адчуваць нерускаму па паходжанню насельніцтву Беларусі, што гэтая вобласць назаўсёды далучана да Расіі і ўжо не аддзяліма ад яе. Таму і названая частка насельніцтва не магла не адчуваць патрэбы ў веданні рускай мовы, рускай гісторыі і геаграфіі, а адсюль не магла не адчуваць патрэбы ў рускай школе» [38, с.52].

У часы таргавіцкай канфедэрацыі Кацярына II звярнула ўвагу на ордэн піяраў, у руках якога знаходзілася большасць навучальных устаноў. У інструкцыі для Бюхлера (21.IX.1792) яна пісала, што трэба «адабраць адукацыю польскай моладзі з рук піяраў, не адкладваючы абдумаць спосабы, каб адукацыю пакінуць у іншых руках» [Цыт.па: 706, с.209]. Амаль адначасова (19.XII.1792) загадвала першаму генерал-губернатару зямель другога падзелу М.Рапніну, каб пільна сачыў за піярамі і іх школамі, якія заражаны французскімі ідэямі [291,Т.23,с.390]. Калі была захоплена Літва, Кацярына II указала 30.X.1794 г. М.Рапніну на небяспечнасць, якую ўтрымлівае спадчына Ш.Канарскага і камісіі народнай адукацыі для расійскага панавання ў краі: «Выхаванне моладзі па сваёй важнасці павінна звярнуць на сябе ўвагу нашых улад, каб з гэтага часу абапіралася яно на паслухмянасць Богу і грамадзянскім законам, а паколькі, як вядома, Віленская Акадэмія, а асабліва піярскія школы, заражалі літоўскую моладзь пылкім настроем, супраціўным Богу і шкоднымі ўплывамі для ўсяго рода людскога, таму трэба гэтыя шкодныя школы даследваць з глыбокай праніклівасцю, і выплываючае з іх зло ў самой крыніцы яго адшукаць і ліквідаваць і для гэтага можна выкарыстаць усякія сродкі і спосабы» [291, т.23, с.578].

Расійская сістэма адукацыі ішла па Беларусі сённяшняга вымярэння з усходу на захад. Патрэбна ўлічваць адрозненне літоўскіх губерняў ад беларускіх, дзе рускія школы ўзніклі больш, чым на 20 гадоў раней. Шлях рускай школы быў звілісты і хвалісты. Першыя вучэбныя ўстановы агульнарасійскага характару і ўладкавання ўзніклі ва Усходняй Беларусі пры

Кацярыне II. Пры Паўле I аб пранікненні рускай адукацыі і культуры ў школы (асабліва літоўскіх губерняў) не магло быць і размовы. Усё звялося толькі да выкладання рускай мовы для жадаючых ва універсітэце і ў базыліянскіх школах, дзе царкоўна-славянская мова вывучалася і па ўставу польскай Адукацыйнай камісіі. Пачатковая адукацыя зусім не арганізавана. У 1801 г. камісія аб усталяванні народных вучылішч запісала ў сваім журнале: «Ва ўсім гэтым краі бацькі вымушаны вучыць сваіх дзяцей пісьменнасці ў сябе ў хаце, выкарыстоўвачы для гэтага па большай частцы бедных студэнтаў, і па вывучэнні пісьменнасці аддаюць іх у вышэйазначаныя вучылішчы (г.зн. у сярэднія школы, арганізаваныя АК)» [313, с.380-381]. Яна вырашыла завесці пры вучылішчах, арганізаваных Адукацыйнай камісіяй, па 1-2 класы па тыпу расійскіх вучылішч, для якіх падрыхтаваць пераклад падручнікаў [38, с.24-25]. Але ніякіх дзеянняў па выкананню гэтага не было прадпрынята, бо Аляксандр I, які прыйшоў да ўлады, прыхільна ставіўся да палякаў, і паланізацыя захліснула вучэбныя ўстановы.

Мікалай I вярнуўся на шлях распаўсюджвання расійскай сістэмы адукацыі. Мэту яе сфармуляваў С.С.Увараў, міністр народнай адукацыі з 1833 г. па 1849 г. Пачынаючы сваю дзейнасць на гэтай пасадзе, ён пісаў куратарам навучальных акруг: «Агульны наш абавязак заключаецца ў тым, каб народная адукацыя адбывалася ў злучаным духу праваслаўя, самадзяржаўя і народнасці» [Цыт. па: 356, с.84]. Асновы арганізацыі вучэбнай справы ў Беларускай вучэбнай акрузе былі выкладзены С.С.Уваравым у «всеподданнейшем докладе» ў 1835 г., у якім галоўнаю мэтаю ён ставіў аднаўленне вучэбных устаноў «в духе русском, хотя большей частью под наружностью прежних наименований», каб не спалохаць і не пазбавіць даверу да новай сістэмы польскае дваранства [Цыт. па: 270, с.425]. Пасля пагрому Лістападаўскага паўстання выйшаў высачайшы загад: адчыняць свецкія вучылішчы замест тых, якія былі на ўтрыманні каталіцкага духавенства, а цяпер скасаваны з закрыццём кляштараў [249, ф.3157, воп.1, спр.85, а. 315-322].

Па дадзеных А.Бялецкага, першанцамі расійскай сістэмы адукацыі Беларусі былі школы прыказа грамадскай апекі і школы пры праваслаўных царквах. Першыя былі задуманы кацярынінскай камісіяй для абмеркавання справы народнай адукацыі, якая прыняла рашэнне аб стварэнні ў гарадах і вялікіх

сёлах народных школ. У іх вучылі чытаць і пісаць па-руску і па-польску, арыфметыцы, малюнку, а дзяцей праваслаўных яшчэ і катэхізісу «для познания православной веры, толкованию десяти заповедей, ради вкоренения нравоучения всеобщего» [Цыт. па: 389, с.753]. У 1780 г. школ гэтага тыпу было ў Полацкай губ. — 7, у Магілёўскай губ. — 21 [38, с.57]. На школы пры царквах Кацярына II звярнула ўвагу ў час наведвання Магілёва (1780 г.). Яна загадала выдаць архіепіскапу Георгію Каніскаму 2100 р. Ён выдадкаваў іх на арганізацыю школаў гарадскому і мястэчкаваму духавенству. Так узніклі вядомыя школы ў Гомелі, Чачэрску, Быхаве. У Гомелі дадаў грошаў гр. М.П.Румянцаў, каб вучыліся дзеці яго сялян. За кошт царквы адчыніліся школы ў Хацімску і Касцюкевічах Клімавічскага павета, Студзянцы Чэрыкаўскага павета, тры школы ў Дуброўне Аршанскага павета [38, с.54]. Падобныя школы былі таксама ў Чаўсах (14 вучняў), Чэрыкаве (14 вучняў), Клімавічах (4 вучні), Беліцы (4 вучні), Копысі (13 вучняў). Гэта былі невялікія пачатковыя школы, у якіх вучылі чытаць свецкія і царкоўныя кнігі, граматыцы, арыфметыцы, чыстапісанню, катэхізіс і правілы для вучняў [121, с.305; 38, с.54].

Пачатковых школ пры царквах або манастырах было ў Магілёўскай губерні ў 1780 г. — 19, у 1803 — 11 [121, с.305; 38, с.55]. У Віцебскай губерні ў 1785 г. такія школы адкрыты ў Полацку, Віцебску (шэсць), Невелі, Себяжы, Гарадку [121, с.311]. Узровень вучэбнай працы ў іх быў невысокі. Вось што пісаў у 1804 г. у рапарце дырэктар народных вучылішч Магілёўскай губерні: «Царкоўныя дзячкі, або панамары, якія займаюцца навучэннем дзяцей, большай часткаю не вучыліся ні ў семінарыі, ні ў народных вучылішчах, а таму і самі правільна чытаць, а тым больш правільна пісаць не ўмеюць. Спосаба вучэбнага і школьнага парадка, прадпісанага для вучылішч публічных, зусім ня ведаюць» [Цыт. па: 38, с.55].

Базай распаўсюджвання расійскай сістэмы адукацыі сталі рускія духоўныя школы — праваслаўныя семінарыі. На тэрыторыі першага падзелу дзейнічала Магілёўская семінарыя. На яе ўтрыманне ў 1774 г. Кацярына II загадала выдаткаваць сумы, якія атрымлівалі іншыя семінарыі Расіі, а з 1780 г. да 400 руб., якія мела семінарыя, дадала 1600 на год [38, с.53]. Гэта дазволіла Г.Каніскаму пашырыць вучэбны курс сваёй семінарыі і палепшыць яе. У межах другога падзелу дзейнічала Слуцкая семінарыя. 15.05.1785 г. Кацярына II загадала выдаваць на яе

ўтрыманне 2000 руб. у год з умоваю, каб семінарыі «присвоен был образ преподавания для всех училищ РИ узаконенный» [Цыт. па: 121, с.337]. З 1786 г. Статут народных вучылішч стаў для абедзвюх семінарый асноўным кіраўніцтвам у выкладанні свецкіх вучэбных прадметаў. Тут вывучаліся лацінская і руская мовы, граматыка, чыстапісанне, пераклад з лацінскай на рускую мову, катэхізіс, сачыненне вершаў, пераклад твораў лацінскіх аўтараў, рыторыка, філасофія, логіка, метафізіка, фізіка, маральная філасофія, лацінская гісторыя, грэчаская, яўрэйская, нямецкая і польская мовы, расійская геаграфія і гісторыя, арыфметыка [313, с.624].

Указам ад 22.04(4.05).1828 г. на тэрыторыі трэцяга падзелу ствараецца Літоўская семінарыя ў м.Жыровіцы пры уніяцкім кляштары (адчынена 07.10.1828 г.). Рэктар (да 1834 г.) Антоні Зубко, выхаваны ў Полацкай акадэміі і Віленскай духоўнай семінарыі, па словах Е.Арлоўскага, «вполне предан мысли о необходимости воссоединения унии с православной церковью». Адпаведна сваім поглядам ён падабраў выкладчыкаў, каб яны дапамаглі справе «воссоединения униатов» і «представляли собою соль западно-русских земель и были искренними и верными сынами западно-русского народа... Без деятельности Литовской семинарии не могло бы совершиться воссоединение униатской с православной церковью, или же самый процесс воссоединения прошел бы болезненным образом...» [268, 1901, №10, с.78,79].

Важным актам унутранай дзяржаўна-аб'яднальнай палітыкі Кацярыны II стала арганізацыя ў Беларусі галоўных і малых народных вучылішч. Праект іх для ўсёй Расійскай імперыі быў распрацаваны камісіяй для ўсталявання вучылішч на чале з П.Завадоўскім у 1782 г. [389, с.754]. Загад адчыніць іх у 25 губернях выйшаў у красавіку 1786 г., але беларускіх губерняў там не было [313,стб.10]. Толькі высачайшым рэскрыптам ад 03.11.1788 г. Беларускаму генерал-губернатару П.Б.Пасэку было аб'яўлена аб адкрыцці народных вучылішч у Полацкай і Віцебскай губернях. Галоўныя 4-хкласныя вучылішчы арганізоўваліся ў губернскіх гарадах: Полацку (15.04.1789 г.); Магілёве (15.03.1789 г.); а таксама ў Віцебску (29.01.1794 г.); малыя 2-хкласныя — у павятовых гарадах [121, с.319]. У лісце П.Завадоўскага да П.Пасэка падкрэсліваўся дзяржаўны характар арганізацыі народных вучылішч — на самой цырымоніі адкрыцця павінны былі прысутнічаць знатныя

грамадзяне і духавенства, мясцовая ўлада. Абавязкова адбывалася літургія ў царкве і малебен у вучылішчы. Нават, раіў П.Завадоўскі, шукаць памяшканне для вучылішча трэба паблізу царквы і ў цэнтры горада (дзе часцей за ўсё знаходзіліся мясцовыя органы кіравання) [313, стб.24-25]. У Мінскай губерні галоўнае вучылішча было адчынена ў Мінску, 4-хкласныя павятовыя — у Бабруйску, Мазыру, Пінску і Слуцку, малыя — у Паставах, Халапеніцы і інш. [188, с.35-36; 313, стб.639].

Праграма малых народных вучылішчаў прадугледжвала:

1. Прадметы, якія ўключаюць у сябе «чистое и разумное понятие о Творце и его святом законе и основательные правила непоколебимой верности к государю и истинной любви к отечеству и своим согражданам»: свяшчэнная гісторыя, скарочаны і пространны катэхізіс, правілы добрых паводзін і кніга аб абавязках чалавека і грамадзяніна.

2. Адукацыйныя прадметы: пачатковая руская граматыка і арыфметыка.

3. Адзін з практычна карысных у жыцці прадметаў — малюнак.

Вучэбныя курсы 1-2 класаў галоўнага народнага вучылішча адпавядалі курсам малых народных вучылішч, але не супадалі, бо ў 2 кл. галоўнага вучылішча вывучалі не ўсю, а толькі 1-ю частку арыфметыкі, а таксама латынь і «суседнія» мовы, якімі карысталася насельніцтва суседняй з данай мясцовасцю тэрыторыі, дзе знаходзілася вучылішча — для карысці ужывання ў зносінах. У 3-4 класах выкладаліся агульнаадукацыйныя прадметы: руская граматыка, усеагульная і руская гісторыя, усеагульная і руская геаграфія, частка арыфметыкі, асновы геаметрыі, механіка фізікі; практычныя веды — малюнак, грамадзянская архітэктура, рэлігіёзна-маральныя паняцці па катэхізісу і евангеллю [38, с.59]. Вучыліся ў галоўных вучылішчах дзеці настаўнікаў, чыноўнікаў, гандляроў, прамыслоўцаў, рускіх і некаторых польскіх памешчыкаў і іншых, хто зразумеў, што землі Беларусі пасоўваюць да ўнутраных губерняў Расіі, што пашыраецца карыстанне рускай моваю ва ўсіх сферах адміністратыўнай дзейнасці [38, с.78]. Ю.Лукашэвіч піша, што новыя вучылішчы сталі зацямняць славу былых езуіцкіх, і беларускае каталіцкае юнацтва пачало ў іх вучыцца [гл.: 617, т.IV, с.187].

Такім чынам, па сваіх праграмах і складу вучняў народныя вучылішчы адрозніваліся ад школ Віленскай навучальнай акругі

(пра іх гл. раздзел 3.3). У першых вучыліся дзеці праваслаўных на рускай мове і пад кіраўніцтвам настаўнікаў, якія атрымалі адукацыю ў рускіх вучэбных установах. А.Бялецкі слушна пісаў: «гэта былі рускія ў поўным сэнсе слова вучылішча, у якіх не было ўмоў, спрыяючых для развіцця польскага пачуцця. А універсітэт разам са сваім апекуном менавіта і імкнуўся да таго, каб у школах быў дадзены поўны прастор польскаму пачуццю» [38, с.115].

У 1801 г. у 2-хкласных вучылішчах беларускіх губерняў вучыліся 526 хлопчыкаў і дзяўчат, а ў 4-хкласных — 211 дзяцей [119, с.189]. У сваёй справаздачы акадэмік В.М.Севяргін ў 1803 г. адзначыў: «Народныя вучылішча могуць існаваць як і раней, бо, 1) навучэнне ва ўсіх добрае; 2) дапускаюцца ў іх усе дзеці бедных бацькоў без уселякай платы, лічачы таксама і жаночы пол, які між іншым з цяжкасцю мог бы знайсці сабе месца для навучэння; 3) тут вучаць найлепш рускай мове...» [Цыт. па: 38, с.96].

Рускімі па духу навучання і выхавання былі кадэцкія корпусы — прывілеяваныя сярэднія агульнаадукацыйныя ваенна-навучальныя ўстановы. У 1800 г. былое Шклоўскае шляхецкае вучылішча, заснаванае ў 1778 г. генерал-лейтэнантам С.Р.Зорычам, было пераўтворана ў аддзяленне Гродзенскага кадэцкага корпуса [119, с.192; 208, с.3]. Апошні існаваў як аддзяленне Пецярбургскага 1-га кадэцкага корпуса [74, с. 49]. Пазней быў створаны Полацкі корпус (1835—1918) [534, т.5, с.535]. 28 жніўня 1840 г. літоўскі генерал-губернатар Ф.Міркавіч гаварыў Мікалаю I у Брэст-Літоўску аб неабходнасці адкрыцця кадэцкага корпуса падобна Полацкаму: «Прапаганда абмяжоўваецца цяпер распаўсюджваннем сваіх правіл сярод моладзі, якую лягчэй спакусіць і абмануць; але сапраўдныя замыслы палякаў больш хітрыя і небяспечныя: яны вырашылі, асабліва жанчыны, жывіць нянавісць да нас і падтрымліваць мары сваёй нацыянальнасці. Я лічу, што цяпер, больш, чым калі-небудзь, урад павінен узяць у свае рукі справу выхавання і ім рашуча кіраваць. Адкрытыя ўстановы не дадуць плёну... Тут неабходны зачыненыя ўстановы, ад якіх толькі трэба чакаць стварэння новага пакалення людзей» [393, с.232].

Рэскрыптам ад 16.04.1841 г. быў адчынены Аляксандраўска-Брэсцкі кадэцкі корпус (1842 г.). Дваранства ахвяравала на навучальны працэс па 57500 руб. серабром штогод [393, с.275,281]. У рапарце Мікалаю I Ф.Міркавіч 6 красавіка 1841 г. пісаў: «У ім краёвае дваранства будзе атрымоўваць маральнае выхаванне

ў духу адданасці Прастолу і Расіі; яно будзе служыць крыніцаю рускіх пачуццёў, думак і дзеянняў, напоўніць край людзьмі абрусельмі, якія закончыўшы службу ў шэрагах нашых і ўнутры Расіі, вароцяцца на Радзіму не са скажёнымі аб ёй паняццямі; яны будуць гаварыць не пра бурныя сеймы былых гадоў, а ўжо пра святую Русь і яе магутнасць, і кожны ў сваім асяродзі будзе непрыкметна садзейнічаць намаганням урада» [393, с.262-263].

Пры Кацярыне II і Паўле I пачалі дзейнічаць прыватныя школы, гаспадарамі якіх былі рускія. У кацярынінскія часы існавалі ў Чачэрску заснаваныя ўдавой беларускага генерал-губернатара графіняй Чарнышовай пансіён «благородных девиц» і школа для сялянскіх хлопчыкаў. Штогод на іх развіццё ішло 6 тыс. руб. Дзяўчат вучылі катэхізісу і свяшчэннай гісторыі, рускай, французскай, нямецкай граматыцы з размовамі, агульнай гісторыі, геаграфіі, арыфметыцы, касмаграфіі, музычным спевам, малюнку, розным рукадзельным працам [119, с.192]. Хлопчыкаў вучылі таму ж самаму, акрамя рукадзелля. З канца XVIII ст. прыватныя вучылішчы з'явіліся ў Магілёве, Шклове, Дуброўне, Рагачове і інш. [38, с.84-85].

Новы этап развіцця расійскай сістэмы адукацыі пачаўся са школьнай рэформы 1802—1804 гг. У 1802 г. было арганізавана Міністэрства народнай адукацыі, якое ўпершыню цэнтралізавала дзяржаўнае кіраўніцтва школьнай сістэмай. 24.01(5.02).1803 г. Аляксандр I зацвердзіў Папярэднія правілы народнай асветы, паводле якіх ствараліся 4 роды вучылішч: прыходскія, павятовыя, губернскія, або гімназіі, універсітэты. Прыходскія вучылішчы ствараліся замест малых народных вучылішч і былі падпарадкаваны назіральніку павятовых вучылішч. Павятовыя вучылішчы павінны былі быць у кожным павятовым горадзе і падпарадкоўваліся дырэктару гімназіі. Губернскія вучылішчы, або гімназіі, арганізоўваліся замест былых галоўных народных вучылішч і падпарадкоўваліся губернскаму дырэктару вучылішч, падведамасных універсітэцкаму праўленню (савету). У кожнай навучальнай акрузе адчыняўся універсітэт [160, с.8; 314, стб.14-15].

Цікава, што новую сістэму асветы прапанаваў Аляксандру I у лютым 1802 г. А.Чартарыйскі, які ўваходзіў у Раду да школьных спраў у міністэрстве асветы. Ён унёс сюды палажэнні і ідэі польскай Адукацыйнай камісіі, прапанаваў «Прынцыпы публічнай адукацыі ў Расійскай імперыі», падрыхтаваныя рэктарам Віленскага універсітэта князем Г.Страйноўскім [605, с.260]. Прынятая чатырохступенчатая сістэма адукацыі

нагадвала сістэму Адукацыйнай камісіі — 6-цікласныя акруговыя, 3-хкласныя падакруговыя і парафіяльныя школы. Арганізацыя навучальных акруг таксама запазычана з вопыта Адукацыйнай камісіі. 24.01.1803 г. створана Віленская навучальная акруга (ВНА), у якую ўвайшло ўсё былое ВКЛ. Куратарам (папячыцелем) стаў таварыш міністра замежных спраў А.Чартарыйскі. Яму дапамагалі вучоны і грамадскі дзеяч Тадэвуш Чацкі і прыхільнік французскай рэвалюцыі і яе ідэй, творца канстытуцыі 3 мая ксёндз Гуга Калантай.

Справа выхавання моладзі на Беларусі апынулася пад польскім уплывам і ішла ў польскім патрыятычным кірунку. Статут навучальных устаноў, падначаленых універсітэтам (1804 г.), на Віленскую акругу не распаўсюджваўся. Тут дзейнічалі спецыяльныя «Статут, або агульныя пастановы Віленскага універсітэта і вучылішч яго акругі» (1803 г.), «Прадпісанне арганізацыі вычылішчаў у акрузе Віленскага універсітэта» (1804 г.), у якіх былі ўлічаны асноўныя прынцыпы і палажэнні статута Адукацыйнай камісіі. Навучальныя ўстановы Літвы і Белай Русі сталі арэнай палітычнай барацьбы. Яе адлюстравалі і тыя змены, якія адбываліся ў тэрытарыяльнай прасторы ВНА. Указам «О новом распределении губерний по Учебным округам» (1824 г.) ад яе адарвалі Усходнюю Беларусь і падпарадкавалі Пецярбургскай навучальнай акрузе. Руку да гэтага прыклаў генерал-губернатар Хаванскі, які прапанаваў міністэрству народнай адукацыі для таго, каб «белорусские гимназии приносили существенную пользу», існуючую ў іх сістэму выкладання навук прыблізіць да рускай сістэмы, беларускія гімназіі далучыць да Маскоўскай або Пецярбургскай акругі, зрабіць выкладанне ўсіх прадметаў на рускай мове, завесці пры гімназіях бібліятэкі з патрэбных падручнікаў і дапаможнікаў, асабліва па рускай славеснасці, пастанавіць за правіла прымаць на грамадзянскую службу толькі тых, хто скончыў гімназію і меў добрыя поспехі ў рускай славеснасці, настаўнікаў і асабліва дырэктараў гімназіі прысылаць з карэнных рускіх выдатных паводзін [314, т.1, стб.1785 -1786].

З 1829 г. уладкавалі Беларускую навучальную акругу (БНА), з перадачаю сюды ў 1832 г. Мінскай губерні [314, т.2, Отд.1, стб.221-223,329-330]. Лістападаўскае паўстанне ўнесла новыя змены: да БНА былі далучаны Віленская і Гродзенская губерні, Беластоцкая вобл. Вызначаны галоўныя мэты міністэрства народнай адукацыі ў адносінах да БНА: ліквідацыя духоўных

вучылішч пры каталіцкіх кляштарах, выкладанне ўсіх вучэбных прадметаў на рускай мове, змест навучання і выхавання павінен спрыяць збліжэнню насельніцтва Беларусі з «природными россиянами».

Другога мая 1850 г. з'явіўся ўказ Сената, паводле якога з Беларускай навучальнай акругі выдзелілі губерні Віленскую, Гродзенскую, Мінскую, Ковенскую і стварылі Віленскую навучальную акругу, Віцебскую і Магілёўскую губерні далучылі да Пецярбургскай навучальнай акругі. Папячыцелем ВНА прызначылі віленскага ваеннага, гродзенскага, мінскага, ковенскага генерал-губернатара, генерал-ад'ютанта, генерал-лейтэнанта І.Г.Бібікава [314, т.2, отд. 2, стб. 989].

Сродкамі барацьбы за душы моладзі паміж паланізатарамі і русіфікатарамі сталі выкладаемыя прадметы, падручнікі, мова выкладання і настаўніцкія кадры. Адпаведна Статуту гімназій і вучылішч 1828 г. сярод прадметаў, якія выкладаліся ў прыходскіх і павятовых вучылішчах і гімназіях выдзяляліся закон божы, кароткі катэхізіс, свяшчэнная гісторыя, чытанне па царкоўных кнігах, руская мова і славеснасць, рускія геаграфія, статыстыка і гісторыя. У сетцы гадзін па класах у тыдзень яны займалі большую частку вучэбнага часу [249, ф.3157, воп.1, спр.13, а.51,53,55,69,72; 314, т.2, отд.1, стб. 156-163,177]. Асабліва звернем увагу на тое, што, скончыўшы вучобу, выпускнікі названых вучэбных устаноў вельмі слаба ведалі гісторыю і культуру роднага краю і, як слушна піша гісторык Л.Лыч, былі больш падрыхтаваны жыць і працаваць у духу рускай культуры, а не служыць сваёй Бацькаўшчыне [213, с.118]. Стваралася рэальная пагроза таго, што беларуская моладзь адвернецца ад духоўных традыцый старэйшых пакаленняў.

Важную ролю ў русіфікацыі адыгрывала руская мова як прадмет вывучэння і як мова выкладання. У пастанове «Аб прысваенні пераваг старэйшых настаўнікаў настаўнікам рускай мовы ў гімназіях і настаўнікам рускай і нацыянальных моў у павятовых для дваран вучылішч Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Беластоцкай вобласцей» ад 14.11.1833 г. гаварылася: «Прымаючы ва ўвагу, што для дастаўлення юнацтву заходніх губерняў адукацыі цалкам у духу Рускім, неабходна імкнуцца, каб Рускую мову праз першапачатковае выхаванне зрабіць там народнай, і што для дасягнення гэтай мэты спатрэбяцца ад настаўнікаў Рускай мовы важкія намаганні...» [314, т.2, отд.1, стб.480]. Пасля забароны выкладання польскай мовы з 1836 г.

у Віцебскай і Магілёўскай губернях, а з 1838 г. у астатніх губернях БНА [249, ф.3157, воп.1, спр.224] яе ўпраўленне звярнула ўвагу на вывучэнне рускай мовы і славеснасці, бо нават у гімназіях, дзе вучылася асноўная маса дваран, размаўлялі «почти все», па прызнанню аднаго з дырэктараў вучылішч, па-беларуску [270, с.428]. Становішча з выкладаннем рускай мовы, відаць, было нездавальняючым, бо у цыркуляры Мусіна-Пушкіна ад 15.10.1855 г. адзначалася, што ў Магілёўскай гімназіі «выкладанне рускай мовы і славеснасці ў гэтай гімназіі наўрад ці можна назваць цалкам здавальняючым, хаця б таму, што яно без асаблівых прычын адыходзіла ад агульнапрынятага парадка і мноствам рукаводстваў павінна было абцяжарваць вучняў» [249, ф.2507, воп.1, спр.462, а.166].

Не заўсёды знаходзіліся адпаведныя выкладчыкі. У 1836 г. дырэктар вучылішч Магілёўскай губ. даносіў у праўленне БАН, што выкладчыку Цеханоўскаму нельга даручаць выкладанне пачаткаў рускай мовы, бо «не будучи природным русским и получив воспитание в Полоцкой духовной академии под руководством ксендзов, он не успел, как видно, приобресть твердых и основательных сведений в русском языке, необходимых для преподавателя онаго..», а таму рэкамендуе часова прызначыць старшага выкладчыка лацінскай мовы Рахмашына «как природному русскому, имеющему основательнейшие сведения в нашем отечественном языке...» [249, ф.3157, воп.1, спр.224, а.20]. У запісцы Віцебскага губернатара «О причинах неприязненных действий помещиков Витебской губернии в отношении к Православию» чытаем: «Руская мова не можа такім чынам ніколі выцясніць польскую: наўрад ці знойдзецца хаця б адзін выхаванец польскага паходжання, які б ведаў яго правільна, а ў жаночым пансіёне нават з цяжкасцю разумеюць па-руску. У Лепельскім, Веліжскім, Невельскім і Крэслаўскім павятовых вучылішчах руская мова выкладаецца палякамі. З дзесяці прыходскіх вучылішч у чатырох настаўнікі палякі» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, 2-3].

Для дасягнення поспехаў у рускай мове і славеснасці ў 1850-х гадах у гімназіях праводзілі літаратурныя размовы (2 разы ў месяц па 15 гадзін). Як было напісана ў правілах, «на гэтых літаратурных бяседах вучні VI і VII класаў па чарзе чытаюць свае творы на рускай мове, пасля папярэдняга прагляда старэйшым настаўнікам славеснасці..» [249, ф.2254, воп.1, спр.73, а.2адв.]. Папячыцель Пецярбургскай навучальнай акругі ў

заўвагах на працы вучняў гімназіяў за 1847/48 навучальны год прапанаваў прызначыць для сачыненняў тэмы з рускай гісторыі, а фактычны матэрыял браць з актаў Археаграфічнай камісіі, летапісаў, з гісторыі рускай літаратуры. «Важнасць выбара падобнага роду гэтым відавочна, і перш за ўсё маладыя людзі павінны ведаць сваю Айчыну, навучыцца цаніць яе багацці, каб потым свядома любіць сваю Радзіму і з яе ж нетраў здабываць ежу для свайго дапытлівага розума» [249, тамсама, а.6 адв.]. Цікава заўважыць, што тэматыка сачыненняў магілёўскіх і віцебскіх гімназістаў зусім не адпавядала гэтым пажаданням куратара навучальнай акругі. Яны пісалі на тэмы з айчыннай гісторыі, мясцовых звычаяў і святаў, па этнаграфіі: «Беларускія павер'і», «Вяселле ў беларускіх сялян», «Хрэсьбіны ў беларускіх сялян», «Успаміны аб справах пад Віцебскам у 1812 г.», «Предслава, княжна Полацкая», пісалі аб Полацку, Крэва, Дняпры, Віцебску, аб латышах і цыганах у Беларусі, аб Кейстуце і д.п. [249, ф.2254, воп.1, спр.73, а.15-130]. У 1843 г. пад старшынствам міністра народнай адукацыі гр. Уварава разглядаўся праект аб увядзенні славянскай азбукі ў польскую пісьменнасць, але гэтая мера абрусенія прызнана была неажыццявімай [351, с.40].

Як мова выкладання руская мова адразу ўкаранілася ў народных вучылішчах, а з правядзеннем рэформы ў пачатку XIX ст. руская мова ў гімназіях, павятовых і прыходскіх вучылішчах не была пануючай, а дзяліла пазіцыі з польскай мовай. Больш моцнае становішча руская мова мела ў Віцебскай і Магілёўскай губернях падчас уваходжання іх у Пецярбургскую ці Беларускую навучальную акругу [38, с.108; 249, ф.3157, воп.1, спр.85, а.323]. На беларускія землі быў шчыльна зачынены ўваход роднай мове карэннага насельніцтва. На беларускай мове не толькі не вялося навучэнне ў школах, але нават не было арганізавана вывучэнне яе як звычайнага прадмета. Не распаўсюджвалася навуковая тэрміналогія, звужалася сацыяльная роля мовы, што адлюстроўвалася на этнічнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі.

Нельга не дааценіць у справе русіфікацыі ролю падручнікаў. 18.01.1801 г. камісія для ўсталявання народных вучылішч пасля азнаямлення з вучэбнымі ўстановамі заходняй Расіі, арганізаванымі АК, акрэсліла меры «для приведения присоединённой Польши в тесный союз с Россией»: 1. Выкрэсліць з карыстання падручнікі па старажытнай

грэчаскай гісторыі (Кракаў, 1786), па тэорыі красамоўя (Вільна, 1792), па праву Страйноўскага, дапаможнік па прыроднаму праву, бо «в них заключается местами правила, монархическому образу правления совсем противные». Замяніць іх іншымі, лепш выдадзенымі ў Расіі. 2. Пры вучылішчах завесці 1-2 класы па тыпу расійскіх вучылішч і для гэтага ўсе вучэбныя кнігі для іх перавесці з рускай на польскую і надрукаваць на абедзвюх мовах разам [38, с.24,25; 313, т.1, стб.394-5]. Міністр народнай адукацыі 5 жніўня 1818 г. дае «вучонаму камітэту» МНА інструкцыю, як яму здзейсніць галоўную мэту ў кіраўніцтве народным выхаваннем: «дасягнуць з дапамогаю добрых падручнікаў выратавальнай адпаведнасці паміж вераю, ведамі і аўтарытэтам дзяржавы, іншымі словамі, паміж хрысціянскім вобразам думак, адукацыяй і існуючым дзяржаўным парадкам» [521, с.100].

У падручніках трэба было ліквідаваць матэрыял, які мог перашкодзіць выконваць свае абавязкі перад сям'ёй або дзяржаваю; гісторыя, славеснасць і эстэтыка павінны паказваць, як чалавецтва пастунова падыходзіць да больш чыстага разумення Бога; кнігі на рускай мове павінны ўмацоўваць набожнасць і нацыянальны дух. «Дополнительные пункты к Уставу учебных заведений в приложении к Белорусскому учебному округу» прадугледжвалі для забеспячэння ўсіх вучылішч Беларусі вучэбнымі кнігамі і дапаможнікамі агульны магазін «всяких учебных книг: российских, польских и иностранных, Ландкарт, рисунков и проч., и поставить хранителя оных в верные сношения с отдельными книгопроизводителями и потом наблюдать, чтобы не были преподаваемы лекции по тетрадям» [249, ф.3157, воп.1, спр.13, а.48].

На праблему кадраў выкладчыкаў звярнулі ўвагу яшчэ пры стварэнні народных вучылішч у Полацку і Магілёве ў 1788 г. З Пецярбурга ў Беларусь былі накіраваны 8 выпускнікоў мясцовай настаўніцкай семінарыі (па 4 у кожнае вучылішча). Яны везлі неабходныя падручнікі і вучэбныя наглядныя дапаможнікі [279, с.86-87]. Архівы захавалі матэрыялы пра ад'езд на працу ў БНА ў 1830-х гадах выпускнікоў Маскоўскага і Пецярбургскага універсітэтаў, Гатчынскага сіроцінскага інстытута [249, ф.3157, воп. 2, спр.8, с.13; воп. 1,спр.478]. Сярод прасіцеляў уладкавання на працу ў Беларусі быў знакаміты В.Р.Бялінскі. Куратару БНА Р.І.Карташэўскаму ён даслаў «Мои мысли о том, каким образом должно поступать учителю при обучении Русскому языку учеников, не могущих объясняться на оном, и который со

своей стороны не знает их отечественного языка» [249, ф.3157, воп.1, спр.43,214-220]. Аднак Бялінскі не атрымаў станоўчага адказу ад Карташэўскага. Відаць, той ведаў пра справу Ф.Заблоцкага, студэнта Маскоўскага універсітэта, якога абвінавацілі ў перадачы верша з заклікам да звяржэння царызму для Віцебскай гімназіі. 24-29.07.33 Заблоцкага дапытвалі ў Віцебску, дзе ён расказаў аб знаёмстве з Бялінскім [245, с.167].

У 1839 г. у школах БНА працавалі 553 настаўнікі. Радзімай 360 чалавек была тэрыторыя Беларускай навучальнай акругі, 207 былі ўраджэнцамі Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілеўскай губерняў, 150 настаўнікаў атрымалі вышэйшую адукацыю ў Пецярбургскім, Маскоўскім, Казанскім універсітэтах, Пецярбургскім педагагічным інстытуце [24, с.185]. Нават не ўсе накіраваныя рускія ўраджэнцы падыходзілі для ўкаранення «духа рускага патрыятызма». Вось што сакрэтна пісаў у 1849 г. куратар БНА міністру народнай адукацыі (для большага эфекта перадаем на мове арыгінала): «Но к сожалению, весьма немногие из русских учителей чувствуют в себе призвание и имеют надлежащие качества для принятия на себя столь многотрудной обязанности. Большая часть из них, исполнив, впрочем, с точностью свои учительские обязанности, почти чужды для учащихся вне классов, а некоторые даже, по неопытности шли по крутости характера, неуместным и слишком резким обнаруживанием своего русского патриотизма и неприязни к здешним жителям, более вредны, нежели приносят пользу в деле преобразования этого края. Нельзя не заметить также, что в числе присылаемых сюда русских преподавателей бывают иногда такие, кои поведением своим не соответствуют учительскому званию, и потому не только сами не могут приобрести влияние на учащихся, но и подрывают доверие к русским своим товарищам, подавая повод к невыгодному давлению их с учителями из здешних уроженцев, которые вообще отличаются хорошим поведением» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, а.7 адв.]

Такія ж погляды меў і віцебскі губернатар князь Далгарукаў, які ў вышэйзгаданай запісцы ў тым жа 1849 г. пісаў: «Мне здаецца, што ў краі, дзе ідзе справа аб укараненні рускага элемента, не павінны быць дапушчаны ў выхавацелі асобы іншага паходжання, акрамя рускага; а тут і начальнікі па ведамству народнай адукацыі не каранныя рускія. Абодва ганаровых апекуна гімназіі і ўсе ганаровыя наглядальнікі

вучылішча, акрамя Невельскага, рымска-каталіцкага веравызнання. Дырэктар вучылішч па Віцебскай губ. хаця не паляк, але і не рускі» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, а.2 адв.].

Асаблівую ўвагу звярталі на настаўнікаў гісторыі. Згаданы куратар БНА у лісце да міністра народнай адукацыі пісаў: «Асабліва настайваў я заўсёды на неабходнасць прыродных рускіх для выкладання ў гімназіях і дваранскіх вучылішчах гэтай акругі гісторыі як прадмета, які можа мець самы вялікі ўплыў на дух вучняў, а таму ад 31 мінулага сакавіка №341 «отношения» ў дэпартамент народнай адукацыі аб замяшчэнні трох адкрыўшыхся тут вакансій настаўнікаў гісторыі рускімі выкладчыкамі» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, а.8]. Калі царскі ўрад не мог замяніць усіх мясцовых настаўнікаў расіянамі, дык настаўнікаў гісторыі абавязкова замянялі. І толькі 20.02.1857 г. было дазволена прымаць на месцы гісторыкаў (у выпадку «абсалютнай немагчымасці знайсці здольных кандыдатаў з рускіх») часова «ураджэнцаў заходніх губерняў у асноўным праваслаўнага веравызнання» [гл.: 374, с.26].

Асобы, якія кіравалі адукацыяй, і мясцовая ўлада разумелі важную ролю жанчын у распаўсюджванні рускай мовы і ў выкараненні насаджаемых «в домашнем быту неприязненных чувств ко всему русскому». Таму было дазволена стварэнне свецкіх прыватных жаночых пансіёнаў, дзе «девицы, обучаясь под непосредственным надзором учительского начальства и под руководством одобренных оным учителей и учительниц, ограждаются хотя на время от тех вредных внушений, коими сопровождается здесь вообще домашнее воспитание...» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, а.9]. З 1823 г. дзейнічаў у Мінску жаночы пансіён Сафіі і Аўгусціна Драздоў, дзе курс навучання набліжаўся да павятовых вучылішч. Некаторыя прадметы выкладаліся на рускай мове (гісторыя Расіі і інш.). Вучаніцы знаёміліся з дзеячамі рускай культуры, творамі па рускай гісторыі [24, с.187]. З 1825 г. пачаў сваю дзейнасць у м. Прапойск, каля Магілёва, пансіён былой выхаванцы Смольнага манастыра Савіч. У 1832 г. «во внимание к пользе, приносимой воспитанием благородных девиц Белорусских губерний», пансіён быў пераведзены на казённую дачу Піпенберг з выдаткаваннем ад казны каля 4440 руб. У 1838 г. ён быў пераўтвораны ў Магілёўскі інстытут, які так і не быў адчынены да канца 1850-х гадоў, хаця выкладаўся інстытуцкі курс навук [194, с.6].

Узорны пансіён быў у Віцебску пад кіраўніцтвам Савіч (невядома, якой) і Якаўлевай, якія таксама атрымлівалі дапамогу ад казны ў суме 1500 руб. у год [249, ф.3157, воп.1, спр.554,а.9]. Да 1845 г. на тэрыторыі Беларусі было 40 пансіёнаў (10 вышэйшага, 21 сярэдняга, 9 элементарнага разрадаў), у якіх вучыліся каля 600 дзяўчынак, адна шостая ад агульнай колькасці вучняў — хлопчыкаў [24, с.191]. У 1837 г. быў адчынены Беластоцкі інстытут «благородных девиц», куды маглі паступаць шляхцянкі з Беластоцкай вобласці, Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў [350, с.166]. Па Статуту 1828 г. дазволілі дзяўчынкам ва ўзросце больш за 11 гадоў вучыцца разам з хлопчыкамі, але толькі ў прыходскіх вучылішчах, з 1844 ім дазволілі вучыцца з хлопчыкамі ў прыходскіх вучылішчах, якія стварала Міністэрства дзяржмаёмасцяў. Урад патрабаваў выхавання дзяўчынак у духу вернападданства трону і праваслаўю. Вось што гаварылася ў Настаўленні для адукацыі выхаванак жаночых навучальных устаноў (1852 г.): вучаніцы павінны засвойваць «правілы набожнасці, дабрачыннасці і непахіснай адданасці трону і айчыне» [Цыт. па: 24, с.189].

Сваю ролю ў выхаванні расійскіх патрыётак павінны былі выканаць праваслаўныя манастыры. «Выхаванне будучых жонак і мацярэй у праваслаўным духу, — пісаў у сваім артыкуле сучаснік Фудель, — ёсць найлепшы і дзейсны сродак вяртання ў лона царквы аблудных, адарваных або ўпартых авечак» [401, с.21]. У 1860 г. упершыню на Беларусі створана ў Гродне жаночае вучылішча (з 1862 г. — гімназія), каб даваць «приличное образование в русском духе». Аднак, па словах М.Мураўёва, яно разам з Віленскім «зрабіліся цалкам польскімі вучылішчамі, дзе пануе над усімі прадметамі польская мова, выхавальніцы амаль не ўмеюць гаварыць па-руску, наглядальніцы паходзяць з асоб польскага паходжання, адданых душою польскай палітычна-рэлігійнай прапагандзе» [Цыт. па: 194, с. 22].

Вышэйнапісанае тычылася верхняга слоя грамадства — шляхты, купецтва, мяшчан. На ніжні таксама звярнулі ўвагу: у часы Кацярыны ІІ для яго былі малыя народныя вучылішчы, пры Мікалаі І сталі з'яўляцца па распараджэнню міністра дзяржаўнай маёмасці (1843 г.) сельскія вучылішчы (так званыя «палатныя»). Па дадзеных І.Карчынскага, у Гродзенскай губ. яны распаўсюджваліся ў 1843—1857 гг. З 1859 г. па ўказу Сінода ствараліся царкоўна-прыходскія школы для навучэння дзяцей пасялян чытанню, пісьму, малітвам

і пачаткам катэхізіса. Да 01.10.1860 г. у губерніях было адчынена больш за 100 школ [155, с.13].

Да 1822 г. расійскія ўлады актыўна падтрымлівалі стварэнне школ узаемнага навучання (так званыя ланкастарскія). Указам ад 22.05(6.06).1819 г. было зацверджана «Положение особого Комитета при Главном управлении училищ взаимного обучения». Ён павінен займацца «соображением всех к тому потребностей, заготовлением учебных пособий, составлением правил для руководства таковым училищам и рассматривать все предметы, до сего относящиеся» [314,Т.1,стб.1286]. Сябрамі камітэта сталі М.Л.Магніцкі, С.С.Увараў, Д.П.Руніч — цікавыя і каларытныя фігуры, адразу відаць, які будзе кірунак выхавання і адукацыі, падручнікі і правілы. Гродзенскі губернатар М.Бутаўт-Андржэйковіч выдаў кніжачку на 19 старонак «O szkole Lankastra» («Пра школу Ланкастара»), аб'яўленую жыхарам губерні 16 мая 1819 г. [74, с.135]. З дапамогаю ланкастарскіх школ распаўсюджвалі пісьменнасць сярод падатных саслоўяў як расійская, так і польская сістэмы адукацыі, толькі мэты ў іх былі розныя — узбуджаць рускі ці польскі патрыятызм, адначасова стрымліваючы абуджэнне ў сялян беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Упершыню метады Ланкастара былі выкарыстаны ў Столінскім вучылішчы Пацэя ў 1816 г. Добра вядома ланкастарская школа ў гомельскім маёнтку канцлера графа Румянцава, які у 1817 г. запрасіў сюды на працу англічаніна Д.Герда. Усяго ў Беларусі ў канцы І чвэрці ХІХ ст. было 13 ланкастарскіх школаў (Гомель, Радкаўшчызна, Празарокі, Вялесніцы, Мінск, Шчорсы, Кобрын, Пружаны, Стаўбцы, Волпа, Шарашова, Полацк, Столін) [245, с.145]. Усе належалі буйным землеўладальнікам — Румянцаву, Манюшку, Храпавіцкаму, Храптовічу і інш.

Каб засцерагчы беларускую моладзь ад уплыву еўрапейскіх рэвалюцыйных ідэй, прагрэсіўных поглядаў, цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч загадаў 26.02.1823 г. віленскаму ваеннаму губернатару «строга забараніць у высачайша даверанных мне Віленскай і Гродзенскай губернях адпраўляць юнакоў у вызначаныя універсітэты для навучання», а хто ўжо вучыцца, вярнуць дадому. Цэсарэвіч перад гэтым атрымаў запіску ад міністра духоўных спраў і народнай адукацыі Галіцына аб тым, што «Яго Імператарскай Вялікасці пажадана, каб для захавання юнацтва ад шкодных замежных навучальных устаноў не

дапускаць яго адпраўляцца для навучэння ва універсітэты Гейдельбергскі, Іенскі, Гесэнскі і Вюрцебургскі...» [39, т.4, с.80]. Такім чынам, парушаліся векавыя традыцыі беларускай моладзі на атрыманне адукацыі ў замежных універсітэтах. Цяпер можна было вучыцца толькі у вышэйшых вучэбных установах велікарускіх губерняў. А з закрыццём Віленскага універсітэта ў 1832 г. і яго рэштказ (медыцынскай і духоўнай акадэмій) у 1842 г. больш нічога не заставалася, як ехаць у Маскву, Пецярбург, Казань ці іншыя універсітэцкія гарады. Моладзь Літвы і Беларусі адрывалася ад родных каранёў, пазбаўлялася нацыянальных пачуццяў, русіфікавалася.

Вучэбныя ўстановы павінны былі не толькі вучыць, але і выхоўваць. Кастамараў трапна пісаў: «Выхаванне — усяму корань. Якое выхаванне народа, такая і яго дзейнасць... Няма нічога немагчымага для выхавання: яно ўсемагутна над чалавекам, і няма на зямле народа, якога б яно не ў моцах было змяніць, перарабіць, надаць высакароднасці і развіць» [177, с.89-90]. Мэтам выхавання ў вучнях пачуццяў вернападданства да самадзяржаўя і безумоўнага падпарадкавання ўладам служылі, напрыклад, радавод і партрэты Раманавых. Першы пад назвай «Краткая Родословная таблица царствующего в России Дома Романовых, со времён Восшествия сего Дома на Всероссийский престол в 1613 г.» быў складзены дырэкцыяй вучылішч Віцебскай губ. у 1838 г. і надрукаваны 2-хтысячным тыражом для навучальных установаў. Адзін экзэмпляр павінен быў размяшчацца на сцяне кожнага класа. «А каб дакладна з боку вучняў было гэта выканана, — пісаў дырэктар вучылішч Віцебскай губерні упраўляючаму БНА, — па нядзельным і святочным дням, пры тлумачанні ім Евангелія ў класах перад літургіяй, кожны раз патрабавана б было ад іх вуснае веданне гэтай табліцы...» [249, ф.3157, воп.2, спр.31, а.15]. Яшчэ патрабавалі, каб у памяшканнях вучэбных устаноў знаходзіліся партрэты Гасудара імператара. Куратар БНА пісаў 18.03.1842 г. дырэктару вучылішч Магілёўскай губерні: «З намерам снабдзіць вучэбныя ўстановы міністэрства народнай адукацыі партрэтамі Яго Імператарскай Вялікасці ў добрых копіях з вядомага арыгінала Крюгера Яго Высокаправасхадзіцельства запрасіў Санкт-Пецярбургскага жывапісца Канавалава заняцца падрыхтоўкаю паясных партрэтаў, якімі ён па распараджэнню Яго Імператарскай Вялікасці ўпрыгожыў ужо залы ваенна-вучэбных устаноў» [249, ф.2254, воп.1, спр.106, а.1, аб.].

Якія былі вынікі барацьбы расійскага ўрада за ўкараненне сваёй сістэмы адукацыі ў далучаных беларускіх землях? Куратар БНА ў 1849 г. Е.А.Грубер прыкмеціў галоўнае — перавагу расійскай сістэмы адукацыі над польскай: «Патрэбна толькі ўспомніць былое становішча заходніх губерняў, калі ў іх усё: і грамадзянскія ўстановы, і выхаванне юнацтва былі накіраваны толькі на тое, каб падтрымаць асобную польскую нацыянальнасць, а потым параўняць яго з прынятаю цяпер сістэмаю кіравання гэтага краю, у выніку якой ліквідавана тут усё польскае і нават сама мова польская выгнана з публічных вучэбных устаноў, каб не з'явіўся дух супрацідзейнічання, які павінен быў нарадзіць у мясцовых жыхароў даволі рэзкі і раптоўны пераход ад былога да новага парадку» [249, ф.3157, воп.1, спр.554, а.10]. Маёр Ламачэўскі напісаў у запісцы шэфу корпуса жандармаў аб палітычным становішчы Мінскай губерні (люты 1840) і звярнуў увагу на «сістэму адукацыі юнацтва»: «... и как русский с душевным удовольствием замечал не только быстрые успехи в отечественном языке нашем, но и в нравственном направлении образующегося юношества. Так, например, переносясь к любопытнейшим событиям отечественной истории наших последних четырёх столетий, тесно связанных с происшествиями Литвы и Польши, ученик, как бы по привычке, представляет себя на стороне русских» [39, т.IV, с.303-304]. У адной з пастаноў МНА за 1852 г. было напісана: «Напрамак выхавання ў вернутых ад Польшчы губернях залежыць цяпер ад яго (Расійскага ўрада — *В.Ш.*) выключна: у выкладанні ўсіх прадметаў выкарыстоўваецца наша айчынная мова; Польскія ўраджэнцы саступілі месца рускім начальнікам і настаўнікам; адчынены ў розных месцах шляхетныя пансіёны, арганізаваны асобыя закрытыя выхаваўчыя ўстановы і агульныя вучнёўскія кватэры» [314, т.2, отд.2, стб.1142].

Такім чынам, расійская сістэма адукацыі, выкарыстоўваючы такія сродкі, як: мова выкладання, праграмы навучальных устаноў, выкладаемыя прадметы, кадры настаўнікаў, жаночая адукацыя і выхаванне дамагліся пэўных поспехаў у русіфікацыі беларускай моладзі і выкараненні «польскага духу». Важна адзначыць, што расійская сістэма адукацыі на землях Беларусі ігнаравала інтарэсы карэннага (тытульнага) насельніцтва, выключала беларускую мову з навучальна-выхаваўчага працэса, нацыянальная культура і традыцыі народа знаходзілі ў адукацыі слабое адлюстраванне.

# ГЛАВА 3. **БЕЛАРУСЬ У ПЛАНАХ АДРАДЖЭННЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ**

## 3.1. **Месца і роля Беларусі ў польскім пытанні**

Так званае польскае пытанне ўзнікла ў Еўропе з перыяду падзелаў Рэчы Паспалітай. Для Расіі ж яно існавала з пятроўскіх часоў, калі ўвайшло ў праграму расійскай знешняй палітыкі. Дастаткова ўспомніць Паўночную вайну (1700-1721 гг.), якая крывавым колам пракацілася па беларускай зямлі. З гэтых часоў расійскія ўлады ўсімі сіламі падтрымлівалі тыя бакі дзяржаўнага жыцця Рэчы Паспалітай, якія паслаблялі яе дзяржаўны арганізм (асабліва выбарнасць каралёў і liberum veto) [74, с.32—37]. Даследчык Ст.Пуле ўказаў на другі бок (рускі) польскага пытання — «наш заходні край, нашы заходнія межы, якія палякі лічылі і працягваюць лічыць сваімі» [297,с.212]. Сучасны расійскі гісторык Л.Е.Гарызонтаў піша: «З кропкі погляду ўнутранай палітыкі Расіі, польскае пытанне зводзіцца да ўсеабдымнай інтэграцыі былых зямель Рэчы Паспалітай у імперскі арганізм, пераўтварэнне палякаў у вернападданых правячай дынастыі» [73 а, с.8]. Галоўны змест польскага пытання для палякаў, на мой погляд, выказала Канстытуцыя 3 мая 1791 г.: быць вольным ад «ганебнай перавагі чужых загадаў» [597, с.39], ацэньваючы ў першую чаргу не сваё жыццё і асабістае шчасце, а палітычнае існаванне, знешнюю незалежнасць і ўнутраную вольнасць народа. Воля быць вольным у незалежнай, самастойнай і вольнай дзяржаве, якая мае свой урад, знойдзе выражэнне ў дзейнасці Чатырохгадовага сейма (1788 — 1792 гг.), у паўстаннях 1794, 1830-1831, 1863-1864 гадоў, падзеях напалеонаўскіх войн і рэвалюцыйных памкненняў 1840-х гадоў. Польскае пытанне стане змястоўнаю часткаю спадчыны Рэчы Паспалітай не толькі на даследуемы намі перыяд, але і на далейшы час, пакуль Польшча не адшукае зноў сваю дзяржаўнасць і не адродзіць другую Рэч Паспалітую, на гэты раз з Заходняй Беларуссю («усходнімі крэсамі»).

У выніку трох падзелаў загінула польская дзяржава, але не загінуў польскі народ. У вельмі папулярнай з 1797 г. песне польскіх легіёнаў у Італіі «Мазурка Дамброўскага» (аўтар Ю.Выбіцкі, музыка народная; з 1926—афіцыйны гімн «Яшчэ Польска не загінула») ёсць такія словы (пераклад аўтара):

Яшчэ Польшча не загінула,
Пакуль мы жывем.
Што чужая моц вырвала,
Шабляй адаб'ем.

У першапачатковым варыянце песні спявалася:

Немец, Маскаль не асядзе,
Калі ўзяўшы палаша,
Дэвізам нашым згода будзе
І Айчына наша.

Польская палітычная думка прасякнута была ідэяй суверэннага народа, звязанага з паняццем уласнай краіны, і не адразу было ўсталявана, што народ жыве і тады, калі яму адабралі дзяржаўны стан. Толькі пасля катастрофы 1831 г. А.Чартарыйскі зразумее, што «права народу да самадзейнага быту — гэта нязменная, найсвятая, не маючая тэрміну даўнасці, несмяртэльная ні ў якім выпадку, можа толькі пры фізічным вынішчэнні народа», і будзе сцвярджаць, што «народы не паміраюць» [605, с.62]. У выніку ліквідацыі польскай дзяржавы адбылася дэнацыяналізацыя польскага народа. «Гэта была,- пішуць І.С.Міллер і І.С.Нарскі, — сур'ёзная пагроза самаму існаванню польскай нацыі, пагроза, на якую польскі народ, фарміруючая польская нацыя адказала нацыянальна-вызваленчым рухам. Польская нацыя праявіла празмерную стойкасць і каласальную сілу супраціўлення палітыцы асіміляцыі, якую праводзілі царская Расія, Прусія і Аўстрыя» [230, с.391].

Марай польскага нацыянальнага руху было аднаўленне Рэчы Паспалітай «ад мора да мора»—гэта значыць у межах да першага падзелу ў 1772 г. Да месца адзначыць, што Рэч Паспалітая складалася з Польшчы («Кароны») і Вялікага княства Літоўскага («Літвы») і з'яўлялася канфедэрацыяй, а не адзіным дзяржаўным целам (Польшчаю, як пішуць польскія даследчыкі). Таму жаданне адраджэння Польшчы ў межах 1772 г. вяло да падпарадкавання ёй былой незалежнай ВКЛ (Літвы, Украіны, Беларусі). Адбываўся парадокс. Як піша М.В.Каяловіч, палякі сталі «васкрасаць сваю дзяржаўнасць не на сваёй чыста польскай зямле, пад уладаю немцаў, а ў сваіх пакутных братоў — рускіх славян, на рускай зямлі» [185, с.309] (паняцце «рускі» ў дадзеным выпадку не азначае сённяшні этнас расіян).

Федэрацыйны характар Рэчы Паспалітай добра разумеў ідыёлаг польскага нацыянальнага руху Гуга Калантай. Ягоны праект рэформаў «Палітычнае права польскай нацыі альбо арганізацыя кіравання Рэчы Паспалітай» (1790 г.), выдадзены пасля першага падзелу, утрымлівае такое паняцце, як «дзяржавы Рэчы Паспалітай», і тычыцца ўсіх земляў Літвы, Беларусі, Польшчы: «кожны чалавек, які нарадзіўся і жыве ў дзяржавах Рэчы Паспалітай або які перасяліўся туды, вольны. Ён можа, адпаведна боскім законам і законам гэтай краіны, карыстацца сваімі асабістымі сіламі і сваёй маёмасцю так, як знаходзіць лепш усяго для сябе. Ні адзін чалавек не можа валодаць другім прымусова або па дагавору і не павінен дапамагаць каму-небудзь у гэтым; тым больш ён не павінен наносіць шкоду маёмасці, асобе або жыццю свайго блізкага». Разумеючы немагчымасць вярнуць усе землі былой канфедэрацыі, Калантай прапанаваў злучыць «хаця б рэшткі нацыі пад скіпетрам адной дынастыі» [134, с.322, 334].

Аўтары брашуры «Ці могуць палякі дабіцца незалежнасці?», Ю. Паўлікоўскі, К.Князевіч, А.- Т.Касцюшка ў прадмове, а таксама ў першай і другой главах палякамі называюць «шаснаццацімільённы народ» Польшчы перад першым падзелам Рэчы Паспалітай. Ва ўводзінах аўтары пішуць: «Будзем чытаць і вучыцца; пажадаем толькі — і мы станем вольнымі, бо шаснаццацімільённы народ не можа быць народжаны для рабства». У першай главе гаворыцца: «Польшча перад першым падзелам мела шаснаццаць мільёнаў насельніцтва, перад другім — восем з паловай мільёнаў… Мы павінны разглядаць Польшчу ўвесь час у яе першапачатковых межах, бо дабрадзейны грамадзянін ніколі не павінен забываць, што падзел быў несправядліваю справай, таму трэба заўсёды спадзявацца, што гэтыя скупыя ваўкі (як назваў Мірабо манархаў, падзяліўшых Польшчу) не ўтрымаюць у сваіх пашчах захопленай здабычы… Няўжо мы думаем, што ў землях, захопленых аўстрыйскімі і расійскімі манархамі, няма польскіх сэрцаў, няма шляхетных душ, якія любілі бы вольнасць і шчасце сваіх сабрацьцяў».

У другой главе чытаем: «Зусім неверагодна, каб такая вялізная краіна, як Польшча, маючая шаснаццаць мільёнаў насельніцтва, магла быць заваявана, калі яе жыхары будуць энэргічна абараняцца і захочуць вызваліцца ад рабства» [134, с.540,551-552,556]. Разлік Бюшэнга, якім карысталіся аўтары

брашуры, быў зроблены перад 1775 г. і на самай справе памылковы. Польскі гісторык Т.Корзун лічыць, што насельніцтва РП перад І падзелам склала каля 11 млн. чалавек, а пасля яго — каля 7 млн. чал. [600, с.62].

Жаданне адраджэння былой Рэчы Паспалітай знайшло выражэнне ў лозунгу «За вольнасць нашу і вашу!». Гэтыя словы, сказаныя І.Лялевелем, сталі лозунгам не толькі Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг., але і ўсяго нацыянальна — вызваленчага руху на былых землях Рэчы Паспалітай. «Польскі катэхізіс» вельмі папулярны і распаўсюджаны на Беларусі ў 1-й палове XIX ст., разглядаў яе як сваю калонію: «У Польшчы ёсць свая Індыя: Украіна і Літва, — калоніі гэтыя з Польшчаю складаюць адно цэлае і, пры розуме і веданні весці справу ніколі ў матэрыяльных адносінах не будуць ад яе адарваны» [48, с.399].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Літва і Беларусь сталі губернямі Расійскай імперыі. Беларуская шляхта, акаталічаная і апалячаная ў сваёй большасці, цягнулася да Польшчы. У гэтым напрамку выхоўваюць яе Віленскі універсітэт і школы Віленскай навучальнай акругі як сродак супраціўлення русіфікацыі. Сярод беларускай шляхты панавалі ідэі аднаўлення незалежнасці ВКЛ і РП. Ажыццяўленне яе бачылася ў сумеснай барацьбе з польскай шляхтай. Таму ў асяроддзі вышэйшых і сярэдніх станаў беларускага грамадства ўзмацняюцца працэсы паланізацыі, якія актыўна падтрымлівае папячыцель Віленскай навучальнай акругі А.Чартарыйскі. Але была і другая група шляхты Беларусі, пра якую піша ў артыкуле «Апошняе папярэджванне Польшчы» (1790 г.) Г.Калантай: «страціла агульны інтарэс і праяўляе слабыя намаганні вярнуцца да Рэчы Паспалітай» [134, с.334]. Людвік Тышкевіч, галава літоўскай дэлегацыі, выказаў Кацярыне П «пачуцці і сэрца цэлага народу, прывязанага да яе больш праз узвышанасць яе душы, чым праз зброю», дзякаваў, што выкарыстала мужнасці і перавагу сваіх войскаў да высоўвання гэтай правінцыі (Літвы — *В.Ш.*) з няшчасцяў і прыгнёту, якімі абцягвалі яе безапеляцыйныя прыўлашчвацелі правай улады (г.зн. урад інсургенцыі — *В.Ш.*) і што вяртае спакой гэтаму краю» [605, с.62].

Даследчык В.Фелдман лічыць, што пад уладаю Канстанціна Паўлавіча і М.Навасільцава Каралеўства Польскае ахапіла «стагнацыя духа» — каставы шляхецкі эгаізм, а на беларускіх і ўкраінскіх землях яна прыняла «нізкі характар» [576, с.114]. За 15 гадоў угоды з Расіяй (1815—1830 гг.): Каралеўства

Польскае аддзялілася ад жывых крыніц заходняй культуры, трапіла ў дзіўны кансерватызм, інстынкт нацыянальна-самаахоўны накіраваў польскую справу ў падполле, дзе толькі і можна было ўзброіцца супраць Расіі, у якой рос нацыяналізм, якая хутка ішла да поўнага зліцця беларуска-літоўска-украінскіх зямель і ўтварэння з Польшчы расійскай правінцыі.

У польскім нацыянальным руху існавалі дзве тэндэнцыі ў вырашэнні польскага пытання:

1) адкрытага ці тайнага, канспіратыўнага супрацьстаяння захопнікам палітычнымі сродкамі і ўзброеным шляхам;

2) легальныя, не ўваходзячыя непасрэдна ў сферу палітыкі, дзеянні, мэтаю якіх з'яўляецца ўсебаковае аб'яднанне грамадства («арганічная праца», як яе называлі ў 40-х гадах).

Адна перацягвала другую ў спрыяючай палітычнай кан'юнктуры. Межы паміж імі былі расплыўчатымі, і прыхільнікаў розных тэндэнцый нельга проціпастаўляць [646, с.38]. Яны арыентаваліся то на Францыю, то на Расію. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай да 1813 г. першынствавала французская арыентацыя. Адам Чартарыйскі пісаў у аўтабіяграфіі: «У 1796 і наступных гадах нас прыводзілі ў захапленне паведамленні аб неверагодных поспехах Напалеона, і мы марылі тады ўбачыць адраджэнне Польшчы. Апасаючыся вымаўляць гучна імя Напалеона, мы дамовіліся называць яго «сябрам». Цяпер кожная параза французаў здавалася нам ударам кінжала нашай Айчыне» [135, с.15].

Рускі пасланнік у Парыжы А.І.Маркаў пісаў 28 кастрычніка 1803 г. міністру замежных спраў А.Р.Варанцову: «У размове з адным польскім эмігрантам Банапарт выказаў спагаду наконт лёсу Польшчы, ганьбіў былы французскі ўрад і саміх палякаў, якія дапусцілі падзелы краіны» [55, т.1, с.533]. З 1805 г. Напалеон, па словах польскага даследчыка М.Гандэльсмана, «уступіў на шлях, які вёў праз Польшчу». З гэтага часу «польская справа» займе ў яго палітыцы значнае месца і стане адным з пытанняў міжнароднай палітыкі [580, с.156]. 19.11.1806 г. у прамове да польскіх дэпутатаў у Берліне Напалеон заявіў: «Ніколі Францыя не прызнавала падзелу Польшчы, бо ніколі гэты падзел з яе інтарэсамі не пагаджаўся... Хутка ўбачу 30-40 тысяч узброеных людзей, аб'яўлю ў Варшаве вашу незалежнасць, якая ад гэтага часу будзе стаяць нерухома... Хачу ведаць погляд цэлага народу. Гэта ёсць адзіны момант для вас цяпер рушыць, калі яшчэ раз зможаце стаць народам».

Гэтую думку паўтарыў Напалеон і ў прамове да польскіх дэпутатаў у Познані 28.11.1806: «Хачу нанова вярнуць палітычнае існаванне вашаму народу, але выкарыстоўваючы гэтую пару, прыдатную дыспазіцыю, пакажыце, што вы годныя маіх замыслаў. Калі ў вашых жылах цячэ яшчэ кроў даўніх мужных палякаў, узбройвайцеся ўсе, вызначыцеся паміраць ці быць вольнымі, быць народам...» [633, с.88,89].

Сёмага ліпеня 1807 г. у Тыльзіце была заключана руска-французская дамова аб наступальным і абаронным саюзе. У час перамоваў гаварылі аб польскіх землях пасля другога і трэцяга, часткова і першага падзелаў — яны пяройдуць пад панаванне саюзніка Францыі саксонскага герцага Фрыдрыха I (унука польскага караля Аўгуста III). Аляксандр I атрымаў Беластоцкую акругу і не згадзіўся на ўжыванне слова «Польшча» ў назве новай дзяржавы — таму назвалі яго Герцагства (Княства) Варшаўскае. Яно мела 140 тыс. кв. км тэрыторыю і 2,6 млн. насельніцтва [646, с.390]. Як тут не ўзгадаць слоў гісторыка Гандэльмана: «Княства Варшаўскае ад самога свайго заснавання было зародкам дзяржавы для народа, які пасля страты незалежнасці на вузкай тэрыторыі збіраў свае сілы і рыхтаваўся да адбудовы цэласці. Пад апекай, амаль што пад куратарствам чалавека, які доўгі час выглядаў Усемагутным. Княства магло, Княства павінна было стаць Пьемонтам Рэчы Паспалітай Польскай» [579 а, с.23].

Аб знаходжанні французскай арміі ў Герцагстве пісаў 16 верасня 1807 г. у «Запісцы аб становішчы дзяржаў у 1807 г.» невядомы аўтар: «Гэта несумненна цудоўная пазіцыя, калі разглядаць яе як аванпост для новых аперацый, у любым іншым выпадку яна з'яўлялася б вельмі абцяжарваючай. Такім чынам, нельга траціць з поля зроку яўную мэту, да якой імкнецца французская палітыка, а менавіта: аднавіўшы Польшчу на поўначы і захапіўшы Грэцыю на поўдні, тым самым канчаткова замацаваць сваё панаванне ў Еўропе» [55, т.IV, с.71]. Аб гэтым жа даносіў 14 студзеня 1808 г. кіраўніку міністэрства замежных спраў М.П.Румянцаву пасол у Парыжы П.А.Талстой [55, т.IV, с.150]. На эрфурцкай сустрэчы Напалеона і Аляксандра I была падпісана 12 кастрычніка 1808 г. «саюзная канвенцыя», але Напалеон адмовіўся пісьмова пацвердзіць абяцанне вывесці французскія войскі з Герцагства Варшаўскага [55, т.IV, с.361-363,647].

Другім пытанне ў дачыненні да Герцагства было пытанне аб яго межах. Напалеон за дазвол павялічыць тэрыторыю

Герцагства за кошт Галіцыі згаджаўся на далучэнне да Расіі Дунайскіх княстваў [55, т.IV, с.358,560]. Напалохала Расію і напалеонаўская канстытуцыя 1807 г., якая даравала сялянам Герцагства Варшаўскага асабістую волю. М.Ф.Вярыгін пісаў І.Н.Філосафаву 22 жніўня 1807 г.: «І вось адзіным розчыркам пяра дваране амаль пазбаўлены маёмасці. Можна апасацца, што гэтая эпідэмія распаўсюдзіцца і ў нас. Гэта будзе жудасным ударам для Расіі...» [55, т.IV, с .31].

У 1809-1810 гг. ішла падрыхтоўка да заключэння франка-рускай канвенцыі аб Польшчы. 20.10.1809 г. Шампані, міністр замежных спраў Францыі, накіраваў ліст М.П.Румянцаву аб тым, што французскі імператар не толькі не жадае выклікаць думку аб аднаўленні Польшчы, якая так далёка ад яго намераў, але ён гатовы садзейнічаць імператару Аляксандру І ва ўсіх тых справах, якія маглі б ліквідаваць назаўсёды ўспаміны аб ёй і яе былым выглядзе». Далей Шампані пісаў, што Напалеон згодзен на тое, каб словы «Польшча і палякі не толькі зніклі з усіх палітычных дагавораў, але, нават, з гісторыі» [391, с.112,113]. Аляксандр І выказаў задавальненне і лічыў, што гэты ліст можа быць асноваю канвенцыі па польскаму пытанню. Асноўныя патрабаванні Аляксандра І заключаліся ў наступным:

1) абавязацельства, што ніколі не ўзнікне пытанне аб аднаўленні Польшчы, якая застанецца ў сучасным стане Герцагства (Княства) Варшаўскага;

2) ліквідацыя слоў «Польшча» і «палякі» з дзяржаўных дакументаў;

3) ліквідацыя старых польскіх ордэнаў і чыноў;

4) абавязацельства, што рускія падданыя не будуць прымацца на службу да саксонскага караля;

5) разглядаць Герцагства (Княства) Варшаўскае і далучаную частку Галіцыі толькі як правінцыю саксонскага караля [391, с.113].

25 лістапада 1809 г. Каленкур атрымаў ад Шампані паўнамоцтвы на заключэнне канвенцыі, і 4.01.1810 у Пецярбурзе яна была падпісана. У першым артыкуле яе гаварылася, што Каралеўства Польскае ніколі не будзе адроджана; у другім — што тэрмінамі «Польшча» і «палякі» ніколі не назавуць ніякія вобласці, якія ўваходзілі ў склад былога Каралеўства Польскага, ні для вызначэння яе жыхароў ці войскаў. Быў пункт абавязацельства не павялічваць тэрыторыю Герцагства Варшаўскага за кошт абласцей, якія некалі належалі Польшчы [391, с.114]. Гарантам пагаднення павінен быў стаць шлюб

Напалеона з вялікай княгіняй Ганнай, чуткі аб якім распаўсюджваліся ва ўрадава-дыпламатычных колах з канца 1809 г. [46, с.418]. Па палітычна-дынастычных меркаваннях шлюб не адбыўся [221, с.570,580-581; 372, с.222-223]. Канвенцыя не была ратыфікавана, і ў ліпені 1810 г. Напалеон у сувязі з гэтым гаварыў: «Я не хачу аднаўляць Польшчу, але я і не хачу пляміць памяць аб сабе, падпісаўшыся пад гэтым актам палітыкі, дастойнай Макіавелі, бо абвясціць, што Польшча ніколі не будзе адноўлена, гэта больш, чым прызнаць яе падзелы» [цыт. па: 391, с.116]. А ў лісце ад 20 жніўня 1810 г. да Аляксандра I Напалеон напісаў, што нічога так не хоча, як міру з Расіяй. У лісце ад 27.02.1811 г. ён звяртае ўвагу, што «калі б хацеў адбудаваць Польшчу, мог гэта зрабіць пасля Фрыдланда, калі меў толькі 12 дзён да Вільні, або ў час апошняй турэцкай вайны» [689, с.93].

У сваім данясенні аб сустрэчы з Напалеонам 10.04.1811 г. А.І.Чарнышоў пісаў, што той неаднаразова пытаўся ў яго «з тым адкрытым і лагодным выглядам, які вядомы Вашай Імператарскай Вялікасці: «Скажыце мне шчыра, ці сур'ёзна думаюць Імператар Аляксандр і граф Румянцаў, што я жадаю «аднавіць Польшчу?»... Ці праўда, «што вы думаеце, што я чакаю толькі «заканчэння Маіх спраў у Іспаніі, каб выканаць гэты намер?». Калі Чарнышоў адказаў, што «аднаўленне Польшчы пры ўмове, калі гэта будзе здавацца вам выгадным і ў вас не будзе іншых войнаў — адна з вашых тайных думак», дык Напалеон прыдаў свайму твару выраз, як бы аслупянеў ад гора і здзіўлення і сказаў: «Непасціжна, як настойліва прыпісваюць мне гэты план. Бо гэта вялікая непрадбачлівасць. Пастаянна гаворачы мне, што ў мяне ёсць такая думка, быць можа, і скончыцца тым, што ўнушаць мне яе і піхнуць на гэту справу» [Цыт. па: 49, с.134]. У гэтай жа размове Напалеон прапанаваў прыняць і падпісаць канвенцыю, якая дае гарантыю супраць аднаўлення Польшчы. Узамен ён прасіў толькі аднаго, каб Расія не спальвала французскія тавары.

Пятнаццатага жніўня 1811 г. на ўрачыстым прыёме дыпламатычнага корпуса з нагоды імянін Напалеона адбылася непрыемная сцэна. Імператар з гневам і пагрозамі ў голасе звярнуўся да рускага пасла князя Куракіна: «На што спадзяваецца ваш гаспадар?.. Я не хачу вайны, я не хачу аднаўляць Польшчу, але вы самі хочаце далучэння да Расіі Герцагства Варшаўскага і Данцыга...» [цыт. па: 372, с.247].

Рускаму дыпламату, гр. Шувалаву, які праездам быў у Парыжу, Напалеон з раздражненнем гаварыў: «Чаго хоча ад мяне імператар Аляксандр? Няхай пакіне мяне ў спакою. Няўжо думаюць, што я ахвярую амаль дзвюмастамі тысячамі французаў дзеля аднаўлення Польшчы?». Ён звяртае яго ўвагу на тое, што Варшаўскае герцагства, слабае і пакорнае, для яго больш выгадна, чым незалежная і моцная Польшча, якая раней ці пазней вызваліцца з-пад яго апекі [49, с.163].

Пра будучае Польшчы Напалеон гаварыў паўнамёкамі і патрыятычны ўздым палякаў хацеў выкарыстаць у сваіх мэтах. Яму патрэбна была не аднаўленая Польшча, а толькі польская армія Ю.Панятоўскага і польскія эканамічныя рэсурсы, база для разгортвання наступальных дзеянняў. Напалеон праводзіў двайстую палітыку: хацеў мець палякаў на сваім баку на выпадак вайны, а пазбегнуць яе — праз занядбанне іх справы. Адначасова падштурхоўваў палякаў да вайны з Расіяй, патаемна пастаўляў ім зброю. Літоўскі гісторык Б.У.Дундуліс у кнізе «Літва ў час напалеонаўскай агрэсіі. 1807—1812» слушна піша: «Дэмагагічнымі заявамі па польскім пытанні ён (Напалеон) імкнуўся замаскіраваць сапраўдную мэту — перамагчы Расію і дабіцца поўнай гегемоніі ў свеце. Напалеонаўская Францыя мела сваю палітыку і стратэгію. Дэвіз гэтай палітыкі — «Францыя вышэй за ўсё». Напалеон не збіраўся ахвяроўваць інтарэсамі сваёй імперыі на карысць інтарэсаў Польшчы і Літвы... У прыгнечанай ім Еўропе не засталося б месца ні для вольнай Польшчы, ні для Літвы» [цыт. па: 2, с.200]. Гэта зразумеў ліцвін Сангушка, які быў пры Напалеоне і пісаў пра яго: «Палякам жа не даваў надзеі быць дзейнымі дзеля сваёй свабоды, а з Польшчы рабіў толькі поле вайны...», «... у ягоным сэрцы не было сэрца, толькі асабісты інтарэс, хаця ў рэшце, прыхільнейшым быў для нашага народу, як ніхто іншы» [658, с.59-60, 70-71].

Вера ў Напалеона была даволі моцная. Чым ён заслужыў гэтае? Польскі гісторык Аскеназы пералічвае, што Напалеон зрабіў для польскага народа: быў пераможцам у Берліне, Вене, Маскве (тры сталіцы тых, хто падзяліў Рэч Паспалітую), вярнуў польскі ўрад і войска, знішчыў акты падзелаў, узняў Польшчу ў ранг еўрапейскіх краін і прадставіў яе сярод іх як еўрапейскую частку, неабходную для палітычнага жыцця Еўропы, аднавіў затаптаных прыхільнікаў польскай справы. «Не быў усемагутным: зрабіў для Польшчы максімум таго, што змог,

або тое, што падалося яму магчымым. Не быў палякам і зрабіў для яе тое, што выдавалася яму згодным з рацыяй свайго становішча, свайго народа і Еўропы» [546, с.13].

У 1811 г. Напалеон паслаў у Варшаву барона Л.-П.-Э.Біньёна, які спачуваў палякам. На яго былі ўскладзены абавязкі «даць ураду Герцагства напрамак, які б падрыхтаваў бы яго да вялікіх перамен, якія маюць быць ажыццяўлены імператарам на карысць польскага народа» [287, с.149-150]. Разам з тым, Біньён стаў прыемнікам французскага рэзідэнта разведвальнага бюро і пачаў кіраваць агентурнай працай супраць Расіі (адзін з аддзелаў ведаў Літвой і Беларуссю). «Назіранне за перасоўваннем рускіх войск, — успамінаў Біньён, — стала маім пастаянным абавязкам» [32, с.87]. Ягоная служба збірала інфармацыю аб настроях насельніцтва, органах улады, становішчы гаспадаркі, тапаграфічныя звесткі, асабліва аб землях Беларусі. З мэтаю падрыхтоўкі ваенна-стратэгічных карт заходніх рэгіёнаў Расіі пабываў у гэтых месцах у 1808 г. палкоўнік Пачкоўскі, рэкагнасцыроўку мясцовасцяў каля Нёмана ажыццявілі ў 1811 г. падначаленыя генерала Сансона. Звесткі аб землях Беларусі збіраў сакратар французскага пасольства ў Расіі Прэво. Разведвальныя функцыі выконваў і граф Л.Нарбон падчас сваёй місіі ў Вільні ў маі 1812 г.: збіраў дадзеныя аб колькасці і размеркаванні рускай арміі, настроях мясцовага насельніцтва, звязваўся з «ліцвінскай знаццю» [32, с.88-90]. Тэрыторыю Літвы запаланілі польска-французскія агенты пад выглядам артыстаў, настаўнікаў, музыкантаў, дактароў, вандроўных манахаў, землямераў (у Смаленску, Мінску, Магілёве і інш.) Палітычнымі агентамі французаў былі Аляксандр Сапега, Франц Патоцкі, ад’ютант маршала Даву Шыдлоўскі, брыгадны генерал Лабунскі, брат каноніка віленскага. Згодна з афіцыйнымі рапартамі, усе яны агітавалі на карысць Напалеона, абвяшчаючы аб хуткім аднаўленні ім Каралеўства Польскага [583, с.54]. Вялікая цікавасць Напалеона да зямель Беларусі і знаходжанне тут большай часткі агентуры, на наш погляд, падкрэсліваюць яго жаданне закончыць ваенную кампанію супраць Расіі на памежных тэрыторыях.

У запісцы М.Сакальніцкага, падрыхтаванай па загаду Напалеона, гаварылася аб палітычным стане Расіі і Польшчы. Аўтар значную ўвагу звярнуў на Літву і Белую Русь. Літву Сакальніцкі лічыў магчымым тэатрам ваенных дзеянняў, а таму прадставіў «сінаптычную карту гэтай краіны»: апісаў берагі

Нёмана, віды на фураж, харчаванне, начлегі арміі. Ён выказаў меркаванне аб мажлівым адыходзе рускіх войск з Літвы, магчымасці арганізаваць з дапамогаю Радзівілаў партызанскія дзеянні і стварыць шасцітысячнае апалчэнне і нават 15-тысячны армейскі корпус. Найбольш важнымі гарадамі, якія трэба было захапіць, Сакальніцкі назваў Пінск і Мозыр, бо першы — «ключавы ўмацаваны пункт на шляху з Літвы ў Валынь праз вялізную палескую дрыгву», а другі — «яшчэ больш важны па свайму значэнню пункт паміж Літвой і Украінай» [331, с.28-29].

У Познані 30 мая 1812 г. Напалеон у сваёй прамове сказаў, што дапускае стварэнне Генеральнай канфедэрацыі, якая звернецца да яго з просьбаю аднавіць былую Польшчу і затым закліча насельніцтва ўсёй былой Рэчы Паспалітай (акрамя Галіцыі) да паўстання і аб'яднання з Герцагствам Варшаўскім. Перш за ўсё Напалеон меў на ўвазе Літву (пад ёй ён разумеў усё былое ВКЛ у межах першага падзелу), паўстанне якой супраць Расіі было яму вельмі выгадна [гл.: 287, с.152; 607, с.9].

22 чэрвеня 1812 г. перад пераходам французскімі войскамі Нёмана і ўварванні на тэрыторыю былога ВКЛ зачыталі загад Напалеона: «Салдаты! Другая польская вайна пачалася. Першая скончылася ў Фрыдландзе і ў Цільзіце... Пойдзем жа наперад, пяройдзем Нёман і ўнясем вайну ў яе (Расіі) межы. Другая польская вайна будзе для французскай зброі такой жа слаўнай, як і першая. Але мір, які мы заключым, прынясе з сабой і паруку за сябе і паложыць канец пагібельнаму ўплыву Расіі, якое яна на працягу пяцідзесяці гадоў аказвала на справы Еўропы» [312, с.95-96]. Гэтым Напалеон хацеў падкрэсліць, што вядзе вайну дзеля аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г.

26 чэрвеня 1812 г. у Варшаве адкрыўся сейм, які выканаў «вышэйшы загад» Напалеона — 28 чэрвеня аб'явіў сябе Генеральнай канфедэрацыяй Каралеўства Польскага і прыняў «Акт аднаўлення і незалежнасці старажытнага Каралеўства Польскага» ў межах, зразумела, да падзелаў Рэчы Паспалітай. 7 ліпеня была апублікавана «Адозва да палякаў», якія жывуць на тэрыторыі Літвы і заходніх губерняў Расіі: «Завершыце вашым стараннем, каб знуджаная радзіма ўбачыла ўсіх сапраўдных сыноў сваіх, злучаных адзіным духам, адзінаю мэтаю і адзінымі непарыўнымі сувязямі. Агульны вораг разарваў вечныя саюзы братэрства; мы павінны спадзявацца, што агульны вызваліцель вярне і сплоціць іх... Падамо адзін аднаму рукі і вырашым — аднадумствам, даверам, руплівасцю і агульным

імкненнем да адной мэты падтрымаць святую справу — адраджэнне айчыны» [284, с.160]. Камісія Часовага Ураду ВКЛ далучыцца да Генеральнай Канфедэрацыі, але аб гэтым будзе сказана ніжэй.

11 ліпеня Напалеон у Вільні прыняў Выбіцкага — главу дэлегацыі з адрасам ад Генеральнай польскай канфедэрацыі, але быў асцярожным, даў «вядомы адказ, афарбаваны словамі дабразычлівасці да палякаў, абяцаннямі падтрымкі з дабаўленнем калі, калі, калі» [602, т.2, с.312]. А гаварыў Напалеон наступнае: «Калі б я панаваў у час першага, другога і трэцяга падзелаў, я ўзброіў бы ўвесь мой народ, каб падтрымаць вас... Я люблю вашу нацыю... Але я абяцаў аўстрыйскаму імператару недакрананасць яго ўладанняў і не магу ўпаўнаважваць вас ні да якіх дзеянняў, якія схіляюцца да парушэнняў мірнага валодання пакінутых у яго ўладаннях польскіх абласцей... Няхай Літва, Самагіцыя, Віцебск, Полацк, Магілёў, Валынь, Украіна і Падолія натхняюцца тым жа духам, які я сустрэў у вялікай Польшчы, і Вышэйшая воля поспехам святую вашу справу» [цыт. па: 284, с.159]. Такім чынам, Напалеон адкрыта сказаў, што ў межах 1772 г. Польшча не адновіцца, але Літва і Беларусь могуць увайсці ў адроджаную Польшчу.

Усіх запаланіла надзея далучыць значную частку, якая ўжо належала Расійскай імперыі. Гісторык Пічэта слушна пісаў, што польскае грамадства ў той час «...амаль не сумнявалася ў канчатковым выніку задуманага пахода і радасна ўглядалася ў бліжэйшую будучыню. Перад яго вачыма не ў мроях і снах, а ў рэальных абрысах пастаянна стаяла адноўленая Польшча, у тым выглядзе, у якім яна знаходзілася да падзелаў... Усе жылі толькі Напалеонам. Толькі ён панаваў над разумамі. Яго лічылі апосталам вольнасці, аднавіцелем новай Польшчы» [Цыт. па: 284, с.154]. Але па сутнасці Францыя часоў Бурбонаў, рэвалюцыі (Канвента, Дырыкторыі) і Напалеона Банапарта заўсёды захоўвала свае інтарэсы і не аказвала разумення захавання дзяржаўнасці Польшчы. Як напісаў польскі гісторык В.Фелдман: «У Парыжы змяняюцца ўрады, лагеры, геніі, сістэмы,.. не змяняецца толькі палітычны пастулат, паводле якога Польшча прызнаецца козырам у міжнароднай гульні, і больш нічым» [576, с.131]. Напалеон сам прызнаў у сваім дзённіку, напісаным на востраве св. Алены, што дзейнічаў у польскім пытанні на сваю карысць — трымаў яго за страшыдла ў сваёй палітыцы да Расійскай імперыі [689, с.88].

Спрабаваў разыграць «польскую карту» і Аляксандр I, якога Напалеон назваў «найхітрэйшым з грэкаў», а А.С.Пушкін — «двулікім Янусам». У 1807 г., напярэдадні Тыльзіцкіх перамоў, у галоўную кватэру ў Таўрогах А.Чартарыйскі запрасіў Тамаша Ваўжэцкага (нагадаем, што пасля Касцюшкі ён быў Начальнікам Узброеных сіл паўстання 1794 г.) як прадстаўніка Літвы і генерала Князевіча з Валыні. Расійскі імператар ім гаварыў: «Падзел Польшчы — памылка, якую паправіць са свайго боку я, колькі гэта ад мяне будзе залежыць, лічу за абавязак» [605, с.106; 631, с.140]. Аляксандр I прапанаваў Князевічу ўзначаліць польскую армію, якую хацеў стварыць, аднаўляючы Каралеўства Польскае. Князевіч адмовіўся, бо не мог ваяваць супраць палякаў, якія былі ў шэрагах Напалеона.

Пасля стварэння Напалеонам Герцагства Варшаўскага Аляксандр I усімі сіламі запрагнуў перацягнуць палякаў на свой бок, каб выняць гэтую балючую стрэмку. Калі ў 1810 г. Напалеон захапіў герцагства Альдэнбургскае, канцлер Румянцаў вырашыў выкарыстаць гэта як нагоду для нанясення смяротнага ўдару па марах палякаў на паступовае пашырэнне Герцагства Варшаўскага і ператварэння яго ў дзяржаву, якой Польшча была да падзелаў. Трэба было дамагчыся выдзялення часткі Герцагства Варшаўскага прынцу Альдэнбургскаму ў якасці кампенсацыі за страту сваіх валоданняў. «Толькі такое ўзнагароджванне, якое па свайму месцазнаходжанню ўяўляла бы гарантыю яе спакою і якое яна магла бы абараніць і паставіць у лепшыя ўмовы ў будучым, — пісаў Вандаль, — падыходзіла Расіі» [49, с.114]. Чарнышова, які накіроўваўся ў Францыю, Румянцаў інструктаваў: «Калі б удалося ўсыпаць у адзін мех справы Польшчы і Аляксандра. Перамяшаць іх хораша і потым вытрасці, саюз абедзвюх імперый стаў бы такім моцным, цесным і шчырым, якім не быў яшчэ ніколі, і ўсё гэта назло англічанам і нават немцам» [цыт. па: 49, с.117].

10 красавіка 1810 г. Чарнышоў размаўляў з імператарам Напалеонам. Той хацеў выпытаць канкрэтныя патрабаванні Аляксандра I, але Чарнышоў паўтарыў метафару Румянцава пра мех. Разгневаны Напалеон сказаў: «Якое ўражанне зрабіла бы на палякаў уступка хаця б адной пядзі іх тэрыторыі ў момант, калі Расія пагражае нам... Але, калі бог вайны стане на наш бок, а гэта магчыма, бо шансы аднолькавыя, я прымушу Расію раскаяцца, і можа адбыцца, што яна страціць не толькі свае *польскія правінцыі*, але і Крым» [Цыт. па: 49, с.132].

Паралельна вяліся перамовы з палякамі. Яшчэ ў красавіку 1810 г. Аляксандр І выказаў Чартарыйскаму думку аб магчымасці аб’яднання васьмі заходніх губерняў пад асаблівым кіраўніцтвам. У жніўні 1810 г. у Пецярбургу быў канчаткова створаны план вялікага пахода супраць Напалеона: палякі павінны былі стаць сродкам, княства трэба было перацягнуць на бок Расіі, завалодаць без адзінага стрэлу, зрабіць плацдармам для збора расійскай арміі, праз княства дасягнуць Берліна, выклікаць інсургенцыю ў Прусіі, захапіць яе ў паходзе, Аўстрыю ўлагодзіць дамоваю і абяцаннямі тэрытарыяльных набыткаў. Аляксандр І разумее, што «трэба вялікіх міражоў», каб збіць палякаў з правільнага шляху, з дарогі саюзніцкай вернасці і салдацкай лаяльнасці», таму перад Чартарыйскім стварае міраж аднаўленага Каралеўства з Аляксандрам на троне, з далучанай Літвою і з дамоваю з Галіцыяй [606, с.5].

18 жніўня 1810 г. адбылася размова Чартарыйскага з Аляксандрам І. Той прапанаваў «даць адпаведную арганізацыю польскім землям у сваёй дзяржаве» (сямі заходнім губерням, бо аб’яднаць усе польскія землі яшчэ не меў сілы). За гэта патрабаваў пэўных сродкаў. Чартарыйскі дамагаўся адбудовы Айчыны палякаў, злучэння іх у адну цэласнасць, раіў пазбягаць усяго, што дражніць палякаў, і шанаваць іх правы, імя, раней дадзеныя прывілеі. Сродкі для гэтага, на яго погляд, маглі быць наступныя: спыніць секвестры, канфіскацыі, увесці агульную амністыю для тых, хто выехаў за мяжу, і іншых, не браць адукацыйныя фундушы, а даверыць іх спецыяльнай установе пад кантролем міністэрства асветы, браць падаткі ў заходніх губернях падобна цэнтральным (у рублях асігнацыямі, а не серабром, што выходзіць у 5 разоў болей), стварыць Вышэйшы Апеляцыйны трыбунал, які будзе вырашаць правы па мясцовых законах і на польскай мове.

Чартарыйскі адхіляўся ад адказу на пытанне Аляксандра І аб арганізацыі Літвы шляхам стварэння ВКЛ, гаварыў, што ў такой важнай справе некампетэнтны. Спасылаўся на тое, што выкананне гэтых праектаў сустрэлася б з вялікімі цяжкасцямі, тым больш, што намеры цара не зусім зразумелыя і станоўчыя. Чартарыйскі пытаў Аляксандра, ці той паставіць на чале літоўскай адміністрацыі палякаў, ці створыць асобнае польскае войска, ці даручыць кіраванне літоўскімі справамі, як у Фінляндыі, асобнай канцылярыі ў Пецярбургу, каб губерні літоўскія не падлягалі непасрэдна Сенату і міністэрствам

імперыі, ці збіраецца імператар у далейшым злучыць усе часткі Польшчы з Варшаўскім княствам і стварыць адно Каралеўства Польскае на чале з ім, каралём польскім, канстытуцыяй, якая забяспечыць свой урад, правы і прывілеі польскага народа [583, с.21]. Такім чынам, беларускія землі разглядаліся Чартарыйскім як польскія, і іх лёс ён бачыў неадрыўным ад карэннай Польшчы.

У вялікім мемарыяле Чартарыйскі растлумачваў, што не можа дапамагаць Аляксандру стварыць іншую Польшчу, якая супрацьпастаўлена Герцагству, узносіць «алтар супраць алтара», нельга лічыць, што яно выступіць супраць Напалеона, які хоць нешта зрабіў для Польшчы. Стрымлівала Чартарыйскага боязь братазабойчай вайны і ліквідацыя маральнай уніі Вільні і Варшавы [605,с.136]. Шостага студзеня 1811 г. князь Адам атрымаў ад Аляксандра І ліст. Цар пісаў, што вырашыў выступіць супраць Напалеона, абвясціць адраджэнне Польшчы як каралеўства пад скіпетрам цара з уключэннем зямель другога і трэцяга падзелаў, з народным характарам і ліберальнай канстытуцыяй [605, с.137]. У лісце ад 12.02.1811 г. Аляксандр І удакладняе межы адноўленай Польшчы: «з'яднанне ўсіх частак былой Польшчы, уключаючы і вобласці, якія адышлі да Расіі, акрамя Беларусі, так, каб граніцаю сталі Дзвіна, Бярэзіна і Днепр» [55, т.VI, с.56; 576, с.70]. Чартарыйскага гэта задавальняла, бо Польшча марыла аб уключэнні Літвы ў яе межы. Белая Русь, як бачым, не ўваходзіла ў адраджаемую краіну. Але магла быць уключана Галіцыя, калі б Аўстрыя пагадзілася замяніць яе на Малдавію і Валахію [55, т. VI, с.57].

Аляксандр І пісаў Чартарыйскаму, што здзяйсненне мараў магчыма толькі пры выкананні наступных умоў:

1.«Каралеўства Польскае назаўсёды злучыцца з Расіяй. Рускі імператар з гэтага часу будзе называцца імператарам расійскім і каралём польскім.

2. Фармальнае і здавальняючае пасведчанне ў тым, што ўсе жыхары Герцагства аднадушна жадаюць і імкнуцца да дасягнення гэтага, гарантаванне подпісамі найбольш вядомых асоб у Польшчы» [55, т.VI, с.57].

Польскае войска павінна было перайсці на бок Расіі. Князю Адаму Чартарыйскаму Аляксандр І даручыў накіравацца ў Варшаву, каб высветліць магчымасці далучэння Герцагства. «Княства – гэта перш за усё войска», – трапна пісаў гісторык Кукель. Чартарыйскі спрабуе перацягнуць на бок Аляксандра Юзафа Панятоўскага, які «сваё войска паверне фронтам на Захад,

супраць учарашніх сяброў па зброі, супраць тых, хто пад Фрынландам крываваю працаю здабываў Княства Варшаўскае» [605, с.137; 606, с.6]. У лісце да Чартарыйскага была інструкцыя «Сродкі, якія тычацца Палякаў», напісаная рукою Аляксандра. Чартарыйскі павінен быў «7. Калі будзе магчымасць убачыцца з Панятоўскім, дык 8. Паспрабаваць яго заваяваць на свой бок, паказваючы яму цяжкасці аднаўлення Польшчы праз Францыю, суровасць непазбежнай тады вайны, знішчэння цэлага краю і суровыя сродкі, да якіх прымушана была бы звярнуцца Расія для сваёй абароны, наадварот, 9. Калі палякі аддадуцца Расіі, дык іх існаванне было бы несумненным... Польшча адбудуецца праз спалучэнне яе з Расіяй, Аўстрыя ўзнагародзіцца (за Галіцыю) Валахіяй, часткай Малдавіі і сваімі старымі рэгіёнамі: Далмацыяй, Венецыяй, часткай Італіі і Цыролем; 10. Калі гэтыя і падобныя вывады падзейнічаюць пераканана на кн.Панятоўскага і будуць ім прынятыя, у такім выпадку 11. Падрыхтаваць у гэтай меры паперы і дагаварыцца з ім аб супрацоўніцтве» [цыт. па: 545, с.220]. Для таго, каб палегчыць пераход Ю.Панятоўскага на бок Расіі, Аляксандр І прапанаваў увесці рускія войскі ў Герцагства, прычым Панятоўскі як бы пры неабходнасці паддаўся бы [215, с.91].

У першых днях лютага 1811 г. Чартарыйскі паехаў у Варшаву, дзе да яго дайшоў другі ліст Аляксандра І, у якім дакладна падавалася размеркаванне на тэрыторыі Літвы і Беларусі расійскай арміі, гатовай у кожную хвіліну да ўдару па Напалеону [55, т.VI, с.56—58]. Чартарыйскі аддаў гэты ліст кн. Юзафу Панятоўскаму і прыклаў пажаданні імператара. Адказ быў адмоўны.

Размаўлялі з Ю.Панятоўскім і самі расіяне. С.Г.Валконскі ўспамінаў: «Адна абставіна заслугоўвае некаторай увагі, гэта даручэнне палкоўніку Толю: тайна бачыцца з Ю.Панятоўскім, камандуючым тады адным з карпусоў Напалеона, каб заверыць яго, што Гасудар мае намер аднавіць Польшчу, і калі ён, Панятоўскі дасць згоду адысці ад Напалеона і тым адвесці за сабою польскае войска, маючы поўны давер да яго, Панятоўскага, дык Аляксандр абвесціць яго каралём Польскім, выстаўляючы гэта не за здраду, а за садзейнічанне аднаўленню Польшчы. Адказ Панятоўскага і на гэты раз быў адмоўным, ён сказаў Толю, што дзякуе Гасудара за намер, але гонар яму не дазваляе прыняць прапанову, а ў пасведчанні павагі і ўдзячнасці да Гасудара, ён не дасць галоснасці ўсяму гэтаму» [Цыт. па: 256, с.4].

Не падтрыманы Аўстрыяй, Прусіяй, Швецыяй, Аляксандр I вымушаны быў адкласці свой план нападу на Францыю. Тым не менш, ваенная падрыхтоўка не была спынена, і армія знаходзілася ў баявым парадку. Цяпер гэта рабілася для абароны межаў Расійскай імперыі. Чартарыйскаму Аляксандр I 13 красавіка 1812 г. пісаў: «Вашыя папярэднія лісты далі мне зусім малую надзею на магчымасць поспеху, каб я меў права дзейнічаць. Я змог бы рашыцца на гэта толькі пры ўмове якой-небудзь надзеі на поспех. Вайна, якая ўжо непазбежна, дае мне права аддацца ажыццяўленню маёй запаветнай мары аб аднаўленні Вашай айчыны» [55, т.VI, с.353]. Імператар прасіў Чартарыйскага скласці спіс суайчыннікаў, якія адмоўна ставяцца да Расіі, бо, калі будзе вайна, «вельмі неабходным будзе вызначыць наш вобраз дзеянняў у дачыненні да гэтых людзей» [55, т.VI, с.354].

У канцы вайны, 29 кастрычніка 1812 г., камандуючы 3-й Заходняй арміі П.В.Чычагаў пісаў камандуючаму войск у Літве: «...Імператар згодзен забяспечыць палякам нацыянальнае існаванне, але ён, не паступаючыся сваёй годнасцю, можа абяцаць ці даць ім яго на наступных дзвюх умовах: 1) што яны заслужаць гэтае сваімі паводзінамі і адданасцю яму; 2) што, задавальняючы збег абставін і важныя вынікі гэтай вайны, дадуць магчымасць ажыццявіць некаторыя палітычныя камбінацыі на сталым і пастаянным падмурку» [55, т.VI, с.593]. Такім чынам, Аляксандр I пачаў рыхтаваць умовы да вырашэння польскага пытання пасля вайны.

Паражэнне Напалеона ў вайне з Расіяй прывяло да змены арыентацыі польскага нацыянальнага руху: у 1813 — 1830 гг. надзеі былі ўскладзены на Расію і пераможцу — Аляксандра I. Міністры Герцагства Варшаўскага аб'ядноўваліся ў гэтым з літоўскімі падданымі Аляксандра I (зноў адраджаліся планы аўтаноміі Літвы, планы Чартарыйскага). Ю.-У.Нямцэвіч пісаў: «Асабістыя дабрадзейнасці гэтага Манарха настолькі занялі сэрцы палякаў, што апошнія пачалі сумнявацца ў тым, чаго чакалі ад Францыі, і былую сваю надзею змянілі ў жаданне, каб падзеленыя вобласці былі злучаны пад скіпетрам гэтага дзяржаўцы. Такое праявілася не толькі ў расійскіх, але і ў прускіх і аўстрыйскіх падданых». Моцна наэлектрызаваныя польскай палітыкай Аляксандра I патрыёты пераходзілі ад надзей да справы. Як піша гісторык Крачкоўскі: «да палітычных мараў аб стварэнні ў Расіі, *у заходніх яе акраінах, новага*

*польскага* каралеўства; ім здавалася, што маленне іх услыханы, і да іх як бы даносіўся ўжо, падавалася ім, жыватворчы голас ветхазаветнага прарока: «косці сухія! Устаньце з трунаў; я апрану вас плоццю, звяжу жыламі і ўдыхну ў вас дух жыцця» [188, с.83].

Яшчэ ў красавіку 1814 г. (да рашэння польскага пытання на Венскім кангрэсе) Аляксандр I стварыў арганізацыйны ваенны камітэт пад старшынствам Канстанціна Паўлавіча для фарміравання польскай арміі на спецыяльных падставах і ў памеры, прынятым трактатам кангрэса (каля 30 тыс. чал.). Набіралася армія не толькі з ураджэнцаў Каралеўства Польскага, але і заходніх губерняў Расіі. Па канстытуцыі 1815 г. яна мела задачу абараняць манарха і айчыну, яе межы і ўвесь час знаходзіцца ў краі. Польскі гісторык У.Студніцкі слушна пісаў: «Армія з'яўляецца істотным дзяржаўным органам, і самое існаванне польскай арміі ўжо прадвызначала аднаўленне польскай дзяржаўнасці» [351, с.19].

Найвышэйшым дасягненнем Аляксандра I у вырашэнні польскага пытання было стварэнне Каралеўства (Царства) Польскага. Венскі кангрэс, на якім гэта адбылося,ператварыўся ў арэну палітычнай барацьбы Расіі са сваімі былымі саюзнікамі па антынапалеонаўскай кааліцыі. Аляксандр I выкарыстаў усё, каб Польшча была адноўлена толькі пад ягоным скіпетрам і ў саюзе (уніі) з Расійскай імперыяй. Адносіны абвастрыліся настолькі, што маглі перарасці ў вайну — 22 снежня 1815 г. Францыя, Аўстрыя, Англія падпісалі тайную канвенцыю з мэтаю стрымаць Расію. Толькі высадка Напалеона ў Францыю адхіліла яе. Пасля «сто дзён Напалеона» расійскія праціўнікі жадалі толькі, каб на яе долю хапіла менш польскіх зямель.

21 красавіка 1815 г. былі падпісаны трактаты паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй, паводле якіх Герцагства Варшаўскае звязвалася рэальнаю ўніяй з Расіяй (за выключэннем Познані, Бромберга, Торна, Кракава, саляных выкапняў Велічкі, Тарнопальскага павета), Аляксандр I прымаў тытул караля польскага і абяцаў дараваць гэтай дзяржаве *«тую ўнутраную працялегласць, якую прызнае падыходзячай»*. Позіркі былі звернуты на тэрыторыю былога ВКЛ. Польская шляхта імкнулася далучыць яе да Каралеўства Польскага, каб тым самым адрадзіць старую Рэч Паспалітую» [215, с.95 — 96].

Вось што пісаў А.Чартарыйскаму ў чэрвені 1815 г. А.-Т.Касцюшка: «Павінны ўвесь час дзякаваць імператару за

адраджэнне польскага імя, якое было згублена, але імя само не становіць народа». Далей адзначыў, што толькі вяртанне краіны да межаў Дзвіны і Дняпра можа стварыць «раўнавагу і станоўчае сяброўства з расіянамі». Ён выгаворваў Чартарыйскаму: «Павінны замаўчаць аб застаўшыхся *нашых братах пад расійскім урадам!* Наша сэрца ўздрагвае і баліць, што не злучаны яны з другімі. *Без іх, прашу знайдзі 11 ці 10 мільёнаў людзей, што маглі складваць Каралеўства Польскае*, адпаведна са святымі словамі самаго імператара?» [576, с.82,83]. Чартарыйскі, які прысутнічаў на Венскім кангрэсе, прыкладаў намаганні, каб павялічыць тэрыторыю Каралеўства Польскага за кошт не толькі зямель Літвы і Белай Русі, але ўсіх васьмі заходніх губерняў Расійскай імперыі, вяртанне якія, на яго погляд, пакладзе пачатак адраджэння Польшчы [605, с.91].

Трыццаць першага кастрычніка 1815 г. Аляксандр I прыехаў у Варшаву. Усе чакалі ад яго галоўнага — пашырэння «унутранай працялегласці» паводле Венскага трактата. Рускі відавочца сведчыць: «Палякі навогул глядзелі на нас пахмурна. Яны выдаваліся незадаволенымі і нават не хавалі ў размовах, што ім павінны *вярнуць Магілёў, Віцебск, Валынь, Падолію і Літву*». Пытанне гэтае падняў у час сакрэтнай аўдыенцыі дэпутатаў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў князь М.Агінскі. Аляксандр I прасіў не кампраметаваць яго і не ставіць у складанае становішча. «Неабходна, — гаварыў ён, — каб усе былі ўпэўнены ў тым, што я гэта раблю па свайму пачыну, што менавіта я жадаю гэтага». Аляксандр I абяцаў спалучыць заходнія губерні з Каралеўствам Польскім тады, калі яны ўмацуюць сувязь з імперыяй пры поўным даверы і згодзе паміж народамі [215, с.97].

Пэўныя крокі ў гэтым напрамку былі зроблены. У 1816 г. тры літоўскіх губерні, а таксама Валынская, Падольская і Мінская атрымалі губернатараў-палякаў. 1(13) ліпеня 1817 г. быў аддадзены высачайшы загад аб арганізацыі асобнага Літоўскага корпуса пачаткова з дзвюх пяхотных дывізій (№27 і №28, былой №4) і 29-й артылерыйскай брыгады (схема Д.4.1.). У гэтым жа годзе да корпуса далучылі восем лейб-гвардзейскіх палкоў. У 1818 г. 1-ю ўланскую дывізію перайменавалі ў Літоўскую і ўключылі ў Літоўскі корпус. У наступным годзе апошні папоўніўся 27-й арт. брыгадай (яна разам з былой 29-й склала Літоўскую арт. дывізію), дзвюма асобнымі батарэямі (коннай №3 і пешай №5). У 1820 г. у складзе корпуса з'явілася

спецыяльная абозная брыгада, у 1824 г. — Гродзенскі гусарскі полк і Літоўскі піянерны батальён. Пасля руска-турэцкай вайны Літоўскі корпус быў перайменаваны ў VI армейскі корпус, а пасля Лістападаўскага паўстання — расфарміраваны [437; 500; 56, с.15–16; 291, т.34, с.438].

Пасля выхаду ўказа аб стварэнні Літоўскага корпуса Кс.Друцкі-Любецкі пісаў А.Чартарыйскаму: «У гэтым, князь, убач, па крайней меры, што манарх не проста ў Парыжы, Вене і Варшаве падаваў надзеі злучэння, а дзе першы крок ад войска пачынаецца, там слабага фундамента няма» [605, с.190]. Крок да далучэння зямель Беларусі да Каралеўства Польскага ўбачыў у арганізацыі Літоўскага корпуса таксама М.І.Тургенеў. У сваёй кнізе «Россия и русские» ён слушна пісаў: «...Усе намеры Аляксандра І далучыць да Царства Польскага старыя польскія вобласці мелі сваім вынікам стварэнне новага корпуса арміі, складзенага з салдат, якія былі ўраджэнцамі гэтых абласцей. Калі недзе ўсё заканчваецца спевамі, дык у Расіі быццам бы ўсяму наканавана заканчвацца салдатамі. З гэтай мэтаю з усіх палкоў арміі набралі людзей, якія нарадзіліся ў Літве і іншых польскіх губернях; стварылі корпус, які назвалі Літоўскім; яму былі дадзены асобы сцяг і форма, якая адрознівалася ад формы рускай арміі, і грамадства ўбачыла ў гэтых мерах указанне на намеры імператара яшчэ больш пашырыць Царства Польскае» [381,с.276]. З такім вынікам згодныя рускі даследчык М.І.Каробка і польскі гісторык В.Касякевіч [175,с.196; 601,с.43].

Погляд Аляксандра І на землі былога ВКЛ праявіўся ў камплектаванні асобнага Літоўскага корпуса. За выключэннем гвардзейскіх палкоў рэкруты набіраліся з ураджэнцаў пяці заходніх губерняў Расійскай імперыі: сялян Валынскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Падольскай губерняў і Беластоцкай вобласці. Агульная колькасць дасягала 40 тысяч чалавек [41, с.15]. Форма таксама падкрэслівала асаблівасць Літоўскага корпуса — яна была не такой, як у рускай арміі, а падобнай да польскай. Знешнім адрозненнем мундзіраў з'яўляліся: у пехацінцаў — сярэбраны прыбор, жоўты колер каўнера, абшлага і выпушкі (гвардзейцы і грэнадзёры мелі яшчэ і жоўтага колеру лацканы) і чорныя крагі; ва ўланаў — сярэбраны прыбор, прыкладное сукно на мундзірах і шапках адпаведна па палках: малінавае, белае, жоўтае, блакітнае; у артылерыстаў — падобныя мундзіры, але з чорнымі лацканамі. На штандарах і шапках была выява «Пагоні» [56, с.15-16; 605, с.190].

Размяркоўваўся асобны Літоўскі корпус якраз на той тэрыторыі, якую, спадзяваліся польскія патрыёты, Аляксандр I далучыць да адноўленай Польшчы. Напрыклад, паглядзім на дыслакацыю Літоўскай уланскай і 24-й пяхотнай дывізій, артылерыйскіх рот у 1822 г. Штаб-кватэры знаходзіліся: 1-й брыгады ўланскай дывізіі, Польскага ўланскага палка — у Слуцку; Татарскага ўланскага палка — у Нясвіжу; Літоўскай уланскай дывізіі, яе 2-й брыгады і Літоўскага ўланскага палка — у Слоніме; Валынскага ўланскага палка — у Навагрудку; 24-й пяхотнай дывізіі і яго 3-й брыгады — у Гродне; 1-й брыгады і Брэсцкага палка — у Брэст-Літоўску; Беластоцкага палка і яго 1-га батальёна — у Кобрыне; 2-й брыгады — у Вільні; Літоўскага палка — у Лідзе; 47-га егерскага палка — у Ваўкавыску; 48-га егерскага палка — у Гродне.

Палкі кватаравалі ў наступных паветах: 7 эскадронаў Польскага ўланскага палка — у Слуцкім; два эскадроны Татарскага ўланскага палка — у Ігуменскім, два — у Слуцкім, тры — у Мінскім; два эскадроны Літоўскага ўланскага палка — у Слуцкім, два — у Навагрудскім, тры — у Слонімскім; 7 эскадронаў Валынскага ўланскага палка — у Навагрудскім; конныя артылерыйскія роты — у Дзятлаве (№29) і Дзярэчыне (№30); Брэсцкі пяхотны полк — у Брэсцкім; Беластоцкі і Літоўскі пяхотныя палкі — у Кобрынскім; Віленскі пяхотны полк — у Лідскім; 47-ы Егерскі полк — у Ваўкавыскім; 48-ы Егерскі полк — у Гродзенскім і Сакольскім; чатыры артылерыйскія роты — у Пружанскім [250, ф.1, воп.1, спр.2803, а.132-138; ф.6, воп.1, спр.201, а.1,2].

Камандавацць асобным Літоўскім корпусам па ўказу цара даручалася галоўнакамандуючаму арміі Каралеўства Польскага вялікаму князю Канстанціну Паўлавічу. Такім чынам, як слушна піша даследчык М.І.Каробка, «усталёўвалася як бы свайго роду асабістая унія паміж ваеннымі сіламі Польшчы і Літвы». Гэтага погляду прытрымліваўся і польскі гісторык Ш.Аскеназы. 29.06. (11.07.).1819 г. Сенату быў дадзены царскі ўказ: «Галоўнакамандуючаму Літоўскага корпуса Яго Імператарскай Вялікасці цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу, усеміласцівейша прадстаўляю над губернямі: Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Валынскай, Падольскай і Беластоцкай вобласцю ўладу галоўнакамандуючага дзейнічаючай арміі, на аснове пастановы аб ёй, студзеня 27-га 1812 г. выдадзенай, надалей да нашага ўказу» [156, с.134-135; 543, с.357-358].

Па названай пастанове 1812 г. кампетэнцыі галоўнакамандуючага дзеючай арміі пашыраліся настолькі, што, апрача сферы чыста вайсковай, захаплялі цывільную. З гэтага часу генерал-губернатар і губернатары вышэйпералічаных губерняў і Беластоцкай вобласці ў грамадзянскіх справах павінны былі звяртацца да Канстанціна Паўлавіча ў Варшаву і дзейнічаць адпаведна яго загадам. Адзначым і той аспект, што гэтыя тэрыторыі такім чынам знаходзіліся як бы на ваенным становішчы. Акрамя таго, будучы пад уладаю асобы, якая, хаця і не афіцыйна, але кіравала Каралеўствам Польскім, яны як бы злучаліся ў адміністрацыйных адносінах з апошнім. Такое становішча беларускіх і іншых зямель уяўляла сабой першы крок да юрыдычнага злучэння тэрыторыі былога ВКЛ з Польшчай, як гэта было да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Для пацвярджэння сказанага прывядзем адзін факт з грамадска-палітычнага жыцця Беларусі таго часу. Пасля забароны дзейнасці езуітаў у Расійскай імперыі Канстанцін Паўлавіч 16 (28).08.1822 г. прадпісаў віленскаму ваеннаму і грамадзянскім губернатарам «вверенных ему губерний»:

1) Мець нагляд, каб бацькі больш не адпраўлялі сваіх сыноў для адукацыі ў замежных езуіцкіх вучылішчах;

2) патрабаваць ад бацькоў, якія ўжо вучаць сваіх дзяцей у гэтых вучылішчах, каб яны вярнулі іх адтуль да сябе;

3) заўсёды патрабаваць ад тых, якія адпраўляюць сваіх дзяцей за мяжу для навучэння, каб яны ў сваіх просьбах аб пашпартах аб'яўлялі, куды і ў якое вучылішча іх адпраўляюць». 10(22).03.1823 г. ужо віленскі ваенны губернатар аддае падобны загад гродзенскаму і віленскаму губернатарам [314, т.1, стб.1684].

У Нацыянальным гістарычным архіве РБ у Гродне ёсць спецыяльны фонд №6 «Гродзенская канцылярыя грамадзянскіх спраў галоўнакамандуючага асобным Літоўскім корпусам цэсарэвіча», 98% спраў якой прысвечана прашэнням і скаргам сялян, гараджан, шляхты. Падобны фонд (№377) захаваўся і ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы. Абедзве канцылярыі працавалі ў 1822—1830 гг. [250, ф.6, воп.1; 97, ф.377].

У 1818 г. на першым польскім сейме Аляксандр I зноў паабяцаў палякам далучыць Літву да Каралеўства Польскага. Пасля сейма ён сустрэўся ў Царскім Сяле з М.М.Карамзіным і падчас адной размовы даверліва прызнаўся яму ў тым, што «хоча аднавіць Польшчу ў яе старажытных межах, гэта значыць

далучыць да яе Заходнюю Расію». На гэта Карамзін адказаў сваёй «Запиской» (1819), у якой між іншым напісаў: «Мы пазбавіліся б не толькі цудоўных вобласцей, але і любві да цара, астылі бы душою да айчыны...» [гл.: 181, с.214-215]. У час трэцяга сейма ў 1825 г. Аляксандр I у прыватнай размове з братам Канстанцінам Паўлавічам пацвердзіць гэтае. Але хутка абставіны зменяцца ў сувязі са смерцю Аляксандра I, паўстаннем дзекабрыстаў і прыходам да ўлады Мікалая I.

Апошні ў маніфесце да палякаў ад 25 снежня 1825 г. прысягнуў, што ўтрымае канстытуцыю, але адзначыў, што «Літва — для Расіі». Сын старшыні Польскага Сената ўспамінаў: «У атачэнні цара панавала найвялікшая абыякавасць на ўсё, што цярпела Польшча... Маскалі мелі перакананне, што, калі б палякі ўзяліся бы за зброю, дык далі бы Маскве жаданы повад да зліквідавання да канца асобнага існавання, асобных Статутаў і войска, повад да канчатковага далучэння іх да імперыі» [601, с.53; 576, с.89]. Такая магчымасць прадставіцца пасля падаўлення Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг. У 1831—1848 гг., як выказаўся гісторык Фелдман, «пачуццямі і розумам Польшча падзялілася на два света, сумесным было ім няшчасце» [576, с.127].

«Дэмакратычнае таварыства», паўстаўшае толькі ў сакавіку 1832 г., ужо 8 мая выступіла з пратэстам супраць трактатаў аб падзелах Рэчы Паспалітай у перыяд з 1772 па 1815 г. Нават непрыхільны да яго А.Гілер прызнае дадзены акт важным фактам, бо «з гэтага часу ў нацыянальнай палітыцы стала догмаю права да незалежнага быту ўсёй Польшчы і ўпамінанне аб Айчыне ў межах перад падзеламі». У маніфесце «Дэмакратычнага таварыства» 1836 г. гаварылася: «Польскі народ, вынуты з усіх правоў, цемнатою, галеччу і няволяю прыціснуты, даўно вырваную яго зямлю дагэтуль апрацоўвае ў крывавым поце на чужую карысць і дагэтуль яшчэ ў *правінцыях даўніх, захопленых Масквою*, як уласнасць неаддзеленая ад зямлі, разам з ёю прадаваемы» [цыт. па: 576, с.162,169].

У міжрэвалюцыйны час на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай (а значыць, і на Літве і Белай Русі) пачалі распаўсюджвацца ідэі збліжэння славянскіх народаў і стварэння славянскай федэрацыі. Напрыклад, П.Сцягенны ў сваім творы «Трэба толькі жадаць» вызначыў межы будучай польскай дзяржавы такім чынам: «Мы спынімся на Карпатах і берагах Днястра, на Дняпры і на Дзвіне; Рыга, Кралевец і Гданьск будуць польскімі. Правы бераг Одры аддзеліць нас ад Захада. Вызвалім

Літву, Жмудзь, Падолію. А славяне, якія знаходзяцца пад скіпетрам аўстрыйскім і прускім, да нас далучацца самі» [110, с.50].

Страціўшыя дзяржаўнасць палякі бачылі яе то пад пратэктаратам Францыі, то пад апекаю Расіі, імкнуліся адыграць значную культурную ролю ў славянскім свеце. Тое ж «Дэмакратычнае таварыства» ад ідэі цэнтралістычнай (пабудаванне Польшчы ад мора да мора ў гістарычных межах) пераходзіць да ідэі федэрацыі славянскіх народаў. К.Лібельт у 1850 г. пісаў у «Польскім Дзённіку» (Познань): «Наша Польшча вялікая і магутная, ужо не паўстане як дзяржава адналітая з нацыянальным урадам, які Літвою, Руссю і Прусамі, як калісьці будзе панаваць, але паўстане як федэрацыя гэтых рознапляменных краёў. Будучая славяншчызна не можа быць іншым, толькі федэрацыяй... Узор такой саюзнай дзяржавы паказалі нам Злучаныя Штаты Амерыкі» [661, с.186]. «Гатэль Ламберт» на чале з Чартарыйскім арыентаваўся на злучэнне славян пад урадавай цэнтралізацыяй дынастыі Раманавых (з умовай вырвання яе з-пад уплыву нямеччыны), з гарантыямі для кожнага народа: захаванне традыцыйнай рэлігіі, мовы, вопраткі, хатніх і палітычных звычаяў, ліберальных дзяржаўных інстытутаў [576, с.205, 208]. Такое ж чакала і Беларусь у мяркуемай федэрацыі.

У 1849 — 1863 гг. арыентацыі польскага нацыянальнага руху змянялі адна другую, гледзячы на міжнародныя абставіны. З прыходам на трон Напалеона III ажывілася французская арыентацыя. У сваёй першай прамове пасля вяртання з выгнання ён гаварыў аб неабходнасці вайны за вольнасць Польшчы: «Менш зрабіць для Польшчы было бы з нашага боку недальнабачна, неўдзячна і — выбачайце мне за слова — подласцю». Але на справе ў адносінах да палякаў Напалеон III паводзіў сябе нерашуча, то нахіляў іх да сябе, то адхіляў, быў палавінчатым і слабым [576, с.314].

Пасля паражэння Расіі ў Крымскай вайне (1853 — 1856 гг.) праявіла сябе руская арыентацыя. Імператар Аляксандр II абапіраўся ў сваёй замежнай палітыцы на нацыянальны (народны) прынцып, які ўлічваў пажаданні і інтарэсы кожнага народнага арганізму, але ў заключаным Парыжскім міры аб Польшчы не было ні слова. У далейшым Расія чакала за Польшчу кампенсацыі на Чорным моры. У гэты час зноў падалі голас прыхільнікі славянскай федэрацыі, у якой знаходзілася месца Беларусі. На гэты раз абвясціў ідэю дэмакрат і рэспубліканец

Г.Каменскі: «Польшча, зломленая непаслухмянасцю Еўропы, павінна злучыцца з Расіяй». Эмігрант М.Лемпіцкі ў 1857 і 1860 гадах дасылаў да міністра замежных спраў А.М.Гарчакова мемарыялы з прапановаю расійскаму імператару заключыць унію паміж Польшчай і Расіяй. Тое ж пісаў граф Т.Дзялынскі, дадаючы, што прыкладам можа быць унія Літвы з Польшчай [576, с.327,33].

Такім чынам, Беларусь займала важнае месца ў польскім пытанні, але разглядалася рознымі плынямі польскага нацыянальнага руху аднолькава — як ягоная складальная частка. Ніхто: ні ўрады краін, ні польскі нацыянальны рух не ставілі пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі, незалежнай ад іншых (без уній з Польшчай ці з Расіяй). Імператары Напалеон і Аляксандр I спрабавалі разыграць «польскую карту», у якой немалую ролю адыгрывала менавіта Літва, зыходзячы толькі са сваіх інтарэсаў.

## 3.2. **«Польская» палітычная эміграцыя і яе эмісары на беларускіх землях**

Адным з важных палітычных фактараў у барацьбе польскага народа за вольнасць і незалежнасць з'яўляецца палітычная эміграцыя. Мы разглядаем яе, калі даследуем палітычную гісторыю Беларусі, таму што польскае пытанне закранала беларускія землі, як мы ўжо высветлілі ў папярэднім раздзеле дадзенай працы. «Польская» (маецца на ўвазе характар дзейнасці, а не этнічны склад) палітычная эміграцыя ўзнікла ў канцы XVIII ст. пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай і страты ёю незалежнасці. Для Беларусі можна вызначыць наступныя хвалі палітычнай эміграцыі:

- 1772 — 1774 гг. — Барская;
- 1792 — 1794 гг. — трэцямайская;
- 1795 — 1797 гг. — пасля паўстання пад кіраўніцтвам А.Т. Касцюшкі;
- 1812 — 1813 гг. — пасля ліквідацыі ВКЛ 1812 г.;
- 1820 г. — пасля закрыцця ордэна езуітаў у Беларусі;
- 1831 — 1833 гг. — пасля Лістападаўскага паўстання 1831 г.;
- 1855 — 1856 гг. — пасля Крымскай вайны.

Барская эміграцыя лічыцца першай польскай эміграцыяй, звязанай з барацьбою за незалежнасць. Яна была больш значнай па колькасці і больш трывалай, а таксама той, «якая спрабавала

рэалізаваць мэты, якія прызнаныя за істотныя (што не значыць, што слушныя) для быту «народа» ў тагачасным разуменні гэтага паняцця». **Месца эміграцыі** — Прусія (Бучын на Шлёнску, Глодаў), Аўстрыя (Прэтаў у Славакіі, Цешын (Шлёнск), Жымін у Венгрыі, Бранаў у Баварыі) [574,с.35]. На з'ездзе эмісараў у баварскім м. Ландсхут (11-14.12.1772 г.) прысутнічалі ліцвіны Войцех Сухадольскі, Юзаф Путкамер, Ігнат Гедройц, Альбрэхт Радзівіл, Кароль Радзівіл, Юзаф Сапега, Міхал Агінскі, Міхал Ян Пац, Іахім Патоцкі [574, с.37]. Сярод эмігрантаў першай хвалі вядомымі былі такія асобы, як: А.-Т.Касцюшка (з 1776 па 1784 г. служыў у амерыканскай арміі і стаў нацыянальным героем ЗША), князь Лубенскі і А.Пац, якія не захацелі прысягнуць Кацярыне II (за што паплаціліся секвестрам маёнткаў [425, с.105-107; 144, с.252].

Трэццямайскую эміграцыю склалі творцы канстытуцыі, актыўныя прыхільнікі рэформ, вайскоўцы, якія падалі ў адстаўку з-за перахода караля на бок таргавічан. Выязджалі яны ў Саксонію, Аўстрыю, Францыю. Восенню 1792 г. у Ліпску аказаліся М.Забэла, А.-Т.Касцюшка, Ю.-У.Нямцэвіч і іншыя [574, с.42]. Тут і ў Дрэздэне ішла падрыхтоўка ўзброенага паўстання. Арыентаваліся на Францыю, але дапамогі не атрымалі. Эмісары падчас паўстання прыехалі на радзіму і сталі яго кіраўнікамі. У эміграцыі засталіся толькі тыя, хто выконваў спецыяльныя місіі.

Першая масавая хваля палітычнай эміграцыі адбылася пасля паражэння паўстання 1794 г. у Францыю, Саксонію (Ліпск, Дрэздэн), Венецыю (нейтральная краіна), Гановер, ЗША. Гэта былі не трапіўшыя праз палон у расійскія турмы і ссылкі дзяржаўна- палітычныя дзеячы, кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі паўстання, афіцэры і жаўнеры (20000 іх інтэрнавана ў Аўстрыі і 3000 — у Прусіі), цывільная інтэлігенцыя [574, с.42-43]. У эміграцыі апынуліся такія дзеячы ВКЛ, як: М.-К.Агінскі, рэферэндатар П. Бжастоўскі, генерал-лейтэнант, камандуючы літоўскай дывізіяй Р.Гейдройц, былы гетман вялікі літоўскі М.Забэла, А.-Т.Касцюшка, пасол Чатырохгадовага сейма ад Ашмянскага павету Я.Кацёл, Ю.Урсын-Нямцэвіч, літоўскі абозны К.Прозар, маршалак генеральнай канфедэрацыі ВКЛ К.-Н. Сапега, маршалак літоўскі Ст.Солтан [425, с.99-101,103,105-107,108-109; 74, с. 160,174-175].

Менавіта падчас гэтай хвалі эміграцыі пачалі ствараціца польскія легіёны. У 1796 г. «Польская дэпутацыя» (радыкальная арганізацыя польскіх эмігрантаў у Парыжы)

звярнулася да Дырэкторыі з ініцыятывай стварэння добраахвотных атрадаў з палякаў. Дырэкторыя аднеслася да гэтага без асобага спачування, а вось генерал Напалеон Банапарт, камандуючы французскай арміі ў паўночнай Італіі зацікавіўся ідэяй Я.-Г.Дамброўскага, бо яна давала магчымасць стварыць войска, якое ўскладніла бы становішча Аўстрыі ў тыле. У студзені 1797 г. урад Цызальпінскай рэспублікі (паўнаўладным правіцелем якой быў Напалеон) даў згоду на стварэнне ў складзе сваіх узброеных сілаў двух польскіх легіёнаў на чале з ген. К.Князевічам і ген. Ф.Рымкевічам пад агульным главенствам Я.-Г.Дамброўскага. За час існавання (да 1802 г.) у легіёнах праслужылі каля 25 тыс. салдат і 1 тыс. афіцэраў [573, с.141]. Сярод іх былі і выхадцы з зямель Беларусі, бо выдадзеная 20.01.1797 г. **«Адозва да палякаў»** распаўсюджвалася на ўсіх захопленых землях. Расійскі ўрад выдаў загад аб рэпрэсіях супраць тых, хто прабіраўся ў легіён [574, с.31].

Другая масавая хваля эміграцыі адбылася пасля перамогі рускіх войск у вайне 1812 г. Выехала Камісія Часовага ўрада ВКЛ, вайсковыя фармацыі, якія пасля баёў за мяжой засталіся ў эміграцыі ў Францыі. Толькі з Гродзенскай губерні эмігравалі 192 чал. Сярод іх: графы К. і Р.Тызенгаўзы, Ф.Ельскі, браты Ф. і Кс.Нарбуты, граф Л.Пац, графіня А.Патоцкая, кн. Д., М., К., Л.Радзівілы, граф А. Хадкевіч, Ф.Верашчака і Л.Путкамер, браты гр. С. і П.Грабоўскія, Ян Гарайн, Ст.Чапскі, Ю.Дэмбінскі, Г.Агінскі і іншыя [138; 5, кн.V, ч. 2, с.252].

13(25) сакавіка 1820 г. міністр духоўных спраў і народнай адукацыі А.М.Галіцын зрабіў даклад аб высылцы з Расіі езуітаў. У ім гаварылася: «выслаць езуітаў з Расійскай імперыі пад наглядам паліцыі і болей ні пад якім выглядам і найменаваннем не пушчаць іх у Расію..» [249, ф.1430, воп.1, спр.367, а.8-9]. Тым езуітам, хто не захоча выйсці з ордэна, дазволена было адправіцца за мяжу, куды захочуць, акрамя Каралеўства Польскага («якое не лічыцца заграніцаю»). Як прыклад эмігранта-езуіта з Беларусі можам прывесці Ф.Дзеружынскага, выкладчыка Полацкай акадэміі, які 7.11.1821 г. прыбыў у Філадэльфію і да сваёй смерці ў 1850 г. займаўся пашырэннем каталіцкай адукацыі, адчуваў сябе беларусам [161, с.45-46].

Самай масавай была пятая хваля эміграцыі пасля Лістападаўскага паўстання 1831 г. «Польскі мяцеж скончыўся, — пісаў Шыльдер, — але для Расіі жаданы спакой суправаджаўся новым злом: у Еўропе з'явілася польская эміграцыя. Дзесяткі

тысяч чалавек рассеяліся па ўсяму свету, страціўшы айчыну; інтарэсы іх і зведаныя бедствы патрабавалі выстаўляць сябе і Польшчу ахвярамі тыранства і ганенняў; яны панеслі сваю нянавісць і лямант супраць Расіі ў Парыж, Лондан, Бельгію і Амерыку» [421, с.224]. Даследчыца Н.П.Міціна падлічыла, што па Гродзенскай губ. больш усяго эмігрантаў было з Навагрудскага пав. (42 чал.), затым ішоў Слонімскі пав. (24), Гродзенскі (16), Ваўкавыскі і Лідскі (па 15), Пружанскі (8), Брэсцкі (7), Кобрынскі (4). У Мінскай губерні выдзяляюцца эмігранты з Дзісенскага (29 чал.) і Вілейскага (26 чал.) паветаў, па 5 чал. было з Мінскага і Барысаўскага павета, 2 чал. — з Рэчыцкага і па 1 чал. з астатніх паветаў. Эмігрантаў па Віленскай губ. было найменш як раз у беларускіх паветах — Ашмянскім (15 чал.) і Браслаўскім (5 чал.). За мяжой усе гэтыя паўстанцы аказаліся пасля далучэння да рэгулярных польскіх войск, якія адышлі да прускай мяжы. Болей усяго выехалі ў эміграцыю з Гродзенскай губ. (258 чал.), менш — з Мінскай губерні (193), Віленскай губерні (54). Большасць з іх былі памешчыкамі (100), шляхціцамі (99), афіцэрамі (72), дваранамі (38) [232, с.175, 180].

Архіўныя матэрыялы даюць нам магчымасць даведацца пра некаторых паўстанцаў з Беларусі. Напрыклад, намі знойдзены «Спіс польскіх выхадцаў з ураджэнцаў Гродзенскай губерні, якія адправіліся ў Амерыку». Тут ёсць пералік 78 чал. з указаннем іх прозвішчаў, месца паходжання, сацыяльнага становішча [250, ф.4, воп.1,спр.196, а.3-10]. З вядомых эмігрантаў пятай хвалі трэба ўспомніць камандзіраў партызанскіх атрадаў братоў Ст. і Я.Жылінскіх, братоў Клотаў, В.Красоўскага, К.Незабітоўскага, братоў Ф. і Л.Плятэраў, Ц.Пуслоўскага, Ст.Радзішэўскага, Ф. Кеневіча, Я.Ронка, Т.Тышкевіча, вядомага ў будучым літаратара А.Рыпінскага.

Цікава адзначыць, што большасць эмігрантаў аселі ў Францыі. Французскі народ прыняў іх спагадліва, а ўрад выдзеліў месцы для жыхарства і абавязаўся аказваць фінансавую дапамогу. Але не гэта было галоўным. Францыя «прыцягвала да сябе польскіх выхадцаў далёкім заравам сваіх рэвалюцыйных пажараў; палякі спяшаліся туды абагрэцца пасля загашанага пажара на радзіме» [48, с.5]. Спачатку ехалі ў Безансон, а адтуль за год рассяліліся ў Парыж і іншыя 24 эміграцкіх асяродкі. Пазней некаторыя выехалі ў Швейцарыю (Жэнева, Цюрых), Бельгію (Брусель), Англію (Лондан), ЗША.

Французскі ўрад стварыў камітэт дапамогі на чале з генералам Лафаетам, які асігнаваў на пенсіі для эмігрантаў 3 тыс. франкаў у год [151, с.15,18].

Пасля Крымскай вайны (1853—1856 гг.) з польскай дывізіі (1600 чал.), створанай М.Чайкоўскім і У.Замойскім на баку Турцыі са збеглых з расійскага войска або ўзятых у палон, у эміграцыю трапілі каля 1 тыс. чал. Большасць іх была з сялян або плебейскага паходжання з зямель Беларусі [574, с.81]. Польскі даследчык Калембка піша, што перад паўстаннем 1863 г. у Парыжы аселі каля 2-3 тыс. моладзі з «расійскага захопу» [589, с.204].

Эміграцыя выконвала функцыі неіснуючай польскай дзяржавы. Гэта была «Польшча ў выгнанні» [589, с.195]. Як пісаў С.Браткоўскі, «наша эміграцыя ёсць Рэчпаспалітая, ёсць злучаныя штаты Польшчы, мае роўных сабе грамадзян. Еўропа, калі нас так у рэчаіснасці не бачыць, прынамсі такія ў нас прынцыпы цэніць, поглядам гэтай Еўропы з'яўляемся мы Рэчпаспалітай маральнай, тым увасабленым ідэалам, які калі-небудзь народы маюць выканаць» [589, с.196]. У асяроддзі польскай эміграцыі нарадзілася ідэя місіі Польшчы, «прызначанай на прадвадзіцеля чалавецтва ў імкненнях да любві, справядлівасці, вольнасці» [557, с.420]. Найлепш гэтую ідэалогію выказаў А.Міцкевіч у «Кнігах польскага народа і польскага пілігрымства», названых сучаснікамі «Евангеліем Міцкевіча». Ён пісаў: «А кожны паляк у паломніцтве не называецца бадзягаю, бо бадзяга ёсць чалавек, які блукае без мэты; і не выгнаннік, бо выгнаннікам з'яўляецца чалавек, выгнаны загадам урада, а паляка не выгнаў ягоны ўрад. Паляк у паломніцтве не мае яшчэ свайго імя, але будзе гэтае імя яму потым дадзена, як і прыхільнікам Хрыста імя пазней было дадзена» [625, с.45; 673, с. 133,135-136]. У рэчышчы польскай місіі трэба разглядаць і польскія легіёны, ствараемыя ў гэты час. У іх панаваў дэмакратычны дух. Песня легіянераў «Мазурка Дамброўскага» стала польскім нацыянальным гімнам.

Эміграцыю 1831—1870 гг. прынята называць Вялікай эміграцыяй. Яе дзейнасць можна падзяліць на 5 этапаў:

1. 1831 — 1834 гг. — надзеі на дапамогу народаў і прадстаўляючых іх тайных рэспубліканскіх таварыстваў. Перыяд спробаў арганізацыі адзінай улады для ўсёй эміграцыі.

2. 1834 — 1837 гг. — новая канцэпцыя вызвалення Айчыны на падставе асабістых народных сілаў. Перыяд спрэчак,

дактрын і арганізацыйнага хаосу. У канцы дамінуючую ролю сталі адыгрываць чатыры саюзы: Грамада польскага народа, Дэмакратычнае таварыства (1532—1862 гг.), Саюз польскай эміграцыі, чартарыжцы (Гатэль Ламберт).

3. 1837 — 1846 гг. — у праграму вызвалення асабістымі сіламі ўключаны прапагандысцкая дзейнасць, падрыхтоўка вайсковых спецыялістаў, дзейнасць эмісараў і агентаў на тэрыторыі былой РП. Перыяд стабілізацыі ідэйнай і арганізацыйнай.

4. 1846 — 1849 гг. — вяртанне канцэпцыі адраджэння Айчыны з дапамогаю збунтаваных народаў, перыяд удзелу палякаў у розных рэвалюцыях таго часу, у тым ліку на землях былой РП. На палітычна-арганізацыйнай сцэне засталіся толькі Дэмакратычнае таварыства і Гатэль Ламберт.

5. 1850 — 1862 гг. — перыяд, які можна лічыць мастом паміж эміграцыямі паслялістападавай і пасластудзенскай [589, с.208-209].

Дадзім невялікую характарыстыку двум найбольш уплывовым палітычным цэнтрам польскай эміграцыі, бо яны вызначалі адносіны да Беларусі і яе месца ў адраджаемай Рэчы Паспалітай. Адно з іх — Дэмакратычнае таварыства, якое ў 1834 г. налічвала 924 сябра, у 1836 г. — 1618, а ў 1848 г. — 2105 [557, с.415; 589,с.214]. Яно было найбольшым па колькасці і найлепш арганізаваным. У сваёй працы кіравалася прынцыпамі выдадзенага ў 1836 г. маніфеста. На чале Дэмакратычнага таварыства стаяла Цэнтралізацыя, якая строга выключала са сваіх шэрагаў парушальніка праграмы. Па характару была больш ліберальнай арганізацыяй, чым дэмакратычнай [681, с.11-12, 73-84]. Падрыхтавала паўстанне 1846 г., актыўна дзейнічала ў час «Вясны Народаў», стварыла за 30 гадоў існавання мадэль рэспубліканскай і дэмакратычнай Польшчы.

Вакол А.Чартарыйскага, а пасля яго смерці (15.07.1861 г.) пры яго сыне Уладзіславе групаваліся чартарыйцы, кіраўнічая група якіх была абкружана рознымі палітычнымі, культурнымі і дабрачыннымі арганізацыямі [589, с.214; 654, с.37]. У Гатэле Ламберт збіраліся польскія манархісты, знакамітыя асобы ў эміграцыі, нават колер французскай арыстакратыі. Прытрымліваліся Канстытуцыі 3 мая і Венскага трактата 1815 г., разлічвалі на дапамогу іншых краін у адраджэнні Польшчы. Каб падтрымаць вайсковы дух, рассылалі эмігрантаў усюды, дзе змагаліся супраць дэспатызму.

З 10 снежня 1831 г. па 1834 г. у Парыжы існавала грамадска-палітычная арганізацыя пад назваю «Таварыства Літоўскае і Рускіх зямель» (ТЛіРЗ), створаная спачатку з эмігрантаў — ураджэнцаў Беларусі і Літвы на чале з Ц.Плятарам, а з сакавіка 1832 г. — таксама і з выхадцаў Валыні, Падоліі і Украіны. Старшынёй таварыства быў маркіз М.-Ж.-П.Лафайет, намеснікам (з 2.12.1832 г.) — А.Міцкевіч (24.09.1832 г. выбраны начальнікам гісторыка-літаратурнай секцыі). Адпаведна Статуту мэтамі ТЛіРЗ з'яўляліся падтрымка землякоў-эмігрантаў і ўмацаванне непарыўных сувязей гістарычнай Літвы з Каралеўствам Польскім («Не хочам Літвы без Польшчы, як Польшчы без Літвы»). Для здзяйснення мэтаў быў створаны ў лютым 1832 г. Літоўскі вайсковы камітэт, які складаўся з былых камандзіраў лакальных паўстанняў 1831 г. Ён займаўся наданнем вайсковых чыноў заслужаным паўстанцам-ліцвінам, ад чаго залежала сума фінансавай падтрымкі французскага ўрада. Ажыццяўляўся збор «матэрыялаў да біяграфіі ўсіх Палякаў, якія на працягу барацьбы за незалежнасць, ад канфедэрацыі барскай да канца апошняй рэвалюцыі, прынялі пакуту за нацыянальную справу», а таксама матэрыялаў для гістарычнага і статыстычнага апісання Лістападаўскага паўстання на тэрыторыі былога ВКЛ. З заклікам пісаць успаміны звярнуўся 1.11.1832 г. А.Міцкевіч у «Адозве да землякоў». Займалася таварыства і падтрымкаю народнасцяў, якія пражываюць на Беларусі, Літве і Украіне, бо лічыла неабходным іх еднасць у барацьбе з царызмам. Сябрамі Т. былі: І.Лялевель, І.Дамейка, С.Ворцель, Ю.-Б.Залескі, Я.Янушкевіч, А.Елавіцкі, М.Валовіч і іншыя. Адным з галоўных мерапрыемстваў ТЛіРЗ было святкаванне гадавіны з дня паўстання 1830-1831 гг. у «забраных краях», якія лічылі «прыгожай палавінай Рэчы Паспалітай». Таварыства скончыла сваю дзейнасць пасля смерці актыўных сяброў М.Акелевіча, Ф.Бурбы і Лафайета [660, с. 22-23; 624, с.138; 678, с.135; 557, с.417].

Дэмакратычнае таварыства і Гатэль Ламберт распаўсюджвалі ідэі адраджэння гістарычнай Польшчы на ўсіх былых землях РП. Іх погляды на месца Беларусі былі аднолькавыя: межы новай краіны ўключалі беларускія землі («забраны край»), няпольскі характар насельніцтва адмаўляўся. Працытуем на гэты конт радкі артыкула, апублікаванага 10.10.1861 г. у «Пшеглёндзе»: «Мы ніколі не выступім, як звёны аднаго федэратыўнага ланцуга, складзенага з Польшчы, Літвы, Украіны, Масквы, а выступім як Польшча 1772 года, і гэта наш

ультыматум, ад якога не мае права адысці ні адзін паляк. Калі вы бачылі палякаў, якія думаюць інакш, яны далі гэтым доказ слабога або недасведчанага патрыятызма» [цыт. па: 390, с.169].

Такія погляды былі ў час пад'ёму нацыянальнага руху ў Польшчы і Беларусі. А вось што думаў Т.Крэмпавецкі, былы сакратар клуба Патрыятычнага таварыства 1830 — 1831 гг., а ў эміграцыі спачатку сябра польскага Нацыянальнага камітэта, а з сакавіка 1832 г. — польскага Дэмакратычнага таварыства. У 1834 г. у Бельгіі ён выдаў артыкул «Нацыянальнасць» («Цэнтралізацыя»), у якім (будучы рэвалюцыянерам-дэмакратам!) пісаў: «Польшча мае патрэбу ў дыктатарскай арганізацыі, у дыктатуры ідэі. Яна ліквідавала бы назвы літвіна, жмудзіна, русіна, бо гэта злашчасная ідэя — дзяліць Польшчу на правінцыі... Еўропа не ўяўляе сабе іншай Польшчы, акрамя былой, у межах да 1772 г.» [134, т.ІІ, с.423-424]. Другі дзеяч Дэмакратычнага таварыства Л.Мераслаўскі ў адной з прамоў 1845 г. гаварыў: «Ідэалам для нас з'яўляецца Польшча ў межах 1772 г., бо столькі патрэбна гэтай дзяржаве прасторы і паветра, каб быт яго быў угрунтаваны і забяспечаны ад усялякіх пагроз і выпадкаў...» [591, с.170].

Чартарыйцы згаджаліся з такімі выказваннямі. Праз свой орган — часопіс «3 Мая» — яны сцвярджалі, што для поўнага поспеху рэвалюцыі патрэбен кароль, які «аднолькава будзе панаваць у Вільні, Кіеве, у Львове і ў Познані, як і ў Варшаве, які б неадкладна прасунуў войскі ў межы старажытных сваіх уладанняў у Літве, Расіі, Прусіі, заваяваных непрыяцелем..» [48, с.74]. У трактаце аб народным паўстанні і вядзенні партызанскай вайны, апублікаваным у часопісе, гаварылася: «трэба звярнуць увагу на пункты асабліва важныя, такія, як вузлы зносін, вельмі цудоўных у гэтай краіне бесперастанных парадаў, а менавіта: на поўначы ад Палесся: Шаўлі, Вільну, Докшыцы, Віцебск, Мінск, Нясвіж, Слонім, Пінск» [48, с.76].

З вышэйсказанага зразумела, чаму эміграцыя была заклапочана ўладкаваннем правільных і непарыўных зносін з землякамі. «Гэтыя зносіны павінны былі заключацца ў дастаўленні самых падрабязных мясцовых звестак з Польшчы, Заходняга края Расіі, Познані, Галіцыі, Кракава, у пераўтварэнні ў грошы ўсёй пакінутай эмігрантамі маёмасці, якую можна было б выратаваць і ў пераводзе капіталаў за мяжу» [48, с.31]. Праз польскае насельніцтва пруска-аўстрыйскага захопу, Галіцыю і вольны горад

Кракаў ажыццяўлялася сувязь эміграцыі з цэнтральнымі і ўсходнімі польскімі землямі і з землямі Беларусі [574, с.71].

Сувязь з Беларуссю падтрымлівалася таксама праз карэспандэнцыю. У 1834 г. лідскі земскі спраўнік дакладаў губернатару М.Мураўёву, што памешчык Ст.Лясковіч, які жыве ў в.Няцэчы Лідскага пав., атрымлівае лісты ад сваяка І.Дамейкі (у 1833 г. 2 ці 3 лісты). «…Сказанной Домейко в умах здешних жителей приобрёл себе большое доверие и на счет его ума судют с признательностью», — пісаў спраўнік [250, ф.1, воп.27, спр.523, а.1 адв.]. Адам Шукевіч — уладальнік Наваельні (Слонімскі пав.) дастаўляў лісты гр.Чапскаму ў Станкава альбо яго паверанаму Андраноўскаму і іншым [250, ф.1, воп.27, спр.524, а.5 адв.]. Былы засядацель Гродзенскай грамадзянскай палаты Пратасевіч адрасаваў атрыманы ліст Міхала Ходзкі з Дрэздэна Палітальскаму, які меў маёнтак Мількаўшчына пад Гродна [250, тамсама, а.6].

Літоўскі генерал-губернатар, генерал-ад'ютант князь М.Даўгарукаў 11 лістапада 1834 г. пісаў гродзенскаму губернатару генералу М.Мураўёву, што польскія рэвалюцыянеры з Каралеўства Польскага звязаны з жыхарамі заходніх губерняў і праз іх распаўсюджваюць «мятежные сочинения вне Империи издаваемые, через них получают собираемые в пользу выходцев деньги, переводимые к ним банкирскими ассигновками в Париж и Лондон» [250, ф.1, воп.27, спр.524, а.5]. На землях былога Вялікага княства Літоўскага распаўсюджвалася эміграцкая літаратура. К.Машкоўскі ў «Рукапісу ў турме» успамінае аб брашуры А.Міцкевіча «Кнігі польскага народу і польскага пілігрымства»: «В это же время, поныне неизвестная в институте, а может быть и в целой Академии (медыка — хірургічнай. — *В.Ш.*), книга проблеснула не как молния, но как комета, ибо книга сия дала вновь сильнейший полет мыслям, бросила свежие уголья на очаг молодого духа. Это была первая часть пилигримства Польского народа, сочинения Мицкевича. Ещё таился страх в умах слабых, ещё свежи были в памяти несчастия мятежа и помнилось запрещение читать подобные книги. Поэтому на первый раз много успеха, что ещё несколько десятков прочло ее, и того более, что ещё несколько осмелились переписать, хранить у себя и сообщать товарищам. Это озарило высшим светом молодые умы…» [240, с.538]. Адам Міцкевіч пісаў у вершы «Exegi monumentum…» аб тым, што яго чытае моладзь у Навагрудку і Мінску, не лянуецца перапісваць ад рукі, што з

эміграцыі, нягледзячы на царскія пагрозы, на злосць вартаўнікоў, вязе ў Літву томікі працы Міцкевіча яўрэй [678, с.375].

У «Прадмове» да «Дэмакратычнага катэхізіса, ці Слова да народа, аб'яўленае Філарэтам Праўдоўскім» Г.Каменскі пісаў: «Ступай, маленькая кніжка, у край, прыгнечаны няволей, абліты слязьмі, дзе кожны дзень гінуць тысячы ахвяраў за вольнасць, дзе зямля нараджае Высоцкіх, Завішаў, Эрнбергаў, Канарскіх, ступай туды, куды я не магу пайсці за табой!..» [134, т.2, с.708]. У брашуры прапагандаваліся ідэі нацыянальна-вызваленчай народнай партызанскай вайны і выказваўся пратэст супраць феадальнага прыгнёту ў Польшчы і капіталістычнай эксплуатацыі ў Заходняй Еўропе [гл.: 134, с.708-798]. Удзельнік паўстання 1831 г. эмігрант Дзімітровіч зрабіў у 1839 г. тузін сярэбраных пярсцёнкаў, «кои должны служить знаком союза и на сей конец отправлены в западные губернии». На гэтых пярсцёнках былі гербы Польшчы і Вялікага княства Літоўскага: Арол і Пагоня, названы пярсцёнкі «Успамін аб Польшчы». У Варшаву дасталі з-за мяжы галантарэйныя рэчы, сярод якіх залатыя гузікі для манішак, якія складаліся з двух медальёнаў: на чырвоным быў Арол, на блакітным — Пагоня, над імі — карона, унізе — дата 29.09.1830 г. Абодва злучаны цэпкаю. Яшчэ чакалі падобныя шпількі [250, ф.1, воп.20, спр.33, а.5 адв.].

Аб ролі і значэнні польскай палітычнай эміграцыі складваецца дваістае ўражанне. З аднаго боку, слушна піша польскі даследчык Брукнер: «Гэта эміграцыя, адзіная ў сваім выглядзе, пратэставала супраць пераможца-тырана; не паддавалася дэспатызму ў імя вольнасці; давала прыклад народам, пазбаўленым вольнасці незапрошанай апекай «бацькоўскіх» урадаў, пагражала спакойнаму становішчу ўсякіх прыгнятальнікаў, неўтаймаваную нянавісць якіх сцягнула на сябе, у той час, як сама мацавала надзеі дэмакратаў і рэспубліканцаў усёй Еўропы» [557, с.408]. На працягу 1831—1871 гг. польская эміграцыя стварыла больш за 50 камітэтаў, саюзаў і таварыстваў; каля 70 розных навуковых і асветніцкіх, рэлігійных, вайсковых, культурных, дабрачынных і іншых установаў. Выходзіла ў свет у 1832 —1862 гг. каля 120 польскіх часопісаў і перыядычных выданняў [589, с.211, 251].

Але, з другога боку, мы прыйшлі да высновы, якую раней выказвала Г.Сяргеева: «Шляхам вымушанай і прымусовай эміграцыі гвалтоўна вырываліся з жыцця народа інтэлектуальныя, свабодалюбівыя, патрыятычныя сілы,

збядняліся яго творчыя магчымасці на бацькаўшчыне, што сталася тут адной з прычын зацягвання працэсу нацыянальнага самаўсведамлення» [353, с.4].

Адной з актыўных форм уплыву эміграцыі на айчынныя землі былі выправы эмігрантаў для арганізацыі партызанскага руху. Першай была так званая экспедыцыя палкоўніка Ю.Заліўскага, былога актыўнага ініцыятара Лістападаўскага паўстання і дзеяча Лялевелеўскага камітэта. Ён стварыў два патаемныя камітэты: выканаўчы пад назваю «Помства народа», які павінен быў падтрымліваць кантакты паміж эміграцыяй і партызанамі, якія дзейнічаюць на радзіме, і заканадаўчы, які займаўся падрыхтоўкай канстытуцыі для вызваленай Польшчы. Пад апошняй разумелася тэрыторыя, «замкнутая паміж Чорным і Балтыйскім морамі, Одрай, Дняпром і Дунаем» [660, с.9].

Ужо ў другой палове 1832 г. Заліўскі ўзяўся за арганізацыю экспедыцыі: вербаваў ахвотнікаў, накіраваў на радзіму агентаў для аналізу настрояў насельніцтва і падрыхтоўкі прыняцця эмісараў. Акрамя камітэта І.Лялевеля, экспедыцыю падтрымала Таварыства Літоўскае і Рускіх зямель, самыя вядомыя сябры Франка-польскага камітэта на чале з М.-Ж.-П.Лафайетам і Амерыканска-польскага пад кіраўніцтвам С.Гавэ. 4 студзеня 1833 г. на з'ездзе прадстаўнікоў усіх эмігранцкіх калоній у Ліоне праект Заліўскага быў апрабіраваны. Мэтаю яго было выклікаць збянтэжанасць на тэрыторыях, якія знаходзяцца пад панаваннем рускага цара, каб не даць яму магчымасці ўмяшацца ў «барацьбу народаў» на Захадзе. Для гэтага партызанскія атрады павінны былі знішчаць усялякімі спосабамі інстытуты захопніцкага ўрада і наогул ўсё тое, што падтрымлівала расійскую ўладу: нападаць на вайсковыя часці, касы, склады амуніцыі, перарываць камунікацыі.

Землі Беларусі падзяляліся на акругі, кожная па два паветы, куды прызначаліся камандзіры (па прынцыпу іх паходжання менавіта з гэтых мясцін) і выбіраліся 2-3 памочнікі. Акругу ў складзе Гродзенскага і Лідскага паветаў узначаліў Марцэлі Шыманскі, акругу са Слонімскага і Навагрудскага паветаў — МіхалВаловіч [гл.: 660, с.11-13; 127, с.22-23]. Сам Заліўскі павінен быў знаходзіцца на Магілёўшчыне. Пераход расійскай мяжы трэба было ажыццявіць не пазней 19 сакавіка 1833 г. Найбольшую актыўнасць выказаў М.Валовіч, былы ўдзельнік Лістападаўскага паўстання, сябра Таварыства Літоўскага і Рускіх зямель і Нацыянальнага Польскага камітэта ў Парыжы.

Прытрымліваўся дэмакратычных і рэспубліканскіх поглядаў, ішоў на родную зямлю з заклікамі вольнасці і роўнасці правоў для ўсіх людзей, у тым ліку вызвалення прыгонных сялян.

У пачатку сакавіка, а можа, нават у канцы лютага Валовіч быў на прызначаным месцы разам са сваім паплечнікам Ю.Яцкевічам. Да арышта Валовічу ўдалося стварыць невялікі атрад, які ў адрозненне ад іншых партызанскіх атрадаў эмісараў экспедыцыі Заліўскага складаўся ў асноўным з сялян (10 чалавек), сямёра з якіх былі уніятамі. Тры разы атрад Валовіча спрабаваў напасці на пошту з мэтай захопу грошай, але няўдала. Не давялося таксама наладзіць кантакты з суседнімі атрадамі. Садзейнічала няўдачам Валовіча яго хвароба. Напады на пошту і данос Яна Валовіча 13 мая 1833 г. прывялі да арганізацыі шматдзённых аблаў на Валовіча і іншыя партызанскія атрады. Па Гродзенскай губерні ў вышуках прынялі ўдзел звыш 10 тысяч салдатаў, паліцыянтаў і сялянаў [355, 4 мая, с.5; 562, с.8]. Аблавы праводзіліся таксама ў Мінскай губерні і ў Беластоцкай вобласці.

У выніку ўсе партызаны былі арыштаваны, у тым ліку іх камандзіры: 25 мая М.Валовіч, які пры затрыманні хацеў пакончыць жыццё самагубствам; 30 красавіка Ю.Яцкевіч — у м.Воранава; 6 чэрвеня М.Шыманскі — ў Вільні (па другіх дадзеных — у Гродне, пад мастом каля Швейцарскай даліны). Апошні дзейнічаў у Лідскім і Гродзенскім паветах: стварыў атрад з мяшчан, шляхты і аднадворцаў (каля 25 чал.); арганізаваў з гродзенскіх гімназістаў палітычны гурток і прыняў у іх прысягу на вернасць польскаму ўраду; спрабаваў сфарміраваць камітэт з мясцовых жыхароў (святароў, адвакатаў) для пастаяннай дапамогі і падтрымкі кантактаў з іншымі эмісарамі; планаваў забойства гродзенскага губернатара М.Мураўёва і нават напад аб'яднанымі сіламі на Гродна з мэтаю захопа арсенала [111, с.86; 334, с.32]. Відаць, пад уплывам Шыманскага ў маі-чэрвені адбыліся выступленні вучняў Гродзенскай дамініканскай гімназіі: напрыклад, яны разбілі вокны ў кватэры старшыні казённай палаты. За гэтыя «беспорядки» былі арыштаваны настаўнікі гімназіі па гісторыі і польскай славеснасці ксёндз І.Няцюнскі і па матэматыцы ксёндз Ф.Ляскоўскі, гісторыі і геаграфіі ў павятовым вучылішчы ксёндз А.Садкоўскі, а таксама 7 вучняў. Як бачна, асаблівасцю атрада Шыманскага быў значны ўдзел святароў (як каталіцкіх, так і ўніяцкіх). Акрамя названых, можна ўспомніць яшчэ двух дамініканаў з Гродна (Я.Сянкевіча і Ш.Гілеўскага), ксёндза з Азёраў А.Шымборскага, які павінен быў стварыць свой атрад, а таксама яшчэ 11 святароў [660, с.89-90].

Арыштаваных на Гродзеншчыне звозілі ў Гродна, дзе трымалі ў астрозе, размешчаным у былым езуіцкім кляштары. Пры арданансхаўзе камендант горада генерал Казлоў I стварыў Камісію ваеннага суда на чале з актыўным перасследнікам Валовіча маёрам Галенкоўскім. Следства па справе М.Валовіча пачалося 11 чэрвеня і доўжылася да 21, калі быў абвешчаны прысуд. У канчатковым варыянце ён быў зацверджаны 24 ліпеня віленскім генерал-губернатарам князем М.Даўгарукавым: Валовіч прыгавораны да павешання, 6 чалавек — да біцця кнутом і да ссылкі на катаржныя працы ў Сібір, 3 чалавекі — да біцця розгамі скрозь строй з 500 салдат, а потым Б.Панасюка павінны былі адаслаць у арыштанцкія роты Бабруйскай крэпасці, а А.Лапко і Ст.Сідаркевіча — у сібірскія лінейныя батальёны, М.Песакоўскі прыгавораны да біцця батагамі і ссылкі ў Сібір [660, с.55]. Другога жніўня Валовіч пры вялікім натоўпе мясцовых жыхароў быў павешаны каля Скідзельскай заставы, недалёка ад парахавых складоў. Ноччу яго патаемна захавалі ў невядомым нам месцы, каб, па словах Далгарукава, «не было тайных молений при теле преступника». З 14 чэрвеня па 17 ліпеня доўжылася следства над Ф.Шабанскім, Д.Аскерка, ксяндзом М.Якутовічам, замешаных па справе Валовіча; з 28 чэрвеня па 17 ліпеня — над Ю.Яцкевічам, Р.Цыплінскім, В.Астраменцкім; з 30 ліпеня па 7 жніўня — над доктарам І.Нагумовічам. Усяго ў Гродне прайшлі праз суд каля 150 чалавек. Усе пералічаныя справы былі па сутнасці адзіным паліцэйска-карным мерапрыемствам. У жніўні была створана Мураўёвым спецыяльная следчая камісія па справах эмісараў [660, с.56,57,72].

Прычыны правалу экспедыцыі Ю.Заліўскага былі як суб'ектыўныя, так і аб'ектыўныя: хвароба Валовіча, характар Заліўскага (па словах М.Берга, «падыходзіў для выбуху ў першыя хвіліны, але потым яго трэба было куды-небудзь прыбраць»); недахоп грошай на падрыхтоўку; адсутнасць цэнтралізаванага кіраўніцтва, дырэктыўных дакументаў і дапамогі з-за мяжы; улады Францыі, Аўстрыі, Расіі мелі спісы і прыкметы эмісараў і маглі арганізаваць праследаванне; барацьба арыстакратычнай партыі супраць левага і дэмакратычнага крылаў эміграцыі; непадрыхтаванасць беларускага краю да партызанскага руху ў выніку праследванняў пасля паражэння Лістападаўскага паўстання [562, с.3-7; 127, с.15; 660, с.70-71].

Катастрофа экспедыцыі Ю.Заліўскага прывяла да новай хвалі рэпрэсій. У ліпені 1833 г. быў абвешчаны царскі ўказ, дзесяць пунктаў якога тычыліся эмісараў і асоб, якія далучыліся да іх. Вінаватыя павінны былі аддавацца пад ваенны суд згодна з палявым статутам крымінальнага кодэкса, маёнткі шляхты канфіскоўваліся, злачынцы 1 і 2 катэгорый караліся смерцю, а 3 і 4 — высылкай у Сібір [660, с.68-69]. У студзені 1834 г. МУС даслала генерал-губернатару ліст, у якім загадвалася ўсіх збеглых і валацэнгаў, здольных да вайсковай службы, аддаваць у рэкруты, а няздольных — у арыштанцкія роты; малалетніх — у ваенныя кантаністы; замужніх і дзяўчат — на фабрыкі і пасяленні. Пад катэгорыю валацэнгаў падпадала значная колькасць дробнай, неаселай шляхты, якая не магла дакументальна пацвердзіць сваё паходжанне.

Дзеянні партызанскіх атрадаў абвастрылі пільнасць царскіх уладаў. З гэтага часу даносіць да мясцовых улад трэба было не толькі аб людзях без дакументаў і аб «замежных выхадцах», але і пра ўсіх новых асобах, якія з'яўляліся ў дадзенай мясцовасці. Для выезда ў Маскву або Пецярбург патрэбен быў спецыяльны пашпарт ад мясцовых урадавых устаноў. Забеспячэнне парадку і спакою было, акрамя паліцыі, ускладзена на земскіх абывацеляў і адміністрацыю [660, с.105]. Нягледзячы на дрэнныя вынікі экспедыцый эмісараў, яны мелі пэўнае значэнне на міжнароднае прызнанне польскай справы і паляпшалі кантакты эміgranцкіх кіруючых устаноў з урадамі еўрапейскіх краін.

Чарговым эмісарам, які з'явіўся на тэрыторыі Беларусі, быў Шыман Канарскі, удзельнік Лістападаўскага паўстання і экспедыцыі Ю.Заліўскага. Ён быў першым эмісарам ад дэмакратычнага крыла эміграцыі і нёс у Беларусь рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі: вольнасць і роўнасць; павага да чалавека, любоў чалавецтва; братэрства паміж людзьмі без розніцы саслоўя, веравызнання і нацыянальнасці; узаемная дапамога паміж славянамі і сумесная іх дзейнасць («як адзін чалавек») [134, т.2, с.230]. Канарскі, размаўляючы з асобамі, якія прыбывалі з Польшчы і Літвы, памылкова прыйшоў да высновы, што там адбыліся змены, што парасткі, пасаджаныя раней ім і іншымі эмісарамі, далі ўсходы, і вырашыў дабрацца туды. На гэтае ён атрымаў благаславенне Дэмакратычнага таварыства, сябрам якога, дарэчы, не быў [127, с.43].

Атрымаўшы ад І.Лялевеля рэкамендацыйныя лісты, а ад В.Жвіркоўскага — грошы, Канарскі вясной 1835 г. з пашпартам

на імя майстра гадзіннікавых спраў Букгарта Северса (Sievers) ці Хагельмана з Бельгіі разам з А.Залеўскім паехаў у Кракаў. Тут існаваў «Саюз польскіх народаў» (далей: СПН). Канарскі рэфармаваў яго па праграме «Маладой Польшчы». СПН прыняў рашэнне разгарнуць сваю дзейнасць на тэрыторыі ўсёй былой РП, у тым ліку на землях Беларусі. З гэтай мэтай вырашылі пасылаць эмісараў, якія павінны былі вербаваць сяброў для Саюза, выхоўваць свядомасць масаў, распаўсюджваць эміграцыйныя выданні, закладваць таварыствы і саюзы. Землі былой РП былі падзелены на пяць акруг, у тым ліку была Літоўска-Руская, якую ўзяў на сябе Канарскі [692, с.27; 127, с.49; 584, с.124].

Канарскі не збіраўся адразу падымаць узброенае паўстанне, бо разумеў, што пасля няўдачы Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг. і экспедыцыі Ю.Заліўскага гэта немагчыма, што шырокія народныя масы трэба падрыхтаваць, каб яны зразумелі заклік «Айчына, Вольнасць!», шляхту з'яднаць з народам, апошняга вызваліць з-пад панскага прыгнёту. Гэтай «апостальскай справай» і хацеў займацца Канарскі. На следстве 22 жніўня 1838 г. ён скажа: «Прыйшоў сюды з мэтаю кінуць думку, якая разгорнутая ў краі магла б калі-небудзь змяніць падставы сацыяльнага саюзу. За Польшчу з каралём, хаця б і Палякам, за Польшчу, напоўненую прывілеямі, не прысвячу ніводнай каплі крыві [цыт. па: 692, с.29]. У снежні 1835 г. Ш.Канарскі перайшоў рускую мяжу і накіраваўся на Валынь пад прозвішчам Дунін. Жыў на Палессі ў маёнтку Лісава, якое знаходзілася сярод густых лясоў і дрыгвы. Адсюль ездзіў у Вільна, дзе за некалькі дзён пазнаёміўся з адвакатам радзівілаўскай камісіі Ст.Казакевічам і некалькімі студэнтамі. З Вільні — у Лахву да доктара Петрашкевіча, потым нядоўга пабыў у Навіцкага ў Карэлічах Гродзенскай губерні. Тут Канарскі пазнаёміўся з мясцовымі жыхарамі, значная частка якіх уступіла ў СПН. Канарскі выбіраў тых, хто пасля яго ад'езду будзе самастойна пашыраць саюз і ствараць новыя арганізацыі. Так было ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях, на Валыні і Падоліі [692, с.31-32].

Сакратаром СПН па Пінскаму рэгіёну быў Антоні Ажэшка, па Слуцкаму — Ежы Брынк, па Навагрудскаму — Тамаш Булгак, па Кобрынскаму — Людвік Орда, па Мазырскаму — Еленскі. У іх задачы ўваходзілі павелічэнне колькасці сяброў Саюза, прыняцце ад іх прысягі, збор грошай, арганізацыя сходаў,

распаўсюджванне эмігранцкай літаратуры, лістоў, заклікаў, ідэй дэмакратызму. Распаўсюджвалі адозвы Канарскага «Да расійскага народу», «Да яўрэйскага народу», «Да жанчын», «Да моладзі», творы А.Міцкевіча «Кнігі народа...» і «Пан Тадэвуш», кнігу К.Ражыцкага «Паўстанне на Валыні», сачыненне Т.Чапскага «Цэсарэвіч Канстанцін», «Палітычны катэхізіс» Янкоўскага, «Параўнанне трох польскіх канстытуцый» Лялевеля, паэтычныя творы Славацкага, Махнацкага, Набеляка [692, с.35,36; 551, с.155,160].

У Мінску ў СПН уваходзілі Тамаш Булгак, ягоная жонка, Напалеон Яленскі, Людвік Орда, Францішак Тэрлецкі. У Гродзенскім Саюзе праявіў сябе сябра Канарскага Ежы Брынк [584,с.127]. У 1836 г. віленскія студэнты пад уплывам Т.Булгака і ксёндза Л.Трынкоўскага ў русле Дэмакратычнага таварыства стварылі студэнцкі саюз на чале са студэнтамі Я. Загорскім і Фр.Савічам. Уваходзілі ў яго прафесар Ю.Мяноўскі і майстар гадзіннікавых спраў Духоўскі. Пасля сустрэчы з Канарскім і Ю.Булгакам прадстаўнік Арыстакратычнага таварыства Казакевіч паўплываў на тое, што сябры апошняга прынялі Статут Дэмакратычнага таварыства і ўвайшлі ў СПН (сярод іх гісторык М. Балінскі) [692, с.40].

У лісце да І. Лялевеля ад 4 красавіка 1837 г. Ш.Канарскі мог сумленна напісаць: «Я тут не лодырнічаю і ў мяне дзень не прападае дарэмна; можаце мне паверыць, што я нядрэнны і дзейсны агітатар, толькі дапамагайце мне і не пакідайце мяне на два гады без адзінага ліста… Я завязаў зносіны з рускай арміяй, тыдні праз тры мы наблізімся з ёю яшчэ лепш… вельмі не хапае мне кніг. Маю сувязь з добрымі людзьмі на Люблінышчыне, Палессі і Беларусі. Захавай толькі мяне, божа, яшчэ адзін год, а вы, браты, дапамагайце» [134, т.4, с.417]. Цікава, што менавіта праз год і адбудзецца арышт Канарскага.

Канарскі хаваўся пад рознымі імёнамі на хутарах, па глухіх кляштарах, і руская паліцыя не ведала аб ім, пакуль Паскевіч не атрымаў з Францыі звесткі аб працы польскіх эмісараў (паведамлены прыкметы Канарскага). Пошукі пачаліся ў верасні 1835 г. Аўстрыйская паліцыя даслала ў Расію літаграфічны партрэт Канарскага. Віленскі генерал-губернатар Даўгарукаў запрасіў усіх уладальнікаў рэстаранаў і кафэ, паказаў ім партрэт і прыгразіў жорсткім пакараннем, калі яны не выдадуць яго паліцыі [584, с.128].

На Палессі сябры Саюза з дапамогай Яна Высоцкага з Мінску ўзялі ў арэнду фальварак на імя Радзевіча, дзе планавалі

размясціць друкарню. У красавіку 1838 г. па справе яе абсталявання і шрыфту Канарскі з Радзевічам паехалі ў Вільна. Там знайшлі гандляра Разенталя, які паабяцаў прывезці з-за мяжы невялікую друкарскую машыну і шрыфт. Але на наступны дзень, 27 мая, у Разенталя Канарскага чакаў паліцэйскі агент. Ад яго ўдалося вырвацца, але ўся віленская паліцыя была паднята на ногі. Канарскага перавезлі пад выглядам вельмі хворага ў клініку, дзе некалькі дзён студэнты (сярод іх Савіч, Грынкевіч, Загорскі, Ейсенблетэр) ахоўвалі яго. З клінікі вынеслі Канарскага як памершага ў труне на могілкі (магчыма, міф), адкуль Радзевіч вывез яго пад выглядам свайго служкі ў напрамку Мінска. На першым прыпынку Кжыжувка яны былі арыштаваны. Вайсковы суд адбываўся 28.01(9.02) — 13(25).02.1839 г. Праз следства прайшоў 221 чалавек, а прыгавораны 72 чал. 14.02.1839 г. Канарскі быў асуджаны да растрэлу, а 15(27).02 растраляны [692, с.41,44-48,63].

Карэспандэнцыя царскай жандамерыі сігналізавала ў 1835-36, 1839, 1844-46 гг. паяўленне на Палессі, Валыні, у Галіцыі, Коўне і Кіеве эмісара Феліксa Кіневіча [647, т.XII, с.415]. Гэта былы начальнік паўстання 1831 г. у Мазырскім павеце і пасол ад яго ў сейме, актыўны дзеяч эміграцыі. Пад выглядам прыказчыка, які наймае рабочых для Каралеўства Польскага, ён у 1844-1846 гг. ездзіў па Мазыршчыне і ўзбуджаў да паўстання мінскіх памешчыкаў. Ягонымі памочнікамі былі Аскеркі, Горваты і Еленскія, галоўнаўпраўляючы маёнткамі графіні Браніцкай Л.Солтан. А. Еленскі ў сваіх лясных дачах адчыніў майстэрні для вырабу баявых прыпасаў, косаў, дзідаў [48, с.110].

У канцы 1845 г. В.Гельтманам быў адпраўлены з Пазнані ў Вільню эмісар Ян Рэр (Roehr) з мэтаю «высветліць асобы змоўшчыкаў, падрыхтаваць да хуткага выбуху і даставіць падрабязнае данясенне аб агульным разумовым стане да 25.01.1846» [48, с.123]. На працягу двух месяцаў Рэр з легальным пашпартам прускага падданага аб'ездзіў Ковеншчыну, наладзіў там, а таксама ў Вільні і Слуцкім павеце патаемную сетку [663, с.504]. У Вільні Рэр дзейнічаў у кантакце з А.Рэнігерам (Renigerem). Да яго ж звяртаўся ў снежні 1845 г. эмісар з Познані М.Сламчэўскі, які быў у Вільні некалькі дзён. Пісьмовыя зносіны падтрымліваў з імі Т.Магдзінскі, прызначаны начальнікам паўстання на Жмудзі. Аб колькасці сяброў створанай Я.Рэрам арганізацыі гавораць лічбы прыцягнутых да адказнасці асоб: 14 прызнаны ўдзельнікамі патаемнага таварыства, 8 абвінавачаны ў сувязях з ім [587, с.201-202].

Паўторна Рэр выехаў у Літву ў студзені 1846 г., калі Мераслаўскі выслаў яго ў якасці кіраўніка літоўскіх паўстанцкіх сіл падчас плануемага агульнага паўстання на тэрыторыі былога ВКЛ. Ён павінен быў падрыхтаваць тут паўстанне, прызначанае на 1846 г. «Наша сістэма, — гаварыў яму на развітанне Мераслаўскі, — сістэма сямілетняй вайны: як можна хутчэй трэба паставіць людскую масу; пачынай цяпер партызанку; як толькі пачнеш збіраць масы, высылай іх да бліжэйшай калоны» [48, с.136]. Рэр з А.Гафмайстрам аб'ехалі Гродзенскую і Мінскую губерні і ўпэўніліся, што шляхта, на якую разлічвалі, не гатова да паўстання, убачылі, што запал гатоўнасці пакінуў шмат каго з яго былых сяброў-ліцвінаў. «У нас недастаткова сабрана зброі, няма пуль і пораху», — гаварылі яны. Рэр спадзяваўся на працоўных фабрык Беластока, дзе ягонымі памочнікамі сталі ўпраўляючыя вакольных маёнткаў графа Красінскага, памешчыкаў Асалінскіх і Старжынскага. Па суседству ў Кнышыне ён і быў арыштаваны 27 лютага 1846 г. [48, с.137-138].

На грамадска-палітычнае жыццё зямель Беларусі мелі ўплыў Кракаўскае паўстанне і сялянскае антыфеадальнае выступленне ў Галіцыі 1846 г. Па-першае, ствараліся радыкальныя таварыствы на сялянскай і плябейскай аснове. Пра дзейнасць аднаго з іх, Саюза свабодных братоў, аповед будзе ў раздзеле 4.6. дадзенай працы. Па-другое, у Беларусі ўзнікла сітуацыя паўтора падобных крывавых галіцыйскіх сцэн. Асабліва небяспечным было становішча на Гродзеншчыне. Восенню 1846 г. Адам Кіркор выконваў тут тайную місію, мэта якой была ў высвятленні настрою грамадства. У «Дзённіку вандроўкі» ён апісаў настрой сялян Беластоцкага, Бельскага, Брэсцкага, Кобрынскага паветаў: «агульны настрой сялян ёсць да такой ступені бязлітасны супраць шляхты, што, па сутнасці, патрэбна берагчыся, каб не паўтарылі яны пры малым зручным выпадку галіцыйскіх сцэн» [575, с.705].

2 жніўня 1846 г. гродзенскаму губернатару данеслі, што сяляне Бельскага павета пагражаюць «пойти примером крестьян Галиции», з Лідскага — сяляне маёнтка Зарэчча «упорно не отрабатывают никаких дворовых повинностей», з кобрынскага (12.11.46) — настолькі моцныя хваляванні сярод сялян, што «если среди крестьян найдутся отважные и инициативные руководители», дык дойдзе да сур'ёзнай завярухі. Кобрынскі спраўнік называў 28 маёнткаў, дзе рух сялян набыў востры характар. Адважны кіраўнік таксама знайшоўся —

Юліян Бакшанскі, былы ўдзельнік патрыятычнага гуртка студэнтаў-медыкаў. Бацька яго быў адміністратарам казённых зямель у Смаргоні. У сакавіку 1847 г. Бакшанскі напісаў «Адозву да смаргонскіх сялян». Галоўная ідэя дакумента — барацьба за ліквідацыю феадальнага ладу. Бакшанскі ўпэўніваў сялян, што яны — «сила народа» і «сила армии», што вытворчасць імі матэрыяльных багаццяў — гарантыя іх дабрабыта і поўнай незалежнасці ад шляхты. Адозва дыхала нянавісцю да зямельных уладальнікаў, якія абыходзяцца з сялянамі «хуже, чем со зверями». Бакшанскі пісаў, што паны павінны даць «полную свободу» сялянам пад пагрозаю смерці, як гэта было ў 1846 г. у Галіцыі. Ён вучыў іх аб'ядноўвацца з салдатамі, якія ў іх кватаруюць, і разам з імі «напасть на офицеров и панов» [Цыт. па: 575, с. 696, 697, 699, 706].

Прадухіліць падзеі маглі толькі рашучыя дзеянні ўлад. З рапарта Віленскага ваеннага губернатара ад 5 жніўня 1846 г. генерал-фельдмаршалу кн. Варшаўскаму аб палітычным стане заходніх губерняў даведваемся, што ён прыняў «надлежащие меры предосторожности к предупреждению всяких покушений злоумышленников в здешнем крае».

1.Губернатарам прапанавана «усугубить внимание за духом местных жителей».

2.Земскім спраўнікам, паліцмайстрам і гараднічым:

-выяўляць тайныя сходы і зборышчы;

-назіраць за падазронымі асобамі (асабліва замежнымі), калі трэба — арыштоўваць;

-дазнавацца, ці не рыхтуецца зброя, ці хто не распаўсюджвае чуткі, і аб усім гэтым даносіць хутка ваеннаму губернатару.

3.Начальнікам памежных акруг наканавана пільна сачыць за пропускам у імперыю асоб з-за мяжы.

4.Камандуючым 2-га пяхотнага корпуса і 9-й акругі ўнутранай аховы наглядваць за падазронымі рухамі мясцовых жыхароў.

5.Папячыцелю Беларускай вучэбнай акругі загадаць вучэбнаму начальству звярнуць увагу на дух юнацтва, іх знешнія кантакты, каб не было шкоднага на іх уплыву.

6.Губернатарам дадзена даручэнне адхіляць просьбы выехаць за мяжу да таго часу, пакуль у суседніх з Расіяй рэгіёнах не ўладкуецца спакой; пераезды ўнутры краю і іншыя губерні дазваляць строга па закону, прычым людзям благанадзейным і праз губернскую канцылярыю [39, т.IV, с.135-136].

У губернях Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай было аб'яўлена ваеннае становішча. Прынятыя меры прадухілілі выбух і на гэты раз. Наступная хваля ўзбуджэння адбылася ў час «вясны народаў». 15 сакавіка 1848 г. у III аддзяленне з Гродна было даслана наступнае данясенне: «Газетныя звесткі аб адбыўшымся ў Францыі перавароце мелі бачны ўплыў на насельніцтва Гродзенскай губерні, з якой большая частка, асабліва маладыя людзі, не могуць схаваць радасці, напісанай на іх тварах, з нагоды гэтай рэвалюцыі. Будучы асцярожнымі на публіцы пры рускіх, яны, як гавораць, выказваюць паміж сабой надзею, што перамена праўлення ў Францыі прывядзе да такіх перамен у Германіі і Італіі і будзе мець уплыў і на Польшчу. Адзін малады паляк, які служыць у мясцовай палаце дзяржаўных маёмасцяў, разважаючы аб замежных здарэннях, нягледзячы на прысутнасць пры гэтым рускага чыноўніка, сказаў, што ўся Еўропа радуецца гэтым падзеям, а адныя толькі рускія баяцца іх...» [Цыт. па: 259, с.138].

15 сакавіка 1848 г. па заказу імператара ваенны міністр генерал-ад'ютант Чарнышоў даў распараджэнне віленскаму ваеннаму губернатару аб прыняцці надзвычайных мераў на падуладнай яму тэрыторыі ў сувязі з рэвалюцыяй у Еўропе: назіраць за пакупкай жыхарамі пораху, за магчымым прыездам замежных эмісараў; адабраць у прыватных людзей зброю ( як у 1831 г.), вінаватых у яе захаванні прыцягваць да адказу згодна з палявым крымінальным улажэннем. 19 сакавіка 1848 г. выйшаў указ Мікалая І, у якім ён прадпісваў, што рабіць і як віленскаму ваеннаму губернатару ў выпадку мецяжа, падобнаму 1831 г.: падзел вінаватых асоб на тыя ж 3 разрады, канфіскацыя або секвестр іх маёнткаў, вінаватых 1-га разрада судзіць ваенна-палявым судом па сваёй канфірмацыі (нават растрэл), вінаватых 2-га разрада ссылаць у Сібір на працу ці пасяленне, вінаватых 3-га разрада асуджаць канфірмацыяй галоўнакамандуючага [39, т.IV, с.139–141].

28 сакавіка 1848 г. па загаду Мікалая І галоўнакамандуючы дзеючай арміі генерал-фельдмаршал кн. Варшаўскі граф Паскевіч-Эрыванскі прадпісаў камандуючаму 2-м пяхотным корпусам надаць генерал-губернатарам заходніх губерняў асаблівыя паўнамоцтвы ў сувязі з рэвалюцыяй у Заходняй Еўропе, каб прымаць хутка і рашуча ўсе меры для аховы грамадзян. З гэтай нагоды ў насельніцтва адбіралі зброю. Колькасць яе толькі па Гродзенскай губерні відаць з захаванай

ведамасці. Ад шляхты, казённых і памешчыцкіх сялян, вартаўнікоў і іншага звання людзей адабралі 6156 ружжаў, 418 пісталетаў, 256 шабляў і шпагаў. Рапарт віленскага губернатара Мікалаю I ад 9(21) красавіка 1848 г. даносіў аб знойдзенай у г.Ашмяны ўлётцы антыўрадавага зместу. Гараднічы зняў яе са слупа брамы дома яўрэйкі Цыркі Шрыравай. У ёй было напісана: «Хоть Николай Романов объявил в манифесте «да будет не так», но будет так и должно быть так!» [250, ф.1, воп.29, спр.184; 39, т.IV, с.306,308; 415, с.31].

У паведамленні віленскага генерал-губернатара ад 16 (28).04.1848г. гаварылася, што ў Познанскім Княстве існуе палітычнае таварыства «Ліга галосная», якое імкнецца дзейнічаць на тэрыторыі былой РП, рыхтуе насельніцтва да ўсеагульнага паўстання і, відаць, мае супрацоўнікаў у заходніх губернях, дзе таксама адбудзецца паўстанне разам з Галіцыяй і Познанню. Гэта пацвярджаецца звесткамі з-за мяжы (ад эмігрантаў). Генерал-губернатар прасіў гродзенскага губернатара, каб «усугублена была бдительность наблюдения за жителями, дабы непременно достигнуть до обнаружения тех тайных связей, какие может иметь с ними вышеупомянутая Познанская Лига...» [250, ф.1, воп.29, спр.75, а.6–7].

Дакладная запіска агента Вільбышэвіча ад 7(19).05.1848 г. у г.Гродна даносіць да нас звесткі аб палітычным становішчы на Слонімшчыне. У Слоніме даносчык даведаўся, што 18(30).04.1848 г. «находились в собрании у помещика Слонимского уезда Филорентия Макульского: тамошний предводитель дворянства Воллович, бывший под надзором полиции; уездный судья Орда, помещики имений: из Хмелицы — Чечот; из Тужевич — Пржецлавский, из Дзевонкевичей — граф Слизня да уездный казначей Именинский; но для какой цели, мне именно неизвестно.». Агент паведамляў, што мяшчане м. Молчадзь Слонімскага павета хаваюць зброю ў вялікай колькасці, а арэндны ўладальнік гэтага маёнтка А.Ельскі і станавы прыстаў Такаржэўскі аб гэтым ведаюць [250, ф.1, воп.29, спр.76, а. 3, 3 адв.].

У «Спісе асоб, якія знаходзяцца пад наглядам паліцыі» за другую палову 1848 г. было прозвішча памешчыка маёнтка Веляну Гродзенскага пав. Леапольда Валіцкага «по подозрению в сношении с находящимися за границею сыновьями родственницы его Станиславом и Северином Доренговскими». Трапілі пад нагляд паліцыі вучань Гродзенскай гімназіі

Кавалеўскі і канцылярыст Гродзенскага прыказа Александравіч па справе аб уцёках за мяжу канцылярыстаў Паплаўскага, Цяшэйкі і Адашкевіча [250, ф.1, воп.29, спр.8, а.44 адв.,33 адв.]. З 70 выпадкаў сялянскіх выступленняў, зарэгістраваных у III аддзяленні прыкладна 40 прыпадае на заходнія губерні [259, с.101]. Больш значны рух стрымлівалі сканцэнтраваныя тут масы царскіх войск і ўвядзенне больш пільнага адміністрацыйна-паліцэйскага нагляда.

Генерал-губернатар Гродзенскі і Ковенскі (Віленскі ваенны губернатар) 6(18).04.1849 г. пісаў ваеннаму губернатару Гродна і Гродзенскаму грамадзянскаму губернатару: «Атрымана мною данясенне, што ў горадзе Вільні ўзнікла справа, па якой абвінавачваюцца шматлікія мясцовыя рамеснікі ў складанні змовы для правядзення ў хуткім часе бунта, што ў гэтым удзельнічаюць таксама і асобы вышэйшага саслоўя, і што паўстанне вызначана зрабіць не толькі ў Вільні, але і ў іншых месцах давераных мне губерняў …» [250, ф.1, воп.29, спр. 75, а.1]. 8(20) ліпеня 1849 г. Віленская следчая камісія даносіла ў рапарце віленскаму ваеннаму губернатару аб змове ў Мінскай губ. Тут рыхтавала паўстанне мясцовае аддзяленне Саюза свабодных братоў. Меркавалі, што яно пачнецца адразу ў адзін і той жа час у розных месцах (на другі дзень пасхі ), але Франц Далеўскі (Вільна ) зразумеў, што сродкаў недастаткова і ўгаварыў адкласці справу да больш зручнага часу — на месцы былі разасланы людзі (у Мінск — Цэзары Макржэцкі). На следстве Вейштарт паказаў, што прычынай пераноса была прапанова пачакаць, калі ў Вільню прыедзе ў маі імператар, каб можна было яго арыштаваць [39, т.IV, с.311, 313].

Архіўныя матэрыялы даносяць да нас жаданні некаторых патрыётаў зямель Беларусі выехаць за мяжу, каб удзельнічаць у рэвалюцыйных падзеях. У захаванай сакрэтнай справе №95 «Аб даносе адстаўнога падпрапаршчыка Камінскага наконт намераў некаторых памешчыкаў паехаць у Венгрыю» (лета 1849 г.) названы: кобрынскі кравец Чарнабель, прыехаўшы з Каралеўства Польскага, маладыя людзі з кобрынскага павета П.Іванкевіч, А.Стэцка, Л.Мікучэўскі, памешчыкі Пружанскага павета Ю.Пратасевіч і А.Ляцкевіч, дваранін Брэсцкага павета Д.Красоўскі [250, ф.1, воп.29, с.91]. Памешчыца Брэсцкага павета Шэмет прыязджала ў Гродна, каб угаварыць свайго брата Казіміра Макульскага, які вучыўся ў гімназіі, ехаць за мяжу [250, ф.1, воп. 29, спр.91,а.1-2].

15(27) ліпеня 1849 г. чыноўнік па асобых даручэннях гродзенскага губернатара А.Малаў даводзіў да ведама губернатара, што заўважыў, што месяцы таму назад сярод польскіх памешчыкаў і чыноўніцтва «было нейкае захапленне расказваць аб венгерскіх справах, але з атрыманнем звестак аб уступленні расійскіх войск у Венгрыю, аб некалькіх баях і аб славе пераможнай рускай зброі, аповеды аб гэтым зрабіліся цалкам для іх нецікавымі і, нават, можна сказаць, што цяпер цяжка пачуць размовы аб гэтым прадмеце» [250, ф.1, воп.29, спр.91, а.27 адв.]. На працягу сакавіка — красавіка 1849 г. у настроях памешчыкаў заходніх губерняў адбыўся пералом. Пасля першага захаплення думкаю аб незалежнасці Польшчы яны занялі пасіўна-чакальную пазіцыю, а затым аддаліся пад ахову самадзяржаўя. На гэта паўплывала абвастрэнне класавых супярэчнасцяў: мары аб палітычнай незалежнасці былі абмежаваны нарастаннем сялянскага руху. Фронт польскага нацыянальнага руху склалі тут толькі беспамесная шляхта, гараджане і вучнёўская моладзь. У выніковым аглядзе «нравственно-политического отчета» III аддзялення за 1848 г. гаварылася: «Аднак адчайныя польскія патрыёты ў заходніх губернях не складаюць большасці і нават паміж дваранамі ёсць даволі такіх, якія збліжаюцца з рускімі, знаходзячыся з імі пад аднымі законамі і карыстаючыся тымі ж правіламі і прывілеямі» [Цыт. па: 259, с.144].

Грамадска-палітычны рух у 1848-1849 гг. на землях Беларусі не перарос у рэвалюцыю, бо для яе тут яшчэ не было ўмоў, а сам ён быў не арганізаваны і разрознены. Але трывога царскіх улад гаворыць аб яго значнасці.

Аб падзеях у сярэдзіне 1850-х гаворыцца ў рапарце жандармскага палкоўніка Тызенгаўза шэфу корпуса жандармаў ад 19(31) ліпеня 1855 г. У маі — пачатку чэрвеня 1855 г. у Мінску аб'ядналіся 25-30 маладых людзей (большасць — выхаванцы землямерных класаў) «единственно от неудовольствия к правительсту» з-за закрыцця землямерных класаў, што пакінула іх без сродкаў існавання і надзеі на будучую працу. Узначаліў іх адстаўны чыноўнік Канстанцін Рагалевіч з мэтаю пачаць паўстанне, каб адцягнуць частку войск з межаў імперыі ўнутр дзяржавы, што палегчыла б заходнім дзяржавам (асабліва Францыі) ваенныя дзеянні на памежных пунктах. Распаўсюджваліся чуткі аб тым, што імператар французаў патрабуе пачаць у Літве і Польшчы хваляванні, і для гэтага

даслаў адозву Чартарыйскага «Браты палякі і ліцвіны». У ёй, у прыватнасці, было напісана: «Гасподзь памілаваў нас, Усход і Захад вядуць крывавы бой, няхай кожны возьме зброю і ідзе адпомсціць за нанесеныя крыўды». 18(30) чэрвеня 1855 г. змоўшчыкі збіраліся падпаліць у некалькіх месцах горад і, выкарыстоўваючы спалох, напасці на казармы гарнізоннага батальёна і жандармскай каманды, забраць зброю, адчыніць астрог і вызваліць арыштантаў, захапіць казначэйства, прыказ грамадскай апекі, некаторых багатых прыватных асоб. З дапамогаю сялян і памешчыкаў злучыцца з іншымі паўстанцамі Мінскай і Віленскай губерняў. Меркавалася, што французы ў гэты час высадзяцца ў Рызе. Слухі аб прыходзе ў Мінскую губ. двух батальёнаў войска адклалі выкананне плана, 15 чал. былі арыштаваны, 6 чал. аддадзены пад нагляд паліцыі [39, т.IV, с. 320,321-322].

Такім чынам, палітычная і разумовая дзейнасць «польскай» палітычнай эміграцыі аказала значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі: з аднаго боку, яна падтрымлівала патрыятызм насельніцтва, прыспяшала яго ідэалагічную эвалюцыю, з другога боку, дзейнасць тут польскіх эмісараў прыводзіла да ўзмацнення рэпрэсіўных мерапрыемстваў царызма, што стрымлівала фарміраванне беларускай самасвядомасці.

### 3.3. **Роля польскай сістэмы адукацыі ў паланізацыі беларускай моладзі. Вучнёўскія і студэнцкія гурткі і таварыствы**

Аб ролі нацыянальнай адукацыі гаварыў у 1777 г. перад студэнтамі і прафесарамі Віленскай галоўнай школы візітатар Ю.Выбіцкі: «...Вы, якія цяпер носіце назву віленскіх акадэмікаў (студэнтаў — *В.Ш.*), з цягам часу зоймеце важныя месцы сенатараў, паслоў, суддзей, уладальнікаў маёнткаў. Бо вас жа вашае паходжанне прызначае на розныя пасады ў краі, і таму ад вашага вобразу думак, ад вашых парадаў і пастаноў залежыць шчасце і спакой народа... Будучы дабрадзейнымі, вы выканаеце абавязкі чалавека і грамадзяніна. Адукацыя дае вам магчымасць разглядзець сапраўдныя інтарэсы края. Запаленыя мужнасцю патрыятызма, вы ніколі не дазволіце сабе ўнізіцца або бегчы перад насіллем, калі толькі пытанне будзе датычыцца блага Айчыны...» [цыт. па:188, с.16-17]. Такімі былі адносіны

да адукацыі ў часы дзейнасці Адукацыйнай камісіі, а вось цытата з дакумента «Будзем вучыцца» часоў 1-й паловы XIX ст.: «З адукацыі, кіруемай ворагам і схіляемай да выключнай яго выгодзе, можна атрымаць выгоду і для Польшчы. Калі са школ, якія стаяць пад пруска-аўстрыйска-маскоўскім папячыцельствам, могуць выходзіць польскія пісьменнікі, дык чаму ж з тых самых школ не могуць выходзіць і польскія грамадзяне? Мы не гаворым аб вялікіх вучоных, аб геніях, аб Каперніках; дарэмна мы выглядалі бы іх; каб дачакацца такіх пладоў, трэба, каб народная ніва была спачатку добра апрацавана па-польску. Але мы цалкам маем права патрабаваць ад польскіх юнакоў, якія вучацца ў нямецка-маскоўскіх школах, каб яны былі грамадзянамі, а маючы гэта права, маем і абавязак, калі не падаць, дык хаця б напомніць ім спосаб, наследуючы які яны не будуць ні немцамі, ні рускімі» [48, с.406–407].

У нашы задачы не ўваходзіць разгляд развіцця польскай сістэмы адукацыі — гэта няблага зрабілі такія польскія даследчыкі, як Ю.Лукашэвіч, І.Шыбяк, Д.Беаву, Л.Заштаўт [617, 676, 552, 696]. Мы хацелі б толькі вызначыць яе месца ў паланізацыі беларускай моладзі, назваць меры і сродкі, якія пры гэтым выкарыстоўваліся. Другая задача вынікае з папярэдняй — дэманстрацыя вынікаў польскай прапаганды ў навучальных установах: дзеянне студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый і выступленні гімназістаў.

Неабходнасць рэарганізацыі сістэмы адукацыі і выхавання прагрэсіўная частка польскай грамадскасці зразумела пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Яна ўбачыла ў старой адукацыйнай сістэме, дзе галоўную скрыпку гралі езуіты, асноўную прычыну ўсіх бедаў РП. Таму была пастаўлена задача замяніць езуітаў (тым больш, што іх ордэн быў скасаваны папскай булай ад 21.07.1773 г.) і зрабіць адукацыю дзяржаўнай справай. Як казаў Ф.Чацкі: «Дзіця грамадзяніна стала дзіцём дзяржавы» [цыт. па: 188, с.26].

Той жа сейм (1773—1775 гг.), які аддаў суседнім краінам значныя тэрыторыі, прыняў па прапанове літоўскага падканцлера І.Храптовіча рашэнне аб стварэнні Адукацыйнай камісіі — цэнтральнай вучэбнай улады для ўсёй Рэчы Паспалітай [77,с.229]. Ад ВКЛ у яе склад увайшлі: кашталян віленскі кн.М.Радзівіл, падкаморы літоўскі Л.Гутакоўскі, віленскі біскуп І.Масальскі (старшыня камісіі), І.Храптовіч, пісар літоўскі І.Патоцкі. На патрэбы адукацыі былі перададзены

езуіцкія маёнткі і праведзена люстрацыя езуіцкай маёмасці, нерухомая перадавалася шляхце ў вечную арэнду з умовай плаціць 4,5% ацэначнай сумы ў адукацыйны фонд [77, с.229; 617, т.2, с.168]. У 1781 г. толькі ў грашовых сумах капіталы Адукацыйнай камісіі склалі 4653182 польскія злотыя, даходы з літоўскіх і каронных паезуіцкіх зямель у 1783 г. раўняліся 1268821 злоты 27 8/12 грошай [617, т.2, с.250]. Так што грошы на рэформу сістэмы адукацыі былі даволі значныя.

За 1780—1783 гг. была створана дзяржаўная структура польскай адукацыі, якая ў Літве і Беларусі складалася з Галоўнай школы ВКЛ, акруговых і падакруговых школ рознага ўзроўню, ордэнскіх (піярскіх і базыліянскіх) школ, падпарадкаваных Адукацыйнай камісіі. ВКЛ было падзелена на 4 навучальных акругі: літоўскую, жмудскую, рускую (навагрудскую), палескую (гл. схему Д.6.1.). Па дадзеных генеральнай візітацыі, у 1782 г. на Беларусі было 47 навучальных устаноў, у якіх вучыліся 2736 вучняў і працавалі 122 настаўніка [падлічана па: 655, с.11-29,47-66]. Іншую лічбу дае на 1781/82 навучальны год польскі даследчык І.Шыбяк: у акадэміцкіх школах вучыліся каля 2200 чал., у ордэнскіх — каля 1000 чал. [676, с.36]. Асобна хочацца адзначыць арганізацыю падскарбіем літоўскім, гродзенскім старостам А.Тызенгаўзам спецыялізаваных школ у Гродне: будаўнічай, бухгалтарскай, па падрыхтоўцы землямераў, каморнікаў, медыцынскай (акадэмія) з акушэрскімі курсамі, музычнай, корпус кадэтаў [424, с.75-78].

Якой стане новая адукацыйная сістэма, залежала ў многім ад настаўніцкага складу. Былыя кадры ігнаравалі патрабаванні Адукацыйнай камісіі, спрабавалі супрацьдзейнічаць яе метадам выкладання, не прымалі новыя падручнікі, вучэбныя планы. Патрэбныя педагагічныя кадры рыхтаваліся з 1780 г. у адчыненых пры універсітэтах Вільні і Кракава настаўніцкіх семінарыях, здольных студэнтаў пасылалі за мяжу за кошт камісіі [121, с.332-333; 617, т.2, с.267-268]. Нямалую ролю адыгрываюць у адукацыйнай сістэме падручнікі. Пры адкрыцці «Таварыства для элементарных кніг» (7.03.1786) яе сакратар Пірамовіч сказаў, што «ўся надзея дзяржавы — Рэчы Паспалітай — у напрамку выхавання моладзі», а галоўныя асновы і зброя школы — падручнікі і дапаможнікі [цыт. па: 188, с.25]. Даволі хутка ўдалося выдаць каля дзесятка добрых падручнікаў, напісаных выдатнымі мясцовымі і замежнымі аўтарамі [651,

с.11,55,156,185,261; 617, т.2, с.419,257], выкарыстоўваліся таксама кнігі класічных лацінскіх аўтараў: Плінія, Авідзія, Гарацыя, Цыцырона і іншых [38, с.22-23].

Расійская камісія народных вучылішч пасля знаёмства з падручнікамі па старажытнай Грэцыі (Кракаў,1786), па тэорыі красамоўства (Вільна,1792), па праву Страйноўскага зрабіла наступную выснову: « ... у іх маюцца месцамі правілы, якія цалкам процілеглыя манархічнаму вобразу праўлення. Усе гэтыя вучэбныя дапаможнікі камісія прызнала неабходным замяніць іншымі, выдадзенымі галоўным чынам у Расіі» [38, с.24]. Для пацвярджэння прывядзем хаця б адзін прыклад з падручніка рэктара Віленскага універсітэта Страйноўскага: «Заканадаўчая ўлада, каму бы яна ні была дадзена, не з'яўляецца адвольнай і бязмежнай і ў тым адзіным складаецца, каб па спелым абмеркаванні і ясным пазнанні прадпісаць, што кожны чалавек у народзе павінен рабіць і не рабіць, адпаведна абавязкам, якія ён мае ад прыроды, або па ўмове і д.п., і таму яна не можа распаўсюджвацца ў народзе надта далёка, яна павінна памятаць, што існуе ў народзе, ад народа і для народа» [38, с.25; 351, с.32]. Зразумела, такім падручнікам карыстацца ў Расійскай імперыі было нельга.

За ўзор праграмы навучэння ў сваіх школах Адукацыйная камісія ўзяла праграму піяраў, распрацаваную ксяндзом Канарскім. Былі ўнесены адпаведныя змяненні: маральную навуку праходзілі не па Біблii, а на вывучэнні прыродных якасцяў чалавека, каб «маладыя розумы былі падрыхтаваны да разумення недахопаў у законах дзяржавы і спосабаў удасканальвання заканадаўства»; латынь вывучалі не толькі на асобным уроку, але і на іншых: гісторыі, праве, маралі, біялогіі. Праграму піяраў дапоўнілі навукамі палітычнымі (эканоміка, палітычнае і міжнароднае права), значную ўвагу звярнулі на фізічнае выхаванне, якое дапамагае фарміраваць людзей мужных, моцных духам, са шляхетнай велікадушнасцю і старажытным рыцарскім духам [38, с.16,21]. Калі раней больш вывучалася біблійная гісторыя, дык цяпер звярнуліся да старажытнай і сучаснай гісторыі Польшчы і ВКЛ, каб зрабіць высновы з мінулага Рэчы Паспалітай, важныя для сучаснага і будучага жыцця [676, с.77,78,85].

У 1776 г. настаўнік мінскай школы М.Дудзінскі выдаў у Вільні падручнік польскай мовы. Тады яшчэ мала хто разумеў, навошта вывучаць граматыку мовы, якая ўжываецца «на

штодзень». Але дзякуючы падручніку інтарэс да польскай мовы мала-памалу стаў павялічвацца. Новыя падручнікі, пра якія мы гаварылі, пісалі па-польску, а замежныя перакладаліся [676, с.71-72; 617, т.2, с.259]. Адукацыйная камісія звярнула ўвагу на адукацыю дзяўчат. У праграмах сясцёр міласэрнасці і марыявітанак, якія ўзяліся за жаночую адукацыю, больш было практычных прадметаў, але з дзяўчат хацелі выхаваць не толькі добрых гаспадынь і маці, а таксама і грамадзян [676, т.2, с.436].

На беларускіх землях, далучаных да Расійскай імперыі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, існавалі да ўтварэння Віленскай навучальнай акругі школы двух тыпаў: езуіцкія і па ўзору польскай Адукацыйнай камісіі (з выкарыстаннем яе праграм і падручнікаў). У Полацкай губерні ў 1772 г. было 11 сярэдніх навучальных устаноў : 6 езуіцкіх, 3 дамініканскіх, па 1 піярскаму і базыліянскаму вучылішчу і 29 школ з нізшым курсам [119, с.192-194; 38, с.26,32,46]. У 1778 г. — 12 вучэбных устаноў, у якіх вучыліся 97 чал. У Магілёўскай губ. у 19 сярэдніх вучылішчах было ў 1780 г. 585 вучняў [121, с.305-306]. У большасці гэтых навучальных устаноў назіраўся моцны рэлігійна-маральны ўплыў на адукацыю і выхаванне. Адпаведна падбіраўся склад настаўнікаў і літаратура для бібліятэк. Значная частка вучэбнага часу адводзілася на вывучэнне латыні, каб дзеці маглі валодаць ёю ў вуснай і пісьмовай мове па ўсіх правілах аратарскага майстэрства.

У Мінскай губерні пасля далучэння да Расійскай імперыі існавалі польскія навучальныя ўстановы, якія раней падпарадкоўваліся Адукацыйнай камісіі. З яе фонда яны працягвалі атрымліваць субсідыі і таму не залежалі ад прыказаў грамадскага прызрэння. На 1800 г. у 7 вучылішчах было 580 вучняў. Прадметы і падручнікі засталіся тыя ж самыя, толькі ўводзілася вывучэнне рускай мовы, на якой сталі выкладаць некаторыя дысцыпліны: матэматыку, расійскае права, геаграфію, гісторыю [313, т.1, с.205,482-483,659-668].

У Віленскай і Гродзенскай губерні польская школьная адукацыя захавалася ў перыяд з 1795 г. па 1803 г. яшчэ больш, чым у іншых губернях Беларусі. Павел I сваім указам ад 6.02.1797 г. пацвердзіў сродкі існавання універсітэта (Галоўнай школы) і навучальных устаноў гэтых губерняў ад працэнтаў з езуіцкіх маёнткаў, а ўказам ад 1.07.1797 г. стварыў літоўскую Адукацыйную камісію з 12 чалавек. Ёй падпарадкоўваліся ў 1797 г. 20 школ 8 каталіцкіх ордэнаў, у якіх 1508 дзяцей

вучыліся па статуту, праграмах, падручніках былой Адукацыйнай камісіі [313, т.1, с.221-222,387-390; 555, т.3, с.580; 119, X, с.220].

Апошняя аказала значны ўплыў і на вучэбна-выхаваўчую сістэму, створаную Віленскай навучальнай акругай. 24.01.1803 г. выйшаў указ аб усталяванні навучальных акруг у Расійскай імперыі, у тым ліку Віленскай. У яе склад увайшлі 8 губерняў, з іх пяць беларускіх: Віленская (будзем лічыць беларускія паветы), Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская, а з 1807 г. — і Беластоцкая вобласць, якая знаходзілася ў Гродзенскай губ. [118, с.13,500]. Уся тэрыторыя Віленскай навучальнай акругі ахапіла былую тэрыторыю ВКЛ з насельніцтвам у 11 млн. чал. і разглядалася ў палітычным значэнні як «аб'яднанне края, якое цяпер выяўляецца ў адзінстве адукацыі» [645, с.132; 27, стб.1155]. «Вялікая навуковая, педагагічная, адміністрацыйная і кіруючая праца, звязаная з гэтым польскім культурным самаўпраўленнем на гэтых землях, — пісаў М.Кукель, — была прасякнута духам даўняй Адукацыйнай камісіі, грамадзянскім і патрыятычным імкненнем, як у міцкевічаўскай песні філарэтаў, праз навуку і годнасць да адраджэння Айчыны» [605, с.191].

Падчас існавання Віленскай навучальнай акругі адбываліся тэрытарыяльныя змены. З 1824 г. Віцебская і Магілёўская губерні ўвайшлі ў Пецярбургскую навучальную акругу, а з 1829 г. склалі сваю Беларускую, куды ў 1831-1832 гг. адышлі астатнія беларускія землі пасля скасавання Віленскай навучальнай акругі. У 1850 г. апошняя была адноўлена ў складзе Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губерняў [277, с.284; 314, т.2, с.329,384-385]. Трэба адзначыць, што Віленская навучальная акруга ў параўнанні з іншымі мела значна большую колькасць вучняў. Намі падлічана, што ў 1808 г. тут было ў сярэдніх вучэбных установах і павятовых вучылішчах 8727 вучняў, што на 1816 чал. болей, чым у астатніх чатырох акругах (Маскоўскай, Харкаўскай, Пецярбургскай, Казанскай) [351, с.6].

Найвышэйшай вучэбнай установай у акрузе быў Віленскі універсітэт, які меў багатую гісторыю з часоў прывілея Стэфана Баторыя (7.07.1578) і карыстаўся правамі падобна еўрапейскім універсітэтам. Павел I наведаў яго 17(29) мая 1797 г. і «всемилостивейше указать соизволил оставить его в настоящем положении» [цыт. па: 313, т.1, стб.546]. Першага ліпеня 1797 г. быў зацверджаны статут Віленскай галоўнай школы. У гэты час тут было тры факультэты, заняткі праводзіліся на латыні, і

паступова ўваходзіла ва ўжытак польская мова, руская гучала толькі на лекцыях рускай мовы. У 1801 г. вучыліся 256 студэнтаў са шляхты (167 чал.), мяшчан (79) і разначынцаў (10), а ў ваенным вучылішчы пры універсітэце — 60 кадэтаў з беднай шляхты [555, с.527-528,580; 549, с.362-364].

Дваццаць пятага мая (6.06) 1803 г. быў зацверджаны «Статут, або Агульная пастанова Імператарскага Віленскага універсітэта і вучылішч яго акругі». Універсітэт атрымаў шырокае самаўпраўленне і паўнамоцтвы кіраваць усімі навучальнымі установамі акругі, нават тымі, якія былі ў духоўным ведамстве і ўтрымліваліся каталіцкімі ордэнамі. Даследчык С.Бархатцаў (Шалковіч) слушна пісаў: «Адносіны паміж універсітэтам і навучальнымі ўстановамі яго акругі былі такія ж, якія існуюць паміж метраполіямі і іх калоніямі; гэта быў літаральны паўтор былога польскага парадку, выпрацаванага Адукацыйнай камісіяй, па якой школы ў Кароне лічыліся калоніямі Кракаўскай акадэміі, а ў Літве — Віленскай акадэміі. Такі стан вучэбнай справы не мог не спрыяць польскай справе, і універсітэт пад уплывам засвоенага ім рэвалюцыйна-польскага напрамка зрабіўся адным з самых моцных і магутных цэнтраў апалячвання заходняй і паўднёва-заходняй Расіі» [27, стб.1159-1160].

Адсюль зразумела, чаму радасць адкрыцця Віленскага універсітэта ахапіла ўсю тэрыторыю навучальнай акругі. Г.Калантай гаварыў: «І як сэрцу пачуццёвага паляка не напоўніцца самымі светлымі адчуваннямі радасці, калі ў акце зацвярджэння Аляксандрам Віленскага універсітэта ён бачыць пацвярджэнне прывілеяў і падараванняў самых слаўных польскіх каралёў: Стэфана Баторыя, Сігізмунда І, Уладзіслава Ягайлы, Казіміра Вялікага!» [цыт. па: 549, с.387]. Удзельнік патаемных таварыстваў Віленскага універсітэта і паўстанец 1830-1831 гг. М.Махнацкі пісаў: «На думку Зана, універсітэт не быў свяцілішчам адных навук, а алгебра не складала апошняй мяжы, за якой не застаецца ўжо ніякай справы. Няўжо з гэтых жыццёвых сілаў студэнтаў немагчыма было вывесці нічога для Польшчы» [цыт. па: 192, с.19]. Па падліках прарэктара універсітэта ў 1929/30 гг. С.Пігона, кожны год каля 250 выпускнікоў ішлі ў жыццё ў якасці працаўнікоў асветы, адміністрацыі і вольных прафесіяў, а ўвогуле з 1803 г. — гэта каля 5 тыс. чал. [645, с.135-136]. Яны стваралі разумовую эліту Беларусі, Літвы, Украіны і надавалі культуры гэтых краёў уласцівы стыль. Зразумела які, бо універсітэт сапраўды быў «ачагом польскай адукацыі і вартаўніком нацыянальнага духа» [77, с.417].

Беларускай моладзі прышчаплялася польская ідэя — гэта добра зразумеў М.Навасільцаў і таму пасля пакарання філаматаў і філарэтаў, якія «думалі распаўсюдзіць праз навуку неразумную польскую нацыю», рэарганізаваў універсітэт, чым нанёс удар па паняццю «польскай нацыі на Літве» [542, т.2, с.197]. Але, каб пазбегнуць аднабаковасці ва ўспрыманні Віленскага універсітэта, трэба ведаць і яго другую ролю: падрыхтоўку тых сілаў, якія стануць прадвеснікамі беларускага адраджэння; правядзенне той працы, якая складзе перыяд падсвядомага беларускага руху (падрабязней гл. раздзел 4.6 ).

Віленскую навучальную акругу «міністэрствам асветы для польскага грамадства ўсёй тэрыторыі рускага захопу» зрабіў Адам Чартарыйскі [576, с.73]. У сваёй аўтабіяграфіі ён пісаў, што ў 1795 г., калі прымусова прыехаў у Пецярбург, дык «не мог абыякава бачыць Рускага без таго, каб кроў не кінулася мне ў галаву і каб я не збляднеў ці пачырванеў, бо кожны рускі здаваўся мне віноўнікам няшчасцяў маёй Радзімы», але хутка зразумеў, што і да рускіх «можна часам адчуваць сяброўства і ўдзячнасць» [135, с.4-6]. Выкарыстоўваючы давер і добрыя адносіны да сябе Аляксандра I, Чартарыйскі працягнуў справу Адукацыйнай камісіі: «галоўныя мае намаганні накіраваў на народную адукацыю, якой я даў нацыянальны характар» [цыт. па: 176, с.7].

Чартарыйскі накіраваў адукацыйную справу да палітычнага і культурнага адасаблення губерняў Віленскай навучальнай акругі ад усходняй Расіі і да злучэння іх з Польшчаю. Дваццаціаднагадовая дзейнасць Чартарыйскага на пасадзе апекуна акругі (5.02.1803 — 17.04.1824) дала багатыя плёны, якія дазваляюць сказаць, што Беларусь нават у часы Рэчы Паспалітай не падвяргалася такой сістэматычнай і ўзмоцненай паланізацыі. Але і ў гэты час захоўвалася пачуццё «правінцыяльнай адметнасці», аб чым мы раскажам у адпаведных раздзелах. М.Навасільцаў адзначыў яшчэ адзін вынік дзейнасці Чартарыйскага: на цэлае стагоддзе затрымаў русіфікацыю Літвы-Беларусі [гл.: 542, т.2, с.180]. Ён падазраваў яго ў падтрымцы патаемных таварыстваў у Віленскім універсітэце [611, с.36].

Не будзем прыпісваць названае толькі аднаму Чартарыйскаму. Ва ўладкаванні польскай сістэмы адукацыі ў Віленскай навучальнай акрузе яму з веданнем справы і энергіяй дапамагалі Адам Казімір Чартарыйскі, Тадэвуш Чацкі, Геранім

Страйноўскі, Ян і Енджэй Снядэцкія, Гуга Калантай, Тадэвуш Матушэвіч, Людвік Плятэр [661, с.193]. Падкрэслім, што большасць гэтых людзей былі дзеячамі Адукацыйнай камісіі. Можна нават сказаць, што часта яны прымушалі Чартарыйскага прачнуцца, звярнуць большую ўвагу на школьную справу, на польскую мову, што менавіта яны «рабілі яму ўказанні і працавалі за яго», бо разумелі, што палітычнае абуджэнне Польшчы можна дасягнуць шляхам пад'ёма нацыянальнай польскай свядомасці праз паўсюднае распаўсюджванне адукацыі і польскай мовы. Выдаваемы ў Парыжы штогадовік «Крамянецкая бяседа» («Biesiada Krzemieniecka») у 1858 г. пісаў: «Мэтаю прапаганды Чацкага было тое, чаго не могуць дакрануцца, асіліць і зліквідаваць ні штыкі, ні полчышчы батальёнаў і ніякія палітычныя саюзы: гэта самабытнасць нацыянальнага духа, непераможная, нявінная, вечная. Esto perpetua! і Польшча не загінула!» [цыт. па: 188, с.490].

Вядомы польскі паэт і прафесар Віленскага універсітэта В.Поль у 1877 г. напіша: «Адукацыяй кіравалі тут не навукоўцы, а менавіта палітычныя мужы, і адсюль зыходзіла тая трапнасць у выбары сродкаў» [цыт. па: 698, с.8]. Давайце высветлім, якія ж яны былі. Нічога новага вымысліць не маглі — працягвалі выкарыстоўваць сродкі Адукацыйнай камісіі: падбор педагагічных кадраў, адпаведных праграм, прадметаў, падручнікаў, літаратуры ў бібліятэках. Вось што пісаў у 1803 г. Ф.Дмахоўскі Гуге Калантаю, які на Валыні працаваў над уладкаваннем вучэбных установаў: «...Арганізацыя публічнай інструкцыі па выбару здольных суайчыннікаў на месцы выкладчыкаў зробіць тое, што магчыма чакаць у дадзеным выпадку. Але калі настаўніцкія месцы будуць замешчаны чужаземцамі, тады давядзецца развітацца з айчыннымі навукамі, і ў асаблівасці страціць ад гэтага адукацыя» [цыт. па: 27, стб.1150]. Відаць, падабралі добрых настаўнікаў на Беларусі, бо беларускі генерал-губернатар князь Хаванскі пісаў: «Існуючая ж сістэма настаўнікаў складаецца з таго, каб пасяліць у вучнях дух чыстага паланізма, у чым яны дасягнулі сваёй мэты» [цыт. па: 524, с.245]. А таму ён дамагаўся аддзялення Віцебскай і Магілёўскай губерняў ад Віленскай навучальнай акругі ў 1824/25 гг. Навасільцаў жа падчас следства над філаматамі і філарэтамі звольніў з пасады 4 прафесароў, бібліятэкара Кантрыма, замяніў рэктара і сам стаў папячыцелем акругі.

Прадметы вывучаліся згодна з прапановамі Адукацыйнай камісіі, але былі ўнесены некаторыя змяненні: стала выкладацца

руская мова і на ёй такія прадметы, як арыфметыка, геаметрыя, расійскае права, гісторыя, геаграфія па падручніках, выдадзеных расійскай камісіяй народных вучылішч. Асаблівая ўвага надавалася польскай гісторыі, каб не «заціраліся здаровыя гістарычныя погляды ў помыслах растучых пакаленняў» [цыт. па: 689, с.210]. А.-К.Чартарыйскі ў лісце да віленскага друкара Ю.Завадскага 27 мая 1808 г. пісаў аб патрэбе выдання гістарычных твораў айчынных і замежных аўтараў, якія пісалі аб Польшчы: «Абшырнае поле займае наш праект перавыдання польскіх гістарычных твораў і апублікаванне іх у верных выданнях ці ў арыгінале, ці ў перакладзе». На працягу 1-й паловы XIX ст. былі выдадзены працы Багамольца, Мастоўскага, Галенжоўскага, Дзялынскага, М.Маліноўскага, А.Пржэздзецкага і іншых [622, т.2, с.16]. Значная роля надавалася польскай мове, на якой, па словах Я.Снядэцкага, «усе маглі хораша і правільна гаварыць і пісаць», бо той, хто «лёгкадумна ставіцца да сваёй мовы, той замежнік на сваёй зямлі; ён не ўнаследаваў духа продкаў і мову народа аддзяляе ад мовы навукі [цыт. па: 188, с.532,536]. Развіваць польскую мову было важна і таму, што вышэйшыя колы, якія задавалі тон культурнаму жыццю, карысталіся французскай моваю і стрымлівалі польскую, «грубую, неабчэсаную і магчымую толькі ў хаце чалядніка» [645, с.128]. Заўважым, што турбаваліся аб чысціні польскай мовы на тэрыторыі Літвы, Беларусі, Украіны, якія ўваходзілі ў Віленскую навучальную акругу. Калі б у Вільні не запалілася бы святло, пісаў Г.Калантай да Я.Снядэцкага 30 жніўня 1803 г., дык, можа, яно «загасла бы цалкам для палякаў і для іх мовы» [632, с.54].

Падручнікамі карысталіся тымі, якія былі падрыхтаваны Адукацыйнай камісіяй, а таксама тымі, якія былі ў карэннай Польшчы, княстве Пазнанскім і Галіцыі, нават у Еўропе — усё на польскай мове і прыдатнае для школ рознага тыпу [622, т.2, с.126]. Напрыклад, падручнікі па праву Страйноўскага і Г.Калантая, па грэчаскай літаратуры Гродка, па польскай літаратуры Бенткоўскага, па касцельнай гісторыі Ю.Бельскага і д.п. Асаблівую ўвагу звярнулі на падручнікі для пачатковых школ. Яны павінны былі не толькі развіваць розум дадзенай навукаю, але і «фармаваць сэрца... старацца, каб з гэтай навукі мог быць добры ўжытак». Прыкладам магла быць кніга для чытання «Пілігрым з Дабраміля» княжны Чартарыйскай, у якой былі змешчаны 40 малюнкаў польскіх каралёў [710, z.10, s.871; 622, т.2, с.198,203-204,221-222].

Ю.Завадскі пісаў А.-К.Чартарыйскаму 7 чэрвеня 1809 г. аб патрэбе ў Вільні, дзе вялікая колькаць вучняў і настаўнікаў, часопіса [622, т.2, с.26]. З 1815 г. сталі выходзіць «Dziennik Wilenski» і «Tygodnik Wilenski» («Віленская газета» і «Віленскі штотыднёвік»), з 1841 г. — «Ateneum Wilenski» («Віленскі Атэнэўм»), якія ўнеслі пэўную ролю ў адукацыю і выхаванне беларускай моладзі ў польскім духу і ліцвінскай краёвасці. Гэта адзначыў, напрыклад, сябра патаемнага таварыства М.Чарноцкі ў сваіх успамінах [564, с.13].

У выхаванні націск рабіўся на фарміраванне ў моладзі любові да Айчыны і актыўнай жыццёвай пазіцыі — выхаванне грамадзян і патрыётаў. Чартарыйскі ў аўтабіяграфіі пісаў: «Справа ў тым, што ўсё маё жыццё адзінай сілаю, якая кіравала маімі дзеяннямі, была любоў да Айчыны. Усё тое, што не магло прынесці карысці ні маёй краіне, ні маім суайчыннікам, не мела для мяне ніякай каштоўнасці. З дзіцячых гадоў я прывык любіць і цаніць толькі тое, што мела прамыя або ўскосныя адносіны да Радзімы» [135, с.23]. Гэта ж хацелі атрымаць ад беларускай моладзі. Праз выкладаемыя навукі ўкараняліся польскія ідэалы і традыцыі, рыхтавалася нараджэнне (а не адраджэнне) Польшчы «ад мора да мора», якой яна ніколі не была (бо такой краінай было ВКЛ).

«Святая справа» А.Чартарыйскага дала свае плады: палітычна актыўная моладзь пачала згуртоўвацца ў легальныя, паўлегальныя і патаемныя гурткі і таварыствы. Фактарам, які прыспяшаў гэты працэс, была франка-руская вайна 1812 г. Тамаш Зан ужо ў 1813-1814 гг. арганізаваў з вучняў Маладзечанскага вучылішча таварыства «Войска Марса і Апалона», сябры якога прагульваліся за горадам, маршыравалі, разыгрывалі бітвы, расказвалі гісторыі аб слаўных людзях старажытнасці, імёнамі якіх называлі сябе. Услаўленыя вучні-вайскоўцы ўзнагароджваліся крыжамі з залатой паперы («Крыж святой любві да Айчыны»). У 1815 г. Зан напісаў марш для войска, дзе заклікаў юнакоў спяшацца на дапамогу Напалеону Банапарту. У камедыі «Пастаянства ў сяброўстве» Зан усхваляў памерлых за Айчыну і гаварыў аб надзеі адраджэння Польшчы на Венскім кангрэсе [301, ф.Шильдера, кар.19, №12, с.48; 524, с.269].

У 1817—1822 гг. у Вільні дзейнічала дазволенае мясцовымі ўладамі таварыства шубраўцаў (літаральны пераклад слова — валацугаў, але ўжывалася яно для назвы так званых «убогіх» літаратараў, якія пісалі для сярэдняга саслоўя). Заснавальнікамі

таварыства былі, па словах рускага гісторыка асветы С.Бархатцава, «паплечнікі Чартарыйскага па справе апалячвання Паўночна-Заходняга краю» прафесар хіміі, філосаф Енджэй Снядэцкі; доктар філасофіі і медыцыны, прафесар Якаў Шымкевіч (ён быў першым, а Снядэцкі — другім прэзідэнтам); сакратар Віленскага універсітэта, загадчык бібліятэкі і супрацоўнік універсітэцкага выдавецтва К.Кантрым. Апошні разам са студэнтам М.Балінскім напісалі статут таварыства, які меў 16 параграфаў [682, т.1, с.59-60,66-68]. Звернем увагу на два з іх: у першым гаварылася, што добра зразумелае каханне да Айчыны — гэта не ўсхваленне ўсяго свайго, кроўнага, а і крытыка недахопаў, каб выправіць іх; у чацвёртым быў запісаны абавязак сяброў таварыства ўзяць сабе імя нейкай выдатнай асобы з гісторыі ВКЛ і падрыхтаваць пра яе артыкул для сатырычнага выдання «Wiadomosci Brukowe» («Вулічныя навіны») [27, стб.1181-1182].

Гэта быў орган таварыства, якое спачатку і збіралася для яго выпуску і распаўсюджвання, а пазней мела яўную і патаемную мэты. Адкрыта шубраўцы выступалі ў сваіх артыкулах (за 6 гадоў выйшла 287 нумароў) супраць заганаў у жыцці грамадства, заклікалі да асветы, любові, да прыстойнага жыцця. Гэтым яны хацелі, як піша Бархатцаў, «ачысціць і ажывіць у ім (грамадстве — *В.Ш.*) усведамленні былыя польскія ідэалы і адрадзіць імкненне да іх, прымірыць варожыя па якіх-небудзь прычынах польскія элементы ў краі і зрабіць іх паміж сабой салідарнымі, а галоўнае — узбудзіць у іх патрэбу палітычнай і гістарычна-польскай адукацыі, каб праз гэта зрабіць іх потым мімавольнымі саўдзельнікамі ў пачынаючымся патрыятычным руху» [132, с.36].

Але не трэба перабольшваць «польскасць» шубраўцаў. У 147 нумары «Вулічных навін» быў змешчаны артыкул аб «Варшаўскім сябры», які надаслаў ім ліст, дзе між іншым пісаў: «Праўда, іншы раз нават вашы прыхільнікі скардзяцца, што для палякаў вы пішаце па-кітайску, што яны не могуць разумець вас. Вы пішаце для Літвы, а не для Кароны. Вы менш клапоціцеся аб тым, ці зразумее вас Варшава, абы толькі зразумелі вас Вільна і Літва... » [524, с.257]. Шубраўцы імкнуліся да адраджэння Літоўска-Польскай канфедэрацыі з палітычнай аўтаноміяй для Літвы.

У 1806 г. студэнт Віленскага універсітэта І.Лялевель і ад'юнкт К.Кантрым стварылі таварыства філаматаў. Яно не

было тыйным, а нават наадварот — імкнулася да шырокага апавяшчэння сваёй дзейнасці і было, як піша польскі даследчык Трацяк, «аздоблена найвялікшымі святцілямі навукі» [682, т.1, с.130-131]. У 1816 г. вучні Лялевеля аднавілі таварыства. Па сведчанню Ф.Ежоўскага, ён, А.Міцкевіч, Т.Зан, А.Петрашкевіч, «маючы блізкія паміж сабой зносіны, разважаючы аб навуках, пісьменніках, кнігах, склалі даволі цесную кампанію, або таварыства». Гэтае пацвярджаюць і паказанні Міцкевіча. Канчатковае афармленне ў самастойную тайную арганізацыю адбылося ў кастрычніку 1817 г. [637, с.7].

Можна сказаць, што з гэтага часу пачалася філаматцкая эпоха ў развіцці патаемных і паўпатаемных арганізацый на тэрыторыі Беларусі і Літвы, бо ад філаматаў зыходзіла ініцыятыва аб іх стварэнні, яны аказвалі ўплыў на характар дзейнасці больш дзесяці вучнёўскіх, студэнцкіх і нават ваенных гурткоў і таварыстваў. Іх аб'ядноўвала мэта — барацьба за нацыянальнае адраджэнне, а таксама тактыка дзеянняў: каб надаць філаматычнаму руху ў вачах непрысвечаных «нявінны выгляд», была прыдумана «ідэя дзвюх мэтаў». Для адных — вывучэнне навук і дапамога ў гэтым іншым, выхаванне ў дабрадзейнасці і брацкім каханні, заняцце літаратурай, рамёсламі і мастацтвамі, распаўсюджванне адукацыі ў грамадстве. Такая «адкрытая» мэта, па словах Ф.Малеўскага, будзе прыцягваць любога дабрамыснага чалавека, які наўрад ці здагадаецца, што гэта пачатковы пункт вялікіх і смелых намераў [238, с.26]. Для кіраўніцтва і справадзейных членаў адкрываецца «патаемная» мэта: адраджэнне гуманных адносін у грамадстве, ліквідацыя прыгоннага права, аднаўленне Рэчы Паспалітай з захаваннем аўтаноміі Літвы.

Кожная з ніжэйпрыведзеных арганізацый заслугоўвае асобнага даследавання, але мы не маем магчымасці разгледзець іх у адпаведных аб'ёме і глыбіні. Звернем увагу толькі на тыя старонкі гісторыі іх дзейнасці (у большасці невядомыя ці малавядомыя ў беларускай гістарыяграфіі), якія патрэбны для больш поўнага даследавання нашай праблемы.

У развіцці філаматцкага руху значную ролю адыграў А.Міцкевіч: ён стаяў ля вытокаў таварыства філаматаў, з'яўляўся сааўтарам трох яго статутаў, дамагаўся рэфармавання філаматаў у агульнанародную палітычную арганізацыю на тэрыторыі ўсёй былой Рэчы Паспалітай [гл.: 425, с.126-136]. Пад яго ўплывам у 1819 г. быў створаны «Саюз сяброў», у які

ўвайшлі ўсе філаматы [598, с.30-31; 239, с.25-26]. У 1822 г. ён разам з іншымі філамацкімі ступенямі быў рэарганізаваны ў саюз філадэльфістаў (гл. схему Д.7.1). Такім чынам, была створана разгалінаваная сетка арганізацый, падпарадкаваных вышэйшым ступеням праз сваіх кіраўнікоў.

Погляды філаматаў добра характарызуюць іх сачыненні і рэфераты выступаў на паседжаннях. У архіве захавалася копія дысертацыі філамата А.Сузіна пад назваю «Паляк да суайчыннікаў сваіх такога роду ёсць». Аўтар праслаўляе Напалеона, які ўваскрэсіў палякаў, і піша, што злучэнне з «масквіцянамі» — гэта «ніякіх відаў шчаслівага будучага, гонару і асалоды, а наадварот, крайняя бядота і няшчасце». Ён жадае вяртання былых межаў Польшчы [302, ф.156, воп.1, спр.96, а.469,471-472]. Другім кумірам філаматаў быў А.-Т.Касцюшка. Яны праслаўлялі яго ў сваіх творах, прысвячалі яго дзейнасці свае рэфераты, удзельнічалі ў жалобных набаженствах у кастрычніку 1817 г., што ўжо лічылася, як пісала нейкая ўрадавая асоба, «орудием политических злоумышлений» [302, тамсама, а. 499]. У рэфератах гучалі тэмы па гісторыі дзяржавы і права ВКЛ, Польшчы, старажытных краін [691, с.458-476].

Важна адзначыць ліцвінскі характар філаматаў і таварыстваў імі арганізаваных. Так напрыклад, пасля следства імперскі камісар М.Навасельцаў у сваім рапарце Канстанціну Паўлавічу заўважыў, што допыты філаматаў і філарэтаў «ясно обнаружили, что под словом приверженность к своему краю разумелась не приверженность к Российской империи вообще, но только к губерниям, составляющим Виленский учебный округ» [Цыт. па: 409, с.20]. Другі факт — заснавальнікамі таварыства філаматаў сталі: А.Міцкевіч з Навагрудка, Т.Зан з Маладзечна, А.Петрашкевіч з Мінскай губ. Уістокаў быў і Я.Чачот з Гродзенскай губ. Трэці факт — з арыштаваных 108 філаматаў і філарэтаў, па дадзеных на 1822 г., было з Мінскай губ. — 22 чал., з Гродзенскай губ. — 25, з Беластоцкай вобл. Гродзенскай губ. — 7, з Вілен. губ. — 27 [149, с.81-84]. Па іншых дадзеных: з Мінскай губ. было 33 філаматы і філарэты, з Гродзенскай губ. — 28, з Магілёўскай — 5 [39, т.4, с.270-271]. Такім чынам, ад 81 да 104 чалавек было ліцвінскага (беларускага) паходжання.

Слушна пісала А.Віткоўска, што ў мурах Віленскага універсітэта сустрэлася моладзь, выхаваная на беларускай рэгіянальнай культуры «herbowego gminu» (простанароддзя),

«аб’яднаныя ў Вільні, у мурах адной вучэбнай установы, адчулі сябе «аддзінствам моцным», упаўнаважаным да захоўвання сваёй рэгіянальнай асаблівасці. Нават больш. Літоўская рэгіянальнасць стала асабліва актыўнай часткай іх свядомасці, іх спосаба бачання сябе. Суправаджае ім яна таксама няўстанна, як цвярозае разуменне грамадскай сітуацыі, і пазіцыя ў жыцці, якую бацькі не падаравалі і якую трэба здабыць самому» [687, с.10]. Сваю «Літву, бацькоўскі край» увасаблялі філаматы і філарэты ў сваіх літаратурных творах, асабліва А.Міцкевіч, Я.Чачот, Т.Зан, А.Петрашкевіч [гл: 394]. Яны вельмі любілі сваю Радзіму і не забываліся пра яе нават у далёкім замежжы. «Нідзе на зямлі, — пісаў Міцкевіч сябрам па эміграцыі, — няма такога бесклапотнага жыцця, як у літоўскіх вёсках і засценках. Колькі там радасці, любові, заўсёднага жыцця для ўсіх. Можа, Бог не дасць ужо вярнуцца да гэтага жыцця, але я павінен нешта зрабіць, каб захаваць тое дарагое *нацыянальнае зерне* (курсіў мой — *В.Ш.*) і даць іншым адчуць яго вартасць» [233, с.7].

Удзельнікі філамацкага руху спрабавалі вывучаць свой край у час канікул. Была падрыхтавана і без дазволу ўлад надрукавана ў віленскай базыліянскай друкарні інструкцыя «Геаграфічнае апісанне». Яна раздавалася ў 1821 г. філарэтам для вывучэння і статыстычнага апісання сваіх парафій па такіх пытаннях, як: месцазнаходжанне населенага пункта, яго прастора і паверхня, дарогі, рэкі, каналы, клімат, стан насельніцтва, развіццё эканомікі, маральны стан, норавы, звычаі, матэрыяльная і духоўная культура. А яшчэ цікавіла, як даносіў Навасільцаў, «дух у дваранстве — любоў да Айчыны», «нацыянальны дух іншых станаў грамадства» [303, ф.735, воп.10, с.7, а.283,285]. Прыкладам напісання інструкцыі магла быць падобная «Інструкцыя для складання ў гімназіях і павятовых школах запісаў па прадметах розных навук», падрыхтаваная З.Даленга-Хадакоўскім і Л.Шырмай, а ўзорам зробленага апісання — «Статыстыка Літоўска-Гродзенскай губерні» І.-Э.Ляхніцкага, выдадзеная ў той жа друкарні Ю.Завадскага [609].

Малавядомымі з’яўляюцца кантакты філаматаў з расійскімі і польскімі патаемнымі арганізацыямі. З Паўночным таварыствам дзекабрыстаў яны, магчыма, былі звязаны праз Пелчынскага, які працаваў у канцылярыі міністэрства духоўных спраў і народнай адукацыі. Да тайнага таварыства ён не належаў, але быў чалавекам прагрэсіўных поглядаў. Знаёмы з А.Гнедзічам, у чэрвені 1822 г. быў выбраны ў член-

карэспандэнты «Вольнага таварыства любіцеляў расійскай славеснасці», дзе сустракаўся з К.Ф.Рылеевым і А.А.Бястужавым, В.К.Кюхельбекерам. Філаматы пісалі Пелчынскаму, а ён ім пра важныя палітычныя падзеі, прычым карысталіся для перасылкі эстафетай з Варшавы ў Пецярбург (ад Канстанціна Паўлавіча да статс-сакратара Сабалеўскага, з чыноўнікамі канцылярыі якога Пелчынскі пазнаёміўся). У жніўні 1821 г. Пелчынскі сустракаўся з прэфектам Віленскага універсітэта І.С.Анацэвічам [262, с.60].

У архіве філаматаў захаваўся спіс месцазнаходжання былых філаматаў па стану на жнівень 1822 г. У Пецярбурзе жылі: Ян Гарайн, Дамінік Арліцкі, Каетан Пшэцішэўскі. Першыя два — інжынеры. Служылі юнкерамі браты Ігнаці і Бруно Шэмёты, Вікенці Бабінскі, Юзаф Шадкевіч. Магчыма, яны сустракаліся паміж сабой і з Пелчынскім [541, т.II, с.255-256]. У канцы 1819 г. у Пецярбург прыехаў Зарыян Даленга — Хадакоўскі (Адам Чарноцкі), вядомы ўжо ў той час этнограф, гісторык, даследчык старажытнай гісторыі славян. Пацвярджэннем існавання сувязяў можа быць факт прыняцця ў асяроддзе дзекабрыстаў сасланых філаматаў А.Міцкевіча, Ю.Ежоўскага, Я.Сабалеўскага ў лістападзе 1824 г.

Пра сувязь філаматаў з Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў сведчыць паездка ў Вільна падчас падрыхтоўкі Бабруйскай змовы ў 1823 г. М.Бястужава — Руміна. У следчым камітэце першым сказаў пра яе Мацвей Мураўёў-Апостал: «У 1823 г. Дырэктарыят даручыў майму брату (Сяргею Мураўёву-Апосталу — *В.Ш.*) і Бястужаву (М.Бястужаву — Руміну — *В.Ш.*), якія знаходзіліся каля Кіева, сабраць звесткі аб адным палітычным таварыстве, якое павінна існаваць у Царстве Польскім і нашых польскіх губернях. Служба не дазваляла майму брату рабіць частыя ад'езды, Бястужаў прыняў на сябе гэтае даручэнне. Ён ажыццявіў паездку ў Вільна, дзе ён павінен быў знесціся з адным пасланым ад Польскага таварыства». Сам М.Бястужаў-Румін на пытанне адказаў: «Я быў у Вільні ў верасні 1823 г. па асабістай справе, жыў увесь час у аднаго знаёмага, ні з кім не знаёміўся і нікога са значных чым-небудзь асоб не бачыў» [63, т.IX, с.93, 200].

Але гэта не так, бо ехаў ён туды, добра ведаючы да каго. М.Бястужаў-Румін пазнаёміўся праз свайго знаёмага, наглядальніка над шпіталямі Фрыдбурга, з князем К.Радзівілам — адным з кіраўнікоў віленскага філіяла Патрыятычнага

таварыства, ад якога мог даведацца пра філаматаў [262, с.62]. А.Міцкевіч у «Дзядах» прыводзіць размову члена таварыства Юсціна Поля з Бястужавым на бале ў Навасільцава [234, с.253-255]. Гісторык Шыльдер, даследуючы матэрыялы Варшаўскай следчай камісіі, зрабіў заўвагу аб тым, што некаторыя з членаў Патрыятычнага таварыства ў Вільні, напрыклад, Зан, належалі таксама і да філаматаў і філарэтаў. І.Лялевель быў сябрам Патрыятычнага таварыства, а ён выйшаў на універсітэцкую моладзь, у тым ліку меў уплыў на філаматаў і філарэтаў [301, кар.43, №84, а.29 аб.,101 аб.]. А мы ведаем ужо, што менавіта яго таварыства філаматаў было адроджана ў 1816 г.

У 1823 г. М.Навасільцаў перахапіў у Варшаве ліст аднаго з віленскіх студэнтаў-філарэтаў і даведаўся аб існаванні патаемнага таварыства. Пачаліся арышты, падазроных прывозілі з Варшавы, Пецярбурга, Берліна — у Літве, Беларусі, на Валыні, Украіне і Падоліі пачалася паніка [577, с.117-125]. Следства ішло 11 месяцаў і скончылася ў маі 1824 г. Прысуд вынес Спецыяльны камітэт на чале з графам А.Аракчэевым 14 жніўня. Адзінаццаць філаматаў і дзевяць філарэтаў былі сасланы ў «дальние от Польши губернии» ў званнях адпаведна набытым імі здольнасцям. Аддаляліся ад настаўніцкіх пасад у Полацкім піярскім вучылішчы ксяндзы К.Львовіч і М.Брадовіч, з пасад прафесароў Віленскага універсітэта І.Лялевель, М.Баброўскі, І. Даніловіч (ім забаранілі жыць у Вільні і прымусова выселілі: Лялевеля — у Каралеўства Польскае, Баброўскага — пад нагляд духоўнага начальства, Даніловіча «вне польских губерний»). Прафесар Галухоўскі адлучаўся ад універсітэта з дазволам выехаць з Расіі на радзіму. Філаматаў Я.Чачота і А.Сузіна прыгаварылі да 6 месяцаў, а Т.Зана — да 1 года зняволення ў крэпасці з наступным высяленнем у расійскія губерні. Асаблівая ўвага звярталася на кнігі і падручнікі, якія трэба было старанна пераглядзець. «По части училищного надзора» акрэслены меры па ўзмацненню нагляда за студэнтамі [302, ф.156, воп.1, спр.96, а.96,473-474,511,513-518 адв.; 250, ф.1, воп.2, спр.246, а.222 адв.-226 адв.].

Здавалася б, філаматы і філарэты разгромлены, але ёсць некаторыя даныя, якія ўказваюць на іх існаванне. Сенатар Навасільцаў гэта адчуваў — у лісце да вялікага князя Канстанціна Паўлавіча ад 24 сакавіка 1825 г. пісаў, што таварыства філаматаў працягвае існаваць і «служыць, як можна лічыць, тайнай зброяй былых сваіх сачленаў да

распаўсюджвання незадавальнення супраць урада» [цыт. па: 610, с.115]. Аб тым, што карані філарэцкага таварыства не вырваны, Навасільцаў быў упэўнены: «Но корень оного по сокровенности своей ещё существует» [302, ф.156, воп.1, спр.96, а.611,614,616].

Ці ёсць факты, якія пацвярджаюць прадчуванні Навасільцава? У паліцэйскіх рапартах за 1825 г. адзначаны сходкі былых філаматаў і філарэтаў у Вільні, на якіх прысутнічалі Мар'ян і Казімір Пясецкія, браты Зана Ігнаці і Стэфан, браты Ежы і Аляксандр Міцкевічы, Станіслаў Казакевіч, Ян Гацыскі, Юзаф Поль, Міхаіл Рукевіч [610, с.116]. Другі факт: Міцкевіч, высланы ў Адэсу 3 мая 1825 г., аднаўляе сувязі з віленскімі сябрамі. У адным з лістоў Малеўскага да сястры ў сярэдзіне мая Міцкевіч просіць яе, каб М.Пясецкі дастаў і пераслаў вершы: «І.Лялевелю», «Дзядам», «Да мастака», аповесць «Жывіля» без купюр цэнзуры, перапісаны «Дон- Карлос», «Оду да юнацтва» (звернем увагу на падбор твораў). У пачатку ліпеня 1825 г Міцкевіч сустракаецца са сваім сябрам доктарам К.Качкоўскім і мастаком Я.Траяноўскім [гл.: 425, с.124-125]. Цікавая сустрэча адбылася ў яго 21 і 24 ліпеня з доктарам С. Гацыскім у Акермане. Гацыскі — навагрудчанін і сябра па універсітэту. Міцкевіч ведаў і яго сваякоў — сяброў масонскай ложы «Вузел еднасці на ўсходзе Навагрудка» [447, с.50-53].

Па ўспамінах М.Чарноцкага, вядома яшчэ адно таварыства філамацкага напрамку — «Думаючай моладзі» (першапачатковая назва «Шасці») у складзе 8 студэнтаў Віленскага універсітэта. Ініцыятыву стварэння выказала група з чатырох выпускнікоў Мінскай гімназіі, паступіўшых ва універсітэт у 1815 г. Да іх далучыліся ў 1819 г. іншыя, і 18 студзеня адбылося першае паседжанне. На пратаколе апошняга стаіць дата 29 чэрвеня 1819 г. Старшынёй таварыства быў П.Пенчкоўскі, а сакратаром — М.Чарноцкі. Як і ў філаматаў, на паседжаннях данага таварыства чыталіся творы сяброў (Т.Зана, Ю.Ходзькі), рэфераты аб слаўных гістарычных постацях (А.-Т.Касцюшцы, Ю.Панятоўскім, М.Глінскім, Г.Калантаі, Т.Чацкім і інш.), аб вольнасцях народаў, аб сапраўдным патрыятызме і інш. [564, с.14-15, 31-35].

У кастрычніку — лістападзе 1819 г. сярод вучняў шостага класа Свіслацкай гімназіі існавала таварыства «Аматараў навук і айчыннай славеснасці» (або «Навуковае»), створанае пад уплывам В.Гельтмана, выдаўцы «Варшаўскай дэкады» — органа

Саюза вольных палякаў. У лісце да брата Юзафа, які вучыўся ў гімназіі, ён даслаў праект статута арганізацыі і пісаў: «Я з верагоднасцю магу сцвярджаць, што маладое пакаленне, якое цяпер знаходзіцца ў школьных сценах і імкнецца да адукацыі, па выхаду з іх, усюды разнясе з сабою асновы аднадушнасці, згоды і сяброўства, якім паспее пранікнуцца ў маладосці, — не разарве іх ніякая сіла, — зрабіўшыся грамадзянамі, яны стануць сынамі адной Айчыны» [Цыт. па: 523, с.141]. Вядомы 15 сяброў таварыства, якіх узначаліў старшыня Д.Шлаеўскі, а сакратаром быў выбраны Р.Вашчыловіч. Яны імкнуліся паводле статута «да ўзаемнай асветы шляхам удасканальвання айчыннай мовы і памнажэння твораў польскай славеснасці» [523, с.142; 149, с.4]. На следстве Шлаеўскі прызнаўся, што ў прамовах і сачыненнях сяброў таварыства «змяшчаліся патрыятычныя думкі ў польскім духу, успаміны аб слаўных мужах былой Польшчы, уплыў быць падобнымі да іх на славу Айчыне і пераконванне, каб у таварыстве захоўвалі адзінадушнасць, роўнасць, патаемнасць і паслухмянасць начальству вучылішча» [302, ф.156, воп.1, спр.96, а.280-280 адв.].

Са студзеня па ліпень 1820 г. дзейнічала Маральнае таварыства, аб'яднаўшае каля 10 былых свіслацкіх гімназістаў, якія працавалі гувернёрамі ці хатнімі настаўнікамі малодшых вучняў. Я.Абрамовіч склаў статут, паводле якога кожны павінен «для ўдасканальвання сябе ў чыстым польскім слогу займацца рознымі сачыненнямі» і адзін раз у тыдзень выступіць на паседжанні з прамовай [149, с.11,12]. У апошніх быў выразна бачны ліцвінска-польскі патрыятычны дух: усхвалялі Л.Сапегу, Г.Калантая, Жалігоўскага, Замойскага, Тарноўскага і іншых выдатных асоб былой Рэчы Паспалітай, ідэалізавалі яе мінулае. Так, напрыклад, сакратар таварыства І.Качальскі ў сваёй прамове гаварыў з відавочным намёкам на Аляксандра І: «Да чаго валадырам сусвета кіраваць агромнымі дзяржавамі і заваёўваць з ненасытнаю прагнасцю новыя краіны, калі самі ў сябе кіраваць не ўмеюць» [149, с.13,14].

У красавіку — чэрвені 1820 г. сярод віленскай студэнцкай моладзі існавала легальная арганізацыя маральна-асветніцкай і палітычнай накіраванасці, створаная філаматам Т.Занам (Архі, Архіпрамяністы) пад назвай «Прамяністыя» («Таварыства сяброў карыснай забавы»). Яны павінны былі стаць, па словах Т.Зана, «ахоўным шчытом» філаматаў, «свайго роду сцяной, аб якую разаб'юцца ўдары, калі яны будуць калі-небудзь на нас

абрушаны» [541, cz.2, t.2, s.62,132]. Што і адбылося падчас следства ў 1823 г., калі легальнасць прамяністаў дазволіла ўтаіць палітычны характар філаматаў і змякчыць прысуд. Статут, або «Пятнаццаць правілаў паводзін для моладзі, якая належыць Таварыству сяброў карыснай забавы» напісаў Ю.Ежоўскі [677, с.67; 149, с.22]. Паводле яго мэтай прамяністых было далучэнне моладзі да навукі, дабрадзейнасці, прыстойнасці, разважлівасці, добрых паводзін, сяброўства, ўзаемадапамогі. Як успамінаў, прамяністы К.Качкоўскі, «праца, стараннае і сумленнае выкананне сваіх абавязкаў, маральныя паводзіны і ўзаемная павага да сябе, нарэшце, пастаянная падтрымка роднай мовы, літаратуры і гісторыі і ў цэлым усіх навук, наколькі магчыма, па-польску і сумесная дзейнасць па найшырокаму развіццю ў краі асветы» [цыт. па: 615, т.1, с.199-200].

За афіцыйна зацверджанымі маральнымі правіламі хаваўся патрыятычны характар прамяністых. VII правіла абвяшчала «Калі адчуеш прыхільнасць да айчыннай зямлі, дык можаш быць упэўнены, што зрабіў вялікі крок на шляху ўдасканальвання свайго сэрца». У VIII правіле гаварылася: «Прыхільнасць да айчыннай зямлі заключаецца ў тым, каб жадаць дабра сваім суайчыннікам рознага стану і ўсяму народу навогул, захоўваць карысныя звычаі сваіх бацькоў, любіць прыродную мову і вывучаць яе, мець у памяці гонар і подзвігі продкаў і наследаваць ім па меры сваіх сілаў і стану» [524, с.259]. Думкі аб адраджэнні Польшчы праявіліся ў створаных прамяністамі песнях, вершах, прозе, праграмных сачыненнях. Гучны рэзананс мелі маёўкі, якія адбыліся 19 красавіка, 18 і 30 мая ў наваколлі Вільні (Пагулянцы, Паплавах, Грыбішках). На іх прамяністыя чыталі свае вершы і прозу, выступалі з прамовамі, спявалі народныя песні, гралі ў розныя гульні, у перапынках пілі малако з белым хлебам або свежымі пірагамі. Філаматы, якія ўдзельнічалі ў маёўках, пазнавалі моладзь, з ліку якой вербавалі «шчырых і адкрытых» для тайных таварыстваў [677, с.66,68,298; 598,с.84; 569, с.88-90].

Даследчык Б.Ліманоўскі лічыць, што ўплыў прамяністых распаўсюджваўся на вучнёўскую моладзь «да ваколіц Себежа на Белай Русі, а з іншага боку да Крэмянца і Беластока» [615, т 1., с.201]. Колькасць іх дасягала, па розных дадзеных, ад 150 да 300 чал. (каля 33% віленскіх студэнтаў) [615, т.1, с.200; 196, с.32; 662, с.52]. Распаўсюджванне прамяністых выклікала ў кансерватыўных грамадзянаў, бацькоў студэнтаў, рэакцыйнай

часткі прафесароў універсітэта і святароў нараканні, якія прывялі да забароны таварыства. Пасля канікул студэнты павінны былі даць падпіску аб непрыналежнасці да яго. У красавіку-маі 1822 г. па даносу прафесара матэматыкі Вырвіча адбылося першае следства па справе прамяністых. Следчы камітэт адрапартаваў А.Чартарыйскаму так, як ён хацеў: ніякага тайнага таварыства не існавала, а было дазволенае рэктарам. За Т.Занам, Т.Лазінскім, А.Міцкевічам быў усталяваны нагляд [506].

Турбуючыся пра пашырэнне сваёй дзейнасці, філаматы стваралі новыя таварыствы. Мала вядома пра Саюз айчынных натуралістаў, пра які паведаміў Міцкевіча Ю.Ежоўскі. У сваім адказе 17 мая 1820 г. Міцкевіч напісаў: «Дзякуй табе за лаканічнае данясенне: «Саюзы памнажаюцца». Якія? ці гэта пра колькасць саюзаў, ці асоб? Якімі асобамі? Праект аб саюзе натуралістаў Тамаша архівыратавальны. Хацеў бы толькі, каб і жывёлы, і матылі, і птушкі літоўскія (чытай беларускія — *В.Ш.*) збіралі для ўтварэння кабінета літоўскай натуральнай гісторыі. Кожны павінен прыкласці пры ахвяраваным экзэмпляры яго апісанне, што чуў пра яго, што чытаў і што назіраў сам, бо шмат, напрыклад, насякомых не ведаем, або іншых ведаем памылкова» [598, с.100]. Колькі праіснаваў саюз, хто ў яго ўваходзіў, на жаль, на сённяшні дзень невядома.

З верасня 1820 г., калі Зан разам з Ф.Малеўскім напісалі статут таварыства, вядуць сваю гісторыю філарэты. 30—40 былых прамяністых склалі аснову, а потым далучыліся іншыя — колькасць усіх падаецца розная: па матэрыялах следства — 166 чал., па ўспамінах І.Лабойкі — 215 чал, па паказаннях паліцыі і па дадзеных гісторыка У.Ігнатоўскага — 300 чал. [132, с.36; 577, с.30; 523, с.129]. Усе сябры падзяляліся на 4 аддзелы адпаведна 4 факультэтам універсітэта, а таксама на саюзы (гл. схему Д.8.1). Адміністрацыя таварыства была вышэйшай і ніжэйшай (гл. схему Д.9.1). Аб мэце філарэтаў гаварылася ў першым параграфе статута: «Узаемная дапамога ў патрэбе, у авалоданні ведамі і ўмацаванні маральнасці, каб кожны з карысцю мог быць выкарыстаны ў дзяржаўнай службе...» [149, с.24]. Вось што казаў у адной са сваіх прамоў С.Макавецкі: «Палітычныя падзеі і Урад, пад якім цяпер знаходзімся, ясна даказваюць нам, што цеснае сяброўства і злучэнне юнакоў у адзін саюз ёсць неабходнасць, каб пры выпадку падаць сяброўскую руку і, злучаючы руку з рукой, вярнуць Айчыне былое яе існаванне» [149, с.41]. Гэты ж змест

і ў вершы Я.Янкоўскага, прачытаны на імянінах М.Маліноўскага: «Калі неапантаная сквапнасць дзікіх суседзяў выкрала ў нас Айчыну і цяжкія аковы наклала на храбры Богам каханы народ, дык усемагутны валадар нябёс, каб аслабіць нашу долю, стварыў новае племя старажытных сарматаў. Вы, браты, складаеце гэтае племя, вам прадвечная мудрасць» [302, ф.156, воп.1, спр.96, а.437 адв.].

Патрыятычны характар таварыства філарэтаў даказваюць наступныя факты. Статут патрабаваў ад усіх уступаючых падпісаць прысягу-абяцанне «словам паляка». Патрыятычныя заклікі, узбуджэнне польскай нацыянальнасці і любові да былой Айчыны гучалі ў вершах, сачыненнях і прамовах філарэтаў. Яны чыталі кнігі па польскай гісторыі (напрыклад, Ю.Нямцэвіча, С.Сташыца, Г.Калантая, Ф.Чапскага, Ф.Макульскага). Захоўвалася патаемнасць сходаў філарэтаў, кожны абяцаў: «...Ні перад нікім аб існаванні і аб занятках таварыства абвяшчаць ня буду...» [149, с.25-26,49,57; 524, с.260,265-266] .

У пачатку 1821 г. было прынята рашэнне аб рэарганізацыі таварыства. Жадаючыя маглі ўнесці свае прапановы. Кіраўніцтва падверглася крытыцы за ўзурпацыю ўлады, ізаляванасць ад астатніх сяброў, за вялікія навуковыя абавязкі [541, cz.2, t.2, s.376-377,403]. У пачатку мая 1822 г. Т.Зан вырашыў спыніць дзейнасць таварыства. Для гэтага былі аб'ектыўныя прычыны: некаторыя студэнты скончылі універсітэт, другія ахладзелі да філарэцкіх абавязкаў, выязджаў з Вільні Зан, выйшаў указ аб закрыцці масонскіх і іншых патаемных таварыстваў, узмацніўся нагляд паліцыі за віленчанамі ў сувязі з падрыхтоўкай царскага агляду гвардыі. Зан напісаў 7 экзэмпляраў акта аб закрыцці таварыства і запрасіў да сябе праваднікоў, якім даручыў сабраць паседжанні ўсіх саюзаў у адзін час і абвясціць аб закрыцці таварыства. З усіх былі сабраны падпіскі з абавязацельствам захаваць яго існаванне ў таямніцы. Гэтыя паперы разам з актамі і пратаколамі паседжанняў Зан спаліў [149, с.38; 524, с.267]. У снежні 1822 г. філарэты аднавіліся ў новай якасці як блакітныя філадэльфісты (гл. схему Д.7.1) і праіснавалі да кастрычніка 1823 г.

Былыя філаматы М.Рукевіч і З.Навіцкі аказалі ўплыў на вучня Беластоцкай гімназіі Ф.Ляховіча і разам стварылі ў 1820/21 навучальным годзе тайнае таварыства «Згодных братоў» (відаць, у русле трэцяга статута філаматаў). Правілы напісаў Ф.Ляховіч на падставе кнігі прафесара Віленскага універсітэта

Хаданія «Wyklad nauki obyczaiowej» («Лекцыі маральнай навукі»). Мэта, як звычайна, культурна-асветніцкая: «узаемнае сяброўства, любоў да бліжняга, дапамога бедным і нагляд за паводзінамі сваіх сяброў» [302, ф.36, воп.5/848, спр.221, а.2-3,16 адв.] Арганізацыйныя формы запазычаны ад філарэтаў, дзейнасць была падобнай і насіла патрыятычны характар: яны марылі аб незалежнай Рэчы Паспалітай і рыхтавалі грамадскую думку да пераўтварэнняў у існуючым ладзе, да высокай адукаванасці і маральнасці ў грамадстве. У 1823 г. таварыства было перайменавана ў «Заран», а пасля канікул 1824 г. не аднаўлялася. У 1825 г. пяцёрка заран увайшла ў Таварыства «Ваенных сяброў» і склала ў ім трэцюю ступень.

На 1822/23 навучальны год Ляховіч перайшоў вучыцца ў Свіслацкую гімназію. Тут з дапамогаю А.Казмінскага ён стварыў у 1822 г. арганізацыю «Заран». У 1824 г. 10 гімназістаў скончылі вучобу, В.Сперскі пераехаў у Вільна, Ф.Акенчыц перастаў з імі кантактаваць, і такім чынам пасля канікул паседжанні не адбываліся. У 1825 г. прыязджаў Я.Высоцкі, каб аднавіць таварыства і далучыць да «Ваенных сяброў», але не змог угаварыць І.Лабунскага — на той час старшыню свіслацкіх «заран». Ляховіч, даведаўшыся пра гэтае, загадаў старшыні беластоцкіх «заран» Ф.Баркоўскаму выключыць з сяброў Высоцкага, абвясціўшы таварыства зачыненым. Той не пагадзіўся і перайшоў на бок Высоцкага, а астатнія сябры перасталі падтрымліваць з таварыствам сувязь [302, ф.36, воп.5/848, спр.221, а.18 адв.-19 адв.; 250, ф.1, воп.1, спр.255 , а.6; 523, с.161].

У 1825 — пачатку 1826 г. у Вільні існавала група «Заран», складзеная з прыехаўшых сюды вучыцца выпускнікоў Свіслацкай і Беластоцкай гімназій — усяго 8 чалавек, да якіх далучыліся яшчэ два зараніны і два студэнты універсітэта. Яны падтрымлівалі сяброўства і прагульваліся. Скасавалі таварыства па парадзе Т.Галёнкевіча і далі пісьмовыя падпіскі, якія забраў прыехаўшы Ляховіч [302, ф.36, воп.5/848, спр.221, а.23-24].

У 1822 — 1826 гг. у часцях Літоўскага асобнага корпуса дзейнічала Таварыства сяброў. Гісторыя яго маладаследаваная. Вядома, што закладзена яно было ў Дзярэчыне і з цягам часу налічвала каля 25 чалавек. Нягледзячы на тое, што па складу яно было ваенным, мы згодны з даследчыкам С.С.Ланда, што Таварыства сяброў з'яўлялася «арганізацыяй філаматкага тыпу». На гэта ўказвае падабенства Правіл да «Прынцыпаў сяброўства», якія былі напісаны У.Хелміцкім і Ю.Валодзькам,

да статутаў вышэйпералічаных таварыстваў. Мэтамі называліся: імкненне зацвердзіць паміж афіцэрамі сяброўства, заснаванае на пашане чужога гонара як свайго; аказанне дапамогі тым, хто яе патрабуе; узбуджэнне любові да літаратуры; абарона нявінных перад начальствам [610, с.182,197; 196, с.46,57,60].

Таварыства сяброў падтрымлівала сувязь з філаматамі праз А.Міцкевіча і Д.Пясецкага. На палітычны характар арганізацыі ўказваюць яе сувязі з Таварыствам ваенных сяброў праз У.Хелміцкага-Ю.Валодзька і К.Ігельстрома-А.Вягеліна, якія ведалі адзін аднаго па навагрудскай масонскай ложы «Вузел еднасці», а таксама праз Ю.Маслоўскага, які адначасова быў сябрам двух таварыстваў [610, с.197]. Відаць, нейкія сувязі былі наладжаны з дзекабрыстамі, бо С.Валконскі на допыте 30.01.1826 г. паказаў: «...Таму ўжо лет семь мне было сказана, што ў польскай арміі ёсць таварыства філадэльфаў, з французскай арміі перанесенай, але прыняўшы ў польскай цалкам іншы ход. Гэта значыць патрыятычнае польскае» [62, т.X, с.127]. Думаецца, што рэч ідзе пра Таварыства сяброў, менавіта створанае пад уплывам філаматаў, стаўшых з 1822 г. вышэйшай ступенню саюза філадэльфістаў, белымі філадэльфістамі (гл. схему Д.7.1).

Акрамя стварэння культурна-асветніцкіх арганізацый, у філамацкую эпоху вядомы некалькі практычных учынкаў вучнёўскай моладзі. Трэцяга мая 1823 г. на дошцы ў адным з класаў Віленскай гімназіі быў зроблены вучнямі М.Плятэрам, Я.Чэховічам, Ю.Кулакоўскім (верагодна, былы прамяністы), Б.Касцялкоўскім надпіс: «Няхай жыве канстытуцыя 3 мая. Ах, які салодкі ўспамін для нас, суайчыннікаў! Але няма таго, хто бы ўспомніў» [302, ф.735, воп.10, спр.7, а.11 адв.]. Дзесятага мая, падчас следства ва універсітэце, на сцяне дамініканскага манастыра з'явіўся яшчэ адзін надпіс, вядомы нам у некалькіх версіях: «Няхай жыве канстытуцыя 3 мая. Смерць тыранам. Дай, Божа, каб гэта адбылося»; «Няхай жыве канстытуцыя 3 мая. Устань, Айчына, з руін»; «Няхай жыве канстытуцыя 3 мая. Смерць тыранам. Айчына адродзіцца» [302, ф.735, воп.10, спр.7, а.18 адв.,20 адв.,21]. У гэтым надпісе абвінавачвалі вучня С.Забэлу, але следчая камісія не знайшла доказаў. Чацвярых жа вучняў, напісаўшых на школьнай дошцы, пакарала універсітэцкае кіраўніцтва: на хлеб і ваду Плятэра і Чаховіча — на 3 дні, Кулакоўскага — на 5 дзён, Касцялкоўскага — на 1 дзень [302, ф.735, воп.10, спр.7, а.18].

У канцы 1824 г. вучні 5 класа Свіслацкай гімназіі А.Глазер і П.Зянкевіч падчас малітвы на ўроку рускай мовы закрэслілі ў друкаваным тэксце малітвы, размешчанай на дошцы, словы «Государю же». Як вядома, пасля хвалы Богу належала зрабіць гэтае ж ягонаму намесніку на зямлі — гасудару імператару, але прачытаць гэта слова цяпер было немагчыма. Абодва вучні былі пакараны цялесна, а потым аддадзены ў салдаты пад строгі нагляд [167, с.39]. У 1826 г. у полацкім вышэйшым піярскім вучылішчы распаўсюджваліся нейкія «пасквили» (лістоўкі). У рапарце візітатара Беларускіх вучылішч прафесара Пецярбургскага універсітэта А.І.Сянькоўскага можна прачытаць: «Начальства і настаўнікі дазволілі збірацца патаемна, чытаць і пець недазволеныя і распусныя вершы, нарэшце давеўшыя іх (вучняў — *В.Ш.*) да неверагоднай ступені буйства, непавінавення і вальнадумства» [523, с.109].

Такім чынам, польская сістэма адукацыі, выкарыстоўваючы тыя ж самыя сродкі, што і расійская, дасягнула сваіх мэтаў у паланізацыі беларускай моладзі. У Віленскім універсітэце, гімназіях Вільні, Свіслачы, Беластока дзейнічалі патаемныя і паўпатаемныя гурткі і таварыствы, сябры якіх займалі актыўную пазіцыю ў грамадска-палітычным жыцці зямель Беларусі, праяўлялі свой ліцвінскі патрыятызм. Сваёй мэтаю яны ставілі аднаўленне Рэчы Паспалітай, у складзе якога будзе знаходзіцца аўтаномнае ВКЛ.

# ГЛАВА 4. **БЕЛАРУСЬ У ПОЛЬСКІМ І РАСІЙСКІМ АПАЗІЦЫЙНЫХ РУХАХ. ПРАЯЎЛЕННЕ ЛІЦВІНСКАСЦІ (БЕЛАРУСКАСЦІ)**

## 4.1. **Паўстанне 1794 года ў літоўскай правінцыі**

Барон Я.І.Сіверс у лісце да Кацярыны II абвінавачваў партыю фаварыта П.Зубава ў правакацыі паўстання 1794 г., ці наўмысным занядбанні ўсялякіх перасцярог. Ён пісаў, што ў пэўных пецярбургскіх колах хацелі паўстання для таго, каб знайсці прычыну для яго пагрому і канчатковага падзелу Рэчы Паспалітай, калі можна было б атрымаць новыя польскія дараваныя маёнткі сродкамі прымусовымі і канфіскацыяй [гл.: 633, с.300-301]. Ці было гэта так, ці не, мы сёння не высветлім канчаткова, а разбярэмся ў тым, як адбывалася паўстанне ліцвінаў, якія яно мела асаблівасці, якую ролю адыграла ў агульнапольскім руху, яго значэнне для далейшага лёсу ВКЛ.

Адным з палітычных лідараў Вялікага княства Літоўскага ў той час быў Якуб Ясінскі, які спачатку ўзначаліць паўстанне і надасць яму радыкальны характар. Таму неабходна прааналізаваць ягоныя погляды. Іх добра адлюстроўваюць яго дваццаць вершаў, якія засталіся ў рукапісах, і толькі, відаць, адзін («Да вяльможаў польскіх аб пастаянстве») быў надрукаваны ананімна (Da exalantow. — Grodno, 1793).

У вершы «Спрэчкі» гучыць сатыра на духавенства, паказана немаральнасць манахаў («вальтэранізм»). Ясінскі выказваецца за творчую свабоду паэта, параўноўвае яе са «спевамі салаўя». Ёсць фрагмент аб любові да Айчыны і абавязках перад ёю. У невялікай працы «Да Стэфана Баторыя» аўтар хваліць Баторыя за яго талент, годнасць і заслугі для краю, а езуітаў называе «піяўкамі народа». У вершы «Да святошы» гучыць пахвала розуму (ён — багацце і права) і роўнасці стану: «натура не ведае розніцы, якая падзяліла нас на саслоўі». У вершы «Дня 16 кастрычніка 1787» Ясінскі паказвае скептыцызм да веры, бо адныя жывуць шчасліва, а другія — у штодзённай працы прыгнечаны. Верш «Да Лёсу» — зборназіранняў над дзіўнымі шляхамі чалавечага жыцця і непрадказальнымі прыгаворамі Лёса. Верш «Мая песня» выказвае радасць ад шчасця, якое чалавек знаходзіць у вольнасці, пачцівасці і розуме.

Акрамя пералічаных, больш усяго выдзяляюць Ясінскага як паэта-рэвалюцыянера і прыхільніка французскай рэвалюцыі,

тры вершы ніжэйназваныя, у якіх ён не толькі крытыкуе шляхецкія звычаі і крывадушнасць феадалаў, але выступае прапагандыстам, праваднікам новых ідэй, якіх цураюцца магнаты і цёмная шляхта, а таксама прыхільнікі рэформ у памяркоўным, а не рэвалюцыйным духу. Верш «Да вяльможаў польскіх аб пастаянстве» — зварот да эмігрантаў пасля другога падзелу, да іх патрыятызма, заклік да барацьбы з царскім захопнікам, пахвала Касцюшкы, Францыі як айчыне апостала вольнасці і творцы ідэй, якія нясуць свету і чалавецтву вольнасць і роўнасць. Вольнасць можна здабыць, на пагляд Ясінскага, толькі рэвалюцыйнай барацьбою, у якой дэспаты і тыраны згінуць. Калі пераможа вольнасць, зробіцца спакой ад войнаў, свет вернецца да першапачатковага стану і чалавецтва будзе родам брацтва.

Верш Ясінскага «У час абходу польскім дваром жалобы па Людовіку XVI» быў грамадскім актам незалежнай думкі. Станіслаў Аўгуст прызначыў узнагароду ў суме 1000 злотых за адшуканне аўтара, які глыбока абураўся:

«А калі вам вольнасць, гонар, маёнткі забралі,

Вы плачаце, што караля галаву за 300 міль адцялі» (тут і далей пераклад аўтара — *В.Ш.*). Аўтар быў упэўнены, што:

Усе людзі — роўныя, ці кароль, ці падданы,

Як хто парушыў права, няхай будзе караны.

А калі гэта не навучыць іншых манархаў, як трэба кіраваць, дык «гаворым, няхай загінуць каралі, і свет будзе вольны».

Верш «Да народа» — гэта адозва і заклік да дзеяння, у якім адчуваецца гарачы патрыятызм, любоў да народа і нянавісць да тыранаў: «там, дзе народ сказаў: «хачу быць вольным», «заўсёды станавіўся вольным», а прыкладам з'яўляецца Францыя. Трэба весці барацьбу не толькі з захопнікам, але і са здраднікамі свайго народа — таргавічанамі:

Ідзіце, Айчына жадае, каб ваш меч выгладзіў

Разам, таго, хто прыйшоў і таго, хто здрадзіў [гл.: 613, с.775 — 789; 634, с.125].

Ясінскі свае погляды выказаў таксама ў «Выпісе з маральных кніг Вялікага Гуда, індыйскага філосафа, пададзеных вернікам сваім як жыццёвы Закон». Відаць, што Ясінскі шмат чаго ўзяў з масонства (думкі, арганізацыю, сімволіку), а таксама з агульнай асветніцкай ідэалогіі праў чалавека. Сама назва Вялікі Гуд вядзе з масонства, у якім літара Г у пламяністай зорцы мела 5 значэнняў: гравітацыі, геаметрыі, генерацыі (творчасці), генія і гносіс (вышэйшых рэлігійных і іншых ведаў), адносілася таксама да Вялікага Архітэктара (G-bood). Усё гэта

Ясінскі напоўніў дэмакратычнымі ідэямі. «Выпіс...» ахоплівае «артыкулы» апісваемай у ім веры і філасофіі, а таксама права... Меў быць у Літве ключом канчаткова сфарміраванай канстрацыі» [612, с.154].

У «Выпісе...» гаворыцца пра такія ісціны як Праўда, Мудрасць, Роўнасць, Любоў, Справядлівасць, Асвета. Каб іх адрадзіць, прыйдзе «вялікі дзень», да якога трэба рыхтавацца — збіраць «братоў» пад кіраўніцтвам Вялікага Папы, прасвятляць сяброў, трымаць усё ў таямніцы: «Памятай толькі, каб тады не праспаць сваёй гадзіны. Цень вялікай іголкі доўга не стаіць на месцы. Зброя твая няхай будзе гатовай на абарону вялікай праўды. Не марудзь часу, калі голас воблака з усходу скажа — ідзі. Бяда таму, хто замінецца» [цыт. па: 16, с. 224].

Ясінскі заклікаў учыніць тайны саюз, «якога першым правам ёсць сакрэт, бо яны (брамінцы — *В.Ш.*) баяцца, каб злы геній не адкрыў свайго скону і не пашкодзіў». Той, хто ўступіў у саюз (яго звалі «брат»), павінен быў прысягнуць, што адракаецца ад сваякоў, маёнтка, сяброў, амбіцыі, нікога не жадае ведаць над сабой, акрамя добрага Генія або Вялікага Папы, па яго загаду жыццё аддасць, нічога ў жыцці прагнуць не будзе, брата роднага, калі б была патрэба, не пашкадуе». Абавязкам кожнага «брата» было распаўсюджванне саюзу, вярбоўка ў яго новых сяброў з душою моцнай і адважнай, гатовай на барацьбу са «злым геніем», і захоўваць маўчанне.

Саюз (змова Ясінскага) стварыўся пяцёркамі («колькі пальцаў у руцэ») — кожны «брат» ведае толькі пецярых супольнікаў, якіх сам схіліў. Усе «браты» замест імя маюць нумары ад 1 да 5 і імі падпісваюцца. Сімвалічнай табліцай з нумарамі валодаў Ясінскі. Былі тут запісаны кн. Фр.Сапега, І.Дзялынскі, віленскі прэлат ксёндз Богуш, Фр.Патоцкі, Ст.Солтан, уся радня Чартарыйскіх, генерал артылерыі К.Сапега [16, с.227].

Таварыства стваралі, па словах Ст.Грабоўскага, усю зіму 1793/94 гг. Паступова яно распаўсюдзілася па ўсёй Літве, трымала сувязі з Варшавай (але рэдкія і недакладныя ), у Вільні адбываліся сходы і нарады на кватэрах сяброў таварыства, рыхтавалі ўзбраенне, амуніцыю, часта закупленую ў расіян. Сябрамі былі амаль уся артылерыя ў Вільні, акрамя генерала Кронемана, Ігнацi Тызенгаўз — шэф гвардыі літоўскай пяхоты з 8 афіцэрамі, маршалак літоўскі Ст.Солтан, бурмістры Мінкевіч і Хмаржынскі, ксяндзы Цяцерскі і Фр.-Кс.Богуш [633, с.149-150].

Відаць, Ясінскі добра ўмеў хаваць свае пачуцці, бо Жытковіч, даследчык яго адносін з таргавіцкай канфедэрацыяй, зрабіў,

аналізуючы дзейнасць Ясінскага (1. Застаўся ў войску і прынёс прысягу сканфедэраванай РП і каралю (27.08.1792 г.); 2. Быў выбраны ад ваенных у склад Ваеннай камісіі ВКЛ (з 15.04.1793 — 16.03.1794); 3. Атрымаў кіраўніцтва аб'яднанай артылерыйскай і інжынернай школамі (загад Ш.Касакоўскага ад 15.07.1793 г.), наступную выснову: «... Да апошніх дзён перад паўстаннем на Літве знешне заставаўся ў дасканалай гармоніі з сучаснымі ўладамі Рэчы Паспалітай» [705, с.182].

Калі пачалося паўстанне, яго Начальнік ліцвін Андрэй-Тадэвуш Касцюшка надаваў літоўскім землям амаль што вырашальнае значэнне. Поспех паўстання на гэтай тэрыторыі з пашырэннем яго за мяжу другога і трэцяга падзелаў спрыяў бы паспяховаму вырашэнню ўсёй справы вызвалення Рэчы Паспалітай ад варожых войскаў і адраджэнню краіны. Становішча польскага войска паміж Кракавам і Новым Мястам было неспрыяльнае паўстанню, таму Касцюшка планаваў на поўначы Літвы паўстанне гараджан і сялян, літоўскіх татараў, што адцягнула бы прускія і расійскія войскі ад Рэчы Паспалітай.

Першы ўніверсал Касцюшкі ў Кракаве быў «Да войска Польскага і Літоўскага». Як піша даследчык Ф.Канечны: «Кожнае сцвярджэнне ў ім як бы ставіць падмурак пад учынкі: «Чакае вас слава і салодкая пацеха быць вызваліцелямі Айчыны» [596, с.279]. Сувязь Літвы і Кароны відаць з першых крокаў паўстання. Чатырнаццатага красавіка пад Брэстам рускія ўлады захапілі гр. К.Мураўскага, назначанага Касцюшкам галоўнакамандуючым узброенымі сіламі ВКЛ. Пры ім былі наступныя лісты:

1) П.Грабоўскаму, шэфу 5-га літоўскага палка, Касцюшка раіў выкарыстаць малую колькасць царскіх акупантаў і «вызваліць сваю Айчыну» — ВКЛ;

2) К.Сапегу, генерала войск Рэчы Паспалітай, Касцюшка заклікаў зрабіць усё, каб па прыкладу Кракаўскага паўстання ў «літоўскай правінцыі» да войска былі далучаны ўзброеныя косамі і пікамі мяшчане і сяляне. Пры тым Касцюшка лічыў, што «літоўскую правінцыю» можна лёгка нахіліць на агульнае паўстанне;

3) К.Несялоўскаму, навагрудскаму ваяводзе, Касцюшка пісаў: «Збірай асоб сумленных, узбройвай іх, як можна хутчэй, і нанясі ўдар непрыяцелю, калі колькасць ягонага войска не будзе перавышаць твайго» [65, с.30-32].

У знойденым разам з лістамі маніфесце былі такія словы: «Браты любыя! Пазваны Вамі, прыняў я начальства і гатовы ахвяраваць для Вас сваё жыццё. Адвага і вобраз думак — вось галоўнае ў поспеху справы. Станем усе адзіным целам, злучымся

вузлом найцяснейшым, злучым сэрцы і магчымасці нашыя і ўсіх нашых сабратаў. Здрада вырвала з рук нашых зброю, дабрадзейнасць вяртае нам яе. Вызвалімся ўсе разам з-пад іга» [Цыт. па: 16, с.230; 8, с.2].

Заклікі Касцюшкі да Літвы не засталіся дарэмнымі. Акт паўстання ў Шаўлях быў прыняты ўжо 16 красавіка. Лозунгам яго ў адрозненне ад Кракаўскага былі «вольнасць, роўнасць і незалежнасць». «Найвышэйшым начальнікам сілы ўсяго народа» прызнаваўся Касцюшка, падкрэслівалася цалкавітая салідарнасць з паўстаннем у Кароне, з якім будуць дзейнічаць «у адзіным духу і намерах». Аднак для большай актыўнасці паўстання ў Літве быў выбраны «за кіраўніка і начальніка ўсёй узброенай сілы правінцый ВКЛ генерал-маёр Антоні Хлявінскі» [704, с.534]. 18 красавіка падняў 7-ы пешы полк падпалкоўнік Ст.Грабоўскі. Праз два дні на чале з 800-асабовым атрадам ён рушыў на Вільна.

Тут напярэдадні паўстання расстаноўка сіл была наступнай: рускія войскі — адзін батальён егераў, Нарвскі і Пскоўскі пяхотныя палкі, Данскі полк, 4 роты артылерыі, 19 гармат маёра М.А.Тучкова на Пагулянцы — усяго 2290 салдат і афіцэраў [114, с.42]; літоўскія войскі — 3 пяхотныя роты, артылерыя, 2 татарскія эскадроны, 7-ы полк — усяго каля 700 чал. [114, с.41-43], у іх руках — замак, арсенал, камісарыят. Гетман літоўскі Ш.Касакоўскі напярэдадні паўстання выслаў з Вільні патрыётаў М.-Г.Бржастоўскага, М.Радзішэўскага, С.Грабоўскага, Кс.Богуша, арыштаваў некалькіх штаб- і обер-афіцэраў. 17 красавіка, за тыдзень да паўстання, Ш.Касакоўскі аддаў загад аб арышце Ясінскага «не толькі ў асабістай сваёй кватэры, але пільна шукаемы і выслежаны, у якім-небудзь доме знаходзіўся бы, павінен быць у той жа час узяты пад найстражайшы арышт» [705, с.182].

Паўстанне ў Вільні пачалося ў ноч з 22 на 23 красавіка. Былі арыштаваны начальнік рускіх войск генерал-маёр М.Д.Арсеньеў, гетман Ш.Касакоўскі, захоплены ў палон 5 маёраў, 4 капітаны, 11 паручнікаў, 8 падпаручнікаў, адзін ад'ютант, 12 прапаршчыкаў і 364 радавых — усіх зачынілі ў касцёле св. Казіміра. Адпор дала адна з рускіх ротаў і М.Тучкоў, які стаў бамбардзіраваць горад [177, с.747; 65, с.47]. Ён сабраў каля 2 тыс. чалавек і па запрашэнню Цыцыянава павёў войска ў Гродна. Тайная дэпутацыя Літоўскай рады паведамляла Касцюшку 7.05.1794 г.: «... вышадшы адсюль падчас рэвалюцыі маёр Тучкоў 25 міль паміж Вільнам і Гроднам зрабаваў, спустошыў і спаліў» [668, с.289]. Гэта прывяло, на думку Т.Ваўжэцкага, да таго, што насельніцтва рашылася на ўдзел у паўстанні [65, с.16].

24 красавіка быў прыняты «Акт паўстання правінцыі Вялікага княства Літоўскага», у якім гаварылася, што народ літоўскі, як і грамадзяне Кароны, паўстаў за аднаўленне вольнасці і роўнасці грамадзянскай, «ахвяруючы жыццё і маёмасць нашу для сумеснай нас саміх і Айчыны нашай абароны...». Падпісалі акт 2328 чалавек [65, с.48]. Пад уплывам Ясінскага часовы ўрад разаслаў 25 красавіка ўніверсал у ваяводствы, паветы і гарады ВКЛ. Між іншым, у ім гаварылася: «Найдастойнейшыя Грамадзяне, трэба захацець узбудзіць у сабе любоў да волі і мужнасць даўнейшых продкаў вашых і па іх прыкладу праз паспалітае рушэнне бярыцеся за зброю... Хай тая прылада, якую яму (селяніну — *В.Ш.*) для працы ў полі распусны салдат ужыць перашкаджае, патануўшая ў яго грудзях, выратаванню Бацькаўшчыны і волі прысвечанай стане...» [65, с.53-54; 114, с.55].

Распаўсюджванне віленскіх універсалаў зрабіла сваю справу. Ц.Туталмін 29 красавіка сакрэтна паведамляў П.Зубава аб тым, што «чернь» «па ўсёй Літве і ва ўсіх без выключэння сяленнях запасаюцца дзідамі і іншымі прыладамі, калі хто не мае агнястрэльнай зброі» [65, с.71]. На заклік адгукнуліся (указваюцца даты прыбыцця ў Вільна і прозвішчы тых, хто прыехаў з акцэсам або быў дэлегаваны): Лідскі павет — 3.05 (І.Кастравіцкі); Наваградскі павет — 10.05 (Б.Гацыскі, земскі суддзя); г. Наваградак — 10.05. (Е.Гарабурда); Ашмянскі павет — Т.Умястоўскі, Слонімскі павет — 9.05. (Ст.Незабітоўскі), Гродзенскі павет — 18.05. (Д.Матакевіч); 22.05 (Фр.Мучынскі); Браслаўскі павет — 30.05 (Б.Мірскі) [704, с.544-546 заўвагі].

У Гродне пачатак паўстання замарудзіўся ў сувязі з тым, што тут знаходзіўся корпус П.Д.Цыцыянава — 8674 чал. і 28 гармат [65, с.57]. Яго самога выратаваў «расторопный и храбрый казак, убежавший из Варшавы». Калі пачаўся разгром рускіх, ён здолеў збегчы і дабрацца да Гродна раней пошты. Апавешчаны Цыцыянаў паспеў прыняць меры засцярогі (знайшоўшы пацвярджэнне небяспекі ў лістах праверанай пошты): злавіў у нейкім кляштары (відаць, бернардзінаў) змоўшчыкаў, зламаў мост на Нёмане і вывеў войска з горада у лагер. Батальён каралеўскай гвардыі, які ішоў на Гродна, каб апанаваць знянацку рускіх, не мог гэта зрабіць, бо мост быў зламаны. Калі прыйшоў Тучкоў, Цыцыянаў разам з ім пад музыку ўвайшоў у Гродна. Рускія афіцэры чулі, як польскія дамы на балконах гучна гаварылі: «Вось ідуць расійскія недарэзкі!» [178, с.749].

Важнай задачай паўстання было прыцягненне да яго сялянскіх масаў. Адозва Літоўскай рады заклікала іх далучыцца

да «стараннай шляхты і яе дабраахвотнікаў»: «Не шкадуйце крыві рабаўнікоў і тыранаў, якія дамы Вашыя паляць, а дзяцей нявінных б'юць і катуюць. Пакіньце ў дамах тых, якія зямлю на пасеў апрацаваць могуць... Астатнія бярыцеся за зброю, саблі і косы» [65, с.74]. Удзел сялянства ў паўстанні залежаў і ад тых, хто кіраваў ім. Там, дзе быў давер сялян, як, напрыклад, у Гродзенскім павеце, дзе Ф.Боуфал даў вольнасць сваім падданым, дык іх актыўнасць была большай. Шляхта, якая стаяла на чале парадковых камісій і выконвала абавязкі земскіх генерал-маёраў, «у закліку мас да зброі бачыла сваю згубу і, хістаючыся паміж абавязкамі для краю і ўласнымі інтарэсамі, схілялася да другога і прыняла да ўпадка Айчыны» [цыт. па: 615, с.50].

7 мая Кастюшка выдаў Паланецкі ўніверсал. Ён зразумеў, што без дапамогі сялян паўстанне згасне. 18 чэрвеня Цэнтральная літоўская дэпутацыя агалосіла яго. Універсал аб'явіў асабістую вольнасць сялянскага люду, зменшыў да 1-2 дзён у тыдзень паншчызну на час паўстання і адмяніў яе тым, хто пойдзе да паспалітага рушэння і будзе выконваць вайсковыя павіннасці. Паводле ўніверсала ваяводствы падзяляліся на дазоры на чале са здольнымі і пачцівымі дазорцамі, якія будуць прымаць скаргі ад сялян і ад панскіх двароў і вырашаць спрэчкі паміж імі [65, с.122-124].

У канцы паўстання Касцюшка пайшоў далей сваіх адозваў і Паланецкага ўніверсала і ўсім, хто мужна будзе ваяваць з ворагам, абяцаў, што Айчына забяспечыць іх лёс — кожны афіцэр і салдат атрымае ва ўзнагароду выдзелены з народных (дзяржаўных) зямель участак навечна, аб чым усе ўжо цяпер атрымаюць пісьмовую паруку. Але так думалі не ўсе кіраўнікі паўстання. Т.Ваўжэцкі, Начальнік паўстання пасля Т.Касцюшкі, на допыце ў Пецярбургу гаварыў, што «ўсе кіраўнікі паўстання згаджаліся лепш на ўпадак дзяржавы, чым даць волю чэрні, і што ні па асобах, ні па якіх-небудзь дзеяннях, паўстанне не мела нічога агульнага з сацыяльнай рэвалюцыяй». Кіраўнікі паўстання баяліся «бачыць жаласныя вынікі» пры вызваленні сялян [9, с.241; цыт. па: 65, с.161]. Універсал, выдадзены пасля вызвалення Вільні, заклікаў да ўступак сялянам, якія толькі чакаюць заклік. У інструкцыі для тых, хто ўваходзіў у расійскія межы (кардон), Ясінскі прасіў: «У вёсках нашых абыходзіцца з сялянамі як можна ласкавей» [65, с.104].

7 мая ў Варшаве быў апублікаваны «Зварот Вышэйшай Нацыянальнай Рады да парадкавых камісій» і пазначаны ў Вільні 18.06.1794 г. У дакуменце гаварылася, што расіяне

падбухторваюць сялян супраць паўстанцаў і абяцаюць ім лепшую долю з расійскай дапамогай. Пасля гэтага ў Вільні ўсвядомілі, што трэба распаўсюдзіць на ВКЛ палажэнне Паланецкага ўніверсала. Таму можна пагадзіцца з поглядам Я.Анішчанкі, што «паўстанцкі рух атрымаўся не ўсенародным, а пераважна шляхецкім па складзе» [9, с. 241]. Шмат гаварылася і абяцалася, але мала рабілася для сялян.

Шляхта таксама не вельмі ахвотна ўдзельнічала ў паўстанні. «Шмат яе, — піша гісторык Кастамараў, — ахвотна аддавалася Расіі, яна спадзявалася ад новай улады выгод, а галоўнае — яе заспакойвала тое, што пад уладаю Расіі ў іх не адбяруць уладу над сялянамі». Сапраўды, рэвалюцыя пасягала на святое права шляхты — уладу над сялянамі. «Расія, — піша далей Кастамараў, — не палохала іх нечым падобным, а таму для іх, калі б давялося выбіраць паміж уладаю той Польшчы, якую хацеў пабудаваць Касцюшка, і ўладаю Расіі, дык карысней было б далучыцца да Расіі» [177, т.II, с.232,543]. Шляхціцы «малілі бога, каб так ці інакш, толькі хутчэй скончылася б такое абдзіральнае паўстанне» [177, т. II, с. 514]. Ідэалам абывацеляў была старая шляхецкая Польшча, а Касцюшка абяцаў ім нейкую іншую, непрыхільную да іх Польшчу, з асновамі, якія пахлі французскай рэвалюцыяй. Што тычыцца мяшчан, дык менавіта яны ўзялі становучы ўдзел у віленскім паўстанні і гатовы былі давесці яго да пераможнага канца, але, «на іх погляд, Касцюшка быў залагодны і запамяркоўны на рэвалюцыйныя намаганні. Для іх узорам і прыкладам была Францыя, Парыж, і такой рэвалюцыі яны жадалі, «паводле дэмакратычных прынцыпаў», як апавядае Война ў сваім дзённіку [615, с.52].

Асноўнай рухомай сілаю паўстання стала войска. Прычынай для яго ўдзела было цяжкае становішча вайскоўцаў, якім пагражала скарачэнне і якое абуралася затрымкамі платы. Да такой высновы прыйшоў і даследчык Я.Анішчанка. Рэгулярнае літоўскае войска налічвала каля 10 тысяч: у Вільні Ясінскага — 4 тыс., у Коўне генерала Хлявінскага — 2 тыс., у Бельску кн. Ф.Сапегі — 4 тыс. [16, с. 229].

У перыяд, калі паўстаннем на тэрыторыі ВКЛ кіраваў Якуб Ясінскі (24.04. — 4.06.), яно набыло своеасаблівы характар. Гэта выявілася ў канкрэтна акрэсленым радыкалізме («якабізме»), лозунгу паўстання, антыфеадальным і антыманархічным напрамку праграмных дакументаў Літоўскай рады і адозваў Я.Ясінскага, прызначэнні яго галоўнакамандуючым Літоўскага войска, арганізацыі асобнай Літоўскай Рады. Радыкалізм

літоўскага паўстання не трэба перабольшваць. Мы згодны з поглядам беластоцкіх даследчыкаў Ежы Урвановіча і Анджэя Вальтаноўскага, якія пішуць, што тэза аб большым радыкалізме на землях ВКЛ, чым на землях каронных, ідзе ад публікацый у «Atheneum Wilenskim» і што «якабізм Ясінскага з'яўляецца ўсё ж з'яўленнем абасобленым» [683, с.22].

Больш значна радыкальны характар літоўскага паўстання праявіўся ў час кіраўніцтва ім Ясінскім, калі і іншыя літоўскія «якабінцы» былі пры ўладзе і пэўным чынам уплывалі на ход падзей. Напрыклад, ад'ютантам Ясінскага быў Юзаф Гарноўскі, пры ім знаходзіўся таксама Пётр Грасмані — абодва не раз выконвалі важныя заданні кіраўніка паўстання. Міхал Карповіч, ксёндз і знакаміты прапаведнік, быў членам Літоўскай Рады. Мікалай Тамашэўскі стаў аўтарам Статута аб дазорцах у ваяводствах. Ігнацы Хацкевіч і Антоні Гушкоўскі выконвалі ролі пасрэднікаў паміж Вільнай і Варшавай.

Вядомы наступныя выказванні Я.Ясінскага, якія пацвярджаюць яго радыкальныя погляды. Ён казаў Касцюшцы, што «калі б меў тваю ўладу ў краі, то павесіў бы 100 чалавек і пазбавіў ад іх 6 мільёнаў» [цыт. па: 8, с.3]. Ён гаварыў, што «паспеў час скінуць мяккасярдэчнасць, якой заўжды ганарыўся наш край, — хапайце здраднікаў, калі іх бачыце, судзіце і забівайце ўсіх, хто не запісаны ў спісе павятовых генералаў з'явіцца на вашай зямлі. Усе яны дыверсанты, а не абаронцы Айчыны. Не спадзявайцеся на меч справядлівасці, часта хісткі і заўсёды спознены» [цыт. па: 16, с.229]. Але пасля такіх пагроз тэрору, як у Францыі, не было. 25 красавіка па пастанове крымінальнага суда ў Вільні, на Рынку, павесілі Шымана Касакоўскага, былога гетмана ВКЛ, цяпер гетмана царскага [65, с.48]. Сорак афіцэраў пасадзілі ў палац Сапегі, 853 расіяны — у касцёл св.Ігнація, некалькіх палякаў — у дом Бжастоўскіх, жонку Ш.Касакоўскага — у кляштар Св. Міхала. Польскі гісторык Масціцкі піша, што паўстанцкія ўлады станоўча ставіліся да арыштаваных расійскіх афіцэраў: дазволілі карэспандэнцыю, адкрылі асобны шпіталь, добра кармілі, выдалі ім неабходныя рэчы, жонкам далі пашпарты з правам ад'езду да дому, Арсеньеў меў свайго кухара, слугу, вартаўніка [633, с.170]. У пачатку чэрвеня грамадзяне Гродна ўсталявалі на Рынку шыбеніцу, прыбілі шыльды з надпісамі «Пакаранне для здраднікаў Айчыны», «Беражыся здраднікаў, выпраўляйся» [634, с.190]. Яна прастаяла да канца паўстання, але ніхто павешаны не быў. Такім чынам, шыбеніца адыгрывала ролю засцярогі.

Рэпрэсіўна-карныя функцыі не з’яўляліся асноўнымі ў дзейнасці Найвышэйшай Рады. Трэба было пакараць здраднікаў Айчыны і праціўнікаў паўстання. Для гэтага можна было дзейнічаць часам хутка («на працягу 24-х гадзін»), у мінімальным складзе дэпутацый («тройкі»). «Зразумела, тыя, хто закладаў петлі на шыі здраднікаў, не павінны адзначацца далікатнасцю пачуццяў, але не былі яны таксама паспалітымі бандытамі і забойцамі, як гэта спрабавалі прадставіць, можа міжволі не раз выканаўцамі гневу і помсты народа, адчуваючага, што напрамак справы народнай не ва ўласцівых знаходзіцца руках» [615, с.57]. Мы цалкам пагаджаемся з гэтым поглядам Б.Ліманоўскага, а не з Я.Анішчанкам, які мае супрацьлеглы погляд і, як мы ўбачым ніжэй, перабольшвае рэпрэсіўную ролю паўстанцкіх органаў улады.

У Кракаве, Варшаве паўстанне адбылося пад лозунгам «вольнасць, цэласць, незалежнасць». У Шаўлях, Вільні — пад лозунгам «вольнасць, роўнасць і незалежнасць». Ясінскі лічыў, што барацьба за незалежнасць павінна быць вайной народнай, рэспубліканскай. Пра гэта гавораць чэрвеньскія мемарыялы Ясінскага — яны заклікаюць сялян, народ далучыцца да паўстання, а ўрад абяцае вольнасць і свабоды [612, с.214]. Лозунг Кракаўскага акта характарызаваў прапольскую ідэалогію паўстання — адраджэнне Рэчы Паспалітай на базе Канстытуцыі 3 мая 1791 г. (як унітарнай цэнтралізаванай дзяржавы). У ВКЛ жа хацелі адрадзіць вольную і незалежную Рэч Паспалітую Абодвух Народаў, з аўтаноміяй ВКЛ. «Роўнасць» азначала паспалітую роўнасць Літвы і Кароны паміж сабой.

Якабінцы супрацьставілі афіцыяльнаму лозунгу свой, у якім на другое месца паставілі замест «цэласці» роўнасць, бо «цэласць», якую разумець трэба як «тэрытарыяльная інтэграцыя» і адмаўленне падзелаў, ужо ахоплена лозунгамі «незалежнасць». Упершыню лозунг «роўнасць» падняў у краі вільнянін ксёндз Франц Ксаверы Богуш. Ужо ў першыя дні паўстання ў Літве гэтыя ідэі ўрачыста абвясціў акт утварэння Нацыянальнай Рады Літоўскай Правінцыі ад 24 красавіка. Адпаведна яму мэтай паўстання з’яўляецца «адшуканне вольнасці і роўнасці грамадзянскай». Паўстанцкая літоўская ўлада заклікала: «адкінем погляды на розніцу саслоўяў, усе мы людзі і грамадзяне краю» [цыт. па: 612, с.250,251,253].

Ва «Універсале да ваяводстваў і паветаў Правінцыі Вялікага княства Літоўскага і гарадоў вольных» ад 24.04 гаварылася:

«Слухай, Народзе Літоўскі, што табе гаворыць не *кароль слабы* са слабейшага яшчэ трону, не свавольная грамада, нічога, акрамя марнага тытулу, не маючага люду, але спакойнае *Згуртаванне спагадлівых тваіх сыноў*, якія доўга для вызвалення твайго працавалі тады, калі Ты ўжо ў ім зняверыўся. Мужны *народ французскі*, разам з іншымі, падае нам сяброўскую руку, патрабуе паўстання нашага, дае нам для таго дапамогу ў розным выглядзе...» [65, с.50; цыт.: 114, с.52]. Такім чынам, віленскія кіраўнікі паўстання паведамлялі насельніцтва ВКЛ аб сваёй прыхільнасці да французскай рэвалюцыі, якая дапамагае, у адрозненне ад слабага і скампраментаванага караля. Апошняга яны як бы дэтранізавалі са «слабейшага яшчэ трону», чаго не зрабіў Касцюшка, падтрымліваючы зносіны з каралём і ягоным пляменнікам Юзафам Панятоўскім, якому адзін час прапаноўваў нават стаць кіраўніком паўстання ў Літве. Т.Ваўжэцкі ў тайнай экспедыцыі гаварыў, што Касцюшка «не вадзіў французскіх памылак, не дапускаў іх, шанаваў кроў адназемцаў, дрыжаў, гледзячы на варварства чэрні і караў строга» [65, с.160].

Пасля абвяшчэння «Акта паўстання Народу Вялікага княства Літоўскага» ўсе падпісаўшыя яго прынялі прысягу: «Мы прысягаем пану Богу Усемагутнаму і Адзінаму ў тым, што Бацькаўшчыне жыццём і маёнткам найадданей служыць будзем, і тое ўсё, што ад нас залежыць, будзе да моцы абароны гэтага Акту Паўстання Народу, аддана і пачціва выканаць не замарудзім, і што нам ад улады якой-небудзь, гэтым Актам утворанай, даручаным стане, не толькі таямніцу захаваем, але ва ўсім паўстанні нашым ніколі асабісты інтарэс, але агульнае дабро краю мець будзе, так нам Пане Божа, дапамажы і бязвінная пакута Сына Яго» [65, с.54; 424, с.98]. Відавочна падпарадкаванасць прыняўшых прысягу Літоўскім органам кіравання паўстаннем і Літоўскаму Народу, Сваёй Айчыне. Літоўская Рада заклікала: «Да Вас, дастойнейшыя Грамадзяне, звяртаемся, каб з Княства Жамойцкага трох, а з ваяводстваў і паветаў, а таксама з гарадоў усіх галоўных па адным, пры атрыманні гэтага ўніверсалу адразу ж да агульнай з намі прыядноўваючыся абароны, *Акт дакладна такіх жа згуртаванняў*, маючы на мэце ўзвышэнне Народу, учыніўшы, да *гэтай жа Рады Найвышэйшай* для выканання паслугі публічнай выбраць і спосабам далучэнняў дэлегаваць хацелі...» [65, с.53; цыт. па: 114, с.54-55]. Так што ўсе, хто ўздымаў паўстанне ў ВКЛ, павінен быў далучыцца да Віленскага, а не

Кракаўскага Акту і накіроўваць сваіх дэлегатаў у Вільна, а не ў Варшаву (аб гэтым ніжэй будзе сказана).

Трэцяга мая Літоўская Рада даручыла Я.Ясінскаму генеральнае камандаванне Нацыянальнымі ўзброенымі сіламі, яму ў дапамогу прызначылі Ю.Несялоўскага, ваяводу навагрудскага, палкоўніка Ю.Коцела, генерал-маёра Р.Гедройца [633, с.176]. Да месца прывесці выказванне аднаго з кандыдатаў на Начальніка пасля Касцюшкі генерала Заёнчака: «Пакуль на Літве кіраваў Ясінскі, дзейнасць яго ажыўляла розум ... правёў некалькі бітваў, не вельмі, праўда, удалых, але заўсёды без значных страт... Планы Ясінскага... занадта, можа, былі смелыя, але падтрымлівалі літвінаў у стараннным руху і ва ўсім насельніцтве выстаўлялі салодкія надзеі. Вельегорскі нічога лепшага, як уступкі непрыяцелю, вымысліць не мог. Само толькі ўяўленне рэтырады меў добрае... Патрыёты літоўскія моцна скардзіліся і ганца за ганцом пасылалі да Начальніка з жаданнем, каб даў іншага ім камандуючага» [цыт. па: 633, с.250].

Т.Ваўжэцкі ў тайнай экспедыцыі гаварыў, што «рэвалюцыя ў Літве пачалася актам, адрозным ад кракаўскага, асаблівую Раду і асаблівага начальніка для Літвы выбралі» [65, с.16]. У гэтым праявілася своеасаблівасць паўстання ў ВКЛ. Віленская ўлада не была падпарадкавана Кароне і начальніку польскай узброенай сілы Касцюшкы. Яго Віленскі Акт нават не ўзгадваў. Менавіта *найвышэйшая ўлада літоўскага народа даручалася Літоўскай Радзе.* Даследчык Л.Жытковіч знайшоў ва ўніверсалах 13 розных варыянтаў яе назваў. Для прыкладу прывядзем толькі некаторыя. Так, ва «Універсале да ваяводстваў і паветаў...» ад 24 красавіка Рада называецца Найвышэйшай Дзяржаўнай. Вельмі часта ўжываецца найменаванне «Нацыянальная Правінцыйная Рада». Апошняй была назва «Часовая Рада Літоўская пад найвышэйшым кіраўніцтвам Т.Касцюшкі» [704, с.542-543]. У гэтым праявіўся характар Літвы.

Літоўская Рада была не часовая, да моманту ўстанаўлення сувязяў з Касцюшкам і Варшавай, а на ўвесь перыяд паўстання. Вось што было напісана ў палажэнні аб Радзе: «найвышэйшая ўлада літоўскага народа ў гэтым цяпер рэвалюцыйным стане Бацькаўшчыны сканцэнтравана ў Часовай Радзе Нацыянальнай, якая мае сілу і найвышэйшую ўладу *пастаянна, пакуль той святы саюз выратавання будзе народам прызнаны патрэбным,* распараджацца ўсім, што да вызвалення Бацькаўшчыны

здатным палічыць» [Цыт. па: 114, с.56]. Аб тым, што Рада была на ўвесь час паўстання, гаворыць і аб'ява яе сяброў аб тым, што яны адракаюцца «ўсякіх зарплат, узнагарод і карысцяў» і датуль выконваць будуць абавязкі з найвышэйшаю годнасцю, «пакуль Рэч Паспалітая будзе цалкам вызвалена ад чужога жаўнера і ачышчана ад усіх здраднікаў нашай Айчыны... у найвышэйшай ступені не стане шчасця» [цыт. па: 633, с. 167-168].

Якія функцыі выконвала Літоўская рада па «Універсалу да ваяводстваў і паветаў Правінцыі Вялікага княства Літоўскага», відаць на табліцы 4.1. Бачна, што створаная ўлада галоўную ўвагу надавала справе паўстання, а не тэрору. Па ўзору кракаўскага акту Літоўская рада пакінула за сабою права ўстанаўліваць і збіраць з насельніцтва падаткі, карыстацца маёнткамі і ўсякімі нацыянальнымі фундушамі, рабіць займы ў краі і за мяжою [704, с.543]. Ёй належала вышэйшая ўлада над войскамі і іх камплектаванне. Універсал Літоўскай Рады ўстанавіў нормы: 1 рэкрут з 25 дымоў у лінейнае войска, 1 добраахвотнік з 5 дымоў сельскіх, 1 коннік з 25 акалічных шляхціцаў. Рабілася заўвага, што рэкруцкі набор належыць праводзіць без прымусу [633, с.177].

Табліца 4.1.

*Функцыі Літоўскай рады*

ЛІТОЎСКАЯ РАДА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Крымінальны суд: судзіць здраднікаў Айчыны, праціўнікаў паўстання (суд кароткі і, калі патрэбна, у 24 гадзіны або выпусціць, або прыгаварыць да смерці праз павешанне). | Дэпутацыя забеспячэння: робіць усё для патрэб паўстання на Літве. | Дэпутацыя публічнай Бяспекі: кіруе нацыянальнай узброенай сілай, аховай бяспекі супраць ворагаў паўстання. | Дэпутацыя скарбу: заведвае публічнымі фундушамі і выконвае функцыі Скарбавай камісіі. | Дэп Тай (вы кра дэп пуб бяс кір вой спр сак маг выр сам Літ Рад |

Рада лёгка магла ператварыцца ў літоўскі сейм, бо яна складалася з 29 асоб, вызначаных Віленскім актам ад 24 красавіка; 26 дэлегатаў ад паветаў і гарадоў, якія фактычна засядалі ў Радзе; 11 асоб выбраных але, відаць, якія не ўдзельнічалі ў паседжаннях Рады. Такім чынам, набіраліся 66 чал. [гл.: 704, с.544-546]. Універсал «Да ваяводстваў і паветаў правінцый ВКЛ і гарадоў вольных» падкрэсліваў, на якой тэрыторыі будзе дзейнічаць Рада: «Бацькаўшчына мілая ёсць выратаваная. Слухай, Народ Літоўскі...». 19 паветаў і 5 гарадоў накіравалі сваіх дэлегатаў у Вільна, што сведчыць аб прызнанні Літоўскай Рады на тэрыторыі ВКЛ [704, с. 552].

Своеасаблівасць паўстання ў Літве відавочная і ў дзейнасці Парадкавых камісій, аб чым пісаў 2 верасня Касцюшка ў адозве да «Зямлякоў і Суайчыннікаў», заклікаючы іх, каб забылі аб асабістых відах і поглядах» [634, с.186]. Парадкавыя камісіі ствараліся не зусім па распараджэнню Касцюшкі, бо колькасць складу Літоўская Рада павялічыла з 16 чалавек да 21 чалавека (8 шляхціцаў, 8 мяшчан, 5 асоб духоўнага стану). Парадкавыя камісіі былі арганізаваны ў Брэсце (9.04) і Кобрыне (13.05), зліўшыся пазней у адну брэсцка-кобрынскую (існавала таксама з 9.04 па 13.05); і ў Пінску і Ашмянах (у красавіку ўжо была); з першай паловы мая — у Лідзе, Слоніме, Навагрудку; у Ваўкавыску і Браславе (22.05); у Гродне (9.05) [634,192,194-195,199-200; 633, с.196-202].

Структура Парадкавых камісій была па ўзору Літоўскай Рады. Гродзенская Парадкавая камісія персанальна была самай вялікай лакальнай уладай у 1794 г., бо налічвала 80 камісараў. Палова людзей — сябры магістрата. Яны былі размеркаваны сярод Крымінальнага Суда і трох Дэпутацый: Забеспячэння, Бяспекі, Скарбавай. На прыкладзе Гродзенскай парадкавай камісіі разгледзім іх дзейнасць. У галіне фінансавай яна ажыццявіла наступнае: адчыніла «Памятную кнігу ахвяраванняў на патрэбу Айчыны», каб заахвоціць жыхароў Гродна да ўзносу грошай і рэквізітаў. Я.Храптовіч даў 9 тыс. злотых, І.Ляхніцкі і І.Скарбек — па 1 тыс. злотых, Боўфал з сынам — 450 зл., брыгіткі ахвяравалі срэбра, упрыгожванні, асабіста Касцюшцы перадалі 2 брыльянтавыя пярсцёнкі, пару срэбраных ліхтароў і 2 срэбныя банкі [688, с.29,41; 633, с.196].

Другой важнай справай Парадкавай камісіі была мабілізацыя войска. Як лічаць беластоцкія гісторыкі Е.Урвановіч і А.Вальтаноўскі, з чым мы пагадзіцца не можам,

мабілізацыя рэкрутаў і на паспалітае рушанне ішла больш на паперы, чым у жыцці. Яны прыводзяць наступны довад: выдадзена для гэтага 13 мабілізацыйных друкаваных заклікаў, адозваў, універсалаў (10.05 — у Сакулцы, астатнія ў Гродне — 17.05 — да татараў; 19.05 і 22.05 — да саслоўя рыцарскага; 31.05, 13 і 14.06 — па мабілізацыі ў конны полк А.Казаноўскага; 15.06 — па мабілізацыі па загаду Віленскай Рады пешага і коннага рэкрута; 5.07 — аб наборы аднаго рэкрута з 50 дымоў з маёнткаў грамадзян, у якіх найбольш дамоў; 7.07 — аб пакаранні тых, хто хавае збеглых сялян-кантаністаў; 17.07 — аб наборы рэкрутаў з 5 дымоў па варшаўскіх наборах; 30.07 — аб дастаўцы з Гродна збеглых рэкрутаў; 30.08 — аб дастаўцы рэкрутаў і коней яшчэ паводле ліпеньскіх загадаў [683, с. 77-78,80].

Наступныя факты даказваюць, што праходзіла не толькі «папяровая мабілізацыя», бо былі сфарміраваны:

1. Полк кавалерыі Адама Казаноўскага, які пачаў вербаваць яшчэ ў Сакулцы, а працягваў у Гродне.

2. 1-ы батальён гродзенскіх стральцоў на чале з маёрам Сахацкім ( 300 пешых, 40 конных). 7 чэрвеня ён прыняў прысягу перад Парадкавай камісіяй і пайшоў на злучэнне з Ясінскім.

3. 2-і батальён гродзенскіх стральцоў на чале з палкоўнікам Міхаілам Трэмбіцкім, які фарміраваўся ў чэрвені — ліпені ў Гродне. Арганізавана муніцыпальная міліцыя. Гэтым займалася Дэпутацыя бяспекі, камендант горада М.Эренкройм, а потым на чале яе стаў Е.Кінсгэдл, былы шведскі ваенны [гл.: 688, с.32-34].

Парадкавая камісія займалася таксама забеспячэннем арміі: у горадзе знайшлі некалькі сотняў гарматных куляў. К.Ельскі дастаў з Нёмана 6 гармат з часоў вайны 1792 г.; заклікалі жанчын збіраць лекавыя травы і бінт; звярнуліся да гараднян аб дапамозе ў абмундзіраванні коннага палка А.Казаноўскага; на патрэбы войска па заказу ННР Варшавы (на 63.034 зл. 25 гр.) працавала Гродзенская суконная мануфактура (Тызенгаўза) на Гарадніцы (103 чал.); шылі мундзіры, кажухі і сермягі гродзенскія краўцы [688, с.34, 38,39; 703, с.154, 634, с.191]. Важнай справай Парадкавай камісіі была ахова парадку ў горадзе і прыняцце мер супраць пажараў. Абапіраліся на «Універсал, які наказвае стварэнне спісу жыхароў, аб выдачы пашпартоў, а таксама з погляду бяспекі ад агню», які выдала Дэпутацыя Бяспекі [688, с.34-35].

Своеасаблівасць паўстання ў Літве ўзбудзіла ў Касцюшкі і варшаўскіх палітычных колах падазрэнне, што Літоўская Рада

прысвоіла сабе ўладу самавольна і прыводзіць «дух нязгоды, абражаючы ўнію абодвух брацкіх народаў». Як слушна піша гісторык Я.Анішчанка, «паміж палякамі і ліцвінамі зноў успыхнулі старадаўнія спрэчкі адносна ўнітарнасці і аўтаноміі паміж Каронай і ВКЛ» [9, с.229]. Старадаўнасць спрэчкі ідзе ад Люблінскага сейму, а на пярэдадні паўстання Канстытуцыя 3 мая 1791 г. юрыдычна ліквідавала ўнію, абвясціўшы ўнітарную дзяржаву («адзінае дзяржаўнае цела»). А.Т.Касцюшка не хаваў свайго намеру вярнуць Канстытуцыю 1791 г. Паміж палякамі і літоўцамі ўзмацніліся ўзаемныя абвінавачванні ў агентурна-марыянетачных паводзінах на карысць чужынцам. Літвіны абвінавачвалі палякаў у здрадзе Літве, у адказнасці за падзел Рэчы Паспалітай, за апанаванне царызмам вялікакняскіх зямель. Напярэдадні паўстання ў Літве папаўзлі чуткі, што ксяндзы рыхтуюць 4 тыс. нажоў, каб на Вялікдзень рэзаць «не толькі расійскія, але і польскія войскі, бо палякі вялікія шэльмы». Трэба нагадваць, што кароль далучыўся да таргавіцкай канфедэрацыі і аддаў загад войскам Рэчы Паспалітай капітуляваць. 14 чэрвеня Ясінскі ў «Апавяшчэнні літоўскага народу» пісаў: «Слухай ротмістраў! *Пакорнасць палякаў згубіла* наш народ, але адзіная адвага адрадзіць яго яшчэ можа» [цыт. па: 9, с. 230, 238].

Касцюшка і яго атачэнне, даведаўшыся аб стварэнні Літоўскай Рады, успрынялі сітуацыю на Літве, як піша Жытковіч, «цалкам трэзва і згодна з гістарычным становішчам справы». Але факты гавораць аб іншым. Касцюшка 12 мая ў лістах да Ф.Сапегі і Т.Ваўжэцкага, дасланых з-пад Паланца, пісаў, што справа паўстання патрабуе аднастайнасці, і ўсе ваяводствы ў Кароне далі гэтаму прыклад — прызналі Кракаўскі акт і далучыліся да яго, а Літва прыняла свой. «Літва, — настойваў ён, — да яе (аднастайнасці) далучыцца павінна, калі хоча быць упэўнена ў эфектыўнай ахове ўсяго краю» [цыт. па: 634, с.175]. Ва ўсім абвінавачваюць Ясінскага (сепаратызм персаніфіцыруецца). Калантай у лісце да яго патрабуе ўнесці змены «ў духу Кракаўскага акту», каб «акт Віленскі простым быў толькі далучэннем (акцэсам) да кракаўскага акту», бо ўсё гэта прывядзе паўстанне да смутнага канца, «калі не будзе еднасці ў Радзе». Старшыня Часовай Рады ў Варшаве Закрэўскі піша аб тым жа прэзідэнту Вільні Тызенгаўзу: «Адзін толькі віленскі акт, таксама ў чыстым патрыятычным духу складзены, здаецца, паказвае намер асобнага кіраўніцтва», а гэта не

адпавядае «палітычным саюзам» і «нацыянальнай неабходнасці», а таму віленскі акт «у гэтым сваім *дыфекце* павінен быць выпраўлены» [цыт. па: 704, с.555,556]. У лісце да Касцюшкі 13 чэрвеня Ясінскі пісаў: «Здрада ёсць каля цябе, як зайздрасць і інтрыга супраць мяне. Цябе слава твая ад дробных інтрыг засланяе, а я вымушаны цярпець, бо зрабіў два вялікія крыміналы. Спачатку, што, не будучы з княжскага роду, узяўся адшукаць давер цэлага краю. Па — другое, бо першы паказаў, што вялікага шэльму, як і малога злодзея, павесіць можна» [цыт. па: 612, с.188].

Бясспрэчным фактам супраць абвінавачванняў Літвы ў сепаратызме з'яўляецца інструкцыя ад 17 мая, якую атрымаў Ю.Коцел, дэлегат ад Літоўскай Рады, да Касцюшкі. Коцел павінен быў запэўніць яго, што стварэнне асобнай улады і Тайнай Дэпутацыі патрэбна было для аператыўнага кіраўніцтва паўстаннем на тэрыторыі ВКЛ, зыходзячы з мясцовых умоў і зменлівых абставін у ходзе баявых дзеянняў. Літоўскі дэлегат павінен быў падкрэсліць, што Літоўская Рада прызнае верхавенства Касцюшкі, будзе выконваць яго загады адпаведна яго сістэме «і рабіць усё на карысць абодвух народаў» [гл.: 633, с.185-187]. Коцел павінен быў «прасіць, каб сам Начальнік Найвышэйшы для дапамогі ўласнай хацеў бы далучыць, каб Рада Найвышэйшая Літоўская была ў сваёй дзейнасці паважана і выслухана без жаднай розніцы ад грамадзянства і войск на літоўскай зямлі знаходзячыхся... Што Тайная Дэпутацыя, трымаючы за першае правіла паслухмянасць загадам Шаноўнага Тадэвуша Касцюшкі як Найвышэйшага ўзброенай сілы абодвух народаў Начальніка, жадае мець яго загады проста прысылаемыя праз сваіх дэлегатаў» [цыт. па: 634, с.181].

У адказ на ліст ад прэзідэнта Варшавы Закржэўскага прэзідэнт Вільны Антоні Тызенгаўз пісаў 13 мая: «Акт нашага паўстання, аб'яўлены ў Вільні, калі ў чым і здаецца адметным ад таго, які ў Кракаве прыняты, розніца такая не ў мэтах і намерах, а ў тым толькі, што Акт кракаўскі канкрэтным быў і першым аднаго ваяводства кароннага, а Акт Літоўскі стаў адразу Актам *агульным усёй Літвы*» [634, с.181]. «Яшчэ раз упэўніваю цябе, шаноўны Грамадзянін, — піша Тызенгаўз, — што наш Народ, наша Рада, усе Дэпутацыі, каменданты войск і войска, усё гэтае знаходзіцца пад начальствам і поўнай залежнасці ад Найвышэйшага Начальніка Тадэвуша Касцюшкі.., бо мы пасля Бога Яму давяраем і пад Яго ўрады аддаемся, няхай будзе

ўпэўнены ў нашым даверу, пакорнасці і паслухмянасці, няхай ведае, што жыццё і кроў наша, нашы маёнткі на знак Яго цалкам будуць прысвечаны і няхай ведае, што Літва заўсёды захавае аднадумнасць з Каронаю, і, што ў самой сабе аднадумна ніякаму падыходу не дасць месца, ніякай інтрыгі не дапусціць і бачнасці яе, калі б якія знайшліся б, дапільнуе, Начальніку данясе і знішчыць...» [цыт. па: 633, с.191-192]. Так што слушна піша Масціцкі: «Сепаратызм у сённяшнім яго разуменні нікому тады да галавы не прыходзіў і літоўскае паўстанне ад першых сваіх хвілін мела выключна польскі характар, мова ішла толькі аб розным разуменні задач і сродкаў руху, выкліканых гарачым і больш рашучым тэмпераментам Ясінскага» [633, с.271].

Асаблівасць паўстання ў Літве праявілася таксама ў стварэнні Літоўскай Рады. Акт кракаўскі не прадугледжваў такога палітычнага інстытуту, бо ў ім гаварылася аб Найвышэйшай Нацыянальнай Радзе для ўсёй Рэчы Паспалітай. Яна носіць часовы характар, існуе падчас паўстання. Назначае яе Начальнік — таму і залежная ад яго. Кампетэнцыі яе былі меншыя, чым Літоўскай Рады (найвышэйшай і незалежнай ні ад каго). Кіруе войскам Начальнік, а ў Літве ён залежыць ад Рады [704, с.552]. Найвышэйшая Нацыянальная Рада для Польшчы і ВКЛ была створана па рашэнню Касцюшкі 10 мая і падпісана 21 мая. Публічна абвешчана 28 мая. Згодна з ім Літоўская Рада і Варшаўская Часовая Рада спынялі сваю дзейнасць. Сярод 8 радцаў былі два ад ВКЛ — Т.Ваўжэцкі і А.Сулістроўскі, сябры Літоўскай Рады. Сярод 32 намеснікаў ад Літвы — Ян Гарайн і Сава Пальмоўскі, былы ігумен Бельскага манастыра і старшыня правасл. кансісторыі ў Рэчы Паспалітай [гл.: 114, с.77].

Паспрабуем выдзеліць этапы так званага «літоўскага сепаратызма». Безумоўна, што пачаўся ён з Віленскага акта паўстання 24 красавіка 1794 г. і працягваўся да 10 чэрвеня, калі была спынена дзейнасць Літоўскай Рады. Унутры гэтага храналагічнага перыяда можна вызначыць некалькі этапаў: 1) 24 красавіка — 10 мая, час найбольшага радыкалізму; праяў своеасаблівасці літоўскага паўстання; 2) 10 — 21 мая, калі адбывалася змена тактыкі, ішла барацьба за захаванне самастойнасці ў кіраванні паўстаннем ў Літве; 3) 21 мая — 10 чэрвеня, пераходны перыяд да страты самастойнасці, змены ў кіраўніцтве. Можна пагадзіцца з У.Емяльянчыкам, што гэты «літоўскі сепаратызм» можна было б выкарыстаць, і дадатным

чынам прызнанне і падтрымка дзейнасці Літоўскай Рады, а не барацьба з ёю далі б больш карысці, спрыялі б толькі ўзмацненню даверу і ўзаемаразуменню паміж Вільняй і Варшавай. Нехта, магчыма, прайграў бы ў амбіцыях, але затое выйграла б справа» [114, с.64].

Ууратаваць свой урад літвінам не ўдалося. 27 мая ў лагеры пад Боркавам Касцюшка выдаў пракламацыю «Да ўсяго Княства Літоўскага, а асабліва да Часовай Рады Віленскай». У ёй сцвярджалася, што Найвышэйшая Народная Рада (далей: ННР) складзена з грамадзян як Кароны, так і Літвы (І.Патоцкі, А.Сулістроўскі, Т.Ваўжэцкі), таму часовыя рады (Віленская і Варшаўская) скасоўваюцца. 10 чэрвеня Літоўская Рада выдала развітальную дэкларацыю, у якой запэўнівала, што «выконвала толькі тое, што народ з паўсюднай руплівасцю сваёй для дабра Айчыны выказваў», цяпер перадаюць уладу ў рукі «выратавальніка ўсяго народа» А.-Т.Касцюшкі і прызначанай ім Цэнтральнай дэпутацыі [65, с.111]. Першага чэрвеня сэсія ННР дэталёва распісала склад Дэпутацыі, яе агульныя абавязкі, падзел працы паміж сябрамі і спосабы дзейнасці. Цэнтральная Дэпутацыя павінна быць «выканаўчым сродкам Начальніка Узброенай сілы і Найвышэйшай Народнай Рады, як іншыя *пасрэдніцкія ўлады* адпаведна акта паўстання» і не мела права «*нічога сама ні пастанавіць, ні растлумачыць, ні выконваць пад адказнасць*». Дэпутацыя павінна была наглядаць, каб ні яна сама, ні падпарадкаваныя ёй улады не выходзілі супраць артыкула XII — га Акта паўстання, які забараняў прыняцце актаў, «якія станавілі бы нацыянальную канстытуцыю». Павінна кожны тыдзень дасылаць справаздачы начальніку і ННР [633, с.226-227]. Членаў Цэнтральнай Дэпутацыі прызначыў сам Касцюшка: Ю.Несялоўскі, А.Тызенгаўз, Е.Белапятровіч, В.Гарэцкі, Ст.Мірскі, Б.Марыконі, Д.Пілхоўскі. Сем дэпутатаў і 28 намеснікаў былі размеркаваны па сямі экспедыцыях: парадка, бяспекі, юрыдычнай, казны, харчавання (нагляд за сельскай гаспадаркай), вайсковых патрэб, асветы (нагляд за школамі) [65, с.112-113]. Галоўнакамандуючым літоўскага войска стаў М.Вяльгорскі.

У палове ліпеня Скарбавая экспедыцыя Найвышэйшай Нацыянальнай Рады даслала ў Вільна 50 тыс. рубл. серабром і 300000 зл. у «mincettlach». Пры гэтым звернута ўвага, што «грошы выбітыя з серабра, дасланага з Літвы, на патрэбу літоўскай правінцыі будуць прызначаны, гэта не з той мэтаю робіцца, каб

дацць месца асобным скарбавым рахункам, бо як духам, так і ў сілах, спосабах і выдатках адзіным з'яўляемся народам, а каб жыхары літоўскія здалёк і зблізу бачылі, як старанна іх ахвяры аказаліся выкарыстанымі» [цыт. па: 634, с.297]. Як бачым, Цэнтральная Дэпутацыя абмяжоўвалася ў сваіх фінансавых функцыях. Аднак нават такая Цэнтральная Дэпутацыя была формай кампраміса паміж цэнтралісцкай арганізацыяй паўстання і «ўдзельнасцю» Літвы. Акт Кракаўскі яе не прадбачыў, ён аб'яўляў жорсткую цэнтралізацыю ўлады, якую Рэч Паспалітая ведала толькі ў часы дзейнасці Чатырохгадовага сейма.

З 23 жніўня па 1 кастрычніка 1794 г. Цэнтральная Дэпутацыя знаходзілася ў Гродне. У гэты час яна поўнасцю падпарадкавалася ННР, сваіх адозваў і ўніверсалаў не выдавала, абмежавалася передрукам тэкстаў, дасылаемых з Варшавы, і тыя са спазненнем даводзілі да жыхароў Літвы. Так, напрыклад, адозва ННР «Да грамадзян правінцый ВКЛ» ад 11 верасня была выдадзена ў Гродне толькі 27 верасня, універсал аб дастаўленні жывёлы да войск Рэчы Паспалітай — 24 верасня, напярэдадні адыхода Цэнтральнай Дэпутацыі з Гродна. Немагчыма было рэалізаваць і яе апошняе распараджэнне ад 30 верасня «Загад абмалоту збожжа і дастаўцы яго да лагера» [688, с.39-40; 424, с. 102].

Ніякія абвінавачванні ў сепаратызме не могуць перакрэсліць фактычную сувязь Літвы і Кароны ў паўстанні. Як добра напісаў даследчык Ясеніца: «Уступілі ў бой сіямскія сёстры: Карона і Літва. Павінны і жадалі ісці разам, але кожнае пад уласным імем і з уласным тварам» [586, cz.3, s.532]. А.Тызенгаўз — сябра Літоўскай Рады і прэзідэнт Вільны ў лісце да прэзідэнта Варшавы Закржэўскага пісаў, што Літва — «бацькаўшчына і калыска Тадэвуша Касцюшкі, і Народ Літоўскі будзе старацца рабіць усё разам са сваімі братамі ў Польшчы, каб быць годнымі свайго земляка» [Цыт. па: 634, с.184-185]. Прыкладамі «братэрскіх паразуменняў» (словы даследчыка Леснадорскага — 612, с. 273) з'яўляюцца іх кантакты. Так, 29 красавіка Тайнай Дэпутацыяй даслана экспедыцыя да Касцюшкі з данясеннем «аб стане рэвалюцыі ў Літве, аб нашай сіле, аб палажэнні непрыяцельскага войска, з просьбаю аб падтрымцы Літвы гарматамі, амуніцыяй і грошамі». Былі высланы: акт паўстання Літоўскага Народа, універсалы Літоўскай Рады, а таксама копіі перахопленых рускіх папераў аб стане войска [668, с.284].

Сёмага мая была накіравана новая экспедыцыя да Касцюшкі з чарговай просьбаю дапамагчы, бо «інакш нашай Правінцыі і г.Вільні пагражае разбурэнне, спусташэнне і знішчэнне». Генерал-маёру Я. Грахоўскаму дэпутацыя пісала: «...калі Літва будзе ўся захоплена, ніякай дапамогі Карона не будзе мець. Яшчэ ёй застаецца цяжкасць вярнуць значную частку свайго краю, і выклікае сумненне, каб пасля аднятых праз кардон (мяжа ВКЛ з РП — *В.Ш.*) частку яшчэ і без Літвы Польшча магла пераадолець ваенныя патрэбы. Некалькі тысяч людзей, дадзеных нам цяпер у дапамогу, выратуюць нас ад поўнага захопу, і ўжо Літва сваёю сілаю і моцай будзе здольна абараніцца і ўтрымаць адзіную з правінцыямі кароннымі справу». Сёмага, а потым дзевятага мая Дэпутацыя просіць у Грахоўскага каля 6 тыс. узброеных гарматамі, бо «на гэтым лёс Літвы, а таксама ўсяго польскага краю залежыць». 7 мая генерал-маёру Казіміру Сапегу, арганізатару паўстання ў Брэсце, Тайная Дэпутацыя Рады пісала: «Працуем па агульнаму ўзбраенню; ужо ў многіх месцах народ узброены ў пікі, косы, насаджаны на дрэўка і нават у стрэльбы, сам г.Вільна такой гвардыі народнай даставіць 1600 асоб». У гэты ж дзень дэпутацыя даносіла Касцюшцы: «Запал у нас трымаецца паўсюдна і грамадства нашае ўзбройваецца, набор ідзе ахвотна, але для гэтага маем дзве перашкоды: недахоп зброі і грошай. Грамадзяне даюць значныя ахвяраванні, але для збору іх патрэбны час, асабліва цяпер, калі яшчэ маем непрыяцеля, раскіданага па краю. Вільна сама склала каля 200000 зл. у наяўных грошах, гэта значыць грамадзяне, якія тут знаходзяцца...» [668, с.288-293]. Варшаўская рада падбадзёрвала літвінаў пасля падзення Вільны. У закліку гаварылася: «Не гарады нас абараняюць ад варожых udараў, не сцены нам цвярдыня і ахова; у нас саміх непераможнае месцазнаходжанне вольнасці і незалежнасці. Грудзі — нашая мяжа, рукі — шчыт і абарона» [цыт. па: 177, с.806]. Сімвалам сувязі Літвы і Кароны з'яўляецца эмісія папяровых грошай, на якіх намаляваны Арол і Пагоня — гербы дзвюх краін Рэчы Паспалітай [596, с.315].

Самым яркім праяўленнем сумеснай барацьбы Літвы і Кароны былі баі, якія адбыліся на тэрыторыі ВКЛ: в.Немчын у 3 мілях ад Вільны — 27.04; в.Паляны каля Ашмян — 7.05; в.Солы — 26.06; г. Вільна — 19 — 20.07; пад Слонімам — 2.08; пад Дзівінам — дата невядома; Вільна — 11-12.08; Кобрын — 15.09; пад Крупчыцамі — 17.09; Брэст — 19.09; Цераспаль —

21.10. Дробныя сутычкі адбыліся ў Мікалішках, Ліпнішках, Жалудку, у якіх праявілі сябе Пацэй, Граноўскі, Ю.Нарбут, Каспер Корсак [634, с.200].

На тэрыторыі Белай Русі паўстанне таксама мела водгаласак. Як толькі пачалося паўстанне, генерал-губернатар Туталмін атрымаў ад Кацярыны II інструкцыю (19.04. ст. ст.), у якой загадвалася ўзяць пад «суровы нагляд» маёнткі Чартарыйскіх, Ябланоўскіх, Мірскага, Дзялынскага, Касоўскага і іншых, «каб даходы з гэтых маёнткаў супраць нас не былі выкарыстаны». Цікава, што імператрыца раіла перацягваць сялян, асабліва праваслаўных, на свой бок, бо яны «палякаў, паноў сваіх ненавідзяць». Для гэтага ў маёнтках, якія ўзяты ва ўрадавую адміністрацыю, трэба было адхіліць ад кіравання былых польскіх адміністратараў, пакінуць толькі «надзейных і пачцівых дазорцаў». Нягледзячы на прынятыя меры, настрой насельніцтва на тэрыторыі другога падзелу быў непрыхільны да «парадкаў, усталяваных пасля 1793 г.». Вось аб чым скардзіўся 30 мая (11 чэрвеня) Туталмін з Нясвіжа кн. Рапніну: «мяжа адкрыта, і бунтаўшчыкі распаўсюджваюць тут свае падбухторваючыя друкі, як гэта было ў замежнай Літве»; паліцыя не можа выконваць сваіх абавязкаў; суды не дзейнічаюць; падаткаў ніхто не плаціць «ні шэляга»; загада імператрыцы аб уніятах і маёнтках паўстанцаў выканаць не — магчыма, бо няма сілаў у паліцыі і не дзейнічаюць суды [634, с.210-211].

Ясінскі лічыў неабходнай умовай поспеху паўстання на Літве партызанскія дыверсійныя рэйды на тэрыторыю, захопленую ад Рэчы Паспалітай пасля двух падзелаў (частка Літвы і Беларусі). Яны ўмацоўвалі бы дух войска і пашыралі бы паўстанне. Першага чэрвеня Я.Ясінскі загадвае ў сваім «Універсале да павятовых генерал-маёраў» сабраць ротмістраў і сотнікаў, каб збіралі згодна атрыманага ардынанса ў тэрмін 10 дзён здаровых і моцных людзей (не меней 300 чал.) і адразу вялі да вайсковых часцей; тых, хто не пойдзе, арыштоўваць, зброю і маёнтак забіраць, а самога прывесці на суд да Ясінскага. Гэтыя конныя атрады накіроўваюць за кардон у межы другога і першага падзелаў і «там так сябе весці, як Масква абыходзіцца з нашым краем», але, не адступаючы ад «Інструкцыі, для ўваходзячых у кардон расійскі» [65, с.104-105; 634, с.202-203].

У першых днях чэрвеня М.К.Агінскі прапанаваў Я.Ясінскаму план рэйду на Беларусь: даць сялянам вольнасць

і гэтым прыцягнуць 12 тыс. у шарэнгі паўстанцаў. Атрад складаўся з 300 стральцоў і 200 кавалерыстаў на чале з маёрам К.Корсакам. За імі ішоў сам Ясінскі. У Валожыне пасля кароткай сутычкі ўзялі запасы скуры, жалеза, волава, некалькі сот валоў адправілі ў галоўную кватэру ў Ашмянах. У Івянцы захапілі запасы амуніцыі, зброі, медзі, срэбра, сукна. Тут 15 чэрвеня М.Агінскі зачытаў жыхарам зварот да насельніцтва Міншчыны, у якім заклікаў падтрымаць паўстанне [65, с.132-133]. Пад Вішнёвам адбыўся бой. Толькі 150 чал. кавалерыі выйшлі пад Крэва, а пазней — частка стральцоў. У пачатку чэрвеня адбыўся рэйд 30 ляснічых у Мінскую губ. на чале з грамадзянінам Я.Зянковічам. Бой гэтага атраду з дапамогаю мясцовага насельніцтва ў Валакаце скончыўся перамогаю [633, с.205,208].

У канцы ліпеня — напачатку жніўня праводзілі рэйд М.-К.Агінскі з завілейскімі паўстанцамі і Я.Зянковіч, К.Бяліковіч, І.Марыконі на чале браслаўскіх і вількамірскіх паўстанцаў. Яны дайшлі 31 ліпеня да Дынабурга, але не змаглі узяць, а толькі частку яго спалілі [65, с.139-146; 634, с.288-290].

Рэйд атрада Ст. Грабоўскага пачаўся пасля капітуляцыі Вільны. 15 жніўня двухтысячны атрад, маючы 5 гармат, выйшаў з Аран на Іўе, дзе адбыўся бой з маршалам Демайтрэ. Пад Мікалаевам у Мінскім ваяводстве Грабоўскі ўжо меў да 6 тыс. чал. Праз Івянец і Ракаў ён пайшоў на Мінск, але за 10 в. да яго 17 жніўня казакі Данскога палка на чале з прэм'ер-маёрам Шчадровым далі бой і прымусілі Грабоўскага адысці ў напрамку Пухавіч і Свіслачы. 30 жніўня пад Бабруйскам ён пазбег акружэння і адступіў далей. Першага верасня быў пад Глускам. Па дарозе на Слуцк, пад Любанню, П.Д.Цыцыянаў з 4 тыс. чалавек перагарадзіў дарогу і даў бой. Атрад Грабоўскага 4 верасня вытрымаў чатыры атакі і ганарова склаў зброю. Расіяне ўзялі 5 гармат, 250 чал. пяхоты [65, с.148-152,155]. У Смаленску яны былі накіраваны на службу ўглыб Расіі, а Грабоўскі сасланы ў Унжэнскую акругу.

Аналізуючы прычыны паражэння паўстання 1794 г. на тэрыторыі ВКЛ, трэба абавязкова звярнуць увагу на яго кіраўніцтва. З 29 чалавек Літоўскай Рады дванаццаць непасрэдна працавалі ў камісіях гродзенскага сейма 1793 г.: М.К.Агінскі, Ст.Валовіч, М.Бжастоўскі, В.Гарэцкі, Р.Гедройц, С.Корсак, М. Мураўскі, Б.Марыконі, Ю.Несялоўскі, К.Нагурскі, А.Тызенгаўз. У сейме ўдзельнічалі П.Грабоўскі, Фр.Сапега,

К.Рушчыц, якія потым узначаляць паўстанцкія войскі і ўслаўляцца бяздзейнасцю і ўхіленнем ад дысцыпліны. Была і здрада. Так, М.Радзівіл на наступны ж дзень паўстання даслаў царскаму намесніку Ц.Туталміну ліст з падрабязным апісаннем падзей [65, с.47-48]. А быў ён членам Камісіі бяспекі Літоўскай Рады. Туталмін папрасіць потым для яго чын тайнага саветніка «за непоколебимую к престолу её императорского величества верность!». Пасля пачатку паўстання з'явіліся да М.В.Рапніна, генерал-губернатара Рыжскай і Рэвельскай губ., Ігнат і Антон Прозары (сябра Літоўскай Рады) і «добровольно свято обещали, что они не только сами от мятежа и всякого сообщения с причастными к оному отрекаются, но желают еще склонить к тому и брата» (К.Прозара) [8, с.4].

Прычынай паражэння была адсутнасць адзінай кіраўнічай улады паўстання, сканцэнтраванай у адных руках: Ясінскі, Хлявінскі, Сапега часам дзейнічалі незалежна адзін ад другога. Радыкалізм Ясінскага, які праяўляўся часам вельмі востра, нараджаў новых ворагаў сярод шляхты і Літоўскай Рады [633, с.214]. Кастамараў піша, што паміж польскімі генераламі ў Літве была нязгода і саперніцтва [177, с.803], старэйшыя генералы лічылі для сябе зневажальным падпарадкоўвацца палкоўніку Ясінскаму, які стаў камандуючым Літоўскага войска. Асабліва вострымі былі спрэчкі паміж Ясінскім і Хлявінскім. У войску, такім чынам, адсутнічалі субардынацыя, дысцыпліна, выкананне загадаў. Прычынамі паражэння паўстання ў ВКЛ быў таксама недахоп здольных і энергічных военачальнікаў, як піша Масціцкі, «такіх Ясінскіх і Грабоўскіх» [633, с.210]. Не было адзінства і салідарнасці ўнутры Цэнтральнай Дэпутацыі, асабліва ў апошні перыяд паўстання. З Вільні адна частка яе членаў выехала ў Коўна, другая — у Гродна. Галоўнай жа прычынай паражэння была нявырашанасць сялянскага пытання: поўная воля абяцалася толькі пасля перамогі паўстання.

Пасля паражэння паўстання ў студзені 1795 г. у Смаленску пачала працаваць Следчая камісія. Было 80 арыштаваных паўстанцаў-афіцэраў, 40 шляхціцаў, 20 вайскоўцаў, 8 святароў (каталікаў і уніятаў), адзін мяшчанін і адзін селянін. «Асобы камітэт» у Пецярбургу разглядзеў вынікі следства і ў канцы мая — пачатку чэрвеня прадставіў Кацярыне II праект свайго рашэння: 16 паўстанцаў вызваліць ад пакарання, 13 пакараць смерцю, астатніх выслаць у Сібір. Імператрыца праявіла міласць і смяротныя прыгаворы замяніла бястэрміновай высылкай у Сібір і на Камчатку.

Не менш гаротным быў лёс малодшых камандзіраў і радавых ваеннапалонных ( да 10 тыс. чал.). Іх сагналі ў зборныя месцы на тэрыторыі ўнутраных губерняў Расійскай імперыі, адкуль найбольш небяспечныя былі высланы ў Фінляндыю «для употребления в работах», астатнія — «во внутренние гарнизоны и штатные команды в солдаты» [гл.: 114, с.151,152,153]. Сярод іх было нямала і ліцвінаў.

Такім чынам, паўстанне ў Літве і Беларусі падзяліла расійскія сілы, не дазваляючы ім канцэнтравацца ў адным напрамку, стрымлівала значную расійскую армію ад выкарыстання яе супраць паўстанцаў Кароны. Дзейнасць літоўскай арміі, рэйды партызанскіх атрадаў не дазвалялі рускім выкарыстаць войска, якое стаяла на тэрыторыі, якая адышла да Рэчы Паспалітай па другому падзелу. Тое ж можна сказаць і пра прускія войскі, якія вымушаны былі надаваць увагу сваёй усходняй мяжы (Жмудзь). Паўстанне Літвы і Беларусі перашкаджала камунікацыі расійскага штаба з Пецярбургам, перасякло дарогу рускім арміям у Карону (яны маглі туды ісці толькі праз Валынскае ваяводства). І, можа, найважнейшым было маральнае значэнне літоўскага руху: «ачысцілася і загартавалася душа гэтага народа, які ў час усяго пад'ёму праявіў незвычайную моц і добрасумленнае вялікае прысвячэнне» [Цыт. па: 633, с.272]. Паўстанне мела і міжнароднае значэнне — яно стрымала інтэрвенцыю рускіх войск супраць рэвалюцыйнай Францыі.

## 4.2. **Расійскае і польскае масонства на землях Беларусі**

Масонства ў вызначэнні розных даследчыкаў — гэта рэлігійна-філасофскі, рэлігійна-этычны, рэлігійна-містычны або маральна-рэлігійны рух. Найбольш дакладнае вызначэнне масонства, відаць, даў выдатны яго даследчык Л.Гас. У вузкім значэнні масонства — гэта геаграфічна распаўсюджаныя і ўплывовыя тайныя аб'яднанні, арганізаваныя на базе статутных дакументаў, выдадзеных «Вялікай ложай Англіі» ці ложамі, створанымі ёю, і якія маюць у якасці падставы арганізацыйнай структуры ложы, сябры якой надзелены вызначанымі ступенямі пасвяшчэння ў яе справы і праводзяць свае паседжанні ў адпаведнасці з рытуалам, які прадпісаны выбраным імі абрадам масонства. У шырокім сэнсе масонства — самакіруемы рух, у

склад якога, акрамя масонскіх ложаў (стрыжня руху), уваходзяць рознародныя аб’яднанні (якія часам называюць парамасонскімі): акультысцкія (марціністы, разэнкрэйцеры, тэасофы, атрапосафы); саюзы спірытаў і метафізікаў; групы з рысамі рэлігійных сектаў; рэлігійна-філасоўскія секты і д.п. [581, с.13].

Назва, структура, рытуалы і сімволіка масонскіх ложаў запазычаныя ад сярэднявечных цэхаў будаўнікоў-муляраў. Росквіт цэхавай арганізацыі ў Заходняй Еўропе прыпадае на XIII—XV стст. [424, с.13-22]. Захавалася дакументальнае сведчанне аб тым, што ў 1600 г. у ложу вольных муляраў упершыню быў прыняты чалавек небудаўнічай прафесіі — шатландскі лорд Басуэлі [385, с.117]. Масонства ж нарадзілася напачатку XVIII ст. у Англіі. 24 чэрвеня 1717 г. у Лондане арганізавалася першая ў свеце Вялікая ложа, якая і стала рассаднікам масонства на ўсім свеце. Спачатку яно перанеслася ў Германію, дзе першая ложа ўзнікла ў 1733 г., затым — у Амерыку (1734 г.), Італію (1735 г.) і Францыю (1736 г.) [236, с.102,106; 621, с.116].

Пад юрысдыкцыяй Вялікай ложы Англіі масонства ў XVIII ст. пранікла ў Расійскую імперыю. Згодна з дакументам, датаваным 1731 г., Вялікім Майстрам у Расіі быў прызначаны капітан Джон Філіпс. У 1765 г. у Пецярбурзе арганізавалася аўтаномная структура кіраўніцтва. Асабліва падкрэслім, што ядром новай масонскай арганізацыі была група каталікаў. Пры Кацярыне II масонства перажыло свой «залаты век», але гэтая ж імператрыца ўказам ад 1 жніўня 1792 г. забараніла яго [385, с.121; 236, с.119-120; 31, с.142].

У кацярынінскія часы пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай з’явіліся першыя масонскія ложы на тэрыторыі Беларусі (табл. Д.10.1). На жаль, сведчанняў пра іх няшмат. 22 мая 1770 г. пачала сваю працу ложа «Двух Арлоў на Усходзе Магілёва». У 1776 г. ці 1777 г. прафесар Маскоўскага універсітэта І.Е.Шварц з дазволу Гросмайстра рускіх ложаў І.П.Елагіна заснаваў ложу «Геркулеса ў Калысцы на Усходзе Магілёва». Пазней майстрам яе быў А.І.Вяроўкін. Працавала ложа па елагінскай сістэме. У 1784 г. гэтая ложа ўвайшла ў Правінцыяльную ложу ў Маскве. У 1778-1779 гг. у Магілёве дзейнічала ложа, назва якой невядомая (майстар У.Палянскі).

Другім цэнтрам распаўсюджвання масонства на Беларусі стаў Полацк. Сюды ў 1777 г. перанесла працу ложа «Талія»,

якую заснаваў у 1775 г. у Маскве Вердзярэўскі. Яна прытрымлівалася шведска-бярлінскай сістэмы і падпарадкоўвалася Вялікаму Майстру Правінцыяльнай ложы ў Пецярбурзе І.П.Елагіну. Невядомая назва ложы, якая працавала ў 1791 г. па елагінскай сістэме ў Шклове [299, с.501-502,505,508,510,521; 61, с.17,67]. Усе названыя ложы існавалі не болей, як да забароны масонства Кацярынай І. У часы Аляксандра І на сучаснай беларускай тэрыторыі ложаў пад кіраваннем расійскіх структур не было.

У Рэчы Паспалітай масонства стала распаўсюджвацца пры польскім каралі і вялікім князі літоўскім Аўгусце ІІІ. У кастрычніку 1738 г. ягоны натуральны брат граф Рутоўскі заклаў у Дрэздэне ложу Трох Белых Арлоў, якая стала прамацяраю польска-літоўскага ( у тым ліку і заходнебеларускага) масонства. Першая польская ложа сфармавалася ў 1739 г. на каралеўскім двары ў Варшаве як філіял названай ложы [224, т.2, с.227-228; 276, с.79]. З 1781 г. Вялікі Майстар (магістр) правінцыйнага масонства Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага Ігнаці Патоцкі падрыхтоўвае Статут Вялікага Усхода Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага. 26 лютага 1784 г. яго падпісалі дэпутаты ад адной вялікай ложы, трох правінцыяльных і дзевяці сімвалічных ложаў. У іх ліку была правінцыяльная ложа пад назваю «Шчаслівае вызваленне на Усходзе Гродна».

Яна ўзнікла ў 1781 г., была правінцыяльнай і працавала на французскай мове, таму па дакументах ложы яе назва «L' beureuse Delivrance». Гэты скарочаны надпіс маецца і на авальнай пячатцы ложы, адбітак якой захаваўся на дакуменце за 17.02.1782 г. у бібліятэцы Польскай Акадэміі Мастацтва. У бібліятэцы АН Літвы ёсць пергамент з подпісамі 17 братоў ложы «Шчаслівае вызваленне на Усходзе Гродна», якія даверылі А.Годзіну прадстаўляць іх у ложы «Дасканалай Еднасці на ўсходзе Вільні». Майстрам кафедры быў знакаміты Ж.-Э.Жылібер, намеснікам — Бекю, казначэем — Ж.-Л.Бекю, сакратаром — Ф.Шрайбер [158, с.483]. Колькі існавала ложа, сказаць цяжка, бо нават такі вядомы даследчык, як Ст.Малахоўскі-Лемпіцкі, і той памыляецца: то піша, што яна перастала працаваць «яшчэ ў XVIII ст.», то дае спіс членаў ложы, дзе паказвае 1820-1821 гады знаходжання. Ёсць факт перадачы Вялікім Усходам імя гродзенскай ложы Нясвіжскай ложы «Шчаслівага вызвалення» 4 жніўня 1810 г. [621, с.116-118; 620, с.53].

Згодна з Статутам 1784 г. існавалі тры масонскія правінцыі — вялікапольская, малапольская і літоўская, на чале якіх стаялі

намеснікі Вялікага Магістра. Кожная правінцыя была як бы малы Вялікі Усход з прадстаўнікоў сімвалічных ложаў і мела вялікую правінцыяльную ложу. У літоўскай — гэта ложа «Дасканалая Еднасць на Усходзе Вільні». Прадстаўнікі ложаў меліся таксама пры Вялікім Усходзе Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага. Статут умацаваў цалкавітую незалежнасць польска-літоўскага масонства ад замежных масонскіх уладаў, ён не прызнаваў першага падзелу Рэчы Паспалітай і падпарадкоўваў ложы-мацеры «Кацярыны пад Паўночнай Зоркай» «усе землі і краі, якія знаходзіліся пад польскім панаваннем, а таксама края і правінцыі, якія ляжаць за мяжою» [224, т.2, с.232; 620, с.9]. У польска-літоўскім масонстве гэтага часу адчуваліся прарускія настроі, але ў перыяд працы Чатырохгадовага сейма адбудзецца пералом да незалежнасці, і нават назва вялікай ложы зменіцца на «Станіслава Аўгуста пад Паўночнай Зоркай» [605, с.25-26].

З 1792 г., а асабліва пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай, пагрома паўстання А.-Т.Касцюшкі, у масонстве на тэрыторыі былых дзяржаваў Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага назіраецца поўны развал. Толькі ў канцы 1809 г. пачынае працу ложа «Шчаслівае Вызваленне на Усходзе Нясвіжа», а 22 сакавіка 1810 г. аднаўляецца Вялікі Усход Польскі. 17 сакавіка 1812 г. ствараецца Вялікі Усход народны Кароны і Літвы, але ў сувязі з вайной 1812 г. масонства зноў згасае. Масоны адклалі свае працы да той пары, пакуль у краіну не прыйдзе спакой. Архівы і перапіска не захавалі ніводнага дакумента аб дзейнасці масонаў у гэты час [64, с.119-120,424-425].

У 1815 г. быў адноўлены Вялікі Усход Польскі, і пачалося адраджэнне літоўска-беларускага масонства. У 1816 г. масоны Ян Норвід, Міхал Сабескі, Караль Гофман і Ян Ходзька прыехалі ў Вільню і пры дапамозе старэйшага масона прэлата Міхала Длускага пачалі працу ў ложах «Старанны Ліцвін» і «Добры Пастыр» і адчынілі дзве новыя ложы: «Школу Сакрата» ў Вільні і «Палемон» у Расіенах Ковенскай губерні. У 1818—1819 гг. у літоўскай правінцыі мелася 12 ложаў: на Усходзе Вільні — правінцыяльная Літоўская ложа «Дасканалая Еднасць», сімвалічныя ложы «Старанны Ліцвін», «Храм Мудрасці», «Добры Пастыр», «Школа Сакрата», «Славянскі Арол» [621, с.120; 101, с.103].

Росквіт масонства адбыўся ў Беларусі ў 1816-1821 гг. пад апекаю Аляксандра I, які сам быў масонам. Менавіта ў гэты

час узніклі сімвалічныя масонскія ложы на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай губерняў (табл. Д.10.1): у Навагрудку — ложа пад назваю «Багіня Цэрэра», якая хутка змянілася на «Вузел Еднасці», у Гродне — «Сябры Чалавецтва» [447, с.50-53; 438, с.66,70; 101, с.103], у Мінску — «Паўночная Паходня», «Святыня Поўначы» і капітулярная (спачатку ніжэйшая, а з красавіка 1821 г. — вышэйшая ) ложа «Гара Табар». Акрамя таго, былі створаны сімвалічная ложа «Уладзіслава Ягайлы» ў Слуцку і ніжэйшая капітулярная ложа «Святыня Спакою» ў Нясвіжу. Невядома, калі ўзніклі нагадваемыя ў архіўных крыніцах ложы «Пераможаныя Забабоны» ў Нясвіжу і «Святасць Змовы» ў Мінску [694, ч.2, с.112-119; 250, ф.1, воп.1, спр.2860, а.3-3 адв.].

Арганізацыйная структура літоўска-беларускага масонства ў час росквіту адлюстравана на схеме Д.11.1. Падпарадкоўвалася яно Вялікаму Усходу Польскаму, у склад якога ўваходзілі капітулярныя ложы «Святыня Спакою» і «Гара Табар», а таксама Правінцыяльная Літоўская ложа пад асаблівай назвай «Дасканалая Еднасць». Апошняй падпарадкоўваліся пяць сімвалічных ложаў, якія мелі сваю нумарацыю ў пераліку ложаў, якія ўваходзяць у Вялікі Усход Польскі, адпаведна часу ўзнікнення.

Ложа — гэта супольнасць выбраных, з'яднаных вузамі духоўнага сваяцтва і адпаведнай клятвай ячэйка масонскага таварыства. Ложай таксама называлася памяшканне, у якім праходзілі паседжанні вольных муляраў. Вокны ў такіх памяшканнях выходзілі на тры бакі свету: усход, захад і поўдзень [528, с.47-48]. Ложы, як мы ўжо ўказвалі, былі сімвалічныя і капітулярныя. У сімвалічных працы вяліся ў першых трох ступенях: вучня, чэлядніка і майстра. Інакш такія ложы зваліся янаўскімі («иоановскими»), у гонар свайго патрона св.Яна, якога Вялікі Будаўнік Свету Ягова накіраваў для адукацыі людзей, якія жывуць у цемры і цені смерці. Ложы першых двух ступеняў называліся блакітнымі, бо сцены памяшканняў у ложах і фартухі братоў былі такога колеру. Сцены памяшканняў, дзе адбываліся паседжанні майстроў і выбраных кавалераў, былі чорнага колеру Для ступеняў ад 5 да 33 з сярэдзіны XVIII ст. прыняты чырвоны колер [621, с.123-124; 333, с.4]. Абсталяванне памяшканняў паседжанняў масонаў таксама адпавядала розным ступеням [гл.: 694, ч.2, с.420; 249, ф.295, воп.1, спр.286, а.92,92 адв,318адв.].

Масонскія працы адбываліся па ступенях. Напрыклад, у гродзенскай ложы «Сябры Чалавецтва» на працягу 1820 г. (па масонскаму летасчысленню 5820 г.) адбылося паседжанняў: у ступені вучня — 37, у ступені чэлядніка — 7, у ступені майстра — 8 [621, ч.2, с.210].

Ступені масонства называліся з першага па сёмы наступным чынам: вучань, чэляднік, майстар, кавалер выбраны, кавалер шатландскі, кавалер Усходу, кавалер Ружовага Крыжа. Ступень залежала ад узроўню пасведчанасці ў масонскія таямніцы. Асноўная праца кожнай ступені складалася з падрыхтоўкі і прыняцця брата ў сваю ступень. Навука масонаў дзвюх першых ступеняў складалася з выпрацавання сямі абавязкаў: даверу, шчырасці, міласэрнасці для бедных, паслухмянасці, лагоднасці, адвагі і маўчання. Сімвалам вучня быў грубы прыродны камень, і належала «заняцца апрацоўкай сябе ў зрэласці дараванняў і сілаў». Абчэсаны кубічны камень — сімвал чэлядніка, які «да Адкравення, слова прарокаў і евангелія ставіцца з глыбокай павагай, не саромеючыся розуму і адносіць законы і дагматы, як апеку, да патрэб знешняй дысцыпліны думкі, пазбягае спрэчак, і не лічачы сябе замкнутым у вызначанае кола, не бачыць карысці ў фанатычнай прапагандзе, якая не стварае ўнутранага сканцэнтравання і апоры». Сімвалам майстра была лічэбнікавая дошка з геаметрычнымі фігурамі і эстэтычнымі контурамі. Ён ведаў легенду аб забойстве будаўніка храма Саламона Гірама (Адараніма). Ягоная праца заключалася ў дапамозе вучням і чэляднікам дасягнуць сваіх мэтаў [621, с.124-127; 225, с.272,274].

Ніжэйшыя капітулярныя ложы працавалі ў 4 і 5 ступенях, а вышэйшыя — у 6 і 7 ступенях і мелі права ствараць сімвалічныя ложы. Чацвёртая ступень называлася «Выбраны кавалер». У ёй вучылі помсце за забойства Гірама. Ступень пятая, шатландскі кавалер, апісвала падарожжа шатландскіх майстроў у пошуках царкоўных скарбаў, якія знаходзяцца ў труне Гірама. У навуцы шостай ступені, кавалера Усхода, таксама гаварылася пра Гірама і неабходнасці падтрымкі існуючай улады. Масон сёмай ступені, кавалер Ружовага крыжа, ведаў, што «той, хто праз сваю працу і пошукі адкрые таямніцу, высокія праўды замыкаючую, будзе ўпэўнены, што знайшоў шчасце, па якому кожны смяротны ўздыхае, дні яго будуць шчаслівыя, рукі яго будуць чыстыя, а нястача і слабасць не будуць мець перавагі» [621, с.127-132].

Кожны год 1 сакавіка (гэта першы дзень масонскага года) адбываліся выбары чыноўнікаў ложы тэрмінам на адзін год: майстра кафедры, ягонага намесніка, дазорцы, прамоўцы, падскарбія, суддзі, ялмузніка (літаральна «жабрака»). Майстар — галоўны адміністрацыйны начальнік ложы, ён вызначае суд, падтрымлівае кантакты з правінцыяльнай ложаю і Вялікім Усходам, прадстаўляе братоў на вышэйшую ступень, падпісвае дакументы. Другую пасаду пасля майстра займаў ягоны намеснік. Ён дапамагаў майстру, а ў яго адсутнасць кіраваў справамі ложы, вёў паседжанні.

Наступная пасада ў іерархіі ложы — прамоўца. Ён павінен быў дасканала ведаць Статут, звычаі і прадпісанні Ордэна, каб быць заўсёды іх абаронцам. Прамоўца выступаў па сутнасці кожнай справы, даваў заключэнне на пададзеныя справы адпаведна з правамі масонаў. Звычайна пасля яго выступу старшыня паседжання пачынаў дыскусію. Дзве наступныя пасады — падскарбі і суддзя. Пад апекаю першага знаходзіўся бюджэт ложы і фінансавыя разлікі. Другі вырашаў судовыя справы братоў ложы. Апошняя выбарная пасада — ялмузнік. Ён загадваў грашыма, якія былі сабраныя на дапамогу бедным, наведваў хворых чыноўнікаў ложы, на яго імя падаваліся прашэнні братоў аб дапамозе.

Шэраг пасадаў прызначаліся майстрам тэрмінам на адзін год: сакратар, ягоны намеснік, майстар абрадаў, сцюарты (абрадавы і эканамічны), пячатачнік, архівіст, гасцёўнік, будаўнічы-рахункавод, мечнік, дырэктар гармоніі. Сакратар вёў справаводства і перапіску ложы. Майстар абрадаў рыхтаваў цырымоніі і сачыў, каб падчас іх кожны член ложы быў на сваім месцы. Пячатачнік ахоўваў пячатку і штэмпелі ложы, ставіў пячатку на правільна складзеныя дакументы і вёў іх спіс. Архівіст ахоўваў архіў, куды складаў усе дакументы аб дзейнасці ложы, вёў вопіс справаў. Першы сцюарт (эканамічны) загадваў маёмасцю ложы і дапамагаў ялмузніку. Другі сцюарт (абрадавы) дапамагаў майстру абрадаў. Гасцёўнік быў памочнікам ялмузніка. Будаўнічы-рахункавод правяраў рахункі сакратара, падскарбія, ялмузніка, сцюартаў і даваў сваё заключэнне аб стане даходаў і расходаў. У функцыі мечніка ўваходзіла несці меч на падушцы перад майстрам на цырымоніях. Дырэктар гармоніі кіраваў музыкай і спевамі падчас працаў ложы, банкетаў і ўрачыстасцяў [438, с.67-73]. Звычайна масонскія пасады адпавядалі свецкім, так напрыклад:

дактары сачылі за здароўем братоў і былі ялмузнікамі, юрысты — суддзямі і прамоўцамі, музыканты — дырэктарамі ці братамі гармоніі, служачыя канцылярый — сакратарамі і д.п.

Колькасць братоў-масонаў у беларускіх ложах у апошні год іх існавання дасягала 1063 чалавек (табл. Д.12.1). Лічба прыблізная, бо адкрыццё новых крыніц масонскіх матэрыялаў, відаць, дасць новыя прозвішчы. Але адсутнасць 1-2 дзесяткаў масонаў не скажае карціну ахопу насельніцтва масонскім рухам. Масоны былі дзейныя (прысутнічаючыя і неприсутнічаючыя) і ганаровыя. Першых налічвалася 485 чалавек, другіх — 243 чал. Былі яшчэ служкі (23 чал.), частка якіх таксама з'яўлялася братамі-масонамі. На жаль, нельга было высветліць, да якой групы масонаў адносіліся 312 братоў. Немагчыма пакуль сказаць, колькі масонаў-ураджэнцаў Беларусі было ў віленскіх ложах. Для прыкладу назавем некаторых з іх: маршалак Навагрудскага павета Ю.Вайніловіч, прэзідэнт Мінскага галоўнага суда А.Гюнтар, князь К.Радзівіл, мастак Я.Дамель, гетман вялікі літоўскі М.Агінскі, межавы суддзя Ашмянскага павета А.Дмухоўскі і іншыя.

Разгледзім якасны склад 820 беларускіх масонаў па сённяшняму стану крыніц (ганаровыя не ўлічваюцца, бо ў нейкай ложы яны будуць дзейнымі, а значыць, тыя, хто ўваходзіў у беларускую ложу, будзе ўсё роўна ўлічаны). Падрабязны расклад дае табліца Д.13.1. Аднолькавымі атрымаліся дзве групы: вайскоўцы і грамадзянскія чыны — па 102 чал. Да першай адносіліся ваенныя, які служылі ў былой ці дзеючай Польскай арміі, Літоўскім асобным корпусе, а таксама рускія афіцэры ў перыяд 1817-1818 гг. Звернем увагу на Літоўскі асобны корпус, які, як мы ведаем, адыгрываў значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці. У ім, па нашых прыблізных падліках, служыў 51 масон: ва ўсіх палках Літоўскай уланскай дывізіі — 37 чал., асобных артылерыйскіх батарэях — 8 чал., у Валынскім і Падольскім гвардзейскіх палках — 3 чал., у Літоўскім піянерным батальёне — 1 чал. (штабс-капітан К.Г.Ігельстром), у Гродзенскім гусарскім палку — 2 чал. [226].

Да другой — шматлікае чыноўніцтва мясцовай адміністрацыі і дваранскіх органаў кіравання. Значная колькасць масонаў былі служачымі па судовай частцы — 94 чал.: адвакаты, суддзі, рэгенты, асэсары і чыноўнікі з Гродзенскага і Мінскага галоўных судоў, межавыя і земскія суддзі. Памешчыкаў было налічана 80 чал., але да шляхты можна было б аднесці пераважную частку

цывільных і вайсковых чыноў. Выдзялялася таксама група ўрачоў, дактароў медыцыны, аптэкараў — 25 чал., асабліва ў гродзенскіх і нясвіжскай ложах [299, с.529; 510, с.37-41].

Цікавую характарыстыку літоўска-беларускаму масонству даў І.Ходзька ў сваіх «Літоўскіх замалёўках»: «Уступіўшы ў ложу, польскі (чытай літоўскі) брат-масон шукаў перш за ўсё навін, адкрыцця таямніцы, наўмысна зацямнёнай баламутнай сімволікай і яшчэ больш баламутнай масонскай легендай... Польскі брат-масон зашмат не думаў. Не дакрануўшыся таямніцы так хутка, як таго прагнуў, угаворваў сябе, што яна ёсць, але так узвышана, высакародна і так глыбока ўкрыта, што ён яе адшукаць не ўмее. Заспакоіўшы сябе такім чынам, сядзеў у масонстве далей, пакуль яго з яе не выгнаў аляксандраўскі ўказ» [694, ч.2, с.44-45].

Але не адна цікавасць штурхала ў лона ложаў, некаторых прываблівала карысць — матэрыяльны інтарэс, перамяшчэнне па службовай лесвіцы, уваходжанне ў элітныя колы. Ходзька пісаў: «Слабы літаратар, журналіст і кнігавыдаўца, уступае ў ложу, бо «браты» яго літаратурныя і журналісцкія опусы не толькі як вяршына мудрасці, ведаў і дасціпнасці разнясуць па свеце і кнігі закупяць толькі ў кнігарнях «брата», але і рэкамендацыю, а нават і грошы дадуць і да добрай кар'еры дапамогуць...» [694, ч.2, с.46; 319, с.65].

Былі сярод масонаў і тыя, хто імкнуўся злучыць ідэю духоўнай працы па пабудове «Храма Госпадняга» з пераўтварэннямі рэчаіснасці, але пра гэта скажам ніжэй, а цяпер звернем увагу на патаемны характар масонскай дзейнасці. Святы абавязак кожнага масона — трымаць тайну рытуальных абрадаў і знакаў. Вось што гаварыў у сваёй прамове на ўрачыстым паседжанні ў гонар патрона св.Яна другі дазорца ложы «Уладзіслаў Ягайла» Ян Садкоўскі: трэба і далей утрымліваць сакрэт і маўчанне ў сваёй дзейнасці, бо гэта прывядзе да «пэўнасці ўсіх мэтаў, да якіх узносяцца намеры шляхетна згодных душаў». Парушыўшыя тайну караліся грыўнай у касу ложы, вусным і пісьмовым напамінам, адхіленнем ад удзелу ў паседжаннях ложы, паніжэннем у ступені і г.д., нават выключэннем (умяртвленнем) з масонства [620, с.68; 249, ф.295, воп.1, спр.286, а.338].

Звернем увагу на погляды і грамадска-палітычную дзейнасць масонаў. Галоўнай мэтаю іх было, зразумела, самаўдасканальванне, самавыхаванне, «пераўтварэнне

першапачаткова змарнаванай чалавечай натуры». Пра адкрыццё ложы «Уладзіслаў Ягайла на Усходзе Слуцка» Б.Квіналоўскі гаварыў, што гэта ўзыход сонца, «першыя прамені якога выводзяць з начной цемры, усяму прыроднаму вяртаюць рух і жыццё... Утвараецца новая святыня, узносіцца новы алтар для Найвышэйшага Будаўніка Свету, а таму кожны з іх (братоў — *В.Ш.*) павінен згодна з правам быць старанным і паслухмяным, каб сусвет папярэджаны і аслепляны са здзіўленнем на іх глядзеў, і ў кожным масоне, хаця б і не хочачы, шанаваў і любіў дабрадзейнасць». У адной з прамоў на паседжанні ложы «Паўночная Паходня на Усходзе Мінска» невядомы брат гаварыў, што вольнамулярская навука «з'яўляецца вялікай, цяжкай і складанай, бо мае высокую мэту: святая падрыхтоўка агульнага шчасця для народаў, гэта навука звязвае вольных муляраў у адзінае цела, злучае іх сэрцы ланцугом братэрскай еднасці» [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.226 адв.,340 адв.].

Масоны гаварылі аб роўнасці ўсіх людзей, аб неабходнасці жыць агульным грамадствам. Першы дазорца на ганаровым паседжанні Вялікай ложы «Казіміра Вялікага» сцвярджаў: «Не хопіць таго, каб прызнаваць роўнасць у свяцілішчы, а трэба, каб мы ва ўсіх людзях прызнавалі чалавека: чалавека ў багравіцы ці лахманах, за плугам, з пяром, са зброяй, з пілою, са скіпетрам або з аршынам у руках; бо ён усюды ёсць адно і тое ж стварэнне, мае аднолькавы пачатак, аднолькавае права на зямное шчасце і аднолькавае прызначэнне за труною...» [148, с.548]. Масоны марылі аб стварэнні, а дакладней, аб вяртанні чалавецтва да «аднаго грамадства па правілах Ісуса Хрыста». Бог хацеў, каб людзі жылі «адным грамадствам, адно цела складвалі». Розныя прамоўцы з ложаў «Паўночная Паходня» і «Уладзіслаў Ягайла» прыйшлі да аднолькавай высновы, што перашкаджае гэта дасягнуць — «монстр эгаізму», які перамог і падзяліў людзей, унёс у іх жыццё сквапнасць, пагарду, усціск, няспраўядлівасць [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.227 адв.,337 адв.-338].

У святле вышэйсказанага не зразумела, аб якім «расчленении территории» Расіі масонамі гаворыць сучасны даследчык А.А.Платонаў: «У 1807 г. частка заходніх губерняў была неправамерна аб'яднана ў так званае Царства Польскае, у якое трапілі і гістарычна рускія (маларускія і беларускія) землі» [286, с.74]. У 1807 г. ніякага Царства Польскага не існавала, бо яно было створана пасля Венскага кангрэса 1815 г., а так званыя «заходнія губерні» (былая тэрыторыя ВКЛ, а не «гістарычна

рускія землі») увайшлі ў яе склад. Масоны да гэтага дачынення не мелі, хаця сам Аляксандр I належаў да іх. У 1807 г. Напалеон Банапарт арганізаваў Герцагства (Княства) Варшаўскае, і ніякія рускія землі туды не ўваходзілі, а нават наадварот, Расія атрымала Беластоцкую акругу (вобласць), далучаную ў 1842 г. да Гродзенскай губерні [75, с.125; 573, с.29,132-133,136-137].

У Статуце сімвалічных ложаў шмат увагу надавалася праяўленню чалавечнасці. Абавязак масона: «Любі бліжняга, як сябе, не рабі яму ніколі таго, што сабе не зрабіў бы. Скарыстай раскошны дар мовы, гэты знешні знак твайго панавання над прыродаю, каб прадбачыць патрэбы чалавека і ў сэрцах усіх распаліць святы агонь дабрадзейнасці». Масон не павінен быў устыдацца на людзях чалавека нізшага, але пачцівага, якога абдымаў, як брата ў ложы; спяшацца на дапамогу брату, які патрабуе яе, са «светам разума, сэрцам і парадаю» [620, с.65,67].

Роўнасць, якой імкнуліся дасягнуць масоны, павінна быць заснавана на панаванні закона. Л.Плятэр у адной са сваіх прамоў на паседжаннях ложы «Паўночная Паходня на Усходзе Мінска» ў 1817 г. гаварыў аб роўнасці, вольнасці слова, панаванні права, перад якім роўныя і сын, і брат караля, і рамеснік, «вось тады і будзе сапраўдная ад вякоў уводзімая і захоўваемая, адзіная разумная і карысная роўнасць у абліччы закона» [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.227].

Складаныя рэлігійныя погляды масонаў. З аднаго боку, статут патрабаваў: «Прысвяці Богу ў ахвярнасць волю і жаданне і паспрабуй быць годным Яго ажыўляючых уплываў. Здзяйсняй правы, якія Ён хоча, каб дапоўніў як чалавек у гэтым тленным побыце на зямлі. Падабацца Богу — гэта тваё шчасце, злучыцца з ім назаўсёды — гэта найцудоўнейшае жаданне і канчатковая мэта тваіх учынкаў...» [620, с.61-62]. Каталіцызм, ускормлены масонамі з малаком мацеры, і каталіцкія традыцыі бралі верх над вераю ў Найвышэйшага Будаўніка Свету: яны хадзілі ў касцёл, дапамагалі каталіцкім шпіталям і таварыствам дабрачыннасці, спавядаліся перад смерцю. З другога боку, як піша польскі даследчык С.Заленскі, «нехрысціянская, наскрозь паганская атмасфера ложы, неверагодна, каб не ўплывала адмоўна на розум сваіх адэптаў; ігнараванне рэлігійнай практыкі і з часам поўнае іх занядбанне — гэта першыя вынікі ўплыву. Затым пайшло трэціраванне павагі касцёла, ігнараванне дагматаў, агульны індыферантызм, а нарэшце, сумненне і рэлігійны скептыцызм...» [694, ч.1, с.49].

Мэта сапраўднага масонства — маральнае ўдасканальванне, самавыхаванне, ніякай палітыкі. Але жыццё ўносіла карэктывы, асабліва на тэрыторыях, якія пазбавіліся свайго незалежнага дзяржаўнага развіцця. Былы масон віленскай ложы «Стараннага ліцвіна Ст.Міцканеўскі даносіў ваеннаму генерал-губернатару Рымскаму-Карсакаву: «Галоўная тайна масонаў заключаецца ў наступным: усталяваць паміж усіх станаў людзей вольнасць і роўнасць, зліквідаваць дэспатызм, або самадзяржаўнае праўленне; схіляць да рэвалюцыі, падобна той, якая была ў Францыі, Іспаніі, Партугаліі, Неапалі і Турыне, а таму, зразумела, пагражае хваляваннямі народаў» [101, с.130; 317, №2, с.36; 148, с.540].

Адзінай унутранай палітыкі ў масонаў былой Рэчы Паспалітай не было, бо па складу ложы былі неаднаслойныя: тут былі і дробная шляхта, і буйныя магнаты, і мяшчанства, прыхільнікі і праціўнікі манархіі. Палітычная думка вагалася паміж спадчыннай канстытуцыйнай манархіяй і алігархічнай магнацкай тыпу Венецыянскай рэспублікі, а самая смялейшая брала за ўзор дзяржаўнага будаўніцтва Вашынгтон ці Парыж. Нас цікавілі адносіны масонаў не толькі да асобы манарха, але і да канкрэтна пануемага над імі — Аляксандра І. Статут сімвалічных ложаў сцвярджаў: «Паняцце манарха як памазаніка боскага моцна звязана з паняццем Айчыны... Найвышэйшая істота бачным і ўпэўненым спосабам уклала ўладу сваю ў рукі Манарха. Таму шануй і любі яго павагу і начальственнасць у кожным куту зямлі, дзе жывешь» [цыт. па: 620, с.62].

У залежнасці ад вырашэння Аляксандрам І польскага пытання, аб чым мы пісалі ў раздзеле 3.1, змяняліся і адносіны масонаў да яго. Рускі імператар падладжваўся пад жыхароў былой Рэчы Паспалітай, і на паседжаннях ложы «Паўночная Паходня» можна было пачуць верш Ю.Рагожы на імяніны Аляксандра І, у якім усхвалялася яго «шырокая і прыгожая душа». Пасля Венскага кангрэса некаторы час добрыя адносіны захоўваліся. На адным з паседжанняў ложы «Уладзіслаў Ягайла» Пяткевіч выхваляў дабрату душы манарха, а ў законе іх брата, які дазволіў існаванне масонаў і стаў іх апекуном, уваскрасіў быт іх роднай Айчыны, захаваў яе назву, мову, правы, звычаі, «тым самым загаіў раны, гадавымі няшчасцямі адкрыўшыяся» [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.225,338]. Пасля сейму 1818 г. давер да Аляксандра І быў падарваны. Хаця Вялікі Усход у 1819 г. рэкамендаваў вывесіць над тронамі майстроў

партрэт манарха, але рабілася гэта для адводу вачэй: незадаволенасць «дабрадзейнасцю» імператара пранікла ў грамадства і масонства. На сейме 1820 г. масон В.Маеўскі выступіў з апазіцыяй Аляксандру I і ўраду [694, ч.1, с.211].

У 1817 г. шубраўцы праз сваю газету «Брукавыя ведамасці» пачалі рыхтаваць літоўска-беларускае грамадства да адмены прыгонніцтва. Ідэю вызвалення сялян па прыкладу Астзейскіх губерняў усяляў праз маршалкаў Ковенскай і Віленскай губерняў масон віленскі віцэ-губернатар Плятар-Зіберг. У снежні 1817 г. пытанне аб рэформе было ўзнята на дваранскіх выбарах у Вільні Ш.Завішай, які заявіў: «Абавязаны мы даць рашэнне не большасцю галасоў, але аднагалосна: адракаемся ад правоў і прывілеяў, якія мелі мы над сялянамі!..». Не ўсе масоны падтрымалі гэтае. Напрыклад, тройчы супраць выступіў дэпутат з Ашмянскага павета М.Пашкоўскі. Зерне, кінутае масонамі, не засохла, бо было вырашана падаць «всеподданнейшее» прашэнне аб стварэнні камітэта для складання праекта паляпшэння становішча сялян. Падрыхтоўка да рэформы зацягнулася да 1819 г., а ў гэты час пачаўся разлад у масонстве, які скончыўся яго забаронай у 1821 г. [цыт. па: 101, с.111-112].

На практыцы некаторыя масоны пайшлі далей размоў. Вядомы гродзенскі масон I.-Э.Ляхніцкі друкуе ў 1817 г. працу «Статыстыка Літоўска-Гродзенскай губерні», дзе паказвае між іншым цяжкае становішча сялян і робіць выснову аб неабходнасці ліквідацыі паншчызны. Слуцкі масон Ю.Вішчынскі 24 чэрвеня 1819 г. заявіў на паседжанні ложы, што вызваліў навечна ад падданства свайго селяніна з маёнтка Косаржыцы М.Пуцяту з сям'ёй, бо той праз яго стаў масонам, а значыць, родным яму братам [609; 249, ф.295, воп.1, спр.286, а.344 адв.].

Хвалявала масонаў і ідэя адраджэння Рэчы Паспалітай. Асабліва мацнеўшая ў часы, калі рускі імператар даваў для гэтага падставы: асаблівае ўладкаванне Каралеўства Польскага і наданне яму канстытуцыі ў 1815 г., арганізацыя асобнай польскай арміі і Літоўскага асобнага корпусу. Гэтая ідэя прывяла рэвалюцыйна-дэмакратычную частку масонаў да рэфармавання масонства і ўплыву на стварэнне тайных таварыстваў. У 1819 г. маёр польскай арміі В.Лукасінскі заснаваў арганізацыю «Нацыянальнае масонства» з мэтаю адраджэння польскай нацыянальнасці і рэстаўрацыі Рэчы Паспалітай у былых межах (падрабязней пра гэта будзе ў

раздзеле 4.4). Звернем увагу на масонскую афарбоўку арганізацыі. Вучань павінен быў прапагандаваць навуковыя веды і знаёміць людзей з гісторыяй Польшчы. Чэляднік — апісваць дзеянні слаўных палякаў, узносіць польскасць, падрыхтоўваць грамадскасць да прысвячэння сябе для айчыннай справы. На пытанне майстра: «Як абшырна твая ложа?» чэляднік адказваў: «Высокія горы, два вольныя моры і дзве ракі служаць яе межамі». «Дзе грамадзяцца твае браты?» — пытаўся майстар і чуў у адказ: «Пры алтары Айчыны, які зверху пашкоджаны, але падмурак яго стаіць з надпісам «утрымаўся да гэтага часу» [224, т.2, с.242; цыт. па: 694, ч.1, с.218].

У легенду аб Гіраме былі ўнесены карэктывы: ягоная смерць — гэта падзелы Рэчы Паспалітай; тры ягоныя забойцы — тры манархі, якія здзейснілі гэтае; абавязак дзяцей Гірама — шукаць яго ўсюды і бароцца з ворагамі яго — абавязак адраджэння Рэчы Паспалітай; уваскрасенне Гірама насуперак найвышэйшым немагчымасцям — сімвал уваскрасення былой польска-літоўска-беларускай дзяржавы [694, ч.1, с.219].

Беларуска-літоўскае масонства мела ўплыў на стварэнне тайных арганізацый сярод вучнёўскай моладзі і афіцэраў Літоўскага асобнага корпусу. Масон прафесар Віленскага універсітэта Я.Шымкевіч быў першым прэзідэнтам шубраўцаў. Філамат-масон Т.Зан стварыў таварыствы «Прамяністых» і філарэтаў. Навагрудскія масоны К.Ігельстром і А.Вягелін арганізоўвалі Таварыства ваенных сяброў. У «Таварыстве сяброў» з 25 чалавек было 9 масонаў навагрудскай ложы. Былі масонамі сябры Патрыятычнага таварыства М.Ромер, Я.Вайніловіч, Л.Каменскі, К.Чапскі, А.Елец, П.Корбут, Ст.Маскевіч, Я.Сержпутоўскі, Я.Сабескі, А.Солтан, Я.Ходзька і іншыя [478; 463,479; 506; 196, с.60; 320, с.72-74]. Сувязь масонаў з тайнымі таварыствамі разумелі і царскія ўлады. Вось што пісаў мінскаму губернатару цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч 24 студзеня 1829 г.: «...Звесткі аб існаванні ў Мінску, Нясвіжы, Слуцку і іншых месцах даверанай Вам губерні масонскіх ложах я даслаў сапраўднаму стацкаму саветніку сенатару Навасільцаву для прыняцця ў разлік з разглядам справы аб тайных таварыствах» [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.363].

Масоны прымалі ўдзел у паўстаннях. Касцюшкаўцамі былі П.Багурскі і Я.Лапэрэ. Падчас Лістападаўскага паўстання ўлады звярнулі ўвагу на былых масонаў. Мінскі часовы ваенны губернатар Далгарукаў 2 мая 1831 г. пісаў выконваючаму

абавязкі Мінскага губернатара Малафееву: «Па дойдзеных да мяне звестках, у канцылярыі грамадзянскага губернатара знаходзіцца пры справах спіс розных асобаў тутэйшай губерні, якія раней з'яўляліся сябрамі таварыства масонаў, я прапаную Вашаму Высакароддзю даслаць мне з яго копію». Аб выкананні Малафееў данасіў праз 2 дні [320, с.72,73; 249, ф.295, воп.1, спр.286, а.365]. Па нашых дадзеных, у паўстанні ўдзельнічалі: навагрудскі масон К.Валовіч [250, ф.31, воп.2, спр.86,36 адв.]; камандзіры атрадаў — масоны Я.Жылінскі, С.Незабітоўскі, А.Солтан, сын масона А.Валадковіч.

У 1818 г. доктар філасофіі і медыцыны масон віленскай ложы «Стараннага літвіна» Я.Шымкевіч задумаў рэформу масонства з мэтаю наблізіць яго да шырокага грамадства. 16 сакавіка 1818 г. К.Кантрым замест хворага Шымкевіча выступіў на паседжанні ложы з прамоваю (аўтарам якой, па словах Гаса, быў ён сам), у якой крытыкаваў значную сімволіку і абраднасць, за якой крыецца ідэйная пустэча, гаварыў, што сярэдневечная арганізацыйная форма не адпавядае рэчаіснасці XIX ст. і паралізуе дзейнасць. Кантрым выступіў за пераўтварэнне ложы ў «паўлегальнае навукова-дабрачыннае таварыства, падпарадкаванае адукацыйным уладам краю». Рэфарматары прапаноўвалі змяніць статут масонаў на наступных пачатках:

1. Масонскі ордэн, агульны для ўсіх, распадаецца на асобныя таварыствы, незалежныя адзін ад другога, не звязаныя абавязкам грашовых узносаў і збораў.

2. Кожнае таварыства, якое фарміруецца ў выглядзе асобнага гуртка, прымае наступную назву: «Таварыства масонскае рэфармаванае» №№.

3. Мэта кожнага таварыства: мудрасць і дабрачыннасць, гэта значыць удзел у справах міласэрнасці і асветы.

4. Кожная ложа выбірае сабе вызначаную спецыяльнасць, у межах якой і адбываюцца «працы».

5. Члены таварыства называюцца «сябрамі».

6. На працах ложы могуць прысутнічаць і сябры іншых ложаў, нават нерэфармаваных, але толькі ў якасці гасцей.

7. Кожная ложа-таварыства вядзе свае заняткі пад наглядам той улады, якае ведае народнаю асветаю ў краі. Яна можа змяніць свой статут, надрукаваць яго; працы вядуцца публічна і падлягаюць справаздачнасці» [620, с.71-77; 581, с.287; 101, с.118-119].

Майстар гродзенскай ложы М.Бутаўт-Анджэйкавіч выступіў супраць праекта Шымкевіча і Кантрыма і прасіў пакінуць у спакоі «старое масонства», а калі ёсць моцнае жаданне, дык стварыць якую-небудзь новую арганізацыю. На выданне кніжкі праекта ён адказаў сваёй запіскай, якая была зачытана на паседжанні 23 сакавіка. Усе, хто быў згодны з рэфарматарамі, былі выгнаны з ложы. Апошнія арганізавалі сваю ложу пад назваю «Старанны Літвін Рэфармаваны». Шымкевіч, відаць, хацеў заручыцца падтрымкаю літоўска-беларускіх ложаў і разаслаў ім лісты, у якіх пісаў, што правінцыяльная Літоўская ложа вырашыла ўсталяваць у Вільні Вялікі Усход і таму запрашае накіроўваць дэпутатаў. Але праз месяц браты слуцкай ложы «Уладзіслаў Ягайла» атрымалі ліст з адменай сваёй прапановы для «забеспячэння існавання і дабрабыту ад святовага ўраду» [249, ф.295, воп.1, спр.286,327; 581, с.287; 101, с.119,122]. Рэформа такім чынам не адбылася, але яе ідэі, відаць, былі выкарыстаны ў Нацыянальным масонстве.

Гэтыя падзеі, несумненна, паўплывалі на тое, што 30 мая 1820 г. статут 1784 г. пасля гадавой спрэчкі і працы над удасканальваннем тэкста быў заменены новым. Аб зацятай барацьбе прыхільнікаў і праціўнікаў новага статута гаворыць галасаванне: 20 галасоў — за, 11 — супраць. Вялікі магістр Ст.Костка Патоцкі гаварыў 21 чэрвеня 1820 г., што пратакол апошняга паседжання Вялікага Усхода стане «духоўнай памяццю, што значнай большасцю галасоў гэты канстытуцыйны статут быў прынятым» [249, ф.694, воп.1, спр.517, а.13-14]. Перапіска паміж літоўска-беларускімі ложамі і Варшавою, а таксама паседжанні ложаў паказваюць, што барацьба не закончылася і пасля прыняцця статута. Правінцыяльная Літоўская ложа даслала сімвалічным ложам ліст, у якім асуджала яго, бо ён вядзе «да ліквідацыі брацтва і звяржэння вольнасці і роўнасці, якія служаць дэвізам іх саюзу» [197, с.542].

Справа ў тым, што новы статут абмежаваў правы правінцыяльных і сімвалічных ложаў, цэнтралізаваў іх і падпарадкаваў створанай Найвышэйшай Радзе з 7 чалавек пад старшынствам Вялікага Майстра Патоцкага. Праз Вялікага Намесніка А.Ражнецкага расійскі ўрад атрымаў магчымасць кантраляваць масонства. У выніку 20 з 40 ложаў Вялікага Усхода Польскага прыпынілі свае працы на нявызначаны час. Браты з ложы «Сябры Чалавецтва» засталіся працаваць па «старых чарцяжах». Ложы «Вузел Еднасці», «Святыня

Паўночы», «Гара Табар», «Уладзіслаў Ягайла» прызналі новы статут [101, с.126; 197, с.543; 621, с.120-121].

Спісы масонаў беларускіх ложаў паказваюць, што братамі былі этнічна розныя людзі. Мы ўжо ўзгадвалі аб удзеле рускіх афіцэраў. У Вільні працавала ложа «Славянскі арол», сябрамі якой былі мясцовыя жыхары і рускія чыноўнікі і афіцэры. Трапна гаварыў на адным з паседжанняў ложы «Паўночная Паходня» нейкі брат з іншага Вялікага Усхода: адзінай мэтай усіх нас з'яўляецца «распаўсюджанне праўдзівага святла на зямном шары, вывесці з глыбіні цемры цярплівыя народы, прышчапіць іх да добрага жыцця, і, калі сусвет стане адной грамадою, злучанай братэрскімі вузамі, тады існаванне людзей будзе сапраўдным» [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.226 адв.].

Беларускія масоны мелі добра наладжаныя кантакты з ложамі ў Польшчы і Расіі. Напрыклад, «Паўночная Паходня на Усходзе Мінска» падтрымлівала сувязі з ложамі Кракава («Святыня Роўнасці»), Ломжы («Узыходзячага Сонца»), Пецярбурга («Астрэя», «Белага Арла», «Елізаветы»), Варшавы («Ізыс», «Казімір Вялікі», «Святло Мінервы»), Плоцка («Дасканаласць»), Седльца («Белы Арол»), Радома («Узыходзячай Заранкі»), Любліна («Адшуканая Вольнасць») і г.д. Прыкладна такія ж сувязі былі ў ложаў «Шчаслівае Вызваленне на Усходзе Нясвіжа» і «Уладзіслаў Ягайла на Усходзе Слуцка» [101, с.117; 249, ф.295, воп.1, спр.286, а.218-219 адв.,259-298].

За прыналежнасць літоўска-беларускага масонства ішла барацьба паміж Вялікімі Усходамі Польскім і Пецярбургскім, які ўсімі сродкамі хацеў зацягнуць яго да сябе. У лісце ад 5 лютага 1818 г. ложа «Астрэя» (майстрам якой, дарэчы, быў граф А.-Ст.Ржэвускі) прапанавала беларускім ложам уступіць у яе залежнасць. Адказ іх у сакавіку і красавіку 1818 г. быў адмоўны. Відаць, польскі даследчык Гас слушна лічыць, што каму падпарадкавацца, не залежала ад нацыянальнага складу масонскіх ложаў, а большую ролю адыгрываў момант «прыцягвання дадзенага рэгіёну да аднаго з двух палітычна-гаспадарчых цэнтраў, якімі былі Варшава і Пецярбург, а таксама — можа ў ступені, прынамся, роўнай — разнародныя кантакты, не толькі былыя вольнамулярскія, кіраўнікоў дадзенай тэрыторыі». 14 верасня 1818 г. ліст з Варшавы «ўхваляў цвёрдую рашымасць літоўскіх ложаў застацца ў саюзе з Варшаўскім Усходам, не ўступаючы ў залежнасць С.-Пецярбургскую» [581, с.276; 197, с.542].

Барацьба паміж расійскім і польскім Усходам прывяла да таго, што ў 1820 г. сярод літоўска-беларускага масонства ўзнік праект утварэння самастойнага Вялікага Усхода Літоўскага. Былі зроблены і першыя практычныя крокі — валынскі масон граф Н.Олізар даў 15 тыс. на будынак будучай рэзідэнцыі. Рэалізацыі праекта перашкодзілі змена адносін улад да масонства і закрыццё ложаў [581, с.275]. У жніўні 1821 г. выйшаў указ Аляксандра I аб закрыцці масонскіх лож і тайных таварыстваў. 25 верасня 1821 г. на апошняй сесіі Вялікага Усхода Польскага ўсе ложы прызваны да паслухмянасці царскаму ўказу — яны павінны былі спыніць свае працы да 1 кастрычніка ў Варшаве і да 15 кастрычніка ў правінцыях. Пасля гэтай даты яны будуць лічыцца антызаконнымі. У першай палове кастрычніка віленскі генерал-губернатар Рымскі-Карсакаў абвясціў жнівеньскі ўказ цара. Шостага лістапада на паседжанні Адміністрацыйнай рады прынята пастанова Намесніка Каралеўства Польскага Зайончыка аб агульным, безумоўным і канчатковым закрыцці ўсіх тайных таварыстваў у КП [694, ч.1, с.264,272; 542, т.2, с.93]. Практычна ўсе ложы на тэрыторыі Беларусі былі зачынены (гл. табл. Д.10.1), іх архівы, грошы, рэчы, прадметы абраднасці і сімволікі па прадпісанню Майстра Вялікага Усхода А.Ражнецкага павінны быць сабраны для захавання [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.167].

Менавіта ў гэты час адбылася так званая «справа С.Міцканеўскага»: былы масон ложы «Стараннага Літвіна» ў ступені майстра пакінуў масонства, аб чым 15 лютага 1820 г. атрымаў грамату. Ён патрабаваў, каб ложа вярнула яму 76 руб., якія ён даў ёй у касу ў выглядзе ўзносаў. А калі тая адмовілася, дык звярнуўся з прашэннем да розных устаноў: Віленскага галоўнага суда, губернскага праўлення, генерал-губернатара. Не вырашыўшы тут справу, Міцканеўскі двойчы звярнуўся з прашэннем на імя імператара і адзін раз — да Намесніка. У ходзе справы былы масон па сутнасці зрабіў данос на масонства, абвінаваціўшы яго ў падрыхтоўцы «народнага хвалявання» і вынішчэння веры хрысціянскай. 8 лютага 1822 г. Рымскі-Карсакаў даслаў міністру ўнутраных спраў змястоўную запіску аб усёй справе, а той далажыў цару [101, с.126-134]. Несумненна, што гэта падліла масла ў агонь забароны масонства. 1 жніўня 1822 г. царскі ўказ закрыў ложы па ўсёй Расійскай імперыі.

Усе дзяржаўныя чыноўнікі, настаўнікі школ, прафесары, вайскоўцы павінны былі даць падпіску аб непрыналежнасці да

масонскіх і іншых тайных таварыстваў у краі ці за мяжой. У гродзенскім архіве захавалася частка падпісак масонаў двух узораў: не належаў і належаў да ложы (яе назва), але цяпер і ў будучым не буду належаць ні ў краі, ні за мяжой [250, ф.1, воп.1, спр.2860, а.8,15]. 14 лістапада 1822 г. каралеўскі намеснік Зайончык загадаў забраць ключы ад скрыні з дакументамі і рэчамі Вялікага Усхода Польскага [540, zesp.K.Nowosilcowa, sign.565, s.40]. Такім чынам, легальная гісторыя масонства была завершана.

У губернях заняліся ліквідацыяй масонскіх знакаў, дэкарацый, зборам архіваў, а ў Мінскай губ. нават вымаганнем «недаімак» з масонаў. Усё гэтае трэба было захоўваць па прадпісанню цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча ў «архіве грамадзянскага губернатара пры сакрэтных справах». Напрыклад, памешчык Адынец у 1827 г. здаў належачыя яму знакі ложаў «Сябры Чалавецтва», «Шчаслівае Вызваленне» і «Паўночная паходня». Аднак, відаць, не ўсе аддалі свае масонскія рэчы. Толькі ў 1830 г. пры вобыску ў доме К.Валовіча знайшлі выдадзены яму патэнт, знак і фартух [249, ф.295, воп.1, спр.286, а.20,32,40,98,322 адв.,350,366; 250, ф.1, воп.1, спр.2860, а.51адв.,62 адв.,71-72,83 і інш.; 250, ф.31, воп.2, спр.86, а.36 адв.].

Большасць масонскіх ложаў спынілі свае працы, але ўрад адчуваў, што не ўсе. Тайны сенатар Навасільцаў сакрэтна пісаў гродзенскаму губернатару 24 мая 1823 г.: «...майце пільны нагляд, ці не сходзяцца былыя масоны ў каго-небудзь са сваіх сяброў або ў трэцім месцы, пад выглядам сяброўскіх размоў, ці часта бываюць такія бяседы і сходы, ці запрашаюцца на іх старонія асобы, чым яны займаюцца, і ці не відаць уплыву якой-небудзь асобы на гэтыя сходы?» [250, ф.1, воп.1, спр.2860, а.59адв.]. Губернатар М.Бутаўт-Анджэйкавіч спраўна дакладваў аб выкананні розных распараджэнняў, але як былы масон, відаць, не вельмі стараўся, бо пад носам працягвалася дзейнасць «Сяброў Чалавецтва на Усходзе Гродна». Э.Ажэшка ў сваіх «Успамінах» занатавала: «...Бацька мой быў вальнадумцам, як гэта тады называлася, вальтэрыянцам; ведаю, што паміж 1825 і 1840 годам належаў да адной з масонскіх ложаў, якія існавалі ў Літве» [цыт. па: 585, с.21]. Дакладна вядома, што масон 3 ступені Б.Паўлоўскі ў гродзенскай ложы быў ужо ў 1821 г., займаў пасаду прамоўцы.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. — 1 чвэрці XIX ст. дзейнічала да 17 масонскіх ложаў, якія налічвалі

каля 1063 братоў. За іх вялі барацьбу Вялікі Усход Польскі і Пецярбургская вялікая ложа «Астрэя», але літоўска-беларускія ложы засталіся верныя прысягі Варшаве і засталіся ў яе падпарадкаванні. Масонства згрупавала розныя часткі дэмакратычнага грамадства да вырашэння галоўнай задачы — адраджэння былой дзяржаўнасці. Яно ўнесла ў жыццё народа новыя лозунгі: роўнасць, вольнасць, братэрства і паўплывала на стварэнне і дзейнасць патаемных таварыстваў.

## 4.3. **Праект 1811 г. М.-К.Агінскага і ВКЛ 1812 г.**

Адданым прыхільнікам ідэі адраджэння ВКЛ напярэдадні франка-рускай вайны стаў М.-К.Агінскі. Трэцяга лютага 1811 г. ён выехаў з Парыжа ў Пецярбург. Па шляху былі Дрэздэн, Брэслаўль, Варшава — усюды ён упэўніваўся ў непазбежнасці вайны Францыі з Расіяй. Не падзяляючы надзей палякаў на Напалеона, Агінскі ў сваіх мемуарах пісаў: «...Але ці мог я асуджаць іх? Я, ад усяго сэрца падзяляўшы іх жаданне ўбачыць аднаўленне Польшчы? Мы толькі не сходзіліся ў сродках і спосабах дасягнення мэты» [289, стб.642]. Ён менавіта і ехаў у сталіцу Расійскай імперыі для таго, каб прапанаваць аднаўленне Польшчы праз адраджэнне Вялікага княства Літоўскага пад апекай Аляксандра I.

21 красавіка Агінскі прыехаў у Пецярбург, а 25-га меў сустрэчу з расійскім імператарам. У трохгадзіннай размове Агінскі ўпэўніваў Аляксандра I у неабходнасці «папярэдзіць Напалеона ў яго плане ўзнаўлення Польшчы, які яму патрэбны для зручнага моманту, каб напасці на Расію». Ён пытаўся: «І ці не будзе магчымым заняцца станоўчым вырашэннем лёсу палякаў, каб схіліць іх да асобы Вашай імператарскай Вялікасці на больш трывалых асновах, чым іх здолеў натхніць імператар французаў?» [128, с.206]. Агінскі прапаноўваў Аляксандру I абвясціць сябе польскім каралём, стварыць ВКЛ і абнадзеіць жыхароў Княства (Герцагства) Варшаўскага ў злучэнні іх з ліцвінамі. «Зразумела, — піша Агінскі ў сваіх мемуарах, — гэта яшчэ не азначала аднаўлення Польшчы, але ўсё ж ажыццявіла бы частку гэтай надзеі, канчатковым завяршэннем якой было бы далучэнне да Расіі, у будучую вайну, вялікага Герцагства Варшаўскага» [289, стб. 646].

У канцы размовы Аляксандр I загадаў Агінскаму прадставіць пісьмова тыя думкі і прапановы, якія ён выказаў.

Выконваючы гэты загад, Агінскі 27 мая прадставіў імператару сваю першую «Записку». У ёй ён абгрунтаваў, чаму трэба аднавіць ВКЛ, захаваць імя Літвы і яе даўнія правы: «Частка Польшчы, далучаная да Расійскай імперыі, складала калісьці асобнае самастойнае валоданне — Літву, яшчэ перад актам уніі Літоўскае княства з каралеўствам Польскім. Жыхары яго спрадвеку адрозніваліся ваяўнічым духам, клапаціліся пра свае правы і былі верныя сваім манархам, адзначаліся мужнасцю і любоўю да бацькаўшчыны. Гордыя сваім паходжаннем, ліцвіны, нягледзячы на аб'яднанне сваёй правінцыі з Польшчай, захавалі свае звычаі, свой цывільны кодэкс, мясцовае кіраванне, сваё войска, вярхоўны суд, міністраў, дзяржаўных саноўнікаў і нават сойм, які збіраўся па чарзе ў Варшаве і Горадні. Усе гэтыя прывілеі былі такімі дарагімі для ліцвінаў, што, нягледзячы на ўсялякія намаганні і красамоўныя перакананні многіх дзяржаўных дзеячоў, немагчыма было схіліць ліцвінаў да адмовы ад сваіх прывілеяў» [128, с.207].

Польскі гісторык М.Кукель пісаў, што «ішло супрацьстаўленне напалеонаўскай Польшчы аляксандраўскай Літве..., (рэч) ішла аб знішчэнні акту Люблінскай уніі, праз якую рускія землі апынуліся злучанымі з Каронай; цяпер з рускіх рук мелася ўзняцца Літва. Магла адбыцца новая унія Літвы, не з Польшчай, а з усходнім суседам» [606, т.II, с.32]. Адраджэнне суб'екта ВКЛ трэба разглядаць, на наш погляд, яшчэ і як чарговую праяву літоўскага сепаратызма. Мы згодны з польскім гісторыкам Ю.Туронкам, які піша, што ён «не быў з'явай выпадковай, а вынікам палітычнай стратэгіі, якая мае мэту захавання суб'екта ВКЛ у найбольш выгадным федэратыўным саюзе — з Польшчай або іншай рэальнай сілаю» [382, с.157].

Напярэдадні вайны 1812 г. такой рэальнаю сілаю была Расійская імперыя. У «Памятнай запісцы», пададзенай імператару 1 снежня 1811 г., М.Агінскі піша, што Аляксандр I, а не Напалеон можа стаць «аднавіцелем ягонай бацькаўшчыны»: «Павярніце, Найяснейшы Пан, тую ж самую зброю супраць яго і пабачыце, як Вы ўзмацніце ўсёй прывязанасцю і натхненнем, якія Вашымі асабістымі якасцямі ўзрушаюцца». З натхненнем гаворыць Агінскі пра слова «бацькаўшчына»: «Са старажытных часоў яно складае любімую ідэю сапраўдных мужоў краіны. Ёсць у ім нейкая абаяльная прывабнасць для ўсіх, для каго дарагія гонар і дабрадзейнасць. Бацькаўшчына дорага ўсім народам, асабліва зведаўшым

зняволенне, і ніякая чалавечая сіла не змагла заглушыць яго ў доўгім шэрагу пакаленняў...» [274, с.218].

«Няцяжка далучыць да сябе правінцыі моцнай дзяржаве, — упэўнівае Аляксандра I Агінскі, — але патрэбна шмат гадоў, каб прыцягнуць да сябе жыхароў заваяванага краю, каб прызвычаіць іх да змяненняў, каб прымусіць іх забыцца пра мінулыя ўмовы існавання, і, безумоўна, ненатуральнай справай з'яўляецца змешванне і зліццё, калі так можна гаварыць, двух розных народаў, каб зрабіць з іх толькі адно цэлае» [128, с.205-206]. Таму Агінскі ў змове з іншымі літоўскімі магнатамі рускай арыентацыі (Ф.Друцкі-Любецкі, Л.Плятар, Т.Ваўжэцкі) прапаноўвае свой план адраджэння ВКЛ у двух запісках, пададзеных расійскаму імператару 27 мая і 1 снежня 1811 г., а таксама ў «Праекце ўказа новай арганізацыі заходніх губерняў» (3 лістапада 1811 г.):

1.Восем губерняў: Гродзенская, Віленская, Мінская, Віцебская, Магілёўская, Кіеўская, Падольская, Валынская і дзве акругі: Беластоцкая і Тарнапальская ўтвараюць Вялікае княства Літоўскае. У тэрытарыяльным падзеле захоўваюцца мясцовыя назвы.

2.Кіраванне ВКЛ даручаецца асобнай персоне са званнем імператарскага намесніка, прызначанага расійскім імператарам. Ён карыстаецца тытулам Высокасці, мае на сваім утрыманні частку дзяржаўнай маёмасці і знаходзіцца ў Вільні (сталіцы ВКЛ), дзе мае свой двор, які б упрыгожваў усю правінцыю. У першай запісцы ад 27 мая главой абвяшчаўся сам Аляксандр I.

3.У Пецярбурзе пад непасрэдным распараджэннем расійскага імператара і пад кіраўніцтвам аднаго з дзяржаўных міністраў прызначаных ім знаходзіцца Літоўская канцылярыя — орган кіравання публічнымі справамі ВКЛ.

4.Унутраная адміністрацыя ВКЛ засяроджваецца ў Адміністрацыйнай радзе пад старшынствам імператарскага намесніка. Яна падзяляецца на некалькі дэпартаментаў і складаецца з аднаго генеральнага дырэктара і некалькіх радцаў, прызначаных расійскім імператарам. Захоўваюцца мясцовыя назвы ўсіх устаноў і польская мова.

5.Асобная камісія, прызначаная расійскім імператарам, складае асноўны статут ВКЛ «у магчыма недаўгачасны тэрмін». У ім павінны быць вызначаны: арганізацыя ўсіх галін унутранага кіравання і абавязкі службовых асоб; размеркаванне падаткаў; кіраванне дзяржаўнай маёмасцю; набор і ўтрыманне войск; парадак і ўтрыманне паліцыі, пошты, шляхоў зносін,

ведамстваў юстыцыі, духоўных спраў, народнай адукацыі, земляробства і прамысловасці.

6.Літоўскі статут застаецца назаўжды грамадзянскім законапалажэннем для ВКЛ, бо «заўсёды лічыўся шляхтай як надайсканалейшы кодэкс цывільных і крымінальных правоў».

7.Літоўскі трыбунал у Вільні будзе апошняй інстанцыяй для рашэння ўсіх цывільных і крымінальных спраў. Правы смяротнага пакарання і памілавання належаць расійскаму імператару.

8.Усе пасады ў дзяржаўным кіраванні могуць замяшчацца толькі ўраджэнцамі ВКЛ.

9.Грошавыя сумы, якія выдзяляюцца на народную адукацыю і ўтрыманне навучальных устаноў з дзяржаўных або прыватных крыніц назаўсёды аддзяляюцца ад іншых галін грамадскіх даходаў.

10. Цалкам ураўняць ліцвінаў з іншымі губернямі Расійскай імперыі ў падатках і спосабах іх спагнання [128, с.207-209; 293, с.212-213; 583, с.36-37].

Асобна трэба сказаць аб канстытуцыі і арміі ВКЛ. Скласці канстытуцыю было загадана прэзідэнту камітэта па справах Фінляндыі генералу Армфелту і барону Розенкампфу, што падкрэслівала яе падобнасць да фінскай. Над сваім праектам канстытуцыі працавалі М.Агінскі (восенню яго далучылі да вышэйназваных), Ф.Друцкі-Любецкі і Л.Плятар, які напісаў яе аснову. У паперах Друцкага-Любецкага захаваўся праект Дзяржаўнага закона ВКЛ, які складаўся з 266 артыкулаў у 10 раздзелах. Адпаведна яму сейм ВКЛ утвараецца з Сенату (12 арцыбіскупаў і біскупаў, 15 ваяводаў, 14 кашталянаў, 8 вышэйшых чыноўнікаў, 4 міністраў) і Пасольскай палаты (160 паслоў і 80 гарадскіх дэпутатаў з шасцігадовым мандатам). Кожныя два гады адна трэцяя частка складу аднаўляецца. У ваяводствах і паветах ствараюцца адпаведныя рады. Сенат і Пасольская палата могуць уносіць неабходныя змены і папраўкі ў Статут ВКЛ. Усе дзяржаўныя пасады займаюць грамадзяне ВКЛ. Выбарнасць суддзяў скасоўваецца, яны назначаюцца вялікім князем літоўскім па прадстаўленню адпаведнага міністра. Усялякія змены ў канстытуцыі могуць быць зроблены па прапанове вялікага князя і са згоды абедзвюх злучаных палат сейма. Па прапанове Друцкага-Любецкага сяляне ВКЛ з 1812 па 1821 г. будуць адпускацца на волю: кожны год у кожным маёнтку дзесятая частка сялян. Паміж імі і ўладальнікамі

заключаецца ўмова па ўзаемнай згодзе, якую захоўвае ўрад і права. У скарбовых маёнтках і тых, якія трымаюцца ў пасэсіі, вызваленнем займаюцца пасэсары і міністр скарбу [630, т.1, с.142; 132, с.30; 605, с.138; 601, с.44-46; 391, с.190].

Праект арганізацыі літоўскай арміі было даручана скласці графу Віту і князю К.Любамірскаму з удзелам графа Агінскага. Ён захаваўся ў паперах А.Чартарыйскага. Літоўская армія фармавалася б толькі пасля атрымання Літвой Канстытуцыі 3 мая, па нацыянальных прынцыпах і формах, каб супрацьставіць Літву Княству Варшаўскаму. Яна была бы часткаю расійскай арміі, але захоўвала б асобнае абмундзіраванне і каманданы склад. Першым генералам дывізіі меркавалася прызначыць Князевіча; генераламі дывізіі — Серакоўскага, Гедройца, Вышкоўскага, Лажнінскага, Гіжыцкага; генераламі конных дывізій — князя Е.Сангушку, Карвіцкага, Кальшку, Касакоўскага, Рангоўскага; генераламі пяхотных брыгад — Несялоўскага, С.Грабоўскага, Крапінскага, Т.Ваўжэцкага, С.Жэвускага, Паца.

Літоўская армія падзяляецца на рэгулярную (6 пяхотных і 12 уланскіх палкоў ) колькасцю спачатку 30 тысяч чал., а пазней — да 100 тысяч і міліцыю двух тыпаў: 1) са шляхты (дзеючую, тэрмін службы — 4 гады, колькасны склад — 36 палкоў па 550 чал. кожны; рэзервовую, тэрмін 6 гадоў, вучоба 1 раз у год); 2) з мяшчан і сялян («Народная ахова») колькасцю 20 тыс. чал. Літоўская армія не можа быць выкарыстана супраць войск Княства Варшаўскага, а міліцыя — за межамі Расійскай імперыі, да таго ж дзейнічае толькі ў час нападу ворага. Расійскія палкі, якія ўкамплектаваны выхадцамі з былога ВКЛ, можна назваць літоўскімі (польскія гісторыкі пішуць «польскімі»), а затым фармаваць выключна з ураджэнцаў ВКЛ, паступова змяняць афіцэрскі склад і, калі яго будзе дастаткова, утварыць свой каманданы штаб. Новай фармацыяй у літоўскім войску быў бы корпус коннай і пешай гвардыі. Нічога не гаварылася аб артылерыі і інжынерных частках — разлічвалі, што руская армія мае іх дастаткова. Прадугледжвалася стварэнне вайскова-гаспадарчых калоній. Цікава адзначыць, што дадзены праект стварэння літоўскай арміі пазней будзе ўлічаны пры фармаванні Літоўскага асобнага корпусу [289, стб.668; 583, с.35, 38, 49-51; 274, с.124].

На погляд Агінскага, прапаноўваемы Аляксандру I план адраджэння ВКЛ будзе карысным і ліцвінам, і рускім. «Кожнаму, — піша Агінскі, — даражэй за ўсё ўзнаўленне імя сваёй бацькаўшчыны, дзе ён упершыню ўбачыў свет жыцця, і

няма неабходнасці даказваць натуральнасць гэтага пачуцця. Тады лёгка зразумець, што ліцвінам было б радасна насіць імя свайго краю і карыстацца тым жа самым правам, якое захавана ў Расіі калмыкам, казакам, фінам і іншым плямёнам». Асобнае кіраўніцтва ВКЛ палепшыла бы і паскорыла рашэнне розных эканамічных, адміністрацыйных, судовых спраў і вызваліла бы ад гэтага пецярбургскія ўстановы. Зменшыліся б фінансавыя выдаткі шляхты, а насельніцтва ў падатках і спосабах іх спагнання параўналася бы з расіянамі [128, с.208-209, 211-212].

У інтарэсах Расіі стварэнне ВКЛ перакрывала бы магчымасці пранікнення туды іншаземнага ўплыву (мелася на ўвазе перш за ўсё французскага) і схіліла бы на бок Аляксандра I сэрцы жыхароў Княства Варшаўскага. Варшавяне ўбачылі бы, што ліцвіны атрымалі сваю бацькаўшчыну і спадзяванні свае на адраджэнне Польшчы ўсклалі бы на імператара Расіі, а не Францыі. Яны мелі бы надзею на тое, што атрымаюць падобна ліцвінам адзінае кіраванне і пазбавяцца тым самым вайсковага дэспатызму і цывільнай анархіі, мешаніны правоў, якая перашкаджае суддзям і жыхарам. Асобнае кіраванне ВКЛ скараціла бы мільёны на выдаткі па ўтрыманню дзяржаўных чыноўнікаў Расіі, на трэць павялічыліся бы даходы яе казны і ў два разы — колькасць рэкрутаў з ВКЛ [128, с.207-210; 289, стб. 663].

Да месца будзе сказаць, што Агінскі быў зброяй у руках Аляксандра I, які праводзіў тонкую палітыку ў інтарэсах Расіі. Вось што піша даследчык А.Падвысоцкі: «... Граф Агінскі болей захапляўся самападманам у сваіх зносінах з імператарам Аляксандрам, чым на самой справе карыстаўся поспехам і, быць можа, па сутнасці, пад уплывам чаруючых прыёмаў адносін гэтага манарха, сам таго не падазраючы, быў ягонай зброяй» [289, с.666-667]. ВКЛ патрэбна была Аляксандру I як «прынада», з дапамогаю якой можна было схіліць грамадскія погляды Княства Варшаўскага на бок Расіі і як бар'ер супраць імператара Напалеона. З гэтай мэтаю на тэрыторыі заходніх губерняў распаўсюджваліся чуткі аб стварэнні ВКЛ як ядра будучай Польшчы.

План Агінскага таксама можна разглядаць як першы крок да адраджэння былой Польшчы. Мы не можам пагадзіцца з польскім гісторыкам Фельдманам, які піша, што ў гэтым плане не было нічога аб Польшчы і польскасці. Але мы згодны са сцвярджэннем, што план Агінскага падарваў еднасць палякаў. У сваіх запісках да імператара Агінскі прадугледжваў далучэнне да ВКЛ Княства Варшаўскага пры абвяшчэнні Аляксандра I

польскім каралём. Ён пісаў: «...то ці не было б найлепшай справай урэшце вырашыць пытанне і прыняць гэты тытул, ствараючы спачатку каралеўства Польскае з васьмі губерняў, якія я прапанаваў аб'яднаць пад назвай Вялікага княства Літоўскага ?» [289, стб.645; 274, с.214, 219, 221; 576, т1, с.71].

Як жа ўспрыняў прапановы Агінскага расійскі імператар і яго дарадцы? Выслухаўшы ўважліва чытанне «Записки графа...», Аляксандр І выказаў задавальненне і сказаў, што выкарыстае выказаныя думкі, бо ў большай частцы яны згодны з яго перакананнямі. Далей Агінскі павінен быў звязвацца са М.М.Сперанскім, які ў той час займаўся фінляндскімі і польскімі справамі. Апошні лічыў, што напярэдадні вайны з Францыяй трэба звярнуць увагу на 8 заходніх губерняў, якім Расія можа даць вольнасць і адраджэнне на падставах больш таннейшых і пастаянных. Сперанскі зрабіў свае заўвагі на план Агінскага:

1. Ён не дае Расіі пэўных гарантый дапамогі.

2. Спачатку можна стварыць у Пецярбурзе Камітэт з прадстаўнікоў васьмі губерняў (па аднаму ад губерні) пад старшынствам графа Завадоўскага.

3. З падаткамі вызначыцца пры правядзенні ў Літве рэформы ўнутранай адміністрацыі з мэтаю яе паляпшэння і прыстасавання да мясцовых умоў. Рабіць гэта трэба патаемна ад замежных кабінетаў і расійскай грамадскай думкі, якая ўзбуджана аўтаноміяй Фінляндыі.

4. Да стварэння Камітэта падрыхтоўчую працу даручыць весці Агінскаму, Плятару, Страйноўскаму, князям Любамірскаму і Друцкаму-Любецкаму, якія знаходзяцца ў Пецярбурзе [583, с.30, 34].

Такім чынам, Сперанскі адцягнуў увагу літоўскіх палітыкаў ад Напалеона і нейтралізаваў энергію літоўска-беларускага грамадства.

У канцы верасня 1811 г. Агінскі перад ад'ездам у чатырохмесячны адпачынак зноў меў размову з імператарам. Той прасіў перадаць яго землякам, што займаецца іх лёсам і разлічвае на іх адданасць, патрабаваў ад іх даверу. На развітанне сказаў: «Адно з двух: або, у выпадку вайны, я ствараю Польскае каралеўства ў такой сувязі з Расійскай імперыяй, як Венгрыя і Багемія з Аўстрыяй, або, калі вайны не будзе, прывяду ў выкананне *наш вялікі план* адносна Літвы» [289, стб. 662].

У час адпачынку на радзіме Агінскі жвава заняўся ажыццяўленнем свайго плану. Сустрэўся ў Шаўлях з

Л.Плятарам, які ўнёс свае прапановы да праекта ўказа аб новай арганізацыі ВКЛ. Вёў перамовы з выдатнымі асобамі Літвы, раздаваў ім будучыя міністэрскія партфелі і генеральскія пасады. Так, міністрам унутраных спраў павінен быў стаць А.Чартарыйскі або С.Патоцкі, міністрам юстыцыі — Т.Ваўжэцкі, міністрам фінансаў — Чацкі, ваенным міністрам — Князевіч, вялікім маршалкам ці вялікім канцлерам — стары князь Чартарыйскі. Сябе Агінскі бачыў у ролі сябра Літоўскай дзяржаўнай рады [287, т.3, с.166; 583, с.34-35].

Пад канец 1811 г. у Мінску адбыўся з'езд выдатных палітычных дзеячоў Літвы: К.Прозара, А.Храптовіча, Т.Ваўжэцкага, С.Солтана, Бялапятровіча, А.Жэвускага, Тызенгаўза і інш. Злучыліся, як бачым, таргавічане і прыхільнікі Канстытуцыі 3 мая. Агінскаму ўдалося ўцягнуць у сваю акцыю губернатараў: віленскага — Сулістроўскага, гродзенскага — Друцкага-Любецкага, мінскага — Ракіцкага. На з'ездзе спрабавалі развянчаць напалеонаўскую зорку: страшылі ягоным кодэксам, узгадвалі падаткавы ціск, успаміналі, што ў Тыльзіцкай дамове забаронена нават назва «Польшча» [583, с.56].

27 снежня адбылася чарговая сустрэча Агінскага з Аляксандрам I, на якой размова ішла аб прадстаўленай графам 13 снежня «Памятнай запісцы». Імператар згадзіўся прыняць тытул польскага караля: «...дык чаму не менаваць сябе польскім каралём, калі гэта да спадобы жыхарам?... Аднак трэба пачакаць развіцця падзей...». Па загаду цара Агінскі з дапамогай Патоцкага прапанаваў кандыдатаў у Пецярбургскі камітэт, які займецца падрыхтоўкай канчатковага плана арганізацыі васьмі губерняў, «з якіх павінна складацца Літва або Польшча»: Т.Ваўжэцкі, Ф.Друцкі-Любецкі, Гецэвіч, Шадурскі, Л.Плятар, Страйноўскі, Чацкі, А.Жэвускі (зменены імператарам на сенатара Казлоўскага). Да губернскіх дэпутатаў былі далучаны Сперанскі, князь А.Чартарыйскі, М.Агінскі, С.Патоцкі [289, стб.682].

17 студзеня 1812 г. на Гродзенскім сейміку план Агінскага падтрымаў І.Ю.Ляхніцкі. Ён узносіў заслугі Агінскага і дамагаўся, каб у дзённіку дваранскага сходу яму запісалі падзяку. Матэрыял аб плане ён апублікаваў у Вільні.

8 лютага 1812 г. Аляксандр I зноў сустрэўся з Агінскім, каб даведацца аб працы камітэта. Ён звярнуў увагу, каб яны не забыліся пра сялян, бо «гэта карыснейшы клас насельніцтва, а ў вас усе яшчэ адносяцца да сялян, як да ілотаў». Агінскага больш

турбавала, як імператар ставіўся да «Памятнай запіскі». Той адказаў, што план адпавядае ягоным задумам адраджэння цэлай Польшчы пад апекай Расіі, але ў дадзенай сітуацыі трэба ўстрымацца ад такога важнага крока. У сваіх мемуарах Агінскі запіша, што ўжо не было і мовы аб аўтаноміі Літвы, а Аляксандр быў заняты іншымі думкамі. Гэта быў канец плана адраджэння ВКЛ [583, с.39,55; 289, стб.662-683].

Чаму так здарылася? Для гэтага былі розныя прычыны:

1. План мала забяспечваў вернасць 8 заходніх губерняў Расіі ў выпадку перамогі Францыі.

2. З набліжэннем вайны было рызыкоўна адраджаць ВКЛ, як першы крок да Польшчы, бо яна супрацьстаяла бы другой Польшчы — Княству Варшаўскаму. Аляксандр I праз А.Чартарыйскага хацеў перацягнуць яго на свой бок.

3. Расійскае грамадства глядзела на землі ВКЛ як на «исконно русские», таму ў стварэнні княства яно ўбачыла замах на цэласнасць і недатыкальнасць Расіі («единой и неделимой»). Гэта добра выказаў М.Карамзін. Супраць былі таксама «маладыя сябры» імператара Страганаў і Навасільцаў, дарадца Сперанскі, дзяржаўны сакратар Шышкоў.

4. Расійская бюракратыя глядзела на Літву як на Эльдарада, дзе можна было за кароткі час і амаль безкарна нажыць добры капітал.

5. Зорка Напалеона яшчэ ўзыходзіла, і яго абяцанні разам з рэальным дасягненнем, Княствам Варшаўскім, прываблівалі зпольшчаную шляхту былога ВКЛ, нягледзячы на апатыю большай часткі насельніцтва.

6. Планам прадугледжвалася вызваленне сялян, таму маскоўскія і пецярбургскія вышэйшыя колы не жадалі ствараць рызыкоўны прэцэдэнт са скасаваннем прыгону [521, с.28; 605, с.145; 583, с.52–53, 58, 63].

Такім чынам, застаўшыся не рэалізаваным, план Агінскага па адраджэнню ВКЛ тым не менш адыграў пэўную ролю як для Літвы, так і для Расіі. Указ ад 6(18).10.1811 г. задавальняў эканамічныя і прававыя патрэбы памешчыкаў Віленскай губерні, дазваляў вывозіць хлеб праз сухапутныя межы. Указ ад 17(29).11.1811 г. дазваляў у заходніх губернях уносіць падаткі збожжам. Указ ад 18(30).12.1811 г. параўнаў літоўскія і беларускія губерні з расійскімі ў падаткавых адносінах, ліквідаваўшы былыя падаткі і ўвёўшы падушны. Царскі рэскрыпт на імя Друцкага-Любецкага ад 24.12.1811 г.

(5.01.1812 г.) зацвердзіў усе ўжо дараваныя ліцвінам правы і паабяцаў хутка вырашыць застаўшыяся абяцанні. Дзейнасць Агінскага і яго паплечнікаў спрыяла аб'яднанню буйных землеўладальнікаў краю, якія стварылі Грамадскі камітэт паставак, дзякуючы якому расійскія магазіны (склады) значна папоўніліся хлебам і фуражом, які ў час адыхода ў 1812 г. рускія войскі будуць спальваць [287, с.166; 583, с.54; 605, с.145; 20, с.31-32].

План стварэння Вялікага княства Літоўскага быў рэалізаваны падчас франка-рускай вайны 1812 г. «Напалеон уваходзіў у Літву, — піша польскі гісторык М.Кукель, — з нехаваемым, радасным пачуццём, што з'яўляецца ў гэтыя хвіліны вызваліцелем вялікага народа, які свой лёс аддаў у ягоныя рукі, а разам з тым, што нясе правы чалавека мільёнам людзей, агорнутых цяжкай няволяй. Што ідзе ваяваць за гэта, паўтараў усім, сваім цывільным і вайсковым паплечнікам, французам і палякам, свайму войску, людзям, якія былі адданыя яму, прадстаўнікам Літвы ў брам Вільны і прадстаўнікам цара ў самой Вільні. Але ў пачуцці, што ваюе за Польшчу, жадаў ад палякаў, асабліва ад палякаў з Літвы, аднадумнага, агульнага пад'ёму да барацьбы» [607, с.389-390].

На вызваленых ад рускіх войск тэрыторыях былога ВКЛ ствараліся розныя установы кіраваня. Так, у Гродне да 17 ліпеня была канфедэрацыйная рада з 12 чалавек, падзеленая на 4 аддзелы (прадуктовы, паліцыі, скарбавы, палітычны). У Мінску да 13 ліпеня існавала часовая рада, затым — камісія часовага кіравання, а з 27 ліпеня — адміністрацыйная камісія Часовага ўрада ВКЛ [583, с.86,90]. Партыя, якая захапіла ў свае рукі палітычнае жыццё краю, імкнулася да інкарпарацыі Літвы і Беларусі ў Польскую дзяржаву. 29 чэрвеня ў Кафедральным касцёле Вільні адбыўся ўрачысты акт аднаўлення уніі Літвы з Польшчай, а тым самым падзелы Рэчы Паспалітай былі прызнаны не дзеючымі. Першага ліпеня выйшаў загад Напалеона аб арганізацыі ўлады ў Літве:

§1. Прызначаецца Часовы Урад Вялікага княства Літоўскага, які складаецца з 5 членаў і генеральнага сакратара.

§2. Камісіі Часовага Урада ВКЛ давяраецца кіраванне фінансамі краю, дастаўка правіянта, арганізацыя мясцовага апалчэння, народнай гвардыі і жандармерыі.

§3. Пры камісіі Часовага Урада ВКЛ будзе знаходзіцца імператарскі камісар.

§4. Губерні Віленская, Горадзенская, Мінская і Беластоцкая будуць у сваю чаргу ўпраўляцца асобнымі камісіямі, якія складаюцца з 3 членаў пад кіраўніцтвам інтэнданта» [39, т.3, с.16].

«Перабольшваючы сілы і ўплыў віленскіх палітычных летуценнікаў, — піша гісторык Ю.У.Тацішчаў пра Напалеона,— ён кінуў ім забаўку, якая была яму нават трохі карысна, бо за дазвол вярцець яе ў руках і цешыцца яе падманлівым бляскам Літва павінна яму даць усё, што ён ад яе патрабаваў» [373, кн.5, ч.2, с.28]. Стварыўшы Камісію Часовага Урада ВКЛ (далей: КЧУ), Напалеон не далучыў Літву да Польшчы, а стварыў для яе асобныя органы кіравання. Гэта вельмі расчаравала палякаў, але так патрэбна было Напалеону. Як правільна лічыў Я.Тарле, гэта «азначала, што ён не хоча рабіць нічога, што магло бы ў дадзены момант перашкодзіць міру з Аляксандрам» [372, с.261].

У такой сітуацыі дзеячы Польшчы пачалі руліцца самі. 11 ліпеня Рада Генеральнай канфедэрацыі піша да КЧУ ВКЛ: «Агульны непрыяцель разарваў адвечныя ніці братэрства і выпадае нам падняць надзею, што агульны вызваліцель верне яго і паправіць. Пакажам яму, што захопнік толькі панаваў над зямлёю, а сэрцы не пераставалі заўсёды быць вернымі Айчыне, якая знаходзілася пад яго ўсеўладнай апекаю і, узяўшыся за рукі, усталюем еднасць даверам, годнасцю і агульным да адзінай мэты намаганнем...». Гэтыя мэты гучалі і ў прынятай у гэты ж дзень адозве да жыхароў вызваленых паветаў, да якіх звярталіся такім чынам: «мужныя ліцвіны, суайчыннікі нашыя».

14 ліпеня КЧУ падпісала акт далучэння да Генеральнай канфедэрацыі Каралеўства Польскага. Выконваючы абавязкі старшыні КЧУ ВКЛ Ю.Серакоўскі, выступіўшы з прамовай, закончыў яе словамі: «Няхай жыве злучэнне Літвы з Каронаю!» Потым заклік паўтарылі ўсе сабраныя. Каб ушанаваць гэты дзень, КЧУ вырашыла выдаць па 1 тыс. злотых дзвюм паннам: ліцвінке, якая выйдзе замуж за паляка, і польцы, якая выйдзе замуж за ліцвіна. Першая пара знайшлася і была злучана шлюбам [583, с.94,103-104]. У тэксце акцэса (уступа) да канфедэрацыі гаварылася, каб «разарваныя краіны, Каралеўства Польскае і ВКЛ, злучаны былі зноў у адзінае палітычнае цела і вярнуліся б да даўняй сваёй Айчыны, яе свабод і валоданняў». Падобныя акцэсы прымаліся таксама ў гарадах і паветах ВКЛ: Брэсце і Гродне (3.07); Гродзенскім, Сакольскім, Беластоцкім паветах (3.07); Ваўкавыску і Ваўкавыскім павеце (13.07);

Мінску (19.07); Слуцку (у сярэдзіне ліпеня); Бабруйскім павеце (28.07); Пінскім павеце (19.07); Віленскім павеце (15.08); Ігуменскім і Барысаўскім паветах (пачатак кастрычніка). Усюды працэс прыняцця акцэсаў адбыўся аднолькава: чыталі акт Варшаўскай (Генеральнай) канферэнцыі, выбіралі дэлегатаў на яе, падпісвалі акцэс. Тэкст па зместу таксама быў падобны. Для прыкладу працытуем акт далучэння жыхароў Мінскай губерні: «Мы, грамадзяне Каралеўства Польскага і ВКЛ, што жывем у яго вобласці, якая за часы няволі была названа Мінскай губерняй, — шляхта, духавенства, мяшчане, сяляне і ўсякага стану людзі перад Богам і ўсім грамадствам сведчым, што, вызваленыя з ярма маскоўскай няволі і вернутыя да нашай бацькаўшчыны, мы, як толькі даведаліся аб утварэнні канфедэрацыі ўсяго польскага каралеўства, жадаючы як наймацней звязацца сэрцам і зброяю з нашыма братамі, злучаемся добраахвотна, аднадумна і непарыўна праз сённяшні ўрачысты акт з канфедэрацыяю Каралеўства Польскага» [цыт. па: 132, с.43].

Падпісаны ў кафедральным саборы Вільні 14 ліпеня акт далучэння да Генеральнай канфедэрацыі Княства Варшаўскага Камісіі Часовага ўрада Літоўскага (як і акты дэпартаментаў) не гавораць аб адмове ад улады рускага імператара і аб прызнанні над сабою ўлады саксонскага герцага. Такім чынам, незалежнасць ВКЛ ад Расіі абвешчана не была. Відаць, палітычныя дзеячы Літвы «пакідалі не спаленымі масты» (бо не былі ўпэўнены ў сіле Напалеона), каб мець «калі не апраўданне, дык запэўненні ў адданасці дынастыі» [5, кн.5, ч.2, с.28]. 21 ліпеня КЧУ ВКЛ абвясціла адозву да жыхароў Белай Русі, у якой заклікала іх да злучэння вузамі сумеснай канфедэрацыі: «Крывёю з Вамі злучаныя, заўсёды адзіным лічыліся народам, нягледзячы на змены межаў у палітычных умовах... Хутка ўжо убачым Вас у святыні праў, засядаючых у крэслах сенату... Зноў нясуць Вам харугвы Хадкевічы, Радзівілы, Сапегі, Сангушкі, злучыце Вашае з Нашым, і хутка зачынім Браму нашых зямель непрыяцелю назаўсёды. Бачыце развіваючыяся іх харугвы і поспехі Непераможнага, вусны якога прагаварылі, што жыве Польшча» [583, с.104-105].

4 жніўня дэлегаты КЧУ ВКЛ Антоні Тызенгаўз і Еленьскі выехалі да Генеральнай рады канфедэрацыі Княства Варшаўскага. Яны везлі наступныя дакументы: акцэс урада і мясцовых уладаў, адозву КЧУ да грамадзян чатырох дэпартаментаў збірацца на соймікі з мэтаю выбара дэлегатаў у

Генеральную канфедэрацыю і на абвешчаны ёю сейм. Дэлегаты хацелі дамовіцца пра дзень збору выбраных паслоў і жадалі быць «перакладчыкамі пажаданняў Літвы», падтрымліваць міжурадавыя кантакты ВКЛ з Княствам Варшаўскім, ліквідаваць перашкоды ў сувязях дзвюх краін (тарыфы манет, солі, кошты сукна і іншых вайсковых матэрыялаў, патрэбных для фарміравання арміі), азнаёміцца з пастановамі Рады міністраў Княства і Урадавай камісіі, якая існуе з 1807 г. 20 жніўня адзін з дэлегатаў КЧУ ВКЛ выступіў з прамовай, у якой падкрэсліў гістарычныя сувязі Літвы і Польшчы. Таму «народ Літвы зліваецца з народам Польшчы, яго сцяг непадзелен з польскім народам, ён хутка ўступае ў агульную канфедэрацыю і будзе кіравацца гэтым актам, ахоўваць яго запаветна і клянецца ні ў чым не адхіляцца ад агульнага пачатку. Прыміце ж, слаўныя палякі, Літву да вашага брацкага сэрца» [цыт. па: 284, с.160].

Да поўнага зліцця ўсё ж былі перашкоды. Створаная КЧУ ВКЛ замяніла ўстановы польскай канфедэрацыі сваімі органамі кіравання знізу да верху: ад вёскі да сталіцы ў Вільні. КЧУ стала вышэйшым урадавым органам, улада якога распаўсюджвалася на значную тэрыторыю былога ВКЛ да 1793 г. (схема Д.14.1). Яна ахоплівала Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць (яны сталі называцца на французскі ўзор дэпартаментамі) і складала тэрыторыю ў 3787 кв. міль з насельніцтвам у 1333889 душ муж. полу (па іншых дадзеных, 2,5-3,5 млн. чал.). ВКЛ 1812 г. мела 31 павет (дыстрыкт), некаторыя з якіх былі заняты рускімі войскамі ўвесь час вайны, а частка дэпартамента Гродзенскага ў кастрычніку была занята войскамі адмірала П.В.Чычагава. Так што ўвесь час пад уладаю КЧУ ВКЛ было каля 17 паветаў, з якіх 4 ужо ў лістападзе адышлі да Расіі [583, с.150; 486, с.327; 488, с.342].

2 ліпеня адбылося першае паседжанне КЧУ ВКЛ у зале бібліятэкі Віленскага універсітэта. Прысутнічалі толькі тры члены: А.Сапега, Ю.Серакоўскі, Ф.Ельскі. Яны выслалі запрашэнне да адсутнічаючых С.Солтана і К.Прозара і падзялілі паміж сабой абавязкі: Ю.Серакоўскаму былі даручаны фінансы, А.Сапегу — войска і харчаванне, Ф.Ельскаму — абодвум дапамагаць. 7 ліпеня ў склад КЧУ ўвайшлі Я.Снядэцкі і А.Патоцкі. 18 ліпеня прыбыў старшыня КЧУ Солтан (яго абавязкі выконваў Серакоўскі). 8 кастрычніка прыехаў затрыманы на Белай Русі К.Прозар [583, с.132].Выбар людзей на пасады кіраўніцтва ВКЛ нельга прызнаць добрым. У разлік

браліся іх былыя заслугі, пасады, радавітасць і маёмасны стан. Гэта былі «добрыя палякі» і заслужаныя людзі, але ўжо ў большасці сталага ўзросту, ветэраны публічнай службы, удзельнікі Чатырохгадовага сейма, сябры Касцюшкі, якія апошнія 20 гадоў не ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці. Яны не былі прыстасаваныя да ўмоў і часу, у якім ім выпала дзейнічаць, ім не хапала энергіі, ведання сучасных краявых умоў і адміністрацыйнай французскай сістэмы. Трэба прызнаць слушнай характарыстыку сяброў КЧУ, якую даў польскі даследчык Ю.Івашкевіч: Ельскі, Прозар, Солтан — «слабыя галавы», хаця добрыя заслужаныя палякі, але ва ўзросце, не здольныя да энергічнай і інтэнсіўнай працы; Патоцкі, кіраўнік унутраных спраў, не меў вопыта палітычнай дзейнасці; толькі пасля смерці А.Сапегі стаў членам А.Тызенгаўз, расольскі стараста; А.Сапега — член Таварыства сяброў навук, галава прыхільнікаў Напалеона ў Літве, яго разведчык да вайны, інтрыган, прыдворны чалавек, які не ведаў армейскай справы; Ю.Серакоўскі — больш геральдыст і археолаг, чым дзяржаўны дзеяч, не ведаў ніводнай з трох спраў, якімі ўзяўся кіраваць (фінансы, прадукты, паліцыя) [583, с.79,132].

«Не было ў Вільні чалавека, — пісаў польскі гісторык М.Кукель, — які быў бы не толькі аўтарытэтам, але і натхніцелем, не толькі арганізатарам, але здольным да смелай імправізацыі. Не мог яго заступіць хаця разумны і вельмі адданы польскай справе Марэт або князь Басана, міністр замежных спраў, які быў у Вільні ўвесь час кампаніі, ці моцна звязаны з Польшчай імператарскі камісар барон Біньён, а тым больш прызначаны генерал-губернатарам галандзец, генерал Гагендорп, з адміністрацыйнай практыкай на Яве і каланіяльным спосабам адносін да палякаў. Цуд магло бы зрабіць з'яўленне Касцюшкі перад магіяй яго імя: але той на запрашэнне Напалеона адмовіўся, гледзячы на ягоны дэспатызм, хаця жадаў, «каб загналі расіян аж да Сібіры» [605, с.148-149].

Напалеон хацеў мець у Вільні А.Чартарыйскага, аўтарытэтнага чалавека. Князь Басана ў Вільне намякаў, што Напалеон прыняў бы карону польскую, а Чартарыйскі стаў бы віцэ-каралём. Гэтых двух «літвінаў» не хапала ў Вільні. Юзаф Панятоўскі — паляк, мог бы тут таксама нешта зрабіць, але ён патрэбен быў на чале польскага корпусу ў арміі Жерома Банапарта.

КЧУ ВКЛ складалася з калегіі старшынь камітэтаў (схема Д.15.2):

1) харчавання і магазінаў — былы літоўскі маршалак Станіслаў Солтан;

2) камітэт паліцыі — былы літоўскі абозны Карл Прозор;

3) камітэт фінансаў — граф Юзаф Серакоўскі;

4) ваенны камітэт — князь Аляксандр Сапега;

5) судовы камітэт — граф Францыск Ельскі;

6) камітэт унутраных спраў — вялікі канюшы, генерал Княства Варшаўскага граф Аляксандр Патоцкі;

7) камітэт народнай асветы і рэлігіі — рэктар Віленскага універсітэта, прафесар астраноміі Ян Снядэцкі.

Генеральным сакратаром урада стаў Юзаф-Ігнат Касакоўскі. Сістэма кіравання, пабудаваная па прынцыпу калегіяльнасці, была ў вядомай ступені стройнай і закончанай, але не мела рэальных сілаў, на якія магла бы абапірацца ў выкананні сваіх задач. Слушна лічыць Ю.Івашкевіч, што прызначаць членаў КЧУ старшынямі аддзелаў было памылкаю, бо гэта адымала час, пытанні на камісію падаваліся непадрыхтаваныя і спешна вырашаліся. Ці мог, напрыклад, Ю.Серакоўскі, будучы старшынёй КЧУ і трох аддзелаў, добра выканаць свае абавязкі? [583, с.135].

Якім было становішча ВКЛ у 1812 г., сведчыць расійскі генерал Армфелт. Ён піша, што расійскія войскі адыходзілі, спусташаючы мясцовасці, асабліва адзначалася гэтым гвардыя — пасля іх нічога не заставалася, апрача авадзеняў і дрыгвы, людзі і жывёла былі выгнаны або разбегліся, хаты зруйнаваныя, пасевы вытаптаныя. На думку Армфелта, калі б Расія атрымала назад Літву, дык ад яе на працягу 150 гадоў было б менш карысці, чым ад Сібіры [583, с.81]. З тэрыторыі ВКЛ у КЧУ прыходзілі звесткі, аналагічныя данясенню ашмянскага падпрэфекта: «Шчодра льецца кроў, якая пры абароне Айчыны салодкі помнік падрыхтавала бы кожнаму. Шматлікія забойствы, раны стрэляныя, штыкавыя і ад шабляў, пажары розных будынкаў, знішчэнне пасеваў, захоп агульных статкаў і коней, а таму поўнае знішчэнне гаспадаркі — гэта лёс дадзенага павета...». Лідскі павет абабралі некалькі разоў, праходзілі галандцы 33-га палка — усе кінуліся рабаваць двары і вёскі. Потым вестфальцы (500 чал.) на чале з камандзірам — рабаўнікам Вандамам у Шчучыне запатрабавалі запасы прадуктаў: хлеба, мяса, гарэлкі, фуражу. Калі яны гэта атрымалі, пачалі рабаваць хаты, страляць у жыхароў. Гвалт адбываўся ўсю ноч, і вынікі былі жахлівыя: 3 забітыя,12 параненых, мноства пакалечаных і пабітых людзей [583, с.81,151,155-156; 426, с.19-20].

Пералічаныя факты паказваюць умовы, у якіх давялося працаваць КЧУ ВКЛ. Асабліва цяжка прыходзілася Скарбоваму камітэту, бо фінансавае становішча было не з лепшых яшчэ з расійскіх часоў — звонкую манету адсюль выцягнулі, а край навадніліі асігнацыямі, курс якіх упаў да 1/5 намінальнай каштоўнасці. Падаткі на 1812 г. забрала яшчэ расійская ўлада. Перад адыходам рускія войскі вывезлі ўсе запасы казны [583, с.88,185; 186, с.151].

КЧУ ВКЛ было вырашана, што ўсе 4 дэпартаменты заплацяць падаткі, роўныя поўгадоваму за 1812 г., без аплаты збожжам, забраным расійскай уладаю. Беластоцкі, Віленскі, Гродзенскі — серабром, Мінскі — асігнацыямі па норме серабра. Падаткі падзяляліся на:

1) пастаянныя — падымны, кварты са старостваў, розныя аплаты з духоўных і казённых маёнткаў, пагалоўнае ад яўрэяў;

2) непастаянныя — мытны і акцызны зборы (чапавы, сосавы), судовыя таксы, даходы ад гербавай паперы, продажу лесу, працэнты ад купецкіх капіталаў ( 21/4% — ад яўрэйскіх, 11/4 — ад хрысціянскіх);

3) новыя — 22 жніўня КЧУ прыняло пастанову аб добраахвотным ахвяраванні для ўсіх, акрамя ваенных да капітана, хворых, асоб, якія не мелі даходаў, дзяцей; падатак патэнтавы на духавенства (згодна з рашэннем Чатырохгадовага сейма), якое мае маёмасць, прывілеі;

4) надзвычайныя — напрыклад, КЧУ разарвала дамовы з тымі, хто трымаў акцызы, канфіскавала іх маёнткі і склады.

Збор пералічаных падаткаў адбываўся вельмі цяжка. Найлепш здолеў сабраць належачыя падаткі Беластоцкі дэпартамент. Рэгулярна пасылаў грошы да заняцця дэпартамента войскамі П.В.Чычагава Гродзенскі дэпартамент. Стараўся вырашыць праблемы Віленскі дэпартамент, а Мінскі збіраў дрэнна: толькі ў кастрычніку 1812 г. з трох паветаў пачалі ісці падаткі. Ад 2 жніўня да 10 снежня 1812 г. баланс у генеральнай касе КЧУ выглядаў наступным чынам: прыход — 2159966 злотых, 3 грошы; расход — 2157047 злотых, 3 1/4 гроша, засталося ў касе 1250 руб. 59 кап. Гэтыя сумы не паказваюць усіх прыходаў і расходаў КЧУ, бо ў генеральную касу прыходзілі сумы з дэпартаментаў пасля выканання сваіх патрэб (часам яны былі даволі значныя) [250, ф.1168, воп.1, спр.3, а.8-44,112,114,176,184; 583, с.202,205].

21 ліпеня КЧУ выдала арганізацыйныя прынцыпы Камітэта ўнутраных спраў: найважнейшыя яго функцыі — стварэнне

адміністрацыйных камісій і падпрэфектур; складанне спісаў шляхты, якая прымае ўдзел у павятовых сейміках, нагляд за сейміками і выбарамі на іх; апека над інстытутам публічнай уласнасці; збор інфармацыі аб пасевах, ураджаях, запасах збожжа; нагляд над сельскімі запаснымі магазінамі, мастамі, дарогамі, дамамі працы і турмамі; апека над сялянамі і старазаконнікамі; снабжэнне соллю; апека над дамамі, землямі, пакінутымі ўладальнікамі-расіянамі.

У функцыі Камітэта паліцыі ўваходзіў нагляд за невядомымі асобамі або падазронымі, асабліва ў дэпартаменцкіх месцах; валацугамі і крымінальнымі элементамі; рознымі публічнымі таварыствамі і месцамі відовішчаў; санітарным станам вуліц, дамоў; бяспекаю вуліц, дамоў ад пажару; продажам ядаў і пораху; таксамі на прадукты; правільнасцю вагаў і мераў. Камітэт таксама выпрацоўваў правілы аб пашпартах і рэгістрацыі асоб, якія прыбылі ці выбылі з горада [583, с.215,226].

Агульнавядомая заява Напалеона, якую ён выказаў літоўскай дэлегацыі ў Вільні: мне патрэбна «хлеба, хлеба і хлеба» [373, с.28]. Таму зразумела, што галоўнай задачай Камітэта харчавання і магазінаў было забеспячэнне напалеонаўскай арміі, а таксама фарміруемых літоўскіх войскаў; падрыхтоўка сельскіх запасных магазінаў для зімоўкі французскіх войск.

Судовы камітэт адчыніў у дэпартаментах гродскія суды, земскія павятовыя суды; акруговыя суды; суды галоўныя 1-га дэпартамента (да спраў карных і крымінальных учынкаў). З 3 ліпеня загадам Напалеона ў Вільні, а потым у іншых дэпартаменцкіх гарадах былі створаны надзвычайныя камісіі з французскіх ваенных, якія разглядалі справы пакарання злачынстваў, здзейсненых ваеннымі ці жыхарамі Літвы, асабліва марадзёрства. Падставаю новай арганізацыі судовай справы ВКЛ сталі правілы судаводства, выдадзеныя КЧУ 23 ліпеня, Статут Літоўскі і пастановы сеймаў [250, ф.1168, воп.1, спр.4, а.2-6; 583, с.242].

Мэтай камітэта адукацыі і рэлігіі было ўтрыманне адукацыйнай сістэмы, створанай А.Чартарыйскім: адкрыццё з пачатку новага школьнага года заняткаў ва ўсіх школах чатырох дэпартаментаў. Для гэтага трэба было вызваліць школьныя будынкі ад войскаў, складаў, шпіталяў і захаваць недатыкальнасць фінансаў адукацыйных і школьных устаноў. У сваёй адозве камітэт адукацыі і рэлігіі запэўніў, што ў сваёй дзейнасці будзе трымацца рэлігійнай талерантнасці і не

дапусціць праследаванняў адной веры другой. Камітэт займаўся апекай людзей рознага веравызнаныя, размеркаваннем фондаў, прызначаных на ўтрыманне святынь, чыноў і служак касцельных, надзорам за кляштарамі [250, ф.1168, воп.1, спр.3, а.68; 583, с.253,265].

Ваенны камітэт КЧУ ВКЛ займаўся фарміраваннем беларуска-літоўскай арміі. Нягледзячы на цяжкасці (павялічаныя расійскія рэкруцкія наборы апошніх гадоў, несумленнасць шляхты, якая давала ненайлепшых сялян; недахоп грошай, узбраення, абмундзіравання), яму ўдалося сфарміраваць 5 пяхотных палкоў (18 — 22), 4 уланскія палкі (17—20), 3 егерскія батальёны (2 — у Мінскім дэпартаменце, 1 — у Віленскім, на стадыі арганізацыі знаходзіўся батальён у Гродзенскім дэпартаменце), атрады Народнай гвардыі (у Вільні, Гродне, Слоніме, Нясвіжу, Беластоку), жандармерыю (Гродзенскую, Віленскую, Мінскую). Акрамя таго, Ваеннаму камітэту падпарадкоўваліся вайсковыя часці, створаныя на грошы магнатаў: коннаегерскі полк І.Манюшкі, уланскія палкі Л.Паца і Д.Радзівіла, гусарскі полк М.Абрамовіча, полк конных стралкоў Любаўскага, коннаартылерыйская рота Р.Тызенгаўза. Агульная колькасць беларуска-літоўскай арміі дасягала 19 тыс. чалавек [501, с.386; 459, с.49-56].

Цікава вызначыць узровень самастойнасці ў дзейнасці КЧУ. Над ёю існаваў пастаянны французскі кантроль. Апекуном (пратэктарам) КЧУ быў сам Напалеон, які і вызначыў (па прапанове Сапегі) яго склад. Пры КЧУ знаходзіўся імператарскі камісар Біньён. Французскі гісторык А.Вандаль даў яму наступную характарыстыку: «Гэта быў маленькі чалавек, вельмі дзейсны, рухомы, жвавы, глыбока адукаваны і надта старанны, усёй душою аддадзены служэнню імператару і яго славе» [49, с.140]. Імператарскаму камісару падпарадкоўваўся інтэндант, які быў пры адміністрацыйнай камісіі дэпартамента. Розныя французскія чыноўнікі былі пры гарадскіх і павятовых уладах ВКЛ.

Паралельна існавала французскае ваеннае кіраванне Літвы (схема Д.15.1). Быў генерал-губернатар ВКЛ, у дэпартаментах — ваенны губернатар, у гарадах — каменданты, якія мелі пад сваёю ўладаю каманды жандармаў. Акрамя іх, у грамадзянскае кіраванне ўмешваліся французскія камандзіры і чыноўнікі вайсковых часцей, якія часова знаходзіліся ў населеных пунктах або праходзілі праз іх [191, с.35; 583, с.140,144-150; 186, с.14-17; 267, с.19; 5, кн.5, ч.2, отд.1, с.26-28]. 27 жніўня КЧУ

паведаміла, што яе старшынёй стаў ваенны французскі генерал-губернатар граф Гагендорп. Гэта была канцом гульні ў самастойнасць адроджанага ВКЛ. А.Сапега заявіў пратэст і падаў у адстаўку. ГісторыкЮ.Тацішчаў слушна пісаў: «Атрымаўся своеасаблівы выгляд дзяржавы, пазбаўленай самай змястоўнай прыкметы незалежнага быцця: у наяўнасці былі тэрыторыя і народ, які жыў на ёй, але не было аб'ядноўваючай яго ўлады, хаця і меліся яе агенты» [373, с.27; 5, ч.2, отд.1, с.34,36]. Разгледзім грамадзянскае кіраванне ВКЛ (схема Д.16.1). На ўзроўні губерні дзейнічала адміністрацыйная камісія, якая была падпарадкавана КЧУ. Яна павінна была хутка выконваць усе даручэнні КЧУ і яе камітэтаў. Складалася з трох аддзелаў: унутраных спраў і паліцыі; вайсковых спраў і харчавання; фінансавых спраў і асветы. Галоўнымі задачамі камісіі былі збор харчу; нагляд за зборам падаткаў і рэкрутаў; апублікаванне пастаноў, распараджэнняў і загадаў урадавых органаў; кантроль за іх выкананнем; выкананне экзэнцый судовых прыгавораў; выкананне ўсіх даручэнняў КЧУ і адпраўка туды усялякай патрэбнай інфармацыі [250, ф.1168, воп.1, спр.9].

На ўзроўні паветаў дзейнічала павятовая камісія дыстрыкта і падпрэфектура. Па пастанове КЧУ ад 21 ліпеня ў функцыі падпрэфекта ўваходзілі абавязкі былога павятовага маршалка і кіраўніцтва павятовай паліцыяй. Інакш кажучы, ён выконваў тое, што ў дэпартаменце выконвала адміністрацыйная камісія: нагляд за парадкам, публічная бяспека маёмасці, збор падаткаў, ажыццяўленне экзекуцый. Гэтыя функцыі пацвердзіла кастрычніцкая пастанова КЧУ ВКЛ. Дапамагалі падпрэфекту два павятовыя радцы — асобы, якім давяралі жыхары павета і якія ведалі мясцовыя ўмовы. На пасаду падпрэфекта КЧУ выбірала галоўным чынам былых павятовых маршалкаў або па іх адсутнасці або нездатнасці падкаморых ці харунжых як асоб, выбраных жыхарамі. Падпрэфектура была падзелена на 3 аддзелы адпаведна аддзелам адміністрацыйнай камісіі дэпартамента: паліцыі, скарбовы, кватэрны. Яны павінны былі забяспечваць бяспеку жыхароў, дастаўку транспарту, паштовую сувязь, памяшканні для войскаў, стваралі магазіны і наглядалі за імі, вырашалі фінансавыя справы, збіралі падаткі, адказвалі за развіццё асветы і рэлігіі, за ўтрыманне капіталаў і д.п. Паліцыя выконвала загады падпрэфектуры, захоўвала парадак, бяспеку, займалася рамонтам дарог, арыштоўвала асоб без пашпартоў, наглядала за сельскай гаспадаркаю, ахоўвала сялян ад прымусу і г.д.

У гарадах па загаду КЧУ ад 17 жніўня 1812 г. існавала муніцыпальная рада на чале з прэзідэнтам (мэрам). У дэпартаменцкіх гарадах рада падпарадкоўвалася адміністрацыйнай камісіі, у павятовых — падпрэфектам. Яна ажыццяўляла кіраванне горадам і яго прадмесцем: загадвала мясцовай паліцыяй, гарадскімі фінансамі, выконвала ўсе патрэбы французскіх войскаў. Рада мела чатыры аддзелы: 1) мясцовай паліцыі, 2) скарбавы, 3) кватэрны, які займаўся расскватэраваннем войскаў, збіраў кватэрны падатак, заведваў будынкамі горада; 4) аддзел рэлігійных спраў і адукацыі [250, ф.1168, воп.1, спр.2, а.1–9].

Скончыла сваю дзейнасць Камісія Часовага Ураду ВКЛ у час адыходу французскіх войск з тэрыторыі Літвы і Беларусі. Восьмага снежня 1812 г., калі ў Вільню пачалі прыбываць рэшткі напалеонаўскай арміі, генеральны сакратар атрымаў ад КЧУ даручэнне аб падрыхтоўцы архіва да эвакуацыі. Сябры КЧУ ў складзе А.Храптовіча, Я.Снядэцкага, Ф.Плятара, К.Даніловіча адыходзілі разам з французамі на Коўна. 21 снежня КЧУ сабралася на сваё паседжанне ў Варшаве і прыняла рашэнне перайсці пад апеку Генеральнай канфедэрацыі. 29 студзеня 1813 г. было вырашана пакінуць Варшаву і ехаць у Кракаў разам з радай Генеральнай канфедэрацыі і ўрадам Княства (Герцагства) Варшаўскага. 7 студзеня сюды была дастаўлена казна ВКЛ. 30 красавіка КЧУ услед за адыходзячымі войскамі перабралася спачатку ў Падгужжа, а пасля — у Дрэздэн, дзе на паседжанні 27 ліпеня былі падзелены паміж сябрамі літоўскага ўрада рэшткі казны ВКЛ, якую прывёз капітан Довят (790 напалеондараў, 1514 галандскіх дукатаў, 125 пяціфранкавых манет). Некалькі дзён апасля КЧУ сабралося на сваё апошняе паседжанне. Гісторыя ВКЛ 1812 г. была завершана [583, с.317].

Такім чынам, праект 1811 г. Агінскага прадугледжваў стварэнне ВКЛ пад апекай Аляксандра I, але па вызначаных намі прычынах не быў здзейснены. У 1812 г. ВКЛ было адноўлена пад пратэктаратам Напалеона з той жа мэтаю — выкарыстаць Літву ў сваіх намаганнях. Літоўская краіна мела ўсе прыкметы дзяржаўнасці, але не была самастойнай у сваёй дзейнасці.

## 4.4. **Землі Беларусі ў планах дзекабрыстаў і польскіх патаемных таварыстваў 1820-х гадоў**

Вядомы дзекабрыстазнаўца М.В.Нечкіна ў кнізе «Движение декабристов» пісала: «Геаграфічна ўся Расія была

прадстаўлена ў дзекабрысцкім руху. Звесткі аб краіне былі ў дзекабрыстаў шматлікія, разнастайныя, ішлі з розных бакоў, асвятлялі розныя пытанні яе складанага жыцця» [257, с.83]. Нашы знаходкі ў архівах, апублікаваныя дакументы, творы дзекабрыстаў, мемуары сучаснікаў пацвярджаюць слушнасць выказанай вышэй думкі адносна Беларусі: існуюць беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў [439].

У Беларусі ішло фарміраванне светапогляду дзекабрыстаў у час руска-французскай вайны 1812 года і замежных паходаў 1813-1814 гг. З чэрвеня 1821 па ліпень 1822 г. у перыяд так званага «італьянскага паходу» гвардыі на тэрыторыі Беларусі пабывалі каля 30 будучых сяброў патаемных таварыстваў. Сярод іх А.Я.Разэн, А.А.Бястужаў-Марлінскі, М.М.Мураўёў, І.Д.Якушкін, М.І.Пушчын, А.В.Поджыа і іншыя. Аляксандр І спадзяваўся «проветрить душок» гвардзейскага корпусу, а здарылася зусім наадварот — перадавыя афіцэры глыбей пазнаёміліся з жыццём прыгоннага сялянства і прыйшлі да высновы аб неабходнасці глыбокіх пераменаў у рускім грамадстве. Яны мелі больш часу для асабістага знаёмства, пазнавалі адзін аднаго, сходзіліся па агульных інтарэсах і поглядах у гурткі, арцелі. У Беларусі ішла вярбоўка сяброў таварыстваў, наладжваліся тыя сувязі, якія прывялі да стварэння Паўночнага і Паўднёвага таварыстваў.

Аб знаходжанні дзекабрыстаў на тэрыторыі Беларусі захаваліся іх лісты і ўспаміны, дзе яны пішуць аб становішчы населеных пунктаў, аб беларусах (мяшчанах, сялянах, шляхце), аб прыродзе і эканоміцы края, ягонай культуры. Не магу не прывесці словы Ф.М.Глінкі аб Беларусі гэтага часу: «...Усё тут ёсць, каб прыкласці чалавечую працу і жыць шчасліва, але пакуль у тутэйшых краях пануе жудасная беднасць». Вяртаючыся з паходу ў Беларусь, паручнік Генеральнага штаба Мікіта Мураўёў вёз у сваім чамадане рукапіс віцебска-мінскага варыянта Канстытуцыі, якая вынесла выразны прыгавор феадальна-прыгонніцкай Расіі і стварала ў перспектыве шырокія магчымасці для развіцця рускага грамадства па прагрэсіўнаму шляху [гл.: 423, с.10-30; 440; 444; 445; 449].

Некаторыя «першанцы свабоды» былі ўраджэнцамі і жыхарамі Беларусі. Да дваран Гродзенскай губерні належалі А.Ст.Вайніловіч і В.В.Сізінеўскі (правільна, магчыма, Седзянеўскі). І.І.Гарбачэўскі, верагодна, нарадзіўся ў Магілёве, дзе ў той час працаваў губернскім сакратаром яго бацька.

Дзіцячыя і юнацкія гады гэтага дзекабрыста прайшлі ў Віцебску (1807 — 1817). З Магілёўскай губерні паходзяць чатыры дзекабрысты: І.К.Ракуза, І.П.Жукаў, стрыечныя браты Ц.У. і М.Ст. Комары. Згодна з метрыкай, выдадзенай Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыяй, 1 кастрычніка 1798 г. нарадзіўся М.Дз.Лапа. Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у Магілёўскім езуіцкім калегіуме. З дваран Віцебскай губерні паходзіў У.І.Гурка — бацька вядомага генерал-фельдмаршала І.У.Гурка (1828 — 1901).

Шмат дзекабрыстаў звязаны з Беларуссю сваяцкімі сувязямі або самі ў розныя часы жылі тут. Р.А.Перэтц да 1803 г. выхоўваўся дзедам у невядомай вёсцы Магілёўскай губерні. Бацька В.Е.Галяміна служыў правіянцкім чыноўнікам у Гродне. А.Л.Кажэўнікаў з 1856 г па 1862 г. быў упраўляючым Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцей, а ў 1862 — 1864 гг. — мінскім губернатарам. І.І.Іваноў у 1812—1815 гг. служыў паштальёнам у Ваўкавыскай паштовай экспедыцыі і Гродзенскай паштовай канторы. Пасля амністыі 1856 г. пасяліўся ў Магілёве А.А.Быстрыцкі. Камендантам Бабруйскай крэпасці ў 1865—1869 гг. быў М.І.Пушчын. Спадчыннікам майарата з цэнтрам у Чачэрску з'яўляўся З.Р.Чарнышоў. Дзве сястры А.В.Карніловіча жылі ў фальварку Бобрыкі Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні, які яны атрымалі пасля смерці бацькі ў 1814 г. У Ружанах і Слуцку служыў у 1822-1824 гг. ротмістр Польскага ўланскага палка М.С.Лунін. Віцебскім віцэ-губернатарам, магілёўскім, а потым гродзенскім губернатарам быў М.М.Мураўёў [гл.: 465; 442; 430; 473; 480; 490; 491; 493; 498; 519].

Да паўстанняў дзекабрыстаў і пасля іх многія сябры расійскіх дзекабрысцкіх арганізацый пабывалі ў Беларусі. Зіму 1814-1815 гг. правёў у Нясвіжы К.Ф.Рылееў. Пасля паўстання збег у Каралеўства Польскае праз тэрыторыю Беларусі В.К.Кюхельбекер, а ў Брэст-Літоўску быў затрыманы ў 1826 г. «дзекабрыст без снежня» П.Я.Чаадаеў [гл.: 423, с.4-5,55-76; 439; 497].

У другой палове верасня 1817 г. С.П.Трубяцкому стала вядома ад сябра Саюза выратавання князя П.П.Лапухіна (палкоўнік, сапраўдны камергер пры імператары меў з ім «канфедэнцыяльную размову»), што Аляксандр I мае сакрэтны намер аднавіць Рэч Паспалітую пад сваім кіраваннем у межах 1772 г., далучыўшы да Каралеўства Польскага землі Беларусі і Правабярэжнай Украіны. Трубяцкі канспіратыўным лістом

да А.Мураўёва паведамляе пра гэтае ў Маскву. У лісце, як піша ў сваіх запісках Дз.Якушкін, было наступнае: «Па-першае, што цар закаханы ў Польшчу і гэта было ўсім вядома; на Польшчу, якой ён толькі што даў канстытуцыю і якую лічыў больш адукаванай, чым Расія, ён глядзеў як на частку Еўропы; па-другое, што ён ненавідзіць Расію, і гэтае было верагодным пасля ўсіх яго дзеянняў у Расіі з 15-га года; па-трэцяе, што ён намераны адняць некаторыя землі і далучыць іх да Польшчы, і гэта было верагодным; нарэшце, што ён, ненавідзячы і пагарджаючы Расіяй, намераны перанесці сталіцу сваю ў Варшаву».

М.В.Нечкіна пісала, што ў турэмных сведчаннях дзекабрыстаў аб лісце Трубяцкога «да зместу часта прымешваецца пытанне аб мяркуемым вызваленні сялян у адрываемых абласцях і аб паўстанні ў адказ рускіх сялян, пакінутых у прыгонным стане. Для падаўлення мяркуемых хваляванняў запрыгоненага рускага насельніцтва як бы арганізавалася паласа ваенных пасяленняў, якая прарэзала Расію ад паўночнай сталіцы да поўдня» (сапраўды першае доследнае ваеннае пасяленне было ўтворана на тэрыторыі былога Бабылецкага староства Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.).

Што ж найбольш узбудзіла хваляванні дзекабрыстаў? М.І.Тургенеў, сябра Саюза благадзенства, пісаў у кнізе «Расія і рускія»: «Як бы гэта не было, менавіта гэты мяркуемы намер імператара ўключыць у склад Царства Польскага старажытныя вобласці Польшчы зрабілі ў Расіі непапулярнымі ўсе мерапрыемствы Аляксандра, якія былі накіраваны на карысць палякаў. Не было б страху перад гэтым, падараванне Польшчы канстытуцыі не ўзбудзіла бы ў рускіх таго раздражнення і той зайздрасці, якія ахапілі рускае грамадства». Лепшыя яго прадстаўнікі глядзелі на беларускія землі, як мы заўважылі з іх выказванняў, або як на «исконно русские», або як на «старинные области Польши».

Рэакцыя дзекабрыстаў была вельмі бурлівай, і ў выніку 5-6-дзённых паседжанняў у Хамоўнічых казармах Масквы прыйшлі да неабходнасці забіць Аляксандра І. На гэтае рашыліся Мікалай Мураўёў, Фёдар Шахаўскі, Іван Якушкін. У Пецярбург паляцеў ліст, у якім паведамлялася пра «маскоўскую змову». Трубяцкі, атрымаўшы яго, па словах С.Мураўёва-Апостала, адразу ж паехаў у Маскву, каб «мясцовым сябрам сказаць, што мы не згаджаемся на іх прапанову, і ўстрымаць іх ад выканання яе». Забойства імператара ў выглядзе дуэлі паміж

ім і Якушкіным не адбылося, бо тайнае таварыства не змагло бы далей выкарыстаць гэтае ў сваіх далейшых планах пераўтварэнняў у Расіі [271, с.14-15; 95, с.103; 257, т.1, с.176-177; 43, с.184; 381, с.275,278; 62, т.3, с.73; 62, т.4, с.112, 256; 536, с.389-390].

Адным з першых планаў паўстання дзекабрыстаў была так званая «бабруйская задума» 1823 г., калі ў Бабруйскай крэпасці стаяла 9-я дывізія 3-га пяхотнага корпуса І-й рускай арміі. Задумалі план С.І.Мураўёў-Апостал і М.П.Бястужаў-Румін, кіраўнікі Васількаўскай управы Паўднёвага таварыства. Да іх далучыліся І.Павала-Швяйкоўскі і В.Нораў. Выступіць павінны былі чатыры палкі, у якіх служылі названыя дзекабрысты: Чарнігаўскі, Палтаўскі, Алексапольскі пяхотныя і 13-ы Егерскі. Аўтары плана мелі намер падняць палкі ў час царскага агляда войск. Яны вырашылі з дапамогаю маскоўскіх дзекабрыстаў ноччу арыштаваць імператара, прымусіць яго падпісаць адрачэнне і трымаць пад вартай. Разлічвалі, што адначасова з гэтым актам паўстануць палкі, якія адразу ж пойдуць на Маскву, далучаючы па шляху іншыя войскі. У крэпасці застанецца толькі гарнізон. Па «бабруйскай задуме» выступленне ў Бабруйскай цытадэлі было б сігналам для паўстання не толькі ў Маскве, але таксама ў Пецярбурзе і ў 2-ой арміі.

Каб ажыццявіць задуманае, бабруйскім змоўшчыкам патрэбна была падтрымка кіраўніцтва Паўднёвага і Паўночнага таварystваў, а таксама маскоўскага філіяла апошняга. З поўдня ніхто не прыехаў, а з атрыманага адказа на свой ліст С.Мураўёў і яго сябры зразумелі, што «общество в сем годе ещё не намерено действовать». Галоўнай прычынай гэтага было тое, што паўднёўцы лічылі месцам паўстання Пецярбург — сэрца ўлады, а не правінцыю, якая магла толькі падтрымаць сталіцу, дзе знаходзіліся міністэрства і кіраўніцтва, цар і вялікія князі. Стрымлівала П.Песцеля, В.Давыдава, С.Валконскага і іншых на поўдні і тое, што па «бабруйскай задуме» не быў зразумелым лёс імператара («никто не станет действовать, покуда существует государь»).

У Маскву летам 1823 г. ездзіў сам М.Бястужаў. Ён сустракаўся з І.Фанвізіным і І.Якушкіным, але тыя не ўспрынялі яго сур'ёзна, і таму пра «бабруйскую задуму» ён ім не гаварыў. У верасні М.Бястужаў быў у Вільні і сустрэўся тут з Канстанцінам Радзівілам, членам Літоўскай правінцыяльнай Рады польскага Патрыятычнага таварыства. Паездка нічога не дала для вырашэння плана паўстання ў Бабруйску, але ўнесла

значны ўклад у руска-польскі рэвалюцыйны саюз. У Пецярбург вестку аб «бабруйскай задуме» прывёз М.Мураўёў-Апостал, які быў у брата ў крэпасці. К.Рылееў, напрыклад, аб ім ведаў.

У пачатку верасня ў Бабруйск прыехала корпуснае начальства (генерал Рот, начальнік штаба Гарчакоў), а за імі — вялікі князь Мікалай Паўлавіч. 12 верасня прыбыў Аляксандр I, а ранкам трынаццатага перад ім прайшлі ўсе палкі. Паўстанне не адбылося, бо, не атрымаўшы падтрымкі, С.Мураўёў і яго сябры не знайшлі ў сабе моцы на рашучыя меры. «Бабруйская задума» была загнана ўнутр, але яна прымусіла спазнаць неабходнасць сувязі паўстання ў правінцыі з цэнтрам, аб'яднання двух рэвалюцыйных таварыстваў (Паўночнага і Паўднёвага) і выпрацоўкі сумеснага плана дзейнасці [423, с.31-36; 468; 470].

У 1825 г. была створана Магілёўская ўправа (або поўуправа) Паўночнага таварыства. Яе ініцыятарам быў Міхаіл Нарышкін, палкоўнік Таруцінскага пяхотнага палка. Прыняўшы ў тайную арганізацыю графа В.А.Мусіна-Пушкіна і П.П.Цітова, ён даручыў ім арганізаваць управу ў Магілёве, дзе яны служылі ад'ютантамі галоўнакамандуючага I-й арміі генерала Ф.Сакена. Цітоў прыняў у Магілёўскую ўправу падпалкоўніка кватэрмайстарскай часткі А.Н.Гвоздева і яго саслужыўца паручыка А.А.Жамчужнікава. Ён расказваў ім аб тым, што таварыства хоча даць дзяржаве канстытуцыю «падобна Амерыканскім штатам», вызваліць сялян ад прыгоннага гнёту, з падначаленымі абыходзіцца чалавекалюбна, а з начальнікамі «быть подчительно». Мусін-Пушкін быў стрыечным братам Нарышкіна і ведаў не менш, чым Цітоў: канстытуцыя Н.Мураўёва, здаецца нам, была яму добра знаёма. Мусін-Пушкін прыняў ва ўправу Ф.Л.Брэверна, штаб-ротмістра Коннай гвардыі і ад'ютанта Сакена. Управа ў Магілёве была арганізавана з мэтаю пашырэння тайнай арганізацыі і далучэння да яе новых членаў. Але галоўным, відаць, з'яўлялася нейтралізацыя штаба 1-й арміі падчас паўстання дзекабрыстаў і пасылка ў Маскву паведамленняў аб падзеях у 1-й арміі — нездарма ж ва ўправе былі тры ад'ютанты галоўнакамандуючага і два кватэрмайстры. Калі прыйшлі снежаньскія дні, і ў Пецярбургу, а потым і на Украіне адбыліся паўстанні, «магілёўскія» дзекабрысты нічога актыўнага не прыдпрынялі. Цітоў, па яго асабістаму прызнанню, «чакаў нечага нечаканага», «ён думаў: «Што робіцца ў 2-й арміі?», але так нічога і не зрабіў, як і іншыя яго сябры па ўправе. Пасля пагрому паўстання Чарнігаўскага палка пачаліся

арышты, і Магілёўская ўправа скончыла сваё існаванне [423, с.36-40]. У 1822 — 1826 гг. у часцях асобнага Літоўскага корпуса існавала патаемная вайсковая арганізацыя філамацкага тыпу пад назваю «Таварыства сяброў» або «*Таварыства гонару*». Заснавана яна была штабс-ротмістрам А.Хэлміцкім і паручыкам Ю.Валодзькам у м.Дзярэчын сярод афіцэраў Валынскага ўланскага палка. У Таварыства сяброў (ТС) уваходзілі паручыкі 29-й конна-артылерыйскай роты Гярловіч і Літоўскага ўланскага палка Валодзька-2, таго ж палка разжалаваны з карнетаў у радавыя Э.Ратыньскі, карнет Татарскага ўланскага палка Ястржэмскі і іншыя — усяго каля 25 чалавек. Сакратаром ТС быў Касаржэўскі. Статут, ці «Правілы сяброў», напісалі заснавальнікі. Адпаведна яму структура ТС была дзвюхступеннай, і ніжэйшая захавала масонскі рытуал прыёма новых сяброў: яны давалі клятву на перакрэшчаных саблях не раскрываць тайну таварыства. Падчас першага следства над удзельнікамі ТС зімою 1826 г., праводзімага камандзірам брыгады генерал-маёрам Г.Ігельстромам, бацькай дзекабрыста К.Г.Ігельстрома, удалося ліквідаваць паперы. Гэта дазволіла падчас другога следства ў ваенна-судовай камісіі пры корпуснай кватэры ў жніўні 1826 г. зняць з таварыства абвінавачванні ў палітычнай дзейнасці і падкрэсліць свае манархічныя сімпатыі, палітычную лаяльнасць і благанадзейнасць. Згодна з напісаным Хэлміцкім для следства Статутам (12 артыкулаў) галоўнымі абавязкамі сябраў таварыства былі вернасць імператару, выкананне загадаў начальства і распараджэнняў урада, адхіленне сяброў ад дурных учынкаў і звычак, добрыя адносіны да падпарадкаваных ім салдат, умацавання сяброўства паміж афіцэрамі і ахова гонару іншага, як свайго, удасканальванне сябе шляхам напісання сатырычных твораў, з якімі трэба выступіць на паседжанні таварыства. У верасні 1826 г. усе арыштаваныя сябры былі вызвалены «за недахопам улік». Але аб палітычным характару дзейнасці гавораць кантакты ТС: з масонамі ложы «Вузел еднасці на Усходзе Навагрудка», братамі якой былі 9 сяброў; з філаматамі праз юнкера Д.Пясецкага і А.Міцкевіча; з «Ваеннымі сябрамі» праз А.Хэлміцкага-Ю.Валодзьку і К.Ігельстрома-А.Вягеліна, а таксама праз карнета Ю.Маслоўскага. Падчас выступлення Літоўскага піянернага батальёна К.Ігельстром спадзяваўся на падтрымку палкоў 2 брыгады, дзе дзейнічала ТС.

Летам 1825 г. у Літоўскім асобным корпусе, раскватэраваным на тэрыторыі Гродзенскай губерні, афармілася патаемная рэвалюцыйная арганізацыя «Ваенныя сябры». Сваімі мэтамі яна была падобна да ранніх дзекабрысцкіх таварыстваў (Саюза вызвалення або Саюза благадзенства), што разумела і царская адміністрацыя Сібіры, калі даносіла аб паводзінах членаў «Ваенных сяброў», дык заносіла іх у «Спіс асоб, дакранёных да здарэння 1825 года». Таварыства ваенных сяброў было арганізавана па ініцыятыве былога філамата Міхаіла Іванавіча Рукевіча. Актыўную ролю адыгралі капітан Літоўскага піянернага батальёна Канстанцін Густававіч Ігельстром і яго стрыечны брат, паручык гэтага ж батальёну Аляксандр Іванавіч Вягелін. Начальнікам (прэзідэнтам) таварыства стаў падпаручык Нясвіжскага карабінернага палка Пётр Іванавіч Гофман.

Першую ступень таварыства, яго камітэт, склалі пяць ваенных: радавы А.М.Угрычыч-Трэбінскі, падпаручык Самагіцкага грэнадзёрскага палка Э.А.Пятроўскі і тры вышэйназваныя. Усе яны павінны былі распаўсюджваць тайнае таварыства, сачыць за яго бяспекай і канспірацыяй, не шкадуючы моцы і сродкаў, «кахання, сяброўства і самога сваяцтва» і жыцця. Другая ступень («Таварыства згоды») складалася з грамадскіх асобаў: канцылярыст Беластоцкага галоўнага суда Л.І.Вронскі, служачы Беластоцкага дваранскага сходу А.М.Грынявіцкі, шляхціц І.С.Высоцкі, настаўнік гімназіі Ф.В.Ардынскі. Яны займаліся «асветаю, паляпшеннем ума і сэрца», павінны былі мець прыкладныя паводзіны згодна з «Маральнымі меркаваннямі», прынятымі таварыствам. Член «Таварыства згоды» таксама захоўваў канспірацыю і ахвяраваў сваё жыццё на справу патаемнай арганізацыі. Трэцяй ступенню «Ваенных сяброў» стала былое самастойнае таварыства вучняў Беластоцкай гімназіі — «Заране». Яе члены Л.І.Вронскі (начальнік), Ф.Баркоўскі, К.В.Ардынскі, А.Д.Яневіч мелі наступныя абавязкі: «асвета разума, паляпшэнне сэрца і ўмацаванне цела... абавязаны практыкавацца ў гімнастычных занятках, такіх, як: страляць у цэль, фехтаваць, ездзіць вярхом і іншае». Сябры кожнай з трох ступеняў мелі сваю клятву, збіралі бібліятэку, рабілі грашовыя «складкі» (звычайныя, добраахвотныя, надзвычайныя) і выконвалі «Маральныя меркаванні». Статут (Правілы) «Ваенных сяброў» быў зацверджаны ў канцы чэрвеня 1825 года. Мэтаю таварыства лічылася «асвета сябе і іншых, узаемная дапамога і дабро агульнае» (са слоў Угрычыча-Трэбінскага). На следстве Гофман

скажа, што ў будучым «таварыства гэтае ператворана было бы да іншых мэтаў». Пятроўскі на следстве пакажа пэўней: «Вольнасць». Тады пад гэтым словам разумелі барацьбу супраць самадзяржаўя, прыгоннага права, палітычнай бяспраўнасці і д.п. [гл.: 423, с.43-50; 433; 441; 443; 462; 453; 463; 472; 475; 478; 481; 489; 500; 516-518].

Таварыства «Ваенных сяброў» знаходзілася на стадыі фарміравання, калі было вымушана выступіць, выкарыстоўваючы раптоўную смерць Аляксандра І. Дваццаць чацвёртага снежня Літоўскі піянерны батальён, фурштацкая і пантонная каманды пастроіліся ў карэ ў м.Браньск пад Беластокам. У наяўнасці былі 1020 чалавек з 1109 па спісу. Ігельстром і іншыя ротныя камандзіры перашкаджалі чытаць прысягу, салдаты крычалі «Няхай жыве Канстанцін!», а потым былі выведзены ротнымі з месца агляда. Такім чынам, прысяга новаму імператару Мікалаю І была сарвана. Ваенныя сябры спрабавалі падняць на паўстанне Самагіцкі, Беластоцкі і Луцкі палкі, але гэта не ўдалося. *25* снежня батальён прыняў прысягу, як даносіў начальнік штаба корпуса М.С.Вельямінаў, «найлепшым парадкам». Пачаліся арышты. Першымі былі зняволены Ігельстром, Вягелін, Ваяховіч. У Беластоку працавала следчая камісія. З 21 студзеня 1826 г. у палацы Браніцкіх яна за 9 месяцаў дапрасіла больш за 140 чалавек. У 1827 г. Вягелін, Рукевіч, Ігельстром былі асуджаны на 10 гадоў катаржных прац у Сібіры з далейшым там пасяленнем. На 5 гадоў катаргі і пасяленне ў Сібіры выслалі Грынявіцкага, Вронскага, Высоцкага, двух братоў Ардынскіх. У арыштанцкія роты Бабруйскай крэпасці былі прыгавораны: Гофман, Пятроўскі, М.Ф.Вільканец, Ваяховіч — кожны на 6 месяцаў; Баркоўскі і Яневіч — на 4 месяцы; Угрычыч-Трэбінскі — на 5 гадоў [гл.: 423, с.40-43; 499; 675, с.27-32].

У Беларусі планаваўся першы праект паўстання дзекабрыстаў, апошняе рэха дзекабрысцкага руху прагучала таксама тут. Як гром сярод яснага неба, успыхнула выступленне ў Бабруйску. І.Гарбачэўскі ў сваіх «Запісках» успамінаў: «Сябры Славянскага таварыства, якія служаць у Палтаўскім палку, паважаючы свяшчэнным абавязкам выканаць слова, дадзенае ў час далучэння да Паўднёвага таварыства, і думаючы, што абурэнне Чарнігаўскага палка ёсць знак да ўсеагульнага паўстання, хацелі неадкладна трымацца цягі гэтых пачуццяў». Віцебскі дзекабрыст меў на ўвазе прапаршчыка Сцяпана Трусава

і паручыка Емяльяна Троцкага. У пачатку лютага 1826 г. новы камандзір ІІалтаўскага палка Лявіцкі-Лазніцкі праводзіў агляд. С.Трусаў агаліў шпагу, выбег наперад 1-га батальёна і сказаў прамову, у якой «поносил государя императора и всю августейшую фамилию и взывал батальон на бунт и называл государя тираном...». Штабс-капітан Дамброўскі загадаў замаўчаць, але Сцяпан не стрымаў прамовы і паўтарыў яе 1-му ўзводу. Учынак Трусава навёў на ўсіх нейкую здранцвеласць, і салдаты ўсе гатовы былі падняцца на паўстанне. «Можа быць,— пісаў Гарбачэўскі, — патрэбен быў адзін чалавек, адна хвіліна — і Бабруйск быў бы ў руках таварыства, але нейкая нябачная сіла трымала салдат і афіцэраў, як прыкаваных да аднаго месца». Але, акрамя Трусава, іншага чалавека не аказалася, хаця з членаў патаемнай арганізацыі ў Палтаўскім палку ён быў не адзін. М.Бястужаў-Румін і В.К.Тызенгаўзэн яшчэ да гэтага часу былі арыштаваны. Я.А.Драгаманаў і Е.Троцкі знаходзіліся ў шпіталі (з апошнім Трусаў меў размову напярэдадні свайго ўчынка). А.В.Усоўскага ў палку не было — ён пайшоў у адпачынак. Так і здарылася, што Трусаў застаўся адзін без падтрымкі і, нягледзячы на гэта, даказаў, што і «адзін у полі — ваяр». Судзіла Трусава (разам з Троцкім) ваенна-судовая камісія. Яна пастанавіла пазбавіць абодвух дзекабрыстаў чыноў, дваранства і саслаць у Бабруйскую крэпасць на працу [гл.: 423, с.50-54; 446].

Выступленне Трусава не было адарвана ад іншых выбухаў дзекабрысцкага руху. Яго трэба лічыць звяном у сістэме паўднёвага паўстання: спачатку «бабруйская задума» 1823 г., затым у перыяд паўстання Чарнігаўскага палка Андрэй Барысаў на сходзе славян адстойваў думку аб Бабруйску як цэнтру паўстання, быў выпрацаваны план пахода на Бабруйск, дзе трэба было ўмацавацца, а пры спрыяльных умовах ісці на Маскву.

Не адыграўшы пазітыўнай ролі ў руху дзекабрыстаў, Бабруйская крэпасць стала для некаторых сяброў патаемных таварыстваў месцам зняволення. У «турме на Бярэзіне» сядзелі дзекабрысты: І.Г.Бурцаў (03. — 19.07.1826), М.А.Бадзіска (21.07.1826 — 21.07.1831), В.С.Нораў (12.10.1827 — 03.1835), В.А.Дзіваў (12.10.1827 — 27.12.1839), Д.Ф.Кейзер (07.1826 — ?), А.К.Берсцель (21.07.1826 — 07.1827), Я.І.Апостал-Кегіч (6 месяцаў), А.М.Гвоздзеў (4 месяцы 1827), С.П. Трусаў (26.02.1826 — ?), Е.М.Троцкі (1 год). За ўдзел у паўстанні Чарнігаўскага палка ў казематах крэпасці апынуліся на 6 месяцаў А.П.Мяшчэрскі, А.Д.Белялюбскі, У.М.Рыбакоўскі, В.Я.Кандыроў. За захоўванне

«Палярнай зоркі»ў 1826 г. у крэпасць быў сасланы на год брат дзекабрыстаў Павел Бястужаў. Па прысуду Беластоцкага ваеннага суда сюды на 6 месяцаў былі сасланы сябры Таварыства ваенных сяброў П.І.Гофман, Э.А.Пятроўскі, М.Ф.Вільканец, П.П.Ваяховіч, а іх кіраўнік А.М.Угрычыч-Трэбінскі — на 5 гадоў (27.05.1827 — 7.06.1832). У 1827 г. у Бабруйскай крэпасці апынуліся сябры таварыства «Заран»: Ф.Ляховіч (на 6 гадоў), Ф.К.Баркоўскі (на 4 месяцы), А.Д.Яневіч (на 4 месяцы) [423, с.84-95; 431; 462; 469; 475; 481; 489; 502; 514; 516].

Па загаду галоўнакамандуючага 1-й арміі Ф.Сакена ад 18.(30).01.1826 г. у Магілёве працавала ваенна-судовая камісія па справах дзекабрыстаў — удзельнікаў паўстання Чарнігаўскага палка: (Е.І.Апостал-Кегіч, А.Д.Белялюбскі, А.А.Быстрыцкі, А.С.Вайніловіч, В.Я.Кандыроў, А.Е.Мазалеўскі, К.К.Маеўскі, А.П.Мяшчэрскі, В.М.Пецін, У.М.Рыбакоўскі, В.М.Салаўёў, В.В.Сізінеўскі, І.І.Сухінаў), «падазроных ва ўдзеле ў мяцяжу» (Д.А.Малчанаў, Лебедзеў, А.Ф.Фурман), а таксама па справах забітых у час паўстання (І.І.Мураўёў-Апостал, М.А.Шчыпіла) і застрэліўшагася А.Д.Кузьміна. Дакументы следчага справаводства камісіі не захаваліся і дайшлі да нас толькі ў дакладзе аўдзітарскага дэпартамента ваеннага міністэрства ад 10.07.1826 г., апублікаванага ў 6 томе зборніка «Восстание декабристов. Материалы и документы» [гл.: 62, т.6; 423, с.76-84; 434; 512].

Праблема аб ролі дзекабрыстаў у жыцці народаў Расіі ўключае і вывучэнне іх поглядаў на нацыянальнае пытанне, якое знайшло адлюстраванне ў канстытуцыйных дакументах. Як слушна пісаў А.Ф.Смірноў: «У адносінах дзекабрыстаў да нацыянальнай праблемы трэба таксама адрозніваць агульнатэарэтычную пастаноўку імі нацыянальнага пытання і практыку руха, які адлюстроўваў неразвітасць сацыяльных і нацыянальных рухаў у той час (выключаючы Польшчу)» [258, с.17; 324, с.67-68; 326, с.53]. На агульнатэарэтычным узроўні мы павінны адзначыць жаданне дваранскіх рэвалюцыянераў, з аднаго боку, ліквідаваць нацыянальныя, рэлігійныя, расавыя прывілеі і асаблівыя правы, з другога боку, распаўсюдзіць свае прагрэсіўныя пераўтварэнні на ўсе народы Расійскай імперыі без выключэнняў. На практычным узроўні нельга не заўважыць, што канстытуцыйныя праекты недастаткова ўлічваюць нацыянальную самабытнасць рэгіёнаў Расіі, што прапаноўваемыя тэрытарыяльна-адміністрацыйныя падзелы

будучай Расіі больш адпавядаюць вялікарускаму народу, і пры вызначэнні межаў прымаліся ва ўвагу перш за ўсё геаграфічныя і эканамічныя ўмовы, а таксама стратэгічныя інтарэсы велікарусаў.

Спынемся больш падрабязней на «практыцы руху», а канкрэтна гаворачы, на тым, якое месца займае Беларусь у канстытуцыйных праектах Паўла Песцеля, і Мікіты Мураўёва. Песцель вырашаў нацыянальнае пытанне, зыходзячы з двух супярэчлівых прынцыпаў: «права Народнасці» («право Народности») і «права Выгоднасці» («право благоудобства»). «Права Народнасці, — пісаў Песцель, — гэта жаданне народаў, падуладных Вялікай Дзяржаве і паходзячых не ад Пануючага племені, да асабістай незалежнасці і асобнаму палітычнаму існаванню». На яго думку, гэта права «існуе ў сапраўднасці для тых толькі народаў, якія карыстаюцца ім, маюць магчымасць яго захаваць», якія «змогуць самастойна палітычнай незалежнасцю карыстацца». Інакш «малыя ж народы» стануць здабычаю суседняй моцнай дзяржавы і будуць «заўсёды месцам ваенных дзеянняў, разарэнняў і гібельных бяздзеянняў усякага роду». Да малых народаў, якія будуць пазбаўлены «права Народнасці», гэта значыць дзяржаўнасці, Песцель аднёс 13 частак тагачаснай Расійскай імперыі: Фінляндыю (якая дарэчы, ужо мела свой сейм), Прыбалтыку (якая валодае асаблівым эканамічным статусам), Маларосію, Крым, Каўказ і іншыя (у іх ліку Беларусь — тэрыторыя рускага захопу пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай). Усе яны абвяшчаліся «на вечныя часы заставацца маючыя ў Складзе Расійскай Дзяржавы».

Беларускае пытанне для Песцеля не існавала. Ягоныя думкі (а таксама сяброў Паўднёвага таварыства, якое прыняло «Рускую Праўду» як сваю палітычную праграму) наконт беларускіх зямель (Белай Русі і Літвы) мы можам выдзеліць з адносін да Польшчы. Яе ў склад будучай федэрацыйнай Расіі не ўключалі, лічылі, што «па праву Народнасці павінна Расія дараваць Польшчы незалежнае існаванне. Але канчатковае вызначэнне межаў паміж Расіяй і Польшчай павінна быць прадстаўлена правілу Выгоднасці для Расіі, і павінна гэтае самастойнае аднаўленне Польшчы ўладкавана быць на такіх пачатках і ўмовах, якія б у поўнай меры забяспечвалі бы Расію на будучае наконт усялякіх дзеянняў, якія маглі б быць супраціў цвёрдай яе бяспекі або дасканаламу яе спакою».

Пытанне аб межах якраз тычыцца беларускіх зямель. На дзвюх амаль ідэнтычных картах, якія былі прыкладзены да

«Рускай Праўды», яны падзелены на дзве часткі: адна ўвайшла ў склад Расійскай федэрацыі, другая — за яе межамі, без вызначэння дзяржаўнай прыналежнасці. «Расійская» частка тэрыторыі Беларусі (тагачасныя Магілёўская і Віцебская губерні) знаходзілася ў Вяршыннай вобласці з галоўным горадам Смаленскам. Віленская, Мінская і Гродзенская губерні апынуліся за межамі Расіі, але ў апісанні да карты Песцель пісаў, што да польскай дзяржавы адыдуць Беластоцкая вобласць, частка Віленскай, а таксама Гродзенская, Мінская і Валынская губерні. Другі варыянт «Рускай Праўды» быў напісаны ў 1824 г., а перамовы аб межах паміж Польшчай і Расіяй будуць праходзіць у 1824 і 1825 гадах (аб чым размова будзе ніжэй) [64, т.7, с.121-126,130-131; 33, с.66-67].

Другі прынцып Песцеля, «Права Выгоднасці», азначаў імкненне Вялікай Дзяржавы да ўсталявання моцных межаў з мэтаю бяспекі і да таго, каб «сілы маленькіх народаў, яе абкружаючых, памнажалі бы асабістыя яе сілы, а не сілы якой-небудзь іншай, суседняй вялікай дзяржавы...». Чацвёрты раздзел «Рускай Праўды» насіў назву «Расія ёсць Дзяржава Адзіная і Непадзельная». Песцель раіў «малым народам» злучыцца «духам і грамадствам» з вялікай дзяржавай і «цалкам зліць сваю народнасць з народнасцю пануючага народа, ствараючы з ім толькі адзіны народ...». Усе павінны былі называцца рускімі, на цэлай прасторы Расійскай Дзяржавы панавала бы руская мова, што палегчыла бы зносіны паміж народамі.

Сучасны беларускі даследчык А.П.Грыцкевіч, прааналізаваўшы канстытуцыйныя праекты Песцеля і Мураўёва, зрабіў выснову, што на іх «ляжыць пячаць дваранскай абмежаванасці і вялікадзяржаўнага рускага шавінізму». В.М.Чарапіца, пагадзіўшыся з першай часткай выказвання, выступіў супраць другой і паказаў, што Песцель выказаў думку аб рэферэндуме сярод насельніцтва спрэчных беларускіх тэрыторыяў («самі вызначацца, да якога народа пажадаюць належаць»). Дык ці быў Песцель шавіністам — прыхільнікам рускага нацыяналізму і прапаведнікам выключнасці рускага народа? Факты пацвярджаюць, што Песцель адмаўляў беларусам самастойнай дзяржаўнасці (усходніх далучаў да Расіі, заходніх пагаджаўся аддаць палякам), далучаных да Расіі аб'ядноўваў з вялікарусамі (нават ад сваёй назвы беларускі народ павінен быў адрачыся), русіфікаваў, прымусіў бы размаўляць па-руску. Ва ўсім гэтым дзекабрыст Песцель змыкаўся з прыхільнікамі

афіцыйнага шавінізму. Але ў адрозненне ад іх ён не распаляў нацыянальнай варожасці і нянавісці, наадварот, сцвярджаў, што ўсе народы падобна рускім будуць валодаць аднолькавымі правамі і абавязкамі (палітычнымі, грамадзянскімі і асабістымі), ніхто не будзе мець пераваг або прывілеяў [64, т.7, с.121-122,126,149,181; 82, с.187; 418, с.80,82; 504].

Паколькі значную колькасць насельніцтва Беларусі ў час дзекабрыстаў складалі яўрэі, дык неабходна звярнуць увагу на вырашэнне Песцелем яўрэйскага пытання. Ён прапанаваў сабраць яўрэяў, якія жывуць у беларускіх, літоўскіх і маларасійскіх губернях (звыш 2 млн. чал.) у адзін зборны пункт, узброіць і дапамагчы войскам, каб яны прайшлі праз Еўрапейскую Турцыю (Балканы) у Азіяцкую і там стварылі сваю Яўрэйскую Дзяржаву. Гэта не была бліжэйшая задача для Часовага Урада, які павінен быў заняцца «ліквідаваннем шкоднага для хрысціян уплыву цеснай сувязі, якую яўрэі паміж сабою маюць або супраць хрысціян накіраванай і ад усіх астатніх грамадзян іх цалкам абмяжоўваючай» [64, т.7, с.146,148].

Мікіта Мураўёў спецыяльна нацыянальным пытаннем не займаўся, але нейкія прынцыповыя погляды праглядаюцца ў ягоным праекце стварэння федэрацыйнай Расіі паводле ўзору Паўночна-Амерыканскіх штатаў. Федэрацыйныя адзінкі былі названы дзяржавамі. Беларускія землі ўвайшлі ў дзве дзяржавы: Заходнюю са сталіцай у Вільні (жыхароў 1325000 чал. муж. пола) і Дняпроўскую са сталіцай у Смаленску (2800000 чал. муж. пола). Як бачым, Мураўёў спрабаваў улічыць асаблівасці рассялення беларускага этнасу, але трэба пагадзіцца з выдатным дзекабрыстазнаўцам М.М.Дружыніным, які сцвярджае, што «М.Мураўёў вельмі далёкі ад думкі пабудаваць Саюзную дзяржаву на дамове асобных нацыянальнасцяў. Прынцыпіяльна ён зыходзіць з вялікадзяржаўнай кропкі погляду: Расійская імперыя змешвае і асімілірue ў сваім складзе розныя падпарадкаваныя народнасці». У аснову будучай Расійскай краіны Мураўёў паклаў не федэрацыю самастойных нацыянальнасцяў, а «натуральныя» гаспадарчыя комплексы. Ён кіраваўся не правам нацый на самавызначэнне, а ідэяй вольнага эканамічнага развіцця Расійскай дзяржавы.

«Дзяржавы» Мураўёў называў самастойнымі краінамі, але па сутнасці думаў пра іх як пра падпарадкаваныя правінцыі. Красамоўна гучыць назва першага, віцебска-мінскага варыянта, канстытуцыйнага праекта: «Предположение для начертания

Устава положительного образования, когда Е.И.В. благоугодно будет с помощью Всевышнего учредить **Славяно-Росскую империю»**. Польшча ў яе не ўключана, бо, верагодна, Мураўёў планаваў пакінуць уласную унію паміж Каралеўствам Польскім і Расійскай імперыяй.

Канстытуцыя Мураўёва аднастайна і дэтальна рэгламентавала ўнутраны лад «дзяржавы» і гэтым падрывала важны прынцып федэрацыйнай краіны — права асобнай дзяржавы самастойна распараджацца сваім лёсам і незалежна арганізоўваць сваю палітычную сістэму (як гэта было ў паўночнаамерыканскім саюзе, на ўзор якога раўняўся Мураўёў). Кожная «дзяржава» мела бы заканадаўчую і выканаўчую ўлады. Першая здзяйснялася бы праз Заканадаўчы сход: Заходні — 130 выбарных, Дняпроўскі — 280. Ён падзяляўся на Палату выбарных, якую выбіраюць на адзін год грамадзяне дзяржавы, і Дзяржаўную думу (у Заходняй дзяржаве — 43 сябры, у Дняпроўскай — 93), якую выбіраюць тыя ж выбаршчыкі на 4 гады. Выканаўчая ўлада даручалася Дзяржаўнаму Правіцелю, яго Намесніку і Радзе. Дзяржаўны Правіцель выбіраўся Народным вярхоўным веча (агульнаімперскім органам) са спісу кандыдатаў, прадстаўленых Заканадаўчым сходам дзяржавы на тры гады, і зацвярджаўся Імператарам. Такім чынам, «дзяржава» была пазбаўлена права самастойна замяшчаць вышэйшую пасаду свайго ўрада. Намеснік Правіцеля і Радцы (для Заходняй дзяржавы 5 чал., для Дняпроўскай — 9) выбіраліся кожныя тры гады на сумесным паседжанні Палаты выбарных і думы.

Кампетэнцыі дзяржаўных улад былі абмежаваныя і тычыліся толькі ўнутранага жыцця «дзяржавы». Заканадаўчы Сход не меў права: заключаць саюз, дамову або трактат не толькі з замежнымі дзяржавамі, але і з іншай «дзяржаваю» Расійскага Саюзу; яму забаранялася «адпраўляць паслоў і дэпутацыі ў Замежныя Краіны пад якой-небудзь зачэпкай і ўваходзіць у якія-небудзь зносіны з Замежнымі Урадамі»; не мог заключаць мір або аб'яўляць вайну; вырабляць манету; утрымліваць у час спакою армію; накладаць падаткі на ўвоз тавараў без згоды Народнага веча. Такім чынам, урад «дзяржавы» быў пазбаўлены важнейшых функцый, увасабляючых самастойнае дзяржаўнае існаванне. Меркавалася, відаць, што інтарэсы «дзяржавы» абароняць яе прадстаўнікі ў Народным веча: ад Заходняй — 46 чал., ад Дняпроўскай — 58.

Больш уважліва да асаблівасцяў нацыянальных ускраін ставіўся Мураўёў у другім варыянце сваёй канстытуцыі. Заходняя дзяржава пашырыла сваю тэрыторыю за кошт Дняпроўскай і стала налічваць 2125000 жыхароў муж. пола, а тая — 2600000 жыхароў. Саюзная краіна Мураўёва і цяпер не стала федэрацыяй народнасцяў. «Дзяржавы» з фармальна-прававога погляду канчаткова ператварыліся ў складальныя часткі адзінай унітарнай краіны. Пра гэта гавораць нават замененыя тэрміны: замест «заканадаўчая ўлада дзяржавы» напісана «кіруючая ўлада дзяржавы», замест «Заканадаўчы Сход дзяржавы» — «кіруючы», або «ўрадавы сход». Былыя 79 і 80 артыкулы аб узаемаадносінах «дзяржаў» у другім варыянце канстытуцыі выключаны. Волю асобных «дзяржаў» выказвала Вярхоўная Дума Народнага Веча, у якую ўваходзілі па 3 грамадзяніны ад кожнай «дзяржавы», выбраныя на сумесным паседжанні Палаты выбраных і Дзяржаўнай Думы. Менавіта Народнаму Веча належалі ўсе асноўныя функцыі дзяржаўнага кіравання [106, с.151-152, 160,173,176,181,182; 171, с.253,257,271-279,283-288].

Вышэй мы адзначалі, як успрынялі дзекабрысты ідэю Аляксандра I аб вяртанні беларускіх зямель Каралеўству Польскаму. Зусім інакш рэагавалі на спробы рускага цара (і аднačасова караля польскага) падтрымаць польскую народнасць і дзяржаўнасць у былых межах польскія шляхецкія рэвалюцыянеры. Маёр Валерыян Лукасінскі прапанаваў злучыць ідэю польскай народнасці з масонскай формаю і стварыў напоўпатаемную арганізацыю Нацыянальнае Масонства (іншыя назвы: Патрыятычны або Нацыянальны Саюз). Яна як бы адпавядала афіцыйнаму жаданню Аляксандра I, а таму не была, на погляд стваральнікаў, незаконнай і рэвалюцыйнай. Яе можна, наадварот, лічыць «дапаможным інстытутам» адраджэнцкай польскай палітыкі Аляксандра I. Лукасінскі ставіў мэтаю злучыць народ і войска (у першую чаргу на тэрыторыі былога ВКЛ) да прысяпшэння памкненняў рускага імператара і польскага караля або, на выпадак яго адмовы, да атрымання таго ж уласнымі сіламі [21; 542, т.1, с.234-235].

Нацыянальнае масонства праіснавала з вясны 1819 г. па жнівень 1820 г. Яно мела наступную структуру: Варшаўская ложа (галоўная) называлася ложай-мацерай, астатнія падзяляліся на два разрады (ступені): першы (вышэйшы) і другі (ніжэйшы, або гміны). Усе ложы падпарадкоўваліся Вярхоўнаму

капітулу на чале з «бачным начальнікам», які быў намеснікам «начальніка нябачнага». Аўтар «Запіскі аб прайшоўшым следстве», якая захавалася ў архіве, адзначыў, што Нацыянальнае масонства не мела «ні малейшага сляда масонства» і «належыць ужо выключна да таварыства Патрыятычным названым». Паколькі сяброў яго вельмі цікавіла тэрыторыя былога ВКЛ, дык зразумела іх імкненне стварыць тут свае аддзяленні. Лукасінскі накіраваў у Вільна ліцвіна Юзафа Гружэўскага, а пазней і былога палкоўніка А.Аборскага. Вакол названых аб'ядналіся брат Гружэўскага Станіслаў, майстар правінцыяльнай масонскай ложы Міхал Ромер (Рюмер), Ян Белазор. Яны прынялі ў таварыства Б.Мікуліча, Даўгялу, князя Канстанціна Радзівіла, графа Станіслава Солтана, Яна Вайніловіча, Тамаша Зана. Мэтаю Нацыянальнага масонства было «аднаўленне Польшчы ў магчыма болей шырокіх межах з захаваннем манархічнага пачатка». У 4 главе рытуала на пытанне: «Як шырока твая ложа?» адзін з назіральнікаў павінен быў адказваць: «Высокія горы, два вялікія моры і дзве ракі служаць ёй межамі». Па прызнанню сяброў таварыства, гэта азначала граніцы былой Рэчы Паспалітай з уключэннем тэрыторый ВКЛ. Аўтар вышэйназванай «Запіскі...» пісаў, што бачна «відавочнае імкненне да ўзрушэння сучаснага палітычнага існавання зямель, якія некалі складалі Польшчу, і злучэнне іх у набытак аднаго незалежнага народа» [542, т.1, с.246-249; 59, с.292-293; 302, ф.ВУА, спр.719, а.10-18].

Закрыццё Нацыянальнага масонства пасля вядомага ўказа аб забароне масонскіх і іншых тайных таварystваў на тэрыторыі Каралеўства Польскага было фіктыўным, бо 1 мая 1821 г. на яго падставе было створана Патрыятычнае таварыства, якое дзейнічала да 1826 г. на тэрыторыі Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны з мэтаю адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Статут Патрыятычнага таварыства складаўся з 4 раздзелаў: «Найвышэйшая ўлада», «Аб правінцыях», «Аб акругах», «Аб стварэнні гмін» — усяго 44 параграфы ў захаваўшайся копіі. Паводле яго найвышэйшай уладай з'яўляўся Цэнтральны камітэт, які складаўся з 7 чалавек (В.Лукасінскі, п/п Вержбаловіч, памешчык Л.Сабанскі, літаратар Мараўскі і інш.), якія збіраліся штоквартальна для слухання справаздач старшынь правінцый і збору складак. Таварыства падзялялася на 7 правінцыяў, сярод іх: Літва і Польскае войска (зыходзілі з асаблівага погляду царскага ўрада на заходнія губерні і

спецыяльнае войска Каралеўства Польскага на гэтых землях). Кожная правінцыя павінна была ствараццa з 3 акруг, упраўляцца правінцыйным камітэтам з 5 чалавек (старшыня, дырэктар, падскарбій, сакратар, сябра), у абавязкі якіх уваходзіла заслухоўваць справаздачы акруговых камітэтаў, збіраць ад іх складкі, пашыраць таварыства. Акругі мелі ад 3 да 9 гмінаў, акруговы камітэт складаўся з 3 чалавек (старшыня, падскарбій, сакратар) [503; 631, т.2, с.231,259; 542, т.2, с.46-51].

Для стварэння правінцыі на тэрыторыі Літвы і Беларусі ЦК накіраваў А.Аборскага. Літоўская правінцыя (Віленская, Гродзенская, Мінская губерні, Беластоцкая вобласць) была арганізавана ў маі 1821 у час Свентаянскіх кантрактаў. У Закрэце пад Вільнам сабраліся былыя сябры Нацыянальнага масонства (каля 15 чал.: браты Ю. і Ст.Гружэўскія, Ст. і С.Мацкевічы, М.Ромер, Ст.Солтан, Т.Мікуліч, Я.Белазор, Струміла, Білевіч і інш.), якія прынялі прысягу. На другім сходзе пад Вільнам, на Паплавах, былі прыняты ў тайнае таварыства маршалак шляхты ковенскай І.Завіша, А.Пацэй, генерал граф К.Прозар. У правінцыйны камітэт (раду) увайшлі князь К.Радзівіл, І.Вайніловіч, памешчык К.Новамейскі, граф А.Солтан. Старшынямі гмін сталі І.Завіша (Ковенскі павет), Білевіч (Росіенскі павет), Ю.Гружэўскі (Шавельскі пав.), Радзівіл (Навагрудскі). Віленскую гміну склалі Ромер (галава), Радзівіл, браты Гружэўскія, Вагнер, Кавальскі, Солтан, Корбут, Бучынскі, Пржэцішэўскі. Ад гэтай гміны хутка выдзелілася другая ў складзе: Я.Вайніловіч (галава), Баранцэвіч, Ходзька, Кульчынскі, Белазор, Зан, Струміла, Лабаноўскі [540, zesp. K.Nowosilcowa, sign.723, s.25; 542, т.2, с.72-75; 175, с.200-202, 205,208-212]. Асноўную ўвагу ў сваёй дзейнасці Літоўская правінцыя звярнула на асобны Літоўскі корпус і арсенал зброі ў Вільні. Яна павінна была таксама ўплываць на Магілёўскую і Віцебскую губерні. Па сведчанню І.Прандзінскага, дзейнасць заключалася «ў прыняцці новых сяброў, прычым неасцярожна, без выбару, а сябры ў сваю чаргу абыякава ставіліся да сваіх абавязкаў у таварыстве». Гэта прывяло да арыштаў. Да следства былі прыцягнуты 128 чалавек, з іх — 90 членаў з заходніх губерняў, у тым ліку з літоўскіх — 36, Беластоцкай вобласці — 7. Членамі ЦК сталі больш памяркоўныя прадстаўнікі шляхты: падпалкоўнік С.Кржыжаноўскі, А.Пліхта, В.Гжымала, якія накіравалі дзейнасць не на пашырэнне сваіх шэрагаў, а на ўмацаванне існуючага. Дзейнасць Літоўскай правінцыі з мая

1822 г. да 1823 г. прыпынілася, але пасля наладжвання сувязі з новым складам ЦК ізноў актывізавалася [302, ф.36, воп.5/48, св.40, спр. 228, а.1,5; 641, т.1, с.37; 542, т.2, с.84-85; 605, с.187; 631, т.1, с.231].

У 1826 г. следства па справе дзекабрыстаў выявіла існаванне Патрыятычнага таварыства. Падданых Расіі, у тым ліку беларусаў, судзіў пяты дэпартамент расійскага Сената. 27 сяброў таварыства вывезлі праз Коўна і Брэст-Літоўск з Варшавы ў Пецярбург. Яны былі вязнямі Петрапаўлаўскай крэпасці. Па ступенях віны іх падзялілі адпаведна галоўнаму абвінавачванню — ці быў у зносінах з рускімі патаемнымі таварыствамі, ці ведаў аб мэтах злучэння польскіх і рускіх арганізацый і ці садзейнічаў ім [302, ф.36, воп.5/48, св.30, спр.21, а.2,10-13,29-36,40; св.40, спр.251, а.7 адв., 12, 14; ф.36, воп.4, св.29, спр.591, а.1 адв.]. Рэч ішла аб адбыўшыхся па ініцыятыве дзекабрыстаў перамовах паміж Паўднёвым таварыствам і польскім Патрыятычным таварыствам. На кіеўскіх кантрактах у студзені 1824 г. сустрэліся з рускага боку С.І.Мураўёў-Апостал і М.П.Бястужаў-Румін, з польскага — С.Кржыжаноўскі. Наступная сустрэча адбылася ў студзені 1825 г., калі перамовы вялі дзекабрысты П.І.Песцель і С.Р.Валконскі з польскімі патрыётамі А.Ябланоўскім і Гродзецкім [471; 504; 640, с.162-163; 136, с.92,118; 302, ф.1, воп.1, спр.9707, а.5].

Следчы камітэт па справах тайных таварыстваў будзе займацца двума пытаннямі, якія цікавяць і нас: дзяржаўныя межы і лёс цэсарэвіча вялікага князя Канстанціна Паўлавіча. Нагадаем, што на перамовах абмяркоўваласяч яшчэ праблема асобнага Літоўскага корпусу, пра што мы гаварылі ў параграфе 3.1. Галоўнай умовай узаемапрацы прадстаўнікоў Патрыятычнага таварыства было ўзгадненне межаў паміж Расійскай дзяржавай і адроджанай незалежнай Польшчай, у склад якой павінны ўвайсці беларускія, літоўскія і ўкраінскія землі. З Канстанцінам Паўлавічам, які адрокся ад рускага прастола і быў жанаты на польцы, яны звязвалі надзеі на аднаўленне былой Рэчы Паспалітай. Таму не згаджаліся на яго забойства, а абяцалі толькі не пусціць у Расію падчас паўстання рускіх патаемных таварыстваў [544, т.2, с.366; 550, с.139-140,150; 605, с.195]. Дзекабрысты пагаджаліся на рэстаўрацыю самастойнай Польшчы, але тэрытарыяльнае пытанне рашалася з цяжкасцю. На перамовы 1824 г. Бястужаў-Румін падрыхтаваў дакумент, які ў літаратуры называецца «Дамова» і часам

лічыцца сапраўдным актам дамоўленасці паміж таварыствамі. На нашу думку, гэта толькі праект, на падставе якога мог бы быць падпісаны дакумент аб супрацоўніцтве. У ім пра беларускія землі, якія адышлі да Расійскай імперыі пасля падзелаў, гаварылася наступнае: «2.Будзе зроблены новы абрыс межаў, а вобласці, недастаткова абрусеўшыя, каб душэўна быць прывязанымі на карысць Расіі, вярнуць Польшчы»; «4.Палякам можна таксама спадзявацца атрымаць губерні Гродзенскую, частку Віленскай, Мінскай і Валынскай» [418, с.9; 62, т.4, с.281-283]. Такім чынам, беларускімі землямі дзекабрысты расплочваліся за сумесныя дзеянні падчас паўстання супраць царызму.

На перамовах 1824 г. Бястужаў-Румін заяўляў, што «прадмет гэты пазней можна вырашыць, бо погляды расійскага саюзу ў гэтай справе падзяліліся, і ёсць нават такія, хто застаецца пры цэласці існуючых межаў дзяржавы». Для доказу прывядзем некалькі прыкладаў. Палымяны рэвалюцыянер К.Ф.Рылееў пра вышэйназваныя ўмовы сказаў на следстве: «Я моцна паўставаў супраць гэтага, сцвярджаючы, што ніякае таварыства не мае права рабіць падобныя ўмовы». Пры ўсталяванні межаў ён слушна падкрэсліў, што трэба ўлічваць мову і веравызнанне жыхароў, але памыляўся, калі гаварыў: «Там, дзе большая частка народа гаворыць названымі нарэчыямі («маларасійскае і рускае, ці па-польскі, хлопскае» — *В.Ш.*) і спавядае грэка-расійскую або уніяцкую рэлігію, там **Русь, старажытная ўласнасць нашая»**. Рэзка выступіў супраць Мікіта Мураўёў: «Сябры Паўночнай думы даказвалі... Песцелю, наколькі **мера гэтая праціўна духу і самалюбству народа, які звыкся на працягу двух стагоддзяў набываць, а не аддаваць вобласці»** [544, с.366; 102, с.48; 62, т.1, с.180, 300].

На перамовах 1825 г. пытанне аб межах паміж Расіяй і Польшчай паўстала зноў. А.Ябланоўскі лічыў яго найбольш істотным: «Адзінаю мэтаю Патрыятычнага Таварыства, якое я прадстаўляю, з'яўляецца рэстаўрацыя Польшчы ў межах, якія мела перад другім падзелам. Таму жадаю даведацца ад расійскіх дэпутатаў, ці пагаджаюцца яны на незалежнасць маёй Айчыны». Песцель адказаў, што Паўднёвае таварыства без усялякіх ваганняў падтрымлівае незалежнасць Польшчы, а наконт межаў яе павінна выказацца насельніцтва спрэчных тэрыторый. Адказ задаволіў Ябланоўскага, але сам ён не падтрымаў намаганні дзекабрыстаў аб рэспубліканскім ладзе ў адроджанай Польшчы і быў супраць забойства Канстанціна Паўлавіча. Градэцкі ў

сваіх паказаннях сцвярджаў: «Расіяне абнадзеілі палякаў у вяртанні ўсіх губерняў, да іх краіны далучаных, а таксама вяртаннем з іх дапамогаю і іншых, якімі валодаюць Аўстрыя і Прусія, абяцаючы сваёй магутнасцю складанне асобнай нацыі і каб ім былі вернуты айчынныя іх землі ў такіх памерах, як было да падзелаў Польшчы» [550, с.156; 33, с.70]. Такім чынам, ізноў беларускія землі сталі прадметам дыпламатычнага гандлю.

Ідэя правядзення рэферэндума на тэрыторыі заходніх губерній Расіі яшчэ раз узнікла падчас размовы Песцеля з палякам Лагоўскім у тым жа 1825 г. пад Луцкам. Калі Песцель не пагадзіўся з межамі маёмасці, акрэсленымі Лагоўскім (задняпроўская Украіна, тэрыторыі, захопленыя ў выніку падзелаў, Беласток), дык той прапанаваў: «Праўда, што пра іх без іх гаворым, але прыйдзе час, калі і яны будуць мець голас; тады даведаемся, які бок яны выберуць». Песцель ахвотна з гэтым пагадзіўся [542, т.2, с.401].

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што ў 1820-я гады рускі вызваленчы рух (дзекабрысты) і польскі нацыянальны рух (Нацыянальнае масонства, а пазней Патрыятычнае таварыства) распаўсюджвалі свой уплыў на тэрыторыю былога ВКЛ: стваралі тут свае філіялы, улічвалі ў сваіх тактычных і стратэгічных планах. Беларускія землі былі прадметам гандлю ў іх перамовах аб сумесных дзеяннях супраць царызму. У лепшым выпадку насельніцтву прапаноўвалі выбар, каму належаць: Расіі ці Польшчы.

## 4.5. **Лістападаўскае паўстанне 1830-1831 гг. на землях Беларусі**

Другое паўстанне, Лістападаўскае 1830-1831 гг., таксама закранула лёс Беларусі. Яшчэ напрыканцы верасня 1830 г., калі яно планавалася, у разлік браўся асобны Літоўскі корпус — «ён неабходна павінен далучыцца да нас». Меркавалася нападзенне на Бабруйскую і Дзінабургскую крэпасці, распаўсюджванне паўстання за 10—12 дзён на тэрыторыю былога ВКЛ. Тут адбудзецца мабілізацыя рэкрутаў, якія атрымаюць зброю з захопленых крэпасцей, на «берагі Літвы» прыбудзе зброя і іншая дапамога з-за мяжы. Лічылася, што паўстанне падтрымае таксама Белая Русь. Камітэт Лафаета ў Францыі падпіскаю сабраў каля 400 франкаў і ладзіў экспедыцыю ў Літву ў 1831 г., але яна не адбылася, а закупленая зброя засталася ў Бельгіі.

Англійскі транспарт зброі дайшоў да балтыйскага берага ў верасні 1831 г., калі паўстанне было загашана [90, с.11-15; 48, с.10; 296, с.306].

Асноўную падрыхтоўку да паўстання ў Варшаве ажыццяўляў Пётр Высоцкі з беларускага шляхецкага роду герба «Адравонж». Яшчэ 15 снежня 1828 г. заснаваў ён у школе падхарунжых у Лазенках тайнае таварыства «Ваенны саюз» (або «Змова Высоцкага»). Менавіта яно і падняло паўстанне ноччу 29 лістапада 1830 г. Сам Высоцкі на чале атрада падхарунжых (каля 160 чалавек) напаў на кашары трох рускіх уланскіх палкоў, а затым прабіўся ў Варшаву [601, с.56; 477, с.375]. У выніку неарганізаванасці паўстанцаў уладу ўзяла Адміністрацыйная рада, якая пайшла на перамовы з цэсарэвічам Канстанцінам Паўлавічам. Сярод умоў, якія прапанаваныя яму, была і такая: «4) прыняць да сведчання і данесці да імператара, што самае гарачае жаданне польскага народа — злучэнне з Царствам і дараванне канстытуцыйных свабод для літоўска-рускіх губерняў» [77, с.473]. Падчас дыктатуры Ю.Хлапіцкага (5 — 18.12.1830; 20.12.1830 — 18.01.1831) узнікла пытанне аб Літоўскім корпусе, але ні цэсарэвіч, ні паўстанцы не выкарысталі яго (табл. Д.17.1). Канстанцін Паўлавіч сумняваўся ў надзейнасці корпуса, а Хлапіцкі не хацеў развязваць вайну далучэннем корпуса да актыўных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Прэлат Буткевіч, які добра ведаў Хлапіцкага, успамінаў: «Калі раілі Хлапіцкаму ісці ў Літву і Валынь і выкарыстаць агульны рэвалюцыйны выбух, які панаваў у пачатку мецяжа, ён завёў зносіны з с.-пецярбургскім кабінетам» [90, с.31; 61, с.593-594]. Да Мікалая І адправіліся Кс.Друцкі-Любецкі і Язерскі. Апошняму на аўдыенцыі 14 снежня (!) імператар заявіў: «Нарэшце, ад мяне патрабуюць вяртання далучаных да імперыі польскіх правінцый; гэтага я ніяк не чакаў, і пагрозамі нельга дасягнуць немагчымага. Ці магу я з народаў, якія знаходзяцца пад маім скіпетрам, зрабіць аднаму дабро за кошт другога?» [60, с.526]. Друцкі-Любецкі, па словах І.Лялевеля, невядома, ці шчыра, «лічыў, што калі давядзецца гаварыць з імператарам аб Літве, дык неабходна ўторгнуцца да яе; калі ж урад не чуе сябе да гэтага ўпаўнаважаным, можна пакінуць гэтую справу жадаючым» [цыт. па: 547, с.135].

18 снежня 1830 г. пачаў сваю працу рэвалюцыйны сейм. Свае адносіны да зямель былога ВКЛ дэпутаты выказалі адразу сваімі ўзрушанымі воклікамі на словы маршалка пасольскай

палаты аб надзеі злучэння ў гэтай палаце з прадстаўнікамі «адарваных ад нас землякоў» [547, с.136]. Яшчэ больш выразна абвясціў сеймавы маніфест, прыняты 20 снежня: «Правінцыі, даўно да Расіі далучаныя, не толькі не сталі далучанымі, праз Венскі кангрэс захопленыя; спачатку зачараваныя абяцаннямі, а потым чаканнем, абуджаныя ў іх народныя ўспаміны, сталі злачынствам... а кароль Польскі ў яе старажытных правінцыях праследваў палякаў, якія асмельваліся называцца палякамі. Школьная моладзь стала асабістаю мэтаю строгасцяў. З лона мацярэй выдзіралі недарослых дзяцей, надзеі знакамітых сямействаў вывозілі ў Сібір або аддавалі ў шэрагі змарнаванага жаўнерства, у дзяржаўным справаводстве і школьнай навуцы адабрана польская мова, указы калечылі дзяржаўнае права і польскае судаводства, адміністрацыйная бяспраўнасць прыводзіла земскіх уласнікаў да галечы, а ад уступлення на трон Мікалая І гэтае становішча яшчэ больш пагоршылася, нават рэлігійная талерантнасць усімі сродкамі старалася выкараніць уніяцкі абрад, а лацінскі прыгнятаць». У маніфесце гаварылася, што народ не складзе зброю, пакуль «не забяспечыць сваіх свабод» і «не злучыцца з прыгнятаемымі братамі... і не зробіць іх удзельнікамі сваіх свабод, вольнасці і незалежнасці» [568, т.1, с.60,63,64].

19 студзеня 1831 г. сейм прызначыў намінальным галавою польскага войска князя М.Радзівіла, былога генерала напалеонаўскай арміі. Публіка сустрэла гэта выклікамі: «Няхай жыве Радзівіл!», «На Літву! На Літву!». У літоўскім паходжанні Радзівіла яна ўбачыла напрамак паўстання, які да гэтага часу не вельмі вызначаўся [77, с.49]. Г.Дэмбінскі, тады яшчэ камандзір гвардыі Кракаўскага ваяводства, у лісце да сейма прапанаваў унесці ў праект аб дэтранізацыі Мікалая І пункты, якія будуць сведчыць, што польскі народ не паўстаў супраць расійскага народа, што ён з расійскім царом не будзе заключаць ні міра, ні перамір'я, пакуль Літву, Валынь, Падолію і Украіну не атрымае, пакуль народ пад скіпетрам яго не будзе мець належачых канстытуцыйных свабод [568, т.1, с.97, 152] .

У такіх абставінах актывізаваліся ліцвіны, якія знаходзіліся ў Варшаве і яшчэ ў пачатку паўстання стварылі камітэт літоўска-рускіх зямель. Ён звярнуўся да сейма з «Адрасам», у якім былі такія радкі: «...заўсёды былі адным з Вамі народам, адзінаю Польшчай. Трыццаць шэсць гадоў прыгнёту і няволі ад апошняга падзела не затапталі ў сэрцах нашых любові да

агульнай Айчыны і імкненняў да зліцця ў адну цэлую народнасць, якая не сцёрта межамі... жыве пад аховаю гісторыі, у агульнай крыві, у супольнасці пачуццяў, памятных рэчах, мове, няшчасцях і сумеснай надзеі». Сярод падпісаўшых «Адрас» — Напалеон Орда, капітан з Беларусі Мікалай Петрушка, К. Друцкі-Любецкі, Ян Гедройц, Ян Кулеша, Ян Рамкевіч з Гродзенскай губерні, а ўсіх каля 200 чалавек. 24 студзеня Лялевель зачытаў «Адрас» на паседжанні сейма. Ва ўступным слове ён успомніў гісторыю саюза двух народаў (ліцвінаў і палякаў), пачынаючы ад караля Лакеткі, назваў Гедыміна, Чартарыйскіх, Радзівілаў, Косака, Рэйтана. Як прыклад сумеснага патрыятызма, прывёў прозвішчы Пачобутаў, Нарушэвіча, Касцюшкі, дэпутатаў сейма Паца, Радзівіла, Нямцэвіча, Кс.Несялоўскага. Чытанне Акта Лялевель закончыў словамі: «...павінны мы звярнуць увагу на прыгнечаных сваякоў, не варта нам іх забываць...» [568, т.1, с.172-174; 567, с.480].

Сейм аднадумна прыняў «Адрас», а 1 лютага абмяркоўваў праект адказа на яго. Ягоны аўтар Лялевель пісаў: «Мы Вас, суайчыннікі зямель Літоўскіх, Валыні, Украіны і Падолі, клічам да народнай справы, мы, памятуючы братэрства, якое злучае нас з вамі, агульную кроў нашу, падаем вам руку, каб паўсталі з-пад ярма, ачунялі б і вызваліся б ад няволі». У дакуменце быў заклік да тых землякоў, якія знаходзіліся ў Польшчы: «Вы, якія разам з намі! Бярыцеся за зброю, якую вам падаем. Па даручэнню нашаму рабіце брацкія атрады і спяшайцеся з намі да вашай зямлі, каб вызваліць прыгнечаных землякоў, такіх жа, як і мы, усхваляваных жаданнем вольнасці і незалежнасці. Аднолькавым рытмам б'ецца вашае сэрца, тоя ж пачуцце кліча на поле бою. Ідзіце землякам вашым сказаць, што прабіў час вызвалення з няволі. Спяшайцеся з намі несці ім дапамогу, каб паўсталі. Да зброі, да бою, браты!» [568, т.1, с.394]. Адказ на «Адрас» быў адзінадушна прыняты і на паседжанні Сената. Перад чытаннем сенатар Вадзінскі сваім выступленнем падкрэсліў, што «абавязкам нашым з'яўляецца даць прыгнечаным яшчэ суайчыннікам усялякія доказы спачування, да таго часу, як адолеем аб'яднацца з імі» [567, с.505].

На гэтым жа паседжанні сейма рэферэнт казначэйскай камісіі Ясенскі прадставіў праект ліцвінаў і іншых прадстаўнікоў народаў былой Рэчы Паспалітай аб стварэнні літоўскага і валынскага легіёнаў. Кожны павінен быў складацца з аднаго батальёна пешых стральцоў і двух конных эскадронаў,

мецъ чатыры лёгкія гарматы. У сейма прасілі фінансавай дапамогі, абяцаючы вярнуць пасля вызвалення сваіх зямель. Да кіраўніцтва і арганізацыі легіёнаў запрашаліся генералы Пац і Несялоўскі, астатніх вызначаў бы галоўнакамандуючы польскіх войскаў. У Варшаве засталіся б тры дэпутаты для сувязі сталіцы з правінцыямі і два дэпутаты пры галоўнакамандуючым для ваеннай сувязі. Аўтары праекта прасілі дазволу перахода ў легіёны сваім землякам з польскіх частак. Легіёны павінны былі ўступіць на сваю тэрыторыю з пачаткам на іх ваенных дзеяннях. Трэцяга лютага сейм прыняў пастанову аб фарміраванні двух легіёнаў: літоўскага (літоўская, жмудская і беларуская часткі) і валынскага (валынская, падольская, украінская часткі). На арганізацыю выдзелілі крэдыт у памеры звыш 95 тысяч злотых [568, т.1, с.408,409]. Курпінскі на верш «Літвінка» напісаў марш літоўскіх легіёнаў [595, с.128].

У сувязі з пачаткам паўстання на тэрыторыі Літвы і Беларусі абедзве сеймавыя палаты прынялі пастанову (26.04. і 5.05. 1831 г.), у якой гаварылася аб прынцыпах узаемаадносін паміж Польшчай і гэтымі краямі. «Кожная частка былога Каралеўства Польскага, княстваў і зямель з ім некалі злучаных (а цяпер адарваных да Расіі), якая паўстае і далучаецца да паўстання Каралеўства, уваходзіць да яго так, як перад падзеламі, у тыя ж самыя адносіны, і вяртаецца да сваіх правоў, якія не могуць падлягаць ніякім абмежаванням, гарантуецца ёй і яе жыхарам усялякая дапамога, ахова і апека, таксама ўдзел у нарадах і трактатах, якія маюць часткі цяперашняга Каралеўства». Дадзены дакумент быў прыняты 69 галасамі, супраць — 3 [568, т.3, с.146; 697, с.59-60]. На паседжанні сейма 29 і 30 красавіка, 4 і 5 мая адбываліся дыскусіі па праекту аховы Літвы і Русі. 4 мая ён быў прыняты Сенатам. 9 мая ў другі раз быў унесен праект аб праве прадстаўніцтва «забраных зямель». На паседжаннях 9-11 мая ішло абмеркаванне, і 11 мая дакумент быў прыняты галасамі: 16 — за, 3 — супраць. Праект прадстаўніцтва Літвы і Русі складаўся з 8 артыкулаў, у якіх былі распісаны тыя, хто мае права выбара і можа быць выбраным паслом на сейм, працэдура выбараў на павятовых і шляхецкіх сеймах, нормы прадстаўніцтва ад паветаў і ваяводскіх месцаў (1 дэпутат) [567, с.539,555; 568, т.3, с.567-579].

Яшчэ на прыёме 14 снежня 1830 г. Мікалай І пытаўся ў Язерскага: «Што азначаюць падкінутыя ў маіх правінцыях

пракламацыі, каб разбурыць парадак і спакусіць маіх салдат? Як сагласаваць ўсё гэта з пачуццямі вернасці да мяне?» [60, с.525]. Сапраўды, на тэрыторыі Літвы і Беларусі распаўсюджваліся розныя брашуры, у якіх насельніцтва запрашалася да ўдзелу ў паўстанні, абяцалася дапамога зброяй, грашыма, як пісаў рускі даследчык Ф.Сміт, маляваўся ў прыгожым выглядзе былы «залаты час рэспублікі, самалюбства вабілі марамі аб славе, якая чакае іх, калі яны — нашчадкі — адродзяць тое, што страчана іх продкамі» [328, т.2, с.110]. Напрыклад, у снежні друкаваныя «варшаўскія аб'явы аб зробленых у Каралеўстве Польскім распараджэннях аб перамене па ваяводствах чыноўнікаў...» былі знойдзены ў повара былога віцэ-губернатара Максімовіча Ю.Кіжэлевіча (30-гадовага ўраджэнца в.Пальніца) і лакея Паўлоўскага. У сакавіку 1831 г. на слупе ў Свіслацкім вучылішчы з'явілася лістоўка, якая на рускай і польскай мовах заклікала: «Панове, бярыце якую маеце зброю і пойдзем абараняць Айчыну, хаця нас няшмат, але з нас возьмуць прыклад іншыя, у Беластоку ўжо ўсё падрыхтавана, як толькі мы пачнем рух, за намі пойдуць усе... Што ж рабіць, адзін раз патрэбна вырашыць: ці жыць, ці атрымаць кулю ў лоб, бароначы сваю Айчыну...» [250, ф.1, воп.3, спр.847, а.1-2; ф.4, спр.1, а.3].

У Віцебскай губерні распаўсюджвалася ў 1831 г. песня «Малады паляк, дзе твой конь?», у якой быў заклік сядлаць каня, бо «сябра, брат твой вядуць з ворагам крывавую бітву». Разыходзіліся вершы А.Міцкевіча «Да Мацеры Польшчы», заклікі да праваслаўных святароў [69, с.54,58]. Зімой 1831 г. прывёз з Літвы на Беларусь верш «Малітва» люцынскі адвакат Лаўмянскі. У ёй гаварылася, што паўстанцы прагнуць толькі аднаго — адрадзіць незалежную Айчыну і быць вольнымі, для гэтага просяць у Бога дапамогі [249, ф.1430, воп.1, спр.2954, а.1,3].

11 снежня 1830 г. камандзір асобнага Літоўскага корпуса генерал-ад'ютант Разэн прасіў гродзенскага губернатара М.Бабяцінскага загадаць усім памежным жыхарам спыніць зносіны з Каралеўствам Польскім «па прасёлкавых і малапрыгодных дарогах і месцах». Праз два тыдні гродзенскі земскі спраўнік даносіў, што ўзяў падпіскі ад жыхароў Калбасіно, Аўгустовак, Ласосна, Грандзічы, Пышкі, Гожа, Прывалка і інш. [250, ф.1, воп.3, спр.844, а.1-14]. 13 снежня Літва, большая частка Заходняй Беларусі і Украіны былі аб'яўлены на ваенным становішчы. За падазронымі асобамі ўсталявалі паліцэйскі

нагляд. Гродзенскі губернатар запрасіў у Гродна ўсіх уплывовых польскіх памешчыкаў і па сутнасці трымаў іх тут пад хатнім арыштам «до минования болезни» («воспаления мозга», як ён гаварыў). Напрыклад, 25 снежня быў дастаўлены брэсцкі павятовы маршалак Карл-Урсін Нямцэвіч, які пазней змог збегчы ў Белавежскую пушчу, дзе ўзначаліў паўстанцкі атрад [334, с.31]. Па загаду галоўнакамандуючага І.І.Дзібіча ад 28 снежня ў насельніцтва канфіскоўвалася розная зброя: паляўнічыя стрэльбы, пісталеты, шаблі, шпагі, нажы, штыкі, пікі і нават гарматныя ядры [250, ф.1, воп.3, спр.1099, а.1-91; 507, с.22]. Гарнізоны гарадоў былі ўзмоцнены надышоўшым з Валынскай губ. 44-ым казачым палком (484 чал., 517 коней), які меў мэтаю «выкананне захоўвання ўнутранага парадку і асабліва для захоўвання цэласнасці пошт, забеспячэння казённых зносін і аховы магазінаў і рознага роду складоў» [250, ф.1, воп.3, спр.828, а.1,14,17].

З 10 студзеня па 11 лютага 1831 г. штаб-кватэра галоўнакамандуючага Дзібіча знаходзілася ў Гродне (відаць, у былым палацы Тызенгаўза). На тэрыторыі Беларусі канцэнтравалася дзеючая руская армія да пераходу мяжы: у Брэсце — 25-я пяхотная дывізія 6-га пях. корпуса (з 29.12) і 3-і рэзервовы кавалерыйскі корпус (з 14.01); у Гродне — 2-я і 3-я пях. дывізіі 1-га пях. корпуса (з 14-16.01), грэнадзёрскі корпус (з 2.02); у Мінску — 7-я пях. дывізія; у Мінску, Магілёве, Барысаве, Віцебску — 6-я пях. дывізія; Навагрудку, Міры, Ружанах, Пружанах — 2-я гусарская дывізія. Гвардыя выйшла з Пецярбурга паміж 7 — 22 студзеня і ішла ў Аўгустаў і Гродна, куды прыйшла не раней сярэдзіны сакавіка [74, с.53; 296, с.29; 680, с.125-127; 255, с.31]. Для падтрымання баяздольнасці гэтага войска ўтвараліся прадуктовыя склады ў Гродне, Вільні, Беластоку, Брэсце, Драгічыне, Бельску, куды харчаванне дастаўлялася з сялянскіх запасных магазінаў і метадам рэквізій ад насельніцтва. У красавіку 1831 г. з Валынскай і Падольскай губерняў у Брэст прывезлі 16 тыс. асьмін сухароў і адпаведная порцыя круп, 12 тыс. асьмін аўса. Артылерыйскія паркі былі арганізаваны ў Гродне, Браньску пад Беластокам, Нясвіжы, Брэсце. Для параненых і хворых у Гродне, Брэсце, Нясвіжу, Слоніме, Бабруйску, Вільні, Беластоку, Мінску адчыніліся шпіталі [680, с.133; 296, с.32,34,36,37; 250, ф.1, воп.3, спр.1092]. 4 лютага 1831 г. руская армія была сканцэнтравана ва ўказаных ёй пунктах. Як успамінаў Д.В.Давыдаў: «У гэты дзень снежны гарызонт усходняй мяжы царства пакрыўся грамадамі войск

нашых; пагоркі Нёмана, Нарава і Буга закрыліся доўгімі радамі бівуакаў, і штык рускі бліснуў помстаю перад знаёмым яму войскам польскім». 5-6 лютага мяжу Каралеўства Польскага перайшлі, па нашых падліках, 57 батальёнаў пяхоты, 120 эскадронаў кавалерыі, 10 казацкіх палкоў, 300 гармат [90, с.320,330-331].

Пасля атрымання першых звесткаў аб варшаўскім паўстанні быў створаны Віленскі цэнтральны камітэт для каардынацыі падрыхтоўкі паўстання на былой тэрыторыі ВКЛ. У яго склад увайшлі 8-9 чалавек: віленскі губернскі маршалак С.Шумскі, паэт А.Гарэцкі, Э.Ромер, Л.Замбжыцкі, Ю.Хрэбніцкі, гісторык М.Балінскі, сакратар Рады Віленскага універсітэта Л.Рагальскі, прафесар В.Пяткевіч. Кіраўніком паўстання на Літве і Беларусі быў прызначаны Варшаўскім урадам генерал Янкоўскі, які не змог дабрацца да месца, бо быў затрыманы ў Пултуску. Інструкцыі з Варшавы прывёз камітэту Я.Граткоўскі. Паседжанні адбываліся на кватэры Пяткевіча ў доме «Кардыналья». Дзякуючы намаганням камітэта паўстала малая аружэйная майстэрня, грашовая каса, падтрымліваліся сувязі з Варшавай, а потым з утворанымі павятовымі ўрадамі (камітэтамі). Віленскі цэнтральны камітэт не меў выразнай лініі паводзін і праграмы дзейнасці, а таму не адыграў значнай ролі і па сутнасці не стаў кіруючым органам паўстання ў Літве і Беларусі, а часам і стрымліваў яго, чакаючы дапамогу і загады з Варшавы [474].

Няўмеласць рускай арміі выкарыстаць перамогу пад Грохавам і нерашучасць удару, нанесенага пад Прагаю, рэвалюцыянізіруюча паўплывалі на шляхту Літвы і Беларусі. Абставіны таксама садзейнічалі пад'ёму паўстання: буйны рускі гарнізон знаходзіўся толькі ў Вільні, у сярэдзіне сакавіка быў абвешчаны рэкруцкі набор, праводзіліся рэквізіі хлеба і фуража для рускай арміі. 26 сакавіка 1831 г. узброены атрад шляхты і сялян захапіў Расіены і абвясціў незалежнасць Літвы (ВКЛ). Як сведчыць сучаснік: «Усюды ў Літве вызваляліся рэкруты і арыштанты, рускіх чыноўнікаў бралі ў палон, некаторых забівалі, захоплівалі казну, зброю, з'явіліся трохкаляровыя какарды, пракламацыі і д.п.» [296, с.137]. 29 сакавіка ў м.Дусяты Віцебскай губ. падняла паўстанне Э.Плятэр, якая за кароткі час здолела арганізаваць партызанскі атрад колькасцю ў 280 стралкоў, 60 коннікаў і некалькі соцен касінераў. Пазней ён далучыцца да атрада К.Парчэўскага, а ў чэрвені войдзе ў рэгулярнае польскае войска Д.Хлапоўскага [425, с.144-148; 505].

У Ашмянах Віленскай губ. пачалі рыхтавацца да паўстання яшчэ ў студзені 1831 г. пад кіраўніцтвам старшыні трыбунала П.Важынскага (табл. Д.18.1). Адбываліся патаемныя сходы ў яго маёнтку Аланы, рабіліся запасы зброі і снарадаў, усталявалі сувязі з Самагіцыяй. 16 красавіка пасля нарады ў Важынскага ўзброеная група паўстанцаў з 9 чал. (Е.Янушкевіч, Ю.Поль, І.Зянкевіч і іншыя) выйшла на вуліцу, дзе да яе далучыліся яшчэ каля 80 чал., і захапіла арсенал. Ашмяны аказаліся ў руках паўстанцаў, і гэта абарвала апошнюю нітку сувязі ваеннага губернатара Храпавіцкага з унутранай Расіяй. Да паўстаўшых ашмянцаў далучыліся жыхары ваколіц, і ўсіх разам стала каля 2,6 тысяч чал. Важынскі быў выбраны старшынёй паўстанцкага кіравання, а граф К.Пржэздзецкі — галоўным начальнікам войск, якія падзялілі на роты, эскадроны, атрады касінераў [428, с.45]. Для пагрома паўстанцаў Храпавіцкі прыцягнуў зводны лінейны казачы полк, які прыбыў з Каўказу. 27 красавіка на Ашмяны быў пасланы атрад з 300 казакаў, 500 пехацінцаў і 4 гармат. На нарадзе кіраўнікоў паўстання было вырашана адвесці асноўныя сілы ў лясы Вішнёва, пакінуўшы ў горадзе толькі арыергад з 600 чал. Бой адбыўся ў прадмесце і ў самых Ашмянах (на вуліцах, плошчы). Казакі жорстка расправіліся з паўстанцамі, забіўшы 350 чал. Для канчатковага пагрому ашмянцаў адправілі каля 1200 чал. 2-га Егерскага палка, эскадрон гусар і 6 гармат. Адначасовай атакай праз Валожын і Бакшты 12 мая яны разбілі паўстанцаў. Выратаваліся толькі 80 коннікаў на чале з Пржэздзецкім і Важынскім [426, с.45; 296, с.140-141; 328, с.141-145, 374-376; 90, с.337].

Падзеі на Ашмяншчыне прыспешылі паўстанне ў Вілейскім павеце Мінскай губерні, дзе рыхтаваліся да яго яшчэ раней, стварыўшы патаемныя камітэты па паветах. На Мінскіх кантрактах (1-13.03) камісары Віленскага цэнтральнага камітэта ўгаворвалі шляхту чакаць. Прыхільнікі пачынаць паўстанне стрымаліся, каб не давесці да ўнутранага разладу ў той час, калі патрэбны еднасць і згода. Паўстанне суседзяў-ашмянцаў стала сігналам для вілейскіх патрыётаў. З дапамогаю атрада М.Ходзькі, прысланага Пржэздзецкім, яны вырашылі захапіць Вілейку. Далучыліся атрады І.Адахоўскага і В.Лубанскага, які першым увайшоў у горад 14 красавіка (табліца Д.17.1.). Было захоплена некалькі сотняў карабінаў са штыкамі, столькі ж паляўнічых стрэльбаў, 100 мундзіраў і 20 тысяч злотых у павятовай касе.

17 красавіка на Рынку Вілейкі сабраліся жыхары горада і ваколіц, некаторыя былі апранутыя ў польскія і французскія мундзіры 1812 г. Адбылося набажэнства, чуліся патрыятычныя заклікі, народныя песні. 18 красавіка быў прыняты Акт канфедэрацыі з Віленскай губерняй, прысяга, адбыліся выбары Вілейскага камітэта і сеймавых паслоў у Варшаву. Начальнікам стаў С.Радзішэўскі, шэфам штаба — В.Лубанскі, камандзірам кавалерыі — А.Валадкевіч, камандзірамі пяхоты — І.Адахоўскі і Ляўковіч. Камітэт падрыхтаваў і праз ганцоў разаслаў шэраг зваротаў: да насельніцтва — даць рэкрутаў, зброю, амуніцыю; да духавенства; жанчын; яўрэяў; сялян — абяцалі вольнасць за ўдзел у паўстанні.

Для пагрома вілейчан паслалі казакаў з Бабруйску. На ваеннай радзе ў Вілейцы было вырашана адысці ўглыб павета, у лясы, перанесці туды цывільную ўладу, збіраць сілы і трымаць павет як можна далей у стане вайны. 24 красавіка адбыўся кароткі бой, пасля якога паўстанцы адышлі ў Любань, а пазней — у Мядзель, які стаў галоўнай кватэрай войска Радзішэўскага (каля 3000 чал.). Паляпшэнне агульнага становішча паўстанцкага руху ў гэты час дазволіла вілейцам спланаваць паход на вызваленне Вілейкі. 4 мая адбылася бітва, у якой поспеха дамагліся царскія войскі. 12-13 і 15 мая баі ішлі ў Глыбокім — паўстанцы зноў праігралі і адышлі да Лужак. Тут сустрэліся партызанскія атрады Вілейскага, Завілейскага, Дзісенскага, Ашмянскага паветаў (каля 4000 чал.). Дасягнуць адзінства камандавання яны не змаглі і ў ноч з 16 на 17 мая дзвюма калонамі разышліся: Брахоцкі, Радзішэўскі, Барткевіч — на Вількамір, браты Адахоўскія — у Віцебскую губ., каб адцягнуць увагу рускіх. З гэтай мэтай яны захапілі Лепель, але праз некалькі дзён самі былі разбіты 4-й гусарскай дывізіяй генерала Каблукова. Асноўная частка вяла партызанскую барацьбу да падыхода польскіх войскаў Гелгуда і Хлапоўскага. З вілейскай пяхоты зрабілі 26 лінейны полк на чале з Радзішэўскім (яны прынялі ўдзел у бітве на Панарскіх вышынях Вільні і пад Шаўлямі), кавалерыя ўвайшла ў склад 12 уланскага палка [593, с.191-210; 296, с.261-262,270-271].

Арганізаваць паўстанне ў Браслаўскім павеце не ўдалося, але тры партызанскія атрады там дзейнічалі (табл. Д.18.1): Ф.Падберскага, Талочкі, нейкага NN. У Дзісенскім павеце паўстанне ўзнялі 4 браты Лапацінскія, 6 братоў Клётаў, іх стрыечны брат І.Клот і два дзядзькі Б. і Л.Клоты [690, т.2, с.211-

212; 563, с.30-35; 554,с.334; 649,с.401; 686,с.192]. Месцам збора паўстанцаў сталі Лужкі, якія знаходзіліся ў 5 вярстах ад Дзісны. 12 красавіка сюды прышлі 20 курсантаў школы падхарунжых з Дынабургскай крэпасці ( сярод іх А.Рыпінскі). У гэты час у Лужках сабраліся каля 50 памешчыкаў. 13 красавіка яны падпісалі Акт канфедэрацыі аб далучэнні павета да паўстання, які склаў ксёндз-піяр А.Татур, і акт прысягі на ўдзел у барацьбе супраць Расіі да аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Са зместу прадпісанняў Пастаяннага камітэта 14 і 16 красавіка і ягонага звароту да яўрэяў м.Глыбокага ад 23 красавіка таксама бачна, што мэтай паўстання было аддзяленне беларускіх зямель ад Расіі і далучэнне іх да Каралеўства Польскага. 13 красавіка быў выбраны Пастаянны (урадавы) камітэт на чале з маршалкам Р.Падбіпентам. Ягоным намеснікам стаў граф А.Бжастоўскі, сябрамі камітэта — Б.Клот, А.Корсак, граф А.Шырын, сакратаром — А.Куроўскі, яго памочнікам — А.Татур. Праз некалькі дзён быў створаны Экзаменацыйны (следчы) камітэт у складзе: граф М.Храпавіцкі (старшыня), А.Хомскі, І.Корсак [425, с.144; 690, т.2, с.222, 229-230; 649, с.400].

Галоўнай задачай Пастаяннага камітэта была арганізацыя вайсковай сілы. 27 красавіка камандуючым паўстанцкага войска Дзісенскага павета быў выбраны В.Брахоцкі, ягоным ад'ютантам — І.Клот, начальнікам штаба — Рагоўскі, камендантам у Лужках — маршалак Буйніцкі, у Глыбокім — І.Корсак. 1 мая паўстанцкае войска (каля 3 тысяч чал.) прыняло прысягу, а 6 мая пад трохкаляровым штандарам з надпісам «За Вольнасць, Веру і Айчыну» выступіла ў паход на Дзісну. 8 мая тут адбыўся бой, і павятовая сталіца на тры дні апынулася ў руках паўстанцаў. Яны скідвалі двухгаловых чорных арлоў, развешвалі свае харугвы, вечарамі спявалі народныя песні. 12 мая Брахоцкі пакінуў Дзісну і пайшоў у Лужкі, дзе злучыўся з завілейскімі паўстанцамі. 15 мая накіраваліся на дапамогу Радзішэўскаму ў Глыбокае, але спазніліся і вярнуліся назад. Корпус Талстога і прыход 18 мая ў Глыбокае войск М.Н.Мураўёва прымусілі дзісенскіх паўстанцаў пакінуць павет і адысці ў Вількамірскі. Там па прыходу Гелгуда з іх арганізавалі Завілейска-Дзісенскі батальён пяхоты, а кавалерыю далучылі да 10 і 11 уланскіх палкоў [690, т.2, с.232,233,235-237,242-244; 649, с.401; 650, с.15,122-151;559, с.107-109].

На тэрыторыі Гродзенскай губ. дзейнічала большасць партызанскіх атрадаў, створаных на тэрыторыі сённяшняй

Беларусі (табл. Д.18.1.): Т.Пуслоўскага, Ю.Кашыца і М.Мержыеўскага, С.Незабітоўскага і А.Бронскага, Я.Жылінскага, ксяндза Ламберта і С.Малаховіча, Я.Ронкі і К.Нямцэвіча, Я.Шрэцера, А.Солтана, К.Гоўвальда, Я.Далубоўскага і А.Скродскага [507,с.23-24]. У «Спісах асоб, якія прымалі дзейны ўдзел у польскім паўстанні 1831 г...» склад гэтых атрадаў характарызуецца наступнымі словамі: «рознага роду валацэнгі, шляхта, збеглыя салдаты, дваравыя людзі», сяляне, «рознага зброду людзі і збеглыя рознага звання», стральцы з варты Белавежскай пушчы, памешчыкі, ксяндзы, афіцыялісты, чыноўнікі, «рознага звання асобы» [250, ф.4, воп.1, спр.192, а.14 адв., 61 адв.,62 адв.,77 адв.,213 адв.; ф.1, воп.27, спр.64, а.244 адв., 257, 261 адв.,268,301]. «Алфавітны спіс удзельнікаў паўстання 1830 г.» па Гродзенскай губ., складзены следчай камісіяй, уключае прозвішчы 474 чалавек. Намі падлічана, што шляхціцаў было 107, сялян — 99, памешчыкаў і іх сыноў — 55, дваран — 25, вайскоўцаў — 26, дзяржаўных служачых — 16, студэнтаў і гімназістаў — 21, святароў і іх дзяцей — 17, служачых у памешчыкаў — 18, мяшчан — 5, настаўнік — 1, невядомага паходжання — 65. На тэрыторыі Гродзенскай губ. па месцы паходжання яны размеркаваліся наступным чынам: Навагрудскі павет — 97 чал., Слонімскі — 57, Лідскі — 39, Ваўкавыскі — 37, Гродзенскі — 35, па іншых паветах Гродзенскай губ. — 80, расійскіх губерняў — 1, Каралеўства Польскага — 3, невядомых — 94 [250, ф.4, воп.1, спр.192]. Прыкладам могуць быць паўстанцы з Мастоўшчыны: сяляне С.Дзяшко, Ф.Курпінскі, Ф.Трусевіч; памешчыкі М.Матусевіч, браты І. і Ф.Палубінскія, Ф.Шабанскі, Антоні Эйсымонт, князь Е.Сапега; шляхціцы Актавіян Эйсымонт і Мінучыц, а таксама 37 паўстанцаў з Ваўкавыскага павета [425, с.137-141; 432, с.122-125].

Найбольш сур'ёзныя падзеі адбываліся ў Белавежскай пушчы, якая ў красавіку — чэрвені была месцам канцэнтрацыі паўстанцаў Гродзеншчыны. Значны лясны масіў, які меў каля 160 вёрст у акружнасці і да 50 вёрст у даўжыню і знаходзіўся на мяжы Беластоцкай вобласці і Гродзенскай губ., стаў прытулкам для 800—1000 чал. [507, с.25-26; 109, с.52]. Базу падрыхтаваў оберфармайстар (галоўны ляснічы інспектар) Б.П.Ронка. Канспірацыйную арганізацыю пачалі складаць яшчэ ў красавіку ўласны сакратар губернатара Т.Краскоўскі і доктар Шчапінскі, а потым узначаліў К.Нямцэвіч. Сябрамі былі Белапятровіч, С.Незабытоўскі, Я.Жылінскі, Білгарайскі і іншыя

(усяго 16 чал.). Былы капітан войска польскага, легіяніст Я.Жылінскі стаў начальнікам войска. Белавежскія паўстанцы нападалі на рускі казённы транспарт (1 мая ў Каралеўскага маста, 16 мая ў р.Гвозны), паштовыя станцыі (Старадворацкую Ваўкавыскага пав.), гарадскую казну, невялікія атрады рускіх войск, стваралі перашкоды для сувязі дзеючай арміі з унутранымі губернямі Расіі [670, с.241,245,251-252; 548, с.27-28; 250, ф.4, воп.1,спр.34, а.7].

Таму перад царскімі ўладамі стаяла задача ліквідаваць белавежскіх паўстанцаў, ачысціць ад іх пушчу і аднавіць зносіны Брэста і Гродна. 8 мая генерал-ад'ютанту Разэну даносілі аб адпраўцы са Слоніма ў Пружаны дзвюх рот Галіцкага пяхотнага палка, а таксама маёра жандармскага корпуса Ожыгава на чале 50 чал. для агляду Белавежскай пушчы. 10 мая Разэн накіраваў туды падпалкоўніка Гурскага з двума эскадронамі Валынскага ўланскага палка, а затым — падпалкоўніка Сарабію з трыма ротамі Мурамскага палка, 1 гарматаю і 14 казакамі. У ноч з 14 на 15 мая Гурскі даў бой пад Ялаўкай у Святлічанскай стражы (хроніку падзей гл. табл. 4.3.2). Большая частка паўстанцаў у гэты час была ў р.Гвозна, дзе 16 мая адбыўся бой. 18 мая да названых рускіх войск далучыўся генерал Ліндэн з Жытомірскім палком, полуэскадронам валынскіх улан і 2 гарматамі. 23 мая ў Гайнаўцы адбыўся бой Ліндэна з рэгулярным польскім войскам на чале з Хлапоўскім. Пасля яе Ліндэн пайшоў на Белавежу, затым — на Шэрашава. Разам з генерал-маёрам Галавіным яны ліквідавалі рэшткі паўстанцаў, захапілі іх лагеры, запасы зброі і прадуктаў. Большая частка белавежскіх паўстанцаў яшчэ раней на чале з Жылінскім і Шчапінскім адышла ў Беластоцкія лясы, атрад Ронка далучыўся да Хлапоўскага, Я.Шрэцер — да польскай вайсковай часці Г.Дэмбінскага [296, с.273; 548, с.28; 670, с.256; 250, ф.4, воп.1, спр.34, а.5-7 адв.; спр.11, а.3; спр.10, а.9,41-42 адв.; ф.4, воп.4, спр.41, а.2-4].

Як бачым, на тэрыторыі Беларусі апынуліся рэгулярныя польскія войскі. Адбылося гэта пасля бітвы пад Астралэнкай (18.05), калі галоўнакамандуючы Скржынецкі загадаў Д.Хлапоўскаму, А.Гелгуду, Раланду і Г.Дэмбінскаму ісці на дапамогу Літве і Беларусі. Хлапоўскі ў сваіх «Запісках» успамінае, што яшчэ 15 снежня 1830 г. у лісце да генерала Хлапіцкага прапаноўваў перайсці Нёман і Буг 1 лютага і падняць паўстанне на Літве і Валыні. Але тады гэты план не спадабаўся памяркоўнаму дыктатару. Цяпер Хлапоўскі атрымаў задачу

давесці на былую тэрыторыю ВКЛ 200 афіцэраў і падафіцэраў, прызначаных інструктарамі для мясцовых паўстанцаў. Ён выбраў 520 салдат 1-га уланскага палка, 100 лепшых салдат і 3 афіцэраў з 1-га палка пешых стральцоў (сярод іх паручыка Ш.Канарскага) — усяго набралася 820 чалавек, якіх пасадзілі на коней. 18 мая Хлапоўскі адышоў ад галоўных сіл і хуткім маршам праравайся паміж корпусам расійскай гвардыі і войскам Дзібіча, 21 мая ступіў на беларускую зямлю. Далейшы маршрут выглядаў наступным чынам: Бельск-Бярозава-Дубіна-Гайнаўка-Масева-Рудня-Крынкі-Мсцібава-Волпа-Ражанка-Гарлянка-Жалудок-Ліда-Мыта-Араны і г.д. Хлапоўскі ўспамінаў: «Калі мы праходзілі праз вёскі, народ спачатку прызнаваў нас за маскалёў і не адразу хацеў верыць, што мы Палякі, а калі ўпэўніваўся, дык плакаў ад радасці, прыносіў прадукты, што толькі меў, ніколі не хацелі браць грошы, тым не менш я прымушаў іх браць грошы за авёс і сена, гаварыўшы, што маю на гэта строгі загад» [561, ч.2, с.10,52,57; 556, с.251; 250, ф.4, воп.1, спр.17].

Праз заходнюю частку Гродзенскай губерні прайшоў на Віленшчыну А.Гелгуд. Ён стаў камандуючым усіх польскіх часцей, якія апынуліся на Літве і Беларусі. У гэтай якасці праявіў сябе не з лепшага боку, зрабіў шэраг памылак, а таму прайграў бітвы на Панарскіх вышынях пад Вільнам (19.06.1831) і пад Шаўлямі (8.07) [579, с.15,16,26,213,217; 614, с.124]. З яго імем звязана дзейнасць Цэнтральнага Польскага Часовага ўрада ў Літве (12.06 — 13.07). У склад яго ўвайшлі: старшыня Т.Тышкевіч, віцэ-старшыня і кіраўнік ваеннага аддзела князь Г.Агінскі, кіраўнік аддзела паліцыі (унутраных спраў) А.Гелгуд, аддзела адміністрацыі (інтэндантскі) М.Залескі, аддзела фінансаў К.Кантрым, аддзела рэкруцкага Кучэўскі, замежнага Ю.Страшэвіч, сакратар генерал Е.Таміцкі. Урад цалкам залежаў ад камандуючага Гелгуда, бо згодна з актам ўстанаўлення ён зацвярджаў яго сяброў, урад знаходзіўся пры галоўнай кватэры арміі, выконваў перш за ўсё загады камандуючага. З дзейнасці ўрада вядомы яго распараджэнні да мясцовых камітэтаў: аб арганізацыі паштовых станцый, аб правядзенні іх паседжанняў для выканання пастаноў урада, аб стварэнні кніг ахвяраванняў, аб арганізацыі вайсковых сіл і інш. Мясцовым камітэтам пераслалі па 4 экземпляры вядомай нам пастановы сейма, у якой за насельніцтвам былога ВКЛ прызнаваліся тыя ж правы і свабоды, што і за насельніцтвам

Каралеўства Польскага. Камітэты павінны былі данесці яе да насельніцтва праз касцёлы, цэрквы, абвяшчэнні на вуліцах, праз свае публікацыі. Такім жа чынам распаўсюджваўся зварот сейма да насельніцтва Літвы. Страшэвічу было даручана выпускаць урадавую газету, дзе патрэбна друкаваць звароты да арміі, пастановы ўрада, заклікі да насельніцтва, былую гісторыю Літвы пад уладай рускіх, падзеі паўстання, навіны, патрыятычныя публікацыі і д.п. [652, с.246-258].

Разам з Гелгудам дзейнічаў Дэмбінскі, які на нарадзе ў Куржанах (9.07) прыняў рашэнне прабівацца назад у Каралеўства Польскае. На чале 3656 чалавек батальёна пяхоты, 6 гармат і 2 эскадронаў кавалерыі прайшоў праз такія беларускія населеныя пункты, як: Жодзішкі, Смаргонь, Альшаны, Іўе, Гаўя, Уселюб, Альхоўка, Дзятлава, Дзярэчын, Зэльва, Ізабэлін, Поразава. Дэмбінскаму ўдалося дайсці да Варшавы і ў хуткім часе стаць галоўнакамандуючым польскай арміі [556, с.251-252; 649, с.271, 272, 279, 280,408,409; 665, с.231-234,332-338,345-347; 250, ф.4, воп.1, спр.42, а.9,9 адв.; спр.54, а.1-3 адв.]. У час праходжання Дэмбінскім Навагрудскага павета актывізаваліся мясцовыя патрыёты. Ю.Кашыц і М.Мержыеўскі стварылі ў маёнтку Ятра партызанскі атрад (гл. табл. Д.18.1). Згодна са спісам, складзеным Гродзенскай следчай камісіяй, у ім было 119 чалавек са шляхты, памешчыкаў, чыноўнікаў, вучняў Дамініканскага вучылішча (школы). 19 ліпеня атрад напаў на м.Гарадзішча, дзе знаходзіліся коні і рэчы рэзервовага эскадрона Валынскага ўланскага палка. 21 ліпеня адбыўся напад на м.Беліцу, дзе раззброілі этапную каманду і забралі яе амуніцыю і харчаванне. Па данясенню Лідскага земскага спраўніка, паўстанцкі атрад налічваў да 400 чал. Частка яго на чале з Мержыеўскім пайшла на Дзятлава, дзе захапіла паштовых коней, другая частка на чале з Кашыцам падалася на Навагрудак. 22 ліпеня эскадрон гусар князя Фердынанда на чале з палкоўнікам Фэлькерсамба пакінуў горад, а ў 4 гадзіны папалудні ўвайшлі паўстанцы. 23 ліпеня ў Навагрудак прыйшлі польскія часткі Дэмбінскага на чале з яго ад'ютантам капітанам Лямпіцкім. 24 ліпеня паўстанцы пакінулі Навагрудак і пайшлі ў Пуцэвічы, куды сцягваліся і іншыя паўстанцы павета. Адсюль пайшлі ў Дзятлава, а па дарозе злучыліся з Дэмбінскім, які накіроўваўся ў Белавежскую пушчу. 28 ліпеня Навагрудак быў заняты царскімі войскамі генерала Ігельстрома, і ў пачатку жніўня паўстанцкія акцыі ў павеце закончыліся [457; 495; 629, с.25-27; 643, с.156-

159; 250, ф.4, воп.1, сп.49, а.10-11, 28-32; воп.27, спр.64, а.152,157-158,160,167,175,276-302; спр. 42, а.5-7; спр.75, а.1,3,6].

На тэрыторыю Мазырскага павета Мінскай губерні ў маі праніклі аўручскія паўстанцы, а ў чэрвені-ліпені 1831 г. дзейнічаў паўстанцкі атрад Ф.Кяневіча. Ён у чэрвені спрабаваў захапіць Мазыр, але беспаспяхова і вымушаны быў перанесці свае дзеянні ў Рэчыцкі павет. Тут дзейнічалі атрады Паскіркі і Крушэўскага. Жыхары м.Нараўля і Барбарава прынеслі прысягу паўстанцам, а з сялян памешчыка Горвата збіраўся партызанскі атрад [496; 73, с.59].

У самой Варшаве ў сеймавыя паслы выбіраліся новыя пасланцы Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці. Прадстаўляючы паслоў з Мінскай губ., маршалак сейма У.Астроўскі 11 жніўня 1831 г. звярнуў увагу на тое, што «цяпер, калі Айчыне пагражае большая небяспека, яшчэ большай увагі заслугоўваюць тыя, хто ў такія хвіліны хоча быць удзельнікам нашых паседжанняў і выбірае гэтую пару, каб злучыцца з намі, стаць у абарону Айчыны і смела прысягнуць з намі яе цэласці, вольнасці і незалежнасці». Пасол са Слуцкага павета В.Пяткевіч на такія словы адказаў: «Засядаем зараз тут, каб ужо ніколі ад вас не былі аддзелены. Калісьці мы мелі адзіную Айчыну, некалькі дзесяткаў гадоў назад адзіныя закранулі нас няшчасці, адзіныя потым былі мучэнні, адзіныя памкненні, адзіныя надзеі злучаюць цяпер; яшчэ хвіліну вытрымаем, а пры агульных намаганнях, дасць Бог, убачым адзіную і непадзельную з двух народаў Польшчу» [568, т.6, с.439-448]. Пра Беларусь і Літву не забываліся польскія патрыёты нават у цяжкія часы перад падзеннем Варшавы. М.Махнацкі добра апісаў гэтую сітуацыю: «Гаворачы вайсковаю моваю: нашай аперацыйнай лініяй быў у гэты час правы бераг Віслы, яе фронтам — Вісла, яе тылам — забраныя правінцыі, дзе ў залежнасці ад адпору пад Варшаваю магла ўзмацніцца рэакцыя» [630, т.2, с.444]. Перад штурмам Варшавы фельдмаршал І.Ф.Паскевіч прапанаваў польскаму ўраду кампраміс на ўмовах заставацца пад скіпетрам Расіі і пры дамовах не чапаць Літву і Русь. Генерал Даненберг, праз якога перадавалася прапанова, данёс Паскевічу, што «Пан Крукавецкі (старшыня ўрада — *В.Ш.*) надаслаў мне ліст, у якім выказаўся супраць праліцця крыві і засведчыў, што палякі паднялі зброю за нацыянальную незалежнасць у межах, якія раней дзялілі іх з Расіяй...» [цыт. па: 689, с.111-112; 255, с.93].

Яшчэ калі ішло паўстанне («междоусобная война», як выказаўся гісторык Шыльдэр), Мікалай I ужо задаваў сабе пытанне, «што трэба рабіць пасля другога пакарэння паўстаўшай краіны». Ён думаў пра новы падзел Польшчы паміж тымі ж самымі дзяржавамі і пераносе расійскай мяжы на Віслу і Нараў, але далейшы ход падзей змяніў намеры ў адносінах да палякаў. Былыя ж тэрыторыі ВКЛ заставаліся ў складзе Расійскай імперыі, а Мікалай I, як піша ягоны гістарыёграф, няўсыпна працаваў «над зліццём заходніх нашых губерняў, у адносінах да іх законаў і звычаяў, з вялікарускімі» [421, с.18, 251].

Лістападаўскае паўстанне ў Беларусі пацярпела паражэнне па шэрагу прычын:

1. Непадрыхтаванасць паўстання з боку Віленскага цэнтральнага камітэта, які залежаў ад загадаў Нацыянальнага ўрада ў Варшаве і таму дзейнічаў нерашуча, непаслядоўна і не меў плана дзейнасці.

2. Павятовыя органы кіравання не былі створаны па ўсёй Беларусі, не былі звязаны паміж сабой, а Цэнтральны Польскі Часовы ўрад у Літве быў арганізаваны ў апошнія месяцы паўстання.

3. Несвоечасовая дапамога Варшавы, якая спазнілася з пасылкай рэгулярных польскіх войскаў на тэрыторыю Літвы і Беларусі.

4. Адсутнасць адзінства і паразумення ў кіраўніцтве вышэйназваных польскіх войскаў. Пасіўныя дзеянні А.Гелгуда і яго тактычныя памылкі.

5. На Беларусі сказалася адсутнасць адзінства ў дзеянні рэвалюцыйнага ўрада і польскай арміі.

6. Нявырашанасць аграрнага пытання, што прыводзіла часам да прымусу сялян да ўдзелу ў партызанскіх атрадах.

Пасля падаўлення паўстання пачаліся рэпрэсіі. 31 кастрычніка 1831 г. выйшаў указ Мікалая I на імя Віленскага і Гродзенскага ваеннага губернатара князя Далгарукава, у якім прадпісвалася стварыць над галоўнымі паўстанцамі ваенны суд і ажыццявіць пакаранне на месцах, «где ими злодеяния их учинены». З указа была зроблена копія і разаслана камендантам, павятовым маршалкам і чынам паліцыі [250, ф.1, воп.3, спр.1120, а.7 адв.,810]. Так, у Гродне дзейнічалі: губернская следчая камісія «для определения степени вины мятежников, секвестра и конфискации их имений» (8.12.1831 – 11.12.1834 г.), камісія «для допроса лиц, принимавших участие в восстании

1831 г.» (студзень — лістапад 1832 г.), губернская ліквідацыйная камісія, якая займалася канфіскацыяй маёнткаў паўстанцаў. Падобныя камісіі працавалі ў Вільні, Мінску, Беластоцкай вобл., Падольску, Кіеве, Валыні [250, ф.1, воп.3, спр.1124, а.2; ф.4, воп.1, спр.209, а.2; воп.1, спр.177, а.1; 249, ф.143, воп.1, спр.3133, а.6]. Вынікі дзейнасці камісій разгледзім на прыкладзе гродзенскіх. Першыя дзве камісіі дапрасілі і разгледзелі справы некалькіх сотняў чалавек, якіх падзялілі на спісы: 13 «упорнейших участников»; 99 асоб, «участие коих в возмущении было не столь велико и кратковременно»; 146 чалавек, «перешедших с мятежниками за границу», 88 паўстанцаў «в неизвестной отлучке находящихся»; 168 чалавек «разного звания, переданные лично для обнаружения участия их в возмущении»; 240 чалавек, якія «причислены в разряды» і знаходзяцца ў адлучцы [250, ф.4, воп.1, спр.177, а.1 адв.-5]. Невінаватыя вызваляліся па царскай амністыі ад 4(15).10.1832 г. і павінны былі ўладкавацца на былым месцажыхарстве, вінаватыя «простолюдины» ссылаліся на вайсковую службу ў сібірскія лінейныя батальёны, ваеннапалонныя і беглыя рэкруты перадаваліся ў ваеннае ведамства.

Ліквідацыйная камісія папрацавала «на славу»: у спісе асоб, маёнткі якіх падлягалі канфіскацыі, быў 531 чалавек. 60 маёнткаў у Гродзенскай губ. было канфіскавана. Сярод іх найбольш буйныя: Дзярэчын і Ражана з фальваркамі Л.Паца (4740 чал.), Зэльва з фальваркамі Сапегі (1177 чал.), Свіслач с фальваркамі Тышкевіча (2036 чал.) [250, ф.4, воп.1, спр.209, а.1-17; ф.1, воп.20, спр.471, а.296 адв.-306]. Пакутавалі не толькі людзі, але і рэчы. Напрыклад, са Свіслацкага палаца Т.Тышкевіча, Дзятлаўскага палаца А.Солтана і Дзярэчынскага палаца Е.Сапегі былі вывезены ў Пецярбург (Эрмітаж, Публічную бібліятэку, Акадэмію мастацтва, дырэкцыю царскіх тэатраў) творы мастацтва (карціны, скульптуры, бюсты, статуэткі), посуд, залатыя і сярэбраныя рэчы, кнігі і рукапісы, мэбля [583, с.227-229].

Паражэнне Лістападаўскага паўстання мела значны ўплыў на маральны стан і палітычнае жыццё беларускага грамадства. Вось што гавораць сучаснікі з Навагрудчыны. Вядомы мемуарыст Э.Паўлоўскі піша: «Менавіта ў гэтым мэта захопніцкіх урадаў, тут ахілесава пята заваёванага народа! Грамадскасць, маральна і матэрыяльна знясіленая, пазбаўлена энергіі, не спасобна да ініцыятывы, перастае быць бяспечнай» [644, с.14]. Н.Керсноўскі ўспамінаў: «Грамадскасць, разбуджаная выбухам паўстання, пачатак якой абудзіў столькі надзей, з яго

упадкам прыцiснутая ў сваiх намаганнях i парывах, убачыўшая сябе зачыненай як бы ў вялiкай турме, пазбаўленая святла асветы, пазбаўленая грамадскага жыцця, а з iм усякага руху, якi мог годна заняць думкi i сэрца, вымушана гэту энергiю i гэту сiлу ўжываць на дробныя мэты, замкнутыя ў вузкiм коле сяброўскага жыцця, таму што толькi гэта было магчыма... Карнавальныя забавы ў горадзе i на вёсцы, паляванне, кiрмашы (у Зэльве, Нясвiжу), кантракты, вiзiты, iмянiны, асамблеi з цэлым арсеналам павятовых i парафiяльных плётак — гэта было звычайным заняццем i галоўнай мэтаю намаганняў i амбiцыяў, якiя ў большай частцы захапiлi грамадскасць Лiтвы таго часу» [592, с.159,161].

Такiм чынам, у Лiстападаўскiм паўстаннi польскi нацыянальны рух у чарговы раз узняў пытанне аб адраджэннi Рэчы Паспалiтай у межах 1772 г. Доказам гэтага з'яўляюцца заклiкi рэвалюцыйнага сейма да насельнiцтва Беларусi i Лiтвы, прыход сюды вайсковых часцей рэгулярнай польскай армii, стварэнне Цэнтральнага польскага часовага ўрада ў Лiтве. Мясцовыя (лiцвiнскiя) патрыятычныя сiлы здолелi арганiзаваць партызанскi рух, адцягнуць на сябе значныя сiлы царскiх войск з мэтаю падтрымкi агульнага паўстання супраць Расii i аднаўлення унii незалежнай Лiтвы (ВКЛ) з Каралеўствам Польскiм.

## 4.6. **Першы этап беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ( 1794 — 1863 гг.)**

Па вызначэнню даследчыка А.К.Каўкi, «беларускi нацыянальна-вызваленчы рух — грамадскi рух за вызваленне беларускага народа з-пад каланiяльнага ўцiску, нацыянальнае адраджэнне беларусаў, за iх самастойнае свабоднае развiццё на аснове сваёй дзяржаўнасцi, здзяйсненне ўласнай суб'ектна-творчай ролi ў агульначалавечай цывiлiзацыi» [159, с.445]. Як i ён, у працэсе вывучэння матэрыялаў мы прыйшлi да высновы, што першы этап беларускага нацыянальна-вызваленчага руху адбываўся ў перыяд з 1794 г. па 1863 г., гэта значыць ад паўстання пад кiраўнiцтвам А.-Т.Касцюшкi да Студзеньскага паўстання. Перш за ўсё нацыянальнае адраджэнне беларусаў праяўлялася ў навуковай, лiтаратурнай, культурна-асветнiцкай дзейнасцi лепшых прадстаўнiкоў так званай краёвай шляхты i духавенства. Менавiта на першым этапе беларускага

нацыянальна-вызваленчага руха ішло станаўленне беларускай фалькларыстыкі, этнаграфіі, мовазнаўства, гісторыі.

Адбываўся сістэматычны запіс беларускіх вуснапаэтычных твораў: песен, казак, паданняў, святаў, звычаяў, прыказак і інш. Я.Чачот (1796—1847) у 1837—1846 гг. выдаў у Вільні 6 фальклорных зборнікаў «Вясковыя песенькі з-над Нёмна і Дзвіны...», у якія ўвайшло каля 1000 песен у арыгінале і ў перакладзе на польскую мову, а ў шостым зборніку былі яшчэ і прымаўкі [37, с.611]. Аляксандр Рыпінскі (каля 1811 — каля 1900) у 1840 г. выдае кнігу «Беларусь. Некалькі слоў аб паэзіі простага люду гэтай нашай польскай правінцыі, аб яго музыцы, спевах, танцах і г.д.». Ян Баршчэўскі (1790 ці 1794—1851) апублікаваў у 1844—1846 гг. «Шляхціца Завальню, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». У 1847 г. выходзіць «Апісанне Барысаўскага павета» Яўстафія Тышкевіча (1814—1873), а ў 1851 г. — «Простанародныя песні Пінскага люду» Рамуальда Зянькевіча (1811—1868). Цікавыя працы публікуе Павел Шпілеўскі (1823—1861): «Беларускія народныя паданні» (1846) і «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» (1853—1856). У трох выпусках «Этнографического сборника», які выдаваўся Расійскім геаграфічным таварыствам, апублікаваў свой твор «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1858) Адам Кіркор (1819—1886). Шмат фальклорнага матэрыялу маюць зборнікі Л.Галембеўскага, У.Сыракомлі, Р.Падбярэскага, А.Глінскага [392,с.77—79].

У станаўленні беларускай этнаграфіі значную ролю адыграла вышэйназваная кніга Я.Тышкевіча, якая не мела сабе роўнай у той час і стала настольнай для пазнейшага пакалення этнографаў. Аўтар грунтоўна апісаў вяселле, абрады Дзядоў, Каляд, Радаўніцы, Спаса і ўсяго цыкла гаспадарчага гадавога календара беларусаў [45, с.64-66; 242, с.578]. Багаты этнаграфічны матэрыял змяшчалі 16 нарысаў працы П.Шпілеўскага «Беларусь...»: беларускія казкі, побыт беларусаў (радзіны, хрысціны, вячоркі, пахаванні і інш.), народныя песні. Яго 13 гісторыка-этнаграфічных і публіцыстычных нарысаў, апублікаваных у часопісе «Современник» пад назвай «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі» (1853—1855), мелі апісанне побыта сялян, іх адзення, жылля, абрадаў, святаў, песен, казак і паданняў. Шпілеўскі прыйшоў да высновы, што беларусы — гэта асобны народ. Гэтай жа думкі прытрымліваўся Міхаіл Без-Карніловіч (1796—1862). У сваёй кнізе «Гістарычныя звесткі

пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе ж адносяцца» (1855) ён разгледзеў этнічную тэрыторыю, побыт і культуру беларусаў [242, с.368, 601]. Працы І.Юркевіча, А.Кіркора і М.Анімеле друкаваліся ў 4 выпусках «Этнографического сборника» ў Пецярбурзе (1853—1858). Каля 20 артыкулаў было надрукавана ў рускім перыядычным друку Пецярбурга, Масквы і Кіева [45, с.65-66]. У першай палове XIX ст. з'яўляецца шэраг кніг, прысвечаных беларускай мове. Зарыян Даленга-Хадакоўскі (1784—1825) упершыню ў славянскім мовазнаўстве вылучыў беларускую мову (ён называў яе крывіцкай) з іншых славянскіх моў, вызначыў некаторыя яе фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці, арэал распаўсюджвання. Упершыню ён звярнуў увагу на гістарычныя помнікі беларускай мовы (Статут ВКЛ, граматы XVII ст.), склаў «Батаніка-заолага-астранамічны слоўнік», які мае багаты збор беларускай лексікі, але, на жаль, застаўся ў рукапісу. «Беларускі архіў старажытных грамат» выдаў у Маскве гісторык і мовазнавец Іван Грыгаровіч (1792—1852). У кнізе было шэраг дакументаў на беларускай мове, якія захавалі мясцовы характар і імёны славутых асоб, заслугоўваючых на гістарычную памяць. У рукапісу засталіся яго два слоўнікі беларускай мовы: «Збор слоў літоўска-рускай (беларускай) гаворкі» і «Слоўнік заходнерускай гаворкі». Я.Чачот у 6-м зборніку сваіх «Вясковых песенек...» змясціў два слоўнікі: «Слоўнік беларускіх слоў» і «Некаторыя крывічскія ідыёмы з Наваградскага павета». Гэтым Чачот паклаў пачатак практычнай лексікаграфіі. Крывічамі Чачот называў беларусаў, а іх мову — крывіцкай, славяна-крывіцкай, «дыялектам крывіцкім» [37, с.165-166,173-174,612].

Педагог і мовазнавец Фёдар Шымкевіч (1802—1843) выдаў у 1852 г. «Караняслоў рускай мовы, параўнанай з усімі найгалоўнейшымі славянскімі гаворкамі і з дваццаццю чатырма замежнымі мовамі». Сярод утварэнняў розных слоў пададзена больш за 880 беларускіх слоў («літоўска-рускіх»). Гэтым вучоны зрабіў прыкметны крок на шляху параўнальна-гістарычнага вывучэння роднасных славянскіх моў і стварыў першы этымалагічны слоўнік з выкарыстаннем беларускага матэрыяла. П.Шпілеўскі напісаў «Кароткую граматыку беларускай мовы» і «Слоўнік беларускай гаворкі» (1845), «Нататкі беларусца пра беларускую мову». Гэтыя працы змаглі бы ўпэўніць у самабытнасці і арыгінальнасці беларускай мовы (а не «наречия»

рускай або польскай мовы), але на жаль, не маглі быць апублікаваны. У сваіх этнаграфічных працах Шпілеўскі таксама прыводзіў шмат цікавых звестак аб лексічных, фразеалагічных, фанетычных і граматычных асаблівасцях беларускай мовы, выказваў арыгінальныя думкі пра яе паходжанне, гісторыю і межы распаўсюджвання [37, с.627,625; 86, с.232].

Пачалося адраджэнне гістарычнай памяці беларусаў. Мы ўжо ўспаміналі «Беларускі архіў старажытных грамат» І.Грыгаровіча. Іаахім Лялевель (1786—1861) у 1818 г. дапоўніў падручнік Т.Вагі «Гісторыя польскіх князей і каралёў» раздзеламі па гісторыі Белай Русі і Літвы, а ў 1839 г. апублікаваў «Гісторыю Літвы і Русі аж да Люблінскай уніі з Польшчай 1569 г.». На жаль, не была надрукавана напісаная Ігнатам Анацэвічам (1780—1845) на багатых матэрыялах са сховішчаў Літвы, Кёнігсберга, Польшчы, Беларусі, Расіі «Гісторыя Літвы». Тэадор Нарбут (1784—1864) выдаў дзевяць з дзесяці напісаных тамоў «Старажытнай гісторыі літоўскага народа» (1831—1841). Трохтомнік «Вобраз Літвы з пункту гледжання цывілізацыі ад найстаражытнейшых часоў да канца XVIII стагоддзя» (1844-1845) апублікаваў Іосіф Ярашэвіч (1793-1860). Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі гісторыю Беларусі зрабіў самастойным прадметам даследавання А.Турчыновіч у сваім «Агглядзе гісторыі Беларусі са старажытных часоў» (1857) [153, с.27; 242, с.346,481,509].

Для беларускага адраджэння і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці вялікую ролю адыграла стварэнне беларускай школы літаратуры. Навогул літаратура, па словах нямецкага гісторыка культуры Ёгана Гердера, «самая дакладная мера росту нацыі», а для славян, падкрэсліваў у сваіх парыжскіх лекцыях А.Міцкевіч, яна выконвае ролю «трыбуны, штандара, амаль што ваеннай тэрыторыі» [129, с.66; 627, т.2, с.11]. Несумненным фактарам літаратурнага жыцця Беларусі была ананімная літаратура. Нельга не ўспомніць «Песню беларускіх жаўнераў» 1794 г., якая заклікала беларусаў даць «сабе рукі ўзаем» і ісці да касцюшкаўскіх паўстанцаў, каб «адзыскаць» бацькаўшчыну [218, с.37-38; 424, с.98, 101-102]. У атмасферы распаўсюджвання тэорыі афіцыйнай народнасці ў 1845 г. з'явілася «Энеіда навыварат», якая доўгі час лічылася ананімнай, а цяпер, дзякуючы літаратуразнаўцу Г.Кісялёву, мы ведаем аўтара — памешчыка Духаўшчынскай акругі Смаленскай губерні В.П.Равінскага [162; 280, с.13]. Па словах А.Лойкі, гэта паэма

ў процівагу тэорыі была «як жывое сведчанне зусім іншых думак аб простым народзе, аб яго стаўленні да жыцця, да прыгонніцтва, да паноў» [206, с.59]. Кісялёў устанавіў імя аўтара (К.Вераніцын) яшчэ адной ананімнай паэмы «Тарас на Парнасе», напісанай у Гарадку ў 1855 г., якая сцвярджае «неўміручасць народа, яго мудрасць, таленавітасць, жыццярадаснасць, дасціпнасць» [162; 206, с.133].

Як удалося ўстанавіць вядомаму беларускаму даследчыку Адаму Мальдзісу, першымі ці аднымі з першых прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры былі драматургі з Забельскай калегіі Каятан Марашэўскі і Міхаіл Цяцерскі. Першы напісаў «Камедыю», беларускі тэкст якой займае прыкладна тры пятых часткі твора (па-беларуску размаўляюць селянін Дзёмка і яўрэй-карчмар). Другі зрабіў польска-беларускую пераробку камедыі Ж.-Б.Мальера «Доктар па прымусу», у якой па-беларуску таксама размаўлялі сяляне Хфёдар і Апанас. Абедзве камедыі былі пастаўлены ў калегіі ў 1787 г. [217, с.394-395].

Пэўнае месца ў станаўленні новай беларускай літаратуры належыць Я.Чачоту. Яго літаратурна-грамадскую дзейнасць А.Лойка слушна падзяляе на два перыяды: раннефіламацкі (да 1823 г.) і позні ( з 1833 г.). У першы перыяд перад намі рамантычны юнак-філамат, жыццярадасны і грамадзянска актыўны, піша рамантычныя творы, заснаваныя на гісторыі, звычаях і культуры простага народа. У другі — гэта самотны чалавек, хворы пасля зняволення, схільны да кабінетнай ціхы вучоны-этнограф і мовазнавец, выдаўшы зборнікі «Вясковыя песенькі...» і свае беларускія вершы [206, с.88-89]. Крытычныя водгукі на Чачотавы зборнікі ў часопісах «Тыгоднік Пецярбургскі», «Бібліятэка Варшаўская», «Рубон» далі магчымасць сучаснікам, як піша Г.Кісялёў, «паразважаць аб багацці і каштоўнасці беларускага фальклору і яго выкарыстанні ў літаратуры» [163, с.123]. 28 беларускіх вершаў, змешчаных у чацвёртым зборніку «Вясковыя песенькі...» (у сучасным выданню «Наваградскі замак» іх ужо 31), і польскамоўныя творы Чачота (аперэта «Малгажата з Зембаціна», балады «Свіцязь-возера», «Мышанка», «Наваградскі замак», «Калдычэўскі шчупак») сцвярджаюць, што іх аўтар — беларускі нацыянальны паэт [242, с.598; 37, с.611; 408, с.29-56].

Адным, але яскравым вершам «Заграй, заграй, хлопчэ малы...» увайшоў у беларускую літаратуру крошынскі ўраджэнец Паўлюк Багрым. Ён вучыўся на добрым прыкладзе — вершы

Яна Баршчэўскага «Размова хлопаў» («Рабункі мужыкоў»), якія атрымаў, як гаварыў на следстве, ад нейкага салдата ў 1812 г. Ведаў творы Адама Нарушэвіча (1733—1796), Эзопа, чытаў «Брукавыя весці», выдаваемыя ў Вільні шубраўцамі. Пісьменнік і грамадска-палітычны дзеяч І.Яцкоўскі параўнаў Багрыма з шатландскім паэтам Робертам Бёрнсам (1759—1796) [280, с.188,189,201-202]. Дарэчы, у зборніку «Палітычныя творы» Яцкоўскага і быў захаваны верш Багрыма, а сам зборнік надрукаваны ў тотнэмскай друкарні Аляксандра Рыпінскага [218, с.180]. Звярніце ўвагу, якая атрымалася цікавая сувязь пачынальнікаў: Баршчэўскі-Багрым-Рыпінскі.

Рыпінскага мы ўжо ўспаміналі як аўтара кнігі «Беларусь...», выдадзенай на падставе раней прачытанага рэферата аб беларускім фальклоры. У 1853 г. ён выдаў у Лондане двухтомнік: першы том быў прысвечаны «роднаму гораду» Віцебску, у другім былі змешчаны польскія творы і беларуская балада «Нячысцік» [218, с.103-104]. Апошнюю Рыпінскі спрабаваў надрукаваць у Расійскай імперыі, але атрымаў адказ па прычыне, сфармуляванай прафесарам І.Срэзнеўскім у дакладзе М.М.Мусіну-Пушкіну наступным чынам: «Аўтар яе Аляксандр Рыпінскі вядомы як пісьменнік, які аддаены ўзбуджальным ідэям і выказаў іх, дарэчы, і ў адносінах да Беларусі ў кніжцы «Беларусь...», а таксама таму, што балада «прапаноўваецца да друку лацінскімі літарамі, тады як яна напісана па-руску на мясцовай гаворцы (г.зн. па-беларуску лацінкаю — *В.Ш.*)». Да таго ж Пецярбургскі цэнзурны камітэт далучыў гэты твор Рыпінскага да ліку забароненых [280, с.182]. У святле гэтай характарыстыкі думаецца, што сучасны даследчык У.Бандарчык не правільна абвінавачвае Рыпінскага ў польска-шавіністычных пазіцыях. Больш аб'ектыўную ацэнку дае А.Фядосік, пішучы, што «ў выдадзенай кнізе «Беларусь...» адлюстроўваецца не столькі імкненне аднесці Беларусь да Польшчы, колькі замілаванне беларускай народнай паэзіяй» [45, с.64; 392, с.78]. Ды погляды Рыпінскага змяняліся: у канцы жыцця ён заняўся напісаннем гісторыі беларускай літаратуры, пісаў у лісце да А.Плуга аб тым, што «можа дарэмна мы горнемся да гэтай няшчаснай Польшчы, як народжаныя на Русі, якую і даўней, здаецца, ужо называлі польскай Сібір'ю». Ёсць запіс Рыпінскага ў «Альбоме» А.Вярыгі-Дарэўскага [280, с.176,272-274]. А сцэнічны абразок апошняга «Адвячорак» знаходзіўся сярод папер Рыпінскага, якія былі ў прафесара БДУ

М.Піятуховіча [218, с.123-124]. Наш ланцужок пачынальнікаў, прыведзены вышэй, дапоўніўся яшчэ адным прозвішчам — Вярыга-Дарэўскі.

Асобна хочацца адзначыць жанчыну-літаратара, прозвішча якой, на жаль, яшчэ невядома. Пад сваёй паэмай «Мачаха» (1850) яна падпісалася «Адэля з Устроні», значыць, паходзіць з Лідскага павета. З'яўленне гэтага твора — яскравае сведчанне таго, што цяга да беларускага слова была не толькі на Віцебшчыне і Міншчыне, але і ў Прынямонні [206, с.109].

Да беларускай літаратурнай спадчыны, несумненна, адносяцца творы польскамоўных літаратараў: Адама Міцкевіча (1798—1855), Юзафа Крашэўскага (1812—1887), Уладзіслава Сыракомлі (Л.Кандратовіча, 1823—1862), Вінцэся Каратынскага (1831—1891). Перш усяго тым, што галоўным іх героем была Літва-Беларусь: яе краявіды, насельніцтва, яе працоўнае жыццё і святочныя дні, паданні і легенды, гісторыя і сучаснасць [гл.: 242, с.456,468,501-503,566-567; 436, с.132,136]. Вось што сказаў пра міцкевічаўскага «Конрада Валенрода» тагачасны крытык пад псеўданімам С.Шчырапольскі (!): «Можа быць еўрапейскім творам — згода — але польскім ніколі!» [цыт. па: 595,с.68]. У творчасці названых літаратараў яскрава вызначаўся «літоўскі рэгіяналізм». Напрыклад, Сыракомля нават меў псеўданім «Лірнік Літвы», а Крашэўскі гаварыў пра яго: «З сапраўдным запалам мог толькі пра тое спяваць, што было ў яго сэрцы... пра Літву, яе палеткі, яе вёскі і лясы, народ і яго долю». З Каратынскім Крашэўскі збіраўся выдаць кніжку вершаў на беларускай мове [цыт. па: 206, с.118,121].

Беларускае нацыянальнае кнігадрукаванне толькі пачынала ўзнаўляцца. Многія выдаўцы выкарыстоўвалі своеасаблівае «прыкрыццё»: змяшчалі беларускамоўныя тэксты сярод польскамоўных; беларускія кнігі мелі тытулы і прадмовы на польскай мове. Але з'яўляліся ўжо і кнігі, цалкам аформленыя па-беларуску. Прыкладам можа быць выдадзены ў 1859 г. пераклад В.Дуніна-Марцінкевіча «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча. Цэнзура не прапусціла кнігу да чытача і знішчыла тыраж, на сённяшні дзень вядома аб захаванні 4 экзэмпляраў кнігі [163, с.83]. Як мы ўжо ведаем, не ўдалося ў 1853 г. надрукаваць па-беларуску (лацінкай) сваю паэму «Нячысцік» А.Рыпінскаму. Адмоўным вынікам скончыўся праект выдання беларускага часопіса, задуманага Р.Падбярэскім, У.Сыракомляй, Э.Жалігоўскім, С.Манюшкам і іншымі ў 1849 г. [164, с.30-36].

Царскі ўрад не пагаджаўся на развіццё беларускай мовы, бо лічыў, што лепш няхай ужываецца польская мова, бо супрацьдзейнічаць палякам-католікам лягчэй, чым беларусам. Пісаць па-беларуску ў той час азначала пісаць у стол. Слушна адзначыў К.Цвірка: «Пісьменнік Беларусі, калі ён хацеў уздзейнічаць мастацкім словам на грамадскую думку ў змаганні як за сацыяльнае, так і нацыянальнае вызваленне свайго народа, змушаны быў пісаць па-польску. Гэтак жа, як часта пісалі ў свой час па-нямецку дзеячы чэшскага нацыянальнага адраджэння...» [408, с.25]. У верасні 1858 г., калі імператар Аляксандр II прыехаў у Вільна, група літаратараў і публіцыстаў прыпаднесла яму «Віленскі альбом», у якім быў і верш «Уставайма, братцы, да дзела, да дзела», напісаны па-беларуску В.Каратынскім [41, с.105]. Гэты факт сведчыць аб тым, што твор на беларускай мове быў пастаўлены побач з прызнанымі афіцыйна рускай, польскай і французскай мовамі. Верш Каратынскага быў як бы заяўкай на права пісаць на роднай мове, па-беларуску.

Мовазнавец і гісторык Т.Мікуліч, адзначаючы ролю мовы ў развіцці этнічнай самасвядомасці, піша: «Яна выступае ў якасці аднаго з механізмаў этнагенэзу, перадае спецыфічны вопыт прадстаўнікоў дадзенай супольнасці пры дапамозе сінхронных і дыяхронных моўных сувязей» [229, с.21]. Прызнаючы гэты факт, мы павінны вызначыць і спецыфіку Беларусі канца XVIII — 1 паловы XIX стст. — мова не была паказальнікам этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці. Слушна пра гэта сказаў А.Станкевіч: «Як вядома, у 2-ой палове XVII ст. і асабліва ў XVIII ст. таварыскай і хатняй моваю беларускага вялікага панства сталася мова польская, але патрыётамі свайго народа і свайго гаспадарства яны засталіся. Маем тут дачыненне не з утратаю нацыянальнага свядом'я, але з утратаю свядом'я моўнага, як гэта сталася з жыдамі яшчэ да Хрыста і шмат пасля з ірляндцамі» [346, с.127-128]. На наш погляд, фарміравалася новая літаратурная беларуская мова, яна стала адыгрываць ролю аднаго з паказальнікаў нацыянальнай самасвядомасці. У беларускай гістарыяграфіі па гэтаму пытанню няма адзінага погляду. Так, Я.Карнейчык лічыць, што ў першай палове XIX ст. ідзе працэс фарміравання адзінай беларускай мовы, а У.Конан піша толькі аб станаўленні беларускай мовы і літаратуры. Арыгінальны погляд у М.Сямёнчыка: ніякага ўзнікнення новай беларускай мовы «не адбывалася, таму што яна, як любы жывы

арганізм, ужо існавала, як існавала Амерыка да таго, як яе адкрылі. Іншая справа, з'яўленне яе перад чытачом падаецца як прыкмета працэса стварэння новай беларускай мовы, а гэта не тое ж самае» [147, с.86; 170, с.61; 352, с.35].

Беларускае адраджэнне выявілася і ў іншых галінах мастацтва. У 1840-х гадах А.Абрамовіч напісаў песні на словы Я.Баршчэўскага і музычнае сачыненне па паэме «Беларускае вяселле». Закладваюцца асновы беларускага нацыянальнага тэатра ў Забельскай калегіі, дзе, як мы ўжо ведаем, на школьнай сцэне былі пастаўлены беларуска-польскія камедыі К.Марашэўскага і М.Цяцерскага. Па словах тэатразнаўца Г.І.Барышава, да «Камедыі» Марашэўскага ні адна школьная драма ў Беларусі «не дэманстравала такіх убогіх, забітых і зняважаных людзей» [29, с.63]. «Лекар па прымусу» быў напісаны Цяцерскім, магчыма, па гродзенскаму выданню Ж.-Б.Мальера (1787), улічваючы ўмовы школы: жаночыя ролі заменены на мужскія, французскія сяляне — на беларускіх, якія размаўлялі і паводзілі сябе, як полацкія вяскоўцы [74, с.44; 29, с.67]. 9 лютага 1852 г. на мінскай сцэне была пастаўлена першая беларуская опера «Сялянка» («Ідылія»), лібрэта да якой напісаў В.Дунін-Марцінкевіч, а музыку — С.Манюшка і К.Кржыжаноўскі. Тэатральную трупу складалі Дунін-Марцінкевіч, ягоныя дачкі Каміла і Мальвіна, сын Міраслаў, працоўны друкарні Ляўданскі, Авер'ян Васільеў і яго сын Якаў, вучні школы ў Люцынцы і іншыя «любіцелі беларускага слова». Опера была ў гэты ж дзень забаронена, бо ішла на «простонародном языке» [407, с.171]. Беларуская тэма знаходзіць сваё адлюстраванне ў карцінах В.Ваньковіча, Я.Дамеля, В.Дмахоўскага Я.Траяноўскага, Ю.Карчэўскага [426, с.36-37; 425, с.126; 494, с.111].

Прыкметы нацыянальнай кансалідацыі праявіліся ў пачатку XIX ст., што было звязана са складваннем мясцовай інтэлігенцыі. Яна рэкрутавалася галоўным чынам з духавенства (часцей уніяцкага), беднай шляхты і некаторых прадстаўнікоў шляхты і інтэлігенцыі польскай арыентацыі, якія, як слушна піша Л.Лыч, «згодны былі штосьці такое зрабіць і па ажыццяўленню тут беларускага духу, каб сумеснымі сіламі супрацьстаяць магутнаму асімілятарскаму патоку, што ўжо не першы год нёсся з усходу» [214,7.09,с.2]. Уніяцкае духавенства ў 1820-я гады пачало супраць польскага ўплыву ў абарону сваёй народнасці адчыняць школы для навучэння царкоўна-славянскай мове. Напрыклад, у Гродзенскай губерні шырокай

вядомасцю карысталася царкоўная школа м.Клешчалі Бельскага павета [176, с.8].

Спачатку ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ўзнікаюць у асяроддзі выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага універсітэта. Пазней цэнтрамі інтэлектуальнага жыцця былі так званыя гурткі: А.-Г.Кіркора ў Вільні, В.Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А.Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. У Пецярбургу беларускія адраджэнцы групаваліся вакол Я.Баршчэўскага.

У Віленскім універсітэце беларуская ідэя нараджалася ў асяроддзі уніяцкіх святароў прафесараў М.Баброўскага і П.Сасноўскага, сыноў уніяцкіх святароў прафесараў І.Даніловіча і І.Анацэвіча, гаспадара універсітэцкай друкарні А.Марціноўскага, а таксама І.Ярашэвіча, Т.Нарбута, І.Лялевеля, М.Балінскага. Разумеючы сваю прыналежнасць да ВКЛ і ўсведамляючы сябе нашчадкамі вялікай гістарычнай спадчыны, яны лічылі неабходным падтрымліваць памяць аб сваёй нядаўна згаснуўшай Радзіме. А таму яны даследавалі беларускую гісторыю, права, мову, фальклор, этнаграфію; ускладалі надзеі на унію як нацыянальную рэлігію, на вяртанне дзяржаўнага статуса беларускай мове. «Ад песняў аб красе і нядолі жыцця народаў, ад навуковых доследаў над гісторыяй і мовай народаў, — пісаў А.Станкевіч, — беспасрэдны пераход да барацьбы за лепшае палітычнае і сацыяльнае жыццё» [343, с.13; 682, с.292]. Марціноўскі любіў і ведаў свой край, рэдагаваў часопіс шубраўцаў «Вулічныя навіны» (1816—1822), быў рэдактарам-выдаўцом газеты «Літоўскі веснік» (1817—1839) і навукова-літаратурнага часопіса «Віленскі дзённік», друкаваў у сваёй друкарні «Гісторыю літоўскага народа» Т.Нарбута, «Летапісец Літвы і хроніку рускую» ў апрацоўцы І.Даніловіча, творы І.Красіцкага, І.Легатовіча і іншых, сабраў вакол сябе студэнтаў-уніятаў універсітэта і вучняў з яе галоўнай семінарыі, заахвочваў іх даследаваць беларускую мінуўшчыну, а таленавітых з іх перадаваў у рукі М.Баброўскага і І.Даніловіча [242, с.493; 666, с.8]. Цяпер, думаем, зразумела, чаму вядомы М.М.Мураўёў-Вешальнік назваў Віленскі універсітэт «гнездилищем литовского вольнодумства» [153, с.34].

На традыцыях філаматаў і філарэтаў, а таксама вышэйназванай групы вучоных і звязаных з імі студэнтаў і прыхільнікаў «беларушчыны» сфарміравалася ў 1850-я гады так званая «літоўская партыя» (ці грамадска-літаратурны гурток) А.-Г.Кіркора: літаратары У.Сыракомля, В.Каратынскі,

А.Адынец, былы шубравец І.Ходзька, гісторыкі М.Маліноўскі (былы філамат) і Я.Тышкевіч, журналіст В.Пшыбыльскі, кампазітар С.Манюшка. Відаць, з імі былі звязаны і тыя віленцы, якія пакінулі свае запісы ў «Альбоме» Вярыгі-Дарэўскага: паўстанец 1831 г. і ўдзельнік літоўска-беларускіх канспірацыйных арганізацый Гіпаліт Платон Пасербскі, паўстанец 1831 г. Аляксандр Тамаш Віктар Карэва, гісторык М.Балінскі, сябра Дэмакратычнага таварыства Ф.Савіча А.Рэніер, настаўнік Віленскай гімназіі Р.Саковіч, паўстанец 1831 г. В.Матушэвіч [163, с.464; 164, с.71-81; 357, с.15]. Характарыстыку гэтага цэнтра інтэлектуальнага жыцця далі даследчыкі А.Цвікевіч і М.Каяловіч. Першы пісаў, што яны «хоць і лічылі сябе палякамі, былі польскай культуры і бачылі будучыню краю ў сувязі з адроджанай Польшчай, але нацыянальна ці, лепш сказаць, этнаграфічна адрознівалі сябе і ад Варшавы, і ад усяго карэнна польскага», «людзі гэтыя жылі ўспамінамі аб Літоўскім княстве, аб гістарычнай асобнасці краю», «цесна былі звязаны з уніяй і са ўсёй той беларускай стыхіяй, якая ў ёй захоўвалася праз вякі». Такім чынам, Цьвікевіч пісаў, што беларуская ідэя развівалася побач з польскай культурай і ў «літоўскім» (або «крывіцкім») абліччы [414, с.104,106,147].

«Літоўскай партыяй», або «польскай партыяй лепшых людзей», назваў віленскую групу інтэлектуалаў, сабраных вакол Кіркора М.Каяловіч, асабіста знаёмы з ім з 1862 г. На жаль, артыкул Каяловіча «Несколько слов о народном движении в Белоруссии» з-за бібліяграфічнай рэдкасці быў нам недаступны, таму цытату прыводзім па кнізе Цьвікевіча. «Паводле іх переконаньня, — піша Каяловіч, — народу беларускаму паграseverity тая самая небясьпека, як і народу польскаму, ад нясправядлівых дамаганьняў на верхавенства (преобладание) расійскай нацыянальнасьці. Яны цьвердзяць, быццам беларусы ніколі ня былі дый ня хочуць быць расійцамі і ў той жа час яны адмаўляюцца ад намеру апалячваць беларуса. Паводле іх слоў, гісторыя вырабіла для беларусаў асобную нацыянальнасьць і вярнула ім тую самую веру, якая існавала да падзелу цэркваў пад вярхоўным адзінствам рымскага папы: захаваньне ў частасьці і недатыкальнасьці гэтае нацыянальнасьці і гэтае веры стварае сьвяты абавязак польскага народу. Яны кажуць, што кожны з гэтых народаў (беларусы і палякі) валодае ўсімі ўмовамі для самастойнага і своеадменнага развіцця і мае на гэтае поўнае права, якое, на няшчасце, яшчэ не ўвайшло ў свядомасць

народных мас... Яны хочуць усіх пераканаць, у тым ліку і саміх сябе, што ў літоўска-беларускіх правінцыях дваранства ня хоча і ня мае патрэбы абяртацца ў польскае, што яно прыняло мову і цывілізацыю польскую толькі часова, для развіцця ўласных (г. зн. беларускай мовы і цывілізацыі), і што нават сваё чыстае каталіцтва яно заменіць уніяй, калі народ вызначае яе сваёй пануючай верай» [цыт. па: 414, с.156-157].

Практычным выражэннем поглядаў гуртка Кіркора стала падача 6 верасня 1858 г. Аляксандру II «Віленскага альбома», які змяшчаў сярод рознамоўных твораў беларускі верш В.Каратынскага. Карэнныя палякі ўспрынялі гэтае выступленне ліцвінаў як нацыянальную здраду [414, с.105; 357, с.14, прим.20]. Частка гуртоўцаў працавала ў створанай у 1855 г. Археалагічнай камісіі пад старшынствам графа Я.Тышкевіча. У яе дзейнасці царская адміністрацыя ўбачыла праявы «польскага і літоўскага» сепаратызму [153, с.34].

У 1840—50-я гады вакол першага прафесійнага беларускага пісьменніка В.Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску сгрупавалася мясцовая творчая інтэлігенцыя — літаратары, музыканты, мастакі. Не сустрэўшы ў крыніцах склад гэтай групы, мы паспрабавалі самі вылічыць яго: музыканты С.Манюшка, Дамінік і Вікенці Стафановічы, Каміла Марцінкевіч, настаўнік і аўтар падручнікаў Фларыян Чапялінскі, фатограф Антон Прушынскі, Мікалай Парфіяновіч, студэнты Канстанцін і Рамуальд Рагоўскі, рэвалюцыянер-дэмакрат Антон Трусаў, падпаручнік С.Беліновіч, удзельнікі тэатральнай трупы і іншыя. На вядомым фатаграфічным здымку сярод 19 асоб ёсць многія з іх, а пра погляды гаворыць вопратка чатырох людзей, апранутых у чамаркі — сімвал належнасці да рэвалюцыйна-патрыятычнага руху [164, с.46,214-220; 163, с.95]. Літаратуразнавец Г.Кісялёў пра лідара мінскіх інтэлектуалаў гаварыў: «Ён як бы падхапіў сцяг, што выпаў з аслабелых рук Чачота», бо здарылася так, што ў адзін і той жа 1846 г. у Вільні былі надрукаваны «Вясковыя песенкі» Чачота і «Сялянка» Дуніна-Марцінкевіча [164, с.8]. Беларускі Дудар (так называў сябе Дунін-Марцінкевіч), як нам ужо вядома, спрабаваў выдаць свой пераклад А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Гэтым ён хацеў паказаць прыдатнасць беларускай мовы ўвасабляць значныя мастацкія творы, праз сусветна вядомы шэдэўр вялікага Міцкевіча даць ёй «дыплом на высакароднасць» [164, с.8; 129, с.67]. Ён пісаў І.Крашэўскаму: «Жывучы сярод народа, які

гаворыць на беларускай мове, звязаны целам і душой з яго складам думак, разважаючы аб лепшай долі гэтага братняга народа, які закаснеў у адсталасці і цемры, рашыў я абудзіць яго цікаўнасць да асветы, у духу яго звычаяў, паданняў, легенд і схільнасці душэўнай пісаць на яго роднай мове» [цыт. па: 357,с.25-26]. Як мы пісалі вышэй, Дунін-Марцінкевіч са сваімі прыхільнікамі заклаў зародак беларускага нацыянальнага тэатра, а, акрамя гэтага, яго дачкі — Каміла ў Мінску, Цэзарына і Элёдыя ў Люцынцы ўтрымлівалі школкі для беларускіх дзяцей [280, с.117].

Арганізатарам віцебскага грамадска-інтэлектуальнага гуртка стаў Арцём Вярыга-Дарэўскі. Магчыма, у яго ўваходзілі: удзельнік рэвалюцыйнага руху 1840-х гадоў і будучы паўстанец 1863 г. Браніслаў Люткевіч, паэт Ялегі Пранціш Вуль і яго бацька Маўрыкі Корбут (Карафа-Корбут), гітарыст Марк Сакалоўскі, Аўгуст Кусцінскі, начальнік віцебскай тэлеграфнай станцыі Конрад Абрампальскі (удзельнік маніфестацый 1861 г.), віцебскія прадвадзіцелі дваранства Міхаіл Нітаслаўскі (да 1859 г.) і Станіслаў Драздоўскі (з 1859 г.), архітэктар Мікалай Высоцкі, Вінцэнт Квяткоўскі, штабс-капітан інжынер шляхоў зносін Ігнат Пржасецкі і іншыя [280,с.223,224,260-263,267,275-276,290; 357,с.23]. Польскі піяніст А.Хадэцкі пакінуў у «Альбоме» А.Вярыгі-Дарэўскага надпіс, які характарызуе яго і людзей, сабраўшыхся вакол Беларускай Дуды (як любіў падпісваць свае творы Арцём): «Хоць здалёку мы прыбылі, але дзеці агульнай з вамі маці, звязаныя звяном аднолькавых пакут і адной надзеі, мы лёгка зразумелі адзін аднаго, хутка пазнаёміліся. Вы ж, браце, цягнеце тыя ж кайданы над Дняпром, як і мы над Віслай. Дык наша становішча аднолькавае, а пакуты лёгка аб'ядноўваюць... Мы ж, калі вернемся да нашых хатніх ачагоў, раскажам нашым братам, што (...) нацыянальны дух яшчэ жыве, і хоць хаваецца ён у закутках, як першыя хрысціяне ў рымскіх катакомбах, аднак, ён моцны, бо мае на варце людзей, якія яму не дазваляюць застыць» [280, с.265-266]. І хочацца працытаваць яшчэ адзін запіс пра Вярыгу-Дарэўскага, зроблены выкладчыкамі канвікта (школы-інтэрната) Гільзена-Шадурскіх: «Дарагая Беларусь! Прыгледзься да яго дзейнасці, яго энергіі, самаахвярнасці. Паглядзі, як ён вучыць тваіх дзяцей любіць радзіму, як вядзе іх дарогаю праўды, прагрэсу, і хай сляза бацькоўскай удзячнасці хоць часткова ўзнагародзіць гэту распачатую ім працу. Вучыш нас, пане, роднай мове, запальваеш добрую думку, выклікаеш

найвышэйшыя пачуцці, дык хай табе бог адплаціць, а мы і ўся наша ўстанова благаслаўляем тваё імя» [280, с.267]. Са спраў гуртка вядома наступнае: гадоў з дзесяць утрымліваў прыяцельскую чытальню режыцкі лекар Юзаф Багенскі, такая ж была ў Віцебску, збіралі грошы на адкрыццё бібліятэкі ў ваколіцах Віцебска Арцём і Сымон Вярыгі-Дарэўскія, збіралі народныя прытчы, казкі, паданні, распаўсюджвалі падпіску на віленскія часопісы А.-Г.Кіркора, на творы А.Міцкевіча і пераклад яго «Пана Тадэвуша» Дуніным-Марцінкевічам, стварылі аматарскую тэатральную трупу. Сам Вярыга-Дарэўскі па-беларуску пісаў свае творы (невядомыя «восемь сшытачкаў», пасланыя да У.Сыракомлі). Кіркору 13 кастрычніка 1862 г. ён прызнаваўся: «З Беларушчынай не разбратаўся. Гэта мой ідэал. Можа, дарэмна на яе трачуся. Што ж рабіць — «Па Хомку шапка» [280, с.225,29,235,236,239,243].

Называючы факты па кожнаму з трох беларускіх цэнтраў грамадска-культурнага жыцця, мы ўказвалі на кантакты паміж імі, але засяродзім на гэта ўвагу спецыяльна. Зрабіць гэта патрэбна, таму што сувязь паміж імі ўказвае на аб’яднанне гістарычнай Літвы з Белай Руссю, на фарміраванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці на ўсёй тэрыторыі сённяшняй Беларусі, на паступовую кансалідацыю беларускай нацыі. Сімвалам гэтых працэсаў можа быць знакаміты «Альбом» А.Вярыгі-Дарэўскага, які вёўся на працягу 1858—1863 гг. У ім пакінулі свае запісы і віленчане, і мінчане, і віцябляне. В.Каратынскі прысвячае Вярыге-Дарэўскаму верш «Далі бог-то, Арцім..», якім падкрэслівае, што правінцыяльная розніца паміж імі (ліцвін і беларус) не павінна перашкаджаць аб’яднанню сяброў, якія ствараюць «з вякоў адно цела і кроў». Успамінаемыя намі настаўнікі канвінкта Гільзена-Шадурскіх назвалі «Альбом» «кнігай, якая злучае нашу Беларусь з Літвой» [280, с.243, 245-280]. Доказамі наяўнасці сувязяў паміж трыма цэнтрамі з’яўляецца таксама карэспандэнцыя. Нават толькі тое, што захавалася: Вярыга-Дарэўскі пісаў да Кіркора ў Вільна (1858—1863 гг.) і перапісваўся з дзеячамі Мінска, Дунін-Марцінкевіч карэспандаваў з Кіркорам. Ён жа пабываў у Вільні, на Віцебшчыне і Магілёўшчыне [280,с.226-243; 206,с.105]. Па словах Цьвікевіча, Дунін-Марцінкевіч, а таксама Ян Баршчэўскі «безварункова духова былі з ёй (Вільнай — *В.Ш.*) зьвязаны» [414, с.105].

Названае прозвішча Баршчэўскага дазваляе нам перайсці да аповеду пра яшчэ адзін беларускі цэнтр, які находзіўся па-за

межамі края, у Пецярбургу, але быў звязаны, як бачым, з гурткамі ў родным краі. Па ўспамінах В.Газдавы-Рэвута, вакол Баршчэўскага сабіраліся беларусы, якія пад яго ўплывам сталі цікавіцца беларушчынай і спрабавалі друкаваць свае творы. Сярод іх былі: журналіст і крытык Р.Падбярэскі, літаратуразнаўца і гісторык Ю.Барташэвіч, мастакі К. і Р.Жукоўскія, фальклафыст І.Храпавіцкі, пісьменнікі Л.Штырмер, В.Рэут, Т.Лада-Заблоцкі, А.Гроза, В.Давід, С.Ляховіч, А.Грот-Спасоўскі; Г.Шапялевіч. Восенью 1839 г. пецярбургскія студэнты, якія паходзілі з Беларусі, Літвы і Польшчы, заснавалі свой друкаваны орган «Nezabudka» (1839—1844), выдаўцом якога стаў Я.Баршчэўскі [403, с.9; 242, с.366]. Р.Падбярэскі выдаў часопіс «Rocznik Litieracki» (1843—1849), К.Буйніцкі — «Rubon» (1842-1849), якія змяшчалі і беларускія матэрыялы на польскай або беларускай мове (лацінкай). Вакол іх склалася адпаведнае кола чытачоў і аўтарскі актыў. Сучаснікі высока ацэньвалі «Шляхціца Завальню, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», напісаную Баршчэўскім. Напрыклад, тагачасны крытык В.Пракаповіч праводзіў аналогію ў прыёмах кампазіцыі паміж гэтым творам і казкамі Шахеразады або апавяданнямі Сервантэса [163, с.122]. Ксёндз І.Галавінскі пісаў пісьменніку М.Грабоўскаму пра тое, што Баршчэўскі «шчыры беларус, не цяпер, а з самага дзяцінства правёў ён з народам усё жыццё» [цыт. па: 403, с.12].

Большасць пачынальнікаў беларускага культурнага адраджэння не называлі сябе беларусамі, бо, як слушна піша сучасны польскі даследчык Б.Белаказовіч, «не ўсвядамлялі сабе, хто яны па нацыянальнасці, і зусім лёгка зжываліся з тэрмінам «ліцвін» [553, с.51-52]. «Ліцвінамі, — піша другі польскі даследчык Р.Радзік, — сябе лічылі тыя, хто вёў сябе з грамадзянства Вялікага княства Літоўскага, без погляду на этнічна-культурныя падзелы. Літоўскай была шляхта, якая выводзіла сябе як з этнічна літоўскіх родаў, так і з беларускіх, якая ў сваю чаргу ўсіх сваіх сялян, нягледзячы на іх мову і вызнанне, лічыла ліцвінамі. Літоўскасць азначала родавае паходжанне, сувязь з краем, яго грамадскасцю, гісторыяй, прыродай, лакальнымі супольнасцямі...» [цыт. па: 553, с.52]. Шляхецкая эліта называла сябе «gente Lithuani (Rutheni), natione Poloni» (або пішуць яшчэ так: «gente Lithuanus (Ruthenus), nationae Polonus» — палякамі ліцвінскага або русінскага паходжання, а інакш па паходжанню ліцвін (беларус), па

нацыянальнасці паляк [205, с.6; 210, с.139; 384, с.9]. «Ліцвін (русін), — піша ў сваёй другой працы Р.Радзік, — адначасова адчуваў сябе палякам — падобна таму, як цяпер брэтонец з'яўляецца французам. Палітычна-тэрытарыяльная «літоўскасць» была ў паўсядзённым жыцці бліжэй мясцовай эліце (вызначала іх будзённае акружэнне), чым ідэалагічная «польскасць», якая абуджалася значна радзей» [300, с.91].

Ліцвінамі сябе лічылі А.Міцкевіч, А.-Т.Касцюшка, бацька А.Чартарыйскага, прафесар ксёндз Ст.Юндзіл, біскуп Смаленскі і Луцкі, паэт і гісторык А.Нарушэвіч, гісторык І.Лялевель, кампазітар С.Манюшка, літаратар Л.Сыракомля і шмат іншых вядомых людзей, якіх адносяць да польскай культуры. Прыкладам праяўлення ліцвінскай самасвядомасці можа быць Адам Кіркор. Калі яго жонка (А.Маеўская) пад уплывам сваіх варшаўскіх знаёмых папракнула яго ў не вельмі прыязных адносінах да Польшчы і патрабавала, каб ён змяніў свой патрыятызм, дык Кіркор адказаў: «Ты добра ведаеш, як я люблю Літву, як ненавіджу (зашыфраванае слова, магчыма, Расію). Ты хочаш, каб я змяніў патрыятызм... Ты ведаеш, як я цябе кахаю, але, аднак, калі б у глыбіні душы я быў перакананы, што ты ўжо не ліцвінка, а толькі полька — маё каханне знікла б адразу... Ці Літва, для таго, каб быць з Польшчай, павінна перастаць быць Літвой? Не! Я ліцвін, — і ніколі гэта пачуццё ў ва мне не будзе знішчана. Я люблю сваю радзіму з усім юначым энтузіязмам, з усёй мужчынскай самаахвярнасцю. Маю сэрца і адчуваю сімпатыю да Польшчы настолькі, наколькі яе лёс звязаны з нашым» [цыт. па: 130, с.215].

Калі прадстаўнікі беларускай літаратуры, даследчыкі беларускай культуры, удзельнікі нацыянальна-вызваленчай барацьбы характарызаваліся, па словах даследчыцы Т.Мікуліч, «ярка выяўленай этнічнай самаіндэнтыфікацыяй і ўстойлівай развітой этнічнай самасвядомасцю», дык «асноўная маса беларускага насельніцтва толькі ўцягвалася ў актыўныя этнакансалідацыйныя працэсы» [229, с.83]. У 1863 г. была выдадзена кніга «Рассказы на белорусском наречии», у якой можна было прачытаць такое сцвярджэнне: «А і мы запэўна саўсім не ляхі: мы самі па сабе народ асобны — Беларусы». Даследчык І.Запрудскі лічыць, што «Рассказы» напісаны на дыялектах Віцебшчыны. Працытуем яшчэ адзін урывак з

дыдактычнага расказа «Большая ошибка наших белорусов»: «Ці ж гэта ня праўда, калі ў нас мужыкоў католікаў завуць Палякамі? Прынаймней, гэтак робяць у Дзісненскім уездзе. Ідзіцё вы па сялу, дзе жывуць мужыкі католікі і праваслаўныя, пытаецеся: «Хто жыве ў такой-та і такой хаце?» Вам гаворяць: «Католікі ці Палякі». А ў другой хаце хто жыве?» Вам адкажуць: «Русакі жывуць, Рускія ці праваслаўныя». Вот тутыцька і вялікая памылка наша і падабенства да цыган, што тыя з нас, каторыя веруць па-каталіцку, завуцца Палякамі. Якія яны Палякі? У іх мова простая, беларуская, звычаі простыя, беларускія; і звычаі, і мова ў мужыкоў католікаў тыя самыя, што і мужыкоў праваслаўных, ці рускіх. Хто добра ведае Палякаў, іх мову і звычаі, той ніколі не скажа, каб мужык-католік быў пахож на Паляка» [241, с.16].

Наступны прыклад прывядзем па Гродзенскай губерні. Палемізуючы з Р.Эркертам наконт яго сцвярджэння аб тым, што вопратка, звычаі, увесь лад жыцця робяць беларусаў-католікаў палякамі, П.Баброўскі пісаў: «Беларусы, не ведаючы, што яны беларусы, захавалі і ў штодзённай гутарцы, і ў песнях, і ў прыслоўях свае азначаныя нацыянальныя, лагічныя формы, свой азначаны характар, свае праявы, звычаі і г.д. Беларус-селянін, ці будзе ён праваслаўны, ці католік, мае свае перакананні, сваю маральную філасофію і перадае гэта разам з мовай сваім дзецям і ўнукам. Ксёндз і памешчык ніколі не скажуць аб беларусу каталіцкага веравызнання, што ён беларус, а скажуць — ліцвін. Пагутарыце з гэтым ліцвінам, і вы пачуеце беларускую гаворку. Падчас нашай працы ў Гродзенскай губерні мы мелі этнаграфічныя спісы насельніцтва ад святароў і ксяндзоў. На спісах тых сяляне, як праваслаўныя, так і католікі, названы ліцвінамі, і тут прыкладзены ўзоры іхняе мовы — вы думаеце літоўскай? Не — беларускае. Ксёндз рабіў гэта таму, што беларусы калісьці ўваходзілі ў склад народнасцей Літоўскае дзяржавы» [цыт. па: 247, с.14].

Чэшскі вучоны П.Шафарык прыводзіць колькасць беларусаў у 1840 г. — 2726000 чалавек, з іх: праваслаўных — 2376000 чал. (87,2%), католікаў — 350000 чал. (12,8%). Параўнальныя даныя па пяці губернях (у працэнтах) глядзі ў табліцы 4.2 [247, с.11-13].

Табліца 4.2.

*Колькасць беларускага насельніцтва ў 1857 і 1863 гадах*

| Губерні | М.Лябёдкін (1857 г.) | А.Рыці (1863 г |
|---|---|---|
| Віленская | 17,4 | 46,9 |
| Віцебская | 62,4 | 59,8 |
| Гродзенская | 3,3 | 57,9 |
| Мінская | 65,1 | 64,6 |
| Магілёўская | 84,2 | 81,7 |
| Усяго абсалют. | 1973873 чал. | Каля 2800( |

Пачатковыя праявы беларускай нацыянальнай ідэалогіі назіраліся і ў дзейнасці патаемных арганізацый. Мы ўжо ведаем аб таварыствах філаматаў і філарэтаў (гл. раздзел 3.3), аб Таварыстве зямель літоўскіх і рускіх у эміграцыі (гл. раздзел 3.2). Але, як слушна адзначыў яшчэ ў 1921 г. даследчык беларускага руху Ф.Ф.Турук, найбольшыя зрухі былі пасля Лістападаўскага паўстання і ў асяроддзі студэнцтва былога Віленскага універсітэта [384, с.9]. У 1836-1838 гг. у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі існуе «Дэмакратычнае таварыства», створанае дзецьмі уніяцкіх святароў Францам Савічам і Феліксам Зданевічам. Яны хацелі «адрадзіць сярод віленскага студэнцтва традыцыі філарэтаў, абудзіць у ім дух Адама Міцкевіча і Тамаша Зана» [327, с.199-200]. У склад таварыства ўваходзілі не толькі студэнты, але і выхадцы з разначыннага асяроддзя і дробнай шляхты. Яны вялі агітацыю сярод маладых рамеснікаў, напрыклад, Рапчынскі прадставіў «чым яны ёсць, чым могуць і чым павінны быць» [240, с.554]. Падрабязны разгляд гісторыі данага таварыства не ўваходзіць у нашы планы, і мы хацелі бы звярнуць увагу толькі на факты, якія адлюстроўваюць сувязь з беларускім адраджэннем.

У праграмных палажэннях «Дэмакратычнага таварыства» было патрабаванне права народаў на нацыянальную самастойнасць: «Усе нацыі роўныя, і ніхто не павінен адчуваць нянавісць адзін да аднаго, нягледзячы нават на нацыянальныя адрозненні, на тое, рускі ён, паляк ці яўрэй, што сама нават асаблівасць веравызнання не павінна дзяліць людзей» [238, с.33].

Сябры таварыства былі працiўнiкамi распальвання нацыянальнай рознасці і адстойвалі ідэю рэвалюцыйнага саюзу братніх народаў. Прыкладам братэрства, аб'яднаўшага беларусаў, палякаў, рускіх, яўрэяў, было само таварыства, якое, дарэчы, мела свой кароткі заклік «За нашу і вашу свабоду!» [294, с.544]. Сяброўства народаў — адна з галоўных тэм вершаў Савіча. Захаваўся адзін з іх пад назваю «Дзе ж тое шчасце падзелася?..», у якім ёсць такія словы:

Ліцвін, валынец, падайце мне рукі,
Так — прысягаем на госпада-бога.
Царам — на згубу, панам — для навукі...

Трэба дадаць, што сам Савіч быў беларусам-пінчуком [407, с.68-69]. Ёсць думка, што з яго Ян Баршчэўскі «спісаў» вобраз лекара Саматніцкага для «Шляхціца Завальні...» [403, с.26]. Блізкія знаёмыя Савіча браты Рэніер, Галамбеўскі, Дэмбіцкі збіралі беларускі фальклор. Аніцэнт Рэніер у 1862 г. складаў пасля смерці У.Сыракомлі бібліяграфічнае апісанне яго кнігазбору [223, с.13]. Меў сувязь з таварыствам Р.Падбярэскі, бо ў 1836 г. жыў у Вільні некалькі месяцаў, а потым пераехаў у Маскву. Яго пасля следства над сябрамі «Дэмакратычнага таварыства» узялі пад сакрэтны нагляд [238, с.89].

З лета 1846 па красавік 1849 г. на тэрыторыі Літвы і Белай Русі дзейнічала патрыятычная арганізацыя рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку пад назваю Саюз свабодных братоў (або *Змова братоў Далеўскіх, Братэрскі саюз, Братэрскі саюз літоўскай моладзі*). Заснавальнікамі і кіраўнікамі яе былі ўраджэнцы Лідскага павета браты Францішак (1825 — 1904) і Аляксандр (1827 — 1862 ) Далеўскія. Цэнтр ССБ знаходзіўся ў Вільні, аддзяленні — у Мінску (Н.Махнач лічыць мінскую арганізацыю самастойнай), Навагрудку, Лідзе, Гродне, Ашмянах, Слоніме, Коўне, Паневежысе. Сябры Саюза былі таксама ў Пецярбурзе, Кіеве, Адэсе, Маскве. ССБ імкнуўся аб'яднаць розныя сацыяльныя пласты: вучнёўскую і студэнцкую моладзь, маладых рамеснікаў і рабочых, разначынскую інтэлігенцыю, шляхту, сялянства, салдат (Мінскага гарнізона і Бабруйскай крэпасці). Агульная колькасць сяброў дасягнула 200 чалавек, сярод іх 45 вучняў з Мінска. Галоўнай мэтаю ССБ было нацыянальнае адраджэнне Рэчы Паспалітай «праз працу, праўду і справядлівасць». Вырашэнне яе патрабавала барацьбы за сацыяльнае і духоўнае вызваленне народа, за дэмакратычныя пераўтварэнні ў Польшчы і Расійскай імперыі. У ССБ існавалі

два крыла: радыкальнае на чале з А.Янкоўскім і Мікутовічам, памяркоўнае на чале з Ф.Далеўскім. Радыкалы былі за антыцарыскі і антышляхецкі рух народных мас, што прывядзе да грамадства, у якім будзе забяспечана вольнасць і дастатак народа, дзе будзе выбарчая ўлада, нізкія падаткі і народнае апалчэнне. Далеўскі і яго прыхільнікі думалі, што змогуць пераканаць прывілеяваныя класы пайсці «на ахвяры і адрачыся ад эгаістычных мэтаў». Мінская арганізацыя наладзіла ў фальварку Бараўляны вытворчасць патронаў і зброі. На красавік 1849 г. рыхтавалася паўстанне, але пачаліся арышты, і паліцыя разграміла ССБ. Прыгаворам ваеннага суда ад 19.11.1850 г. браты Далеўскія былі пакараны катаржнымі працамі ў Сібіры: Аляксандр — на 10, Францішак — на 15 гадоў. Некаторыя дробныя часткі ССБ у Вільні і Мінску здолелі пазбегнуць праследванняў і праіснавалі да 1850 — 1851 г. [238, с.11-121; 558, с.9-19; 662, с.72].

Адзначым прычыны, якія стрымлівалі нацыянальнае развіццё беларусаў у перыяд 1794 — 1863 гг.:

1. Інкарпарацыя Беларусі ў склад Расійскай імперыі, кіраўніцтва якой імкнулася не дапусціць станаўлення беларускай нацыі, бо лічыла беларусаў, асабліва праваслаўных, рускімі. Пецярбургскі гісторык В.Грыцкевіч слушна піша: «Трэба нарэшце сказаць у поўны голас, што найбольшую непапраўную шкоду Беларусі, беларускай аўтэнтычнасці, маральнаму, духоўнаму развіццю беларускай нацыі нанесла расійская імперскасць» [84, с.173].

2. Ліквідацыя бацькоўскай рэлігіі — уніяцтва, якое было асноўным вызначальнікам асаблівасці беларусаў. А, акрамя, таго, насаджэнне адзінай веры, рускай праваслаўнай царквы.

3. Русіфікацыя і паланізацыя насельніцтва Беларусі. Як не пагадзіцца з прафесарам Л.Лычом, які піша: «Вялікі гістарычны парадокс: два славянскія народы — рускія і палякі — паразітавалі на целе трэцяга славянскага народа — беларусаў» [212, с.1]. На ўсходзе этнічныя беларусы ўсё часцей сталі пераходзіць у рускіх, а на захадзе — палякі пры любым прыдатным выпадку рабілі з беларусаў, асабліва католікаў, палякаў.

4. Расійская і польская сістэмы адукацыі. Першая вучыла на рускай мове і выхоўвала ў духу «За веру, цара і Айчыну», а другая — на польскай мове і фарміравала палякаў-патрыётаў, гатовых да барацьбы за адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах да трох падзелаў.

5. Шляхце зямель Беларусі быў нанесены моцны ўдар пасля паражэння Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг., а акрамя таго, яна разыходзілася інтарэсамі з сялянствам і не адчувала з ім свайго этнічнага адзінства. Праўда, знешняе апалячванне шляхты, як слушна адзначае В.Грыцкевіч, «далёка не заўсёды было стратай сувязі з асяроддзем», што яна «ніколі не забывала пра сваё мясцовае, беларускае, паходжанне» [84, с.178; 427, с.45-69].

6. Адсутнасць рэзка асобных рыс беларускай культуры: праваслаўная рэлігія лічыцца рускай, каталіцкая — польскай; мова набліжана да рускай і польскай; у беларускім фальклоры не хапала матэрыяла аб палітычнай асаблівасці: праслаўлення асабістых перамог, герояў, смутку аб былой волі і дзяржаўнасці (гэта называецца адсутнічанне канфліктагенных элементаў). Да таго ж насаджалася культура і мова сакральнага вялікарускага этнаса.

7. Этнічная разнастайнасць: суіснаванне на тэрыторыі Беларусі розных этнічных суполак. Прычым яны перамешваліся ў выніку дэмаграфічных працэсаў. У сувязі з гэтым нацыяналістычныя настроі ўкараняліся тут з больш вялікімі цяжкасцямі, чым на Украіне і Літве (Летуве).

Але і ў гэты час «палітычна-грамадзкай няволі», па словах А.Станкевіча, «народ наш і тут жыў такжа вартасьцяй грамадзкай, якая яму прыпамінала яго нацыянальную асобнасць — ягоную няпольскасць і нерасейскасць» [343, с.9].

Такім чынам, першы этап нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі (1794—1863 гг.) з'яўляўся «рухам у сабе» ці падрыхтоўчым перыядам выяўлення беларускай нацыянальна-культурнай ідэі і адбываўся ў форме станаўлення беларускай фалькларыстыкі, этнаграфіі, мовазнаўства, гісторыі. У гэты час фарміравалася этнічная самасвядомасць народных мас і нацыянальная самасвядомасць прадстаўнікоў нацыі, праходзіла кансалідацыя беларускай нацыі на падставе лакальных супольнасцяў (ліцвіны і беларусы). Праявы нацыянальнай ідэі назіраліся ў рамках ліцвінскага патрыятызма, які працякаў у рэчышчы польскага (рэчыпаспаліцкага) нацыянальна-вызваленчага руху. З'явіліся першыя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі («Дэмакратычнае таварыства» Ф.Савіча і Саюз свабодных братоў), якія выступілі за нацыянальную еднасць і братэрскі саюз паміж народамі ў барацьбе супраць агульнага ворага — расійскае самадзяржаўе.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Далучэнне зямель Беларусі да Расійскай імперыі адбывалася з невялікімі адхіленнямі па аднолькаваму сцэнарыю: 1) дыпламатычныя перамовы Расіі з іншымі будучымі захопнікамі спачатку аб неабходнасці інтэрвенцыі, а потым аб падзеле РП; 2) стварэнне ў РП прарасійскай канфедэрацыі; 3) увод на тэрыторыю ВКЛ расійскіх войск (інтэрвенцыя) пад маскай барацьбы супраць беспарадкаў і хваляванняў і захавання «спакою і шчасця» сваіх падданых; 4) анексія занятых беларускіх зямель як узнагарода за ўдзел у барацьбе супраць рэвалюцыйнай хвалі ў Еўропе; 5) легалізацыя падзелу РП і далучэння часткі яе тэрыторыі да Расійскай імперыі на паседжаннях надзвычайнага сейма; 6) прысяга насельніцтва зямель Беларусі расійскаму імператару.

2. Палітыка расійскага самадзяржаўя на землях Беларусі не была адзначнай і прамалінейнай, а залежала ад палітычных абставін і поглядаў пануючага манарха. Можна выдзеліць 4 перыяды: кацярынінскі (да і пасля паўстання 1794 г.), паўлаўска-аляксандраўскі (1796—1801, 1801 — да франка-рускай вайны 1812 г., пасля вайны 1812 г.), мікалаеўскі (да і пасля Лістападаўскага паўстання), панаванне Аляксандра II (1856–1863 гг.). Эвалюцыя царскай палітыкі стварала ўмовы і ўплывала на змены ў грамадска-палітычным жыцці зямель Беларусі. Пры Кацярыне II да Літвы і Белай Русі ставіліся як да рускіх зямель, якія нарэшце вярнулі да Расіі. Паўлаўска-аляксандраўскаму перыяду былі характэрны паланафільскія тэндэнцыі ў розных галінах палітыкі расійскіх урадаў адносна зямель Беларусі, якія яны лічылі «польскімі правінцыямі» Расіі. Русіфікацыю і ўніфікацыю зямель Беларусі ўзмацніў Мікалай I, а Аляксандр II зрабіў паслабленні для «польскай справы», але інтэграцыю зямель Беларусі з іншымі тэрыторыямі Расіі працягваў.

3. Пасля інкарпарацыі зямель Беларусі расійскі ўрад пастугова займаўся ўладкаваннем тут агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, заснаванай на расійскім заканадаўстве. Пры гэтым часова захоўваліся мясцовыя правы і органы кіравання і суда. Гэта прыводзіла да прававой блытаніны і стварала магчымасці для бюракратычнай валакіты і злоўжыванняў. Кадры адміністрацыі складаліся з прыезжых рускіх чыноўнікаў

і ў большасці з мясцовых, русіфікацыя якіх ішла не так хутка, як хацелася бы царскаму ўраду.

4. Навучальныя ўстановы Беларусі былі аб'ектам уздзеяння дзвюх рэакцыйных антыбеларускіх сіл: расійскага самадзяржаўя і мясцовага польскага шляхецтва і каталіцкай царквы, з'яўляліся арэнай палітычнай барацьбы за беларускую моладзь. Польская і расійская сістэмы адукацыі для паланізацыі і русіфікацыі выкарыстоўвалі такія сродкі, як: мова выкладання, праграмы навучальных устаноў, выкладаемыя прадметы, кадры настаўнікаў, жаночая адукацыя і выхаванне. Важна адзначыць, што абедзве сістэмы адукацыі ігнаравалі інтарэсы карэннага (тытульнага) насельніцтва, выключаючы беларускую мову з навучальна-выхаваўчага працэса, нацыянальная культура і традыцыі народа знаходзілі ў адукацыі слабое адлюстраванне.

5. Галоўнай арганізацыйнай формай грамадска-палітычнага жыцця зямель Беларусі ў 1772-1863 гг. былі патаемныя і паўпатаемныя гурткі, таварыствы і арганізацыі, якія сталі вынікам паланізацыйнай дзейнасці польскіх патрыётаў у Віленскай навучальнай акрузе. Яны дзейнічалі ў Віленскім універсітэце і гімназіі, гімназіях Беластока, Свіслачы, часцях Літоўскага асобнага корпуса. Ставілі сваёй палітычнай мэтай адраджэнне РП, у складзе якой было бы аўтаномнае ВКЛ.

6. Грамадска-палітычныя падзеі на землях Беларусі выклікалі да жыцця семь хваляў палітычнай эміграцыі ў 1772—1863 гг. Найбольш уплывовыя яе цэнтры (Дэмакратычнае таварыства і Гатэль Ламберт) не губляла сувязі з Радзімай і сваёй палітычнай і разумовай дзейнасцю ўплывала на яе грамадска-палітычнае жыццё. З аднаго боку, яны падтрымлівалі патрыятызм насельніцтва, прысвяшалі яго ідэалагічную эвалюцыю праз распаўсюджванне агітацыйнай і мастацкай літаратуры, сімвалічных рэчаў, пісьмовыя кантакты, накіраванне на айчынныя землі эмісараў для арганізацыі патаемных арганізацый і партызанскага руху. З другога боку, дзейнасць польскіх эмісараў (М.Шыманскага і М.Валовіча ў 1833 г., Ш.Канарскага ў 1835 г., Ф.Кіневіча ў 1844—1846 гг., Я.Рэра ў 1845 і 1846 г.) прыводзіла да ўзмацнення рэпрэсіўных мерапрыемстваў царызма, што стрымлівала фарміраванне беларускай самасвядомасці. Падзеі 1846 г. у Галіцыі і «вясна народаў» у Еўропе 1848-1849 гг. таксама паўплывалі на

грамадска-палітычнае жыццё зямель Беларусі: было створана радыкальнае таварыства Саюз свабодных братоў, некаторыя жыхары выехалі за мяжу, узмацніўся сялянскі рух, на які звярнулі ўвагу ўдзельнікі вызваленчага руху («Адозва да смаргонскіх сялян» Ю.Бакшанскага ў 1847 г.).

7. У грамадска-палітычным жыцці зямель Беларусі існавалі тры плыні: руская (імперская і апазіцыйная), польская («рэчапаспаліцкая»), ліцвінская (беларуская), якія адлюстраваліся ў розных арганізацыйных формах і грамадскіх рухах. Першая праявілася ў расійскай урадавай палітыцы (асабліва ва ўладкаванні агульнаімперскай сістэмы кіравання і суда, распаўсюджванні расійскай мовы і расійскай сістэмы адукацыі, саслоўнай палітыцы), а таксама ў спробах рускага грамадскага і рэвалюцыйнага рухаў прыцягнуць жыхароў зямель Беларусі да сумеснай барацьбы з самадзяржаўем. Другая праявілася ў польскім масонскім і нацыянальна-вызваленчым рухах, якія ахоплівалі насельніцтва Літвы і Белай Русі: тут былі масонскія ложы, філіялы патаемных арганізацый (Нацыянальнае масонства, Патрыятычнае таварыства), якія мелі мэту адраджэння РП у межах 1772 г. Беларускія землі былі прадметам гандлю на перамовах дзекабрыстаў і сяброў Патрыятычнага таварыства ў 1824 і 1825 гг. Трэцяя праявілася ў рэчышчы рэчапаспаліцкай плыні як ліцвінскі сепаратызм (аўтанамізм) і ліцвінскі патрыятызм: у дзейнасці масонаў, шубраўцаў, філаматаў і філарэтаў, эмісараў эмігранцкіх цэнтраў і Таварыства Літоўскага і Рускіх зямель, паўстаннях 1794 г. і 1830-1831 гг., праекце 1811 г. М.-К.Агінскага аб адраджэнні ВКЛ пад апекай Аляксандра I.

8. Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ўзніклі ў асяродзі выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага універсітэта: уніяцкіх прафесараў М.Бброўскага і П.Сасноўскага, сыноў уніяцкіх святароў прафесараў I.Даніловіча і I.Анацэвіча, гаспадара універсітэцкай друкарні А.Марцінinfоўскага, а таксама I.Яршэвіча, Т.Нарбута, I.Лялевеля, М.Балінскага. Першы этап нацыянальна-вызваленчага руху на землях Беларусі (1794—1863 гг.) з'яўляўся «рухам у сабе» ці падрыхтоўчым перыядам выяўлення беларускай нацыянальна-культурнай ідэі і адбываўся

ў формах літаратурнай, навуковай, культурна-асветніцкай дзейнасці «краёвай» шляхты і ўніяцкага духавенства. У гэты час фарміравалася этнічная самасвядомасць народных мас і нацыянальная самасвядомасць прадстаўнікоў нацыі, праходзіла кансалідацыя беларускай нацыі на падставе лакальных супольнасцяў (ліцвіны і беларусы). З'явіліся першыя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі («Дэмакратычнае таварыства» Ф.Савіча і Саюз свабодных братоў), якія выступілі за нацыянальную еднасць і братэрскі саюз паміж народамі ў барацьбе супраць агульнага ворага — расійскага самадзяржаўя. Беларускія адраджэнцы групаваліся вакол А.-Г.Кіркора, В.Дуніна-Марцінкевіча, А.Вярыгі-Дарэўскага, Я.Баршчэўскага. Яны называлі сябе «ліцвінамі», «сарматамі», «крывічамі», жылі ўспамінамі аб ВКЛ, этнаграфічна адрознівалі сябе ад карэннай Польшчы і набліжалі свядомасць мясцовага грамадства да перакanання, што тутэйшы край не ёсць Расія ці Польшча.

9. У працэсе грамадска-палітычнага жыцця канца XVIII — першай паловы XIX ст. выпрацоўваліся асноватворныя ідэі грамадзянскай супольнасці: аўтаномія і свабода асобы, роўнасць перад законам, маёмасць як падмурак асабістай і сацыяльнай вольнасці навогул. Ідэі гэтыя гучалі на паседжаннях масонаў і сяброў патаемных таварыстваў (шубраўцаў, філаматаў і філарэтаў, Нацыянальнага масонства, Патрыятычнага таварыства), у праграмных дакументах і прапагандысцкай літаратуры эмігранцкіх цэнтраў (Дэмакратычнага таварыства, Гатэля Ламберт) і рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый (Саюза свабодных братоў, Дэмакратычнага таварыства Ф.Савіча).

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Абалихин Б.С., Дунаевский В.А. Новое в изучении истории Отечественной войны 1812 года. — М.: Знание, 1983. — 64 с.

2. Абалихин Б.С., Дунаевский В.А. 1812 год на перекрестке мнений советских историков 1917 — 1987 гг. — М.: Наука, 1990. — 243с.

3. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі / Рэд.-склад.М.І.Камінскі. — Мн.: БелСЭ, 1985. — 100с.

4. Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года, собранные и изданные по поручению Его императорского Величества великого князя Михаила Александровича / Под ред. (и с предисловием) К. Военского // Сборник императорского русского исторического общества. — СПб., 1909. — Т.128. — XLIVс.+ 528с.+ IXс.

5. Акты и документы архива Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторского управления, относящиеся к истории 1812 — 1813 гг. // Виленский временник. — Вильна, 1912.—Кн. 5. Ч.1. — Переписка по военной части. — 285с.; Кн. 5. Ч.2. — Переписка по части гражданского управления. — 355с.

6. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. Т. 37. Документы и материалы, относящиеся к истории Отечественной войны 1812 г. — Вильна, 1912. — L.+544с.

7. Анішчанка Я. «Усынаўленне» // Спадчына. — 1993. — № 2. — С. 75 — 77.

8. Анішчанка Я. Якабінец Ясінскі і шляхецкая Вандэя // Бел. мінуўшчына. — 1995. — № 5. — С. 2 — 4.

9. Анішчанка Я. Паўстанне 1794: Змаганне за народ // Полымя. — 1995. — № 5. — С. 225 — 241.

10. Анішчанка Я. Канец прахаднога двара // Голас Радзімы. — 1996. — 5 снежня. — С.5.

11. Анішчанка Я. Перавод беларускіх уніятаў у праваслаўе ў 1781 — 1783 гг.// З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400 — годдзя Брэсцкай уніі). — Мн., 1996. — С. 85 — 89.

12. Анішчанка Я. Адозвы літоўскага паўстання 1794 года // Культура. — 1996. — 28 мая — 3 чэрвеня. — С. 7.

13. Анішчанка Я. Другі падзел Рэчы Паспалітай // Энцыкл. гісторыі Беларусі. — Мн., 1996. — Т. 3. — С. 287.